# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

У чатырох частках







## 1 АД СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА СЯРЭДЗІНЫ XVI ст.

ДАПАМОЖНІК

## ТЭРЫТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XII ст.




### НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ
- ПОЛАЦК — Цэнтры княстваў-земель
- Менск — Цэнтры княстваў-валасцей
- *Лукомль* — Іншыя гарады

### ГРАНІЦЫ
- старажытнарускіх княстваў-земель у другой палове XII ст.
- далучаных тэрыторый, валасцей
- Сучасная граніца Рэспублікі Беларусь

### ТЭРЫТОРЫІ
- якія ў сярэдзіне XII ст. перайшлі пад уладу чарнігаўскіх князёў
- паперамennага валодання Полацка і Смаленска
- якія перайшлі пад уладу валынскіх князёў
- якія былі ўключаны ў склад Кіеўскай зямлі
- якія каля 1180 г. адышлі да Польшчы

### ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ
- Паходы падчас міжусобнай барацьбы паміж менскім князем Валадарам Глебавічам і полацкімі князямі (1157, 1162, 1167)
- Паход кааліцыі рускіх князёў разам з палачанамі супраць тураўскага князя Юрыя Яраслававіча (1157)
- Няўдалыя аблогі Турава кааліцыйным войскам (кіеўская, смаленская, галіцкая, луцкая раці і палачане) у 1158 г., валынскім войскам у 1160 г., Пінска берандзеямі ў 1158 г.
- 1160 — Пагадненне Кіева з Туравам – афіцыйнае прызнанне незалежнасці Тураўскага княства
- Сумесная аблога князямі Мсціславам Полацкім і Расціславам Смаленскім горада Лукі (1167)
- Паход наўгародцаў і псковічаў на Полацк (1169)
- Паход на Друцк кааліцыі князёў (Ігар Святаславіч, Яраслаў Усеваладавіч, Усяслаў Полацкі і інш. полацкія князі) (1180)
- Паход палачан разам з літвой на Лукі (1198)
- Паход наўгародцаў. Заключэнне міру на воз. Каспля

## УТВАРЭННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА




### ГРАНІЦЫ
- дзяржаў у сярэдзіне XIII ст.
- усходнеславянскіх княстваў, балцкіх і фінскіх племянных княжанняў, далучаных тэрыторый
- Літоўскага каралеўства ў 1253–1260 гг.
- ВКЛ пры Міндоўгу каля 1260 г. і пры Віценю каля 1310 г.
- земель, якія сплачвалі даніну Ардзе
- Сучасная граніца Рэспублікі Беларусь
- каля 1306 — Гады далучэння тэрыторый да ВКЛ
- 1254 — Гады часовага далучэння тэрыторый да Галіцка-Валынскай дзяржавы

### ТЭРЫТОРЫІ
- непасрэдна падуладныя Міндоўгу каля 1250 г.
- балцкіх княстваў, якія каля 1250 г. знаходзіліся пад уплывам Міндоўга
- рускіх княстваў, якія з сярэдзіны XIII ст. час ад часу знаходзіліся пад уплывам літоўскіх князёў
- Полацкага княства, якое ў 2-й палове XIII ст. паперамenna належала літоўскім і мясцовым князям
- Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў на 1245 г.
- захопленыя Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі паміж 1245 і 1282 гг.
- заваяваныя Тэўтонскім ордэнам да 1313 г.
- Лівонскага ордэна, якія часова належалі ВКЛ з 1281 да 1313 г.
- трэці Яцвяжскай зямлі, якія па дамове з Тэўтонскім ордэнам 1254 г. належалі Галіцка-Валынскаму і Мазавецкаму княствам
- ленных уладанняў Рамана Васількавіча ў 1254–1258 гг. пад сюзерэнітэтам князя Міндоўга
- часова страчаныя ВКЛ на карысць Галіцка-Валынскай дзяржавы ў 1289 г.
- на якіх у другой палове XIII – пачатку XIV ст. была аднаўлена ўлада галіцка-валынскіх князёў
- далучаныя да Смаленскага княства (Віцебскае кн-ва ў 1281–1297 гг., Бранскае кн-ва з канца XIII ст.)
- Усходнеславянскія землі, якія непасрэдна кіраваліся Ардой

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

У чатырох частках

## Частка 1

## АД СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА СЯРЭДЗІНЫ XVI ст.

*Рэкамендавана*
*Вучэбна-метадычным аб'яднаннем*
*па гуманітарнай адукацыі*
*ў якасці дапаможніка для студэнтаў устаноў*
*вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца*
*па спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя*
*(па напрамках)»*

МІНСК
БДУ
2018

УДК 94(476)(075.8)
ББК 63.3(4Беи)я73-1
Г46

Аўтары:
**П. І. Брыгадзін** (8, 10, 21), **В. А. Варонін** (4, 5, 15),
**І. Л. Грыбко** (12, 16, 21), **А. Р. Дзянісава** (7, 17),
**А. А. Егарэйчанка** (3), **Ю. Л. Казакоў** (18, 20),
**П. А. Лойка** (4, 10), **А. А. Любая** (13), **А. У. Любы** (1, 11, 13, 14),
**Л. В. Мікалаева** (9, 19), **У. А. Падалінскі** (22),
**М. М. Чарняўскі** (2), **Г. Ф. Шапавал** (6), **М. А. Шніп** (20)

Пад рэдакцыяй П. І. Брыгадзіна,
А. Г. Каханоўскага, С. М. Ходзіна

Рэцэнзенты:
кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі
Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы;
акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук,
прафесар *М. П. Касцюк*

**Гісторыя** Беларусі : дапаможнік. У 4 ч. Ч. 1. Ад старажытнасці
Г46 да сярэдзіны XVI ст. / П. І. Брыгадзін [і інш.] ; пад рэд. П. І. Брыгадзіна, А. Г. Каханоўскага, С. М. Ходзіна. – Мінск : БДУ, 2018. – 351 с.
ISBN 978-985-566-616-6.

Першая частка дапаможніка адлюстроўвае сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы айчыннай гісторыі ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст. Вялікая ўвага надаецца генезісу беларускай дзяржаўнасці, фарміраванню этнаканфесійнага становішча і культурнай прасторы на беларускіх землях у эпоху Сярэднявечча.

Для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)».

**УДК 94(476)(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи)я73-1**

**ISBN 978-985-566-616-6 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-566-615-9**

© БДУ, 2018

# ПРАДМОВА

Гісторыя як адна з універсальных сацыяльна-гуманітарных навук дазваляе атрымаць цэласнае ўяўленне аб розных баках сацыяльнага, палітычнага, эканамічнага, культурнага і духоўнага жыцця грамадства. Гэтая навука не толькі мадэлюе верагодную карціну мінулых эпох, але і дае тлумачэнне тых з'яў, якія адбываюцца ў наш час. Як вучэбная дысцыпліна гісторыя развівае ў чалавека здольнасці і навыкі збору інфармацыі, яе аналізу, абагульнення і далейшага выкарыстання. Яна дапамагае лепш разумець ролю і месца свайго народа ў сусветных працэсах, ганарыцца сваёй культурнай традыцыяй, памятаць аб гераічных і трагічных уроках мінулага, выступае фундаментам нацыянальнай самаідэнтычнасці.

У аснове кожнай нацыі ляжыць доўгі і нялёгкі шлях развіцця, таму ўласная гісторыя з'яўляецца важным выхаваўчым кампанентам гуманістычнага светапогляду, абуджае нацыянальную свядомасць і гістарычную памяць. Актуальнасць і запатрабаванасць вывучэння гісторыі Беларусі абумоўлена станаўленнем сучаснай беларускай дзяржавы, умацаваннем яе пазіцый на міжнароднай арэне ў XXI ст., пошукам свайго месца ў свеце.

Першая частка дапаможніка прысвечана перыяду ад засялення тэрыторыі сучаснай Беларусі чалавекам да заключэння Люблінскай уніі 1569 г. Значная ўвага нададзена палітычным і ваенным падзеям нашага мінулага, важны акцэнт зроблены на развіцці дзяржаваўтваральных працэсаў на землях Беларусі. Станаўленне дзяржаўнасці, звязанае са з'яўленнем Полацкага, Тураўскага і іншых княстваў, разглядаецца з улікам рэгіянальных асаблівасцей, што дазваляе ўбачыць шматграннасць гэтага працэсу.

З пазіцый нацыянальнай гістарыяграфіі асэнсавана ўзнікненне феадальнай поліэтнічнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага. Не абыдзены ўвагай даволі складаныя праблемы айчыннай гісторыі, такія як генезіс беларускага этнасу або ўнутрыпалітычная барацьба ў ВКЛ у 1430–40-х гг. Упершыню ў вучэбнай літаратуры комплекснае асвятленне атрымаў перыяд кіравання Казіміра Ягайлавіча (1440–1492).

У кнізе прааналізаваны працэсы культурнага і рэлігійнага жыцця Беларусі, перш за ўсё звязаныя з распаўсюджаннем асветніцтва і розных плыняў хрысціянства. Разгледжана эвалюцыя эканомікі беларускіх зямель ад простай прысвойваючай гаспадаркі да яе ўстойлівых форм у XVI ст. Такім чынам, развіццё беларуска-літоўскай дзяржавы паказана на шырокім фоне сацыяльна-палітычных і этнаканфесійных працэсаў Сярэднявечча і ранняга Новага часу.

Дапаможнік арыентуе чытача на разуменне гістарычных працэсаў, вылучэнне заканамернасцей у развіцці грамадства і дзяржаўных інстытутаў. Параўнальны кампанент дазволіць убачыць асаблівасці развіцця культуры Беларусі ў еўрапейскай прасторы. Фактычны матэрыял паспрыяе засваенню каштоўнаснага падыходу.

Гэта кніга – вынік шматгадовай працы выкладчыкаў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама даследчыкаў іншых навуковых цэнтраў Рэспублікі Беларусь. Спадзяемся, што выданне будзе карысным для студэнтаў усіх айчынных вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкаў, навукоўцаў, настаўнікаў і кожнага, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Карты, размешчаныя на форзацах, распрацаваны Віктарам Мікалаевічам Цемушавым і Сцяпанам Мікалаевічам Цемушавым.

# 1 УВОДЗІНЫ Ў ГІСТОРЫЮ БЕЛАРУСІ

- **Прадмет, задачы, функцыі гістарычнай навукі**
- **Перыядызацыя гісторыі Беларусі**
- **Крыніцы вывучэння беларускіх зямель**
- **Гістарыяграфія Сярэднявечча і ранняга Новага часу**

## ПРАДМЕТ, ЗАДАЧЫ, ФУНКЦЫІ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

Спасціжэнне гісторыі з'яўляецца неад'емнай умовай развіцця нацыі ў сучасным глабалізаваным свеце. Гісторыя як наратыў асэнсоўваецца з вышыні пераэжытых гадоў, а ў выпадку дзяржавы – дзесяцігоддзяў і стагоддзяў існавання на палітычнай карце свету. Яна ўбірае ў сябе комплекс пытанняў, раскрыццё якіх дазваляе нам бліжэй падысці да разумення сваёй нацыянальнай ідэі, свядомага выбару ідэнтычнасці і месца ў сям'і еўрапейскіх народаў. Гісторыя не можа існаваць без сваіх вымярэнняў – палітычнага, эканамічнага і культурнага – і разглядацца па-за гістарычнымі часам, прасторай і тэкстам. На розных этапах развіцця гістарычнай думкі дамінавала ідэя пра перавагу адной з галін гістарычнага працэсу, якія ў сукупнасці ўтвараюць шматмерную мадэль, што дае магчымасць наблізіцца да мінулага.

Перад нацыянальнай гісторыяй стаяць такія важныя пытанні, як эвалюцыя дзяржаўнасці, яе формы і элементы, этнічныя працэсы на вызначанай тэрыторыі. Істотным з'яўляецца і сацыяльны кампанент, які выяўляецца ў фарміраванні эліт, няроўнасці, адносінах падпарадкавання і дагавору. Гісторыя дынастый, якія панавалі ў сярэднявечных дзяржавах, цесна

звязана з палітычнай культурай і перайманнем уладных традыцый, складаннем своеасаблівай ідэалогіі, адносін розных груп тагачаснага грамадства.

Беларусь размешчана на памежжы культур і рэгіёнаў. У некаторым сэнсе наша тэрыторыя ўспрымаецца як памежжа (мяжа, бордэрлэнд, крэсы і г. д.). З іншага боку, мы знаходзімся ў сэрцы славянскага рэгіёна, аднак пры гэтым гістарычна звязаны з балцкімі народамі, з якімі ўваходзілі ў адны дзяржаўныя фарміраванні на працягу амаль 800 гадоў. Узнікненне першых дзяржаў-княстваў на тэрыторыі Беларусі прывяло да фарміравання і развіцця сістэмы ўлады, існуючай ва ўмовах феадальных адносін. З канца X ст. палітычныя эліты арыентаваліся на візантыйскія ўзоры, стваралі традыцыі і каноны ўзаемаадносін манарха і яго падуладных, сумеснага супрацоўніцтва з царквой. Палітычныя і ваенныя пераўтварэнні XIII ст. у рэгіёне прывялі да істотных змен у грамадстве: фарміравання шляхецкага прывілеяванага саслоўя, свабоднага і феадальна-залежнага насельніцтва, рознаэтнічных кантактаў. Апагеем змен у палітычнай культуры стала пераарыентацыя з візантыйскіх узораў да імклівай вестэрнізацыі на нямецкі і польскі ўзоры ў часы Гедымінавічаў і Ягелонаў, імкненне пануючага саслоўя да «залатых шляхецкіх вольнасцей» і пераразмеркавання ўладных функцый у дзяржаве паміж імі і манархам. Гэтыя пытанні ўзнімаюцца ў гістарычнай літаратуры ад XVI ст., дамінуючы ў гістарыяграфіі барока, Асветніцтва, рамантызму, і праходзяць праз пазітывісцкую мадэль гістарычнага даследавання XIX – пачатку XX ст., насычаюцца стварэннем нацыянальных герояў і гістарычных міфаў.

Мінулае стагоддзе прайшло ў гістарычнай навуцы пад сімвалам вывучэння гаспадаркі і форм гаспадарання, адносін паміж феадалам і селянінам, мешчанінам і гарадской адміністрацыяй, якія ўплывалі на дабрабыт дзяржавы і яе жыхароў у розныя гістарычныя эпохі. Вывучэнне эвалюцыі гандлёвых сувязей з суседнімі рэгіёнамі адыграла важную ролю ў асэнсаванні развіцця беларускіх зямель у эпоху Сярэднявечча. Гандаль і змены форм гаспадарання дазволілі стварыць трывалы падмурак функцыянавання палітычнай сістэмы сярэднявечнай Беларусі, яе элітарнай культуры ў вызначаны перыяд.

Сярэднявечная культура Беларусі – гэта сумяшчэнне візантыйскіх і балканскіх традыцый у архітэктуры, прыкладным мастацтве, абразах і рукапіснай кнізе. Царкоўнаславянская мова яднала інтэлектуалаў эпохі ў X–XIII стст., а пашырэнне ўплыву іншых славянскіх моў спрыяла пераходу ў духоўнай культуры Беларусі ад візантыяцэнтрызму да арыентацыі на Заходнюю Еўропу. Лацінізмы, тэрміналогія, кнігадрукаванне, адыход ад канонаў у пісанні абразоў, кніжная мініяцюра, партрэтны жанр, эпас (выбар

героя эпохі не ў «Александрыі», а ў «Трышчане і Ізольдзе») паказваюць паступовае фарміраванне рэгіянальных асаблівасцей. Падобныя тэндэнцыі прасочваюцца і ў бытавой культуры. Метадалогія еўрапейскай «новай гісторыі» зацікавіла ўсходнееўрапейскага даследчыка толькі ў канцы 80-х – 90-я гг. XX ст.

Адной з важных праблем сучаснай гістарыяграфіі з'яўляецца пазіцыянаванне сярэднявечнай гісторыі Беларусі ў геапалітычнай прасторы Еўропы. Яшчэ Фрэнсіс Бэкан адзначаў, што гісторыя – гэта веды аб прадметах, месца якіх вызначана ў прасторы і часе. Увядзенне ў XX ст. тэрмінаў «Усходняя Еўропа» (для IX–XIV стст.) і «Цэнтральная і Усходняя Еўропа» (для XV–XVI стст.) дазволіла ўбачыць геапалітычную сітуацыю для дзвюх гістарычных эпох, прасачыць палітычныя і культурныя працэсы, якія суправаджалі станаўленне дзяржаў Сярэднявечча і ранняга Новага часу і ўплывалі на фарміраванне грамадства на тэрыторыі Беларусі.

Гістарычны час – адна з найважнейшых катэгорый гісторыка. Фернан Брадэль пісаў, што гістарычны час наліпае на думкі даследчыка, як зямля наліпае на рыдлёўку садоўніка. З 30-х гг. XX ст. вучоныя сталі задумвацца над прыродай гістарычнага часу, яго роляй у гістарычным працэсе. Звяртае на сябе ўвагу тое, што кожная аб'ектыўная рэальнасць функцыянуе ў рэчышчы толькі ёй належнага гістарычнага часу. Яго ўспрыняцце адрозніваецца па эпохах, пакаленнях, культурных традыцыях. Гэта адлюстравана ў змене адліку часу і яго прымяненні ў летапісанні і справаводстве, усведамленні часавай адлегласці паміж падзеямі і асобамі, якія прымалі ў іх удзел. У традыцыйным разуменні гістарычны час праяўляецца ў навуковай перыядызацыі і вылучэнні гістарычных эпох.

## ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

У айчыннай гістарыяграфіі і дыдактычнай літаратуры захавалася традыцыя, распачатая М. В. Доўнар-Запольскім і У. М. Ігнатоўскім, атаясамліваць перыяды ў развіцці Беларусі з дзяржаўнымі фарміраваннямі, якія панавалі на нашай тэрыторыі ў той ці іншы прамежак часу. Падобная перыядызацыя атрымала найменне «дзяржаўніцкая», выкарыстоўвалася да 1930-х гг. і з рознымі ўдакладненнямі актуалізавалася ў другой палове XX ст. У 1930–80-я гг. пад агульнасавецкім уплывам у гістарыяграфіі выкарыстоўвалася перыядызацыя, якая грунтавалася на фармацыйнай тэорыі. У канцы XX ст. у аснову перыядызацыі гісторыі Беларусі быў пакладзены цывілізацыйны падыход, вылучаліся перыяды, звязаныя з развіццём грамадства, духоўнай і матэрыяльнай культуры. Сутнасць падыходу – вылучэнне лакальных

цывілізацый і кампаратыўны аналіз яе асаблівых рыс. У пачатку XXI ст. гісторыя Беларусі разглядаецца ў кантэксце гісторыі еўрапейскай цывілізацыі, адбываецца пошук агульных працэсаў, якія прасочваюцца ва ўсеагульнай і айчыннай гісторыі.

Цывілізацыйны падыход прадугледжвае вылучэнне наступных перыядаў: эпоха Старажытнасці, якая ў беларускай гісторыі супадае з дадзяржаўніцкай гісторыяй Беларусі; Сярэднявечча; Новы і Навейшы час.

Старажытнасць (100–35 тыс. гадоў таму – сярэдзіна 1-га тыс. н. э.) падзяляецца на каменны, бронзавы (ці каменна-бронзавы) і жалезны вякі. У эпоху каменнага веку на Беларусі з'явіліся першыя каланісты-паляўнічыя. У сярэднім каменным веку яны засялілі ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі. Эпоха характарызуецца развіццём сацыяльнай арганізацыі насельніцтва (ад праабшчыны да племя), зменамі матэрыяльнай і духоўнай культуры. У новым каменным веку адбыўся пераход да вытворчых форм гаспадарання, з'явіліся промыслы. У бронзавым веку (для нашай тэрыторыі характэрна вызначэнне каменна-бронзавы, ці энеаліт) пад уплывам руху індаеўрапейцаў праз беларускія землі праходзілі буйныя міграцыі, тут з'яўляліся ўмацаваныя паселішчы, змянялася этнічная карта Беларусі.

Сярэднявечча (ад прыходу славян на нашыя землі і фарміравання першых дзяржаў на Беларусі да канца XV ст.) было часам інтэнсіўных змен палітычнага, культурнага і эканамічнага жыцця рэгіёна і ўсёй еўрапейскай цывілізацыі. У IX ст. на тэрыторыі Беларусі як племянныя палітычныя цэнтры з'явіліся гарады, а затым і дзяржавы (землі-княствы Полацкае, Тураўскае, Смаленскае, Чарнігаўскае). Адбыліся змены ў дзяржаўнай і эканамічнай арганізацыі рэгіёна, што прывяло да феадальнай раздробленасці і ўтварэння ВКЛ. Змянілася сістэма вераванняў, адбыўся пераход ад політэізму да монатэізму. Стварыліся ўмовы суіснавання розных канфесій і рэлігій у адной дзяржаве.

Пачатак Новага часу, ці ранні Новы час, – эпоха, якая пачалася ў 1492 г., – характарызуецца кардынальнымі пераўтварэннямі ў дзяржаўным ладзе ВКЛ, тэрытарыяльнымі стратамі, якія вымусілі палітычныя колы дзяржавы ісці на перамовы аб дзяржаўнай уніі з Каралеўствам Польскім. На гэтым этапе адбывалася інтэнсіфікацыя этнічных працэсаў на беларускіх землях, росквіт старабеларускай мовы і культуры.

Ранні Новы час спрэчна называецца ў навуковай і дыдактычнай літаратуры «залатым часам». Так, у XVI ст. панаванне дынастыі Ягелонаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе дало штуршок развіццю культуры і мастацтва, палітычных праў шляхецкага саслоўя, узвышэнню ролі інстытутаў улады, соймавай і судовай сістэмы ВКЛ. Аднак не трэба забываць, што ў ранні

Новы час ВКЛ вяло войны, заключала дагаворы, уступала ў кааліцыі і саюзы. Вынікам гэтага і стала страта ўласнай знешняй палітыкі, партнёраў-саюзнікаў і значных тэрыторый на ўсходзе і поўначы, што адбівалася на рэлігійнай сітуацыі ўнутры краіны, вяло да эканамічнага заняпаду адных рэгіёнаў і адасаблення іншых.

## КРЫНІЦЫ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ

Неад'емнай часткай працы гісторыка з'яўляецца спасціжэнне гістарычнага тэксту: крыніцы інфармацыі, адлюстраванне эпохі, а з прыходам лінгвістычнага павароту ў гістарычнай навуцы – і магчымасць зазірнуць у працэс узаемадзеяння стваральніка-аўтара і карыстальніка-чытача, убачыць асобу інтэлектуала таго часу. Такім чынам, сам тэкст становіцца захавальнікам часу, з дапамогай якога магчыма прасачыць след, пакінуты ў мінулым. Гэтым следам могуць быць месцы памяці ці гістарычная памяць. Гісторык адначасова з'яўляецца і назіральнікам, і ўдзельнікам падзей; працы па гісторыі напісаны з пагляду свайго часу, яны асвятляюць увесь спектр дасягненняў і памылак сваёй эпохі.

Гісторыя зямель Беларусі адлюстроўваецца ў летапісах і хроніках Цэнтральнай і Усходняй Еўропы пачынаючы з X ст. Усходнееўрапейскае летапісанне (Кіеўскі, Галіцка-Валынскі, Наўгародскі, Суздальскі летапісы) змяшчае інфармацыю аб рассяленні славянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі, стварэнні першых дзяржаў, іх уладных элітах (агульнаруская частка – «Аповесць мінулых гадоў»). Летапісы ўтрымліваюць інфармацыю пра ваенна-палітычныя падзеі і ўдзел у іх прадстаўнікоў Полацкай і Тураўскай зямель, раскрываюць узаемаадносіны з такімі палітычнымі цэнтрамі Усходняй Еўропы, як Ноўгарад, Кіеў, Смаленск, Галіцка-Валынскае княства і Польская дзяржава. Цікавым помнікам усходнееўрапейскага летапісання з'яўляецца Радзівілаўскі летапіс XV ст., адметны мініяцюрамі (617 адзінак), якія тлумачаць і дапаўняюць тэкст, змяшчаюць шмат інфармацыі па візуальных вобразах гісторыі беларускіх зямель («Замах Рагнеды на Уладзіміра», «Бітва на Нямізе», «Палон Усяслава»). Усходнееўрапейская летапісная традыцыя ўплывала на фарміраванне рэгіянальнага светапогляду: ад часоў Уладзіміра Манамаха і яго сына Мсціслава складаецца агульны канон гісторыі Русі.

На жаль, да сённяшняга часу не захавалася летапісаў, якія паходзяць з беларускіх гарадоў і зямель XI–XIV стст. Такія палітычныя цэнтры, як Полацк, Менск, Тураў, а таксама Новагародак, Пінск, Гародня, Берасце,

не маглі не мець у Сярэднявеччы сваіх летапісаў, дзе спалучалася агульнаруская і рэгіянальная часткі гістарычнага наратыву. Спробы адшукаць і рэканструяваць на аснове тэкстаў наяўных летапісных зводаў урыўкі з Полацкага і Новагародскага летапісаў праводзіліся з XVIII ст., але не далі вынікаў.

На тэрыторыі сучаснай Польшчы і Паўночнай і Усходняй Прыбалтыкі ў Сярэднявеччы склалася свая традыцыя гісторыяпісання, а ў тэкстах сфарміравалася ўстойлівая ацэнка гісторыі беларускіх зямель. У хроніках, створаных на тэрыторыі Польшчы, Прусіі і Лівоніі, утрымліваюцца ўнікальныя звесткі па гісторыі Беларусі. Стаўленне аўтараў да беларускіх зямель, іх характарыстыка падзей і спосаб выкладання інфармацыі змяняліся на працягу XIII–XVI стст. Пад уздзеяннем інтэграцыйных працэсаў паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім Княствам Літоўскім беларускія землі далучаліся аўтарамі да заходнееўрапейскай прасторы, разглядаліся часткай лацінскага свету. З ліку польскіх крыніц найбольш інфарматыўнымі з'яўляюцца хронікі Янкі з Чарнкова, Марціна і Яўхіма Бельскіх, Бернара Вапоўскага, Мацея Мехавіта і інш. Асэнсаванне сацыяльных і палітычных працэсаў у ВКЛ выкладзена ў «Хроніцы» Яна Длугаша, які ўпершыню звярнуўся да пытання паходжання велікакняжацкай дынастыі. Тэксты польскіх храністаў першай паловы XVI ст. аказалі вялікі ўплыў на летапісанне княства. Сярод ордэнскіх храністаў вылучаюцца Генрых Латыш, Барталамей Хёнэке, Герман Вартберг, Віганд з Марбурга. Яны апісваюць станаўленне ВКЛ і яго ваенна-палітычныя стасункі з суседнімі дзяржавамі.

У першай трэці XV ст. на тэрыторыі ВКЛ адбывалася фарміраванне ўласнага гісторыяпісання, што ўвасобілася ў стварэнні смаленскага і віленскага летапісных цэнтраў. Пры двары епіскапа Смаленскага (а ў далейшым мітрапаліта ўсяе Русі Герасіма) быў створаны так званы Летапіс 1446 г., які ўтрымліваў, акрамя агульнарускай часткі, і «Летапісец князёў літоўскіх». Ідэйная кампазіцыя летапісу была скіравана на разгляд ВКЛ у якасці прадаўжэння агульнай усходнееўрапейскай гісторыі пасля ваенных і палітычных узрушэнняў XIII ст. Летапіс апавядаў пра палітыку «збірання рускіх зямель» пад уладай Вільні і, магчыма, рыхтаваў інфармацыйны падмурак для абвяшчэння ВКЛ еўрапейскім каралеўствам.

Ад пачатку XVI ст. пры двары Гаштольдаў пачаў складацца асяродак новага гісторыяпісання ВКЛ. Асноўныя ідэі ўвасобіліся ў лаціна- і славянамоўных тэкстах, якія даказвалі заходнееўрапейскае (італійскае) паходжанне дынастыі вялікіх князёў і іх атачэння (асобных магнацкіх родаў дзяржавы). Аўтары імкнуліся ўпісаць гісторыю ВКЛ у шэраг цэнтральна- і заходнееўрапейскіх дзяржаў ранняга Новага часу. Традыцыя дзяр-

жаўнага летапісання згасла на Беларусі ў другой палове XVI ст., але атрымала працяг у форме гарадскіх і манастырскіх хронік. Яны з'яўляюцца цікавай крыніцай па рэгіянальнай гісторыі XVII–XVIII стст. (Магілёў, Віцебск, Гародня, Баркулабава і г. д.), адлюстроўваюць быт, рэлігійныя і сацыяльныя адносіны на Беларусі.

Біяграфіі ўплывовых асоб Сярэднявечча прадстаўлены такімі жанрамі персанальнай гісторыі, як царкоўныя жыціі (Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага і інш.) і свецкія пахвалы («Пахвала Вітаўту» ці пахвала, прысвечаная Канстанціну Астрожскаму як пераможцу ў Аршанскай бітве 1514 г.). Падобныя творы мелі пэўныя каноны, паводле якіх ключавым персонам прыпісваліся рысы папярэднікаў.

Важнымі крыніцамі па гісторыі Беларусі з'яўляюцца актавыя матэрыялы, да якіх адносяцца вялікая група палітычных і гандлёвых дагавораў (Рыгі з Полацкам, Віцебскам і Смаленскам, ВКЛ з Ноўгарадам, Тэўтонскім ордэнам, уніі ВКЛ і Каралеўства Польскага); акты пасольстваў (у Вялікае Княства Маскоўскае, Крымскае ханства, Канстанцінопаль, да Папскай курыі), а таксама ўнутрыпалітычныя акты – статуты, земскія і агульназемскія прывілеі, прывілеі на магдэбургскае права, глейты, увязчыя граматы, попісы, якія складаюць велікакняжацкі архіў – Метрыку ВКЛ.

З XVI ст. вялікае значэнне мела прыватная і дзяржаўная карэспандэнцыя, прадстаўленая лістамі манаршых асоб, прадстаўнікоў знаці,ураднікаў ВКЛ (лісты Жыгімонта Аўгуста да Радзівілаў, перапіска Мікалая Радзівіла Чорнага з Жанам Кальвінам, лісты Філона Кміты-Чарнабыльскага). Інфармацыйнасць падобных крыніц невычарпальная ў святле міждысцыплінарнага дыскурсу ў гуманітарных даследаваннях.

У гістарыяграфію XXI ст. усё актыўней уваходзіць візуальная рэпрэзентацыя гістарычнага матэрыялу, шчыльна звязаная з выкарыстаннем спецыфічных крыніц пры вывучэнні гісторыі. Адносна сярэднявечнай Беларусі, напрыклад, важнымі з'яўляюцца абразы і аб'екты дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фрэскавы жывапіс, партрэты, кніжная мініяцюра, гербы.

Недахоп пісьмовых крыніц можа быць кампенсаваны археалагічным матэрыялам, які дае магчымасць даследаваць этнічную і духоўна-фунеральную культуру насельніцтва Беларусі як у дапісьмовы перыяд, так і ў эпоху Сярэднявечча. На аснове даных археалогіі магчыма прасачыць сацыяльныя трансфармацыі ў грамадстве, эканамічнае развіццё асобных рэгіёнаў і культурныя сувязі паміж імі. Археалагічны матэрыял дапамагае ў даследаванні сярэднявечнай гісторыі гарадоў, мястэчак, фартыфікацый, а таксама ў вывучэнні рэлігійнай і гаспадарчай гісторыі Беларусі.

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ СЯРЭДНЯВЕЧЧА І РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ

Вывучэнне гісторыі беларускіх зямель пачалося задоўга да інстытуцыянальнага станаўлення ўніверсітэцкай навукі. Цікавасць да напісання аўтарскай гісторыі ВКЛ была праяўлена Мацеем Стрыйкоўскім у яго «Хроніцы» (1582). Ён упершыню правёў крытычны разбор крыніц па гісторыі ВКЛ, выявіў несупадзенні па асобных падзеях і з'явах з гісторыі нашых зямель паміж наратыўнымі крыніцамі польскага і беларускага паходжання, летапісным і актавым матэрыялам. На жаль, яго праца не была шырока запатрабавана ва ўмовах фарміравання палітычнай і культурнай прасторы Рэчы Паспалітай канца XVI – пачатку XVII ст. Але ўжо ў сярэдзіне XVII ст. тэкст хронікі быў выкарыстаны выкладчыкам езуіцкага калегіума Альбертам Віюк-Каяловічам для напісання «Гісторыі Літвы». Пры ўсіх разважаннях аб патрэбе ведання гісторыі да сярэдзіны XVII ст. навучанне ва ўстановах ордэна езуітаў абмяжоўвалася так званай біблейскай археалогіяй. Для выкладання гісторыі бацькаўшчыны ў польскай і літоўскай правінцыях ордэна былі створаны свае падручнікі. На тэрыторыі ВКЛ у якасці такога выкарыстоўвалася двухтомная кампіляцыйная праца на лацінскай мове. А. Віюк-Каяловіч прысвяціў другі том перыяду ад Крэўскай да Люблінскай уніі. У канцы XVII – першай палове XVIII ст. пашыралася захапленне вывучэннем генеалогіі магнацкіх і шляхецкіх родаў, канструяваннем родавых легенд пры апісанні адпаведнай эпохі (Адам Нарамеўскі, Францішак Папроцкі, Мацей Догель). Піярская рэформа Канарскага і стварэнне Адукацыйнай камісіі павінны былі карэнным чынам змяніць адносіны да гісторыі, гісторыяпісання і вывучэння асобных зямель Рэчы Паспалітай. Аднак падзелы дзяржавы запаволілі адпаведныя працэсы. Вывучэнне гісторыі на нашых землях у традыцыях эпохі Асветніцтва праводзіў Адам Нарушэвіч, які змог прадставіць грамадству свайго часу заснаваную на прыватных архівах гістарычную біяграфію Яна Караля Хадкевіча. Пад кіраўніцтвам А. Нарушэвіча рыхтавалася першая буйная праца па гісторыі Рэчы Паспалітай «Гісторыя польскага народа», дзе адводзілася месца і гісторыі беларускіх зямель.

Заснаванне Віленскага імператарскага ўніверсітэта (1803) і кафедры гісторыі пры ім дазволіла падняць вывучэнне і выкладанне гісторыі беларускіх зямель на новы ўзровень. Маладое пакаленне даследчыкаў займалася палявымі даследаваннямі, пошукам крыніц, іх археаграфічнай апрацоўкай і падрыхтоўкай да выдання. Ва ўніверсітэцкай зале з курса лекцый Іахіма Лялевеля пачалося сістэматычнае вывучэнне ВКЛ. І хоць яго «Гісто-

рыя Літвы і Русі» выйшла толькі ў 1839 г., Лялевель увёў у гістарыяграфію ўласную перыядызацыю гісторыі ВКЛ, разгледзеў ключавых асоб гісторыі, знешнюю і ўнутраную палітыку дзяржавы, свецкія і царкоўныя уніі XIV–XVI стст. У атачэнні І. Лялевеля працавалі такія спецыялісты, як І. Даніловіч, М. Баброўскі, І. Анацэвіч, Ю. Крашэўскі і інш. Навуковая спадчына гістарычнай школы Віленскага імператарскага ўніверсітэта складаецца з адкрыцця Статута 1529 г. і падрыхтоўкі да выдання яго Супрасльскага спісу летапісу 1446 г., апрацоўкі актавага матэрыялу па знешнепалітычных кантактах ВКЛ, апублікаваных пад назвай «Скарбніца».

Паралельна з гістарычнай школай Віленскага ўніверсітэта фарміраваліся і асяродкі вывучэння гісторыі беларускіх зямель пры рэзідэнцыях магнатаў і расійскіх арыстакратаў (Румянцавых, Тышкевічаў, Радзівілаў, Сапегаў). У першую чаргу там праводзіліся археаграфічныя і археалагічныя даследаванні, якія далі магчымасць заявіць пра сябе ў сярэдзіне – другой палове XIX ст. навукова-асветніцкім праектам Віленскай археалагічнай і Віленскай археаграфічнай камісій, дзейнасць якіх звязана з З. Даленга-Хадакоўскім, К. і Я. Тышкевічамі, Г. Грыгаровічам і інш.

Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта гісторыю беларускіх зямель пачалі даследаваць у іншых універсітэцкіх цэнтрах Расійскай імперыі: Санкт-Пецярбургу, Маскве, Кіеве, Варшаве. Складвалася навуковая спецыялізацыя, якая вынікала з асаблівасцей персанальных навуковых школ М. Каяловіча ў Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі, Д. Ілавайскага і М. Любаўскага пры Маскоўскім універсітэце, У. Антановіча пры Імператарскім універсітэце Святога Уладзіміра ў Кіеве. На базе гэтых школ у канцы XIX – пачатку XX ст. сталі магчымымі даследаванні царкоўнай гісторыі на беларускіх землях, уніі паміж Польшчай і ВКЛ, брацкага руху, рэгіянальнай гісторыі. Пры Маскоўскім універсітэце вывучаліся ўтварэнне ВКЛ і яго тэрытарыяльнае ўладкаванне (працы М. Любаўскага «Абласны падзел», «Нарысы»), а таксама гісторыя дзяржаўных органаў («Літоўска-рускі сейм»), сацыяльна-эканамічных рэформ (праца У. Пічэты, прысвечаная аграрнай рэформе Жыгімонта Аўгуста). Даследчыкі Маскоўскага ўніверсітэта пачалі актыўна выкарыстоўваць акты Метрыкі ВКЛ. Кіеўскі ўніверсітэт даў штуршок даследаванням рэгіянальнай гісторыі эпохі Сярэднявечча (У. Данілевіч «Нарысы гісторыі Полацкай зямлі», А. Грушэўскі «Нарысы гісторыі Турава-Пінскага княства», П. Галубоўскі «Гісторыя Смаленскай зямлі», М. Доўнар-Запольскі «Нарысы гісторыі крывічскай і дрыгавічскай зямель»).

Такім чынам, гістарыяграфія XIX ст. заклала падмурак для з'яўлення абагульняючых прац па гісторыі беларускіх зямель. Гісторыя Беларусі

ўпершыню пачала прыцягваць увагу даследчыкаў як непарыўнае развіццё гісторыі этнасу і тэрыторыі яго кампактнага пражывання, абумоўленага паступовымі зменамі дзяржаўных утварэнняў на гэтых землях.

У XX ст. факталагічная база папоўнілася здабыткамі археалагічнай навукі. У міжваенны перыяд археалагічныя экспедыцыі адкрылі некалькі соцень стаянак каменнага і селішчаў бронзавага веку. Беларускім археолагам К. Палікарповічам былі даследаваны стаянкі паляўнічых каля Бердыжа і Юравічаў, выказаны гіпотэзы пра пачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі чалавекам. У вывучэнні аб'ектаў жалезнага веку за 1919–1941 гг. былі знойдзены больш за 800 гарадзішчаў і неўмацаваных паселішчаў, некалькі дзясяткаў могільнікаў. На аснове археалагічнага матэрыялу даследчыкамі аналізавалася развіццё гаспадаркі старажытнага насельніцтва Беларусі, яго этнічны склад і матэрыяльная культура.

У пасляваенны час асноўны акцэнт археолагамі быў зроблены на даследаванні гаспадарчага развіцця, светапогляду, праблем этнагенезу. Вывады знайшлі адлюстраванне і ў абагульняльных працах па гісторыі, падручніках і энцыклапедыях. Вядучую ролю адыгрывалі археолагі ў даследаванні сярэднявечнай гісторыі Беларусі там, дзе наратыўны матэрыял не дазваляе раскрыць у поўнай ступені гаспадарчую ці духоўную культуру. Гісторыю Полацкай зямлі вывучалі Г. Штыхаў і С. Тарасаў, Смаленскага княства – Л. Аляксееў, Тураўскага княства – П. Лысенка. Даследаванне сярэднявечнага Навагародка здзяйсняла Ф. Гурэвіч, Панямоння – Я. Звяруга і С. Півварчык, Мінска – Э. Загарульскі, а таксама Ю. Заяц, Пасожжа – А. Мяцельскі. Працу па вывучэнні полацкай дзяржаўнасці працягваюць у XXI ст. В. Ляўко і Д. Дук.

Першыя абагульняльныя працы па гісторыі Беларусі былі створаны ў 1910–20-я гг. (В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, М. Доўнар-Запольскі, У. Пічэта). Эпохам Старажытнасці і Сярэднявечча ў іх надавалася вялізная ўвага з прычыны фарміравання спецыфічных умоў для ўтварэння беларускага этнасу, беларускай культуры. У X–XIII і XIV–XVI стст. шукаліся пачаткі беларускай дзяржаўнасці, дзяржаўныя сімвалы, гістарычныя героі і знамянальныя даты.

Станаўленне беларускай гістарычнай навукі адбывалася ў міжваеннае дзесяцігоддзе. Заснаванне Інбелкульта, Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта дазволіла мэтанакіравана праводзіць мерапрыемствы па вывучэнні гісторыі Беларусі ад старажытнасці да сучаснасці.

У міжваенны перыяд працягваліся даследаванні праблемы сацыяльнай і эканамічнай гісторыі ВКЛ да Люблінскай уніі. З'явіліся працы

В. Дружчыца, К. Кернажыцкага, А. Бурдзейка, В. Шчарбакова («Нарысы Беларусі», «Сялянскі рух»). У працах апошняга можна прасачыць сувязь паміж эканамічнымі працэсамі і класавай барацьбой. Любыя працэсы ў грамадстве тлумачыліся як вынік сялянскага руху. Паступова з узмацненнем кантролю над гістарычнай навукай узмацняўся і акцэнт на класавай барацьбе ў беларускім грамадстве XVI ст.

У другой палове XX ст. была звернута ўвага на гісторыю гарадоў, гарадскога права і сацыяльных адносін (З. Капыскі). Сацыяльную барацьбу гараджан вывучаў А. Грыцкевіч. Аграрная праблематыка знайшла сваё адлюстраванне ў працах П. Казлоўскага і В. Мялешкі. Праводзіліся даследаванні сістэмы падаткаў і павіннасцей сялян, вывучаліся магнацкае вотчыннае землекарыстанне і яго ўплыў на сацыяльныя адносіны. Пры гэтым трэба адзначыць, што вывучэнне палітычнай гісторыі ВКЛ у Беларусі практычна адсутнічала.

Імпульс да развіцця даследаванняў гісторыі ВКЛ быў дадзены сацыяльна-палітычнымі працэсамі другой паловы 1980-х гг. Цікавасць да айчыннай гісторыі абумовіла зварот да пошуку каранёў сваёй дзяржаўнасці. У вывучэнні ВКЛ вылучаюцца некалькі напрамкаў, якія змянілі падыход да цэлага комплексу пытанняў: утварэнне і станаўленне дзяржавы (А. Краўцэвіч, В. Насевіч), дыпламатычныя адносіны і знешняя палітыка, сацыяльна-палітычная гісторыя, скіраваная на вывучэнне беларускай шляхты і саслоўных прадстаўнічых органаў улады ў ВКЛ (П. Лойка). На першы план выйшлі даследаванні ваеннай гісторыі (Ю. Бохан) і ўнутрыпалітычныя канфлікты (унутрыпалітычная барацьба 1430–40-х гг., паўстанне М. Глінскага).

У 1990-я гг. сярод айчынных даследаванняў XIII–XIV стст. узнік новы напрамак – гісторыя царквы. З’явіліся працы, прысвечаныя манастырскай і парафіяльнай структуры на Беларусі, дзейнасці асобных прадстаўнікоў царквы (Р. Цамблак), узаемаадносінам паміж велікакняжацкай уладай і царквой.

У наш час перажывае росквіт даследаванне гісторыі культуры. Гэтаму ў некаторай ступені паспрыялі ўмовы глабалізацыі інфармацыйнай прасторы, запатрабаванасць у даследаваннях аўтэнтычных элементаў культуры, рэстаўрацыі і рэнавацыі аб’ектаў мастацтва (Мірскі і Нясвіжскі замкавапалацавыя комплексы, гарадскія ратушы).

Беларуская гістарычная навука інтэгравана ў міжнародныя праекты па вывучэнні еўрапейскай гістарычнай і культурнай спадчыны. На гістарычным факультэце БДУ склалася навуковая школа даследаванняў сацыяльнай і палітычнай гісторыі Беларусі эпохі Сярэднявечча і ранняга Новага часу.

# 2 НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў КАМЕННЫМ І БРОНЗАВЫМ ВЯКАХ

- **Супольнасці палеаліту на тэрыторыі Беларусі**
- **Плямёны паляўнічых, рыбакоў і збіральнікаў у часы мезаліту**
- **Неаліт. Пераход да вытворчых форм гаспадаркі**
- **Плямёны Беларусі ў бронзавым веку**

## СУПОЛЬНАСЦІ ПАЛЕАЛІТУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Каменны век – самы працяглы перыяд развіцця грамадства, калі галоўнай выробнай сыравінай з'яўляўся камень, пераважна крэмень, – падзяляецца на старажытны каменны век (палеаліт), сярэдні каменны век (мезаліт) і новы каменны век (неаліт).

Палеаліт (каля 100–10 тыс. гадоў таму) характарызаваўся адаптацыяй чалавека да суровых умоў ледавіковай эпохі. Каля 95 тыс. гадоў таму пачалося апошняе, паазерскае зледзяненне. Сфарміраваўшыся на гарах Скандынавіі, ледавік таўшчынёй да 3,5 км пачаў паступова насоўвацца на Паўночную Еўропу. 20–18 тыс. гадоў назад ён дасягнуў тэрыторыі Паўночнай Беларусі.

У шэрагу месцаў Паўднёва-Усходняй Беларусі знойдзены крамянёвыя вырабы архаічнага выгляду, якія датуюцца часам ад 100 да 40–35 тыс. гадоў таму. У гэты перыяд Еўропу засялялі мускулістыя людзі з нізкай пасадкай галавы, нізкім ілбом, шырокімі скуламі і вялікімі надброўнымі дугамі – неандэртальцы (палеаантрапы). Яны выраблялі з крэменю прылады працы – пераважна ручныя рубілы, разнастайныя вастраканечнікі, скрэблы, разакі. Неандэртальцы жылі паляваннем і, магчыма, збіральніцтвам,

валодалі членараздзельнай мовай, стала карысталіся агнём, будавалі сховы-жытлы, прыкрывалі цела скуранай вопраткай, мелі зачаткі рэлігійных вераванняў. Выяўленыя матэрыяльныя рэшткі еўрапейскіх неандэртальцаў навукоўцы аб'ядноўваюць у шэраг блізкіх між сабой археалагічных культур мусцьерскага перыяду.

Рэшткі жыццядзейнасці першабытных жыхароў – жытлы, прылады працы, творы мастацтва, упрыгожанні, а таксама пахаванні, якія вызначаліся ўзаемападабенствам, існавалі на пэўнай тэрыторыі і ў акрэсленым прамежку часу, вучоныя аб'ядноўваюць у археалагічныя культуры. Лічыцца, што яны маглі адпавядаць плямёнам з адзінай мовай або падобнымі дыялектамі. Такое супадзенне этнасу з культурай найбольш верагодна магло існаваць на ранніх стадыях развіцця культуры або калі яе межы працяглы час былі стабільныя. Экспансія на суседнія тэрыторыі, звязаная з працэсамі ўзаемаасіміляцыі, прыводзіла да парушэння адпаведнасці археалагічнай культуры з этнасам.

Наяўнасць аднолькавых рыс матэрыяльнай культуры ў чалавечых супольнасцях, адасобленых сотнямі кіламетраў, можа сведчыць як пра далёкія міграцыі, так і пра зачаткі племянной арганізаванасці.

Менавіта неандэртальцы і рабілі спробы асвоіць абшары на ўзбярэжжах Дняпра, Сожа і Прыпяці. Іх першапачатковае пранікненне на нашу тэрыторыю магло адбыцца напярэдадні або ў пачатку паазерскага зледзянення, калі яшчэ захоўваўся цёплы клімат.

Несумненныя сведчанні сталага засялення першабытным чалавекам Паўднёвай Беларусі адносяцца да перыяду 27–24 тыс. гадоў таму, калі тут з'явіліся людзі сучаснага антрапалагічнага тыпу, – краманьёнцы. Да гэтага часу адносяцца рэшткі доўгачасовых паселішчаў-стаянак, якія знойдзены пад тоўшчамі земляных адкладаў у в. Юравічы Калінкавіцкага раёна і каля в. Бердыж Чачэрскага раёна на Гомельшчыне.

Краманьёнцы выраблялі больш разнастайныя і дасканалыя прылады працы і паляўнічую зброю, чым іх папярэднікі. Жыхары бердыжскай стаянкі карысталіся драўлянымі коп'ямі з крамянёвымі наканечнікамі, скрабкамі для апрацоўкі шкур, скоблямі для дрэва, разцамі для косткі, нажамі, кінжаламі, праколкамі, мелі сякерападобныя інструменты. Вузкія рэтушаваныя пласцінкі, па меркаванні некаторых вучоных, былі наканечнікамі для стрэл. Выкарыстоўвалі краманьёнцы таксама косткі і мамантавы біўні. На некаторых еўрапейскіх стаянках знаходзяць касцяныя наканечнікі коп'яў, коп'екідалкі, землекапалкі, кінжалы, праколкі і нават іголкі. Выкарыстоўвалася і дрэва – для рукаятак дрэўкаў і ўдарнай зброі.

У зацішных і сухіх мясцінах рачнога ўзбярэжжа краманьёнцы ладзілі свае паселішчы ў два-тры жытлы. Пабудовы былі доўгачасовыя, пераважна

акруглыя ў плане, дыяметрам чатыры-пяць метраў. Аснову іх складалі нізкія масіўныя сценкі з чарапоў і буйных костак мамантаў, а каркас даху ладзіўся з драўляных або звязаных з мамантавых рэбраў жэрдак і накрываўся шкурамі.

Асноўным заняткам краманьёнцаў было загоннае паляванне на валасатых насарогаў, першабытных быкоў, бурых мядзведзяў, паўночных аленяў і інш. Асабліва важнай здабычай былі маманты, з якіх атрымлівалі шмат мяса і тлушчу, косткі для будаўніцтва і паліва, біўні, шкуры для ўцяплення падлогі, сценак і дахаў жытлаў, высцілання лежакоў.

Жыхары познепалеалітычных стаянак мелі сістэму рэлігійных вераванняў, звязаных пераважна з паляўнічай магіяй, жаночай плоднасцю, уяўленнямі пра замагільнае жыццё. Матэрыяльным адлюстраваннем гэтых вераванняў былі выразаныя з біўняў маманта фігуркі людзей, пераважна жанчын, звяроў і птушак, наразныя арнаменты на касцяных вырабах, падвескі са звярыных зубоў.

Аснову сацыяльнай арганізацыі краманьёнцаў, відавочна, складалі сем'і па пяць – сем асоб. Яны групаваліся ў першабытныя родавыя абшчыны. Улічваючы знаходкі палеалітычных «венер», мы можам гаварыць аб вялікай ролі ў тагачасных супольнасцях жанчын як прадаўжальніц чалавечага роду. Аднак не меншае значэнне мелі і мужчыны-паляўнічыя, дзякуючы старанням якіх гэты род карміўся.

Тыповыя для бердыжскай стаянкі востраканечнікі з бакавой выемкай сустракаюцца ад Падоння на ўсходзе да Аўстрыі і Паўднёва-Усходняй Германіі на захадзе. Некаторыя навукоўцы лічаць гэта сведчаннем існавання на дадзенай тэрыторыі асобнай віленддорфска-касцёнкаўскай культуры.

Каля 20–18 тыс. гадоў таму ледавік дасягнуў раёнаў сённяшніх Гродна, Вілейкі, Оршы. На Беларусі ўсталяваўся асабліва неспрыяльны клімат. Наш край зноў цалкам абязлюдзеў. Аднак у хуткім часе пачалося імклівае пацяпленне і праз тры тысячагоддзі лёд пачаў адступаць з поўначы сучаснай тэрыторыі Беларусі. Узгоркі і раўніны, зазелянелыя тундравай і стэпавай расліннасцю, запаланілі статкі паўночных аленяў. Услед за імі прыйшлі і грамады паляўнічых. Пачаўся перыяд фінальнага палеаліту (13/12–10 тыс. гадоў таму).

Старажытнейшымі з гэтай трэцяй хвалі засялення тэрыторыі Беларусі былі плямёны лінгбійскай і грэнскай культур. Лінгбійцы засялілі захад Беларусі, грэнцы прыкладна ў той жа час, а можа, нават крыху раней, прасунуліся ў Падняпроўе з поўдня.

Некалькі пазней, у самым канцы фінальнага палеаліту, у Заходняй і Цэнтральнай Беларусі і на суседніх тэрыторыях Польшчы, Украіны і Літвы запа-

навала насельніцтва свідэрскай культуры, якое, як мяркуюць, генетычна паходзіць ад лінгбійскага.

Асноўнай паляўнічай зброяй фінальнапалеалітычнага насельніцтва Беларусі былі лукі са стрэламі. Лінгбійцы майстравалі масіўныя крамянёвыя вырабы: лістападобныя наканечнікі з выдзеленымі чаранкамі, нажы, скрабкі, разцы. У грэнцаў наканечнікі стрэл былі таксама лістападобныя, але чаранкі мелі толькі адну бакавую выемку. Свідэрцы ж свае наканечнікі майстравалі з вузкіх правільна аграненых пласцін, рэтушуючы чаранкі з абодвух бакоў.

У фінальным палеаліце для вырабу прылад працы пачалі выкарыстоўваць якасную сыравіну, якую здабывалі на крэйдавых адкладах і на ўчастках крэменяноснай марэны адкрытым спосабам – перакопам у ямах і траншэях. Сустракаюцца і рэчы з адмысловых гатункаў крэменю, які здабывалі на аддаленых тэрыторыях, што сведчыць пра міжплемянны абмен або міграцыі. Акрамя крамянёвых, у фінальным палеаліце карысталіся вырабамі з рога і косці. Гэта былі найперш сякеры і гарпуны для палявання на хуткаsuccessive дзічыну.

Вымушаныя часта перамяшчацца ўслед за статкамі паўночных аленяў людзі канца палеаліту закладалі на зручных прыбярэжных участках рэк і азёр пасяленні-стаянкі, дзе будавалі лёгкія жытлы тыпу сібірскіх чумаў. У лясістай мясцовасці размяшчаліся базавыя паселішчы, дзе жылі зімой, палюючы не толькі на аленяў, але і на лясную дзічыну. Там жытлы рабілі грунтоўныя, для захавання цяпла крыху заглыбленыя ў зямлю.

Жыхары фінальнапалеалітычных паселішчаў асноўную ўвагу надавалі паляванню, прымяняючы розныя стратэгіі здабычы дзічыны, у залежнасці ад яе віду і геаграфічнага асяроддзя. Па-ранейшаму шырока выкарыстоўвалася загоннае паляванне. Найбольш інтэнсіўная здабыча паўночных аленяў адбывалася восенню на рачных пераправах. У цёплыя часы паляванне магло дапаўняцца збіральніцтвам.

Пра сацыяльна-культурнае развіццё фінальнапалеалітычных жыхароў Беларусі амаль нічога не вядома, але пра іх гаспадарку мы ведаем некалькі больш праз захаванасць вырабаў з крэменю. Некаторыя з нешматлікіх касцяных вырабаў з паўночнай часткі Цэнтральнай Еўропы маюць складаныя арнаментальныя кампазіцыі з нарэзак і насечак. Магчыма, у гэтых абстракцыях зашыфравана нейкая магічная сімволіка.

Акрэсленасць меж археалагічных культур і аднатыпнасць вядучых форм крамянёвых і касцяных вырабаў сведчаць пра аб'яднанне родавых абшчын у плямёны. Іх культурнае адзінства падтрымлівалася адзінай мовай. У арэалах вялікіх культур існавала па некалькі спародненых плямён, якія карысталіся блізкімі дыялектамі.

# ПЛЯМЁНЫ ПАЛЯЎНІЧЫХ, РЫБАКОЎ І ЗБІРАЛЬНІКАЎ У ЧАСЫ МЕЗАЛІТУ

Каля 10 тыс. гадоў таму ледавік канчаткова растаў. З канцом ледавіковай эпохі завяршыўся палеаліт і пачаўся сярэднякаменны век – мезаліт (9/8–5/4-е тыс. да н. э.), які вызначаўся адаптацыяй чалавечых супольнасцей да ўмоў пацяплення і распаўсюджвання цеплалюбных форм флоры і фаўны.

Клімат змяняўся паступова. Здараліся сухія і вільготныя, халодныя і цёплыя перыяды. Спачатку захоўваліся рэшткі тундры і лесатундры, але паступова іх пачалі цясніць бярозавыя і сасновыя лясы. На зіму яшчэ прыходзілі паўночныя алені, яшчэ сустракаліся бізоны і дзікія коні, але ў наваколлі ўсё больш павялічваліся статкі зуброў і ласёў. Потым сасновыя лясы пачалі пераважаць над бярозавымі, а каля 7–6-га тыс. да н. э. распаўсюдзіліся змешаныя лясы, у якіх значнае месца занялі шыракалістыя пароды дрэў. Склаліся спрыяльныя ўмовы для існавання разнастайнай лясной дзічыны. Да зуброў і ласёў дабавіліся туры, высакародныя алені, казулі, дзікі. Шмат было мядзведзяў, ваўкоў, лісіц, розных драбнейшых лясных істот. Незлічонае мноства азёр на поўначы Беларусі, балоты на рэшце яе тэрыторыі прыцягвалі вадаплаўных птушак. Вадаёмы поўніліся рыбай. У наваколлі з’явілася шмат раслінная ежы – малюскі і смаўжы, грыбы, лясныя і вадзяныя арэхі, карані, клубні і зялёныя часткі травяністых раслін. Напрыканцы мезаліту (5–4-е тыс. да н. э.) клімат дасягнуў свайго так званага оптымуму, калі сярэднегадавыя тэмпературы былі нават вышэйшымі за сучасныя.

У пачатку мезаліту паўночныя алені, прызвычаеныя да холаду, мігравалі на поўнач і паўночны ўсход. За імі адышла значная частка мясцовага свідэрскага і грэнскага насельніцтва. Рэшта ж засталася на сваіх спрадвечных землях, прыстасоўваючыся да новых умоў існавання ў лясной зоне.

У раннім мезаліце карысталіся тым жа крамянёвым наборам вырабаў, як і ў канцы папярэдняй эпохі. Навацыяй стала толькі пашырэнне колькасці інструментаў для працы з дрэвам – сякер, цёслаў, долатаў, стамесак.

У сярэдзіне мезаліту на землі Беларусі з поўдня і паўднёвага захаду пачало перасяляцца новае насельніцтва з іншым тыпам прылад працы. Яно навучылася ў касцяных асновах выразаць пазы і ўклейваць у іх дробныя рэтушаваныя крамяні – мікраліты. Такім чынам рабілі наканечнікі коп’яў, дроцікаў і стрэл, кінжалы, нажы, гарпуны.

Старажытныя чалавечыя супольнасці, якія карысталіся мікралітамі, на тэрыторыі Беларусі аб’ядноўваюць у некалькі археалагічных культур –

яніславіцкую на захадзе, кудлаеўскую на поўдні і сожскую ў Беларускім Падняпроўі. Поўнач Беларусі ўвесь мезаліт займалі плямёны кундскай культуры, якія былі прамымі нашчадкамі фінальнапалеалітычнага насельніцтва. Аднак і на поўдні Беларусі ў познім мезаліце побач з мікралітамі выкарыстоўвалі лістападобныя вастрыі для стрэл. Гэта сведчыць пра тое, што тут заставалася і частка абарыгеннага насельніцтва, якое паступова змешвалася з прышлым з мікралітычнымі крамянёвымі вырабамі.

Знаходкі ў тарфяніках і донных адкладах азёр і рэк паказваюць, што мезалітычнае жыхарства Беларусі для вырабу прылад працы і зброі шырока выкарыстоўвала косткі і рогі. Сярод іх вядомы наканечнікі стрэл і кінжалы з пазамі для мікралітаў, простыя наканечнікі стрэл і дроцікаў, адназубыя вастрыі, гарпуны, рыбацкія кручкі, праколкі, сякучыя і долатападобныя вырабы, матыкі і сякеры з фрагментаў аленевых рагоў з прасвідраванымі адтулінамі, косалёзавыя муфтавыя сякеры і інш.

У пачатку мезаліту насельніцтва тэрыторыі Беларусі заставалася яшчэ вандроўным. Пазней, з развіццём суцэльнай залесенасці, калі распаўсюдзіліся не схільныя да міграцый жывёлы, чалавечы побыт стаў больш размераны і ўладкаваны. Асобныя вялікія сем'і, роды і плямёны мелі акрэсленыя тэрыторыі з цвёрда вызначанымі межамі.

Свае паселішчы мезалітычныя жыхары стараліся ладзіць на высокіх пясчаных узвышшах на ўзбярэжжах рэк і азёр, паблізу рыбных мясцін. Меліся ўлюбёныя месцы доўгачасовага пражывання родавай абшчыны і кароткачасовыя стаянкі асобных сем'яў ці груп паляўнічых або рыбакоў. Жытламі былі акруглыя, авальныя або падпрамавугольныя ў плане збудаванні з калоў і жэрдак, накрытыя, верагодна, шкурамі, бяростай і трыснягом, плошчай 15–20 кв. м. Некаторыя збудаванні былі крыху заглыбленымі ў зямлю. Агнішчы размяшчаліся ў жытлах, а звонку меліся яшчэ летнія агнішчы і невялікія ямы-сховішчы для розных прыпасаў.

Павелічэнне спосабаў і форм эксплуатацыі асяроддзя – пашырэнне рыбалоўства і збіральніцтва – стала даваць больш ежы. Адпаведна, на канкрэтнай тэрыторыі магло пракарміцца больш людзей. Рачныя і азёрныя ўзбярэжжы пачалі пакрывацца больш густой сеткай паселішчаў. Водападзелы і ўзбярэжжы малых рэчак заставаліся бязлюднымі.

Мезаліт быў эпохай росквіту прысвойваючай гаспадаркі (паляванне, рыбацтва і збіральніцтва) ва ўмовах максімальна спрыяльнага клімату. Спецыялізаванае здабыванне паўночных аленяў фінальнапалеалітычнага часу вялікімі гуртамі паляўнічых у мезаліце саступала месца лясному індывідуальнаму паляванню. Галоўнай паляўнічай зброяй стаў лук. Выкарыстоўваліся таксама коп'і з крамянёвымі наканечнікамі

і розныя касцяныя гарпуны, верагодна, былі вядомыя і розныя лоўчыя прыстасаванні. Палявалі на аленяў, ласёў, высакародных аленяў, тураў, сернаў, дзікоў, мядзведзяў, баброў і іншую дзічыну, у тым ліку пушную – лісіц, выдраў, куніц, а таксама на вадаплаўных і лясных птушак. Агульнапрынятым лічыцца, што мезалітычных паляўнічых ужо суправаджаў сабака – першая свойская жывёліна чалавека.

У мезаліце набыла шырокі размах здабыча рыбы. Рыбацтва вялося з дапамогай вуд з касцянымі кручкамі, гарпуноў, пастак з драўляных пруткоў. Ёсць сведчанні і аб падлёдным лове. Найбольш пасяхова рыба лавілася з дапамогай сетак, у тым ліку і на глыбокай вадзе, для чаго выкарыстоўваліся чоўны-даўбёнкі.

Прыроднае асяроддзе было спрыяльным для збіральніцтва. З лесу, балота і вадаёмаў чалавек атрымліваў ягады, грыбы, ядомыя часткі раслін, карані, малюскаў, яйкі, мёд.

Рухомы лад існавання раннемезалітычных супольнасцей адлюстраваўся ў характары першабытнага мастацтва. Касцяныя вырабы гравіраваліся дынамічнымі, наструненымі выявамі мужчын-паляўнічых і звяроў, пакрываліся ламанымі лініямі арнаментаў. Напрыканцы мезаліту, з развіццём большай аселасці, мастацкі стыль набыў дастаткова размераны і спакойны характар. Выявы і арнаменты адлюстроўваюць узровень і характар тагачасных рэлігійных вераванняў, заснаваных, верагодна, на кульце звяроў і міфічных герояў-паляўнічых, а магчыма, і нейкіх бостваў.

На тэрыторыі Польшчы знойдзены некалькі пахаванняў людзей янiславіцкай культуры. Яны сведчаць аб складанай пахавальнай абраднасці, дзе была вера ў працяг існавання і пасля смерці, і вера ў жыватворную моц чырвонай охры, якая, магчыма, сімвалізавала кроў.

Пра сацыяльную арганізацыю мезалітычнага насельніцтва Беларусі мы мала што ведаем. Асновай тагачаснага жыхарства былі малыя сем'і. На паселішчы з некалькіх жытлаў жыло адпаведна некалькі спародненых сем'яў, якія ўтваралі род. Роды аб'ядноўваліся ў плямёны. Групам блізкіх між сабою па мове або дыялектах плямён, верагодна, маглі адпавядаць археалагічныя культуры.

## НЕАЛІТ. ПЕРАХОД ДА ВЫТВОРЧЫХ ФОРМ ГАСПАДАРКІ

У 5–4-м тыс. да н. э. у развіцці першабытнага грамадства Беларусі пачынаецца заключны этап каменнага веку – неаліт (5/4 – пачатак 2-га тыс. да н. э.). Класічны еўрапейскі неаліт характарызуецца з'яўленнем

вытворчых форм гаспадаркі – земляробства і жывёлагадоўлі, распаўсюджваннем глінянага посуду (керамікі), каменных шліфаваных прылад працы, аселасці. Аднак неаліт Беларусі, як і іншых тэрыторый лясной зоны Усходняй Еўропы, меў свае асаблівасці. Пачатак новай эпохі супаў з найбольшым за папярэднія дзесяць тысяч гадоў пацяпленнем. Клімат спрыяў развіццю фаўны і флоры. Таму ў нашым азёрна-балотна-лясным краі чалавек мог тысячагоддзямі знаходзіць сабе спажыву традыцыйнымі формамі эксплуатацыі асяроддзя – паляваннем, рыбацтвам і збіральніцтвам. Ва ўмовах багацця прыродных рэсурсаў не было неабходнасці мець лішні клопат з жывёлагадоўляй або з земляробствам. Аднак змены клімату прывялі да парушэння раўнавагі «чалавек – прырода» і неабходнасці іх выкарыстання для кампенсацыі харчовых запасаў.

Распаўсюджванне вытворчай гаспадаркі было працяглым. Па назіраннях палінолагаў, зачаткі земляробства на паўднёвым захадзе Беларусі з'явіліся вельмі рана, магчыма, нават у канцы мезалітычнай эпохі. Расліны, спадарожныя жывёлагадоўлі, пачалі распаўсюджвацца пазней. Жыхары ж Падзвіння пазнаёміліся з земляробствам і жывёлагадоўляй толькі ў пачатку 3-га тыс. да н. э. Аднак на працягу неаліту ў гаспадарцы чалавечых супольнасцей міжрэчча Дзвіны і Буга яшчэ цалкам пераважалі паляванне, рыбацтва і збіральніцтва. Новыя формы атрымання харчу толькі дапаўнялі іх.

Сведчанні вытворчай гаспадаркі на ранніх неалітычных паселішчах слаба ўлоўныя, а абломкі глінянага (керамічнага) посуду сустракаюцца паўсюдна ад самага пачатку эпохі. Фактычна пачатак неаліту на нашай тэрыторыі вызначаецца адной «неалітычнай» рысай – керамікай. З'яўленне керамічнага посуду было абумоўлена важнымі гаспадарчымі і побытавымі зменамі – існаваннем вялікай колькасці расліннай ежы, якая магла найлепш спажывацца, калі гатавалася ў кіпячай вадзе. Шліфаванне ж каменных вырабаў на тэрыторыі Беларусі шырока распаўсюдзілася толькі ў познім неаліце.

На паселішчах з ранненеалітычнымі матэрыяламі, як правіла, сустракаюцца крамянёвыя вырабы з перажыткавымі мезалітычнымі рысамі. Гэта сведчыць аб тым, што на мяжы эпох у Беларусі не назіралася істотных змен насельніцтва, а неалітычныя культуры фарміраваліся пераважна на мясцовым познемезалітычным субстраце.

З часам крамянёвыя вырабы набывалі ўсё больш неалітычныя рысы. Так, калі ў раннім неаліце выкарыстоўваліся вузкія лістападобныя наканечнікі стрэл, то ўжо ў сярэднім неаліце ў басейнах Нёмана і Прыпяці наканечнікі рабіліся трохвугольнымі, а ў Падняпроўі і Падзвінні – кароткімі

лістападобнымі і рамбічнымі. Распаўсюджваліся лістападобныя наканечнікі коп'яў, разнастайныя скрабкі, рэтушаваныя пласціны, якія маглі выконваць і функцыі сярпоў. Змяншалася колькасць разцоў. Значна больш шматлікімі рабіліся сякерападобныя і цяслападобныя вырабы, прызначаныя для апрацоўкі дрэва. Павелічэнне іх колькасці ўказвае на пашырэнне земляробства, звязанага з расчысткай лясных зараснікаў пад зямельныя ўчасткі. У канцы неаліту лёзы некаторых сякер пачалі падшліфоўваць, павялічваючы гэтым іх прадукцыйнасць. Значную частку прылад працы і паляўнічай зброі ў неаліце, асабліва на поўначы краю, дзе было мала крамянёвай сыравіны, выраблялі з рога і косці. Працягвалася актыўнае выкарыстанне і драўляных рэчаў – разнастайных прылад працы і кухоннага посуду.

На паверхні некаторых гліняных пасудзін сярэдняга неаліту заўважны адбіткі нітак, што сведчыць аб прадзенні і ткацтве. Прысвойваючая гаспадарка ва ўмовах спрыяльнага клімату, дапоўненая новымі спосабамі атрымання харчавання шляхам земляробства і жывёлагадоўлі, давала значныя запасы ежы. Гэта, адпаведна, выклікала прыкметны прырост насельніцтва. Колькасць паселішчаў у некаторых рэгіёнах у неаліце падвоілася.

Паселішчы размяшчаліся на пясчаных павышэннях поплаву і ніжэйшых рачных тэрасах, на мысах у прывусцях невялікіх рачных прытокаў. Вялікае значэнне мелі суседства рыбных затok і старыц, наяўнасць розных ландшафтаў, дзе быў багацейшы выбар дзічыны. У такіх спрыяльных мясцінах меліся скапленні паселішчаў. Жытлы будавалі пераважна наземныя, але маюцца сляды і паўзямлянак. Паселішчы былі доўгатэрміновымі. Іх плошчы займалі па некалькі тысяч квадратных метраў.

У раннім неаліце тэрыторыю Беларусі, асабліва ў басейнах Нёмана і Прыпяці, засялялі плямёны з падобнай матэрыяльнай культурай. Яны карысталіся гліняным ляпным посудам – пераважна гаршкамі з вострым дном і валакністымі дамешкамі ў сценках, паверхні якіх загладжваліся зубчатымі шпатэлямі. Ніжнюю Прыпяць і захад Беларусі, а таксама прылеглыя раёны Паўночна-Усходняй Украіны, Паўднёвай Літвы і Паўночна-Усходняй Польшчы займалі плямёны ўсходнепалескай і прыпяцка-нёманскай культур, якія ўваходзілі ў вялікую Днепра-Данецкую этнакультурную вобласць. Асноўным арнаментам іх керамікі былі даволі разрэджаныя ўзоры з адбіткаў грэбеня і наколаў, якія дапаўняліся пракрэсленымі лініямі і нешматлікімі ўмяцінамі. На захадзе Беларусі характэрнымі былі адступаючыя наколы кантам акруглай палачкі. Пад краем венцаў у большасці выпадкаў меўся пояс глыбокіх круглых ямак. Падняпроўе займалі плямёны верхнедняпроўскай

культуры з керамікай, шчыльна аздобленай адбіткамі грэбеня і ямачнымі паглыбленнямі, з даволі шматлікім крамянёвым інвентаром з мясцовага крапчастага крэменю.

На поўначы Беларусі валадарылі носьбіты нарвенскай культуры. У арэал культуры апрача Паўночнай Беларусі ўваходзіла Паўднёва-Усходняя Прыбалтыка і некаторыя прылеглыя тэрыторыі. Нарвенцы карысталіся вастрадоннымі гаршкамі і акругладоннымі місачкамі з дамешкамі тоўчаных ракавін у сценках. Посуд аздабляўся насечкамі, наколамі, часам грабеньчатымі адбіткамі. Паясы ямак пад краем венцаў былі мала характэрныя. Крамянёвы інвентар мясцовага ранненеалітычнага насельніцтва яшчэ захоўваў шэраг познемезалітычных рыс. Недахоп крамянёвай сыравіны кампенсаваўся рогам і косцю, з якіх выраблялі найперш колючыя, ударныя і сякучыя інструменты.

Ранненеалітычныя грамадствы на тэрыторыі Беларусі праяўлялі адносную стабільнасць, развіваючыся паводле мясцовых выпрацаваных традыцый. Гэтае развіццё адбывалася ва ўмовах так званага атлантычнага кліматычнага перыяду, устойліва цёплага і вільготнага, з панаваннем шыракалістых лясоў.

Пад канец 4-га тыс. да н. э. наступіў так званы суббарэальны кліматычны перыяд, па-ранейшаму дастаткова цёплы, але больш сухі і няўстойлівы. Для гэтага часу было характэрна гарачае і сухое лета і халодная зіма. Азёры паменшыліся ў памерах, часткова затарфаваўшыся. Адбыліся змены ў раслінным і жывёльным свеце.

Няўстойлівасць клімату парушыла сфарміраваныя стагоддзямі сувязі чалавечых супольнасцей з акаляючым асяроддзем. Гэта выклікала адмоўныя з’явы ў гаспадарцы, стварыла дэмаграфічныя праблемы. Такія сітуацыі, як правіла, выкарыстоўвалі больш мабільныя і паспяховыя суседзі.

З другой паловы 4-га тыс. да н. э. на ўзбярэжжы рэк і азёр поўначы Беларусі з-пад далёкай Фінскай затокі прасачыліся групы насельніцтва прыбалтыйскай культуры з грабеньчата-ямкавай керамікай. На самым поўдні іх экспансія дасягнула Нарачанскіх азёр, Віліі і вярхоўяў Бярэзіны дняпроўскай.

Прышлае насельніцтва ўжывала кругладонны таўстасценны посуд з жарсцвянымі дамешкамі ў сценках, шчыльна аздобленых паясамі з глыбокіх ямак і адбіткаў шыраказубага грабеньчатага штампа. Акрамя крамянёвых прылад працы, у іх ужытку былі разнастайныя вырабы з рога і косці.

Носьбіты прыбалтыйскай культуры на нашай тэрыторыі былі нешматлікімі, і праз пэўны час іх асімілявала мясцовае нарвенскае насельніцтва.

Аднак яны надалі аўтахтонам новыя асаблівасці, што прыняло да фарміравання на Беларускім Паазер'і ўсвяцкай культуры.

Усвяцкая культура характарызуе сярэдненеалітычны час Паўночнай Беларусі. Мясцовае насельніцтва традыцыйна працягвала карыстацца вастрадонным посудам з ракавіннымі дамешкамі ў сценках, арнаментаваным пераважна насечкамі і наколамі. У той жа час, па прыкладзе прыбалтыйцаў, загладжвала паверхню посуду, а арнаменты дапаўняла ямачнымі паглыбленнямі, адбіткамі шыраказубага штампа і вусеняў.

На захад Беларусі ў другой палове 4-га тыс. да н. э. з тэрыторыі суседняга Пабужжа пачало перасяляцца насельніцтва так званага польскага ляснога неаліту. Яно карысталася звыклым для лясной зоны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы вастрадонным посудам і крамянёвым інвентаром, але валодала больш развітымі формамі земляробства і жывёлагадоўлі.

У выніку змешвання перасяленцаў з насельніцтвам мясцовай прыпяцка-нёманскай культуры на захадзе Беларусі і паўднёвым захадзе Літвы сфарміравалася нёманская культура. Яе лысагорскі этап характарызуе мясцовы сярэдні неаліт, а дабраборскі – позні неаліт.

Для лысагорскага этапу быў характэрны вастрадонны посуд з раслліннымі і жарсцвянымі дамешкамі ў гладкіх сценках. У арнаментах на кераміцы дамінуюць адступаючыя наколы, з'яўляюцца адбіткі лінейнага штампа. Для крамянёвых вырабаў былі асабліва характэрныя трохвугольныя наканечнікі стрэл.

На дабраборскім этапе карысталіся посудам з заштрыхаванымі паверхнямі, арнаментаванымі адступаючымі наколамі, адбіткамі лінейнага штампа, рыскамі. Сярод крамянёвых вырабаў вядомы трохвугольныя наканечнікі стрэл, серпападобныя нажы, на некаторых сякерах прыкметная падшліфоўка ляза. Новыя рысы нёманская культура атрымала пад уплывам сярэднееўрапейскіх культур шарападобных амфар і шнуравой керамікі.

На Падняпроўі ў сярэднім і асабліва познім неаліце адчуваліся ўплывы з Волга-Окскага міжрэчча. Аднак тут, як і на Ніжняй Прыпяці, мясцовае насельніцтва стойка трымалася спрадвечных традыцый. Па гэтай прычыне для Паўднёва-Усходняй Беларусі цяжка вылучыць сярэдненеалітычны этап.

У 3-м тыс. да н. э. на захад Беларусі з тэрыторыі Польшчы і Паўночна-Заходняй Украіны пачалі пранікаць групы носьбітаў цэнтральнаеўрапейскіх культур, якія валодалі даволі развітымі формамі земляробства і жывёлагадоўлі, а матэрыяльная культура мела энеалітычныя рысы (ад лац. «энеус» – «медны», калі пры дамінацыі каменных вырабаў ужывалі і медныя).

Першымі пачалі з'яўляцца рухавыя, ваяўнічыя і добра арганізаваныя групы носьбітаў культуры шарападобных амфар. Яны закладалі свае паселішчы на прыбярэжных павышэннях і будавалі там прамавугольныя наземныя жытлы слупавой канструкцыі. У некаторых рэгіёнах ладзілі паўзямлянкі. Насельніцтва культуры шарападобных амфар карысталася разнастайным пласкадонным і, радзей, кругладонным гліняным посудам, сярод якога асабліва характэрныя былі вушастыя амфары з шарападобным тулавам і звужаным горлам. У крамянёвым інвентары тыповымі былі чатырохгранныя зашліфаваныя сякеры і долаты. Вядомыя таксама і вырабы з рога і косці, найперш наканечнікі стрэл і дроцікаў, долаты. Зрэдку ўжываліся дробныя медныя прылады.

Матэрыял з паселішчаў і могільнікаў дазваляе ўявіць некаторыя асаблівасці складанай духоўнай культуры шарападобнікаў. Насельніцтва культуры шарападобных амфар займалася пераважна жывёлагадоўляй. Вядомае яму было таксама земляробства. Існавалі і даўнія гаспадарчыя заняткі – паляванне, рыбацтва і збіральніцтва. Шарападобнікі сталі першымі шахцёрамі на Красносельскіх крамянёвых выпрацоўках на Росі, дзе яны ў крэйдавых адорвенях здабывалі якасную крамянёвую сыравіну. На тэрыторыі Беларусі шарападобнікі былі нешматлікімі. Аднак яны маглі распаўсюджвацца малымі групамі на далёкія адлегласці, пераадольваючы супраціў абарыгенаў.

З сярэдзіны 3-га тыс. да н. э. на тэрыторыю нашай краіны пачынае пранікаць больш шматлікае насельніцтва культур шнуравой керамікі. Насельніцтва з посудам, аздобленым шнуравымі арнаментамі, пачало распаўсюджвацца ў Цэнтральнай і часткова Усходняй Еўропе каля сярэдзіны 3-га тыс. да н. э. На працягу кароткага часу яно распаўсюдзілася ад Германіі да Беларусі, і ад Паўднёвай Скандынавіі да Чэхіі і прадгор'яў Карпат. Усюды на гэтых прасторах сустракаюцца ямныя пахаванні са скурчанымі на баку касцякамі і суправаджальным інвентаром – арнаментаванымі шнуравымі адбіткамі амфарамі і звонападобнымі пасудзінамі, свідраванымі каменнымі баявымі сякерамі лодкападобнай формы. Гэтыя старажытнасці навукоўцы аб'ядноўваюць у так званы агульнаеўрапейскі гарызонт культуры шнуравой керамікі.

Першапачатковыя пранікненні шнуравікоў не праходзілі мірна. На гэта ўказваюць, між іншым, вялікая колькасць баявых сякер у пахаваннях і наканечнікі стрэл у некаторых касцяках. З часам шнуравікі пачалі змешвацца з абарыгенамі, што вяло да распаду іх першапачатковага адзінства. У выніку ўжо праз пару стагоддзяў узнік шэраг асобных культур шнуравой керамікі. У Беларусі гэта была найперш сярэднедняпроўская

культура. Асобныя культуры шнуравікоў сфарміраваліся на Панямонні і Заходнім Палессі.

Калі першыя шнуравікі былі пераважна жывёлаводамі, якія часта перамяшчаліся з месца на месца, то пазней у іхняй гаспадарцы большую ролю пачало адыгрываць земляробства. Месцамі перасяленцы дамінавалі на Падняпроўі; на іншых тэрыторыях, у прыватнасці на Падзвінні, іх прысутнасць была слабейшай. Там працягвалі развівацца мясцовыя позненеалітычныя супольнасці, аднак і яны адчулі моцныя ўплывы з боку шнуравікоў.

На Падзвінні сярэдненеалітычная ўсвяцкая культура ў сярэдзіне 3-га тыс. да н. э. у значнай ступені пад уплывам шнуравікоў пачала трансфармавацца ў позненеалітычную паўночнабеларускую культуру. Яе носьбіты па-ранейшаму карысталіся вастрадонным посудам, майстравалі з крэменю лістападобныя наканечнікі стрэл лясных тыпаў, выраблялі вялікую колькасць касцяных прылад працы і паляўнічай зброі, значную ўвагу ўдзялялі паляванню, рыбалоўству і збіральніцтву. Новым у іх паўсядзённасці стала з'яўленне пласкадоннага посуду, упрыгожанага часам шнуравымі арнаментамі, трохвугольныя наканечнікі стрэл, крамянёвыя сякеры з прышліфаванымі лёзамі, каменныя сякер-кліны і свідраваныя сякеры, нешматлікія медныя вырабы. У гаспадарцы ўсё большае месца займалі земляробства і жывёлагадоўля.

У неаліце працягвалі існаваць і развівацца рэлігійныя вераванні і культы супольнасцей паляўнічых, рыбакоў і збіральнікаў. Існаваў культ звышнатуральных істот, якія маглі спрыяць чалавеку ў штодзённых занятках або шкодзіць яму. З развіццём жывёлагадоўлі і асабліва земляробства пашырыліся культы, звязаныя з верай у жыватворную моц нябесных свяцілаў і агню. У познім неаліце яскрава праявілася суіснаванне традыцыйных (лясных паляўнічых) і новых (земляробчых) культаў. Несумненным з'яўлялася паўсюдная вера ў замагільнае жыццё неалітычнага чалавека. Пахавальныя рытуалы былі разнастайныя, яны мяняліся ў часе і мелі рэгіянальныя асаблівасці.

Пра сацыяльнае ўладкаванне неалітычных жыхароў Беларусі мы ведаем вельмі мала. Важнае значэнне ў родзе і племені займаў мужчына – здабытчык мяса. Асобныя стаянкі маглі належаць канкрэтным калектывам – родам. Скапленні стаянак з падобнай матэрыяльнай культурай, верагодна, акрэслівалі тэрыторыю распаўсюджвання племя і групоўкі роднасных плямён. Паміж племяннымі тэрыторыямі знаходзіліся памежныя слаба заселеныя зоны.

Побыт неалітычнага чалавека вызначаўся даволі высокай ступенню аселасці. Сітуацыя некалькі змянілася ў познім неаліце, з прыходам рухомых носьбітаў культуры шарападобных амфар і культуры ранняга этапу шнура-

вой керамікі, якія не пакінулі пасля сябе паселішчаў. Ведаем мы толькі іх пахаванні, як правіла адзінкавыя, ды невялікую колькасць артэфактаў на помніках неалітычных аўтахтонаў.

Каменны век – дзяцінства чалавецтва, эпоха, калі закладваліся і фарміраваліся падмуркі яго далейшага развіцця. Дасягненнямі каменнага веку сталі: здабыванне і выкарыстанне агню, шыццё скураной, а затым і тэкстыльнай вопраткі, абутку, будаванне жытлаў і арганізацыя іх у паселішчы, авалоданне керамічнай вытворчасцю, зараджэнне і развіццё земляробства і жывёлагадоўлі, горназдабыўная справа, у тым ліку здабыча крэменю шахтавым спосабам.

## ПЛЯМЁНЫ БЕЛАРУСІ Ў БРОНЗАВЫМ ВЕКУ

У пачатку 2-га тыс. да н. э. на тэрыторыі Беларусі наступіў бронзавы век – эпоха ў гісторыі першабытнага грамадства, калі ва ўжытку распаўсюджваюцца вырабы з бронзы (сплаў медзі з волавам або іншымі металамі).

Бронзавы век Беларусі мае свае асаблівасці, звязаныя найперш з аддаленасцю нашай тэрыторыі ад цэнтраў старажытнай металургіі, самыя вядомыя з якіх існавалі ў Карпацкім, Балканскім і Каўказскім рэгіёнах. Медных і бронзавых вырабаў у Беларусь трапляла мала, і цаніліся яны вельмі высока. Гэта былі пераважна ўпрыгожанні, сустракаліся таксама сякеры, наканечнікі коп’яў, нажы, шылы, зрэдку нават мячы. Пераважная ж большасць прылад працы і зброі па-ранейшаму выраблялася з крэменю.

На нашай тэрыторыі эпоха бронзы працягвалася крыху больш чым тысячагоддзе – па VII ст. да н. э. на поўдні краіны, калі мясцовае насельніцтва авалодала сакрэтамі здабычы жалеза з балотнай руды. На поўначы Беларусі працэс пераходу ад бронзавага веку да жалезнага запазніўся і прыпаў прыкладна на сярэдзіну 1-га тыс. да н. э.

Выкарыстанне металаў прывяло да паскоранага развіцця гаспадаркі, матэрыяльнай і духоўнай культуры, сацыяльных адносін у грамадстве. Аднак традыцыйныя формы гаспадаркі захоўвалі перавагу на працягу ўсяго перыяду.

Як правіла, бронзавы век Беларусі падзяляюць на ранні (XIX–XIV стст. да н. э.), сярэдні (XV–XI стст. да н. э.) і позні (X–VIII/V стст. да н. э.) перыяды. Век металу на Беларусі распачаўся з часу з’яўлення ва ўжытку насельніцтва позніх культур шнуравой керамікі і мясцовых постнеалітычных супольнасцей бронзавых вырабаў.

Сярэднедняпроўская культура сфарміравалася на невялікай тэрыторыі правабярэжжа Сярэдняга Падняпроўя. З’яўляючыся ў сваёй аснове

шнуравой, яна ўвабрала ў сябе элементы культур шарападобных амфар, суседніх жыхароў стэпу і лесастэпу, а таксама нашчадкаў мясцовага позненеалітычнага насельніцтва. Набраўшы моц на цяперашняй Кіеўшчыне, сярэднедняпроўцы пачалі экспансію на суседнія тэрыторыі. У сярэдзіне 3-га тыс. да н. э. адбылося пранікненне на паўднёвы ўсход Беларусі. У пачатку 2-га тыс. да н. э. гэтае насельніцтва пачало выкарыстоўваць бронзавыя вырабы.

Сярэднедняпроўцы карысталіся гліняным пласкадонным, а часам акругладонным посудам, як кухонным, так і сталовым. Сярод арнаментаў, утвораных пераважна шнуравымі адбіткамі і нарэзкамі, асабліва характэрнымі былі паясы са спалучаных трохвугольнікаў. Сярэднедняпроўцы ўжывалі разнастайныя крамянёвыя прылады працы і зброю. Для іх былі характэрнымі трохвугольныя баявыя і паляўнічыя лістападобныя наканечнікі стрэл. Даволі шырокае распаўсюджванне набылі каменныя вырабы. У якасці матэрыялу выкарыстоўваліся таксама косці і рогі. Меднымі і бронзавымі былі ўпрыгожанні, наканечнікі коп'яў, сякеры, кінжалы. Сваіх памерлых сярэднедняпроўцы хавалі ў магільных ямах, пераважна ў скручаным стане. Даволі часта над пахаваннем насыпаўся курган.

Галоўнымі гаспадарчымі заняткамі сярэднедняпроўцаў з'яўляліся земляробства і жывёлагадоўля, хоць яны практыкавалі і больш традыцыйныя паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Сярэднедняпроўцы атрымоўвалі гатовыя металічныя вырабы не толькі шляхам абмену або гандлю з суседнімі тэрыторыямі, але і самі займаліся бронзаліцейнай справай.

У пачатку 2-га тыс. да н. э. бронзавы век распачаўся і на іншых тэрыторыях Беларусі, дзе непасрэдна рассяляліся шнуравікі або дзе яны аказвалі ўплыў на аўтахтонаў, – у басейнах Верхняй Прыпяці і Нёмана. Свайго росквіту ў эпоху бронзы дасягнулі плямёны паўночнабеларускай культуры, якія ўспрымалі ўплывы з боку суседзяў, найперш шнуравікоў. Развіццё мясцовага земляробства і жывёлагадоўлі пры далейшай эксплуатацыі асяроддзя ранейшымі прысваяльнымі спосабамі садзейнічала адчувальнаму паскарэнню прыросту насельніцтва. У выніку яно пачало асвойваць новыя ўчасткі азёрных і рачных узбярэжжаў, пашырала межы старых паселішчаў.

У кераміцы распаўсюджваліся пласкадонныя пасудзіны, якія паступова замянялі вастрадонныя формы. Сярод крамянёвых вырабаў з'явіліся трохвугольныя шыпастыя наканечнікі стрэл, серпападобныя нажы і шліфаваныя сякеры. Пачалі выкарыстоўвацца каменныя сякеры-кліны, сякеры і матыкі з прасвідраванымі адтулінамі. Майстраваліся тыповыя для бронзавага веку касцяныя вырабы, найперш наканечнікі дроцікаў з фрагментаў трубчастых костак.

Пры захаванні традыцый вераванняў і мастацтва лясной зоны распаўсюджваліся і новыя – характэрныя для жывёлаводаў і земляробаў.

У канцы існавання супольнасцей культур шнуравікоў, недзе ў XVI ст. да н. э., на паўднёвы ўсход Беларусі пачалі пранікаць невялікія групы носьбітаў культуры шматвалікавай керамікі. Плямёны гэтай культуры ў другой чвэрці 2-га тыс. да н. э. займалі стэпы і лесастэпы Паўночнага Прычарнамор'я. Яны жылі на даволі доўгачасовых паселішчах, а галоўнай галіной гаспадаркі мелі жывёлагадоўлю. Для іх быў характэрны ляпны гладкасценны посуд з наляпнымі валікамі, кароткія свідраваныя сякеры, трохвугольныя наканечнікі стрэл з чаранком, бронзавыя кінжалы.

Да сярэдзіны 2-га тыс. да н. э. складаныя этнакультурныя працэсы, якія адбываліся цягам мінулых стагоддзяў, выкліканыя інвазіяй шнуравікоў і паступовым іх змешваннем з аўтахтонамі, у цэлым завяршыліся. Наступіў сярэдні перыяд бронзавага веку. У гэты час Паўднёвая і Сярэдняя Беларусь увайшла ў вобласць культур «тшцінецкага кола», якую падзяляюць на заходнетшцінецкую і ўсходнетшцінецкую. У арэале апошняй вылучаюць сосніцкую групу.

Плямёны заходнетшцінецкай культуры займалі Сярэдняе і Верхняе Павісленне ў Польшчы і Пабужжа, а таксама Заходнюю Беларусь. Насельніцтва, якое пакінула пасля сябе помнікі сосніцкага тыпу, рассялялася ў асноўным на Падняпроўі паміж Кіевам і Магілёвам, на Ніжняй Прыпяці. Лічыцца, што тшцінецкая культура сфарміравалася на аснове культуры позніх шнуравікоў і нашчадкаў мясцовага позненеалітычнага насельніцтва, пры ўплыве некаторых іншых культурных элементаў.

На тэрыторыі Беларусі найбольшае скапленне тшцінецкіх паселішчаў і могільнікаў знаходзіцца ў яе паўднёвай частцы. Аднак матэрыялы гэтай культуры сустракаюцца і паўночней – уключаючы правабярэжжа Нёмана і Паўднёва-Заходнюю Літву. Тшцінецкія элементы заўважаюцца нават на Падзвінні, у старажытнасцях паўночнабеларускай культуры.

Некаторыя тшцінецкія паселішчы мелі вялікія памеры. Жытламі былі паўзямлянкі, вядомы таксама наземныя прамавугольныя жытлы на слупах, з плеценымі і абмазанымі глінай або складзенымі з невялікага бярвення сценамі.

Сваіх памерлых жыхары тшцінецкіх паселішчаў хавалі на курганных і плоскіх могільніках, пераважна ў ямах, па абрадзе трупапакладання і трупаспалення. Нябожчыкаў суправаджаў пахавальны інвентар – найчасцей з посуду, прылад працы, зброі, упрыгожанняў.

Матэрыяльная культура тшцінецкага насельніцтва тыповая для сярэдняга этапу бронзавага веку. Асноўнай формай іхняга глінянага посуду былі

гладкасценныя высокія гаршкі цюльпанападобнай формы з патоўшчаным краем венцаў. Выкарыстоўвалі таксама слоікі, кубкі, міскі, дуршлякі-цадзілкі. Посуд аздабляўся пераважна баразёнкамі і адбіткамі тонкага ружанца. Апошні часцей сустракаўся ў зоне сосніцкіх помнікаў. На захадзе тшцінецка-сосніцкага арэалу даволі шырока былі распаўсюджаны розныя наляпныя валікі, гузы і нават вушкі.

У сярэднебронзавы час медных вырабаў стала больш, але ў асноўным гэта былі ўпрыгожанні – бранзалеты, простыя шпількі са шчыткамі або спіралепадобнымі галоўкамі, запінкі-фібулы, кольцы, падвескі. Меднай зброі было мала. Сярод крамянёвых вырабаў найбольш характэрны вузкачаранковыя наканечнікі стрэл з трохвугольным або кароткім лістападобным пяром і вялікія сярпы з заглянцаванымі ад ужытку лёзамі. Вядомы былі і кароткія рамбічныя каменныя сякеры з абушкамі з прасвідраванымі адтулінамі. Мяркуючы па знаходках, насельніцтва тшцінецкіх паселішчаў аддавала перавагу жывёлагадоўлі, слядоў земляробства захавалася менш.

У сярэдні перыяд бронзавага веку працягвала развівацца паўночнабеларуская культура. У карыстанні яе носьбітаў была пласкадонная кераміка, арнаменты на якой пераносіліся на верхнія часткі пасудзін. Распаўсюджваліся, хоць і ў вельмі малой колькасці, бронзавыя вырабы – шылы і плоскія сякеры.

Позні перыяд бронзавага веку Беларусі даследаваны слаба. Вядома толькі, што на паўднёвым усходзе краіны тшцінецкая культура трансфармавалася ў лебядоўскую. Носьбіты апошняй жылі на невялікіх паселішчах, а памерлых хавалі па абрадзе крэмацыі пад невялікімі курганнымі насыпамі. Цюльпанападобны посуд па форме, тэхналогіі і некаторых элементах арнаментацыі ўказвае на тшцінецкія вытокі. Гэта ж можна сказаць і пра некаторыя прылады працы. На Беларускім Панямонні і ў басейне Віліі пачала складвацца культура штрыхаванай керамікі. На Падзвінні фарміравалася днепра-дзвінская культура з гладкай керамікай.

Большасць прылад працы і зброі і ў бронзавым веку на тэрыторыі Беларусі выраблялася з крэменю, рога, косці і дрэва. Аднак паступова адбываўся заняпад крэменеапрацоўкі. У канцы вызначанага перыяду колькасць і асартымент крамянёвых вырабаў змяншаецца, назіраецца неахайнасць у іх апрацоўцы, выпадковасць форм.

У новую эпоху назіраўся росквіт апрацоўкі некрамянёвых гатункаў каменя. У штодзённай працы шырока выкарыстоўваліся плоскія сякеры-кліны, а на поўначы Беларусі былі вядомы і плоскія чаранковыя сякеры. Асаблівую ўвагу выклікаюць каменныя сякеры з зашліфаванымі паверхнямі

і прасвідраванымі адтулінамі пад тапарышчы. З каменю выраблялі шліфавальныя пліты, зерняцёркі, грузілы для сетак, ліцейныя формы.

У бронзавым веку на тэрыторыі Беларусі працягваў існаваць першабытнаабшчынны лад, аднак развіццё земляробства і жывёлагадоўлі, пачатак апрацоўкі металаў, далейшае распаўсюджванне абмену выклікалі значныя змены ў грамадскім жыцці, якія выявіліся ў першую чаргу ў станаўленні патрыярхальных адносін у родзе, у парушэнні былой маёмаснай роўнасці, у накапленні асобнымі родамі адноснага багацця.

У адпаведнасці з развіццём гаспадарчых заняткаў на першае месца ў сям'і выйшаў мужчына, што адлюстроўваецца ў археалагічных матэрыялах. Так, на могільніках бронзавага веку мужчынскія пахаванні звычайна займалі цэнтральнае, лепшае месца, часта яны мелі і багацейшы інвентар.

З узнікненнем і ўмацаваннем прыватнай уласнасці ўзнікла і маёмасная няроўнасць – беднасць і багацце, якія суседнічалі ўнутры родаў. Сфарміраваліся дамінуючыя роды, якія вылучаліся адносным багаццем. З іх ліку часцей выбіраліся правадыры на час узброеных канфліктаў. Найбольш яскрава маёмасная няроўнасць адлюстроўваецца ў пахаваннях.

Са з'яўленнем металічных вырабаў пачаўся больш рэгулярны міжплемянны абмен. Аб'ектамі гандлю з'яўляліся медзь, бронза, бурштын, высакаякасны крэмень. У бронзавым веку ўзброеныя сутыкненні сталі часцейшымі, перарастаючымі ў шматгадовыя войны. Цяпер, апрача багатых дзічынай лясоў і балот, рыбных вадаёмаў, імкнуліся захапіць і ўрадлівейшыя землі, травяністыя пашы, багатыя сыравінай радовішчы, гандлёвыя шляхі. Імкнуліся завалодаць і суседскай маёмасцю.

Рэлігія ў бронзавым веку, як і ва ўсе першабытныя часы, грунтавалася на анімізме – веры ў духаў і душы, волі якіх нібыта падлягаюць усе навакольныя прадметы і з'явы. Важнае месца ў такіх уяўленнях займаў культ продкаў. Найбольш яскрава гэта праяўлялася ў пахавальных абрадах. Пра існаванне культу продкаў сведчаць не толькі пахаванні, але і выявы людзей на кераміцы, статуэткі.

Земляробства і жывёлагадоўля паспрыялі ўзнікненню культу Сонца як вярхоўнага боства, якому падуладна ўсё існае, у тым ліку і розныя меншыя боствы і духі. Ад культу Сонца быў неадрыўны і культ агню, як зямнога ўвасаблення нябеснага свяціла. З узнікненнем рэлігійных вераванняў з'явіліся і асобы, якія прафесійна абслугоўвалі культы, – святары-шаманы. Вядомы нават шаманскія пахаванні. Пра афармленне рэлігіі ў бронзавым веку як пра складаную сістэму паняццяў і рытуалаў сведчаць і знаходкі спецыяльных культавых збудаванняў.

З уяўленнем пра ачышчальную і жыватворную сілу агню звязаны звычай спальваць нябожчыкаў. На тэрыторыі Беларусі ён стаў вядомы яшчэ ў канцы існавання сярэднедняпроўскай культуры, а ў сярэдняй бронзе пашырыўся сярод плямён тшцінецкай і роднасных ёй культур. Магчыма, распаўсюджванне абраду трупаспальвання на такіх велізарных тэрыторыях сведчыць аб узнікненні першай сусветнай рэлігіі сонцапаклоннікаў. У бронзавым веку працягвала існаваць і вера ў роднасную сувязь людзей з пэўнымі відамі жывёл і раслін – татэмізм. Рэлігійныя і мастацкія погляды перыяду бронзавага веку адлюстроўваюцца ў арнаментацыі керамічных начынняў, дробнай пластыцы – падвесках, пацерках, амулетах, аздобах адзення.

Ужо ў сярэдні перыяд неалітычнай эпохі колішняя адносная этнакультурная блізкасць на тэрыторыі Беларусі была перарвана пранікненнямі іншакультурнага насельніцтва. На захадзе з'явіліся перасяленцы з Павіслення і Пабужжа «польскага ляснога неаліту», на поўначы – плямёны прыбалтыйскай культуры. Наступнае распаўсюджванне ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, у тым ліку і на ўсёй тэрыторыі Беларусі, энеалітычнага насельніцтва шарападобнікаў, і асабліва шнуравікоў, пачало аднаўляць гэта адзінства. Яно ўмацавалася ў ранні перыяд бронзавага веку, калі завяршыўся працэс узаемаасіміляцыі груп носьбітаў культур шнуравой керамікі і позненеалітычных аўтахтонаў. У гэты час на тэрыторыі Паўднёва-Усходняй Прыбалтыкі, Беларусі, Паўночнай Украіны, Цэнтральна-Усходняй Польшчы і ў Волга-Окскім рэгіёне Расіі сфарміраваўся шэраг так званых эпішнуравых культур. Паміж плямёнамі, што засялялі адзначаныя тэрыторыі, падтрымліваліся культурныя і гаспадарчыя сувязі.

Фарміраванне ў сярэдні перыяд бронзавага веку тшцінецка-сосніцка-мароўскай супольнасці культур зноў падзяліла Беларусь на дзве зоны – паўночную і паўднёвую. На Панямонні, Падзвінні і ў басейне Віліі ў канцы бронзавага веку пачалі складвацца супольнасці культур шнуравой керамікі і днепра-дзвінскай, асноўнае развіццё якіх прыпадае на жалезны век. Іх этнічная прыналежнасць вызначаецца як балцкая.

На поўдні Беларусі назіралася больш складаная сітуацыя. Частка даследчыкаў схільна шукаць сярод тшцінецкага насельніцтва праславян. У значнай ступені на тшцінецка-сосніцкай аснове сфарміравалася лебядоўская супольнасць познебронзавага часу, якая перарасла ў мілаградскую культуру жалезнага веку. Апошнюю інтэрпрэтуюць як балцкую або славянскую, а некаторыя адносяць да нявызначанай этнічнай групоўкі.

У бронзавым веку на тэрыторыі Беларусі...

- яшчэ захоўваліся традыцыйныя формы гаспадарання – паляванне, рыбацтва і збіральніцтва; важную ролю адыгрывалі крамянёвыя вырабы;

- распаўсюджваліся новыя, вытворчыя формы гаспадарання – земляробства і жывёлагадоўля, а на поўдні краіны яны паступова станавіліся дамінуючымі; медныя і бронзавыя вырабы; пласкадонны посуд, формы якога набылі разнастайнасць; пахавальны абрад трупаспалення;
- важнае гаспадарчае і сацыяльнае значэнне набылі каменныя шліфаваныя вырабы;
- транспартныя сродкі дапоўніліся колавымі;
- у духоўнай культуры да традыцыйных вераванняў паляўнічых дадаліся вераванні, звязаныя з земляробчымі культамі плоднасці і з салярнымі культамі;
- у мастацтве, якое па-ранейшаму з'яўлялася ў асноўным эстэтычным адлюстраваннем рэлігіі, адбываўся росквіт арнаментальнай абстракцыі;
- у выніку складаных этнакультурных пераўтварэнняў да канца бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі сфарміраваліся супольнасці прабалтаў і, магчыма, праславян.

# 3 ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ЖАЛЕЗНЫМ ВЕКУ

- **Археалагічная карта Беларусі**
- **Этнічная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі ў жалезным веку**
- **Асноўныя віды гаспадарчай дзейнасці**
- **Абмен і культурныя сувязі**
- **Грамадскі лад**
- **Генезіс усходнеславянскіх плямён і шляхі іх рассялення на тэрыторыі Беларусі**

## АРХЕАЛАГІЧНАЯ КАРТА БЕЛАРУСІ

Пачатак жалезнага веку адносіцца да таго часу, калі людзі навучыліся здабываць жалеза з руды. На тэрыторыі Беларусі гэта адбылося не раней за VII ст. да н. э. У старажытнасці жалеза здабывалі з бурых жалезнякоў, але часцей за ўсё – з балотных, азёрных, лугавых і іншых руд. Шырокаму распаўсюджванню чорнай металургіі спрыялі два фактары: з аднаго боку, практычна паўсюднае распаўсюджванне руд, якія змяшчаюць вокісы жалеза, а з іншага – даўнія традыцыі каляровай металургіі.

У жалезным веку на тэрыторыі Беларусі досыць выразна выявілася нераўнамернасць сацыяльна-эканамічнага развіцця асобных рэгіёнаў. Першымі, хто пазнаёміўся з чорнай металургіяй і ўкараніў яе і металаапрацоўку, былі плямёны паўднёвых абласцей, у прыватнасці носьбіты мілаградскай культуры, якія з VII ст. да н. э. мелі цесны кантакт з лесастэпавымі скіфамі. Мяркуючы па знаходках прылад працы і зброі, аналагічных скіфскім, менавіта яны перадалі сваім паўночным суседзям тэхналагічныя навыкі «варэння»

і апрацоўкі жалеза. Што да цэнтральных, а тым больш паўночных раёнаў Беларусі, то там першыя жалезныя вырабы не могуць быць датаваны раней за V–IV стст. да н. э. Гэта адзінкавыя знаходкі клінаватых вушных сякер, таксама супастаўныя са скіфскімі. Уласная чорная металургія ў гэтых месцах пачалася не раней за канец 1-га тыс. да н. э. Дагэтуль тут дамінавалі касцяная і каменная вытворчасці, характэрныя для эпохі бронзы.

Храналагічныя рамкі класічнага жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі ахопліваюць час ад VII ст. да н. э. да сярэдзіны V ст. н. э. Перыяд V–VII стст. н. э. даследчыкі адносяць да позняга жалезнага веку.

Археалагічная карта Беларусі ў эпоху жалезнага веку адрозніваецца вялікай разнастайнасцю этнакультурных груповак. На поўначы краіны сацыяльна-эканамічнае развіццё ішло павольнейшымі тэмпамі. Там эпоха бронзы працягвалася да мяжы нашай эры. Адной з такіх культур была культура ранняй штрыхаванай керамікі. Яна займала Паўночна-Усходнюю Літву, Паўднёва-Усходнюю Латвію, Паўночна-Заходнюю і часткова Цэнтральную Беларусь. Яе фарміраванне адносіцца да апошняй чвэрці 2-га тыс. да н. э., а заняпад – да пачатку нашай эры. Асаблівасць культуры заключаецца ў тым, што яна вядомая толькі па селішчах. Пахавальныя помнікі дагэтуль не выяўлены.

Асноўным тыпам паселішчаў былі гарадзішчы. Яны ставіліся, як правіла, на асобных узгорках-астанцах. Жылыя пабудовы размяшчаліся па перыметры пляцоўкі. Цэнтральная частка звычайна заставалася незабудаванай і выкарыстоўвалася для ўтрымання скаціны, культавых і грамадскіх мерапрыемстваў. Жылыя будовы былі наземнымі шматкамернымі або аднакамернымі слупавой канструкцыі. Яны ацяпляліся агменямі, выкладзенымі з каменя ці гліны.

Посуд культуры ранняй штрыхаванай керамікі прадстаўлены слоікавымі і слабапрафіляванымі гаршкамі, пакрытымі бессістэмнай штрыхоўкай ад верху да дна. Арнаментацыя – бедная, складаецца з ямачных уцісканняў, якія наносіліся на шыйку пасудзіны.

Большасць прылад працы выраблялі з каменю і косці. Да каменных вырабаў адносяцца клінападобныя і свідраваныя сякеры, зерняцёркі і пясты. Знаходкі з косці разнастайней. Прылады працы прадстаўлены праколкамі, долатамі, нажамі, тупікамі, іголкамі і інш. Значная частка знаходак характарызуе зброю: розныя па форме наканечнікі стрэл, утулкавыя дзіды з касым зрэзам або са штучна нададзенай формай пяра, якія імітуюць бронзавыя наканечнікі дзід прадлужыцкай і лужыцкай культур. Сустракаюцца таксама касцяныя гарпуны і рыбалоўныя кручкі. З костак выраблялі ручкі. Вялікай разнастайнасцю адрозніваюцца касцяныя шпількі. З іх асаблівую цікавасць

уяўляюць асобнікі з навершам у выглядзе цвіка і вушкам на іголцы. Яны, як і дзіды, імітуюць бронзавыя шпількі прадлужыцкай і лужыцкай культур, якія былі распаўсюджаны ў 1400–1200 гг. да н. э. Косць служыла сыравінай і для вырабу ўпрыгожанняў: падвесак, кудменяў, пацерак.

Знаходкі з бронзы рэдкія: шпілька і арнаментаваныя бранзалеты з гарадзішча Наркунай, іголка і скроневае кальцо з гарадзішча Рацюнкі. Нягледзячы на адсутнасць уласных крыніц сыравіны, бронзаліцейная справа атрымала распаўсюджванне ў большасці паселішчаў. Рэшткі вытворчасці бронзавых вырабаў у выглядзе тыгляў, льячак, радзей ліцейных форм выяўлены на шматлікіх гарадзішчах.

На змену культуры ранняй штрыхаванай керамікі прыходзіць культура позняй штрыхаванай керамікі, якая існавала ў другой палове I ст. да н. э. – сярэдзіне V ст. н. э. Яна вядома выключна па паселішчах. Нягледзячы на тое, што культура позняй штрыхаванай керамікі склалася галоўным чынам на базе ранняй, паміж імі існуе шэраг прынцыповых адрозненняў. Культура позняй штрыхаванай керамікі займала шырэйшую тэрыторыю. Яе арэал уключаў Усходнюю Літву, Паўднёва-Усходнюю Латвію, Цэнтральную і Паўночна-Заходнюю Беларусь.

Асноўным тыпам паселішчаў былі гарадзішчы. Іх тапаграфія характарызуецца значнай разнастайнасцю ў параўнанні з культурай ранняй штрыхаванай керамікі. У паўночнай частцы арэала яны па-ранейшаму ўладкоўваліся на ўзгорках-астанцах, аднак мелі больш магутную сістэму абароны. У Цэнтральнай Беларусі для паселішча выкарыстоўваліся і мысы пры зліцці дзвюх рэк. З напольнага боку пляцоўка такіх гарадзішчаў была абаронена адной ці дзвюма лініямі валоў і равоў. У Паўночным Палессі вядомы прыклады, калі носьбіты культуры позняй штрыхаванай керамікі займалі гарадзішчы мілаградскай культуры. Адзначаны таксама выпадкі, калі паселішчы размяшчаліся на высокім карэнным беразе ракі. У іх напольны бок абаронены валам і ровам, а бок, звернуты да ракі, абнесены драўлянай сцяной.

Жылыя пабудовы культуры позняй штрыхаванай керамікі адрозніваюцца разнастайнасцю тыпаў. Як і ў культуры ранняй штрыхаванай керамікі, дамінуюць шматкамерныя пабудовы слупавой канструкцыі. На гарадзішчы Малышкі кожнае жытло падзялялася на чатыры пакоі, якія ацяпляліся агменем, складзеным з камянёў і гліны. Яшчэ адна шматкамерная пабудова, выяўленая на гарадзішчы Вязынка, была падзелена на тры секцыі і мела зрубную канструкцыю сцен. У паўднёвых раёнах культуры зафіксаваны зрубныя паўзямлянкі, з'яўленне якіх у азначанай мясцовасці тлумачыцца ўплывам зарубінецкай культуры.

Асноўнай формай посуду былі рабрыстыя гаршкі. У іх звычайна верх да рабра загладжаны, а ніз пакрыты вертыкальнай ці дыяганальнай штрыхоўкай. Арнаментацыя больш разнастайная. Вельмі папулярнымі былі гарызантальныя ці вертыкальныя пальцавыя зашчыпы і ямачныя ўціскanні, якія размяшчаліся на рабры. Сустракаюцца таксама насечкі, наразныя лініі.

У культуры дамінавалі вырабы з жалеза. На змену каменным сякерам і бронзавым кельтам прыйшлі жалезныя кельты. Частымі знаходкамі з'яўляюцца сярпы, нажы, шылы.

Змяніўся характар зброі. Наканечнікаў стрэл практычна няма. Пануе зброя блізкага бою: жалезныя ўтулкавыя наканечнікі дзід і ўтулкавыя двухшыпныя дроцікі. Унікальнай знаходкай з'яўляецца багата арнаментаваная касцяная ручка ад кінжала з гарадзішча Івань. На шматлікіх гарадзішчах вядомы жалезныя шпоры з загнутымі кручкамі.

Дэталі адзення і ўпрыгожанні разнастайныя. Фібулы сустракаюцца параўнальна рэдка. Найбольш раннія асобнікі адносяцца да ліку познелатэнскіх. Паступова іх змянілі правінцыйнарымскія тыпы. Адно з самых позніх датаванняў мае падковападобная фібула з эмалямі з гарадзішча Малышкі. Найбольш прадстаўнічую серыю прадметаў імпарту рымскага часу складаюць спражкі. Унікальнай з'яўляецца знаходка бронзавага наканечніка пояса з гарадзішча Зазоны з крыжападобным паглыбленнем у дыску, запоўненым чырвонай эмаллю. Датуецца ён 200–260 гг. н. э.

Шырокае распаўсюджванне ў носьбітаў культуры мелі жалезныя кіепадобныя шпількі. Упрыгожанні прадстаўлены падвескамі розных форм, кольцамі, бранзалетамі, кудменямі.

Разнастайнымі з'яўляюцца вырабы з гліны. Сярод іх найбольш выразныя – прасліцы з арнаментацыяй рознага выгляду. Звычайныя на селішчах грузікі дзякаўскага тыпу, плоскія грузілы для рыбалоўных сетак, абломкі льячак, тыгляў, радзей ліцейных форм. Знаходкі з каменю рэдкія. Гэта зерняцёркі, зробленыя з буйных валуноў, і асялкі.

Усходнім суседам культур штрыхаванай керамікі была днепра-дзвінская культура. Яе арэал уключаў Верхняе Падняпроўе прыкладна да Магілёва і вялікую частку басейна Заходняй Дзвіны. Яна сінхронная культурам штрыхаванай керамікі. Яе раннія селішчы ўзнікаюць у канцы 2-га тыс. да н. э., а фінал культуры прыпадае на першыя стагоддзі новай эры.

Як і культуры штрыхаванай керамікі, днепра-дзвінская культура вядома толькі па паселішчах, пераважным тыпам якіх былі гарадзішчы. У Падзвінні яны часцей размяшчаліся на ўзгорках, у Падняпроўі – на рачных мысах. Найбольш раннія гарадзішчы штучных земляных умацаванняў не мелі. У самым канцы 1-га тыс. да н. э. – пачатку 1-га тыс. н. э. з'яўляюцца добра ўмацаваныя гарадзішчы са складанай сістэмай валоў і равоў.

Асноўным тыпам жылой пабудовы ў 1-м тыс. да н. э. быў наземны шматкамерны дом слупавой канструкцыі. З мяжы нашай эры з'яўляюцца аднакамерныя пабудовы слупавой канструкцыі. У беларускім арэале культуры яны ацяпляліся агменямі, аконтуранымі камянямі ці глінянымі валікамі. У Верхнім Падняпроўі агмені былі цалкам выкладзены з камянёў, шчыльна прыгнаных адзін да аднаго.

На гарадзішчах культуры ў Смаленскім Падняпроўі былі адкрыты паганскія свяцілішчы, якія размяшчаліся ў цэнтральнай частцы. Гэта круглыя пляцоўкі дыяметрам да шасці метраў, аконтураныя канаўкай, у якой захаваліся ямы ад слупоў. У самым цэнтры пляцоўкі, відаць, устанаўліваўся ідал. Адно з такіх свяцілішчаў адкрыта і ў Беларускім Падняпроўі на гарадзішчы Карабановічы.

Посуд днепра-дзвінскай культуры гладкасценны. Ён прадстаўлены гаршкамі слоікавай і слабапрафіляванай формы. Посуд арнаментаваны скразнымі адтулінамі, ямачнымі ўцісканнямі, радзей – прачэрчанымі лініямі.

У 1-м тыс. да н. э. і ў гэтай культуры дамінавалі каменныя і касцяныя вырабы. Апошнія прадстаўлены лёзамі, долатамі, праколкамі, тупікамі, ручкамі, разнастайнымі наканечнікамі стрэл, дзідамі, шпількамі, кудменямі з зубоў жывёл. Параўнальна шматлікую групу складаюць клінаватыя сякеры. Радзей сустракаюцца свідраваныя сякеры і зерняцёркі.

Першыя жалезныя вырабы ў днепра-дзвінскай культуры з'явіліся раней, чым у культурах штрыхаванай керамікі. Да іх адносяцца клінаватыя вушныя сякеры, якія маюць аналогіі сярод скіфскіх старажытнасцей VI–IV стст. да н. э. У першых стагоддзях нашай эры з'яўляюцца сякеры паўднёвабалтыйскага тыпу.

Шырокае распаўсюджванне чорнай металургіі і металаапрацоўкі пачынаецца толькі ў канцы 1-га тыс. да н. э. Звяртаюць на сябе ўвагу сярпы з выгнутым пад прамым вуглом лязом. Аналагаў ім у іншых культурах няма, і гэта дазваляе лічыць падобныя сярпы адной з характэрных рыс культуры. Разам з імі сустракаюцца сярпы і жніўныя нажы звычайнай формы. Сярод жалезных прылад працы вялікія серыі складаюць таксама нажы і шылы.

Жалезная зброя, як і ў культуры позняй штрыхаванай керамікі, прадстаўлена галоўным чынам утулкавымі наканечнікамі дзід і двухшыпнымі дроцікамі. Акрамя таго, зрэдку сустракаюцца і наканечнікі стрэл.

Частымі знаходкамі на паселішчах з'яўляюцца жалезныя кіепадобныя шпількі, разнастайныя ўпрыгожанні, якія выраблялі з бронзы і жалеза (ручныя і нажныя бранзалеты, пярсцёнкі, падвескі). Знойдзена параўнальна шмат бранзалетаў латэнскіх тыпаў.

Сярод гліняных вырабаў дамінуюць грузікі дзякаўскага тыпу. Праслiцы сустракаюцца вельмі рэдка. Яны характэрны для беларускага басейна

Заходняй Дзвіны. Іх форма і арнамент ідэнтычныя прасліцам культуры позняй штрыхаванай керамікі.

Найбольш складанае і нестабільнае становішча склалася ў басейне Прыпяці і паўднёвай частцы Беларускага Падняпроўя. Тут у VII–III стст. да н. э. пражывалі плямёны мілаградскай культуры. Для іх характэрны пераважна гарадзішчы. У носьбітаў гэтай культуры існавалі тыповыя пабудовы двух відаў. Найбольш выразнай была паўзямлянка слупавой канструкцыі з характэрным выступам у адным з кутоў. Ацяплялася падобнае жыллё адкрытым вогнішчам. У Верхнім Падняпроўі побач з паўзямлянкамі існавалі і наземныя аднакамерныя пабудовы слупавой канструкцыі, для якіх знаходзіўся характэрны агмень, выкладзены з камянёў у адным з кутоў.

Разнастайным з'яўляўся пахавальны абрад носьбітаў мілаградскай культуры. У VII–VI стст. да н. э. у басейне р. Гарыні яны хавалі сваіх памерлых у курганах па абрадзе інгумацыі. У пахаваннях (у курганах) выкарыстоўваліся разнастайныя канструкцыі, а пахавальны інвентар адрозніваўся значнай варыятыўнасцю. Выяўлены параўнальна багатыя курганы, ёсць практычна безынвентарныя, што сведчыць, прынамсі, пра маёмаснае расслаенне грамадства. У IV–III стст. да н. э. у Верхнім Падняпроўі з'яўляецца абрад крэмацыі. Разам з тым нябожчыкаў хавалі ў звычайных ямах, а пахавальны інвентар, за выключэннем двух-трох чарапкоў ад пабітых пасудзін, адсутнічаў.

Найбольш яркай рысай матэрыяльнай культуры мілаградскіх плямён з'яўляецца гліняны посуд. Ён зусім не тыповы для жалезнага веку. У той час, калі ў іншых плямён ён быў ужо стабільна пласкадонны, мілаградцы выкарыстоўвалі пасудзіны з акруглым дном. Верхняя частка гэтых гаршкоў была ўпрыгожана ямачнымі ўціскannямі, насечкамі, «жамчужным» арнаментам.

З моманту зараджэння культуры ў ёй дамінавалі жалезныя вырабы: вушныя сякеры, матыкі для апрацоўкі глебы, сярпы з кручкамі на пятцы, нажы з «гарбатай» спінкай. Спецыфічнай з'яўляецца зброя гэтых плямён. У іх былі распаўсюджаны жалезныя наканечнікі стрэл рознай канфігурацыі. Разам з тым выкарыстоўваліся жалезныя наканечнікі дзід і бронзавыя наканечнікі стрэл скіфскіх узораў. Вельмі разнастайныя ўпрыгожанні і дэталі адзення, зробленыя, як правіла, з бронзы. Гэта шпількі кіепадобнай формы, завушніцы, разнастайныя падвескі, пярсцёнкі і бранзалеты. Адмысловую групу ўпрыгожанняў складаюць срэбныя і бронзавыя бранзалеты, запазычаныя ў кельцкіх плямён.

На мяжы III–II стст. да н. э. мілаградскую культуру змяніла зарубінецкая, якая на тэрыторыі Беларусі займала прыкладна той жа арэал. Для яе былі характэрны галоўным чынам неўмацаваныя паселішчы, найбольш

тыповыя для Палесся. У Верхнім Падняпроўі носьбіты зарубінецкай культуры пражывалі і на гарадзішчах. Аднак сваіх умацаванняў яны не ўзводзілі, займаючы існыя мілаградскія гарадзішчы і праводзячы мадэрнізацыю сістэмы ўмацаванняў. На Палессі галоўным чынам зарубінецкія плямёны будавалі зрубныя паўзямлянкі, нароўні з якімі сустракаюцца і паглыбленыя ў глебу слупавыя пабудовы. У Верхнім Падняпроўі пераважалі наземныя дамы слупавой канструкцыі.

Своеасаблівым быў пахавальны абрад носьбітаў зарубінецкай культуры. Для яго характэрны грунтавыя могільнікі, у якіх хавалі нябожчыкаў па абрадзе крэмацыі. Пахаванні ўтрымлівалі наборы посуду, дэталі адзення і жаночых упрыгожанняў. Найбольш вядомы Чаплінскі могільнік недалёка ад г. Лоева, дзе адкрыта 285 пахаванняў. Багатыя і бедныя пахаванні, тыповыя як для Чаплінскага, так і іншых могільнікаў, сведчаць пра маёмасную і сацыяльную няроўнасць у тагачасным грамадстве.

Зарубінецкая культура – адзіная на тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася пад моцным кельцкім уплывам. Яна адносіцца да ліку латэнізаваных культур нароўні з некаторымі этнакультурнымі супольнасцямі Цэнтральнай Еўропы. Падобныя кельцкія традыцыі ў асноўным звязаны з шырокім распаўсюджаннем глянцаванай керамікі і фібул латэнскіх схем, якія з'яўляюцца звычайнымі знаходкамі ў зарубінецкіх пахаваннях. Гэтыя фібулы паслужылі асновай для вырабу сваіх, уласных зарубінецкіх зашпілек, для якіх быў характэрны трохвугольны шчыток на ножцы, багата арнаментаваны пунсоннымі і іншымі ўцісканнямі. У зарубінецкай культуры вырабы з жалеза дамінуюць. Да іх адносяцца прылады для ўборкі ўраджаю (сярпы з кручкамі на пятцы, падобныя да мілаградскіх), сякеры-кельты, нажы з прамой спінкай і іншыя прадметы. Зброя для гэтай культуры была не характэрнай. Толькі ў Чаплінскім могільніку параўнальна часта сустракаліся жалезныя ўтулкавыя дзіды і двухшыпныя дроцікі. Разнастайнымі былі дэталі адзення і ўпрыгожанні. Сярод іх прысутнічаюць спражкі, фібулы, кіепадобныя шпількі, падвескі трапецападобнай формы з пунсоннымі ўцісканнямі па краі, бранзалеты, кольцы.

У сярэдзіне – трэцяй чвэрці I ст. н. э. класічная зарубінецкая культура знікла. На тэрыторыі Украіны, у Сярэднім Падняпроўі, прычынай гэтага сталі неаднаразовыя ўварванні з поўдня сарматаў, якія прымушалі зарубінецкія плямёны сыходзіць у глухія лясістыя месцы. Доўгі час лічылася, што носьбіты зарубінецкай агульнасці ў Беларускім Палессі не пакінулі пасля сябе ніякага следу. Аднак цяпер ужо вядома пра сыход нейкай часткі насельніцтва ў розных кірунках: у Паўднёва-Усходнюю Польшчу, Украінскую Валынь, у вярхоўі левабярэжных прытокаў Прыпяці.

У беларускай частцы Верхняга Падняпроўя, у басейне р. Дзясны і ў некаторых іншых месцах у канцы II – пачатку III ст. н. э. пры ўдзеле познезарубінецкага насельніцтва адбывалася фарміраванне кіеўскай культуры, якая праіснавала да сярэдзіны V ст. Новая супольнасць займала паўднёвую частку Магілёўскага Падняпроўя, Гомельскае Падняпроўе, Усходняе Палессе, Падзясенне, Сярэдняе Падняпроўе. У апошнія гады яе помнікі адкрыты і ў расійскіх лесастэпавых раёнах. Для кіеўскай культуры характэрны выключна неўмацаваныя паселішчы, на якіх сустракаюцца паўзямлянкі слупавой і зрубнай канструкцыі. У пахавальным абрадзе, у параўнанні з зарубінецкім часам, адбыўся прыкметны рэгрэс. Як і раней, дамінавалі пахаванні па абрадзе крэмацыі, аднак пахавальны інвентар практычна знік. Зрэдку разам з кальцынаванымі косткамі сустракаюцца два-тры чарапкі ад гаршкоў ці дэталі адзення. У керамічным наборы вызначаныя зарубінецкія традыцыі яшчэ ўлоўліваюцца (слабапрафіляваныя і рабрыстыя гаршкі, падглянцаваныя міскі), аднак якасць лепкі посуду і яго глянцавання рэзка дэградуе. У кіеўскай культуры сустракаецца нямала прадметаў правінцыйнарымскага паходжання: спражкі, фібулы, касцяныя грабяні, каралі, манеты і г. д. Зброя і рыштунак вершніка для гэтых плямён мала характэрны. Адмысловую цікавасць выклікае група ўпрыгожанняў, галоўным чынам лунніцы, аздобленыя эмалепадобнымі ўстаўкамі.

У другой палове II ст. н. э. у Брэсцкім Пабужжы з'явіліся помнікі вельбаркскай культуры, асноўны арэал якой знаходзіўся ў Польскім Памор'і і ў нізоўях Віслы. Рухаючыся з Памор'я на поўдзень, у Паўночнае Прычарнамор'е, нейкая частка носьбітаў гэтай культуры затрымалася ў заходніх раёнах Беларусі, дзе пакінула шэраг пахавальных помнікаў. Для іх былі характэрны грунтавыя могільнікі з крэмацыяй, радзей інгумацыяй. У пахаваннях прысутнічае шматлікі інвентар (гліняны посуд, фібулы, спражкі, побытавыя вырабы, упрыгожанні). На тэрыторыі Беларусі добра вывучаны два могільнікі: Брэст-Трышчын і Пятровічы, на кожным з якіх выяўлена звыш 70 пахаванняў, датаваных у межах другой паловы II – пачатку IV ст.

У канцы IV – V ст. на тэрыторыі Беларусі адбывалася чарговая змена культурна-гістарычных супольнасцей, якая суправаджалася вызначаным спрашчэннем і агрубленнем матэрыяльнай культуры. На большай частцы краіны распаўсюдзіліся помнікі трох археалагічных культур, якія маюць шмат агульнага ў структуры паселішчаў, пахавальнай абраднасці, гаспадарчай дзейнасці і грамадскім укладзе.

Вялікую частку правабярэжнага басейна Прыпяці пачынаючы з канца IV ст. займалі плямёны пражскай культуры, асноўны арэал якой ахопліваў міжрэчча Одэра і Віслы, Заходнюю Украіну, Чэхію, Славакію і некаторыя іншыя рэгіёны. Носьбіты пражскай культуры пражывалі пераважна

ў невялікіх па плошчы адкрытых селішчах, якія нярэдка мелі гнездавое размяшчэнне – тры-чатыры селішчы непадалёк адзін ад аднаго. Жыллё прадстаўлена паўзямлянкамі. Яны ацяпляліся агменямі або печамі, складзенымі з камянёў і гліны. На адным з самых ранніх селішчаў гэтай культуры, знойдзеным у в. Выспе Пінскага р-на, выяўлены паўзямлянкі з незвычайнымі агменямі, выкладзенымі з кавалкаў жалезнага шлаку. Гарадзішчы сустракаюцца рэдка. Яны, відаць, выкарыстоўваліся ў якасці сховішчаў. Найбольш вядомым з'яўляецца ўмацаванае паселішча ў в. Хатомель, даследаванае амаль цалкам. У ніжніх адкладах культурнага пласта гэтага гарадзішча была выяўлена пражская кераміка і жалезны наканечнік аварскай стралы.

Пахавальныя помнікі пражскай культуры прадстаўлены грунтавымі могільнікамі і курганамі. Апошнія, характэрныя для заключнага этапу, сустракаюцца рэдка. У абедзвюх катэгорыях пахаванняў кальцынаваныя косткі змешчаны ў гліняныя пасудзіны-ўрны ці проста рассыпаны на дне магільнай ямы. Інвентар у падобных пахаваннях за рэдкім выключэннем адсутнічае.

Гліняны посуд прадстаўлены слабапрафіляванымі гаршкамі з максімальным пашырэннем у верхняй траціне вышыні пасудзіны. Арнаментацыя не характэрна.

Селішчы пражскай культуры характарызуюцца беднасцю рэчавага комплексу. На іх сустракаюцца жалезныя нажы, шылы, гліняныя прасніцы, шкляныя пацеркі. Адзінкавыя знаходкі зброі – жалезныя двухшыпныя наканечнікі стрэл, дроцік. Рэдкімі асобнікамі прадстаўлены дэталі адзення і металічныя ўпрыгожанні. Сярод іх вылучаецца складанафігурыстая спражка візантыйскага паходжання, знойдзеная на селішчы Снядзін-2. На мяжы VII–VIII стст. пражская культура арганічна перарасла ў Луку-Райкавецкую, злучаную ўжо з летапіснымі славянамі. На ўсход ад пражскай была лакалізавана калочынская культура, якая займала такі ж арэал, як і кіеўская, і мела з ёй генетычную сувязь. Датуецца гэта агульнасць мяжой IV–V стст. – VII ст. І для гэтай культуры былі характэрны неўмацаваныя паселішчы. На іх сустракаюцца чатырохвугольныя паўзямлянкі зрубнай ці слупавой канструкцыі, нярэдка з цэнтральным апорным слупом, які падтрымліваў шатровы дах. Ацяпляліся яны адкрытымі агменямі, зрэдку абкладзенымі камянямі. Гарадзішчы ў гэтай культуры, як і ў пражскай, былі рэдкія і выконвалі функцыю сховішчаў. Класічным прыкладам такога помніка з'яўляецца ўмацаванае селішча ў в. Калочын. Па перыметры пляцоўкі былі адкрыты рэшткі доўгай наземнай хаты слупавой канструкцыі, знішчанай пажарам. Тут, акрамя таго, былі выяўлены гаршкі, запоўненыя

абгарэлым збожжам. Не выключана, што некаторыя з гарадзішчаў, якія мелі правільную форму і невялікія памеры, выкарыстоўваліся ў якасці свяцілішчаў, як гэта адзначана на Смаленшчыне.

Пахавальныя помнікі калочынскай культуры прадстаўлены выключна грунтавымі могільнікамі, якія змяшчаюць парэшткі пасля крэмацыі ў урне ці на дне магільнай ямы. Як і ў кіеўскай культуры, рэшткі пахавальнага інвентару (за выключэннем некалькіх чарапкоў ад посуду) адсутнічаюць.

Керамічны комплекс складаюць гаршкі слоікавай, слабапрафіляванай і рабрыстай форм, у якіх максімальнае пашырэнне прыпадае на сярэдзіну вышыні пасудзіны. Арнаментацыя не характэрна. Частымі знаходкамі з'яўляюцца таксама гліняныя біканічныя прасліцы з шырокай адтулінай, аналагічныя кіеўскім. На даследаваных селішчах выяўлены жалезныя нажы, сякеры, сярпы, косы, шылы, рыбалоўныя кручкі і інш. У невялікай колькасці прадстаўлены зброя і прадметы рыштунку вершніка: наканечнікі стрэл і дзід, шпоры. Сярод упрыгожанняў адзначаны бронзавыя падвескі, кольцы, бранзалеты, пальчатая фібула, шкляныя каралі.

У паўночнай частцы Беларускага Падняпроўя (вышэй г. Быхава) у V–VII стст. атрымалі распаўсюджанне гарадзішчы і селішчы, падобныя да помнікаў тушамлянскай культуры Смаленскага Падняпроўя. Сярод іх асаблівую вядомасць набыло гарадзішча ў в. Нікадзімава. Пры яго раскопках былі выяўлены рэшткі доўгага шматкамернага будынка слупавой канструкцыі, знішчанага пажарам. Характэрнай асаблівасцю гэтага помніка з'яўляецца насычанасць культурнага пласта прадметамі ўзбраення, рыштункам вершніка і верхавога каня. Тут выяўлены шматлікія наканечнікі дзід, дроцікаў, стрэл, цуглі, шпоры. У вялікай колькасці прадстаўлены і жаночыя ўпрыгожанні са срэбра і бронзы: пальчатыя фібулы, бранзалеты, кольцы, падвескі, бурштынавыя і шкляныя пацеркі.

У канцы IV–VII ст. Цэнтральную і частку Паўночнай Беларусі засялялі носьбіты банцараўскай культуры, роднаснай тушамлінскай і калочынскай. Для яе таксама былі характэрны неўмацаваныя паселішчы, якія часта размяшчаліся каля падножжа ўзгоркаў, на вяршынях якіх знаходзіліся ў папярэдні час гарадзішчы днепра-дзвінскай культуры і культур штрыхаванай керамікі. Жытло плямён гэтай супольнасці прадстаўлена паўзямлянкамі слупавой і зрубнай канструкцыі, а таксама наземнымі аднакамернымі пабудовамі слупавой канструкцыі. Ацяпляліся яны печамі-каменкамі. Значная колькасць банцараўскіх жытлаў была адкрыта на паселішчах Дзядзілавічы (54) і Гарадзішча Мядзельскага р-на (42). Гарадзішчы, як і ў іншых культурах гэтага часу, служылі ў якасці сховішчаў. Сярод іх найбольш вядомым

з'яўляецца Банцараўскае гарадзішча пад Мінскам, на якім было выяўлена 20 пасудзін, запоўненых абгарэлым збожжам.

Пахавальныя помнікі характарызуюцца грунтавымі могільнікамі з трупаспаленнямі, змешчанымі ў пасудзіны-урны ці звычайныя ямы. Пахавальны інвентар, за выключэннем фрагментаў пабітага посуду, як правіла, адсутнічае.

Керамічны комплекс прадстаўлены пераважна гаршкамі слоікавай, слабапрафіляванай і рабрыстай форм, у якіх максімальнае пашырэнне даводзіцца на сярэдзіну вышыні пасудзіны. У гэтай культуры таксама шырока распаўсюджаны біканічныя прасліцы з шырокай адтулінай. Пры раскопках паселішчаў выяўлены шматлікі і разнастайны рэчавы комплекс: сякеры, нажы, косы, сярпы, шылы, наканечнікі дзід, дроцікаў і стрэл, спражкі, шпількі, бранзалеты, кольцы, падвескі, пацеркі.

## ЭТНІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ЖАЛЕЗНЫМ ВЕКУ

Вывучэнне этнічных працэсаў з'яўляецца адной з найважнейшых, але ў той жа час і найскладанейшых праблем сучаснай археалогіі. Як правіла, археалогія, вырашаючы этнагенетычныя пытанні, прыцягвае даныя такіх навук, як лінгвістыка, антрапалогія, гідраніміка, этналогія і інш.

Аналіз назапашаных да цяперашняга часу звестак сведчыць аб складанай і этнічна неаднастайнай сітуацыі, якая існавала ў жалезным веку. Па даных гідраніміі, вялікая частка назваў рэк і азёр мае балцкае паходжанне, аднак непасрэдна з балцкім этнічным масівам можна з упэўненасцю звязаць толькі некалькі археалагічных культур. Да іх у першую чаргу адносяцца культуры штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінская культура. Вядомы савецкі і расійскі археолаг-славіст В. В. Сядоў меркаваў, што культуры штрыхаванай керамікі з'яўляліся ядром балцкага этнічнага масіву, вакол якога фарміраваліся балцкія дыялекты. Па яго меркаванні, носьбіты штрыхаванай керамікі ўяўлялі сабою лета-літоўскую групоўку ўсходніх балтаў, у той час як днепра-дзвінскія плямёны прыналежалі да найбольш аддаленай дняпроўскай кааліцыі балтаў. Усе гэтыя ўсходнебалцкія групоўкі асобныя археолагі злучаюць то з венедамі, то з фенамі, якія згадваюцца Тацытам.

Аднак звесткі, якія змяшчаюцца ў працах антычных аўтараў, у тым ліку і Тацыта, пра аддаленыя плямёны вельмі бедныя, няпэўныя, а часам і проста фантастычныя, што не дае магчымасці суаднесці іх з пэўнымі археалагічнымі культурамі.

Не так адназначна вырашаецца пытанне пра этнічную прыналежнасць плямён, якія займалі паўднёвую і паўднёва-ўсходнюю часткі Беларусі. Носьбітаў адной з самых ранніх культур жалезнага веку, мілаградскай, частка даследчыкаў прылічае да славян, іншыя – да балтаў. Паводле В. В. Сядова, гэтая этнакультурная агульнасць таксама прыналежыць да групоўкі дняпроўскіх балтаў. У археалагічнай літаратуры носьбіты мілаградскай культуры атаясамліваюцца з неўрамі Герадота, аднак яго звесткі вельмі супярэчлівыя і не маюць дакладнай геаграфічнай прывязкі.

Няма адназначнай трактоўкі і этнічнай прыналежнасці плямён зарубінецкай культуры. Частка даследчыкаў спрабуе даказаць, што зарубінецкая культура мае шэраг агульных рыс з кіеўскай, калочынскай і пянькоўскай культурамі 1-га тыс. н. э., якія нібыта звязаны з пэўнымі ўсходнеславянскімі групоўкамі летапіснага перыяду. Пры гэтым прыцягваюцца і даныя гідраніміі Сярэдняга Падняпроўя, дзе шмат славянскіх назваў рэк. Аднак калочынскія старажытнасці не маюць прамога хроналагічнага стыку з класічнымі славянскімі матэрыяламі VIII–IX стст., што з'яўляецца слабым звяном гэтай версіі. Паводле іншай канцэпцыі, зарубінецкія плямёны маглі мець балцкае паходжанне. Найбольш аргументавана гэта гіпотэза была прадстаўлена В. В. Сядовым. Аднак пасля ён стаў паступова адыходзіць ад выказанай канцэпцыі, мяркуючы, што носьбіты зарубінецкай культуры складалі асобную дыялектную групу, якая займала прамежкавае становішча паміж праславянскай мовай і ўскраіннымі заходнебалцкімі гаворкамі. Некаторыя расійскія археолагі злучаюць зарубінецкія плямёны з гістарычнымі бастарнамі, этнічная прыналежнасць якіх была цяжкавызначальнай ужо для антычных аўтараў. Гэтыя даследчыкі спрабуюць звязаць носьбітаў зарубінецкай культуры са звязам кельцка-ілерыйскіх ці нават германскіх плямён.

Бясспрэчна германскія плямёны пранiклі на тэрыторыю Заходняй Беларусі ў першых стагоддзях нашай эры. Гэта былі готы, якія пакінулі старажытнасці вельбаркскую культуру. Іх радзімай з'яўлялася Скандынавія, адкуль яны ў І ст. н. э. перасяліліся на паўднёвае ўзбярэжжа Балтыйскага мора, а ў другой палове ІІ ст. н. э. пачалі прасоўвацца на поўдзень, дасягнуўшы Паўночнага Прычарнамор'я, дзе стварылі сваю дзяржаву. Падчас гэтага руху нейкая частка гоцкага насельніцтва асела ў Беларускім Пабужжы і на Валыні, пакінуўшы шэраг могільнікаў з тыпова вельбаркскім інвентаром. Асобныя групы готаў адначасна сталі пранікаць і ў больш усходнія раёны аж да Пагарыння, дзе таксама ў невялікай колькасці маюцца вельбаркскія пахаванні.

Паводле археалагічных крыніц, першай дакладна славянскай культурай сёння лічыцца пражская культура. Яна мае пэўныя сувязі з пазнейшай

Лука-Райкавецкай культурай, якая непасрэдна звязана з летапіснымі славянамі. Гэтыя сувязі выразна прасочваюцца ў домабудаванні, пахавальным абрадзе, аздабленні керамікі. Шэраг даследчыкаў прылічаюць да славян і носьбітаў калочынскай культуры, аднак іх сувязь з летапіснымі групоўкамі славян, як ужо адзначалася, праблематычная. Нарэшце, плямёны банцараўскай культуры традыцыйна разглядаюць як балцкія. Рассяліўшыся на крайнім поўдні Беларусі, славяне яшчэ доўгі час не адважваліся ці не былі гатовыя да асваення паўночных тэрыторый. Відаць, шырокая славянская каланізацыя цэнтральных і паўночных абласцей Беларусі пачалася параўнальна позна, не раней за VIII ст., а завяршылася ў асобных месцах Падзвіння толькі ў XI ст.

## АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

З'яўленне і шырокае распаўсюджанне жалезных прылад працы прывяло да істотнага ўздыму прадукцыйных сіл і павелічэння дадатковага прадукту. Аснову гаспадаркі плямён жалезнага веку складалі земляробства і жывёлагадоўля, аднак іх суадносіны на розных тэрыторыях былі рознымі па прычыне адрознення глеб, асаблівасцей мікраклімату, рэльефу мясцовасці і іншых фактараў.

У паўднёвых раёнах, дзе былі распаўсюджаны мілаградская і зарубінецкая культуры, дамінуючае становішча займала земляробства. Пры гэтым шматлікія даследчыкі мяркуюць, што яно было пераважна ральным. Падобны пункт гледжання не выклікае ніякіх сумневаў у адносінах да паўднёвых раёнаў гэтай культуры (Сярэдняе Падняпроўе), змешчаных на мяжы лясной і лесастэпавай зон. Там існавалі даўнія традыцыі менавіта ральнага земляробства, якія сыходзяць сваімі каранямі ў скіфскую эпоху, што падмацоўваецца знаходкамі драўляных ралаў. Адзінкавыя падобныя прылады працы адзначаны і на тэрыторыі Беларусі. Сярод іх найбольш паказальным з'яўляецца крывагрядзільнае, знойдзенае ў тарфянішчы побач з в. Капланавічы. Яшчэ адна частка рала, зробленая з косці, з жалезным наканечнікам, была знойдзена на гарадзішчы Уваравічы. Абедзве гэтыя знаходкі датуюцца мяжой – пачаткам нашай эры. Аднак ральнае земляробства ў плямён мілаградскай і зарубінецкай культур на тэрыторыі Беларусі, відаць, насіла абмежаваны характар. Яно магло атрымаць распаўсюджанне толькі ў асобных раёнах Верхняга Падняпроўя, на Палессі і Перадпалессі, дзе маюцца адносна ўрадлівыя глебы і назіраецца значная канцэнтрацыя селішчаў гэтых культур. У астатніх месцах з іх малаўрадлівымі падзолістымі супясчанымі і пясчанымі глебамі і вялікай колькасцю лесу пераважала падсечнае земляробства, пры якім

ураджайнасць у першыя два-тры гады была значна вышэй, чым пры ральным земляробстве. Уборка ўраджаю збожжавых адбывалася з дапамогай жалезных сярпоў. Памол збожжа на муку ажыццяўляўся на каменных зерняцёрках. Вядома, што мілаградскія плямёны вырошчвалі мяккую пшаніцу і проса. Склад сельскагаспадарчых культур у носьбітаў зарубінецкай культуры больш разнастайны. Палеабатанічныя даследаванні паказалі, што асноўнай збожжавай культурай у іх было проса. Вядомы таксама пшаніца, ячмень і ў невялікай колькасці жыта. Апроч збожжавых, зарубінецкія плямёны вырошчвалі бабовыя (гарох) і тэхнічныя культуры (лён, каноплі), а таксама рэпу.

У Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі, у раёнах распаўсюджання культур штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскай культуры, земляробства атрымала шырокае распаўсюджанне толькі да мяжы нашай эры, калі з'явіліся жалезныя прылады працы. Раней у гэтых плямён дамінавала жывёлагадоўля. У адрозненне ад паўднёвых тэрыторый тут непадзельна панавала падсечна-агнявое земляробства. Трэба адзначыць, што шматлікія пісьмовыя і этнаграфічныя крыніцы фіксуюць гэты від гаспадарання не толькі ў перыяд развітога Сярэднявечча, але ў асобных месцах нават у канцы XIX ст. Так, А. Гваньіні падрабязна апісаў усе элементы падсечнага земляробства, якія ён назіраў у Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XVI – пачатку XVII ст. Ва ўмовах прахалоднага і больш вільготнага клімату, які наступіў у першых стагоддзях нашай эры, заняткі лядным земляробствам былі досыць працаёмкімі. Аднак цяжкасці, якія ўзнікалі пры падрыхтоўцы ўчасткаў для пасеву, былі пераадолены ў выніку шырокага распаўсюджання жалезных прылад працы, у першую чаргу сякер. Менш выдатковай стала і ўборка ўраджаю, якая ажыццяўлялася з дапамогай жалезных сярпоў і жніўных нажоў. Аднак да канца 1-га тыс. да н. э. у гэтых культурах жніўныя прылады працы былі невядомыя. Памол збожжа ажыццяўляўся на каменных зерняцёрках з дапамогай спецыяльных камянёў-цёрачнікаў. Найбольш распаўсюджанымі збожжавымі культурамі ў плямён культуры позняй штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскай культуры былі мяккая пшаніца і проса. Ёсць усе падставы лічыць, што ў першых стагоддзях нашай эры пачалі культываваць і жыта. Бабовыя культуры прадстаўлены гарохам, конскімі бабамі і вікай.

Заняткі земляробствам не маглі забяспечыць насельніцтва дастатковай колькасцю ежы, таму жывёлагадоўля адыгрывала не менш важную ролю. У арэалах культуры ранняй штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскай культуры яно з'яўлялася дамінантнай галіной сельскай гаспадаркі аж да пачатку нашай эры. Для ўсіх без выключэння плямён жывёлагадоўля мела

прысядзібны характар. Аднак склад статка меў свае рэгіянальныя адрозненні. Носьбіты мілаградскай культуры разводзілі пераважна буйную рагатую жывёлу. Другое па колькасці месца займалі коні, далей ішлі свінні і дробная рагатая скаціна. Адсоткавыя суадносіны хатніх жывёл у статку зарубінецкіх і мілаградскіх плямён некалькі адрозніваліся. У апошніх аснову статка складала буйная рагатая скаціна, аднак другой па значэнні жывёлай была свіння. У меншай колькасці разводзілі коней і дробную рагатую скаціну. Свае асаблівасці мела жывёлагадоўля ў цэнтральных і паўночных абласцях культуры. Так, у культуры ранняй штрыхаванай керамікі аснову статка складалі свінні, колькасць якіх магла дасягаць 50 % ад агульнага ліку свойскіх жывёл. Другое па значэнні месца займала буйная рагатая скаціна, затым дробная рагатая скаціна, а замыкалі гэты шэраг коні, доля якіх была невялікая. У культуры позняй штрыхаванай керамікі назіраюцца істотныя змены ў адсоткавых суадносінах хатніх жывёл. Пачынаючы з мяжы нашай эры, аснову статка складала буйная рагатая скаціна, якая перамясціла свіней на другое месца. Далей ішлі коні і дробная рагатая скаціна. Аднак на некаторых селішчах склад статка мог істотна адрознівацца. Так, на гарадзішчы Івань яго насельнікі разводзілі найперш коз і авечак і толькі потым буйную рагатую скаціну, свіней і коней. Высокі адсотак дробнай рагатай скаціны і на гарадзішчы Малышкі. Свае асаблівасці мае склад статка і ў плямён днепра-дзвінскай культуры. Тут, як і ў большасці культур, дамінавала буйная рагатая скаціна, аднак на другой пазіцыі знаходзіліся козы і авечкі. Далей ішлі коні, а замыкалі шэраг свінні. Астэалагічныя назіранні паказваюць, што жывёлагадоўля ў плямён жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі мела мяса-малочную скіраванасць, а ўзроставы склад коней (ад чатырох да дзевяці гадоў) з гарадзішча культуры позняй штрыхаванай керамікі Кашчэлічы сведчыць пра выкарыстанне каня як для верхавой язды, так і ў якасці цяглавой жывёлы.

Істотнае значэнне для папаўнення мясной ежы адыгрывалі паляванне і рыбная лоўля. Велізарныя лясныя масівы, а таксама развітая сістэма рэк і азёр прадвызначалі вялікую разнастайнасць дзікіх жывёл, большасць з якіх служылі аб'ектам палявання. Як паказваюць фаўністычныя рэшткі, у мілаградскіх плямён паляванне вялося пераважна на такіх дзікіх жывёл, як лось, зубр, кабан, мядзведзь, барсук. Сярод пушных звяроў адзначаны бабры і зайцы. Аб'ектам палявання былі і дзікія птушкі: курапатка, журавель, драфа, цецярук, чапля, качка і інш. У носьбітаў зарубінецкай культуры паляванне вялося таксама на высакароднага аленя, казулю, рысь, тхара і выдру. У больш паўночных раёнах, у арэалах культур штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскай культуры, пераважнае значэнне на паляван-

ні аддавалася буйной жывёле (лось, кабан, мядзведзь, тур, высакародны алень). Каштоўнай здабычай быў бабёр: яго мяса ішло ў ежу, каштоўная шкурка магла не толькі выкарыстоўвацца для ўласных патрэб, але і служыць прадметам абмену. Ужо ў глыбокай старажытнасці людзі навучыліся выкарыстоўваць бабровую струю (мускус) у якасці лячэбнага прэпарату. На паляванні выкарыстоўваліся розныя спосабы і прыёмы. Пры здабычы буйнога звера ўжываліся загоны і пасткі, якія патрабавалі калектыўных высілкаў і адмысловай асцярожнасці. Паляванне на дробных жывёл магло праводзіцца як індывідуальна, так і ў складзе невялікай групы. Пры здабычы пушных звяроў часцей за ўсё ўжываліся сілкі і петлі.

Наяўнасць вялікай колькасці вадаёмаў стымулявала заняткі рыбалоўствам. Астэалагічныя назіранні паказваюць, што аб'ектам рыбнай лоўлі служылі практычна ўсе віды рыб, вядомыя і цяпер. Найбольш прадстаўнічую серыю іхтыяфаўны далі гарадзішчы культур штрыхаванай керамікі Зазоны і Рацюнкі. На іх выяўлены 14 парод рыб: шчупак, лешч, гусцера, карась, язь, плотка, чырвонапёрка, лінь, сом, акунь, судак, ёрш, вугор, галавень. На зарубінецкіх селішчах вядомы таксама косці сазана і асятра. Асноўным аб'ектам здабычы былі драпежныя пароды рыб, у першую чаргу шчупак. Яго ўдзельная вага складала да паловы ад рыбы, якая здабывалася. Сярод карпавых парод прыярытэт аддаваўся ляшчу. Лоўля шчупака вялася пераважна ўвесну падчас нерасту і ў канцы лета. У гэтым выпадку найбольш эфектыўнымі былі гарпуны і восці, знаходкі якіх выяўлены ў шматлікіх культурах. Мяркуючы па буйных рыбалоўных кручках, ужывалася і лоўля на жыўца. Сеткі і бучы прызначаліся галоўным чынам для лоўлі рыб з сямейства карпавых.

Сярод хатніх рамёстваў цэнтральнае месца займалі металургія жалеза і кавальскае рамяство. Вытворчасцю жалеза займаліся паўсюдна, пра што сведчаць знаходкі кавалкаў жалезнага шлаку практычна на кожным з даследаваных селішчаў. Для атрымання чорнага металу выкарыстоўваліся печы двух тыпаў. Самай простай з іх з'яўлялася звычайная яма дыяметрам да 1 м, сценкі якой былі абмазаны глінай і моцна загартаваны падчас эксплуатацыі. Прыток паветра да такой печы быў натуральным. Рэшткі падобных прымітыўных канструкцый выяўлены на мілаградскім гарадзішчы Гарошкаў, на гарадзішчах культуры позняй штрыхаванай керамікі Кімія і Кашчэлічы. Класічныя печы-домніцы мелі больш складаную канструкцыю. Адна з іх выяўлена на гарадзішчы культуры позняй штрыхаванай керамікі Лабеншчына пад Мінскам. Яна была цалкам складзена з гліны. Амаль на ўзроўні падлогі меліся адтуліны, у якія ўстаўлялі соплы для мацавання мяхоў. Рэшткі сырадутных горнаў падобнага тыпу вядомы

і ў іншых культурах: на днепра-дзвінскіх гарадзішчах Кастрыца і Кублічы, на зарубінецкім гарадзішчы Чаплін. Атрыманую крыцу пракоўвалі каменнымі молатамі, знаходкі якіх вядомы па раскопках днепра-дзвінскага гарадзішча Буракова і ўмацаванага паселішча культуры позняй штрыхаванай керамікі Малышкі. Як паказалі металаграфічныя даследаванні, большасць простых рэчаў мясцовыя кавалі выраблялі са звычайнага жалеза шляхам кавання. Аднак ім былі вядомыя не толькі простыя аперацыі, але і вытворчасць прылад працы па складаных тэхналагічных схемах, якія ўключалі пакетаванне, цэментацыю, зварку жалеза са сталлю, загартоўку і да т. п.

Шырокае распаўсюджанне ў культурах жалезнага веку атрымала бронзаліцейная справа. Ёсць нават меркаванне пра наяўнасць у асобных плямён спецыялізаваных бронзаліцейных цэнтраў, якія забяспечвалі сваёй прадукцыяй суседнія раёны. Да іх ліку адносіцца гарадзішча Уваравічы, на якім выяўлена вялікая колькасць абломкаў гліняных ліцейных форм, якія служылі для вырабу па васковай мадэлі (ліццё ў форме, якую потым абавязкова разломвалі) бронзавых бранзалетаў латэнскіх тыпаў. Гліняныя і каменныя ліцейныя формы вядомыя практычна ва ўсіх археалагічных культурах, як і тыглі і льячкі, якія выкарыстоўваліся для плаўкі і разлівання каляровага металу. Каляровая металургія на тэрыторыі Беларусі з-за адсутнасці ўласных рудных крыніц грунтавалася на прывазной сыравіне. Мяркуючы па спектральным аналізе рэчаў, бронза магла паступаць з Каўказа, Карпацка-Балканскага рэгіёна ці нават з Альпаў. Каляровы метал ужываўся найперш для вырабу розных упрыгожанняў і дэталей адзення. Мясцовыя майстры валодалі такімі прыёмамі апрацоўкі бронзы, як ліццё, каванне, чаканка і, магчыма, валачэнне.

Істотнае месца сярод хатніх рамёстваў займала вытворчасць ганчарнага посуду. Выраб розных пасудзін ажыццяўляўся ўручную. Вытворчасць посуду складалася з некалькіх аперацый. Спачатку падрыхтоўвалася фармовачная маса, у якую дадавалі жарству (здробнены граніт), шамот (абпаленая гліна), радзей буйназярністы пясок і балотную руду. Пасудзіны ляпілі з дапамогай стужкава-кальцавога налеплівання. Выраблены такім чынам посуд пакрываўся арнаментам, сушыўся і абпальваўся ў кастрышчы. Больш складанай была тэхналогія вырабу глянцаванай керамікі. Не выключана, што для яе фармоўкі ўжо ўжывалася ганчарнае кола ручнога тыпу. Пасля лепкі паверхня пасудзіны да бляску шаравалася касцяным, каменным ці скураным лашчылам. Чорны ці цёмна-карычневы колер глянцаванай керамікі надаваўся з дапамогай метаду абварвання, калі пасудзіна да абпалу апускалася ў цёплы раствор мукі. Такі тэхналагічны прыём не меў мясцовых каранёў і, хутчэй за ўсё, быў запазычаны

ў кельтаў або плямён, якія знаходзіліся пад іх моцным уплывам. Сярод іншых хатніх рамёстваў былі распаўсюджаны прадзенне, ткацтва, апрацоўка косткі і дрэва.

## АБМЕН І КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Тэрыторыя Беларусі знаходзілася на значнай адлегласці ад перадавых цэнтраў поўдня і захаду. Аднак наяўнасць такіх буйных водных магістралей, як Днепр, Заходняя Дзвіна, Нёман і Прыпяць, спрыялі актыўным кантактам з суседнімі плямёнамі, якія выступалі пасрэднікамі пры абменных аперацыях. Дзякуючы ім да носьбітаў археалагічных культур беларускага арэала паступалі каляровы метал і разнастайныя рэчы. Для плямён мілаградскай культуры, дзе асноўнай транспартнай артэрыяй быў Днепр, амаль на ўсім працягу яе існавання найбольш цеснымі былі сувязі са скіфамі, якія, у сваю чаргу, былі пасрэднікамі пры абмене з больш аддаленымі тэрыторыямі поўдня (антычныя гарады Паўночнага Прычарнамор'я, Паўночны Каўказ) і захаду (кельцкая цывілізацыя). Першыя вядомыя кантакты са скіфамі датуюцца VII–VI стст. да н. э. Характар гэтых сувязей мог быць дваістым. З аднаго боку, знаходкі зброі могуць сведчыць пра ваеннае пранікненне асобных атрадаў качэўнікаў аж да Прыпяці і Беларускага Падняпроўя, а з іншага – скіфскія ўпрыгожанні, прылады працы, упрыгожанні, якія маюць прататыпы на Паўночным Каўказе, могуць быць доказам не толькі ваенных, а і гандлёвых сувязей. Максімальны росквіт абменных аперацый паміж мілаградскімі і скіфскімі плямёнамі прыйшоўся на V–III стст. да н. э. Менавіта да гэтага часу адносіцца большасць скіфскіх рэчаў ці іх прататыпаў. Тым часам пры пасрэдніцтве скіфаў у арэал мілаградскай культуры патрапілі вырабы з антычных гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я: разнастайныя шкляныя і паставыя пацеркі, амфарная тара. У IV–III стст. да н. э. усталяваліся кантакты і з кельцкім светам, адкуль паступалі латэнскія бранзалеты, фібулы і іншыя рэчы. Прыкладна такую ж скіраванасць мелі сувязі і носьбітаў зарубінецкай культуры, з той толькі розніцай, што кантакты з захадам і паўднёвым захадам у гэтых плямён былі больш інтэнсіўнымі. Як ужо адзначалася, зарубінецкая культура з'яўляецца адзінай на тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася пад моцным кельцкім уплывам. Адзначаны на зарубінецкіх селішчах і могільніках і іншыя рэчы кельцкага паходжання: жалезныя псаліі, бронзавыя пярсцёнкі, пасавыя кручкі і г. д.

Прадметы антычнага паходжання з грэчаскіх гарадоў-калоній Паўночнага Прычарнамор'я ў вялікай колькасці прадстаўлены ў Сярэднім Падняпроўі. Там найбольш шматлікую групу знаходак складаюць абломкі

эліністычных і раннерымскіх амфар. Апроч іх, шырокавядомы чырвонагліняны сталовы посуд, чырвоналакавыя кубкі. На тэрыторыі Беларусі знаходкі антычнай керамікі рэдкія. Значна большую запатрабаванасць мелі паставыя і шкляныя пацеркі, якія траплялі праз пасрэднікаў з Ольвіі і некаторых іншых гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я.

Культуры штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінская культура знаходзіліся ў самым цэнтры лясной зоны і таму мелі слабыя сувязі з развітымі культурамі Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы. На працягу жалезнага веку гэтыя этнакультурныя супольнасці былі арыентаваны на ўзаемадзеянне з зарубінецкім насельніцтвам, а пасля распаду гэтай культуры – з заходнімі плямёнамі. Праз носьбітаў зарубінецкай культуры ў арэал культуры позняй штрыхаванай керамікі паступала зброя (наканечнікі дзід і дроцікаў), фібулы познелатэнскай схемы, сякеры-кельты. Яны ж пастаўлялі плямёнам штрыхаванай керамікі не толькі рэчы ўласнай вытворчасці, але і вырабы антычных гарадоў Паўночнага Прычарнамор'я, напрыклад шкляныя і паставыя пацеркі.

Пасля распаду зарубінецкай агульнасці найбольш інтэнсіўныя кантакты ўсталёўваюцца з плямёнамі захаду, у прыватнасці з носьбітамі культуры заходнебалтыйскіх курганоў, якія пастаўлялі фібулы і паясны набор правінцыйнарымскіх тыпаў, рэчы з выемчатай эмаллю, некаторыя тыпы шкляных пацерак.

## ГРАМАДСКІ ЛАД

Археалагічныя даныя сведчаць пра тое, што ў перыяд жалезнага веку плямёны на тэрыторыі Беларусі па-ранейшаму знаходзіліся на стадыі першабытнаабшчыннага ладу. Гэты час – панаванне патрыярхату, але і яго паступовы заняпад. Найбольш трывалыя пазіцыі патрыярхальныя адносіны займалі ў арэалах культур штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскай культуры. Аснову грамадства тут складала вялікая патрыярхальная сям'я, якой належала асобнае гарадзішча. Нярэдка гэтыя ўмацаваныя паселішчы групаваліся па два – чатыры на невялікай адлегласці адзін ад аднаго, а людзі, якія пражывалі на іх, відаць, уваходзілі ў адзін род. Пра дамінаванне вялікай патрыярхальнай сям'і сведчыць шэраг даных. Так, уладкаванне паселішчаў і ўзвядзенне вакол іх умацаванняў у выглядзе земляных валоў, равоў і драўляных сцен патрабавала значных калектыўных высілкаў. Аб гэтым гаворыць і характар заняткаў насельніцтва. Падсечна-агнявое земляробства было немагчымым без намаганняў усіх дзеяздольных членаў сям'і. Працэс расчысткі лясных участкаў, падрыхтоўка іх да пасеву, ахова палёў

і гародаў ад дзікіх жывёл, уборка ўраджаю – усё гэта было не пад сілу малым сем'ям. Пра моцныя пазіцыі вялікай патрыярхальнай сям'і сведчаць і жылыя пабудовы. Як правіла, гэта былі шматкамерныя дамы, падзеленыя на асобныя жылыя памяшканні, у якіх жылі малыя сем'і. У першых стагоддзях нашай эры ў гэтых культурах з'явіліся і аднакамерныя пабудовы, што можа з'яўляцца паказчыкам узмацнення ролі малых сем'яў, аднак побач з падобнымі пабудовамі адсутнічаюць ямы-скляпы, якія маглі б сведчыць пра індывідуалізацыю сельскай гаспадаркі і распад вялікай патрыярхальнай сям'і. Ускосным аргументам на карысць непарушных пазіцый патрыярхату з'яўляюцца пісьмовыя звесткі пра найбліжэйшых суседзяў балцкіх плямён. Так, паводле Юлія Цэзара, германцы, якія знаходзіліся ў прамым кантакце з рымскай цывілізацыяй, яшчэ ў I ст. да н. э. жылі ва ўмовах радавой абшчыны.

## ГЕНЕЗІС УСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ПЛЯМЁН І ШЛЯХІ ІХ РАССЯЛЕННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Адным з найбольш складаных пытанняў гістарычнай і археалагічнай навук з'яўляецца высвятленне этнагенезу народаў. Калі пра шматлікія з іх, напрыклад грэкаў, рымлян, кельтаў, германцаў, балтаў і інш., мы маем досыць пераканаўчыя факты, то пытанні аб паходжанні славян дагэтуль застаюцца спрэчнымі. Існуе нямала гіпотэз, як навуковых, так і проста фантастычных, але ніводная з іх не валодае пераканаўчымі доказамі.

Першым, хто паспрабаваў адказаць на пытанне «адкуль пайшла руская зямля» быў Нестар Летапісец. У «Аповесці мінулых гадоў» XII ст. ён пісаў: «Во мнозих же времянех сели суть словени по Дунаеви, где есть ныне Угорьска земля и Болгарска [и] от тех словен разыдошася по земле и прозвашася имена своими, где седша на котором месте». Гэта паведамленне Нестара стала адпраўной кропкай для складання так званай дунайскай ці балканскай тэорыі паходжання славян, якой прытрымліваліся шматлікія вядомыя рускія і еўрапейскія гісторыкі XIX – пачатку XX ст. Паводле П. Шафарыка, першыя славяне з'явіліся на поўначы і паўночным усходзе ад Карпат, на тэрыторыях сучасных Галіцыі, Падоліі, Валыні. Тым самым была сфармулявана прыкарпацкая тэорыя этнагенезу славян.

У адпаведнасці з поглядамі Ю. Растафінскага і М. Фасмера, якія абапіраліся на фларыстычную лексіку славян і матэрыялы гідранімікі, прарадзіма славян знаходзілася ў басейне Прыпяці і сярэдняга Дняпра. З пункту гледжання А. А. Шахматава, раннія славяне першапачаткова пражывалі ў ніжняй плыні Заходняй Дзвіны і Нёмана, дзе яны былі суседзямі балтаў,

германцаў, кельтаў і фінаў. Пасля сыходу германцаў з Павіслення, славяне перасунуліся на захад, на тэрыторыю сучаснай Польшчы, а пазней і ў іншыя месцы, што зафіксавана ў сярэднявечных крыніцах.

Найбольш пераканаўчай выглядае гіпотэза, паводле якой славяне пачалі фарміравацца ў міжрэччы Віслы і Одэра ў перыяд бронзавага веку, адкуль пасля рассяліліся на поўдзень і ўсход.

Як бы ні вырашалася гэта праблема ў далейшым, можна канстатаваць, што, паводле археалагічных даследаванняў, першыя дакладна вядомыя славяне з'явіліся на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі не раней за канец IV ст. н. э. Паўночнай мяжой іх рассялення была Прыпяць. Менавіта там яны жылі аж да канца X ст.

Актыўнае асваенне больш паўночных рэгіёнаў пачалося параўнальна позна, не раней за VIII ст., калі па ўсёй гэтай тэрыторыі з'явіліся славянскія курганы з крэмацыяй. Э. М. Загарульскі мяркуе, што шырокае рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі стасуецца з распаўсюджаннем хрысціянства. Завяршылася славянская каланізацыя тэрыторыі Беларусі толькі ў XII–XIII стст.

# 4 ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА: ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

- **Узнікненне Полацкага княства**
- **Уласным шляхам**
- **Час Усяслава**
- **Феадальнае драбленне Полацкай зямлі**

## УЗНІКНЕННЕ ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА

Пісьмовая гісторыя беларускіх зямель узыходзіць да IX–X стст., калі летапісныя крыніцы ўпершыню згадваюць племянныя супольнасці, якія існавалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі (найбольш буйныя з іх – крывічы, дрыгавічы, радзімічы), а таксама ўмацаваныя паселішчы – гарады, што былі цэнтрамі зямель дадзеных племянных аб'яднанняў (Полацк – 862 г., Тураў – 980 г.). Крывічы ў летапісных зводах фігуруюць пад 859, 862, 907, 944, 980 гг. Іпацьеўскі летапіс выкарыстоўвае гэтае вызначэнне для жыхароў падзвінскіх зямель нават у 1128 г. і называе полацкіх князёў крывіцкімі ў 1140 і 1162 гг. Тэрмін «палачане» неаднаразова сустракаецца ў пісьмовых крыніцах XI–XII стст. Ён паходзіць ад назвы горада Полацка, а больш дакладна – ад ракі Палаты. Паводле «Аповесці мінулых гадоў», Полацк быў заснаваны «на рацэ Палаце, дзе палачане. Ад гэтых апошніх і пайшлі крывічы». Узнікае пытанне: ці ідэнтычныя паняцці «крывічы» і «палачане»? Частка гісторыкаў адназначна лічыць, што так. Але большасць навукоўцаў схіляюцца да думкі, што «крывічы» – абагульняльная назва буйнога саюзу плямён, куды, акрамя полацкіх, уваходзілі крывічы смаленскія ды ізборскія. Здаецца, гэта дакладней адлюстроўвае сапраўдны

стан тагачаснай этнічнай, геаграфічнай і палітычнай рэчаіснасці. Адсюль вынікае, што тэрмін «палачане» хутчэй палітычны, чым этнічны, бо ім вызначаліся жыхары Полацкага княства, маладой дзяржавы, якая ўзнікла не шляхам інтэграцыі невядомых дробных плямён, а, наадварот – праз вылучэнне з больш груваcткага племяннога крывіцкага аб'яднання яго канкрэтнай полацкай часткі ў падзвінскім рэгіёне.

Менавіта ў IX–X стст. на землях Усходняй Еўропы, у тым ліку ўсходнеславянскіх, адбываліся звышвызначальныя для будучай гісторыі дзяржаваўтваральныя працэсы. Тая ж «Аповесць мінулых гадоў» адзначае, што пасля смерці ўвекавечаных заснавальнікаў кіеўскага княжання братоў Кія, Шчэка, Харыва «іх нашчадкі сталі трымаць княжанні ў палян, у дрыгавічоў свае, а ў славян у Ноўгарадзе свае, а другое на рацэ Палаце, дзе "палачане"».

Недзе да сярэдзіны IX ст. ва Усходняй Еўропе ўтварыліся два тэрытарыяльныя саюзы – Паўночны і Паўднёвы, якія вялі звышупартую барацьбу за мажлівасць пад сваім пачаткам здзяйсняць аб'яднанне тых зямель, дзе пралягаў шлях з «варагаў у грэкі».

На чале Паўночнага саюзу стаяў Ноўгарад Вялікі, Паўднёвым кіраваў Кіеў. Полацк знаходзіўся паміж гэтымі буйнымі цэнтрамі і з'яўляўся аб'ектам іх агрэсіўных аб'яднаўчых памкненняў. Шэраг летапісных сведчанняў дазваляе канстатаваць прыналежнасць на сярэдзіну IX ст. Полацка да наўгародскага саюзу. «Аповесць мінулых гадоў» пад 859 г. зафіксавала выплату даніны прышлым варагам крывічамі разам з паўночнымі народамі чудзь, мерай, славенамі і вессю. Год першага згадвання Полацка – 862 – звязаны са знакавай для гэтай заходнедзвінскай цвярдыні падзеяй, а менавіта «прызваннем» у паўночныя гарады варажскіх князёў Рурыка, Сінявуса і Трувара, якія занялі княжацкія пасады адпаведна ў Ноўгарадзе, Белавозеры ды Ізборску. У Полацку ж быў пасаджаны Рурыкавы «муж», а сам князь Наўгародскі пасля смерці братоў стаў адзінаўладцам на поўначы Русі. Тэрыторыя яго панавання была аграмаднай і распаўсюджвалася з Ноўгарада, апроч Полацка, на Белавозера, Растоў з прылеглымі да гэтых цэнтраў землямі. Падобны стан рэчаў выклікаў нервовасць і непасрэдную агрэсію з боку кіеўскіх лідараў Аскольда і Дзіра. У 865 г. яны «воеваша полочан и много зла сотвориша». Такім чынам, Полацк на шэраг дзесяцігоддзяў патрапіў пад кантроль кіеўскіх князёў, у той час як «Рюрику же княжище в Новгороде». Праўда, у хуткім часе сітуацыю кардынальна змяніў сваяк Рурыка князь Алег, які апекаваўся пасля смерці наўгародскага ўладара яго малалетнім сынам Ігарам. У 882 г. «поиде Олег... к Смоленьску с кривичи, и прия град, и посади муж свои». Потым яго шлях быў працягнуты ўніз

па Дняпры да Кіева, дзе Алег, выказаўшы незадаволенасць тым, што Аскольд і Дзір не княжацкага паходжання, заявіў, што ён княжацкага роду, «и вынесоша Игоря» дадаў: «А се есть сын Рюриков». Пасля чаго абодва кіеўскія ўладары былі забіты і «седе Олег княжа в Киеве, и рече Олег: “Се буди мати градом русьским”».

Такім чынам, у канцы IX – першай палове X ст. Полацк ішоў у фарватары палітыкі кіеўскіх князёў, пры гэтым, праўда, пераследуючы па магчымасці свае мэты. Так, крывічы згадваюцца як удзельнікі паходаў кіеўскіх князёў Алега і Ігара на Візантыю. Пасля пераможных выпраў ім дасталася належная частка кантрыбуцыі, якая дапамагала трымаць пэўную палітычную дыстанцыю ад кіеўскай метраполіі. Гістарычныя рэаліі першай паловы X ст. дазваляюць казаць не пра адміністрацыйную залежнасць палачан ад Кіева, а толькі пра ваеннае падначаленне полацкага войска кіеўскаму князю. Само ж Полацкае княства, якое, безумоўна, палітычна не паглыналася «маці гарадоў рускіх», падчас паходаў на Канстанцінопаль магло быць адным з саюзнікаў кіеўскага князя.

У пацвярджэнне вышэйзгаданай тэзы можна прывесці факт дастаткова хуткага, няхай і часовага, распаду Кіеўскай дзяржавы на тры часткі ў 70-х гг. X ст. пасля пагібелі Святаслава (частку Кіеўскую, Наўгародскую і Драўлянскую). У гэты час Полацк з летапісных крыніц паўстае як незалежнае, самастойнае дзяржаўнае ўтварэнне. Менавіта з гэтага моманту адбываецца ўзвышэнне падзвінскага цэнтра, яго ўключэнне ў якасці асобнай адзінкі ў міжусобную барацьбу Святаславічаў, бо якраз у канцы X ст. летапіс згадвае полацкага князя Рагвалода, што палітычна ніяк не быў звязаны ні з Ноўгарадам, ні з Кіевам. З часоў Рагвалода ішло паступовае ўзвышэнне Полацка, які праз пяць стагоддзяў займеў такую высокую ацэнку ў полацкіх граматах: «А Полацк таксама ёсць, хвала богу, месца славутнае. А не ніжэйшае па значэнні і ва ўсім ні Вільні, ні Мальбарка, ні Гданьска».

Полацк пачынаў быць запатрабаваным палітычным цэнтрам, ад падтрымкі якога ў многім залежала першынство ва ўсходнеславянскім рэгіёне, ад часоў драматычных падзей канца X ст. У «Аповесці мінулых гадоў» пад 980 г. вядзецца аповед аб сватанні да полацкай княжны Рагнеды кіеўскага князя Яраполка Святаславіча і наўгародскага князя Уладзіміра Святаславіча. Уладзімір паслаў да полацкага князя, які «держит и владеет и княжит Полоцкую землю», сваіх прадстаўнікоў з прапановай: «Хачу дачку тваю ўзяць сабе за жонку». Тады полацкі князь запытаў у Рагнеды: «Ці хочаш ты за Уладзіміра?». Яна ў адказ: «Не хачу разуваць сына рабыні (вясельная абраднасць. – *Аўт.*), але хачу за Яраполка». Абражаны адмовай, Уладзімір сабраў войска з варагаў, славен, чудзі ды ізборскіх крывічоў

і рушыў выправай на Полацк. Пасля працяглай аблогі горад быў захоплены. Рагвалод, яго жонка і два сыны былі забіты, а Рагнеда гвалтоўна стала жонкай пераможцы.

Адмова Рагвалода замацаваць шлюбам дачкі з князем Уладзімірам саюз з Ноўгарадам тлумачыцца цэлым шэрагам абставін. Галоўнымі з іх былі, па-першае, супярэчнасці паміж суседнімі княствамі за права кантролю над паўночнай часткай шляху «з варагаў у грэкі» (гэта характэрна і для далейшых адносін паміж Полацкам і Ноўгарадам), па-другое, Рагвалод, хутчэй за ўсё, хацеў быць у намінальнай залежнасці ад аддаленага лясамі і балотамі Кіева, чым знаходзіцца ў падначаленні блізкага і варожага Ноўгарада. Пасля падначалення Полацка Уладзімір накіраваў сваю ваенную моц на поўдзень, захапіў Кіеў і стаў адзінаўладным гаспадаром Русі.

Безумоўна, нерэалізаваны саюз Полацка з Кіевам праз шлюб Рагнеды з Яраполкам, забойства апошняга і пачатак княжання ў Кіеве Уладзіміра нанеслі адчувальны ўрон папярэдняй самастойнасці Полацкай зямлі. Аднак цалкам знішчыць яе не здолелі.

Інтэнсіўная, мэтанакіраваная дзейнасць князя Уладзіміра па пераадоленні рэгіянальнага сепаратызму ды ўзмацненні адзінства ўсходнеславянскай дзяржавы (прыняцце хрысціянства, правядзенне адміністрацыйна-кіраўнічай рэформы) сустракала натуральнае супраціўленне мясцовай знаці. Ад гэтага кіеўскаму ўладару не было куды дзецца. Таму прыкладам – далейшы лёс Полацкага княства.

## УЛАСНЫМ ШЛЯХАМ

Рагнеда нарадзіла ад Уладзіміра чатырох сыноў: Ізяслава, Яраслава, Усевалада, Мсціслава і дзвюх дачок. Пасля няўдалага замаху князёўны на жыццё мужа, апошні выслаў яе разам са старэйшым сынам Ізяславам на Полаччыну. Пры гэтым кіеўскі ўладар прадставіў законнаму спадкаемцу мясцовай дынастыі (унуку Рагвалода па жаночай лініі) полацкае княжанне. Гэта быў пэўны кампраміс кіеўскага князя з полацкай знаццю, якая супрацьстаяла цэнтрападпарадкавальным імкненням Кіева. Пацвярджэннем таму можа быць той факт, што пасля смерці Ізяслава (1000 г.) на вызваленае месца ў Полацк не быў накіраваны хто-небудзь з малодшых сыноў Уладзіміра, на пасад быў узведзены сын Ізяслава Брачыслаў (княжыў у 1003–1044 гг.). Такім чынам, у канцы X – пачатку XI ст. мясцовая полацкая княжацкая дынастыя была ўзноўлена, нягледзячы на тое, што да смерці кіеўскага князя Уладзіміра знаходзілася пад кантролем сталічнага горада.

Пасля смерці Уладзіміра Святаславіча ў 1015 г. уся сабраная ім агромністая, але пры гэтым далёка не ўпарадкаваная пад адзіным скіпетрам кіеўская імперыя рухнула. Землі-княжанні былі падзелены паміж яго шматлікімі спадчыннікамі, якіх, безумоўна, хвалявала пытанне лідарства на тэрыторыі Уладзіміравай Русі. Галоўнымі канкурэнтамі ў барацьбе за палітычнае першынство на шырокіх абсягах усходнеславянскай маладой дзяржавы былі, як і раней, князі кіеўскія і наўгародскія. Пасля працяглых, амаль чатырохгадовых спрэчак, як дыпламатычных, так і ваенных, перамога ў 1019 г. дасталася князю Ноўгарада Вялікага Яраславу Мудраму. Ён на 35 гадоў укняжыўся ў Кіеве.

Брачыслаў, князь полацкі, у дынастычнай барацьбе спадкаемцаў Уладзіміра захоўваў нейтралітэт. Аднак ён выкарыстаў адыход Яраслава з Ноўгарада ў Кіеў і ў 1021 г. здзейсніў паход на паўночную рускую цвярдыню. Паводле «Аповесці мінулых гадоў», «приде Брячислав, сын Изяславль, внук Володимерь, на Новгород, и зая Новгород, и поим новгородце и именье их, поиде Полоцку опять». Гэтая выправа князя Брачыслава мела пад сабой эканамічную аснову, а менавіта – кантроль Полацка над часткай гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі». Неабходна ўлічваць, што грашовае абарачэнне паміж Паўночнай і Усходняй Еўропай, якое абапіралася на Волхаўска-Волжскую і Волхаўска-Дняпроўскую водныя артэрыі, у IX–XI стст. складала 12–15 млн марак срэбра ў год. Таму стаць паўнапраўным уладаром часткі гэтага грашова-прыбытковага гандлёвага напрамку было заманліва і неабходна для дзяржавы.

Тым не менш эканамічныя і тэрытарыяльныя памкненні не маглі не мець палітыка-ваеннага рэзанансу. Кіеўскі князь Яраслаў умомант зрэагаваў на агрэсію Брачыслава, мэтай якой была ліквідацыя паўночнага рускага цэнтра ў якасці канкурэнта на ролю ўладальніка «волака» паміж басейнам Волхава і Дняпра. Кіраўнік Кіева пасля імклівага рэйду са сваёй дружынай пераняў полацкае войска на рацэ Судаміры, што на Пскоўшчыне, і разбіў яго. «Аповесць мінулых гадоў» зафіксавала гэты факт такім чынам: «И победи Ярослав Брячислава и навгородце вороти Новгороду, а Брячислав бежа Полотьку».

Развязка гэтага канфлікту пачатку 20-х гг. XI ст. паміж Брачыславам і Яраславам была дастаткова нечаканай. Неўзабаве пасля бітвы праціўнікі сустрэліся ў Кіеве і заключылі мірную згоду, па якой да Полацкага княства далучыліся два гарады, што былі да гэтага пад кантролем Ноўгарада, – Усвяты і Віцебск, праз якія праходзіў «волак» да Дняпра па шляху «з варагаў у грэкі». Шырокі княжацкі жэст Яраслава суправаджаўся фразай, звернутай да полацкага князя: «Будь же со мною за один».

Умовы дагавора дазваляюць зрабіць высновы як аб прычыне канфлікту паміж Полацкам і Кіевам, так і аб палітычным статусе Полацкага княства на пачатку 2-га тысячагоддзя. Прычына традыцыйная: грошы, а менавіта кантроль над часткай гандлёвага шляху і ліквідацыя ў гэтай справе Ноўгарада як канкурэнта. Падобная палітыка Полацка разгортвалася не толькі ва ўсходнім, але і ў заходнім напрамку. Менавіта ў гэты час – першыя дзесяцігоддзі XI ст. – на Заходняй Дзвіне, яе сярэднім і ніжнім цячэнні, былі закладзены два ўмацаваныя цэнтры: гарады Кукенойс і Герцыке, якія падначальваліся Полацку. Праз іх не толькі пашыраўся кантроль полацкіх князёў над гандлёвым шляхам ад Полацка да Варажскага (Балтыйскага) мора, але таксама ўмацоўвалася іх сфера ўплыву на падзвінскае балцкае насельніцтва. З гэтай жа мэтай у заходнім ад Полацка напрамку быў заснаваны горад Брачыслаўль (сучасны Браслаў).

Адмова Яраслава ад шырокага ўмяшання ў полацкія справы тлумачыцца значнай сілай княства і яго дастатковай палітычнай самастойнасцю. Таму мірнае суіснаванне з суседняй магутнай дзяржаўнай адзінкай для Кіева было справай важнай. Да сярэдзіны 60-х гг. XI ст. ваенных канфліктаў паміж Полацкам і Кіевам не адзначалася.

Такім чынам, у першай палове XI ст. назіраўся працэс умацавання дзяржаўнасці Полацкай зямлі, станаўлення яе пэўных геаграфічных меж. Калі ў IX ст. падуладная Полацку тэрыторыя абмяжоўвалася навакольнымі землямі, то на працягу X–XI стст. у сферу яго ўплыву ўжо ўваходзілі Заслаўе і Віцебск. У тым жа XI ст. узнікае звыш дзясятка гарадскіх паселішчаў, якія былі падначалены «старэйшаму» гораду Полацку. Сярод іх варта адзначыць згаданыя Браслаў, Усвяты, а таксама Менск, Копысь, Оршу, якія выконвалі ролю фарпостаў Полацкай зямлі. Браслаў знаходзіўся на памежжы з літоўскімі плямёнамі, Заслаўе і Менск межавалі з Тураўскай зямлёй, Копысь, Орша і Усвяты – са Смаленскам.

Пашырэнне Полацкага княства суправаджалася эканамічным развіццём рэгіёна. Гэта выяўлялася ў адчувальным росце старажытных гарадоў. У першай палове XI ст. у пяць разоў павялічыліся памеры рамесна-гандлёвай часткі і пасада Полацка. З канца X ст. пачаў разрастацца Віцебск. Тут быў пабудаваны новы пасад на правым беразе ракі Віцьбы. Тое ж археолагамі фіксуецца ў горадзе Лукомлі, дзе ў XI ст. узнікае яшчэ адзін пасад на левым беразе ракі Лукомкі. У XI ст. перажыў перыяд свайго найбольшага росквіту ў часы ранняга Сярэднявечча горад Менск на рацэ Менцы, плошча ўмацаванай часткі якога (дзядзінца) і рамесна-гандлёвага цэнтра (пасада) складала не менш за 30 гектараў.

Пра сённяшнюю сталіцу Рэспублікі Беларусь трэба сказаць асобна. Упершыню горад Менск згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» у 1067 г. у сувязі з бітвай паміж Полацкам і Кіевам на рацэ Нямізе.

На Немизе снопы стелют головами,
молотят чепи харалужными,
на тоце живот кладут,
веют души от тела.
Немизе кровавы брезе
не бологом бяхуть посеяни,
посеяни костьми руских сынов, –

так апавядае аўтар «Слова аб паходзе Ігаравым» пра жорсткую бітву, калі кіеўскія князі Яраславічы – Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад «совокупивше вои, идоша на Всеслава, зиме суще велице. И придоша ко Меньску, и меняне затворишася в граде. Си же братья взяша Менеск и исекоша муже, а жены и дети вдаша на щиты, и поидоша к Немизе...». Апошняя фраза з «Аповесці мінулых часоў» і выклікала сумненне адносна ўзнікнення Мінска ў тым месцы, дзе Няміга ўпадала ў Свіслач. Сапраўды, навошта тады пасля спусташэння мінскай цвярдыні Яраславічам трэба было кіравацца да Нямігі, калі б яна знаходзілася побач? Пасля даследаванняў археолагаў загадка тая была вырашана. Мінск узнік не на рацэ Нямізе, а на рацэ Менцы, каля 16 км на захад ад сучаснага горада, на тэрыторыі сённяшняга Шчомысліцкага сельсавета каля вёскі Гарадзішча. Пасля неаднаразовых разбурэнняў Менск адбудаваўся ў вусці ракі Нямігі, дзе раней стаяла моцная крэпасць, якая абараняла паўднёвае парубежжа Полацкага княства.

Падсумоўваючы часы праўлення ў Полацку князёў Ізяслава і Брачыслава, неабходна адзначыць, што да сярэдзіны XI ст. Полацкая зямля назапасіла дастаткова дзейсныя ўнутраныя рэсурсы для далейшага эканамічнага развіцця, абароны сваіх знешнепалітычных інтарэсаў, а значыць, для адстойвання дзяржаўнай незалежнасці. Усё гэта агулам з поўнай дакладнасцю выявілася ў другой палове XI ст. – падчас княжання полацкага князя Усяслава Брачыславіча (1044–1101).

## ЧАС УСЯСЛАВА

У 1044 г., пракняжыўшы ў Полацку 41 год, Брачыслаў памёр. Пры гэтым умяшальніцтва ва ўнутраныя справы Полацкага княства з боку кіеўскага ўсяўладнага правіцеля Яраслава не адбылося, што з’яўляецца сведчаннем поўнага суверэнітэту тагачаснага Полацка.

Да 60-х гг. XI ст. дзейнасць маладога полацкага князя Усяслава Чарадзея (паводле падання, ён нарадзіўся ад чарадзейства) была сканцэнтравана

на ўпарадкаванні ўласнай дзяржавы. Умацаваліся межы шляхам узвядзення па ўсім перыметры Полацкай зямлі драўляных умацаваных крэпасцей. Пад рукой полацкага ўладара збіралася добра ўзброенае войска – дружына. Аб гэтым ёсць непасрэдныя сведчанні быліннага эпасу. У быліне «Волх Усяславіч», якая была прысвечана дзейнасці полацкага князя, маюцца наступныя радкі:

Стал себе он дружину прибирать:
дружину прибирал в три года,
он набрал дружину себе в семь тысяч.

Інтэнсіўнымі тэмпамі ў першыя дзесяцігоддзі княжання Усяслава Брачыславіча развівалася горадабудаўніцтва. Прычым яно мела як гандлёва-эканамічную накіраванасць, так і культава-палітычную. У апошнім аспекце вельмі характэрным і сімвалічным з'яўляецца пабудова ў 50-х гг. XI ст. у Полацку Сафійскага сабора. Гэта быў адзін з першых хрысціянскіх храмаў ва Усходняй Еўропе і трэцяя Сафія на рускіх землях (першая была ўзведзена ў Кіеве, другая – у Ноўгарадзе). Пабудова такога сабора ў Полацку сведчыла аб тым, што гэты горад вылучаецца ў тройку найбольш уплывовых палітыка-эканамічных цэнтраў Русі.

У XI ст. полацкі храм быў не толькі і не столькі культавай пабудовай, колькі сімвалам магутнай княжацкай улады. Тут, безумоўна, маліліся прыхаджане, але ў гэтым святым месцы таксама прымалі паслоў, аб'яўлялі войны і заключалі мірныя дагаворы, захоўвалі казну і бібліятэку, пісалі летапісы. Такім чынам, Сафія падкрэслівала, што Полацкае княства ў сваёй магутнасці не саступае паўднёвым і паўночным суседзям. Усяслаў паставіў над Дзвіною мураваную прыгажуню, каб падкрэсліць сваю значнасць, адметнасць ды самастойнасць.

У той жа час Полацк меў цесныя кантакты з суседнімі рускімі землямі. Дынастычная блізкасць княжацкіх дамоў давала магчымасць заваёўваць аўтарытэт і ўплыў прадстаўнікоў любога з іх на шырокай агульнарускай прасторы. Гэтым у свой час скарыстаўся Яраслаў Мудры (трэці сын Рагнеды і Уладзіміра), які прыйшоў з Ноўгарада, заваяваў Кіеў і аб'яднаў вакол дняпроўскай цвярдыні большасць усходнеславянскіх тэрыторый.

Аднак пасля смерці ў 1054 г. самадзяржаўнага кіеўскага князя і раздачы ім пераважнай большасці зямель у княжанне Яраславічам, сістэма княжацкага самакіравання змянілася. Адзінаасобная ўлада трансфармавалася ў трыумвірат Яраславічаў – ужо згаданых Ізяслава, Святаслава і Усевалада. Па папулярнасці ды ўплывовасці з імі мог паспрачацца полацкі лідар Усяслаў.

У другой палове 50-х гг. XI ст. ён пайшоў на збліжэнне з Кіевам. Калі над Усходняй Еўропай з поўдня навісла пагроза качэўнікаў, полацкі праві-

цель дапоўніў сваёй моцнай дружынай войска Яраславічаў, якое ў 1060 г. нанесла агрэсарам адчувальнае паражэнне. Прымаючы ўдзел у гэтай выправе, Усяслаў імкнуўся атрымаць сабе палітычны аўтарытэт на Русі, а пасля ўступіць у барацьбу за лідарства ў агульнарускім рэгіёне. Пацвярджэннем гэтаму з'яўляюцца выступленні полацкага князя ў абарону сваіх пляменнікаў-сірот, якіх трыумвіры адлучылі ад улады ў Смаленску ды Ноўгарадзе, калі пасадзілі туды сваіх сыноў.

На падставе ўзнаўлення справядлівасці, а на самой справе жадаючы падначаліць свайму ўплыву наўгародскія землі, якія знаходзіліся пад кантролем Ізяслава Кіеўскага, Усяслаў у другой палове 60-х гг. XI ст. здзейсніў шэраг паходаў на суседнія паўночныя тэрыторыі.

Першую выправу полацкі князь здзейсніў на Пскоў, але яна была няўдалай. Крыху больш, чым праз год, у 1066 г., Усяславам быў захоплены і разрабаваны Ноўгарад. У адказ Яраславічы выступілі супраць Усяслава. У 1067 г. аб'яднанымі войскамі Ізяслаў, Святаслаў ды Усевалад пайшлі ў напрамку Полацка праз Менск. Як ужо заўважалася, гэты цэнтр на Менцы быў разрабаваны і спалены, а 3 сакавіка 1067 г. на рацэ Нямізе адбылася крывавая сеча паміж кіеўскімі і полацкімі дружыннікамі. Паводле звестак «Аповесці мінулых гадоў», Яраславічы атрымалі перамогу. Аднак перамога тая, улічваючы ўсе акалічнасці, была пірава, практычна роўная паражэнню. Пасля бітвы на Нямізе моц кіеўскага войска была цалкам падарвана, і выправа на Полацк прыпынілася.

Няміга для кіеўскіх трыумвіраў ператварылася ў дзейсны ўрок, пасля якога ім стала зразумела, што ваеннай агрэсіяй Полацкае княства не падначаліць сваёй уладзе і нават уплыву. Тады яны запрасілі полацкага князя на перамовы. Усяслаў даў згоду, маючы спадзяванне на іх крыжацалаванне (г. зн. клятву на сумленнасць). Аднак полацкі князь падманам быў захоплены ў палон і кінуты ў кіеўскую турму, дзе прабыў 14 месяцаў і 5 дзён. Тым не менш нават у зняволенні правіцель Полацка заставаўся буйной палітычнай фігурай, вакол якой аб'ядналіся апазіцыйныя трыумвірам, асабліва кіеўскаму князю Ізяславу, сілы, у тым ліку і ў самой сталіцы Кіеўскай дзяржавы. Так, на баку Усяслава актыўна выступіў Антоній, ігумен Кіева-Пячэрскага манастыра.

У 1068 г. «придоша иноплеменьници на Руську землю, половцы мнози». Супраць іх выступілі тры браты-трыумвіраты – Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад, але перамагчы качэўнікаў-суседзяў рускай дружыне не ўдалося. У бітве, што адбылася на подступах полаўцаў да Кіева, «побегоша руськи и князи, и победиша половци». Ізяслаў з Усеваладам вярнуліся да стольнага града, каб арганізаваць абарону. Жыхары Кіева, паводле «Аповесці

мінулых гадоў», сабралі веча «на торговищи, и реша, пославшеся ко князю: "Се половци росулися (разышліся. – *Аўт.*) по земли; дай, княже, оружье и кони, и ещё бьемся с ними"». Ізяслаў адмовіў «кіянам» у просьбе абараняць ад «паганых» град. Тыя не сцярпелі адмовы і, падзяліўшыся на дзве купы, адной накіраваліся ў Ізяславаў двор, яго «разграбиша, бесчисленое множество злата и серебра, кунами (футра куніцы. – *Аўт.*) и белью (белая шаўковая тканіна. – *Аўт.*). Изяслав же бежа в Ляхи». Другі натоўп пайшоў да поруба, дзе знаходзіўся Усяслаў з двума сынамі; людзі вызвалілі полацкага князя і 15 верасня 1068 г. у выніку першага ў гісторыі Усходняй Еўропы выступлення гарадскіх нізоў пасадзілі яго на кіеўскі прастол.

Усяслаў пракняжыў у Кіеве сем месяцаў. За гэты час яму не ўдалося перацягнуць на свой бок ні большасці гараджан, ні шматлікай знаці. У красавіку 1069 г. Ізяслаў кіеўскі разам з польскімі войскамі свайго цесця Баляслава II рушыў на сталіцу Рускай дзяржавы. Насустрач яму выйшла кіеўскае апалчэнне і полацкая дружына Усяслава. Сустрэліся варагуючыя бакі пад Белгарадам. Але да бітвы справа не дайшла. Адсутнасць дастатковай ваеннай моцы і трывалай падтрымкі ў Кіеве прымусілі Усяслава цвяроза ацаніць сітуацыю і прыняць рашэнне спыніць барацьбу за кіеўскі прастол. Уначы перад мажлівай бітвай ён «утаивая киян, бежа из Белагорода к Полоцку».

Пасля вяртання вялікага кіеўскага княжання Ізяслаў з дапамогай свайго сына Мсціслава расправіўся з паўстанцамі: «…исеча киян, иже беша высекли (вызвалілі. – *Аўт.*) Усеслава, числом 70… а другия слепиша, другия же без вины погуби, не испытав». Надалей уладар сталіцы вырашыў канчаткова падначаліць Полацкае княства, пры гэтым пазбавіцца самага магутнага канкурэнта ў асобе Усяслава. Ізяслаў здолеў выгнаць спадчыннага князя з Полацка і паставіць на яго месца свайго сына Мсціслава. Але той хутка, нечакана памёр. Гэтая смерць зусім маладога, поўнага энергіі чалавека выклікае падазрэнне аб яго атручванні палачанамі, людзьмі Усяслава.

Полацкі князь-выгнаннік накіраваўся шукаць падтрымкі і дапамогі да фіна-ўгорскага племені водзь, адкуль паходзіла яго маці. Без стварэння балта-ўгорскай кааліцыі зварот Полацка быў для Усяслава нерэальным. Для заваявання сімпатый прыбалтыйскага насельніцтва былы ўладар Верхняга і Сярэдняга Падзвіння павінен быў праявіць сябе ў якасці добрага ваяра, які б служыў гэтым народам. Першая спроба зарэкамендаваць сябе слаўным пераможным воінам атрымалася няўдалай. 23 кастрычніка 1069 г. войска племені водзь на чале з Усяславам з'явілася пад сценамі свайго даўняга ворага-саперніка – горада Ноўґарада Вялікага. Гэтая выправа полацкага ўладара на старажытную цвярдыню закончылася паражэннем і нават па-

лонам Усяслава Чарадзея. Праўда, каб не ўскладняць адносіны ў сваім рэгіёне, наўгародцы ў хуткім часе адпусцілі полацкага князя.

Два гады не сустракалася імя Усяслава на старонках летапісаў. Пэўна, ён збіраў і мацаваў дружыну, пакуль правіцелем Полацка быў другі кіеўскі стаўленік – сын таго ж Ізяслава Святаполк. Нарэшце ў 1071 г. Чарадзей з'явіўся пад Полацкам з войскам, якое складалася з літоўцаў, эстаў, ліваў, сямігалаў. Гэтым разам удача спадарожнічала Брачыславічу і бацькоўскі прастол быў ім адваяваны.

З гэтага моманту – пачатку 70-х гг. XI ст. – актыўнасці полацкага князя ў агульнарускай палітыцы амаль не назіралася. Пераканаўшыся, што выйсці на першыя ролі ў барацьбе за Кіеў яму не ўдасца, Усяслаў трывала замкнуў свае межы. Зрэдку полацкі ўладар прымаў удзел у спрэчках малодшых князёў з роду Яраславічаў з іх старэйшымі папярэднікамі. Летапісы адзначаюць безвыніковы напад Брачыславіча на Ноўгарад у 1077 г. Усяслаў хадзіў на Смаленск, які належаў на той час сыну кіеўскага князя Усевалада – Уладзіміру Манамаху. Горад быў спалены. Манамах знаходзіўся ў Чарнігаве і спрабаваў дагнаць Усяслава. Мяняючы коней («о двух конях», як зафіксавана ў летапісах) Уладзімір Усеваладавіч проста кінуўся ў пагоню за полацкім лідарам, праўда, няўдала. Але няўдачы малодшых князёў Рурыкавічаў – Барыса і Алега – у бітве 1078 г. на Няжацінай ніве супраць старэйшых князёў Ізяслава (які загінуў у гэтай сутычцы) і Усевалада прыпынілі актыўнасць падзвінскага князя ў антыкіеўскіх выступленнях. Кіеўскія правіцелі ды іх прыспешнікі таксама зразумелі немажлівасць поўнага падначалення сваёй уладзе магутнай Полацкай зямлі і прыпынілі спробы гэта ажыццявіць. Суседзямі – рускімі князямі, у прыватнасці Манамахам, у адплату за смаленскую выправу рабіліся вакольныя выпады на памежныя полацкія ўмацаванні (у 1078 г. – на Друцк, 1084 г. – на Менск). Як падкрэсліў у пазнейшым «Павучэнні» сам Уладзімір Усеваладавіч, у гэтым цэнтры на рацэ Менцы ім не было пакінута «ни чалядина, ни скотины…».

З 1084 па 1092 г. летапісцы маўчаць аб гісторыі Полаччыны. Менавіта ў 1092 г. у горадзе на Заходняй Дзвіне адбылася значная трагедыя – эпідэмія, якая панесла шмат жыццяў. «Аповесць мінулых гадоў» прысвяціла гэтай падзеі даволі шмат радкоў, настолькі яна была значнай: «Предиво было чюдо в Полоцке... бывше в ночи... станяше по улици, яко человеци рищюще бесы. Аще кто вылезяще ис хоромины, хотя видети, абье (адразу. – *Аўт.*) уязвен будяще невидимо от бесов язвою, и с того умироху, и не смеху излазити ис хором. Посемь же начаша в дне являтиша на коних, и не бя их видеть самих, но конь их видети копата; и тако уязвлеху люди полоцкия и его обласць. Темь и человеци глаголяху, яко навье (мерцвякі, ці,

больш дакладна душы памерлых. – *Аўт.*) бьюць полочан. Се же знаменье ноча быти от Дрьютьска».

Постаць Усяслава Чарадзея не згадвалася на старонках летапісаў з сярэдзіны 80-х гг. XI ст. да яго скону ў 1101 г. Нават на княжацкіх з'ездах у Любечы (1097) і Віцічаве (1100), дзе вырашаліся прынцыповыя пытанні аб падзеле Кіеўскай Русі («Пусть каждый владеет отчиной своей»), полацкі князь не з'яўляўся. Тое заканамерна, бо пытанне аб самастойнасці яго ўжо не хвалявала. Усяслаў упэўнена адчуваў сябе ў сваёй дзяржаве, дзе ён, як у 1068–1069 гг. у Кіеве, паводле «Слова аб паходзе Ігаравым», «людям суд правил, князьям города рядил (раздаваў. – *Аўт.*)». Сапраўды, яшчэ пры жыцці Усяслаў размеркаваў цэнтры Полацкага княства паміж шасцю сынамі, і гэта дзяржаўная адзінка пачала драбіцца на ўдзелы. Узніклі асобныя Менскае, Ізяслаўскае, Друцкае, Лагойскае і Віцебскае княствы. Нейкі час пад уладай князя Глеба Усяславіча (1104–1119) вельмі моцным было Менскае княства. Але і яно пазней распалася на ўдзелы. Гэты працэс быў характэрны для ўсіх рускіх княстваў. Пачаўся перыяд удзельна-феадальнай раздробленасці, у выніку якога ў XII ст. Кіеўская Русь спыніла існаванне як адзіная дзяржава.

Усяслаў Брачыславіч пражыў па тым часе працяглае жыццё. Не стала яго ў 1101 г. «месяца апреля в 14 день, в 9 час дня, в среду», і тое, што аўтар «Аповесці мінулых гадоў» толькі для аднаго князя Усяслава пазначыў дакладны час смерці, яшчэ раз сведчыць, наколькі значнай была асоба гэтага палітыка ў тагачаснай гісторыі.

Такім чынам, Полацкае княства ў канцы X–XI стст. уяўляла сабой самастойную, незалежную дзяржаву. Пры гэтым яно знаходзілася ў трывалай сувязі з іншымі рускімі княствамі і разам з імі складала часам цесны (канец X – пачатак XI ст.), а часам не вельмі трывалы (другая палова 60-х гг. XI – пачатак XII ст.), але кангламерат, які быў падрыхтаваны да дзяржаўнага аб'яднання.

## ФЕАДАЛЬНАЕ ДРАБЛЕННЕ ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ

Перыяд раздробленасці – гэта заканамерны этап развіцця любой феадальнай дзяржавы. Не абмінуў ён і Полацкае княства, якое стала распадацца на ўдзелы пасля смерці Усяслава Чарадзея. Праўда, не выключана, што гэты працэс быў распачаты яшчэ пры яго жыцці. У любым выпадку ўжо з 1104 г. вядома пра існаванне ў межах Полацкай зямлі асобнага Менскага княства, на чале якога стаў вельмі амбітны і энергічны Глеб Усяславіч. У той жа час Полацк заставаўся самым прэстыжным горадам зямлі, яго гістарычным,

палітычным, рэлігійным і гандлёва-эканамічным цэнтрам. Кожны з Усяславічаў меў права і, відаць, разлічваў заняць тамтэйшы прастол. Але дынастыя разрасталася, і такіх магчымасцей станавілася ўсё менш.

Шэраг вострых канфліктаў Глеба Менскага з кіеўскімі князямі прывялі да таго, што ў 1119 г. Уладзімір Манамах прымусіў Глеба скласці зброю, вывеў яго з Менска ў Кіеў, дзе Усяславіч і памёр 13 верасня згаданага года. Праз нейкі час адбыўся канфлікт паўднёварускіх князёў з полацкім князем Давыдам Усяславічам. У 1128 г. ён адмовіўся ісці разам з імі вайной на качэўнікаў у стэп. За гэта вялікі князь кіеўскі Мсціслаў Уладзіміравіч арганізаваў вялікую кааліцыю падуладных яму рускіх князёў, якая здзейсніла грандыёзны карны паход на Полацкую зямлю. Усяславічы былі вымушаны выказаць пакору. У 1129 г. Мсціслаў выслаў іх разам з сем'ямі ў Візантыю, а Полацкам пачалі кіраваць кіеўскія стаўленікі.

Аднак гэты перыяд аказаўся нядоўгім. Пасля смерці Мсціслава ў 1132 г. працэс феадальнага драблення Кіеўскай Русі набыў незваротны характар. Улада Кіева над іншымі гарадамі Русі з кожным годам слабела. У канцы 1130-х гг. у Полацкай зямлі зноў княжылі прадстаўнікі мясцовай дынастыі, якія вярнуліся з замежнай высылкі. Тым не менш працэс феадальнага драблення ахапіў і Полаччыну, дзе ў сярэдзіне XII ст. існавала ўжо некалькі ўдзельных княстваў. Паступова вылучыліся тры лініі Усяславічаў (нашчадкі Барыса Усяславіча замацавалі за сабой Друцк, Глебавічы – Менск, Васількавічы – Віцебск), прадстаўнікі якіх змагаліся за ўладу ў самым важным цэнтры зямлі – Полацку.

Ва ўмовах канкурэнцыі князёў усё большую ролю ў грамадска-палітычным жыцці пачало адыгрываць гарадское насельніцтва. Вечавыя сходы пачалі вырашаць важнейшыя праблемы жыцця гарадоў і зямель. Гараджане сталі ледзь не галоўнай сілай у барацьбе князёў за ўладу.

У 1151 г. палачане выгналі непажаданага ім князя Рагвалода Барысавіча і запрасілі Расціслава Глебавіча. Аднак праз сем гадоў яны памянялі сваю пазіцыю і вырашылі вярнуць Рагвалода. Для гэтага ім давялося выгнаць Расціслава. Разгарнулася барацьба паміж канкурэнтамі, пераможцам у якой выйшаў прадстаўнік трэцяй лініі Усяславічаў – Усяслаў Васількавіч, які кіраваў Полацкам дастаткова доўгі час – з 1161 па 1184 г. (з невялікім перапынкам).

Такім чынам, Полацкая зямля была аслаблена міжусобіцамі, якія з'яўляліся неад'емным атрыбутам феадальнай раздробленасці. Але практычна адначасова, у другой палове XII ст., ускладнілася і знешнепалітычнае становішча Полацкай зямлі. На яе межах з'явіліся сур'ёзныя праціўнікі.

Першым з іх быў Смаленск. Уздым гэтага горада звязаны з дзейнасцю князя Расціслава Мсціславіча, які кіраваў ім у 1125–1159 гг. і здолеў

ператварыць горад у цэнтр буйнога і вельмі моцнага княства. Справу бацькі працягвалі яго нашчадкі. Як вынік, ужо ў другой палове XII ст. Смаленск пачаў актыўна ўмешвацца ва ўнутраныя справы Полацкай зямлі, прэтэндуючы на яе ўсходнія ўскраіны – напрыклад на Віцебск. Справа дайшла да таго, што ў 1222 г. смаляне захапілі Полацк. Тут стаў княжыць прадстаўнік смаленскай дынастыі Святаслаў Мсціславіч. Праўда, праз 10 гадоў ён уступіў у барацьбу за Смаленск, разам з палачанамі напаў на яго і ўзяў горад «на шчыт».

Яшчэ адным праціўнікам палачан сталі немцы, якія першапачаткова з'явіліся на полацкіх межах як хрысціянскія прапаведнікі і купцы. У 1184 г. яны высадзіліся ў вусці Даўгавы (Дзвіны) і пачалі прапаведніцкую дзейнасць сярод мясцовага язычніцкага насельніцтва – ліваў. Лівы былі даннікамі полацкіх князёў, і немцы былі вымушаны наведаць Полацк і атрымаць дазвол на сваю дзейнасць. Але з цягам часу сітуацыя змянілася. Убачыўшы, што мірная пропаведзь не дае пажаданага выніку, немцы перайшлі да больш рашучых, у тым ліку сілавых дзеянняў. Яны пачалі будаваць у ніжнім цячэнні Дзвіны замкі – напрыклад, у 1201 г. заснавалі Рыгу. Яшчэ большае значэнне мела арганізацыя ў 1202 г. ваенна-манаскага Ордэна мечаносцаў, які нёс веру Хрыстову з дапамогай зброі.

Адначасова пачалі псавацца адносіны паміж немцамі і палачанамі. Першы канфлікт паміж імі адбыўся ўжо ў 1203 г. Полацкае войска здзейсніла паход на нямецкія замкі Іксюль і Гольм, які, аднак, аказаўся беспаспяховым: палачане не ўмелі браць такія ўмацаванні. У наступныя тры дзесяцігоддзі немцы падпарадкавалі практычна ўсе полацкія ўладанні ў ніжнім цячэнні Дзвіны, захапіўшы невялікія гарады і княствы Герцыке і Кукенойс. Ужо ў 30-х гг. XIII ст. немцы выйшлі да заходніх меж уласна Полацкай зямлі з яе славянскім насельніцтвам. Страта Ніжняга Падзвіння стала вельмі балючым ударам па Полацку, бо яго магутнасць напрамую залежала ад кантролю над дзвінскім гандлёвым шляхам.

Нарэшце, на паўднёвым захадзе ад Полацкай зямлі ўзнікла яшчэ адна небяспечная сіла – літоўцы. Полацкія князі здаўна былі добра знаёмыя з гэтым народам. На працягу першай паловы – сярэдзіны XII ст. яны нярэдка выкарыстоўвалі літоўцаў у сваіх дружынах як ваяроў. Але ў апошняй трэці XII ст. расстаноўка сіл змянілася. Літоўцы выйшлі з падпарадкавання і пачалі здзяйсняць рабаўнічыя напады на Полацкую зямлю. Полацкія князі спрабавалі абараніць свае ўладанні, але зрабіць гэта было ўжо вельмі складана: літоўцы ператварыліся ў сур'ёзную ваенную пагрозу. Палачане пачалі цярпець паражэнні і ў адкрытых бітвах. Адну з іх апісвае славуты твор «Слова пра паход Ігаравы»:

Уже бо Сула не течет сребреными струями к граду Переяславлю,
И Двина болотом течет оным грозным полочаном под кликом
поганых.
Един же Изяслав, сын Васильков,
Позвони своими острыми мечи о шеломы литовския,
Притрепа славу деду своему Всеславу,
А сам под черлеными щиты на кроваве траве притрепан
литовскыми мечи…
Не бысть ту брата Брячяслава, ни другаго – Всеволода,
Един же изрони жемчюжну душу из храбра тела чрес злато
ожерелие….

Ужо ў 1216 г. літоўцы ваявалі пад Полацкам, а ў 30–40-я гг. XIII ст. зафіксаваны іх напады на Наўгародскую і Смаленскую землі. У 1239 г. апошні раз згадваецца прадстаўнік мясцовай княжацкай дынастыі ў Полацку – Брачыслаў. У далейшым тут княжылі ўжо літоўскія князі ці іх стаўленікі. Для Полацкай зямлі пачаўся працяглы перыяд паступовай інтэграцыі ў Вялікае Княства Літоўскае.

Полацкае княства было першым дзяржаўным утварэннем на беларускіх землях. Часам прызнаючы ўладу Кіева, а часам набываючы самастойнасць, полацкія князі здолелі стварыць дзяржаву, якая займала віднае месца на Русі. Яе рост у многім быў абумоўлены ваеннай актыўнасцю палачан, а таксама здольнасцю знаходзіць кампрамісы з суседзямі. Полацкае княства вельмі рана выявіла памкненні да самастойнага развіцця і выхаду з-пад вярхоўнай улады Кіева. Тым не менш яно вельмі хутка было ахоплена тым самым працэсам феадальнага драблення, які адбываўся ў XII–XIII стст. у маштабах усёй Русі. У выніку Полацкая зямля страціла сваё дзяржаўна-палітычнае і тэрытарыяльнае адзінства. Яна распалася на шэраг удзельных княстваў, якія траплялі пад уплыў больш буйных і больш моцных дзяржаўных утварэнняў.

# 5 ТУРАЎСКАЕ КНЯСТВА. ЗЕМЛІ БЕЛАРУСКАГА ПАБУЖЖА, ПАНЯМОННЯ І ПАСОЖЖА

- **Фарміраванне Тураўскай зямлі і яе месца ў сістэме княстваў Старажытнай Русі**
- **Тураўскае княства ў XI – сярэдзіне XII ст.**
- **Пабужскі, Панямонскі і Пасожскі рэгіёны**

## ФАРМІРАВАННЕ ТУРАЎСКАЙ ЗЯМЛІ І ЯЕ МЕСЦА Ў СІСТЭМЕ КНЯСТВАЎ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ

Станаўленне дзяржаўнасці на землях усходніх славян было доўгім і складаным працэсам, які меў даволі значныя рэгіянальныя асаблівасці. Некаторыя тэрыторыі ўвайшлі ў склад Старажытнарускай дзяржавы яшчэ на раннім этапе яе існавання, іншыя ж – толькі праз нейкі час. Шэраг племянных княжанняў стаў асновай для пазнейшых княстваў, тады як іншыя не знайшлі развіцця ў якасці самастойных дзяржаўных ці адміністрацыйных утварэнняў. Абставіны падпарадкавання некаторых тэрыторый кіеўскім ці наўгародскім князям застаюцца нявысветленымі. Сярод апошніх – палескія землі, населеныя дрыгавічамі. На жаль, мы не ведаем дакладнай даты і акалічнасцей іх пераходу пад уладу вялікіх князёў кіеўскіх. Аднак, паводле ўскосных даных, гэта адбылося ў X ст., калі землі на поўдні сучаснай Беларусі ўжо дасягнулі дастаткова высокай ступені гаспадарчага развіцця і грамадскай арганізацыі. Аб гэтым сведчыць, у прыватнасці, існаванне тут даволі буйных гарадоў, у першую чаргу Турава, які адыграў важнейшую ролю ва ўзнікненні і фарміраванні адпаведнага княства.

Заснавальнікам горада лічаць князя Тура, аднак у гістарыяграфіі няма адзінага меркавання адносна яго асобы. Некаторыя аўтары лічаць Тура славянінам, некаторыя варагам, частка ж даследчыкаў увогуле адмаўляе гістарычнасць гэтага чалавека і ўспрымае яго постаць як легендарную.

Сам Тураў упершыню згаданы ў пісьмовых крыніцах пад 980 годам. Як і большасць старажытных гарадоў Беларусі, сталіца Тураўскага княства ўзнікла на мысе пры ўпадзенні ў буйную раку (Прыпяць) невялікага прытока. Увесь час існавання горада Прыпяць з'яўлялася для яго важнейшым транспартным і гандлёвым шляхам. Па гэтай рацэ княжацкая сталіца мела зручнае злучэнне з Кіевам і Кіеўскай зямлёй на ўсходзе, а на захадзе вярхоўі Прыпяці блізка падыходзілі да цячэння Заходняга Буга. Там склалася Уладзіміра-Валынскае княства, якое стала адным з найважнейшых суседзяў і адначасова адным з самых небяспечных сапернікаў Тураўскай зямлі. Буг выконваў таксама ролю шляху камунікацыі, які злучаў яе сталіцу з польскімі землямі.

Звесткі пісьмовых крыніц пра Тураў істотна папоўніліся дзякуючы археалагічным даследаванням. Раскопкі ўказваюць на тое, што горад сапраўды ўзнік, верагодней за ўсё, у канцы 1-га тысячагоддзя. Умацаваная частка паселішча складалася з невялікіх па плошчы дзяцінца і вакольнага горада, якія былі падзелены паміж сабой абарончым валам. Аднак плошча гандлёва-рамеснага пасада была вельмі значнай і перавышала 30 гектараў. Такім чынам, гэта быў добра развіты ў сацыяльна-эканамічных адносінах, сур'ёзна ўмацаваны горад, які да таго ж меў шматлікае насельніцтва. Мяркуючы па ўсім, шчыльна была заселена таксама гарадская акруга.

Тураўскае княства ўзнікла ў канцы X ст. у басейне Прыпяці – на землях, заселеных дрыгавічамі. Большасць даследчыкаў лічыць, што яму папярэднічала іх племяннoе княжанне. Аднак улада Турава распаўсюджвалася не на ўсе дрыгавіцкія землі, некаторыя з якіх трапілі ў склад іншых княстваў Старажытнай Русі. Увогуле ж, межы Тураўшчыны дакладна высветліць немагчыма. Апрача таго, на працягу стагоддзяў яны даволі моцна змяняліся. Стабільнай была толькі прыналежнасць да Тураўскай зямлі тэрыторый па сярэдняй і верхняй Прыпяці. Менавіта ў гэтым раёне размяшчаліся сталіца і такія важныя гарадскія цэнтры, як Пінск і Давыд-Гарадок. На ўсходзе тэрыторыя Тураўскага княства не даходзіла да Дняпра, а на поўначы ўключала раён Слуцка і Клецка. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што Тураў то страчваў гэтыя гарады, то вяртаў іх назад. Асаблівай жа нестабільнасцю вылучаліся заходняя і паўднёвая межы зямлі. Пісьмовыя крыніцы не даюць магчымасці нават прыблізна акрэсліць іх. Спрэчнай тэрыторыяй паміж Тураўскім, Кіеўскім і Уладзіміра-Валынскім княствамі быў раён Пагарыння. Тураўскае і Уладзіміра-Валынскае княствы пры актыўным удзеле Кіева спрачаліся таксама за раён Берасця.

Побач з Туравам на працягу XI–XII стст. узнік цэлы шэраг даволі значных гарадоў. Шляхі іх узнікнення былі рознымі, але пераважная іх большасць склалася ў месцах з добрымі камунікацыямі, ролю якіх тады адыгрывалі галоўным чынам рэкі, і з урадлівымі глебамі. Абедзве названыя характарыстыкі падыходзяць і да раёна, дзе паўстаў сам Тураў. Даследаванні паказалі, што практычна ўсе гарады Тураўскай зямлі былі пабудаваны ў добра асвоеных у гаспадарчым плане і шчыльна заселеных раёнах.

Геаграфічнае становішча Тураўшчыны, якая размяшчалася на невялікай адлегласці ад сталіцы Кіеўскай Русі і была злучана з ёй зручнымі шляхамі – рэкамі, у многім абумовіла яе становішча і гісторыю ў складзе Старажытнарускай дзяржавы. У адрозненне ад Полацкага, Тураўскае княства вельмі доўгі час не выяўляла імкнення да самастойнасці. Нярэдка яно знаходзілася ў падпарадкаванні непасрэдна вялікіх князёў кіеўскіх. Можна прасачыць пэўныя заканамернасці ў выпадках, калі кіеўскія манархі перадавалі Тураў у кіраванне аднаму са сваіх сыноў. Часцей за ўсё Тураў даставаўся трэцяму сыну кіеўскага вялікага князя. Аднак гэта правіла ніколі строга не вытрымлівалася. Апрача таго, трэба мець на ўвазе, што іерархія гарадоў на Русі на працягу стагоддзяў прыкметна мянялася. Таксама вядомы выпадкі, калі найбольш верагодныя спадкаемцы вялікіх князёў кіеўскіх (сыны, пляменнікі) самі пераходзілі ў Тураў, пакідаючы дзеля гэтага нават больш прэстыжныя і багатыя сталы – напрыклад наўгародскі. Гэты іх тактычны крок быў абумоўлены імкненнем быць бліжэй да Кіева і ў выпадку смерці вялікага князя хутка, без ускладненняў заняць тамтэйшы прастол. Аднак ва ўсіх пералічаных выпадках Тураўская зямля і тураўскія князі не былі зацікаўлены ў канфліктах з Кіевам. Наадварот, Тураў неаднаразова станавіўся тым своеасаблівым плацдармам, з якога мясцовыя князі прыходзілі ў Кіеў.

На становішча Тураўскай зямлі таксама ўплывала палітыка, якую праводзілі кіеўскія манархі. Адным з галоўных пераўтварэнняў, якое здзейсніў вялікі кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч, было змяненне сістэмы кіравання. У ранейшы перыяд вялікія князі кіеўскія, відаць, абмяжоўваліся тым, што залежныя гарады і рэгіёны проста прызнавалі іх вярхоўную ўладу. Дакладна невядома нават, ці трымалі кіеўскія манархі сваіх прадстаўнікоў у гэтых гарадах. Магчыма, залежнасць той ці іншай зямлі ад Кіева выяўлялася толькі ў перыядычным зборы даніны на карысць вялікага князя, а таксама ў абавязку выстаўляць войска па яго патрабаванні. Такая сістэма дзейнічала доўгі час і, падобна, усіх задавальняла. Сярод іншага яна дазваляла старой родаплемяннай знаці захоўваць трывалыя пазіцыі ў сваіх землях. Дзе-нідзе (як, напрыклад, ва ўскраіннай зямлі вяцічаў) яшчэ дастаткова доўга, аж да

канца XI ст. існавалі і свае князі. Аднак з пэўнага часу род Рурыкавічаў і яго галава – вялікі князь кіеўскі Уладзімір – пачалі разглядаць усе падпарадкаваныя землі як сваё велізарнае сямейнае ўладанне. Права кіраваць і распараджацца ім належала толькі прадстаўнікам роду. Адным з наступстваў гэтых змяненняў у свядомасці сталі змены ў палітыцы кіеўскага князя, у тым ліку адміністрацыйная рэформа Уладзіміра.

У адпаведнасці з рэформай, Тураў дастаўся Святаполку, які быў трэцім па старэйшынстве сынам Уладзіміра, але пасля смерці братоў Вышаслава (княжыў у Ноўгарадзе) і Ізяслава (кіраваў Полацкам) застаўся старэйшым з Уладзіміравічаў і галоўным прэтэндэнтам на вярхоўную ўладу. Каля 1010 г. ён ажаніўся з дачкой польскага князя, а пазней караля Баляслава І Храбрага. Гэта яшчэ больш павышала яго аўтарытэт унутры дзяржавы і па-за яе межамі. Тым не менш шлях да ўлады аказаўся для Святаполка няпростым. У 1012 г. ён, яго жонка і яе духоўнік польскі біскуп Рэйнберн па загадзе Уладзіміра былі схоплены і кінуты ў турму. Прычыны гэтага кроку вялікага князя дакладна невядомыя, але арышт Святаполка мог быць звязаны з планамі Уладзіміра памяняць свайго пераемніка. Хадзілі чуткі, што гэтым пераемнікам павінен быў стаць іншы яго сын – Барыс. Праўда, праз нейкі час Святаполка вызвалілі, але ў далейшым ён знаходзіўся пад пастаянным наглядам, жывучы недалёка ад Кіева, у Вышгарадзе.

Калі памёр Уладзімір (15 ліпеня 1015 г.), Святаполк знаходзіўся ў Кіеве і хутка заняў велікакняжацкі прастол. Дзеля павышэння аўтарытэту сваёй улады прыблізна ў 1016 г. ён распачаў чаканку манеты – срэбранікаў са сваім імем. Але становішча новага вялікага князя было дастаткова хісткім. Не ўсе браты пагадзіліся з укняжаннем Святаполка, што прывяло спачатку да абвастрэння сітуацыі, а потым і да адкрытай вайны за кіеўскі трон. У ходзе гэтай вайны загінулі Барыс, Глеб і Святаслаў Уладзіміравічы. Крыніцы рускага паходжання ўскладаюць усю віну за іх забойства на Святаполка, называючы яго «акаянным». Больш за тое, яны прыпісваюць Святаполку далейшыя злачынныя намеры: «Избью всю братью свою и приму власть Рускую единъ». Аднак іншыя крыніцы сведчаць аб тым, што ў рэчаіснасці сітуацыя выглядала не так адназначна. Напрыклад, скандынаўскія сагі паведамляюць пра тое, што Барыс быў забіты па загадзе іншага брата – наўгародскага князя Яраслава Уладзіміравіча, які таксама ўключыўся ў барацьбу за Кіеў.

Тым не менш Святаполк сапраўды быў непераборлівы ў сродках адстойвання ўлады. У прыватнасці, ён вельмі актыўна выкарыстоўваў замежныя сілы. Калі Яраслаў упершыню прымусіў яго пакінуць Кіеў, а гэта здарылася ў 1016 г., Святаполк накіраваўся да свайго цесця Баляслава Хра-

брага. Праз два гады пры падтрымцы палякаў Святаполк здолеў вярнуць сабе сталіцу Русі. Але, незадаволены паводзінамі Баляслава, які ўзяў пад свой кантроль Кіеў і іншыя гарады, ён стаў падбухторваць кіяўлян да выгнання замежнікаў. У выніку Баляслаў быў вымушаны ўцякаць у Польшчу, што вельмі хутка аслабіла пазіцыі самога Святаполка, які ў 1018 г. зноў быў выгнаны Яраславам з Кіева. На гэты раз Святаполк накіраваўся да печанегаў. У 1019 г. на рацэ Альце паміж сапернікамі адбылася вырашальная бітва, у якой перамог Яраслаў. Святаполк уцёк у Польшчу, дзе на мяжы з Чэхіяй і памёр.

Святаполка можна лічыць фактычна першым гістарычным тураўскім князем, бо летапісны Тур з'яўляецца, хутчэй за ўсё, постаццю легендарнай. На жаль, мы мала ведаем пра становішча і падзеі, якія адбываліся ў Тураўскай зямлі ў гэты перыяд. Можна ўпэўнена гаварыць хіба што толькі пра пачатак хрысціянізацыі краю.

## ТУРАЎСКАЕ КНЯСТВА Ў XI – СЯРЭДЗІНЕ XII ст.

Новы вялікі князь Яраслаў, верагодна, забраў Тураў пад сваю непасрэдную ўладу. Як і яго бацька Уладзімір, па меры сталення сыноў Яраслаў пачаў накіроўваць іх на княжанне ў гарады Русі. Тураў дастаўся другому сыну – Ізяславу. Пасля смерці яго старэйшага брата наўгародскага князя Уладзіміра ў 1052 г. Ізяслаў застаўся галоўным прэтэндэнтам на кіеўскі велікакняжацкі пасад. І сапраўды, у 1054 г. ён стаў вялікім князем. Тураў ён захаваў за сабой, і з таго часу горад больш за трыццаць гадоў не меў свайго асобнага князя. Пра пэўнае зніжэнне значэння Турава ў сістэме рускіх княстваў сведчыць і той факт, што ў 1078 г. новы вялікі князь кіеўскі Усевалад Яраславіч перадаў гэты горад свайму пляменніку Яраполку Ізяславічу – але толькі як дадатак да яго галоўнага Уладзіміра-Валынскага стала.

Тураў выйшаў з ценю ў 1088 г., калі там пачаў княжыць старэйшы з Яраслававых унукаў Святаполк Ізяславіч. Ён меў усе правы заняць кіеўскі трон пасля смерці свайго дзядзькі Усевалада. Імкненне быць бліжэй да Кіева з'явілася, відаць, галоўнай прычынай таго, што Святаполк ахвяраваў дзеля Турава багатым і прэстыжным Ноўгарадам, дзе ён раней княжыў. Святаполк стварыў у Тураве моцную базу, сабраўшы там шмат сваіх прыхільнікаў. Ён здолеў рэалізаваць свае планы ў 1093 г., калі памёр Усевалад. Сын апошняга, славуты ў далейшым Уладзімір Манамах не рызыкнуў змагацца за ўладу і, згодна з паведамленнем летапісу, сам паслаў па Святаполка ў Тураў.

На пачатковым этапе княжання Святаполк трапіў у даволі складанае становішча. Уплывовая дружына ранейшых вялікіх князёў кіеўскіх была

вельмі незадаволена тым, што ён стаў адсоўваць яе ад кіравання, спрабуючы абаперціся на ўласную, тураўскую дружыну. Летапісец называе новую дружыну малодшай і звязвае пралікі першых гадоў княжання Святаполка з яе недасведчанасцю. У гэтай сітуацыі новы кіеўскі ўладар быў надзвычай зацікаўлены ў падтрымцы з боку сваіх стрыечных братоў. Асабліва важную ролю сярод іх стаў адыгрываць Уладзімір Манамах, які княжыў у Чарнігаве. У 1097 г. Святаполк і Уладзімір сталі ініцыятарамі правядзення з'езда князёў-Яраславічаў у Любечы. Тут яны паспрабавалі вырашыць надзвычай важную і на той час ужо вельмі складаную праблему спадчыннасці ўдзелаў, якая ўсё часцей прыводзіла да міжусобіц. Вынікам любецкага з'езда было пагадненне, паводле якога князі абавязваліся трымаць толькі ўладанні бацькі («кождо да держить отчину свою») і не прэтэндаваць на ўдзелы іншых. Праўда, гэта пагадненне не спыніла ўсобіц, якія літаральна ў тым жа годзе выбухнулі з новай сілай і прывялі да нечуванай на Русі падзеі – асляплення церабоўльскага князя Васількі.

Увесь час праўлення Святаполка ў Кіеве Тураўская зямля ўваходзіла ў склад велікакняжацкіх уладанняў. Увогуле ж, пачынаючы з часоў Яраслава Мудрага, Тураў пастаянна знаходзіўся пад уладай прадстаўнікоў старэйшай лініі яго нашчадкаў: Ізяслава, Яраполка, Святаполка. Аднак наўрад ці пра іх можна гаварыць як пра самастойную тураўскую княжацкую дынастыю, якая мела нейкія выключныя, спадчынныя правы на гэты горад. Хутчэй, справа была ў тым, што Тураў быў ужо вельмі шчыльна звязаны з Кіевам і тамтэйшыя ўладары разглядалі яго як складовую частку свайго велікакняжацкага дамена, распараджаючыся Тураўскай зямлёй у адпаведнасці з патрэбамі бягучага палітычнага моманту. Варта падкрэсліць, што гэта стаўленне да Тураўскай зямлі было ўласціва не толькі Ізяславічам.

У 1113 г. пасля смерці Святаполка вялікім князем стаў Уладзімір Манамах. Ён адразу забраў Тураў у лік сваіх уладанняў і, такім чынам, распарадзіўся ім так жа, як гэта рабілі яго папярэднікі, вялікія князі кіеўскія. Праз нейкі час пасля смерці Манамаха ў 1125 г. Тураў заняў яго трэці сын Вячаслаў, які на працягу свайго жыцця некалькі разоў валодаў Тураўскай зямлёй. Тураўцы на чале з Вячаславам прымалі ўдзел у шэрагу буйных ваенных акцый агульнарускага значэння, арганізатарамі якіх былі вялікія князі кіеўскія Мсціслаў, а потым Яраполк Уладзіміравічы. Так, у 1127 г. яны хадзілі на Полацк, а ў 1138 г. на Чарнігаў. Такім чынам, Вячаслаў дзейнічаў цалкам у рэчышчы палітыкі сваіх братоў – Манамашычаў. Відавочна, ён разлічваў пасля смерці старэйшых братоў заняць Кіеў – у адпаведнасці з прынятым на Русі парадкам спадкаемнасці трона.

Аднак смерць вялікага князя Яраполка 18 лютага 1139 г. прывяла да рэзкай змены сітуацыі. Вячаслаў з Турава хутка накіраваўся ў Кіеў і адразу

заняў велікакняжацкі пасад. Але трыумф Вячаслава быў нядоўгім, ён трымаў уладу ў сваіх руках усяго дзесяць дзён (з 22 лютага па 4 сакавіка) і быў вымушаны вярнуцца ў Тураў, саступіўшы Кіеў энергічнаму Усеваладу Ольгавічу. На кіеўскі трон упершыню за доўгі час уступіў прадстаўнік чарнігаўскай дынастыі, і гэта нягледзячы на тое, што Ольгавічы мелі на вярхоўную ўладу добра абгрунтаваныя дынастычныя правы, бо паходзілі ад другога сына Яраслава Мудрага – Святаслава.

У 1142 г. Усевалад Ольгавіч выгнаў Вячаслава з Турава. Сваё рашэнне ён патлумачыў Манамашычу вельмі красамоўным аргументам: «седиши во Киевьскои волости, а мне достоить...». Іншымі словамі, Усевалад лічыў Тураўшчыну часткай Кіеўскай зямлі, якая належала яму як вялікаму князю. Кіраваць Туравам ён прызначыў свайго сына.

Пасля смерці Усевалада ў 1146 г. на кіеўскі прастол уступіў унук Манамаха Ізяслаў Мсціславіч, і ўлада ў Кіеве вярнулася да нашчадкаў Усевалада Яраславіча. Палітыка князёў гэтай дынастычнай лініі ў дачыненні да Тураўскай зямлі была ранейшай і нічым прынцыпова не адрознівалася ад палітыкі, якую праводзіў Усевалад Ольгавіч. Ізяслаў перадаў Тураў свайму сыну Яраславу. Аднак, каб дамагчыся свайго, Ізяславу ўжо давялося змагацца з тураўцамі – прыхільнікамі Вячаслава Уладзіміравіча. У Тураўскай зямлі адбываўся працэс узмацнення гарадскіх абшчын, які тады ішоў практычна паўсюль на Русі. Вялікі князь Ізяслаў загадаў схапіць тураўскага епіскапа Якіма, тамтэйшых пасаднікаў і, «исковавъ», адправіў іх у Кіеў.

Увогуле ж, палітычная біяграфія Вячаслава Уладзіміравіча выразна сведчыць пра тое, што гэты князь быў вельмі прыхільны Тураву. На працягу жыцця ён чатыры разы займаў тамтэйшы стол, кожны раз вяртаючыся ў Тураў з іншых гарадоў – у тым ліку і з надзвычай важнага для Манамашычаў іх вотчыннага Пераяслава. Вялікія князі кіеўскія з ліку нашчадкаў Уладзіміра Манамаха звычайна прызначалі княжыць у Пераяслаў сваякоў, якіх жадалі бачыць сваімі непасрэднымі пераемнікамі на кіеўскім прастоле. З другога боку, згаданыя вышэй падзеі паказалі, што тураўцы таксама былі прыхільныя Вячаславу. Не апошнюю ролю адыгрывалі тут меркаванні прэстыжу – Вячаслаў быў сынам Уладзіміра Манамаха. Важнейшую ролю ў фарміраванні пазіцыі і дзеяннях тураўскага князя адыгрывала тутэйшая знаць – баярства, сталай падтрымкай якога карыстаўся Вячаслаў. Але баяры не былі паслухмянай і падпарадкаванай князю сілай. Яны мелі ўласныя інтарэсы і ўласную пазіцыю. Менавіта тураўскія баяры з'явіліся ініцыятарамі захопу Вячаславам у 1146 г. шэрагу гарадоў. Князь здолеў скарыстаць зручную сітуацыю (смерць Усевалада Ольгавіча) і вярнуў пад сваю ўладу Рагачоў, Берасце, Клецк і іншыя гарады, якія былі адабраны ў Тураўскай

зямлі некалькімі гадамі раней. Больш за тое, войска тураўскага князя захапіла Уладзімір-Валынскі, у якім Вячаслаў пасадзіў княжыць свайго пляменніка, але гэта быў толькі часовы поспех. У тым жа годзе новы вялікі князь адабраў у Вячаслава не толькі захопленае, але і сам Тураў. Тым не менш з падзей другой чвэрці XII ст. выразна відаць, што імкненне адасобіцца ад Кіева і набыць самастойнасць ахапіла і Тураўскую зямлю. Праўда, на той час яно не знайшло яшчэ свайго трывалага і канчатковага ўвасаблення.

Чарговая змена ўлады ў Кіеве, якая адбылася ў 1154 г. са смерцю вялікага князя Ізяслава і ўступленнем на прастол яго дзядзькі Юрыя (Даўгарукага), мела для Тураўскай зямлі прыблізна такія ж наступствы, што і папярэдняя. Юрый адразу пераразмеркаваў прастолы і аддаў Тураў свайму сыну Барысу.

Адной з адметных рыс перыяду феадальнай раздробленасці, у які ўступіла Русь, была частая змена вялікіх князёў у Кіеве. Толькі на працягу 1150–1161 гг. улада ў Кіеве мянялася восем разоў. У час змагання за першынство паміж прэтэндэнтамі за вярхоўную ўладу (на самой справе ўжо хутчэй намінальную) землі-княствы аказваліся фактычна самастойнымі. Менавіта такая сітуацыя склалася ў 1157 г., калі ў Кіеве памёр Юрый Даўгарукі. Момант выкарыстаў Юрый Яраславіч – унук колішняга тураўскага князя і вялікага князя кіеўскага Святаполка Ізяславіча. Ён захапіў Тураў і пры падтрымцы мясцовых жыхароў здолеў там замацавацца. Сваю ролю тут адыграла яго паходжанне, а таксама асабістыя здольнасці. Раней ён не меў уласнага ўдзела і служыў Юрыю Даўгарукаму. Так ён і трапіў у Тураў, дзе здолеў праявіць сябе. Ва ўсялякім выпадку, тураўцы маглі ацаніць яго дзейнасць. Юрый Яраславіч заняў тураўскі стол у парушэнне ранейшага парадку, які прадугледжваў удзел у гэтым вялікага князя кіеўскага. Таму ў 1158 г., калі сітуацыя з уладай у Кіеве стабілізавалася і вялікім князем стаў Ізяслаў Давыдавіч, ён арганізаваў вялікі паход на Тураў. У паходзе, які ўзначаліў сам вялікі князь, удзельнічалі князі з Валыні, Галіча, Смаленска, Полацка. Ужо было вырашана, што пасля захопу Тураў дастанецца аднаму з князёў – Уладзіміру Мсціславічу. Тураў і Пінск апынуліся ў аблозе, якая доўжылася ажно дзесяць тыдняў. Схільны да кампрамісу Юрый Яраславіч «многу мольбу сътвори» Ізяславу, жадаючы заключыць мір. Вялікі князь жа хацеў узяць Тураў, аднак яму так і не ўдалося гэта зрабіць. Рашучасць тураўцаў і пінян у адстойванні сваіх гарадоў і свайго новага князя, а таксама паморак коней у войску саюзнікаў вымусілі іх зняць аблогу і вярнуцца дадому. Тым не менш праблема заставалася нявырашанай, бо мір не быў заключаны. Праз два гады адбыўся новы, праўда, ужо не такі маштабны паход князёў на Тураў, аднак і ён не прынёс жаданага выніку. Толькі ў 1162 г. новы вялікі князь кіеўскі Расціслаў заключыў мір з Юрыем Яраславічам.

Укняжанне Юрыя Яраславіча стала этапнай падзеяй у гісторыі Тураўскага княства. Адметна і прынцыпова важна тое, што гэты князь здолеў замацавацца тут пры рашучай падтрымцы мясцовага насельніцтва. Юрый Яраславіч стаў заснавальнікам дынастыі, якая кіравала Тураўшчынай наступныя паўтара стагоддзя.

Апошні раз Юрый Яраславіч фігуруе ў летапісе пад 1167 г. У далейшым у Тураве княжылі яго сыны Святаполк (пам. у 1190 г.) і Глеб. Ужо пры жыцці сыноў Юрыя пачаліся працэсы, якія тады разгортваліся паўсюль на Русі. І так невялікая Тураўская зямля пачала драбіцца на меншыя княствы. Менавіта ў дадзены перыяд згадваюцца яе ўдзелы Пінск і Дубровіца. З гэтага ж часу можна гаварыць пра паступовае ўзвышэнне Пінска. Відаць, каля 1240 г. Тураўскае Палессе трапіла пад удар мангола-татарскіх войск.

Увогуле ж, звесткі з гісторыі Тураўскай зямлі XIII ст. фрагментарныя. Нельга дакладна аднавіць нават генеалогію мясцовага княжацкага дома. Можна канстатаваць толькі факт далейшага драблення зямлі на ўдзелы (Слуцк, Сцяпань). У 1292 г. Галіцка-Валынскі летапіс апошні раз паведамляе імёны князёў мясцовай дынастыі. У гэтым годзе памёр пінскі князь Юрый Уладзіміравіч, «кроткыи, смиреныи, правдивыи. И плакася по немъ княгини его, и сынове его, и брат его Демидъ князь и вси людье плакахоуся по немъ плачемъ великимъ». Дзямід, відаць, і стаў новым пінскім князем. Аднак мы, на жаль, нічога не ведаем пра падзеі, якія адбываліся ў Тураўскай зямлі пры ім і яго пераемніках. А ў другой чвэрці XIV ст. турава-пінскія землі перайшлі пад уладу вялікага князя літоўскага Гедыміна.

## ПАБУЖСКІ, ПАНЯМОНСКІ І ПАСОЖСКІ РЭГІЁНЫ

Побач з двума галоўнымі асяродкамі дзяржаўнасці на беларускіх землях, Полаччынай і Тураўшчынай, можна назваць яшчэ некалькі рэгіёнаў, якія мелі ўласныя традыцыі дзяржаўна-палітычнага развіцця, у прыватнасці Пабужжа, Панямонне і Пасожжа. Кожны з іх адыграў сваю ролю ў станаўленні раннефеадальнай дзяржаўнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Землі па сярэднім цячэнні Заходняга Буга здаўна з'яўляліся пагранічным рэгіёнам, які межаваў з Польшчай і Літвой. Гэты край быў добра развіты ў гаспадарчых адносінах і дастаткова шчыльна заселены. Тут даволі рана ўзніклі гарады, якія ў далейшым дасягнулі высокага ўзроўню развіцця. Заснаванне самага старажытнага і самага буйнога з іх, Берасця, адбылося на мяжы X і XI стст., а ўпершыню гэты горад згадваецца ў летапісах пад 1019 г. Крыху пазней крыніцы называюць Драгічын (1142), Мельнік (1260), Камянец (1276) і Кобрын (1287).

Першыя звесткі аб ваенна-палітычнай гісторыі Пабужжа звязаны з барацьбой паміж Старажытнарускай дзяржавай і Польшчай. У 1019 г., у выніку міжусобнай барацьбы на Русі, Берасце было занята палякамі. Гэта выклікала паход Яраслава Мудрага ў Пабужжа ў 1022 г. і яго далейшую барацьбу з Польшчай. Пазней (каля 1073 г.) Уладзімір Манамах ахоўваў Берасце ад нападаў польскіх войск. У другой палове XII ст. увесь Пабужскі рэгіён знаходзіўся пад уладай уладзіміра-валынскіх князёў. Горад трапіў пад удар мангола-татар у час іх нашэсця на Русь. Калі ў 1240 г. галіцка-валынскія князі Даніла і Васілька Раманавічы прыйшлі да Берасця, яны «не возмогоста ити в поле смрада ради и множьства избьеных».

У канцы XIII ст. Берасце было ўжо настолькі значным горадам, што мясцовыя жыхары зрабілі спробу ператварыць яго ў цэнтр асобнага княства. Яны скарысталіся цяжкай хваробай і смерцю бяздзетнага ўладзіміра-валынскага князя Уладзіміра Васількавіча і ў 1288–1289 гг. паспрабавалі, насуперак апошняй волі свайго ўладара, пасадзіць у сябе на княжанне аднаго з малодшых прадстаўнікоў дынастыі – Юрыя Львовіча. Але галоўны прэтэндэнт на ўладзіміра-валынскае княжанне, Мсціслаў Данілавіч, здолеў падавіць гэту «коромолу берестьян» і вярнуць горад пад сваю ўладу. Бунт дорага абышоўся жыхарам Берасця – новы князь усклаў на іх дадатковыя цяжкія падаткі.

Вялікае эканамічнае значэнне не толькі ў Пабужжы, але і ў прылеглых землях меў Драгічын над Бугам – крайні ўсходнеславянскі пункт на прыпяцка-бугскім гандлёвым шляху, аб чым сведчаць знаходкі некалькіх тысяч таварных свінцовых пломб XII–XIII стст. Драгічын доўгі час быў аб'ектам зацятай барацьбы паміж дзяржавамі, якія змагаліся за ўплывы над гэтым краем. У 1235 г. горад быў захоплены мазавецкім князем Конрадам, які праз два гады пасяліў там рыцараў Тэўтонскага ордэна. Праўда, неўзабаве магутны галіцкі князь Даніла Раманавіч выгнаў крыжакоў. Прыблізна ў 1253 г. Даніла Галіцкі, вяртаючыся з паходу на яцвягаў, каранаваўся ў Драгічыне каралеўскай каронай. У апошняй трэці XIII ст. валынскія князі ўзяліся ўмацоўваць сваю паўночную мяжу, якой пачалі пагражаць літоўцы. У 1276 г. па загадзе князя Уладзіміра Васількавіча на поўнач ад Берасця быў заснаваны замак Камянец (назва паходзіць ад камяністай глебы, замак жа першапачаткова быў драўляны).

Больш адчувальнай прысутнасць балтаў была ў Беларускім Панямонні. Яны здаўна жылі на гэтых землях, аднак у выніку славянскай каланізацыі этнічная сітуацыя паступова мянялася. У X–XI стст. славяне заснавалі тут шэраг гарадоў, сярод якіх асабліва значнымі былі Гародня, Навагародак, Ваўкавыск і Слонім. Гародня вылучалася выгадным стратэгічным становішчам і заможнасцю. Пра багацце горада сведчыць, у прыватнасці,

даволі актыўнае мураванае будаўніцтва. Так, археалагічна выяўлены ці нават дайшлі да нашага часу рэшткі трох мураваных цэркваў (Прачысценскай, Ніжняй і Барысаглебскай) і фрагменты гарадской сцяны. У 1116 г. вялікі князь кіеўскі Уладзімір Манамах выдаў сваю дачку Агаф'ю замуж за Усеваладка (Давыдавіча), які ў пазнейшых крыніцах фігуруе як гарадзенскі князь. Летапісы паведамляюць, што ў паходзе вялікага князя кіеўскага Мсціслава Уладзіміравіча на Полацк у 1128 г. удзельнічаў і князь Усеваладка «из Городня». Ён памёр у 1141 г., а ў далейшым у Гародні княжылі яго нашчадкі. У 1235 (1238) г. упершыню згадваецца горад Навагародак, дзе тады княжыў Ізяслаў. Прыблізна ў той самы час, каля 1250 г. Іпацьеўскі летапіс згадвае гарады Ваўкавыск і Слонім, якія таксама былі цэнтрамі невялікіх удзельных княстваў.

Пасожжа засяляла племяннное аб'яднанне радзімічаў. Лічыцца, што іх цэнтрам (праўда, магчыма, не адзіным) быў Гомель. Сваё княства ў радзімічаў так і не склалася, у выніку чаго іх землі сталі аб'ектам барацьбы паміж некалькімі дзяржаўна-палітычнымі цэнтрамі. Найбольшую актыўнасць тут праяўлялі размешчаныя па суседству Чарнігаў і Смаленск. Першапачаткова большая частка радзіміцкіх зямель належала Чарнігаву, але ў другой чвэрці XII ст. сітуацыя змянілася. У 1125 г. у Смаленску сеў на княжанне малады і энергічны Расціслаў, сын вялікага князя кіеўскага Мсціслава Уладзіміравіча. Ён выкарыстаў усобіцы, якія пачаліся сярод чарнігаўскіх Ольгавічаў, і ў 1127 і 1142 гг. здзейсніў два паходы ў Пасожжа, далучыўшы паўночную частку пасожскага рэгіёна да сваіх смаленскіх уладанняў. На гэтых землях ён заснаваў гарады Мсціслаў (1135 г., назваў у гонар свайго бацькі), Расціслаў (цяпер Рослаў, у свой гонар) і Ізяслаў (у гонар брата). Асабліва паспяховым было развіццё Мсціслава. У XII–XIII стст. горад квітнеў, аб чым сведчаць багатыя археалагічныя знаходкі. Сярод гарадоў Смаленскага княства Мсціслаў займаў, бадай, трэцяе месца – пасля самога Смаленска і Таропца. Паводле В. М. Тацішчава, каля 1180 г. Мсціслаў на нейкі час стаў цэнтрам удзела, якім кіраваў князь Мсціслаў Раманавіч. Паўднёвая частка пасожскіх зямель з Гомелем засталася за Чарнігавам. Ускосныя даныя сведчаць пра тое, што Гомель таксама мог быць цэнтрам удзельнага княства.

Пабужскія, панямонскія і пасожскія землі істотна адрозніваліся паміж сабой і па геаграфічным размяшчэнні, і па той ролі, якую яны адыгрывалі ў гісторыі Беларусі. Тым не менш можна ўпэўнена казаць пра іх даволі хуткае і ў цэлым паспяховае развіццё, што выявілася, у прыватнасці, ва ўзнікненні і росце гарадоў, якія ператвараліся ў значныя цэнтры эканамічнага і дзяржаўна-палітычнага жыцця.

# 6 САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ЗЯМЕЛЬ БЕЛАРУСІ Ў IX–XII стст.

- **Шматукладнасць эканомікі**
- **Стан сельскай гаспадаркі, асноўныя прылады для апрацоўкі глебы і вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў**
- **Гарады: узнікненне, выгляд, размяшчэнне. Гарадскія рамяство і гандаль**
- **Развіццё феадальных адносін на землях Беларусі**
- **Сацыяльнае расслаенне грамадства**

## ШМАТУКЛАДНАСЦЬ ЭКАНОМІКІ

У IX ст. гаспадарчая дзейнасць людзей на тэрыторыі старажытнай Беларусі характарызавалася шматукладнасцю. Найбольш значнымі сацыяльна-эканамічнымі ўкладамі былі: першабытнаабшчынны, рабаўладальніцкі (у славян не атрымаў класічнага развіцця) і феадальны (толькі зараджаўся).

Інтэнсіўны працэс разлажэння родаплемяннога ладу назіраўся ва ўсіх напрамках грамадскага і эканамічнага жыцця. Гэта перш за ўсё праяўлялася ў развіцці сельскай гаспадаркі, адасабленні рамяства, пашырэнні гандлёвых эканамічных сувязей і маёмаснай дыферэнцыяцыі насельніцтва.

Важную ролю ў арганізацыі жыцця і вытворчасці земляробаў працягвала адыгрываць абшчына і ў раннім Сярэднявеччы. Абшчыннікі-смерды былі свабоднымі ў распараджэнні ворыўнай зямлёй, а таксама маглі пакінуць яе. Абшчынай абаранялася маёмасць, аднаўлялася разбуранае ці спаленае жыллё, ажыццяўляўся суд, збіраліся падаткі на карысць князя ці баярына і г. д. Побач з абшчынным укладам на тэрыторыі Беларусі

існавалі элементы рабаўладальніцкага грамадска-гаспадарчага ўкладу. Ён характарызуецца ўласнасцю рабаўладальніка на прылады працы і на работніка вытворчасці – раба, праца якога насіла адкрыта прымусовы характар і вызначалася надзвычайна нізкай эфектыўнасцю. Асноўнымі крыніцамі рабства былі ператварэнне ў рабоў ваеннапалонных, рознага роду злачынцаў, аднапляменнікаў за нявыплату даўгоў, а таксама гандаль нявольнікамі. Ранняе патрыярхальнае рабства, якое ўзнікла ў час пераходу ад першабытнаабшчыннага ладу да класавага грамадства, было накіравана на задавальненне патрэб патрыярхальнай сям'і (праца па хатняй гаспадарцы, абслугоўванне рабаўладальніка і г. д.). Рабоў выкарыстоўвалі ў занятках жывёлагадоўляй і значна менш – у земляробстве. Паднявольная праца і поўнае бяспраўе абумоўлівалі нізкую прадукцыйнасць вытворчасці. Трэба падкрэсліць, што пад уздзеяннем шэрагу ўнутраных і знешніх фактараў праца рабоў на тэрыторыі Беларусі, як і ўвогуле на тэрыторыі пражывання ўсходніх славян, не знайшла масавага прымянення, не стала асновай вытворчасці.

Новым укладам, які ўсё пашыраўся і паглыбляўся, быў феадальны. Працэс феадалізацыі заключаўся ў тым, што фарміравалася землеўладанне князёў, баяр, царквы, а сялянства, якое працавала на гэтай зямлі, трапляла ў залежнасць ад феадалаў.

Такім чынам, у выніку разлажэння першабытнаабшчыннага ладу нашы продкі перайшлі ад шматукладнага грамадства непасрэдна да феадалізму, захоўваючы некаторыя рысы папярэдніх укладаў, мінуючы класічную рабаўладальніцкую эпоху, што з'яўляецца адной з важнейшых асаблівасцей у гісторыі нашай краіны.

## СТАН СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, АСНОЎНЫЯ ПРЫЛАДЫ ДЛЯ АПРАЦОЎКІ ГЛЕБЫ І ВЫТВОРЧАСЦІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДУКТАЎ

Сельская гаспадарка ў сярэднія вякі была галоўнай сферай занятасці ўсходніх славян. Ворныя землі, пашы, лясы, сенажаці, рэкі і сажалкі, на якіх працавалі сяляне, знаходзіліся ў сумесным карыстанні. Асноўныя прылады працы сяляне рабілі з дрэва, металічнымі былі толькі асобныя іх часткі. Раскопкі сведчаць, што найбольш распаўсюджаным сельскагаспадарчым інвентаром нашых продкаў былі драўлянае рала, саха, матыка, рыдлёўка, каса-гарбуша, серп, барана, граблі, цэп, драўляная ступа і інш. Сеялі ўручную, апрацоўвалі поле сахой і драўлянай бараной. Збожжа малацілі на гліняным таку драўлянымі цапамі, веялі пры дапамозе драўляных рыдлёвак і рэшатаў

і захоўвалі яго ў свірнах. Для памолу зерня выкарыстоўвалі круглыя каменныя жорны з пясчанікавых парод.

Археалагічныя матэрыялы, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі, даюць уяўленне аб сістэмах земляробства. На працягу разглядаемага перыяду паступова ўдасканальваліся спосабы захавання, аднаўлення і павышэння ўрадлівасці глебы. У IX–X стст. прымянялася двухпольная сістэма земляробства з захаваннем такіх прымітыўных метадаў апрацоўкі зямлі, як падсека і пералог (падсека – кавалак лесу, які выкарчоўваўся і засяваўся сельскагаспадарчымі раслінамі, пералог – пакінутыя землі для аднаўлення натуральнай урадлівасці, каб выкарыстоўваць іх праз некаторы час), а затым, у XI–XII стст., – трохпольная: папар (адпачываючае поле), азімыя, яравыя. Пераважала архаічнае трохполле, якое ад класічнага адрознівалася тым, што ворыва дзялілася на тры часткі, але засявалася не дзве трэці, як пры класічным, а толькі палова, а можа, і меншая частка, а астатняя заставалася аблогай (той, якая доўгі час не выкарыстоўвалася ў сельскай гаспадарцы).

Самымі распаўсюджанымі сельскагаспадарчымі культурамі былі жыта і пшаніца. Значнае месца займалі і такія культуры, як ячмень, авёс, проса, грэчка, гарох, віка, лён, каноплі. Як сельскае, так і гарадское насельніцтва займалася агародніцтвам. Акрамя бабовых, шырока былі распаўсюджаны капуста, рэпа, буракі, агуркі, рэдзька, морква і цыбуля. Пры апрацоўцы агародаў ужываліся такія ж прылады працы, як і ў полі: саха, матыка з жалезнай рабочай часткай і драўляная рыдлёўка з жалезнай акоўкай. Іх выявы можна ўбачыць на старажытных мініяцюрах, а жалезныя наканечнікі матык і акоўкі рыдлёвак – у археалагічных экспанатах гістарычных музеяў. Было вядома і садоўніцтва. Пісьмовыя і археалагічныя матэрыялы зафіксавалі развядзенне яблынь, груш, вішань, сліў і інш. Костачкі вішні выяўлены пры археалагічных раскопках у Мінску і Полацку, вішні і слівы – у Гродне.

Адной з галін сельскай гаспадаркі была жывёлагадоўля, якая забяспечвала земляробства цяглавой сілай і ўгнаеннямі, а насельніцтва – прадуктамі харчавання і сыравінай для хатняй гаспадаркі і промыслаў. Крыніцы археалогіі сведчаць, што на тэрыторыі Беларусі разводзілі коней, якіх выкарыстоўвалі не толькі ў земляробстве, але і ў войску, а таксама валоў, з іх дапамогай апрацоўвалі зямлю і перавозілі грузы. Акрамя буйной рагатай жывёлы, разводзілі авечак, коз, свіней, свойскую птушку (куры, гусі, качкі), якія меліся ў гаспадарцы як сялян, так і феадалаў. Аднак вырашальнай ролі жывёлагадоўля ў гаспадарчым жыцці сялян не адыгрывала. Тлумачыцца гэта тым, што сярод густых і балоцістых лясоў бракавала добрых

пашаў, а значыць, не існавала спрыяльных умоў для развядзення жывёлы ў вялікай колькасці. Асаблівасцю развіцця жывёлагадоўлі ў нашых продкаў было тое, што яна ў асноўным насіла стойлавы характар (жывёла трымалася ў хлявах, загонах), а не ў полі.

Дадатковым прыбыткам для сялян было паляванне, якому спрыялі геаграфічныя ўмовы. У лясах вадзілася шмат розных звяроў, якіх дабывалі мясцовыя жыхары. Ім займалася амаль усё дарослае насельніцтва, таму што яно задавальняла патрэбы людзей не толькі ў ежы, але і ў адзенні, абутку, якія выраблялася са скур і футра як свойскіх, так і дзікіх жывёл. Паляванне мела два напрамкі: харчовае (на зубра, высакароднага аленя, лася, дзіка, казулю, гуся, цецерука і інш.) і футравае (на баброў, лісіц, куніц, мядзведзяў, вавёрак, ваўкоў, зайцоў і інш.). З цягам часу здабыча футра паступова ператварылася ў промысел. Пушніна з'яўлялася таксама адным з асноўных прадметаў збору даніны і гандлю.

Распаўсюджаным заняткам сялян было рыбалоўства. У рэках і азёрах Беларусі лавілі самоў, ляшчоў, ласосяў, акунёў, плотак, яршоў, шчупакоў, лінёў, судакоў і г. д. Пры раскопках былі знойдзены самыя розныя прылады здабычы рыбы: кручкі розных памераў, блёсны з каляровых металаў, гліняныя і каменныя грузілы, паплаўкі з кары бярозы і хвоі, рэшткі невада, восці. Вялікая колькасць знойдзеных рыбных касцей дае падставу меркаваць аб тым, што лоўля рыбы значна пашырала харчовы рацыён насельніцтва. Побач з паляваннем і рыбалоўствам шырокае развіццё атрымала бортніцтва, або лясное пчалярства. Аматары дзікага мёду выбіралі яго з дуплаў дрэў. Мёд і воск былі прадметамі не толькі ўнутранага спажывання, але разам з футрам – прадметамі падаткаабкладання і гандлю. Мёд шырока выкарыстоўваўся ў медыцынскіх мэтах для лячэння розных хвароб. Вясковае насельніцтва займалася таксама зборам грыбоў, ягад, іншых дароў лесу. Шкарлупіны лясных арэхаў часта трапляюцца пры археалагічных раскопках, а ў Мінску ў пласце XII ст. былі знойдзены рэшткі дзікай грушы.

Значную ролю адыгрывала перапрацоўка сельскагаспадарчых прадуктаў. З насення лёну і канопляў выціскалі алей, са злакавых рабілі муку і крупы. Тэхніка перапрацоўкі сыравіны была прымітыўнай: алей выціскалі звычайнымі прэсамі, а зерне проса для атрымання круп таўклі ў вялікіх ступах. Адпаведныя таўкачы знойдзены пры раскопках у Полацку.

У раннефеадальны перыяд амаль кожны сялянскі двор выступаў як самастойная гаспадарчая адзінка з шырокім дыяпазонам дзейнасці. Усё жыццёва неабходнае: жыллё, харчовыя прыпасы, адзенне, тканіны, шкуры, рэчы хатняга ўжытку, посуд, сельскагаспадарчыя прылады і транспартныя сродкі – у абсалютнай большасці выраблялася на месцы рукамі вясковых умель-

цаў. З ільну, канапель і воўны рыхтавалі пражу, ткалі палатно і сукно. З дрэва і гліны рабілі разнастайны посуд.

Апрацоўка скур і пашыў вопраткі мелі таксама характар хатняга промыслу. Вельмі добра было развіта рагожнае пляценне, вядомае славянам яшчэ з жалезнага веку. Аб гэтым промысле сведчаць археалагічныя знаходкі рагожнай керамікі (адбіткі рагож на гліняным посудзе), а таксама паведамляюць летапісы XII ст. і актавыя дакументы Сярэднявечча. З ліпавай кары, лубу, мачалы, лыка рабілі розныя гаспадарчыя рэчы (рагожы, цыноўкі, карабы, вяроўкі, лапці, пэндзлі і г. д.).

Важным паказчыкам развіцця сельскай гаспадаркі з'яўлялася асваенне новых зямель, занятых лесам, але прыдатных для апрацоўкі. Пры экстэнсіўных метадах гаспадарання натуральны прырост насельніцтва абумоўліваў неабходнасць пастаяннага пашырэння сельскагаспадарчых угоддзяў.

Асноўнай вытворчай адзінкай у вёсцы была звычайна сям'я, радзей некалькі сем'яў і іх уласнасць: гаспадарчыя пабудовы, цяглавая і прадукцыйная жывёла, сельскагаспадарчы інвентар, а таксама зямля.

За карыстанне зямельнымі надзеламі сялян абавязвалі выконваць шматлікія павіннасці, характар і доля якіх змяняліся па меры развіцця феадальных адносін. Найстаражытнейшай формай феадальнай рэнты (падаткаабкладанне за карыстанне зямлёй), якая ўзнікла яшчэ ў часы разлажэння першабытнаабшчынных адносін і фарміравання першых дзяржаўных утварэнняў – княстваў, была даніна (натуральны аброк). Даніна спаганялася жытам, пшаніцай, аўсом, сенам, мясам, прадуктамі бортніцтва і палявання.

Сялянскі двор уяўляў сабой складаны гаспадарчы комплекс. На сялянскіх сядзібах знаходзіліся жылыя дамы, розныя гаспадарчыя пабудовы (гумны, свірны, клеці, пуні, хлявы і інш.). Сяляне-гаспадары мелі ўвесь неабходны інвентар: плугі, бароны, вазы, косы, сохі, сярпы і іншыя прылады працы.

Асноўнай формай сельскіх паселішчаў былі вёскі (весі), для якіх уласцівы ўклад жыцця, звязаны з сельскагаспадарчай вытворчасцю і народнай традыцыйна-бытавой культурай. Шмат вёсак будавалася на берагах рэк і азёр, таму што глеба рачных далін была больш урадлівай, вадаёмы з'яўляліся надзейнай крыніцай пітной вады, а рэкі і азёры служылі месцам лоўлі рыбы і зручнымі шляхамі зносін. З канца X ст. да сярэдзіны XIII ст. колькасць вёсак павялічвалася. Рассяленне стала больш шчыльным.

У склад дваровай забудовы селяніна ўваходзілі: жылы дом, (будынак, хата, харомы, ізба), гаспадарчыя пабудовы (клець, свіран, хлеў, гумно). На будаўніцтва ішлі пераважна хвойныя пароды дрэў. Падлога ў жылых памяшканнях была глінабітная ці драўляная. Страха рабілася двух- або чатырохсхільная, яе крылі саломай, чаротам, дранкай.

Да канца XIII ст. печы ў хатах былі глінабітныя, з XIV ст. іх сталі рабіць з цэглы. У курных «чорных» (печ без коміна) хатах жыла найчасцей чэлядзь нявольная. Інтэр'ер хаты беларускага селяніна на працягу стагоддзяў захоўваў традыцыйныя рэчы хатняга дабрабыту: стол, паліцы, лавы, кублы, скрыні, жорны і г. д. Сялянскія хаты былі двух- (хата – сенцы) або трохкамернымі (хата – сенцы – камора).

Гаспадаркі аднаго паселішча складалі суседскую сельскую абшчыну, якая ў славян называлася «верв» (ад слова «вяроўка», з дапамогай яе адмяралі надзелы зямлі). Сельскай абшчыне належалі палі, лясы, вадаёмы – існавала калектыўнае (абшчыннае) землекарыстанне.

У Беларусі суседская абшчына адыгрывала значную ролю ў арганізацыі сялянскага землекарыстання і выплаты феадальнай рэнты. На чале грамады стаяў старац (староста), які кіраваў раскладам даніны па асобных гаспадарках, яму дапамагалі дзясяцкія. Кіраўнікі абшчыны выбіраліся грамадой, якая з'яўлялася першаснай формай арганізацыі сялянства. Менавіта ў абшчыне ўсталяваліся прававыя нормы на аснове звычаёвага права. Яно існавала як адносна самастойны адміністрацыйна-прававы інстытут, якому належалі значныя судовыя (калектыўная адказнасць за злачынствы, зробленыя членамі абшчыны), павіннасныя, гаспадарчыя і іншыя паўнамоцтвы.

Такім чынам, стан сельскай гаспадаркі нашых продкаў і іх грамадская арганізацыя сведчаць аб даволі высокім узроўні эканамічнага і сацыяльнага развіцця тагачаснага сельскага насельніцтва.

## ГАРАДЫ: УЗНІКНЕННЕ, ВЫГЛЯД, РАЗМЯШЧЭННЕ. ГАРАДСКІЯ РАМЯСТВО І ГАНДАЛЬ

Важнае значэнне пры вывучэнні працэсу станаўлення феадалізму мае пытанне фарміравання гарадоў, таму што яно садзейнічала разбурэнню перажыткаў патрыярхальна-родавых адносін. Узнікненне гарадскога жыцця было пераломным момантам у развіцці феадальнага грамадства.

Пад старажытным горадам звычайна разумеюць даволі буйны населены пункт, жыхары якога заняты пераважна рамяством і гандлем. Галоўнай прычынай станаўлення гарадоў выступае падзел працы – аддзяленне рамёстваў ад земляробства, узнікненне рэгулярнага тавараабмену, што адбылося пры пераходзе ад першабытнаабшчыннага да рабаўладальніцкага ладу (на Усходзе, у Старажытнай Грэцыі і Рыме) ці феадальнага ладу ў большасці краін Еўропы, у тым ліку і ў Беларусі.

Першыя гарады на тэрыторыі Беларусі існавалі ўжо ў IX ст., яны згадваюцца ў летапісах, хроніках і іншых пісьмовых крыніцах., а ў XIII ст. іх колькасць дасягнула 35. Гарады выконвалі гандлёва-рамесніцкія, аграрныя, адміністрацыйна-фіскальныя, ваеннаабарончыя, культурныя і рэлігійныя функцыі; з'яўляліся цэнтрамі сельскагаспадарчых акруг. Княжацкая дружына ахоўвала не толькі горад, але і ўсю воласць (ці зямлю) ад знешніх рабаўнікоў. Лёс воласці быў цесна звязаны з лёсам яе горада. Многія беларускія гарады атрымалі сваю назву ад рэк, на якіх былі заснаваны: Полацк – ад Палаты, Віцебск – ад Віцьбы, Пінск – ад Піны, Слуцк – ад Случы, Друцк – ад Друці, Чачэрск – ад Чачоры, Орша – ад ракі Рша і г. д. Іншыя ўзніклі на месцы старажытных гарадзішчаў жалезнага веку, якія з'ўляліся племяннымі цэнтрамі. Так развіваліся Лукомль, Гомель, Крычаў і інш. Шмат беларускіх гарадоў узнікла з умацаваных паселішчаў, парубежных крэпасцей – Менск, Гародня, Камянец і інш.

Ядром старажытнага горада звычайна быў дзяцінец (град) – умацаваная частка, абнесеная драўляным тынам, равамі і валамі (пазней муравамі сценамі і драўлянымі вежамі). Там размяшчаліся адміністрацыйныя і культавыя пабудовы, жылі князь з дружынай, яго чэлядзь, гандляры, рамеснікі, духавенства. Побач знаходзіўся вакольны горад, абапал якога ўтвараліся падвойная лінія ўмацаванняў і пасады. Непадалёку ад горада часта знаходзіўся курганны могільнік (некропаль). Росту гарадоў спрыялі выгадныя геаграфічныя фактары – скрыжаванне гандлёвых шляхоў, блізкасць ракі ці возера, якія выкарыстоўваліся ў якасці спажывання пітной вады і транспартных артэрый. Памеры раннефеадальных гарадоў параўнальна невялікія. Насельніцтва самых вялікіх гарадоў налічвала некалькі тысяч чалавек, а малых – некалькі соцень жыхароў.

На тэрыторыі Беларусі, як і ва ўсёй лясной паласе Усходняй Еўропы, гарады будаваліся цалкам з дрэва. З бярвенняў рубілі жылыя памяшканні, хлявы, масты, гарадскія сцены, вежы, вароты, драўлянымі былі насцілы вуліц. Звычайная плошча жылых дамоў у IX – першай палове XIII ст. складала прыкладна 9–25 кв. м. Спецыфічныя рысы домабудаўніцтва ўласцівы толькі Навагародку, дзе выяўлены двухкамерныя дамы агульнай плошчай 70–75 кв. м і нават 120 кв. м, якія мелі шкляныя вокны дыскападобнай формы. Сцены некаторых дамоў тынкаваліся, а ў асобных выпадках размалёўваліся фрэскамі. Ужо ў XII ст. у дамах заможных гараджан будаваліся печы з комінамі.

Гараджане мелі свае пашы, агароды і лугі, разводзілі хатнюю жывёлу, займаліся паляваннем і рыбалоўствам. Але асноўнымі іх заняткамі былі рамяство і гандаль. У гарадскіх цэнтрах засяроджваліся свецкія і духоўныя

феадалы і іх слугі, сюды сцякалася таксама насельніцтва з ліку сялян, якія займаліся рамяством і гандлем. У беларускіх гарадах дзейнічалі рамеснікі каля 60 розных спецыяльнасцей, многія рамёствы дасягнулі высокага тэхнічнага і мастацкага ўзроўню.

Вядучая роля ў гарадскім рамястве належала металаапрацоўцы, якая забяспечвала ўсімі неабходнымі тэхнічнымі прыладамі розныя віды гаспадарчай дзейнасці. У мастацкіх металаапрацоўчых вырабах шырока выкарыстоўваліся тонкая пайка, зварка, коўка, разьба, шліфоўка, паліроўка, чаканка, інкрустацыя, адліўка па васковых мадэлях. Сыравінай для металаапрацоўкі ў асноўным служыла крычнае жалеза, якое здабывалася шляхам варкі ў прымітыўных домніцах з балотнай руды, на якую былі багаты рэкі і азёры старажытнай Беларусі. Карысталіся і прывазным металам, асабліва каляровым – срэбрам, золатам.

Высокага ўзроўню развіцця дасягнула ювелірная справа. Дакументальнымі крыніцамі пацвяржаецца існаванне гэтага рамяства амаль ва ўсіх буйных гарадах Беларусі (Берасце, Ваўкавыск, Гародня, Кобрын, Магілёў, Навагародак, Полацк і інш.). Шэдэўрам ювелірнага мастацтва, нацыянальнай рэліквіяй беларусаў стаў узвіжальны крыж, зроблены ў Полацку майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. па заказе Ефрасінні Полацкай, пра што сведчыць надпіс на ім. У крыжы захоўваліся святыя рэліквіі, атрыманыя ігуменняй ад імператара Візантыі Мануіла Комніна. Крыж быў згублены ў часы Другой сусветнай вайны, узноўлены ў наш час брэсцкім ювелірам М. Кузьмічом.

У пачатку XIII ст. з'явілася складаная тэхніка ювелірнага ліцця «навыплеск», калі ўпрыгожанні рабілі пустацелымі, што давала магчымасць выраблядь больш тавару для продажу. Зыходнымі матэрыяламі ювелірных рамеснікаў былі медзь, свінец, волава, бронза, латунь; для ўпрыгожанняў заможнага насельніцтва – золата, срэбра, білон, выкарыстоўваліся таксама паўкаштоўныя камяні, бурштын, косць.

Шырока былі прадстаўлены і іншыя рамёствы. Развівалася і касцярэзная вытворчасць: выраблялі накладкі калчанаў, дэталі арбалетаў, грабяні, фігуркі шахмат, грузікі, абразкі. Майстры па апрацоўцы каменю рабілі надмагільныя крыжы, надмагіллі ў выглядзе бюстаў, статуй, рэльефаў. Асабліва славіліся беларускія майстры-гарбары. Вырабы з юхту, замшы, саф'яну карысталіся вялікім попытам у Польшчы і гарадах Прыбалтыкі, куды вывозіліся гэтыя тавары. Высокім узроўнем развіцця вызначалася і шклаварнае рамяство. Майстры-шклавары ў Шыдлоўцы (каля Слоніма) выраблялі келіхі, кубкі, міскі і іншы посуд. У Полацку мясцовыя шклавары наладзілі вытворчасць шкляных упрыгожанняў, бранзалетаў, якія карысталіся вялікай

папулярнасцю ў гараджанак. Ганчарная вытворчасць забяспечвала пастаянны попыт на посуд. У яго асартымент уваходзілі гаршкі, кубкі, міскі, збаны, чарпакі, патэльні. Да X ст. посуд вырабляўся з гліны ўручную ляпным спосабам. У X ст. у Беларусі распаўсюдзілася ганчарнае кола. Яно дало магчымасць наладзіць масавую вытворчасць бытавога посуду.

У гаспадарчым жыцці гарадоў важнае месца займалі прадзенне і ткацтва. Ніткі пралі на ручным верацяне, на канец якога надзявалі каменны ці гліняны грузік-прасліцу. Прадзенне было заняткам кожнай жанчыны не толькі ў вёсцы, але і ў горадзе. Пралі з воўны, ільну, пянькі. Адзенне шылі жалезнымі ці бронзавымі іголкамі. Ваўняныя ніткі ўжывалі не толькі для ткацтва і шыцця, але і для вязання. З воўны валялі войлак, які выкарыстоўваўся як матэрыял для пашыву паходных шатроў, пакрывалаў, папон, шапак. Як разнавіднасць ткацтва існавала іголкавае пляценне. Матэрыялам для пляцення былі лаза, салома, чарот, мачала, карані дрэў, лыка, бяроста, скура, лучына, конскі волас і інш. Для пляцення выкарыстоўвалі драўляныя, касцяныя і жалезныя прыстасаванні.

Гарады з'яўляліся цэнтрамі ўнутранага і знешняга гандлю. Гандаль у IX – першай палове XIII ст. развіваўся ва ўмовах натуральнай гаспадаркі і абмежаванай патрэбы ў прывазных таварах. Унутраны гандаль меў у эканамічным жыцці старажытнай Беларусі большае значэнне, чым знешні. Развітымі былі гандлёвыя сувязі паміж горадам і вёскай. З вёскі прывозілі сельскагаспадарчыя прадукты і сыравіну для рамеснай вытворчасці. Вырабы гарадскіх рамеснікаў знаходзілі попыт сярод вясковага насельніцтва.

Побач з унутраным развіваўся і знешні гандаль. Актыўны знешні гандаль вялі гарады Беларусі, размешчаныя на буйных водных магістралях. Гандлявалі з рускімі, украінскімі, польскімі гарадамі, а таксама з некаторымі гарадамі Усходу. На знешні рынак пастаўлялі жыта, сала, лес, паташ, футры, скуры, вырабы рамеснікаў. Імпартавалі жалеза, медзь, волава, свінец, металічныя вырабы, сукно, галандскае палатно, віно, соль, селядзец, каштоўныя металы, прадметы раскошы. Важную ролю ў сістэме гандлёвых камунікацый адыгрывалі водныя і сухапутныя шляхі, якія праходзілі праз беларускія землі і садзейнічалі іх эканамічнаму развіццю: «шлях з варагаў у грэкі», шлях па Заходняй Дзвіне. Гандлёвыя сувязі звязвалі ў старажытнасці Полацк з Ноўгарадам, Псковам, Віцебскам, Менскам, Смаленскам. У Берасці перасякаліся важнейшыя гандлёвыя шляхі, якія звязвалі Беларусь з Украінай, Польшчай і паўднёвай часткай Прыбалтыкі. Сродкамі перамяшчэння па вадзе былі дзяўбаныя лодкі, ладдзі; на сушы – вазы, сані, коні.

У Полацкім, Тураўскім і іншых княствах на тэрыторыі Беларусі было грашовае абарачэнне. Ужо ў IX ст. распаўсюджвалася металічнае абарачэнне: металічныя грошы паступова выціснулі грошы-жывёлу і грошы-футра (куны). Самай буйной адзінкай была грыўна, якая ўпершыню ўпамінаецца ў 882 г. Грыўны таго часу былі сярэбранымі і з'яўляліся (да XII ст.) як вагавай, так і грашовай адзінкай. Абазначэнне на металічных грошах гэтай вагі і ёсць іх ператварэнне ў манету. Насельніцтва Беларусі карысталася таксама манетамі іншаземнай чаканкі, якія ў вялікай колькасці меліся ў краіне. Аб гэтым сведчаць шматлікія гістарычныя і археалагічныя даныя. У цяперашні час вядома некалькі тысяч скарбаў з іншаземнай манетай, знойдзеных у Беларусі. Еўрапейскія манеты з'явіліся ў Беларусі ў X ст. і чаканіліся амаль выключна ў Нямеччыне. Знойдзены скарбы манет Багеміі, Бургундыі, Даніі, Швецыі, Нарвегіі і Ірландыі. На тэрыторыі Беларусі сустракаюцца таксама манеты рымскія і славянскія (чэшскія і польскія).

У грашовым абарачэнні на беларускіх землях можна вылучыць некалькі перыядаў. У IX–X стст. найбольшае распаўсюджанне атрымаў арабскі дырхем (сярэбраная манета вагой 2,5–4,0 г). З канца X ст. да канца XI ст. асноўнай манетай быў заходнееўрапейскі дынарый (сярэбраная манета вагой 1,8–1,9 г). Перыяд XII–XIII стст. атрымаў назву безманетны, таму што ў якасці плацёжнага сродку выкарыстоўвалі сярэбраныя зліткі – грыўні. Гэтыя зліткі адрозніваліся па вазе і форме. На тэрыторыі Беларусі атрымалі распаўсюджанне заходнерускія ці літоўскія грыўні (вага звыш 100 г), а таксама выкарыстоўвалі кіеўскія (каля 165 г) і радзей наўгародскія (каля 200 г) зліткі. Але развіццё гандлю і грашовага абарачэння не мянялі агульнага натуральнага характару гаспадаркі беларускіх зямель. Таварная дзейнасць з'яўлялася толькі невялікай часткай грамадскай вытворчасці.

## РАЗВІЦЦЁ ФЕАДАЛЬНЫХ АДНОСІН НА ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ

Эпоха феадалізму ахоплівае даволі працяглы перыяд. У Заходняй Еўропе феадальны лад праіснаваў з часоў падзення Заходняй Рымскай імперыі (V ст.) да буржуазных рэвалюцый у Англіі (XVII ст.) і Францыі (XVIII ст.), у Расіі і Беларусі – прыкладна з IX ст. да сялянскай рэформы 1861 г. У шэрагу краін, у тым ліку і ўсходнееўрапейскіх, фарміраванне феадалізму праходзіла праз маёмасную дыферэнцыяцыю ўнутры тэрытарыяльнай абшчыны, узнікненне землеўладання ваеначальнікаў, дружыннікаў, служылых людзей.

Перыяд феадалізму ў гісторыі ўсходняга славянства, а значыць, і ў гісторыі Беларусі, налічвае шмат вякоў і можа быць раздзелены на тры асноўныя этапы:

1) IX – першая палова XVII ст. (устанаўленне і развіццё феадальных адносін);

2) другая палова XVII – другая палова XVIII ст. (пачатак разлажэння феадалізму і зараджэння капіталістычных адносін);

3) першая палова XIX ст. (крызіс феадальна-прыгонніцкіх адносін).

Феадальныя адносіны ў Беларусі фарміраваліся на працягу доўгага часу, аднак па пытанні аб генезісе феадалізму на яе тэрыторыі пакуль што няма адзінага меркавання. У цэнтры спрэчак аб з'яўленні феадалізму стаіць пытанне аб тым, на якой аснове ўзніклі новыя адносіны ва ўсходніх славян. Адны даследчыкі лічаць, што феадальныя адносіны склаліся яшчэ ў нетрах першабытнаабшчыннага ладу. Іншыя, гаворачы аб узнікненні феадалізму, выдзяляюць паміж першабытным грамадствам і феадальнай эпохай працяглы пераходны перыяд – ваенную дэмакратыю. Усё ж большасць вучоных лічаць, што ўзнікненне сельскай (суседскай) абшчыны азначала канец першабытнаабшчынных вытворчых адносін. У аснове сялянскай абшчыны, на іх думку, ляжала індывідуалізацыя грамадскай вытворчасці, якая прывяла да асобнай гаспадаркі, а тая, у сваю чаргу, з'явілася падмуркам для фарміравання класавых адносін.

Феадальнае землеўладанне ў беларускіх княствах і землях склалася ў форме вотчыны, якая знаходзілася ў поўнай уласнасці феадала, перадавалася ў спадчыну, магла быць прададзена, падаравана. Вотчына – комплекс зямельнай уласнасці (зямля, пабудовы, жывы і мёртвы інвентар) і звязаных з ёю феадальна-залежных сялян. Вотчына ўяўляла сабой арганізацыю для прысваення вотчыннікамі-феадаламі дадатковай працы залежных сялян і была асновай панавання феадалаў у сярэдневяковым грамадстве. Аснову вотчыны складалі панская гаспадарка і сялянскія трыманні. Для рэалізацыі сваіх праў у вотчыне яе ўладальнік абапіраўся на ўласны апарат прымусу і цэнтральную ўладу. Эканамічная структура вотчыны характарызавалася тымі ці іншымі суадносінамі дамена ўтрыманняў (дамен – асабістыя ўладанні князя, якія застаюцца за ім незалежна ад знаходжання на княжацкім прастоле і з'яўляюцца спадчыннымі) і розным спалучэннем галоўных форм эксплуатацыі сялян у вотчыне (паншчына, прадуктовы і грашовы аброк). Першыя звесткі аб княжацкіх вотчынах у Полацкім княстве адносяцца да X ст. У XI–XII стст. ёсць звесткі аб баярскіх і манастырскіх вотчынах. Вотчыны абслугоўваліся працай залежных сялян-смердаў і халопаў. У гэты час феадальныя правы вотчыннікаў замацоўваюцца ў «Рускай праўдзе».

Непазбежным вынікам з'яўлення буйнога землеўладання было ўмацаванне феадальнай залежнасці сялян і паступовае перарастанне даніны ў феадальную рэнту. У IX–XI стст. сяляне па сваім гаспадарчым і прававым становішчы дзяліліся на дзве асноўныя групы: свабодных і залежных ад землеўладальнікаў. Але суадносіны паміж імі хутка мяняліся. Гаспадарка сялян была няўстойлівай. Вялікі памер даніны, ваенныя паходы, частыя набегі суседніх народаў прыводзілі гаспадарку незалежных абшчыннікаў да разбурэння. Патрэба ў прыладах працы, інвентары, насенні прымушала збяднелых сялян ісці ў кабалу да буйнога землеўладальніка. Асноўнай формай эксплуатацыі рабочай сілы ў феадальнай вотчыне была даніна, прадукцыя сялянскай гаспадаркі. Ператварэнне раней свабодных абшчыннікаў у феадальна-залежных сялян адбывалася рознымі шляхамі. Гэта быў доўгі і павольны працэс, які працягваўся некалькі стагоддзяў.

У першай палове XIII ст. працэс фарміравання феадальных адносін паскорыўся. Больш інтэнсіўна развіваліся прадукцыйныя сілы ў сельскай гаспадарцы, раслі гарады, квітнелі гандаль і рамёствы; пашырылася тэрытарыяльная спецыялізацыя працы. Адчуваліся змены ў інстытуце феадальнай уласнасці. У плынь феадальнай эксплуатацыі пачалі ўцягвацца новыя катэгорыі насельніцтва з ліку вольных, свабодных абшчыннікаў.

Побач з зямельнай уласнасцю свецкіх феадалаў у Беларусі развівалася і землеўладанне вышэйшага духавенства, асабліва карпаратыўных духоўных феадалаў: праваслаўных епіскапстваў, манастыроў і цэркваў. Зямельная ўласнасць царквы фарміравалася з падараванняў князёў, а таксама з уласнай гаспадарчай і іншай дзейнасці (купля, атрыманне ў спадчыну або за доўг і інш.). Так, жонка менскага князя Глеба Усяславіча ў 1158 г. падаравала Пячэрскаму манастыру пяць сёл з чэляддзю. Уласнасцю царквы з'яўляліся манастырскія ўладанні, маёмасць царкоўных іерархаў, органаў царкоўнай улады, прыходскіх храмаў.

## САЦЫЯЛЬНАЕ РАССЛАЕННЕ ГРАМАДСТВА

Насельніцтва беларускіх княстваў і зямель не было сацыяльна аднолькавым, аднародным. На вяршыні феадальнага грамадства стаялі самыя багатыя і ўплывовыя людзі – князі і баяры. Клас феадалаў меў сваю іерархію, піраміду. На яе вяршыні стаяў вялікі князь, які з'яўляўся ўласнікам усёй зямлі. Ніжэй знаходзіліся князі больш дробных удзельных княстваў-«вотчын», затым ішлі феадалы – уладальнікі вялікіх і малых ся-

дзіб. Становішча феадала залежала ад яго радавітасці і колькасці зямлі, якой ён валодаў.

Сялянства не было аднародным слоем тагачаснага грамадства. Яно складалася з шэрагу катэгорый. Асноўнай масай насельніцтва ўсходніх славян з'яўляліся свабодныя абшчыннікі – смерды, як яны называюцца ў крыніцах. У працэсе феадалізацыі грамадства частка смердаў пераходзіла ў залежны стан, іншыя заставаліся адносна свабоднымі. Адпаведныя суадносіны змяняліся, але вольныя абшчыннікі пераважалі яшчэ доўгі час.

Існуе некалькі меркаванняў аб сацыяльнай сутнасці смердаў. Верагодней за ўсё, яны ўяўлялі сабой несвабодных ці паўсвабодных княжацкіх даннікаў, што сядзелі на яго зямлі і выконвалі павіннасці на карысць князя («Или смердъ умучать, а без княжа слова, за обиду 3 гривны»). З развіццём феадальных адносін частка з іх трапіла ў залежнасць ад свецкіх і царкоўных феадалаў. Такім чынам з'явіліся новыя катэгорыі феадальна-залежных сялян: закупы, радовічы, ізгоі, халопы.

Закупы – гэта сяляне, якія ўзялі пазыку ў пана і павінны былі яе адпрацаваць на гаспадарцы крэдытора да выплаты доўгу. Многія закупы не маглі вярнуць пазыку і рабіліся неаплатнымі даўжнікамі («если закуп убежит от господина, то он полный холоп…»). Сялян, якія заключылі з феадалам дагавор (рад) называлі радовічамі, а сяляне, якія па розных прычынах вымушаны былі пакідаць абшчынныя землі і сяліцца на зямлі феадала, рабіліся ізгоямі. Халопы і рабы былі асабіста несвабоднымі людзьмі і знаходзіліся ў поўнай уласнасці феадала. Частка халопаў працавала ў яго ў якасці хатніх і дваровых слуг. Яны не мелі асабістай гаспадаркі і знаходзіліся на ўтрыманні гаспадароў. Да залежных ад феадала людзей адносілася чэлядзь, якая фарміравалася ў асноўным з рабоў («чэлядзь нявольная»), («…кто челядинъ пояти хощеть, познавъ свои, такъ оному вести…»). З'яўленне закупаў, радовічаў, халопаў, рабоў, чэлядзі нявольнай сведчыць, з аднаго боку, аб маёмасным і сацыяльным расслаенні сялянскай абшчыны, а з другога – аб канцэнтрацыі зямельнай уласнасці ў руках феадалаў-землеўладальнікаў.

Сацыяльнае расслаенне грамадства значна паглыбілася ў выніку развіцця феадальных адносін у бок павелічэння класа феадалаў і змяншэння слоя свабодных, незалежных сялян, якія паступова станавіліся прыгоннымі, сацыяльна бяспраўнымі. Залежнае насельніцтва займала самае прыніжанае становішча на сацыяльнай лесвіцы.

Такім чынам, у IX–XII стст. аснову эканомікі Беларусі складала сельская гаспадарка, у якой вядучая роля належала земляробству. На яго аснове

развівалася жывёлагадоўля з развядзеннем усіх вядомых у наш час відаў свойскай жывёлы. Пэўнае месца ў гаспадарцы, асабліва для некаторых населеных пунктаў, займалі паляванне і рыбалоўства. Шырокае распаўсюджанне атрымалі хатнія промыслы. Ішоў працэс фарміравання феадальнага землеўладання і феадальнай іерархіі.

Сельскагаспадарчая вытворчасць у азначаны перыяд яшчэ не набыла таварнага характару, таму асноўны цяжар у эканамічным развіцці прыпадаў на сялянскую гаспадарку. З пашырэннем рамеснай вытворчасці (пераважна ў гарадах) і яе спецыялізацыі, хоць і абмежавана, але развіваўся як унутраны гандаль, так і гандаль з замежжам. Сельскае насельніцтва само забяспечвала сябе неабходнай рамесніцкай прадукцыяй. Эканоміка насіла ў асноўным натуральны характар. Сацыяльны склад насельніцтва мяняўся ў бок павелічэння феадальных слаёў – князёў, баяр, царкоўнікаў – і памяншэння колькасці незалежных (свабодных) сялян.

# 7 РЭЛІГІЯ І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У IX–XIII стст.

- **Язычніцтва. Перадумовы хрысціянізацыі**
- **Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства**
- **Вусная народная творчасць**
- **Пісьменнасць, літаратура, мастацтва**

## ЯЗЫЧНІЦТВА. ПЕРАДУМОВЫ ХРЫСЦІЯНІЗАЦЫІ

Язычніцтва (паганства) – умоўны тэрмін для абазначэння вераванняў і культаў, якія існавалі да ўзнікнення і пашырэння монатэістычных рэлігій (будызму, хрысціянства, ісламу). Для яго характэрны: політэізм – вера ў шматлікіх багоў; пантэізм – абагаўленне розных прыродных сіл і стыхій; антрапамарфізм – надзяленне чалавечымі рысамі і якасцямі багоў, міфічных істот; магічныя дзеянні і інш.

Станаўленне сістэмы рэлігійных уяўленняў, культаў і абрадаў на тэрыторыі Беларусі адбывалася на працягу розных гістарычных эпох і было звязана з жыццядзейнасцю чалавечага грамадства. У часы каменнага веку асноўнымі заняткамі насельніцтва беларускіх зямель былі збіральніцтва, паляванне і рыбалоўства. Прырода займала галоўнае месца ў жыцці чалавека. Пазнанне прыродных з'яў адлюстравалася на мысленні людзей і іх свядомасці. У першабытным грамадстве развіваліся такія вераванні, як татэмізм (уяўленні пра роднасць паміж людзьмі і пэўным відам жывёл, раслін), фетышызм (вера ў цудадзейную сілу асобных матэрыяльных прадметаў), анімізм (перакананне ў існаванні душ, добрых і злых духаў), якія

з'яўляліся спробай тлумачэння навакольнага свету, а таксама давалі магчымасць гарманізаваць адносіны чалавека з прыродай і з іншымі людзьмі.

У бронзавым веку на тэрыторыі Беларусі рассяляліся індаеўрапейцы і фарміравалася балцкае насельніцтва, асноўнымі заняткамі якога сталі земляробства і жывёлагадоўля. Такія змены прывялі да пашырэння культаў сонца, асобных жывёл, дажджу і звязаных з ім навальніц і маланак. Навукоўцы лічаць, што ў гэты час сфарміраваліся асноўныя аграрныя культы нашых продкаў.

У перыяд жалезнага веку адбылося далейшае ўдасканаленне гаспадарчага жыцця і ўскладненне сацыяльнай структуры грамадства. Гэтыя з'явы паўплывалі на свядомасць людзей і развіццё рэлігійных уяўленняў. Менавіта ў жалезным веку ў асноўным вызначыўся пантэон багоў.

Прыход славян на тэрыторыю Беларусі ў V–VIII стст., працэсы сінтэзу балцкай і славянскай культур сталі чарговымі фактарамі, якія садзейнічалі эвалюцыі вераванняў і культаў, фарміраванню міфалогіі – сістэмы ўяўленняў аб навакольным асяроддзі. Лічыцца, што ў канцы X ст. завяршылася афармленне язычніцкай міфалогіі продкаў беларусаў як рэгіянальнага варыянта ўсходнеславянскай.

У свядомасці старажытных жыхароў Беларусі шматлікія з'явы прыроды і грамадскага жыцця персаніфікаваліся. Таму міфалогія ўключае значную колькасць персанажаў, сярод якіх асноўныя – гэта багі і духі. У адпаведнасці з міфалагічнымі ўяўленнямі, кіравалі светам багі. Яны валодалі надзвычайнымі магчымасцямі, індывідуальнай адметнасцю і пазнавальнай атрыбутыкай, кіравалі пэўнымі часткамі Сусвету. Ім пакланяліся як уладарам прыроды і чалавечага лёсу.

Па крыніцах вядомы шэраг багоў усходніх славян (Вялес, Пярун, Мокаш, Стрыбог, Даждбог, Сварог, Ярыла, Хорс і інш.) і заходніх (Белбог, Чарнабог, Яравіт, Святавіт, Ругевіт, Трыглаў, Провэ і інш). Але невядома, якіх багоў канкрэтна шанавалі на тэрыторыі Беларусі. Ёсць звесткі аб тым, што ў нашай краіне засталіся сляды (тапаніміка, паданні, назвы свят) толькі двух багоў – Перуна і Вялеса, а яшчэ, магчыма, Ярылы. Назвы *Мокашава балота*, *Мокіш* могуць быць слядамі культу багіні Мокаш.

Пярун – захавальнік нябеснага агню, бог грому і маланкі, вайны і мужчынскай доблесці. Свяшчэнным дрэвам гэтага бога быў дуб, а адным з атрыбутаў лічыліся каменныя сякеры, якія сярод беларускіх сялян называлі «громавымі» ці «перуновымі» стрэламі. Пярун панаваў над зямлёй, яго страшыліся і стараліся задобрыць ахвярапрынашэннем. Улада бога грому і маланкі вызначалася мяжой – з першых да апошніх навальніц (з мая да сярэдзіны жніўня), а потым ён засынаў да наступнай вясны.

Простыя людзі асабліва шанавалі Вялеса (Воласа), таму што ён заступаўся за бедных. Вялес параднiў чалавека з жывёламі, дапамог выкарыстоўваць іх у гаспадарцы. Ён быў звязаны з аграрнымі культамі, пра што сведчыць усходнеславянскі звычай пакідаць яму ў дар нязжатымі некалькі каласкоў, якія называлі «Воласавай барoдкай». Вялес меў дачыненне да асобных крыніц і рэк, а таксама лічыўся богам падземнага свету.

Служкамі паганскага культу былі жрацы. Месцы, дзе язычнікі ўшаноўвалі сваіх багоў, прыносілі ім ахвяры, называліся свяцілішчамі. Яны падзяляліся на родавыя (для аднаго паселішча) і племянныя (для аднаго або некалькіх плямён). З узнікненнем дзяржаўнасці і са з'яўленнем гарадоў будаваліся агульнадзяржаўныя свяцілішчы, дзе маглі быць прадстаўлены пантэоны розных этнасаў. Размяшчаліся яны на ўзвышшах, астравах і мысах сярод балот, на берагах рэк і азёр, пры крыніцах (асабліва тых, якія з'яўляліся вытокамі рэк), зрэдку насыпаліся штучна. Адной з разнавіднасцей свяцілішчаў былі капішчы – круглыя пляцоўкі з ідаламі ў цэнтры, абведзеныя па краі равамі, камянямі або ямамі. Функцыі прасцейшых свяцілішчаў выконвалі культавыя камяні, узгоркі, крыніцы, дрэвы або гаі.

Захаваліся звесткі пра існаванне паганскіх свяцілішчаў на гарадзішчах Войстам (Смаргонскі раён) і Свір (Мядзельскі раён); ахвярнікаў у Хоўхлаве (Маладзечанскі раён), Лоску (Валожынскі раён) і Брэсце. Паводле легенды, запісанай у XIX ст., каля возераВаловае (цяпер на тэрыторыі г. Полацка) існавалі калісьці капішчы Перуна і Бабы Ягі. Да пачатку XX ст. функцыянавала свяцілішча на вуліцы Лодачнай у Мінску (на беразе ракі Свіслач блізу сучаснай вуліцы Чырвонаармейскай). Тут, у дрыгвістым месцы была невялікая пляцоўка, дзе рос вялізны дуб, стаяў святы камень і няспынна гарэла вогнішча. Гэтае капішча на працягу ўсяго XIX ст. абслугоўвала адна сям'я Севасцеяў. Царква забараніла хаваць іх на хрысціянскіх могілках, а потым паспрыяла і разбурэнню капішча.

У цэнтры свяцілішчаў ставіліся драўляныя, каменныя ці металічныя ідалы, каля якіх выконваліся рытуальныя дзеянні. Ідалы (багі, каменныя бабы, куміры, стоды, балваны, ёлупы) – скульптурныя выявы паганскіх багоў. Найбольш вядомыя – Шклоўскі ідал «Ёлуп», які датуецца X ст. (захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь), і Слонімскі (знаходзіцца ў Слонімскім краязнаўчым музеі).

Акрамя багоў, шматлікімі персанажамі беларускай міфалогіі былі духі. Духі – міфічныя істоты, звязаныя з чалавекам, яго целам і жыццёвым асяроддзем, у тым ліку і прыродным. З духамі адносіны былі даволі супярэчлівыя. Іх дзялілі на добрых і нядобрых, не акцэнтуючы ўвагі на тое, да якой часткі міфалагічнага Сусвету яны належалі.

Паводле адной з легенд, духі, дэманы, нячысцікі паходзяць ад анёлаў, якіх Бог скінуў на зямлю за спробу ўчыніць бунт супраць яго ўлады. Духі траплялі ў людскія сядзібы, лясы, вадаёмы і станавіліся, адпаведна, дамавікамі, лесунамі, вадзянікамі.

Самымі паважанымі былі духі хаты і сядзібы; самымі любімымі – Дамавік і Хлеўнік. Дамавік (Хатнік, Падпечнік, Гаспадар, Дзед, Браток) – гэта хатні дух, апякун дома, сям'і і гаспадаркі, які часам атаясамліваўся з духам продкаў. Хлеўнік – сядзібны дух, які жыве ў хляве і даглядае скаціну – коней і кароў. Калі селянін пераязджаў у новую хату, то запрашаў Дамавіка і Хлеўніка з сабою.

Лясы і вадаёмы ў жыццядзейнасці селяніна займалі важнае месца пасля палёў. Лясную і вадзяную прасторы, паводле ўяўленняў нашых продкаў, засяляла мноства духаў (Лясун, Вадзянік, Русалка), якія былі не вельмі прыязныя да чалавека з-за таго, што ён сек дрэвы, паляваў на жывёл, лавіў рыбу. Таму неабходна было наладжваць з імі кантакты праз рытуальныя дзеянні і прынашэнні.

Шэраг персанажаў беларускай міфалогіі – гэта персаніфікаваныя вобразы хваробы: Ліхаманка, Пошасць, Халера, Чума і інш. Адпаведныя дэманы часта ўяўляліся ў выглядзе вандруючых старых жанчын, якія хадзілі ад вёскі да вёскі, разносячы хваробы і смерць. Акрамя лячэння раслінамі, сродкамі жывёльнага і мінеральнага паходжання, распаўсюджанымі прыёмамі пазбаўлення ад хвароб былі магічныя, якімі карысталіся знахары і шаптуны як пасрэднікі паміж «гэтым» светам і «тым», адкуль прыйшла хвароба.

Рэлігійным уяўленням нашых продкаў была характэрна вера ў звышнатуральныя ўласцівасці камянёў і дрэў. На Беларусі пакланяліся камяням-краўцам, сярод якіх вядомы валуны блізу в. Вароніна (Сенненскі раён), в. Краснікі (Докшыцкі раён) і інш. Існуюць паданні аб тым, што ў кожным з іх жыў змей ці чорт (часам чалавек ці абстрактны «кравец»), які вельмі добра і за невялікую плату шыў адзенне. Частка камянёў-краўцоў мела дадатковыя назвы – Сцяпан (Сцёп-камень), Змееў камень, Чортаў камень. Хутчэй за ўсё, так званыя Барысавы і Рагвалодавы камяні, на якіх у XII ст. былі выбіты крыжы і звароты да хрысціянскага Бога, маглі быць культавымі аб'ектамі язычнікаў.

Паводле беларускіх павер'яў, чалавечыя душы часта пасяляліся ў дрэвах, якія пасля гэтага маглі хадзіць, размаўляць, ператварацца ў чалавека. Іншым часам, калі дрэвы секлі, то з іх выцякала кроў і чуліся стогны. Некаторыя дрэвы лячылі хворых. Да XX ст. захоўвалася абрадавае кармленне дрэў. Ім насілі хлеб-соль, загорнутыя ў палатно. На Беларусі шанавалі дуб, ліпу, бярозу, хвойныя дрэвы, таксама шмат паданняў было звязана з асінай, вярбой, клёнам і іншымі дрэвамі. Культавымі з'яўляюцца дуб

бліз в. Царкавішча (Ушацкі раён), ліпа каля в. Капланцы (Бярэзінскі раён), сасна Куліна ля в. Краснікі (Докшыцкі раён), якая расце побач з вядомым Сцёп-каменем і лічыцца яго жонкай.

Акрамя камянёў і дрэў, нашы продкі ўшаноўвалі крыніцы, рэкі, азёры, звяроў і птушак. Асаблівай павагай карысталіся нябесныя свяцілы – сонца, месяц і зоркі, а таксама агонь. Так, напрыклад, да агню ставіліся як да жывой істоты, якая можа і дапамагчы, і пакараць. На агонь не дазвалялася пляваць, нельга было заліваць яго вадой, трэба было дачакацца, каб сам дагарэў і патух. Катэгарычна забаранялася пазычаць агонь чужым людзям, асабліва ў вялікае свята.

Такім чынам, язычніцтва адлюстроўвала светапогляд нашых продкаў, якія не супрацьпастаўлялі сябе навакольнаму асяроддзю, а жылі ў натуральным адзінстве з прыродай. Вераванні, культы і абрады захоўвалі шматвяковы вопыт папярэдніх пакаленняў, значна ўплывалі на штодзённае жыццё і побыт насельніцтва, фарміравалі асновы маралі і выхавання дзяцей. Старажытныя міфалагічныя ўяўленні сталі асновай фарміравання разнастайнай вуснай народнай творчасці, якая з'яўляецца важнай часткай духоўнай культуры нашага народа.

Аднак плямёны, што насялялі тэрыторыю Беларусі, адрозніваліся ўзроўнем грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. Гэтыя фактары непазбежна ўносілі карэктывы ў працэс развіцця племянных вераванняў і культаў. Таму ў сістэме язычніцкай міфалогіі існавалі рэгіянальныя асаблівасці, звязаныя з тэрыторыяй пражывання славянскіх аб'яднанняў – крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. У кожнага племяннога саюзу існаваў свой своеасаблівы пантэон, свае найбольш папулярныя культы, сэнс і значэнне якіх у суседзяў маглі быць зусім іншымі.

Спробу правесці рэлігійную рэформу і ўніфікаваць язычніцкія пантэон багоў і культы зрабіў кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч (980–1015), які такім чынам хацеў умацаваць сваю ўладу. У «Аповесці мінулых гадоў» паведамляецца, што ў 980 г. ён паставіў ідалаў асобных багоў (Перуна, Хорса, Дажбога, Стрыбога, Семаргла, Мокашы) «на хълме вънe двора теремьнаго» ў Кіеве.

На славянскім Алімпе, які стварыў кіеўскі князь, вяршэнстваваў Пярун, бо адзіны быў упрыгожаны золатам і срэбрам (срэбраная галава, залатыя вусы). Раней Перуна галоўным боствам не лічылі. Яго культ – справа князя Уладзіміра і яго дзядзькі Дабрыні, які сілай прывёў да пакланення гэтаму богу гарады Ноўгарад і Уладзімір. Менавіта Пярун як заступнік князя і дружыны, апякун воінскай славы найбольш адпавядаў ваяўнічай палітыцы Уладзіміра Святаславіча, накіраванай на ўзмацненне цэнтральнай улады. Аднак спроба рэфармавання язычніцтва поспеху не мела.

Чарговым новаўвядзеннем кіеўскага князя стала хрысціянства. Распаўсюджванне гэтай рэлігіі ў межах Старажытнай Русі з'яўлялася заканамерным працэсам, характэрным для значнай часткі Усходняй Еўропы, які суправаджаўся ўсталяваннем раннесярэдневяковых дзяржаў. Хрысціянства дазваляла манархам абвясціць сваю ўладу свяшчэннай і аб'яднаць падданых агульным веравызнаннем. Славянскія народы адзін за адным прымалі хрысціянства як дзяржаўную рэлігію. Каля 800 г. былі ахрышчаны маравы, у 964 г. новая рэлігія ўведзена ў Балгарыі, у 966 г. – у Польшчы, у 973 г. – у Чэхіі.

Усходнія славяне маглі сутыкнуцца з вучэннем Хрыста ў VII ст. падчас паходаў у землі Візантыйскай імперыі. Царкоўная традыцыя ўвогуле адносіць пачатак хрысціянізацыі Старажытнай Русі аж да першых стагоддзяў нашай эры. У летапісах ёсць звесткі пра місіянерскую дзейнасць апостала Андрэя Першазванага. Згодна з імі, ён трапіў і на землі ўсходніх славян, благаславіў іх і прадказаў узнікненне вялікага горада Кіева: «...Яко на сихъ горах восияеть благодать Божья; имать градъ великъ быти и церкви многи Богъ въздвигнути имать...».

У любым выпадку пачынаючы з IX ст. новая рэлігія павольна распаўсюджвалася ў асяроддзі варажскіх і славянскіх дружыннікаў і купцоў, якія мелі непасрэдныя кантакты з хрысціянскім светам. Некаторыя гісторыкі лічаць, што ў 860-я гг. былі ахрышчаны кіеўскія князі Аскольд і Дзір. Дагавор, заключаны ў 944 г. кіеўскім князем Ігарам з Візантыяй, зацвярджаўся як воінамі-язычнікамі, так і хрысціянамі. Жонка Ігара княгіня Вольга прыняла хрышчэнне каля 955 г.

Пашырэнне хрысціянства на беларускіх землях мела агульныя рысы з яго зацвярджэннем у іншых землях усходніх славян. Мясцовыя князі, дружыннікі, купецтва маглі даведацца або нават далучыцца да новага веравызнання, дзякуючы ваенна-палітычным і гандлёва-эканамічным кантактам Старажытнай Русі з хрысціянскімі краінамі. Некаторыя даследчыкі, абапіраючыся на паведамленні ісландскай «Сагі пра хрышчэнне», лічаць, што ў канцы X ст. у Полацкім княстве хрысціянскае вучэнне прапаведваў скандынаўскі місіянер Торвальд Вандроўнік.

Такім чынам, у IX–X стст. у Старажытнай Русі, часткай якой былі беларускія землі, склаліся перадумовы для прыняцця хрысціянства. Язычніцтва ўскладняла палітычныя, эканамічныя і культурныя стасункі з замежнымі краінамі, большасць з якіх сталі хрысціянскімі. Развіццю феадальных адносін, фарміраванню інстытута ўлады і дзяржаваўтваральным працэсам, якімі былі ахоплены ўсходнеславянскія землі, больш адпавядаў хрысціянскі монатэізм, чым язычніцкі політэізм. Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены ў Старажытнай Русі выклікалі канфесійную перабудову,

садзейнічалі таму, што адна рэлігія была заменена другой, якая больш адпавядала гістарычнай рэчаіснасці. Знешне- і ўнутрыпалітычная кан'юнктура, папярэдняя місіянерская дзейнасць і наяўнасць у дзяржаве пэўнага хрысціянскага асяроддзя падштурхнулі вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча да прыняцця вучэння Хрыста і хрышчэння дзяржавы.

## ПРЫНЯЦЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАННЕ ХРЫСЦІЯНСТВА

Афіцыйнаму ўвядзенню хрысціянства на Русі папярэднічаў зварот імператара Васіля II (958–1025) да кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча па дапамогу ў падаўленні мяцяжу, які выбухнуў у Візантыі ў 987 г. За падтрымку імператар абяцаў выдаць за князя сястру Ганну і даць значную ўзнагароду. Мяцеж быў ліквідаваны пры дапамозе прысланага Уладзімірам шасцітысячнага войска, але імператар адмовіўся выконваць свае абавязацельствы. Тады кіеўскі князь з войскам уступіў у Крым і пасля доўгай аблогі заняў Корсунь (зараз г. Херсанес). Імператар паспяшыў прымірыцца з Уладзімірам і выканаць свае абяцанні. Аднак да заключэння шлюбу кіеўскі князь павінен быў ахрысціцца, што ён і зрабіў у хуткім часе.

Пасля вяртання з Візантыі Уладзімір Святаславіч абвясціў хрысціянства («грэчаскую веру») рэлігіяй Старажытнай Русі. Афіцыйнай датай прыняцця новай веры лічыцца 988 г. (па іншых звестках 989 ці 990 г.). Аднак названы час мае толькі сімвалічнае значэнне. Увядзенне хрысціянства было не каротчасовым актам, а стала працяглым і складаным працэсам, расцягнутым на стагоддзі.

Паводле «Аповесці мінулых гадоў», ахрысціўшы жыхароў Кіева, князь Уладзімір распачаў хрышчэнне ўсёй дзяржавы. Ён рабіў гэта асабіста або з дапамогай сваіх пасаднікаў і сыноў. Хрышчэнне беларускіх зямель ажыццяўлялася рознымі, не заўсёды мірнымі, шляхамі.

Пра ўсталяванне хрысціянства ў Полацку вядома мала. Хутчэй за ўсё, новае веравызнанне было прынята прадстаўнікамі вышэйшай знаці ўслед за ўвядзеннем яго ў Кіеве ў 988 г. У познім Ніканаўскім летапісе пра полацкага князя Ізяслава (канец X ст. – 1001 г.) сказана, што ён «прилежаще прочитанию божественных писаний», г. зн. быў вельмі набожны.

Верагодна, крывавымі падзеямі суправаджалася хрышчэнне Турава. Паданне апавядае пра каменныя крыжы, якія прыплылі ў горад па Прыпяці з Кіева, і пра тое, што вада ў рацэ была чырвоная ад крыві. Хрысціянізацыя насельніцтва беларускіх зямель доўжылася да пачатку XIII ст. Новая вера сутыкнулася з моцнымі традыцыямі не толькі славянскага, але і балцкага язычніцтва. Нездарма так марудна паддавалася хрысціянізацыі Панямонне, заселенае рознымі этнасамі.

Хрысціянскае веравызнанне параўнальна хутка прымалі вышэйшыя слаі грамадства, княжацкія дружыннікі і гараджане, тады як вясковы люд яшчэ стагоддзямі маліўся паганскім багам. У мысленні людзей язычніцкія ўяўленні доўгі час суіснавалі з хрысціянскімі, што прывяло да нараджэння новай формы рэлігійнай свядомасці – феномена «двуаверства». Адбылося злучэнне дзвюх вер, двух светапоглядаў, дзвюх культур. Абедзве рэлігійныя сістэмы адлюстроўвалі розныя бакі быцця: язычніцтва суадносіла чалавека з прыродай, вызначала яго месца ў навакольным асяроддзі, а хрысціянства адлюстроўвала сацыяльную сутнасць чалавека і грамадства, месца чалавека сярод людзей. Сферы ўплыву гэтых сістэм не супадалі, але яны перасякаліся.

Разам з хрысціянізацыяй адбывалася фарміраванне царкоўнай арганізацыі. У канцы X ст. на землях Старажытнай Русі ўзнікла Кіеўская мітраполія, якая падпарадкоўвалася Канстанцінопальскаму патрыярхату. Яна складалася з царкоўных акруг – епархій (епіскапій) з прыходамі. Пад 992 г. Ніканаўскі летапіс паведамляе аб прызначэнні епіскапаў: «Постави Леонтъ митрополитъ Киевский и всея Руси епископы по градомъ. Того же лета постави Леонтъ, митрополитъ Киевский и всея Руси, Чернигову епископа Неофита, а въ Ростовъ постави епископа Феодора, а въ Володимерь Стефана, а въ Белграде Никиту, и по инымъ многимъ градомъ епископы постави».

Да XIII ст. на тэрыторыі Старажытнай Русі ўтварылася каля 16–17 епіскапій, з іх дзве (Полацкая і Тураўская) – на беларускіх землях. Часам з'яўлення епіскапскай кафедры ў Полацку прынята лічыць 992 г. Першым вядомым полацкім уладыкам стаў епіскап Міна, прызначаны на кафедру ў 1105 г. Тураўская епархія была заснавана ў 1005 г. Яе першым кіраўніком крыніцы называюць епіскапа Фаму.

Большая частка епархій ахоплівала тэрыторыі княстваў, у «стольных гародах», у якіх размяшчаліся епіскапскія кафедры. Полацкая епархія ўключала землі ў басейне рэк Дзвіны і Бярэзіны. Што тычыцца Тураўскай епархіі, то на момант узнікнення ў 1005 г. яна аб'ядноўвала некалькі суседніх рэгіёнаў: Папрыпяцце, частку Пабужжа і Верхняе Панямонне. У XI–XII стст. беларускія землі ўвайшлі ў склад яшчэ некалькіх суседніх епіскапій – Белгародскай (Кіеўскай), Уладзіміра-Валынскай, Чарнігаўскай і Смаленскай.

Важнае месца ў царкоўнай структуры займалі манастыры, якія ўзнікалі ў гарадах ці недалёка ад іх. Пад 1037 г. у «Аповесці мінулых гадоў» упершыню ўпамінаецца аб будаўніцтве манастыра ў гонар святога Георгія князем Яраславам Мудрым. У летапісе зазначаецца: «...Черноризьци почаша множитися, и монастыреве починаху быти...». Аднак ёсць меркаванне, што манастыры маглі ўзнікнуць у гады праўлення кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча.

Што тычыцца тэрыторыі Беларусі, то з'яўленне тут першага манастыра звязваюць з імем княгіні Рагнеды, жонкі вялікага князя Уладзіміра. Яна, пастрыгшыся ў манахіні пад імем Анастасіі, заснавала манастыр у Заслаўі. У XI–XII стст. сталі вядомымі манастыры: Свята-Успенскі (Лешчанскі) у Пінску; Барысаглебскі і Варварынскі – у Тураве; Спаса-Ефрасіннеўскі, Багародзіцкі, Іаана Прадцечы, Барысаглебскі (Бельчыцкі) – у Полацку; Барысаглебскі (Каложскі) у Гародні. Ініцыятарамі іх узвядзення былі, як правіла, вялікія ці мясцовыя князі або набліжаныя да іх асобы. Заснавальнікамі духоўных устаноў маглі быць і манахі. З 68 вядомых на Русі манастыроў (па іншых звестках іх было каля 300) дзве трэці былі пабудаваны князямі ці прыватнымі асобамі.

Для пашырэння ўплыву на насельніцтва патрэбны былі людзі, жыццё якіх служыла б узорам хрысціянскіх запаведзяў і маралі. Падобная роля адводзілася менавіта манаству. У XII ст. вылучаюцца прадстаўнікі манаскага духавенства, якія займаліся актыўнай грамадскай дзейнасцю, адукацыяй і асветай. Сярод іх Ефрасіння Полацкая (каля 1104–1167).

Ефрасіння (свецкае імя Прадслава) была дачкой князя Святаслава і ўнучкай князя Усяслава (Чарадзея). У 12-гадовым узросце яна прыняла манаскі пострыг і пасялілася ў келлі Сафійскага сабора. Карыстаючыся бібліятэкай храма, манахіня перапісвала і, магчыма, перакладала кнігі, складала малітвы і пропаведзі. У канцы 1120-х гг. Ефрасіння заснавала жаночы манастыр пры Спаскай царкве ў Сяльцы недалёка ад Полацка. Дзякуючы клопатам Ефрасінні, у манастыры за 30 тыдняў была ўзведзена новая мураваная царква Святога Спаса, будаўніцтвам якой кіраваў Іаан «прыстаўнік над майстрамі царкоўнымі». Манахіня-асветніца падаравала гэтай царкве крыж, выкананы па яе асабістым заказе майстарам-ювелірам Лазарам (Богшам) у 1161 г.

Ефрасіння Полацкая няспынна займалася духоўным самаўдасканаленнем. Яна вучыла манашак захоўваць цярплівасць і душэўную чысціню: «...Учыніце сябе пшаніцаю чыстай, і змяліцеся ў жорнах уміранасцю, малітвамі, постам, каб чыстым хлебам прынесціся на трапезу Хрыстову!». Хрысціянка-асветніца была вядома як добры дарадчык, справядлівы суддзя і міратворца. «І не хацела яна бачыць, каб хто варагаваў: ні князь з князем, ні баярын з баярынам, ні з простых хто са сваім сябрам, але ўсіх жадала бачыць адзінадушнымі».

Па ініцыятыве Ефрасінні каля 1150 г. недалёка ад Полацка пачалося будаўніцтва царквы Святой Багародзіцы, пры якой быў заснаваны мужчынскі манастыр. У гэтай царкве яна размясціла абраз Багародзіцы Адзігітрыі Эфескай, прывезены яе слугой Міхаілам з Візантыі.

У канцы жыцця Ефрасіння здзейсніла паломніцтва ў Іерусалім, дзе і памерла. Пасля 1187 г. яе мошчы былі вывезены з Палесціны і размешчаны ў дальніх пячэрах Кіева-Пячэрскага манастыра, а ў 1910 г. іх перавезлі ў полацкі Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр. За сваю дзейнасць асветніца была далучана царквой да ліку святых. Дзень яе памяці прыходзіцца на 5 чэрвеня (23 мая па старым стылі).

Сярод хрысціянскіх дзеячаў XII ст. вылучаецца асоба Кірылы Тураўскага (каля 1130 – каля 1182). Згодна з паведамленнем з жыція, Кірыла Тураўскі быў сынам багатых бацькоў, але «обаче не любляше богатьства, ни славы тленныа мира сего, но паче всего прилежаше божественных писаний, добре извыче святых книг учению. По времени же отшед в монастырь и бысть мних». Праз нейкі час, прагнучы адзіноты для болей адданага служэння Богу, ён робіцца стылітам (стоўпнікам). Дзякуючы сваёй дзейнасці Кірыла Тураўскі «славен бысть по всей стране той».

Заняўшы каля 1159 г. тураўскую епіскапскую кафедру, ён займаўся ўладкаваннем епархіі, прапаведніцкай, літаратурнай, царкоўнай і палітычнай дзейнасцю, будаваў храмы. Пакінуўшы кафедру, свяціцель нейкі час жыў і працаваў у Тураўскім Барысаглебскім манастыры. Верагодней за ўсё, там Кірыла Тураўскі скончыў свой жыццёвы шлях.

Дзейнасць Кірылы не магла застацца па-за ўвагай сучаснікаў і нашчадкаў. Даследчык яго жыцця і творчасці А. А. Мельнікаў выказаў думку, што, магчыма, ужо ў пачатку XIII ст. Кірыла Тураўскі шанаваўся як святы (пра час кананізацыі звестак не захавалася). Дзень памяці святога адзначаецца 11 мая (28 красавіка па старым стылі).

Клімент Смаляціч (? – пасля 1164) быў вядомы як царкоўна-палітычны дзеяч, мысляр, пісьменнік. Па прапанове кіеўскага князя Ізяслава Мсціславіча епіскапскі сабор без згоды патрыярха абраў яго мітрапалітам у Кіеве ў 1147 г. Клімент Смаляціч займаў гэтую пасаду з перапынкамі да 1161 г. Да нашага часу захаваўся толькі адзін твор гэтага «філосафа і кніжніка» – «Пасланне Фаме прэсвітару». У ім Клімент Смаляціч адстойваў незалежнасць хрысціянскай царквы Русі ад канстанцінопальскага патрыярха.

Аўрамій Смаленскі (? – да 1224) нарадзіўся ў сям'і заможных бацькоў, якія мелі 12 дачок і малілі Бога аб сыне. З дзяцінства Аўрамій (свецкае імя Афанасій) быў набожным, наведваў царкву і меў магчымасць «кніжнай навуцы вучыцца». Бацькі спадзяваліся, што іх адзіны сын возьме шлюб і будзе прадаўжальнікам роду, але той вырашыў прысвяціць сябе справе рэлігійнага служэння і асветы. Пасля іх смерці юнак ахвяраваў усю маёмасць манастырам, хворым і бедным, а сам пайшоў у Селішчанскі манастыр Прасвятой Багародзіцы паблізу Смаленска.

Выконваючы ў манастыры розныя паслушэнствы, Аўрамій старанна вучыўся, займаўся перапісваннем ды збіраннем кніг. Пасля шматгадовага манаскага служэння ён стаў «спачатку дыяканам, а пасля – іерэем». Прападобны набыў вядомасць як прапаведнік і настаўнік манахаў і недухоўных асоб.

Аўрамій перайшоў у Крыжаўзвіжанскі манастыр у Смаленску, куды да яго пачало прыходзіць шмат людзей за духоўнай парадай і настаўленнем. Поспехі ў веруючых выклікалі зайздрасць смаленскага духавенства, у выніку чаго прападобнага абвінавацілі ў ерасі і распаўсюджванні забароненых кніг. На судзе, які ўзначалілі князь і епіскап, Аўрамій змог апраўдацца, але яму забаранілі служыць і адправілі ў Селішчанскі манастыр.

У хуткім часе Смаленшчыну спасцігла засуха. Маленні епіскапа яе не спынілі, і толькі пасля малітвы Аўрамія на зямлю паліўся доўгачаканы дождж. Пасля гэтага царкоўныя ўлады вымушаны былі адмяніць забарону на прапаведніцтва і прызначылі яго ігуменам манастыра. Прападобны Аўрамій памёр да 1224 г. Праваслаўная царква кананізавала яго за актыўную хрысціянскую дзейнасць і ўзорнае жыццё. Дзень памяці святога адзначаецца 3 верасня (21 жніўня па старым стылі).

Распаўсюджванне хрысціянства аказвала ўплыў на фарміраванне маральных прынцыпаў грамадства, спрыяла ўсведамленню нормаў і запаведзяў новага веравучэння. Святы, набажэнствы, абрады, пасты, штодзённыя малітвы карэнным чынам змянілі быт насельніцтва. Аднак хрысціянства не здолела цалкам выкараніць язычніцкія ўяўленні ў менталітэце людзей. У свядомасці нашых продкаў адбылося перапляценне старых і новых традыцый і звычаяў.

Рэлігійныя пераўтварэнні садзейнічалі афармленню дзяржаўнасці, умацаванню княжацкай улады, развіццю феадальных адносін на ўсходнеславянскіх, у тым ліку і на беларускіх, землях. Новая дзяржаўная рэлігія дала магчымасць усталяваць больш цесныя сувязі з еўрапейскімі краінамі. Насельніцтва нашых зямель далучылася да культурнай традыцыі грэкарымскай цывілізацыі. Хрысціянізацыя садзейнічала стварэнню выдатных помнікаў архітэктуры і мастацтва, распаўсюджванню пісьменства, развіццю розных жанраў у літаратуры, з'яўленню школ і бібліятэк.

## ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Вусная народная творчасць, або фальклор, – адзін з відаў славеснага мастацтва, для якога характэрны калектыўнасць стварэння, шматжанравасць і варыятыўнасць. Фальклорны працэс заўсёды адбываецца ў межах

традыцыі, абапіраецца на папярэдні вопыт і здабыткі, выкарыстоўвае назапашаныя мастацкія каштоўнасці. Фальклор узнік раней, чым пісьменнасць, і доўгі час існаваў толькі ў вуснай форме. Сярод жанраў народнай творчасці бытавалі каляндарна- і сямейна-абрадавыя паэтычныя цыклы, шырока распаўсюдзіліся казкі, легенды і паданні, прыказкі і прымаўкі, загадкі і замовы.

Да ліку найбольш архаічных фальклорных жанраў адносяцца замовы – славесныя формулы з магічным сэнсам, якія выкарыстоўваліся для ўздзеяння на навакольную рэчаіснасць і дасягнення розных практычных мэт. Адна група замоў тычылася гаспадарчай дзейнасці. Да яе прымыкаюць «ахоўныя» замовы – ад розных прыродных з'яў, ад злых духаў, ад звяроў, ад злога чаравання. Другая група ўключала творы лекавага характару – ад розных хвароб, на забеспячэнне здароўя. Трэцяя група замоў ахоплівала грамадскія і сямейныя адносіны і была скіравана на ўмацаванне дабрабыту і шчасця ў сям'і, захаванне кахання, абарону ад благіх людзей і інш.

Каляндарна-абрадавая паэзія – сукупнасць розных фальклорных жанраў, звязаных з аграрнымі святамі і працай земляроба на працягу гаспадарчага года. Вылучаюць зімовы, вясновы, летні і восеньскі паэтычныя цыклы каляндарна-абрадавага фальклору, вытокі якога бяруць пачатак у старажытным родавым грамадстве. Назіранні за астранамічнымі з'явамі, зменамі ў прыродзе, этапамі чалавечага жыцця склаліся ў цэльную міфалагічную карціну свету. Гэта ўвасобілася ў розных паэтычных формах (песнях, прыгаворах, прыказках, прымаўках), якія суправаджалі абрады і рытуалы, накіраваныя на забеспячэнне перш за ўсё ўраджаю на палях і дабрабыту ў сям'і і гаспадарцы. З развіццём грамадства паэзія земляробчага календара пачала адлюстроўваць працоўную дзейнасць селяніна, сацыяльны падзел грамадства, маральна-этычныя ўяўленні народа.

Да сямейна-абрадавага фальклору адносяцца вусна-паэтычныя творы, якія тычыліся трох важнейшых жыццёвых падзей чалавека: нараджэння, шлюбу і пахавання. Сямейна-абрадавая паэзія, звязаная з культам продкаў і анімістычнымі вераваннямі, павінна была ўплываць на звышнатуральныя сілы, каб палепшыць лёс чалавека, абараніць яго ад усяго шкоднага, забяспечыць шчаслівае жыццё, дабрабыт і рост сям'і. Гэтая разнавіднасць вуснай народнай творчасці ўключала радзінна-хрэсьбінныя і вясельныя паэтычныя цыклы, а таксама пахавальныя галашэнні.

Сярод празаічных жанраў беларускага фальклору шырынёй ахопу жыццёвых з'яў, глыбінёй абагульнення, яркасцю створаных вобразаў вылучаюцца казкі. Казка – гэта вуснае апавяданне сацыяльна-бытавога, фантастычнага або авантурна-навелістычнага зместу, якое адлюстроўвае рэчаіснасць пры дапамозе мастацкай выдумкі і заключае ў сабе дыдактычна-павучаль-

ны сэнс. Казкі, якія ўзніклі ў далёкім мінулым, задавальнялі эстэтычныя запатрабаванні народа, былі важным сродкам пазнання навакольнага свету і абагульнення вопыту многіх пакаленняў, а таксама сродкам выхавання. Звычайна казачны эпас падзяляецца на творы аб жывёлах, чарадзейныя, або міфічныя, сацыяльна-бытавыя.

На думку даследчыкаў, анімалістычныя і чарадзейныя казкі – адны з самых старажытных разнавіднасцей фальклорнай прозы. У казачных творах пра жывёл разам з трапнымі назіраннямі за навакольнай прыродай перадаваліся ў алегарычнай форме адносіны паміж людзьмі, асобныя рысы чалавечых характараў, выкрываліся заганы грамадства. Персанажамі названых казак сталі лясныя звяры – мядзведзь, воўк, ліса, заяц, дзік; хатнія жывёлы – конь, баран, кот, свіння, сабака; птушкі.

Беларускія чарадзейныя апавяданні захавалі вобразы міфічных асілкаў (Вярнідуб, Гарыня) і варожых сіл (шматгаловы змей – Паганы Цмок). У такіх творах разам з жывымі істотамі дзейнічаюць Сонца, Вецер, Месяц, Мароз, Гром. Асобную групу ствараюць чарадзейныя казкі, у якіх адлюстраваны эпізоды з былін. Найбольш падрабязна расказваецца пра Іллю Мурамца: яго цудоўнае вылячэнне, карчаванне ляда, выбар каня, перамогу над нягідным Сокалам і царом Пражорам, якія вельмі нагадваюць вядомых былінных персанажаў Салаўя-разбойніка і Ідалішча Паганае. Падабенства паміж такімі казкамі і былінамі ў большасці выпадкаў не абмяжоўваецца агульнымі эпізодамі і вобразамі. Яно адчуваецца ў ідэйным напаўненні вобраза, у агульнай накіраванасці твораў.

Быліны з'яўляюцца вядомым усходнеславянскім фальклорным жанрам. Асноўная іх тэма – барацьба са знешнімі ворагамі, галоўныя героі – асілкі, абаронцы роднай зямлі. Большасць былін геаграфічна звязана з Кіевам і Ноўгарадам, але ў змесце некаторых з іх адлюстраваны падзеі з гісторыі Полацкай зямлі. Так, у быліне «Дунай» адлюстраваны сапраўдны гістарычны факт сватання наўгародскага князя Уладзіміра да полацкай князёўны Рагнеды (канец X ст.). Паводле быліны, Дунай Іванавіч быў прыбліжаным князя Уладзіміра. Яму даручылі адказнае заданне – прывезці дастойную нявесту для князя, дзеля чаго ён паехаў у «харобрую Літву» сватаць «літоўскую» Апраксу-каралеўну, прытым яму было прыдадзена сілы сорак тысяч і казны дзесяць тысяч. Князь не меў упэўненасці, што славутая каралеўна пойдзе за яго, таму даў наказ узяць каралеўну сілай у выпадку адмовы. Дунай Іванавіч выканаў загад і забраў нявесту для князя.

Вобраз Рагнеды і яе гаротны лёс сталі тэмай для фальклорных сюжэтаў, частка якіх была занатавана ў летапісах – «Аповесці мінулых гадоў», «Лаўрэнцьеўскім», «Густынскім», «Цвярскім». Менавіта з летапісных

аповедаў можна даведацца аб падрабязнасцях сватаўства Уладзіміра да полацкай князёўны, аб забойстве яе сям'і, пра замах Рагнеды на жыццё князя, пра тое, як яна прыняла манаства пад імем Анастасіі і пайшла ў манастыр. Ва ўсіх летапісных аповесцях Рагнеда паўстае гордай і непакорлівай, яе журботны лёс выклікае спачуванне.

Даследчыкі лічаць, што полацкі князь Усяслаў Брачыславіч з'яўляецца правобразам галоўнага героя ўсходнеславянскай быліны «Волх Усяславіч». Твор пачынаецца з апавядання аб чарадзейным нараджэнні сына Волха ў маладой князёўны Марфы Усяслаўны і «лютага» Змея. Волх быў здольны абарочвацца шэрым воўкам. У час паходу «дружына спіць, так Волх не спіць». Сокалам лятаў ён да сіняга мора, гнядым турам-залатыя рогі скакаў у паўднёвае царства. Як і быліннаму герою, летапіс прыпісвае Усяславу Брачыславічу здольнасці пярэваратня, дзякуючы якім ён вельмі хутка рухаўся ў паходах, ведаў пра планы ворага, нечакана з'яўляўся перад ім, ды і кіеўскі пасад ён захапіў «клюкамі» – хітрасцю і падманам. Характэрна, што станоўчая былінная ацэнка гэтага князя-чараўніка адрозніваецца ад негатыўнай летапіснай («Аповесць мінулых гадоў») і цалкам сугучная ўзнёслай характарыстыцы Усяслава ў «Слове аб палку Ігаравым».

Акрамя вышэйпералічаных жанраў, фальклорная творчасць насельніцтва беларускіх зямель прадстаўлена легендамі і паданнямі. Да легенд звычайна адносяць вусныя апавядальныя творы, у аснове якіх ляжаць фантастычныя або апаэтызаваныя вобразы, уяўленні, падзеі, звязаныя з гісторыяй народа. Беларускія легенды разнастайныя па тэматыцы – касмаганічныя, этнагенічныя, гістарычныя, апакрыфічныя (творы на біблейскія сюжэты) і інш. У іх адлюстраваны спробы растлумачыць паходжанне сусвету і зямлі, чалавека і жывёл, сутнасць розных з'яў прыроды і грамадскага жыцця («Адкуль свет пайшоў», «Адкуль горы ды балоты», «Сатварэнне чалавека», «Як чалавек зрабіў агонь»). У некаторых беларускіх легендах разглядаюцца розныя маральна-этычныя праблемы, сцвярджаецца неабходнасць добрасумленнага стаўлення да працы, справядлівых і добразычлівых адносін паміж людзьмі («Стары бацька», «Чаму не аднолькава работы ва ўсіх?»).

У адрозненне ад легенд паданні паведамляюць аб рэальных асобах і сапраўдных падзеях. З пакалення ў пакаленне перадаваліся апавяданні пра месцы даўніх пабоішчаў, пра барацьбу з ворагамі, пра асобных гістарычных дзеячаў («Гара Рагвалода і Рагнеды»). Значную групу складаюць тапанімічныя паданні – пра паходжанне гарадоў, мястэчак, вёсак, рэк, азёр, замчышчаў, гарадзішчаў і курганоў у Беларусі і іх назваў («Як узнікла Берасце», «Як паўстаў Мінск», «Пра паходжанне ракі Віліі», «Сож і Дняпро», «Нёман і Лоша»). Былі таксама пашыраны паданні пра заклятыя скарбы, што нікому «не даюцца» ў рукі, пра дзівосныя камяні, у тым ліку камяні-краўцы і г. д.

Фальклор з'яўляецца важнай часткай духоўнага жыцця народа, яго гісторыі. Вусная народная творчасць мае старажытныя карані і традыцыі. Фальклорны працэс з'яўляўся калектыўнай справай, кожнае пакаленне ўзбагачала яго сваімі здабыткамі, думкамі і пачуццямі. У народных творах адлюстраваліся жыццёвыя вопыт і мудрасць, філасофія і маральна-этычныя ідэалы, а таксама найважнейшыя гістарычныя падзеі. Таму фальклорнае мастацтва – гэта каштоўная крыніца для вывучэння айчыннай гісторыі.

## ПІСЬМЕННАСЦЬ, ЛІТАРАТУРА, МАСТАЦТВА

Пачынаючы з IX–X стст. на ўсходнеславянскіх землях распаўсюджвалася пісьменнасць на базе кірылічнага алфавіта. Кірыліца была складзена ў 863 г. братамі Кірылам і Мяфодзіем для старабалгарскай мовы, але ўжывалася многімі славянскімі народамі. Спрыяла гэтаму прыняцце славянамі хрысціянства і пераклад рэлігійных тэкстаў на іх мовы.

Адным са старажытнейшых узораў усходнеславянскага пісьма з'яўляецца надпіс канца X ст. на свінцовай віслай пячатцы полацкага князя Ізяслава Уладзіміравіча, знойдзенай у Ноўгарадзе. На ёй змешчана выява трызубца і напісана імя князя – «Изас(лав)ос». Там жа, у Ноўгарадзе, знаходзілася і пячатка Ефрасінні Полацкай з надпісам «Г/оспод/и помози рабе своей Ефросини нарецаемой».

Помнікамі эпіграфікі з'яўляюцца свінцовыя віслыя пячаткі тураўскага князя Ізяслава Яраславіча (з 1054 г. ён быў кіеўскім князем), выяўленыя ў Тураве, Берасці, Ваўкавыску. Акрамя гэтых, пячаткі з надпісамі знойдзены ў Гомелі, Гродне, Віцебску, Пінску.

У час археалагічных раскопак на тэрыторыі Беларусі выяўлена значная колькасць разнастайных прадметаў XI–XIII стст. з надпісамі іх уладальнікаў, што сведчыць аб распаўсюджванні пісьменнасці сярод насельніцтва. Напрыклад, прасніцы з тэкстамі «Настасино прасънъ» (Пінск), «бабино прасьне» (Віцебск), абломкі амфар – «(Я)рополче вино» (Пінск), «Олекъси» (Навагародак). На самшытавым грэбені з Берасцейскага гарадзішча выразаны літары ад «А» да «Л».

Помнікамі пісьменнасці на Беларусі з'яўляюцца надпісы XII ст. на Барысавых (Полацкі, Мёрскі, Браслаўскі раёны) і Рагвалодавым (Аршанскі раён) камянях. На вялікіх валунах па загаду полацкага князя Барыса Усяславіча былі выбіты крыжы і надпісы наступнага зместу: «гси (господи) помози рабоу своему Борисоу». Тое зрабіў і сын Барыса друцкі князь Рагвалод. На камені вышынёй каля трох метраў князь загадаў выбіць крыж і надпіс: «В лето 6679 (1171) месяца мая в 7 день доспен (высечаны) крест

сий; господи помози рабоу своему Василию в крещении именем Рогволоду, сыну Борисоу».

Уяўленне пра бытавую пісьменнасць на тэрыторыі Беларусі даюць берасцяныя граматы. Адна з іх – гэта грамата XI ст., якую напісаў Жыравіт, жыхар Полацка або Віцебска, была знойдзена ў Ноўгарадзе. Берасцяныя граматы XIII ст. выяўлены ў Віцебску і Мсціславе. Тэкст граматы з Віцебска наступны: «От Степана къ Нежилови. Оже еси продалъ порты, а купи ми жита за 6 гривенъ. А ли цего еси не продалъ, а посли ми лицемь. А ли еси продалъ, а добро сътворя у купи ми жита». У фрагменце граматы з Мсціслава гаворыцца пра пшаніцу на суму 4,5 грыўні і пра нейкага Сямёна.

Найбольш каштоўныя помнікі пісьменнасці – гэта рукапісныя кнігі. У XI–XIII стст. яны выраблялiся з пергаменту – спецыяльна апрацаванай скуры жывёл. Кнігі перапісваліся ўручную, гэта быў вельмі працаёмкі працэс. Тэкст аздабляўся каляровымі мініяцюрамі, застаўкамі, загалоўкамі і канцоўкамі. Кніжныя пераплёты мелі прыгожыя абклады і аздобы з каляровых металаў. Кнігі ствараліся і захоўваліся пры манастырах і саборах. Такім чынам узнікалі бібліятэкі, найбольш вядомая з якіх – бібліятэка пры полацкім Сафійскім саборы, якая праіснавала з XI ст. да другой паловы XVI ст.

Рэпертуар рукапісных кніг складалі рэлігійныя і свецкія творы перакладной і арыгінальнай літаратуры. З перакладной – першымі з'явіліся кнігі Святога Пісання і багаслужэбная літаратура. XI стагоддзем датуецца Тураўскае Евангелле, напісанае на царкоўнаславянскай мове. Яшчэ вядомы Аршанскае і Полацкае евангеллі (абодва датуюцца канцом XII – пачаткам XIII ст.), Супрасльскі рукапіс (кодэкс) – зборнік жыцій і пропаведзяў XI ст. Сярод рэлігійных чытальных кніг папулярнасцю карысталіся творы Яфрэма Сірына, Іаана Леcтвічніка, Іаана Златавуста і інш.

Сярод твораў арыгінальнай літаратуры найбольш пашыраны былі жыціі, або агіяграфіі (жыццяпісы святых). Вядомымі творамі такой літаратуры з'яўляюцца «Жыціе Ефрасінні Полацкай» (створана на мяжы XII–XIII стст.), «Жыціе Кірылы Тураўскага» (складзена ў канцы XII або ў XIII ст.), «Жыціе Аўрамія Смаленскага» (напісана яго вучнем Яфрэмам каля 1240 г.).

«Жыціе Кірылы Тураўскага» апавядае аб ім наступнае: «Андрею же, Боголюбскому князю, многа послания написа от евангельскых пророчьскых писаний, яже суть чтомы на праздникы Господьскыа, и ина многополезна словеса, яже к Господу молитвы и похвалы многым святым, – сим вся и ина множайша написав, церкви предаст. И канон великый о покаании сътвори к Господу по главам азбуки...». На сённяшні дзень захавалася каля 70 твораў розных жанраў з літаратурнай спадчыны Кірылы Тураўскага.

За красамоўства, рэлігійна-асветніцкую дзейнасць сучаснікі называлі свяціцеля «другим Златоустом».

Акрамя рэлігійнай, у XI–XIII стст. распаўсюджвалася свецкая літаратура. Папулярнасцю карысталіся перакладзеныя з грэчаскай на царкоўнаславянскую мову «Гісторыя іўдзейскай вайны» Іосіфа Флавія, гістарычныя аповесці «Александрыя», «Троя» і інш. Гэтыя кнігі распавядалі аб мінулым еўрапейскіх народаў.

Выдатным помнікам арыгінальнай свецкай літаратуры таго перыяду лічыцца «Слова пра паход Ігаравы» – ананімны твор, напісаны ў 1185–1187 гг. «Слова…» створана на тыповай для Старажытнай Русі літаратурнай мове і спалучае рысы дружыннага эпасу і хрысціянскай літаратуры. Асноўнай думкай аўтара паэмы з'яўляецца асуджэнне княжацкіх міжусобіц, якія аблягчалі напады стэпавых качэўнікаў – полаўцаў – на Русь. У творы ахоплены два перыяды гісторыі Полацкай зямлі: часы князя Усяслава Брачыславіча (1044–1101) і перыяд, калі княжылі і не мірыліся паміж сабой і з іншымі князямі Русі яго ўнукі (XII ст.). Вялікая ўвага і цікавасць аўтара да мінулага Полацкай зямлі, глыбокая заклапочанасць яе палітычным становішчам сведчаць пра разнастайныя сувязі Полацка з Кіевам і Чарнігавам, пра важную і самабытную ролю Полацкага княства ў гістарычным жыцці Русі.

Арыгінальная літаратура таксама была прадстаўлена летапісамі. Вядома, што летапісанне вялося ў Полацку. Полацкі летапіс не захаваўся, але яго часткі былі ўключаны ў больш позні Кіеўскі летапісны звод. Акрамя Полацка, на беларускіх землях летапісы маглі складацца ў Тураве і Навагародку.

Адным з найбольш значных гісторыка-мастацкіх твораў усходніх славян з'яўляецца «Аповесць мінулых гадоў». Летапіс ствараўся ў Кіеве ў некалькі этапаў і канчатковы выгляд набыў у другім дзесяцігоддзі XII ст. Лічыцца, што «Аповесць…» была складзена манахам Кіева-Пячэрскага манастыра Нестарам. Аўтар летапісу выкарыстаў мясцовыя і замежныя дакументы, шматлікія літаратурныя крыніцы, паданні і легенды. У «Аповесці мінулых гадоў» распавядаецца шмат звестак з гісторыі беларускіх зямель, асабліва Полацкага княства. Летапісец расказвае аб лёсе Рагвалода, Рагнеды, Усяслава Чарадзея, узгадвае падзеі, звязаныя з гарадамі Полацк, Менск, Тураў, Берасце, Гародня і інш.

Такім чынам, з канца X ст. сярод насельніцтва беларускіх зямель распаўсюджвалася пісьменнасць. Пісьму і чытанню вучыліся пераважна прадстаўнікі прывілеяваных колаў і жыхары гарадоў. У грамадстве ўзнікла запатрабаванасць у літаратуры. Першапачаткова з'явіліся перакладныя, пераважна рэлігійныя, кнігі. Але з цягам часу адбывалася станаўленне розных

жанраў арыгінальнай кніжнай творчасці, якая па сваёй значнасці не саступае ўзорам візантыйскай і заходнееўрапейскай літаратуры.

Мураваная архітэктура (дойлідства) з'явілася на старажытнабеларускіх землях разам з хрысціянствам. Найбольш старажытным каменна-цагляным будынкам на тэрыторыі Беларусі лічыцца Сафійскі сабор у Полацку, узведзены ў сярэдзіне XI ст., неўзабаве пасля пабудовы Сафійскіх սабораў у Кіеве і Ноўгарадзе. Сафійскі сабор стаў сімвалам палітычнай незалежнасці Полацкага княства, у ім адбываліся найбольш значныя грамадскія падзеі: «пасаджэнне на сталец», абвяшчэнне вайны і міру, прысяга на вернасць князю, сустрэчы іншаземных паслоў. У храме захоўваліся дзяржаўны скарб і архіў, мелася бібліятэка, вялося летапісанне.

Падчас раскопак 1980-х гг. у падмурку сабрнага будынка археолагамі быў выяўлены вялікі камень-валун, на якім надрапана: «Давыдь, Тоума, Микуола, Петьрь, Воришь». Мяркуецца, што гэта імёны майстроў будаўнічай арцелі, запрошанай у Полацк з Ноўгарада. Па архітэктурнай тыпалогіі полацкі сабор XI ст. з'уляўся крыжова-купальным храмам. Яго сцены былі выкладзены ў змешанай тэхніцы, якая спалучала плінфы (шырокая і плоская абпаленая цэгла візантыйскага ўзору) і прыродны камень. На працягу сваёй шматвяковай гісторыі сабор неаднаразова перабудоўваўся і руйнаваўся. Падчас Паўночнай вайны ў 1710 г. у ім адбыўся выбух пораху, які там захоўваўся. У сярэдзіне XVIII ст. над рэшткамі праваслаўнай святыні ў стылі позняга барока быў узведзены новы грэка-каталіцкі храм, які існуе і сёння.

Пасля ўзвядзення Сафійскага сабора мураванае храмабудаўніцтва ў Полацку прыпынілася болей чым на паўстагоддзя. Але прыблізна з пачатку XII ст. пры епіскапе Міне (1105–1116) яно аднавілася, і ў далейшым была ўзведзена даволі значная колькасць цэркваў. У Полацку сфарміравалася школа культавага дойлідства, якая зведала ўплыў візантыйска-кіеўскіх традыцый. Аднак ужо ў першай палове XII ст. мураванае будаўніцтва ў княстве пайшло іншым, чым у Кіеве, шляхам. Пры ўзвядзенні будынкаў полацкія дойліды выкарыстоўвалі муроўку са схаваным радам цэглы (адзін рад цэглы ўтапліваўся глыбей і затынкоўваўся, вонкавая тынкоўка адсутнічала). У XII ст. дойлідамі гэтай архітэктурнай школы былі ўзведзены: полацкая Спаская царква, бельчыцкія Пятніцкі і Барысаглебскі храмы, віцебская Дабравешчанская царква, а таксама храмы ў Менску і Смаленску.

Акрамя полацкай школы, вылучаецца гарадзенская архітэктурная школа. Яна прадстаўлена наступнымі помнікамі XII ст.: у Гародні – Ніжняй царквой, Барысаглебскай (Каложскай) царквой, Прачысценскай царквой, а таксама храмамі ў Навагародку, Ваўкавыску і іншых гарадах. Асаблівасці тэхнікі гарадзенскай школы – выкарыстанне ў муроўцы плінфы разам

з абчасанымі камянямі і дэкаратыўнай маёлікавай пліткай, а таксама галаснікоў – керамічных гаршкоў, умураваных у сцены для паляпшэння акустыкі. Для аздаблення выкарыстоўваліся фрэскі і мазаіка, што гаворыць аб уплыве візантыйскай, балканскай і каўказскай традыцый будаўніцтва.

У XII ст. была ўзведзена велічная царква ў Тураве, рэшткі якой выяўлены ў час раскопак 1962 г. Гэта быў вялізны мураваны шасціслуповы храм. Яго сцены складаліся з плінфы ў тэхніцы «роўнаслаёвай муроўкі», падлога была вымашчана паліванымі пліткамі. Царква не мела фрэскавай размалёўкі, унутры і звонку аздаблялася лапаткамі. Будаўнікамі храма былі майстры мясцовай школы, якая фарміравалася пад уплывам архітэктурных традыцый валынска-чарнігаўскага рэгіёна.

Акрамя цэркваў, у беларускіх гарадах сталі ўзводзіцца грамадзянскія мураваныя пабудовы, церамы і вежы. У XII ст. княжацкія харомы з’явіліся ў Гародні і Полацку. Паміж 1276 і 1289 гг. дойлідам Алексам была збудавана Камянецкая вежа (Брэсцкая вобласць), якая захавалася да нашага часу. Яна мае пяць міжпавярховых перакрыццяў. Яе сцены праразаюць амбразуры, вузкія ў ніжніх паверхах і шырэйшыя ў верхніх. У старажытнасці вежа бялілася вапнай, таму ў народзе яе сталі называць Белай вежай. Падобныя вежы меліся ў Гародні, Берасці, Навагародку і Тураве.

Прыняцце хрысціянства на старажытнабеларускіх землях паклала пачатак развіццю жывапісу. Яго творы XI–XIII стст., што захаваліся да нашых дзён, нешматлікія – гэта манументальныя роспісы, кніжная мініяцюра і графіка.

Манументальныя роспісы прадстаўлены, галоўным чынам, роспісамі культавых інтэр’ераў. На ранніх этапах развіцця жывапіснага мастацтва моцнае ўздзеянне на яго аказвалі візантыйскія традыцыі. У якасці ўзораў таксама служылі роспісы кіеўскіх храмаў. Аднак ужо з XII ст. у работах айчынных майстроў становяцца бачнымі ўласныя спосабы мастацкага аздаблення храмавых інтэр’ераў, адыход ад традыцыйных схем размяшчэння выяў, імкненне да інтэрпрэтацыі кананічных сюжэтаў, змены ў тэхніцы і тэхналогіі выканання роспісаў.

Адпаведна візантыйскай традыцыі, выявы ў царкве размяшчаліся ў падкупальнай прасторы, у прасценках паміж аконнымі праёмамі барабана, на слупах, бакавых сценах, у прытворах, на хорах. Важнае сэнсавае значэнне мелі кампазіцыі, якія знаходзіліся ў апсідах. Вобразы Хрыста, Маці Божай, Іаана Хрысціцеля, апосталаў, архангелаў, пракокаў, кананічныя сцэны, такія, як «Еўхарыстыя», «Дэісус», сцэны святочнага цыкла складалі галоўныя ідэйныя дамінанты храма. Іх дапаўнялі выявы святых, пакутнікаў, айцоў царквы. Завяршалі мастацкае ўбранне інтэр’ера арнаментальныя

кампазіцыі, якія ішлі па нізе сцен, слупоў, змяшчаліся на скосах аконных і дзвярных праёмаў.

Унутраная прастора храмаў аздаблялася фрэскамі – рознакаляровымі роспісамі па сырой тынкоўцы. Самымі раннімі з вядомых у Беларусі фрэсак з'яўляюцца роспісы полацкага Сафійскага сабора, выкананыя адразу пасля яго ўзвядзення. Да выдатных дасягненняў жывапісу XII ст. можна аднесці фрэскі храмаў полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага і бельчыцкага Барысаглебскага манастыроў, Дабравешчанскай царквы ў Віцебску, Барысаглебскіх храмаў у Навагародку і Гародні.

Акрамя фрэсак, культавыя будынкі аздабляліся мазаікай. У якасці матэрыялу для яе выкарыстоўвалі кавалкі каменю, кераміку, смальту – каляровае непразрыстае шкло ў выглядзе кубікаў ці пласцінак. Мазаікай былі ўпрыгожаны Сафійскі сабор, храм Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку, Ніжняя, Барысаглебская, Прачысценская цэрквы ў Гародні.

З пачаткам кнігапісання з'явілася такая галіна выяўленчага мастацтва, як кніжная мініяцюра і графіка. Рукапісы XI–XII стст. афармлены ў візантыйскім стылі. У іх аздабленні выкарыстоўваліся геаметрычныя, раслінныя і тэраталагічныя элементы. Так, упрыгожаннем Тураўскага Евангелля служаць ініцыялы (вялікія літары) старавізантыйскага тыпу, пры размалёўцы якіх перапісчык прымяніў тры колеры – сіні, зялёны і чырвоны. Аршанскае Евангелле было аздоблена больш як 300 ініцыяламі, выкананымі ў «звярыным» стылі, дзвюма застаўкамі і дзвюма мініяцюрамі з выявамі евангелістаў Матфея і Лукі.

У старажытных княствах на тэрыторыі Беларусі высокага ўзроўню дасягнула дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Шэдэўрам гэтага віду творчасці з'яўляецца крыж Ефрасінні Полацкай, які па заказу князёўны зрабіў майстар-ювелір Лазар (Богша) у 1161 г. На драўляную аснову пярэдняй і адваротнай плоскасці крыжа былі прымацаваны залатыя пласціны, аздобленыя перагародчатымі каляровымі эмалямі з выявамі Ісуса Хрыста, Маці Божай, святых, сярод якіх апекуны княжацкай сям'і – св. Ефрасіння Александрыйская, св. Сафія і св. Георгій. Бакі крыжа абкладзены сярэбранымі з пазалотай пласцінамі, на якіх прасечаны доўгі надпіс, што паведамляе гісторыю стварэння рэліквіі, дату і імя майстра, колькасць золата, срэбра, жэмчугу ў вырабе, яго кошт, а таксама змяшчае перасцярогу на выпадак крадзяжу крыжа. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны гэтая нацыянальная рэліквія знікла і дасюль пра месца яе знаходжання нічога невядома. У 90-я гг. XX ст. брэсцкім майстрам М. Кузьмічом была зроблена дакладная копія крыжа, якую размясцілі ў Полацкім Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры.

Майстры-ювеліры працавалі ўжо ў X ст. у Полацку, Віцебску, Лукомлі, Заслаўі, Клецку, а ў XII ст. сляды залатарства знойдзены практычна ва ўсіх гарадах і ўмацаваных паселішчах. Майстры-залатары валодалі тэхнікай ліцця, коўкі, штампоўкі, ціснення, пляцення, зярнення, скані, гравіроўкі, перагародчатай эмалі, інкрустацыі металамі, шклом, каштоўнымі і напаўкаштоўнымі камянямі. Ювеліры апрацоўвалі прывазную сыравіну – волава, медзь, свінец, срэбра, золата, каштоўныя камяні. Папулярнасцю карысталіся рэчы рэлігійнага культу, дэталі адзення, упрыгожанні, выробленыя з каляровых металаў.

Сярод старажытных прадметаў рамесніцкай вытворчасці значную колькасць складаюць рэчы з каменю, косці і дрэва. Цікавым відам каменнай пластыкі XI–XIII стст. з'яўляюцца абразкі з Полацка, Менска, Навагародка, Ваўкавыска, Віцебска. Дасканалымі навыкамі валодалі старажытныя кастарэзы, якія выраблялі старанна ўпрыгожаныя прадметы хрысціянскага культу і побытавыя рэчы. Выдатныя знаходкі твораў пластыкі – касцяныя і драўляныя шахматныя фігуркі са Слуцка, з Берасця, Ваўкавыска, Гародні і іншых гарадоў.

Музычная культура насельніцтва беларускіх зямель мела некалькі кірункаў. Княжацкаму двару патрабаваліся выканаўцы цырыманіяльных і ваенных твораў. У працэсе развіцця царкоўнага музычнага мастацтва, значны ўплыў на якое аказалі візантыйскія традыцыі, узнікла своеасаблівая сістэма спеваў – знакаміты знаменны распеў. Народная музычная культура была прадстаўлена творчасцю скамарохаў і спевакоў з гуслямі, жалейкамі, бубнамі. Іх вельмі шанаваў просты люд і часта прымалі пры дварах феадалаў.

Такім чынам, развіццё архітэктуры і мастацтва на беларускіх землях адбывалася ў рэчышчы візантыйскай традыцыі і пад заходнееўрапейскім уплывам. Трэба адзначыць, што замежныя наваўвядзенні не ўспрымаліся цалкам, а спалучаліся з мясцовымі традыцыямі, творча перапрацоўваліся ў адпаведнасці са славянскімі звычаямі і побытам. Гэта і прывяло да стварэння арыгінальных і самабытных твораў у архітэктуры і мастацтве.

# 8 ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ

- **Этнічныя працэсы на беларускіх землях у IX–XII стст.**
- **Складванне этнічнай тэрыторыі ВКЛ**
- **Хрысціянізацыя беларускіх зямель**
- **Развіццё нацыянальнай мовы**
- **Фарміраванне этнічнай самасвядомасці**

## ЭТНІЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У IX–XII стст.

Працэс фарміравання беларускай этнічнай супольнасці складаны і разнапланавы. Складванне антрапалагічнага аблічча, мовы, культуры, ментальнасці беларусаў адбывалася на працягу многіх стагоддзяў. Сучасныя даследаванні вучоных даюць магчымасць па малекулярна-генетычных маркерах выявіць сваяцкія адносіны розных груп людзей. Аналіз папуляцый асноўных гаплагруп Y-храмасомы, якая перадаецца ад бацькі сыну, і мітахандрыяльнай ДНК, якая перадаецца дзецям па жаночай лініі, дае ўяўленне аб міграцыйных рухах насельніцтва ў даўнія часы. Самая значная гаплагрупа, у склад якой уваходзіць больш за палову насельніцтва Беларусі, характэрна для насельніцтва Усходняй Еўропы, а таксама Ірана і Алтайскага краю. Прычым адно з маладых адгалінаванняў гэтай групы мае максімальную канцэнтрацыю ў паўднёва-ўсходняй Польшчы, Славакіі, на ўсходзе Палесся і ў Панямонні. Другая, пашыраная на поўначы Балкан, гаплагрупа мае каля 25 % носьбітаў сярод насельніцтва Палесся. Што тычыцца гаплагруп, найбольш распаўсюджаных у народаў Скандынавіі, то сярод беларусаў іх частата ў сярэднім складае 10 %.

Такім чынам, маркіруюцца тры асноўныя міграцыйныя патокі на Беларусь. Сярод іх рух індаеўрапейцаў, якія дайшлі да Цэнтральнай Еўропы; паўночны рух, які быў пашыраны ў Прыбалтыцы і часткова ахапіў тэрыторыю Беларусі; паўднёвы рух, які быў характэрны для Усходняй Еўропы і Балкан, меў шырокі арэал распаўсюджання на беларускіх землях. Гэтыя рухі заклалі аснову генатыпу беларусаў.

Інтэграцыя і ўзаемная асіміляцыя фіна-ўгорскіх, балцкіх, славянскіх этнічных груп стварылі базу для фарміравання новых этнічных супольнасцей на землях Беларусі. Менавіта ў перыяд ранняга Сярэднявечча пачаўся працэс нівеліроўкі гэтых этнічных груп. Вядомыя ўсходнеславянскія супольнасці (дрыгавічы, крывічы, радзімічы) узніклі ў выніку змешвання розных этнічных субстратаў. У першую чаргу рассяленне славян адбывалася на тэрыторыі пражывання балцкіх этнічных груповак. Шырокае распаўсюджанне славян на беларускіх землях, як сведчаць археалагічныя помнікі, адбывалася ў IX ст., а іх дамінаванне, звязанае з дзейнасцю дзяржавы, – у X–XI стст.

Племянныя княжанні ўсходніх славян знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад ваяўнічых суседзяў: нарманаў (варагаў) на поўначы і хазараў на поўдні. Таму стварэнне дзяржавы (Кіеўская Русь) стала вызначальнай з'явай у этнічнай гісторыі насельніцтва беларускіх зямель. У летапісах ёсць сведчанне аб удзеле крывічоў і дрыгавічоў у прызванні варагаў у Ноўгарад, аб паходзе кіеўскіх князёў Аскольда і Дзіра на землі палачан. «Ваявалі Аскольд і Дзір палачанаў, – гаворыцца ў Ніканаўскім летапісе, – і многа зла натварылі». Пасля захопу Кіева князем Алегам (879–912) і ўсталявання там яго ўлады ішоў працэс падпарадкавання племянных княжанняў. Іпацьеўскі летапіс згадвае ў ліку падначаленых кіеўскаму князю крывічоў. У 885 г. князь Алег ажыццявіў паход на радзімічаў і прымусіў іх плаціць яму даніну.

Кіеўская Русь з'явілася галоўным этнаўтваральным фактарам. Поліэтнічная дзяржава паступова набывала славянскую аснову. Так, паводле летапісных звестак, сярод удзельнікаў паходу на Візантыю ў 907 г. у войску князя Алега большасць складалі славянскія дружыны. «Мноства варагаў і славян, і чудзі, і крывічоў, і меры, і радзімічаў, і палян, і северан, і вяцічаў, і харватаў, дулебаў і ціверцаў» узяў Алег у паход, – зазначана ў «Аповесці мінулых гадоў». Кіеўскія князі павінны былі знаходзіць шляхі камунікацый з мясцовым насельніцтвам для падтрымання сваёй улады на велізарнай тэрыторыі, заселенай рознымі этнічнымі групамі. Мясцовая знаць таксама мела інтарэс у моцнай уладзе як у справе абароны ад нападаў, так і ў далучэнні да захопніцкіх паходаў на іншыя тэрыторыі.

Славянізацыя заходніх і паўночна-заходніх зямель Беларусі адбывалася пазней. Тут пражывалі балцкія плямёны яцвягаў, літвы, дайновы, аўкштайтаў.

У 983 г. кіеўскія князі ваявалі землі яцвягаў. У XI–XII стст. як апорныя цэнтры на землях Пабужжа і Панямоння былі створаны гарадскія паселішчы (Берасце, Драгічын, Ваўкавыск, Гародня, Навагародак і інш.).

Рассяленне і замацаванне славян на беларускіх землях адбывалася паступова шляхам змяшання з мясцовым насельніцтвам. Этнічнае ўзаемадзеянне праявілася ў асаблівасцях культуры, звычаях, вераваннях, дыялектах мовы славян.

Дзяржаўная палітыка садзейнічала паступовай эканамічнай, моўнай, канфесійнай інтэграцыі балцкіх і ўсходнеславянскіх плямён. Славяне прынеслі сваю мову, якая папоўнілася балцкімі словамі, фіна-ўгорскай тапанімікай. Так фарміравалася зразумелая насельніцтву беларуская мова.

Важная роля ў фарміраванні беларускай этнічнай супольнасці адводзілася гарадам. Яны ўзнікалі ў перыяд дзяржаўнага будаўніцтва, калі з'яўлялася эканамічная і ваенная патрэба. У летапісах IX–XII стст. прыводзяцца звесткі пра больш за 30 гарадоў на беларускіх землях: Полацк, Віцебск, Тураў, Заслаўе, Берасце, Усвяты, Копысь, Браслаў, Менск, Орша, Лагойск, Лукомль, Пінск, Барысаў, Слуцк, Гародня, Клецк, Гомель, Мазыр і інш.

Старажытныя гарады станавіліся важнымі адміністрацыйнымі, ваеннымі, рэлігійнымі, культурнымі цэнтрамі. Яны мелі развітую рамесную вытворчасць, вялі ўнутраны і знешні гандаль. Гандлёвыя шляхі «з варагаў у грэкі», «прыпяцкі», «нёманскі» звязвалі беларускія гарады з многімі краінамі Еўропы і Візантыяй. Узнікненне і развіццё гарадоў сведчыла аб высокім эканамічным, культурным узроўні тагачаснага грамадства.

У межах адной дзяржавы ішоў працэс нівеліроўкі этнакультурных адметнасцей розных этнічных груп. Але Кіеўская Русь складалася з аўтаномных зямель – княжанняў, якія захоўвалі свае традыцыі, мясцовыя асаблівасці гаспадарчай дзейнасці, мовы і культуры. На тэрыторыях княжанняў на працягу ранняга Сярэднявечча захоўвалася адасобленасць гарадоў, вёсак, гарадскіх і сельскіх абшчын. Эканамічная раздробленасць ва ўмовах натуральнай гаспадаркі стрымлівала працэс кансалідацыі этнічных супольнасцей. Таму ў IX–XII стст. беларуская народнасць, як і ўвогуле старажытнаруская, не магла скласціся.

Адасобленасць зямель, ваенна-палітычнае супрацьстаянне княстваў прывялі да феадальнай раздробленасці Кіеўскай Русі, што стала заканамернай з'явай Сярэднявечча амаль для ўсіх народаў Еўропы. На пачатку XIII ст. на беларускіх землях існавала каля 20 незалежных княстваў (Полацкае, Менскае, Віцебскае, Пінскае, Друцкае, Гарадзенскае, Мсціслаўскае, Новагародскае і інш.). Пастаянныя ваенныя паходы на суседнія землі знясільвалі княствы, абмяжоўвалі гандлёвыя, культурныя сувязі. Да таго ж у пачатку XIII ст. змянілася геапалітычная сітуацыя. На балтыйскае ўзбя-

рэжжа прыйшлі крыжакі Тэўтонскага ордэна. Еўрапейскія рыцары пачалі захоп зямель балтаў і ўсходніх славян. У 1230-я гг. пачалося мангола-татарскае нашэсце. Гэтыя абставіны падштурхнулі працэс фарміравання адзінага палітычнага цэнтра балцкага і славянскага насельніцтва беларускіх зямель.

## СКЛАДВАННЕ ЭТНІЧНАЙ ТЭРЫТОРЫІ ВКЛ

На пачатку XIII ст. лідарства ў дзяржаўным будаўніцтве на беларускіх землях ад Полаччыны перайшло да Панямоння. Прыкладна ў 1248 г. улады горада Новагародка заключылі саюз з адным з князёў племені літва – Міндоўгам. У 1253 (1252) г. ён каранаваўся каралём Літоўскай дзяржавы, якая ў больш познія часы стала называцца Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім.

У жорсткай барацьбе і супрацьстаянні з галіцка-валынскімі і літоўскімі князямі, крыжакамі, з мангола-татарскімі захопнікамі стваралася аснова новай балтаславянскай дзяржавы. У другой палове XIII ст. у склад ВКЛ увайшлі землі Новагародчыны, Слонімшчыны, Гарадзеншчыны, часткова Берасцейшчыны, балцкія землі Нальшаны, Дзяволтва, Упітэ, Саўле. На рубяжы XIII–XIV стст. было далучана Полацкае княства, пазней Пінскае, Віцебскае княствы, Берасцейшчына, жамойцкія землі (Меднікі, Кнітува, Каршува), заходнія землі Смаленскага княства.

Збіранне зямель Вялікага Княства Літоўскага ішло рознымі шляхамі: ваенным захопам, заключэннем дынастычных шлюбаў, перамовамі. Аб разнастайнасці аб'яднальнага працэсу сведчыў палітычны статус далучаных тэрыторый. Некаторыя з іх, як, напрыклад, Віцебскае і Полацкае, захавалі шырокую аўтаномію, мясцовыя законы, суд, выключнае права мясцовых баяр займаць пасады ў кіраванні.

У выніку актыўнай палітыкі па аб'яднанні зямель пад сваёй уладай вялікіх князёў Віценя (1293–1316), Гедыміна (1316–1341) і Альгерда (1345–1377) да княства былі далучаны беларускія землі і значная частка ўкраінскіх. Тэрыторыя ВКЛ пашырылася ад Балтыйскага да Чорнага мора. Існавала рэальная гістарычная перспектыва аб'яднання беларусаў і ўкраінцаў у адзін этнас, тым больш што сталіца Старажытнай Русі, горад Кіеў, уваходзіла ў склад ВКЛ. Аднак гэты працэс быў спынены ўключэннем украінскіх зямель у склад Польскай дзяржавы.

Большая частка тэрыторыі сучаснай Беларусі ўвайшла ў склад княства кіруючыся ваенна-палітычнай мэтазгоднасцю. Крыжовыя войны супраць Літвы, спусташальныя набегі Залатой Арды падштурхоўвалі князёў да стварэння вялікай дзяржавы. Таму невыпадкова аб'яднанне ўдзельных княстваў адбывалася на фоне актыўнага ўзвядзення абарончых збудаванняў.

На беларускіх землях у XIV ст. сфарміравалася адметная школа айчыннага дойлідства. Яна несла адбітак розных архітэктурных традыцый, але мела самабытны характар. У гэты час на Беларусі пачалося ўзвядзенне мураваных замкаў-крэпасцей на стратэгічна важных тэрыторыях. У пачатку XIV ст. быў збудаваны Лідскі замак (замак Гедыміна) памерам 80 м (паўднёвая сцяна) на 93,5 м (паўночная сцяна) з дзвюма вежамі, байніцамі і таўшчынёй сцен да 2 м. У 1330-я гг. узведзены мураваны замак у Крэве, сцены якога мелі таўшчыню да 2,75 м і вышыню да 4 м. Адна з трох вежаў была вынесена за перыметр сцяны, што паляпшала яе абарончыя магчымасці. Крэўскі замак з'яўляўся адной з велікакняжацкіх рэзідэнцый.

У канцы XIV – пачатку XV ст. адбылася рэканструкцыя драўлянага замка ў Новагародку. У дапаўненне да вежы Шчытоўка (вежа-данжон) былі ўзведзены Касцёльная, Пасадская, Малая брама, Калодзежная вежы, злучаныя паміж сабою сценамі. Пазней у замку з'явіліся яшчэ дзве вежы. Новагародскі замак быў адным з лепшых абарончых збудаванняў на тэрыторыі Беларусі таго часу. Ён вытрымаў многія штурмы і аблогі галіцка-валынскіх князёў, крыжакоў і татар. Мураваныя замкі ў Вільні, Троках, Медніках, Гародні, Віцебску, Крэве, Лідзе, Новагародку, Оршы адыгрывалі важную ролю ў абароне дзяржавы ад знешняй агрэсіі і вызначалі мяжу этнічнай тэрыторыі.

Аб'яднанне ўдзельных феадальных княстваў у складзе ВКЛ стварыла першасную аснову фарміравання адзінай народнасці, акрэсліла этнічную тэрыторыю беларусаў. Гэтая тэрыторыя (каля 260 тыс. кв. км) вызначалася ўстойлівасцю на працягу многіх стагоддзяў. Склалася балтаславянская дзяржава, якая мела дамінуючую славянскую аснову: пісьменнасць, мову, хрысціянскую веру, традыцыі. Славяне складалі абсалютную большасць насельніцтва княства.

## ХРЫСЦІЯНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ

У перыяд ранняга Сярэднявечча кансалідуючую ролю для насельніцтва беларускіх зямель адыграў рэлігійны фактар. Хрысціянізацыя адбывалася на працягу стагоддзяў. Гэты працэс ішоў з канца X да сярэдзіны XII ст., а на тэрыторыі балтаў – да канца XIV ст.

З уключэннем новых зямель у склад ВКЛ хрысціянская вера паступова ўваходзіла ў жыццё, бо адным з важных палітычных патрабаванняў удзельных князёў было: «Старыны не рухаці, навіны не ўводзіці». Яна доўгі час суіснавала сярод асноўнай часткі жыхароў разам з верай продкаў. Паганскія вераванні і традыцыі мелі глыбокія карані. Складваліся своеасаблівыя

формы двухвер'я, калі язычніцкія абрады аб'ядноўваліся з хрысціянскім культам: Каляды і свята Нараджэння Хрыстова, Радаўніца і Вялікдзень.

Хрысціянізацыя беларускіх зямель, як і Кіеўскай Русі ў цэлым, праводзілася на агульнадзяржаўным узроўні. Іпацьеўскі летапіс канстатуе: «И нача ставити (Уладзімір. – *Аўт.*) по градам церкви и попы, и люди на крещение приводя по всем градом и селом». Царкоўнае будаўніцтва патрабавала стварэння ў рэгіёнах духоўных рэлігійных цэнтраў, якімі сталі епіскапскія кафедры. У Полацку яна была заснавана ў 992 г., а ў Тураве – у 1005 г. Першымі хрысціянскімі святарамі былі запрошаныя грэчаскія і балгарскія місіянеры.

Прыняцце і распаўсюджанне хрысціянства аказала значны ўплыў на ўсе сферы жыцця тагачаснага грамадства. Пад уздзеяннем грэка-візантыйскай культурнай традыцыі мяняўся светапогляд людзей на мараль, сям'ю, быт, традыцыі. Хрысціянства садзейнічала развіццю архітэктуры (будаваліся мураваныя цэрквы і манастыры), жывапісу, пісьменства; спрыяла ўмацаванню ўладных паўнамоцтваў князёў; садзейнічала моўнай, культурнай інтэграцыі насельніцтва беларускіх зямель.

Хрысціянізацыя ўсходнеславянскіх тэрыторый пачыналася з гарадоў, дзе ствараліся культавыя пабудовы, утвараліся рэлігійныя абшчыны. Хрысціянізацыя балцкіх зямель адбывалася са значным спазненнем. Між тым праваслаўныя і язычніцкія землі Літвы мірна суіснавалі. Паступова рускую веру прымалі ўдзельныя князі, уплывовыя феадалы. У 1246 г. прыняў «веру хрысціянскую з Усходу з многімі сваімі баярамі» Міндоўг. У 1254 г. хрысціўся ў праваслаўе яго сын Войшалк. Менавіта ён заснаваў Лаўрышаўскі манастыр недалёка ад Новагародка.

Складваліся перадумовы стварэння дамінуючай дзяржаўнай праваслаўнай царквы. Аднак заключэнне ў 1385 г. Крэўскай уніі змяніла рэлігійны ландшафт. У адпаведнасці з дагаворам, вялікі князь Ягайла, які стаў каралём Польшчы, у 1387 г. пачаў хрысціянізацыю Літвы па заходнім рымска-каталіцкім абрадзе. 22 лютага ён выдаў ліст, у якім прысягнуў павярнуць усіх жыхароў у бок каталіцкай веры і нават прымусіць іх прыняць каталіцтва. Гэтым закладвалася ідэалагічная база для далейшага супрацьстаяння розных палітычных груповак.

Прыняцце каталіцтва дало магчымасць пашырыць у грамадстве ўздзеянне заходнееўрапейскай культурнай традыцыі. Еўрапеізацыя ВКЛ адбывалася ў цесным звязе з еўрапеізацыяй польскай дзяржавы і каталіцкай царквы. Вялікія князі ВКЛ, якія пасля Крэўскай уніі былі католікамі, перадавалі рымскай царкве і манастырам значныя надзелы зямлі, вызвалялі іх ад дзяржаўных падаткаў і павіннасцей. Гаспадары ВКЛ стымулявалі пераход праваслаўных феадалаў у каталіцкую веру. Прыняцце каталіцызму правячымі

коламі і дыскрымінацыйныя нормы для праваслаўных прывялі да абвастрэння этнарэлігійных адносін. Толькі ў канцы XV – першай палове XVI ст. велікакняжацкая ўлада зняла эканамічныя і палітычныя абмежаванні для праваслаўных феадалаў. У ВКЛ склалася раўнавага праваслаўя і каталіцтва. На працягу XV – пачатку XVI ст. у ВКЛ сфарміраваліся дзве самастойныя царкоўныя арганізацыі. Праваслаўная вера была найбольш распаўсюджанай сярод славянскага насельніцтва дзяржавы. Між тым пашыралі сваю дзейнасць каталіцкія біскупствы (Віленскае, Жамойцкае, Луцкае, Кіеўскае). Засноўваліся новыя кангрэгацыі: францыскане, бернардзінцы, аўгусцінцы. Іерархі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў ВКЛ усё больш уцягваліся ў геапалітычнае і канфесійнае супрацьстаянне паміж Канстанцінопальскім патрыярхатам і Ватыканам, паміж Польшчай і Масковіяй.

У другой палове XVI ст. рэлігійная сітуацыя на Беларусі змянялася. Праваслаўная царква займала ўсё больш кансерватыўныя пазіцыі. У сваёй барацьбе з рэфармацыяй, уплывам каталіцтва яна ўвогуле не прымала ніякіх здабыткаў еўрапейскай культуры. Арыентацыя на Візантыю, якая ў той час была захоплена Асманскай імперыяй і страціла становішча лідара ў праваслаўным свеце, прыводзіла да культурнай ізаляцыі беларускага насельніцтва.

Змянілася геапалітычнае становішча ВКЛ. Люблінская унія (1569), еўрапейская рэфармацыя і контррэфармацыя садзейнічалі пашырэнню каталіцкага ўплыву, паланізацыі грамадства. Магнаты, шляхта ўсё больш пераймалі мову, культуру палякаў, пераходзілі ў каталіцкую веру. Праваслаўе, якое да сярэдзіны XVI ст. з'яўлялася важным этнакансалідуючым фактарам ВКЛ, губляла сваю сілу.

У гэтых умовах супрацьстаяння палітычнае кіраўніцтва ВКЛ шукала кампраміс праз заснаванне самастойнай царквы. У 1596 г. была прынята Берасцейская царкоўная унія, якая абвяшчала стварэнне ўніяцкай царквы. Канцлер ВКЛ Л. Сапега і іншыя палітычныя дзеячы княства падтрымалі гэтае рашэнне. У артыкулах уніі былі зафіксаваны ўзаемаадносіны новай царквы з дзяржавай і касцёлам. Уніяцкая царква падпарадкоўвалася Ватыкану, але захоўвала праваслаўную абраднасць. Артыкулы уніі былі скіраваны на змяншэнне паланізацыі і лацінізацыі, сталі пачаткам трансфармацыі праваслаўя. Гэта была спроба стварыць новае веравызнанне з улікам этнакультурнай своеасаблівасці беларускіх і ўкраінскіх зямель.

Берасцейская царкоўная унія актывізавала этнічную самасвядомасць насельніцтва. Шляхта, духавенства выказвалі адносіны да уніі, спасылаючыся на сваё разуменне патрыятызму. Праваслаўная апазіцыя разглядала унію як здраду веры продкаў. Прыхільнікі уніі гаварылі аб духоўным адраджэнні культурных і рэлігійных еўрапейскіх традыцый. Гэтая канфрантацыя ў грамадстве сведчыла аб этнічнай, культурнай самасвядомасці народа.

## РАЗВІЦЦЁ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МОВЫ

Адным з галоўных фактараў фарміравання беларускага этнасу было развіццё нацыянальнай мовы. Фанетычныя асаблівасці гаворкі насельніцтва ВКЛ кансалідаваліся ў беларускую мову. На ёй былі падпісаны дагаворы Полацка, Віцебска, Смаленска ў XIII–XIV стст. Агульнаславянская лексіка склала ядро старажытнабеларускай мовы, якую тады называлі «руськай», а часам літоўскай. Чэшскі місіянер Геранім Пражскі, які знаходзіўся ў княстве ў часы Вітаўта, пісаў, што «мова народа ёсць славянская», і паводле дзяржавы называюць яе літоўскай.

У складзе ВКЛ адбывалася ўніфікацыя дыялектных моўных асаблівасцей. Беларуская мова набывала ўсё большае адрозненне ад старажытнарускай. Асаблівасцямі ў фанетыцы сталі дзеканне (*дзеці*), цеканне (*маці*), аканне (*карова*), яканне (*зямля*); цвёрды [р] (*рыцар*), фрыкатыўны [г]; у сінтаксісе – выкарыстанне саюзаў «каб», «калі», часціц «ці», «чы». У другой палове XIV ст. мова набывала агульнадзяржаўнае распаўсюджанне. Фарміравалася агульная тэрміналогія, якая адлюстроўвала сістэму кіравання (*радца*, *войт*, *лаўнік*), віды феадальных павіннасцей (*чынш*, *цягло*, *талака* і інш.), сацыяльнае жыццё гараджан (*падатак*, *кравец*, *шкляр*, *кушнер*, *гандаль*).

Беларуская мова мае падабенства да іншых славянскіх моў – рускай, украінскай, польскай. Яна ўвабрала ў сябе многія запазычанні, што сведчыць пра цесныя адносіны беларусаў з замежжам. У беларускай мове праявілася ўздзеянне заходнееўрапейскай культурнай традыцыі. Многія словы – лацінізмы (*артыкул*, *адукацыя*, *гонар*, *колер*), германізмы (*фарба*, *дах*, *ліхтар*), а таксама паланізмы (*пан*, *кабета*, *праца*) – у гэты час сталі агульнавядомымі на Беларусі.

Ужо ў канцы XIV ст. беларуская мова з'яўлялася дзяржаўнай у ВКЛ. У 1588 г. у Статуце ВКЛ яна атрымала заканадаўчае замацаванне ў афіцыйным справаводстве, на ёй былі створаны выдатныя помнікі культуры: публіцыстычныя творы, мемуарная літаратура, хронікі, летапісы.

Станаўленне беларускай мовы звязана з працэсам фарміравання беларускай літаратурнай традыцыі. У XIV ст. складалася арыгінальная беларуская літаратура, якая мела царкоўна-рэлігійную накіраванасць: гэта сказанні («Сказанне аб літоўскіх (віленскіх) пакутніках»), хаджэнні (Аграфенія, Варсанофія, Ігнація Смаляніна), пропаведзі і пахвальныя словы.

Значнай культурнай з'явай пачатку XV ст. стала дзейнасць на Беларусі прапаведніка, пісьменніка Рыгора Цамблака. Яго пропаведзі на рэлігійныя святы, пахвальныя словы святым маляўніча апісваюць прыроду і людзей. У 1415 г. на царкоўным саборы ў Навагародку Цамблак быў абраны

мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Русі. Абранне Рыгора Цамблака мітрапалітам «державы Литовскыя» было спробай князя Вітаўта стварыць самастойны ад Масквы праваслаўны цэнтр. У 1416 г. Цамблак перанёс мітрапаліцкую кафедру ў Вільню, а сваю рэзідэнцыю ў Навагародак. З 1415 па 1419 г. на беларускіх землях мітрапаліт напісаў мноства пропаведзей на царкоўныя святы, палемічны твор «Како держат веру немцы», пахвальныя словы Яўхімію Тырноўскаму, святому Дзімітрыю Салунскаму, пахвальнае слова бацькам Канстанцкага сабору і інш. Гуманістычныя па сваім змесце творы Рыгора Цамблака ўнеслі значны ўклад у станаўленне беларускай літаратурнай традыцыі.

У XV ст. на беларускіх землях з'явіліся летапісныя творы, якія мелі выразную нацыянальную патрыятычную накіраванасць. Гістарычныя падзеі выкладаліся ў іх з пазіцый неабходнасці ўмацавання дзяржаўнага кіравання. У старэйшым беларускім летапісе, «Летапісцы вялікіх князёў літоўскіх», напісаным у Смаленску, разглядаюцца гістарычныя падзеі пасля смерці князя Гедыміна, ухваляюцца дзеянні князя Вітаўта як мудрага гаспадара і аўтарытэтнага палітыка. У канцы XV ст. у Смаленску быў напісаны летапіс Аўраамкі, у якім выкладзены падзеі, узятыя аўтарам з больш ранніх летапісных твораў пра Кіеўскую Русь, наўгародскія і маскоўскія справы.

У пачатку XVI ст. у развіцці беларускай духоўнай культуры адбылася рэвалюцыйная па сваім змесце з'ява – кнігадрукаванне на роднай мове, якое здзейсніў у 1517 г. Францыск Скарына. Гэта набліжала Свяшчэннае Пісанне да простых людзей. Яно падкрэслівае роўнасць мовы беларусаў з лацінскай, грэчаскай і іншымі класічнымі мовамі свету.

Шырокае распаўсюджванне старабеларускай мовы і станаўленне ўласнабеларускай літаратуры з'явіліся важнымі фактарамі кансалідацыі розных этнічных груп, якія пражывалі на тэрыторыі ВКЛ (літва, дайнова, яцвягі, прусы, жамойты, латгалы, татары, яўрэі, цыгане і інш.), у беларускую народнасць.

Рэфармацыя, а затым контррэфармацыя на Беларусі пашырылі цікавасць да нацыянальнай культуры, мовы. Ідэі гуманізму, вальнадумства змянілі традыцыйны рэлігійны светапогляд адукаванай часткі насельніцтва.

Адраджэнне на беларускіх землях адбывалася пад уздзеяннем як грэка-візантыйскай, так і заходнееўрапейскай культуры. У XVI ст. ішоў працэс секулярызацыі культуры Беларусі, з'явіліся свецкія бібліятэкі, пашырылася цікавасць да навукі. Паступова адбываліся змены ў звычаях, паводзінах шляхты, якая імкнулася пераймаць заходнееўрапейскую моду, культуру.

## ФАРМІРАВАННЕ ЭТНІЧНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ

Важнейшым фактарам этнічнай кансалідацыі грамадства з'яўляецца этнічная самасвядомасць насельніцтва. Этнічная ідэнтычнасць як разуменне сваёй прыналежнасці да акрэсленай этнічнай супольнасці фарміравалася і праяўлялася па-рознаму ў залежнасці ад саслоўнай, рэлігійнай прыналежнасці, меж тэрыторый рассялення насельніцтва. Яна адлюстроўвалася ў этнанімічных вызначэннях. У саманазвах насельніцтва была зафіксавана ў першую чаргу прыналежнасць людзей да акрэсленай тэрыторыі – вялікай вёскі (*маладаўцы*, *маталяне*), тэрытарыяльнай абшчыны, мястэчка, воласці, горада (*менчукі*, *пінчукі*, *мазыране*). З цягам часу гарадскія ўрбонімы распаўсюджваліся на насельніцтва бліжэйшай акругі. Зямляцкая субэтнічная супольнасць характарызуецца устойлівай самасвядомасцю са сваімі традыцыямі, асаблівасцямі быту, мовы, культуры.

Этнічная самасвядомасць праяўлялася ў першую чаргу ў працэсе ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі іншых этнасаў. На этнічным памежжы ўзнікла патрэба міжэтнічнага параўнання, вызначэння «свой – чужы».

Складванне монаэтнічнай ідэнтычнасці ў акрэсленых тэрытарыяльных арэалах прывяло да з'яўлення не аднаго, а некалькіх этнонімаў, якія спалучалі гістарычныя назвы «Русь», «Літва»: «русін», «рускі», «ліцвін», «ліцвін рускага роду».

З XIII па XVI ст. самай распаўсюджанай назвай насельніцтва беларускіх зямель была «рускія». Сваю мову яны называлі рускай у адрозненне ад мовы маскавітаў, якую называлі маскоўскай. Назвы «русіны», «рускія» з цягам часу замацаваліся за праваслаўным насельніцтвам усходняй часткі Беларусі і смаленскіх зямель. У цэнтральнай частцы жыхары зваліся літвінамі. Паступова гэтая назва распаўсюдзілася на ўвесь беларускі этнас. У XVI ст. літвінам называў сябе палачанін Ф. Скарына. Аўтар трактата «Пра норавы татараў, літвінаў і маскавітаў» беларускі гуманіст М. Цішкевіч падпісваўся як Міхалон Літвін.

Пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай (1569) шляхта ВКЛ падкрэслівала сваю прыналежнасць да літвінаў: «Мы і палякі, хоць і брацця, – пісаў у канцы XVI ст. Л. Сапега, – але зусім адменных звычаяў». На працягу стагоддзяў «літвінства» стала абагульняльнай формай этнічнай самасвядомасці насельніцтва беларускіх зямель.

Этнонім «беларусы» атрымаў распаўсюджванне на тэрыторыі сучаснай Беларусі значна пазней. Першыя звесткі пра Белую Русь ёсць у геаграфічным трактаце каталіцкага манаха «Апісанне зямель» (другая палова XIII ст.). Там гаворка ішла аб сучаснай паўночна-ўсходняй тэрыторыі Беларусі і частцы Пскоўшчыны.

У Іпацьеўскім летапісе ёсць апісанне падзей 1305 г., калі «много бо зла Ляхом Литва, Жмоит прежде сотвори, Ляхов и Мазуров полками в полон бра, сице Лях един по гривне, се есть по десяти грошей литовских, в Литве и Белой Руси продаван был…».

У 1472 г. маскоўскі князь Іван III у грамаце да папы рымскага называе сябе царом Белай Русі (Albae Russiae). Аднак гэтая назва не замацавалася за Маскоўскім княствам. У XVII–XVIII стст. расійскія манархі выкарыстоўвалі гэты тэрмін больш у палітычных мэтах для апраўдання сваіх тэрытарыяльных дамаганняў на гістарычную спадчыну Кіеўскай Русі. Цар Аляксей Міхайлавіч у 1655 г. пасля захопу Вільні дадаў да свайго тытула «великий князь всея Великия и Малыя… и Белыя России».

З другой паловы XVI ст. назва «Белая Русь» мела больш-менш акрэсленую геаграфічную лакалізацыю. Яна ўжывалася ў некаторых дакументах ВКЛ у дачыненні да тэрыторый Падзвіння і Падняпроўя. З’явілася цікавае словаўжыванне «літвін беларусец». Назва «літвін» разглядалася як прыналежнасць да дзяржавы, «беларусец» мела этнарэлігійны змест.

Такім чынам, на працягу XIII–XVI стст. на землях ВКЛ склалася беларуская (руская, літвінская) этнічная супольнасць з агульнай тэрыторыяй, культурай, мовай. Вынікам гэтых працэсаў стала фарміраванне ў шляхты, духавенства, гараджан этнічнай самасвядомасці.

Асэнсаванне прыналежнасці да пэўнага этнасу праяўляецца ў патрыятызме, клопаце аб сваёй зямлі і яе людзях. У прадмове да кнігі «Юдзіф» Ф. Скарына так сфармуляваў гэтую думку: «…Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птицы, летающие по возьдуху, ведають гнезда своя; рыбы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, – тако же и люди, игде зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають».

У 70–80-я гг. XVI ст. нацыянальна-культурны рух пачаў згасаць. Ад яго адыходзіў пануючы клас, які ва ўмовах антыфеадальных выступленняў больш за ўсё клапаціўся аб сваім эканамічным становішчы, атрыманні прывілеяў ад кіраўніцтва Рэчы Паспалітай.

Спусташальная Лівонская вайна, абвяшчэнне Масквой сваёй місіі «трэцяга Рыма» стварала рэальную пагрозу ВКЛ з боку Маскоўскай дзяржавы. У той жа час пасля заключэння Люблінскай уніі (1569) значна ўзмацніўся польскі этнакультурны ўплыў. У такіх умовах фарміравалася біэтнічная і маргінальная ідэнтычнасць насельніцтва. Шляхта, гараджане ўсё часцей пераймалі культуру быту, традыцый, мову і адносілі сябе да іншых этнасаў, якія мелі больш высокі сацыяльны статус.

# 9 СУПРАЦЬСТАЯННЕ КРЫЖАЦКАЙ АГРЭСІІ І ПАХОДАМ МАНГОЛА-ТАТАР У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIII ст.

- **Знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у канцы XII – пачатку XIII ст.**
- **Войны Полацкага княства з Ордэнам мечаносцаў і Лівонскім ордэнам**
- **Барацьба насельніцтва Беларусі з мангола-татарамі**

## ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У КАНЦЫ XII – ПАЧАТКУ XIII ст.

Раскрываючы розныя аспекты міжнародных умоў развіцця княстваў, што існавалі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XII – пачатку XIII ст., трэба ўлічваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель, асаблівасці якога знаходзілі адбітак у знешнепалітычнай дзейнасці мясцовых дзяржаўных утварэнняў. Праз землі сучаснай Беларусі праходзілі важныя шляхі зносін, чаму спрыяла густая сетка водных камунікацый. Разам з тым гэтыя абшары былі адкрыты з усіх бакоў, не мелі якіх-небудзь натуральных, прыродных перашкод. Дзяржаўных меж у сучасным іх разуменні ў той час таксама не існавала.

У канцы XII – пачатку XIII ст. беларускія тэрыторыі з'яўляліся часткамі некалькіх дзяржаўных адзінак, што раней уваходзілі ў сістэму княстваў Русі. Полаччына і Тураўшчына, якія ў папярэдні перыяд уключалі асноўныя абшары зямель сённяшняй Беларусі, у азначаны час уяўлялі сабой своеасаблівыя кангламераты дробных княстваў. Узаемасувязі ў іх трымаліся на роднасных адносінах князёў. Распад зямель у працэсе феадальнай раздробленасці прывёў да іх аслаблення. Як вынік, удзельныя мясцовыя

княствы былі ўцягнуты ў арбіту інтарэсаў больш магутных дзяржаўных фарміраванняў, што вылучыліся са складу Кіеўскай Русі. Так, у Полацку, які заставаўся цэнтрам прыцягнення ўвагі і памкненняў навакольных князёў, адчуваўся моцны ўплыў Смаленскага княства. Турава-Пінскае княства ж, у адрозненне ад Полаччыны, і ў папярэдні перыяд, і ў час феадальнай раздробленасці, па сутнасці, не з'яўлялася самастойнай палітычнай адзінкай, знаходзячыся пад значным уплывам спачатку вялікіх князёў кіеўскіх, а пасля і галіцка-валынскіх князёў. На заходнебеларускіх землях у пачатку XII ст. утварылася Гарадзенскае княства, на чале якога стаялі нашчадкі малодшага сына Яраслава Мудрага Ігара, звязаныя пераважна з Валынню (першы вядомы гарадзенскі князь Усеваладка – сын Давыда Ігаравіча). Да сярэдзіны XIII ст. Гарадзенскае княства заставалася ў фарватары палітыкі паўднёварускіх князёў. Берасцейская зямля, якая з сярэдзіны XII ст. кантралявалася Галіцка-Валынскім княствам, таксама ніколі не выступала як незалежнае палітычнае аб'яднанне. Знаходзячыся на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў паміж землямі Кіеўскай Русі і Цэнтральнай Еўропы, яна з'яўлялася сферай геапалітычных інтарэсаў некалькіх моцных племянных саюзаў і княстваў і часта ператваралася ў арэну канфліктаў. Так, у канцы XII – пачатку XIII ст. Пабужжа было часова захоплена польскімі князямі: спачатку Казімірам II, пазней Конрадам Мазавецкім і Лешкам Кракаўскім. Шэраг усходніх і паўднёва-ўсходніх беларускіх зямель у азначаны перыяд уваходзілі ў склад Смаленскага (Прупой (Прапойск), Крычаў, Мсціслаў, Копысь), Чарнігаўскага (Гомель, Рэчыца, Чачэрск) і Кіеўскага (Мазыр і Брагін) княстваў і самастойнай ролі ў палітычным жыцці гэтых дзяржаў не адыгрывалі.

Уплывалі на знешнепалітычнае становішча беларускіх княстваў і рэаліі іх унутрыпалітычнага развіцця, якое вяло да таго, што ў глыбінях феадальнай раздробленасці няўхільна выспявала і яе адмаўленне. Павелічэнне значэння і вагі таварнай вытворчасці ў гаспадарчым жыцці розных зямель ва ўмовах раз'яднанасці спрыяла іх эканамічнаму і палітычнаму збліжэнню. Так, Полаччына, якая знаходзілася на больш высокай стадыі сацыяльна-эканамічнага развіцця, ужо ў канцы XII ст. пачала выходзіць са стану феадальнай раздробленасці і пазбаўляцца ўплыву Смаленска. Тураўшчына, наадварот, перажывала кульмінацыйны момант працэсу палітычнага драблення. Наступствам гэтых асаблівасцей стаў рост самастойнасці Полацкай зямлі ў вобласці знешняй палітыкі, з аднаго боку, і фактычна поўная страта палітычнага значэння княствамі Тураўскай зямлі – з другога. Такім чынам, толькі Полацкая зямля ў канцы XII – пачатку XIII ст. валодала ўсімі атрыбутамі суб'екта міжнародных адносін.

Спецыфіка знешнепалітычнага становішча Полацкай зямлі ў гэты час праяўлялася ў некалькіх акалічнасцях. Па-першае, Полацку даводзілася

мецъ справу з мноствам дзяржаўных фарміраванняў на тэрыторыі былой Кіеўскай Русі. Асноўнымі напрамкамі яго знешняй палітыкі былі адносіны са Смаленскім, Уладзіміра-Суздальскім, Чарнігаўскім княствамі і Наўгародскай рэспублікай. Смаленскім і чарнігаўскім князям, якія варагавалі паміж сабой, была выгадна барацьба менскіх, друцкіх і віцебскіх князёў за лідарства, якая абвастрылася ў канцы XII ст. і істотна аслабіла Полацкую зямлю. Скарыстаўшыся гэтым, смаленскія князі захапілі ўсходнія полацкія воласці. Аднак Полацк, удала іграючы на супярэчнасцях паміж суседнімі княствамі, з цягам часу здолеў пераадолець палітычнае прыцягненне свайго галоўнага саперніка – Смаленска.

Па-другое, у гэты час можна адзначыць дастаткова выразнае выкрышталізаванне знешнепалітычных прыярытэтаў Полацкай зямлі. Да традыцыйнага супрацьстаяння з Кіевам і Ноўгарадам дадалася абарона ад націску смаленскіх і ўладзіміра-суздальскіх князёў. Між тым з'яўленне новых знешнепалітычных контрагентаў было ўзаемазвязана з ужо звыклымі напрамкамі знешняй палітыкі Полацкага княства. Гэта тлумачылася тым, што з часоў Андрэя Багалюбскага (1111–1174, вялікі князь уладзіміра-суздальскі 1169–1174) наўгародцы бралі сабе правіцеляў з моцнага роду суздальскіх уладароў. Большая ж частка вялікіх князёў кіеўскіх у другой палове XII і пачатку XIII ст. паходзіла з роду, які правіў у Смаленску. Ідучы княжыць у Кіеў, яны не парывалі сувязей са смаленскімі сваякамі, аказваючы ім усялякую падтрымку. У такіх умовах полацкія дыпламаты вучыліся гнуткасці і абачлівасці. Набыты вопыт, нягледзячы на часовыя крызісы і няўдачы, даў магчымасць Полацку аднавіць тэрытарыяльную цэласнасць і набыць палітычную стабільнасць.

Поспехі ў сацыяльна-эканамічным развіцці Полацкага княства прывялі да актывізацыі экспансіі яго ўладароў у рэгіёне Усходняй Прыбалтыкі, звязанай з падпарадкаваннем тэрыторыі паабапал Заходняй Дзвіны. У Ніжнім Падзвінні былі створаны невялікія ўмацаваныя паселішчы, якія станавіліся апорнымі пунктамі на шляху пашырэння ўплыву Полацка ў наваколлі. Паводле пісьмовых крыніц, ужо ў канцы XII – пачатку XIII ст. усё цячэнне Заходняй Дзвіны і частка Балтыйскага ўзбярэжжа было ў сферы ўплыву полацкіх князёў. Мясцовыя плямёны (лівы, земгалы, куршы і інш.) выплачвалі даніну Полацкаму княству. У ваенных адносінах аўтахтоннае насельніцтва выступала саюзнікам Полацка. Прыкладна ў X–XI стст. на землях латгалаў і селаў з'явіліся гарады Герцыке і Кукенойс – цэнтры невялікіх княстваў са змешаным у этнічным плане насельніцтвам, якія знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад Полацка. Верагодна, там княжылі прадстаўнікі полацкай дынастыі са сваімі дружыннікамі, але ў пачатку XIII ст. сітуацыя ў Прыбалтыцы ўскладнілася ў сувязі з пранікненнем туды крыжаносцаў.

З гэтага часу супрацьстаянне крыжацкай экспансіі стала на першае месца ў іерархіі знешнепалітычных прыярытэтаў Полацкага княства.

Такім чынам, сфера знешнепалітычнай дзейнасці княстваў беларускіх зямель была дастаткова шырокай. Ажыццяўлялася яна па розных напрамках як самастойна, так і ў саюзах з іншымі старажытнарускімі княствамі. Разам з тым перад беларускімі княствамі паўсталі новыя міжнародныя праблемы, а знешнепалітычныя ўмовы развіцця значна ўскладніліся. Для беларускіх зямель небяспека зыходзіла перш за ўсё ад нямецкіх рыцараў-крыжаносцаў.

## ВОЙНЫ ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА З ОРДЭНАМ МЕЧАНОСЦАЎ І ЛІВОНСКІМ ОРДЭНАМ

Крыжаносцы з'явіліся ў вусці Заходняй Дзвіны ў пачатку XIII ст. Іх прыход у гэты рэгіён не быў стыхійным: яго падтрымлівалі як нямецкія гарады і еўрапейскае рыцарства, так і Ватыкан, каталіцкая царква. Менавіта з арганізаванымі ёю крыжовымі паходамі ў Палесціну з мэтай вызвалення ад мусульман труны Гасподняй было звязана з'яўленне асобных ваенна-манаскіх арганізацый – духоўна-рыцарскіх ордэнаў. Першым у 1099 г. быў створаны ордэн шпітальераў-янітаў (сваю назву атрымаў ад шпіталя Святога Яна, які дапамагаў хворым пілігрымам-вандроўнікам), другім – у 1119 г. у Палесціне ордэн тампліераў (храмоўнікаў, назва паходзіла ад таго, што рэзідэнцыяй ордэна быў палац караля Болдуіна II, які знаходзіўся каля мячэці, пабудаванай на месцы храма цара Саламона). Але для гісторыі беларускіх зямель непасрэднае значэнне мела заснаванне ў 1198–1199 гг. у Палесціне ў час трэцяга крыжовага паходу Тэўтонскага ордэна (афіцыйная назва – Ордэн шпіталя Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Іерусаліме), які ў XIII ст. замацаваўся ў Прусіі і ператварыўся ў адзін з фактараў знешняй небяспекі для суседніх беларускіх зямель.

З'яўленню крыжаносцаў у Прыбалтыцы папярэднічала дзейнасць каталіцкіх місіянераў. У 1186 г. першы з іх – святар ордэна Аўгусціна Мейнард, пасланы брэменскім арцыбіскупам Гартвікам II, каб заснаваць арцыбіскупства на рускіх землях, – звярнуўся да полацкага князя Уладзіміра па дазвол прапаведаваць хрысціянства сярод падуладных яму ліваў-язычнікаў. Полацкі князь даў такі дазвол, недаацаніўшы ўсю важнасць гэтай падзеі, якая пацягнула за сабой непрадбачаныя наступствы як для Полацкага княства, так і для іншых зямель Беларусі. Менавіта Мейнард заснаваў першае каталіцкае біскупства на тэрыторыі Прыбалтыкі. Створаная ім калонія нямецкіх місіянераў, купцоў і прафесійных ваяроў хутка разрасталася. Яна прыцягвала на свой бок мясцовую ліўскую знаць, засылала на ўсход

і паўднёвы ўсход рэлігійных, гандлёвых і ваенных прадстаўнікоў. Створаны Мейнардам фарпост стаў базай для далейшага пашырэння каталіцкага ўплыву ў рэгіёне.

Памерлага ў 1196 г. Мейнарда замяніў біскуп Бертольд – першы місіянер у Прыбалтыцы, які разам з крыжам узяў у рукі і зброю. Бертольд упершыню запрасіў сюды нямецкіх рыцараў і дамогся таго, што папа рымскі Цэлестын III прыраўняў ваенныя акцыі ў гэтым рэгіёне да крыжовых паходаў у Палесціну. Знайшлося шмат ахвотнікаў паўдзельнічаць у гэтых паходах (год службы ў крыжацкім войску даваў дараванне за любыя грахі). Бертольд быў забіты ў 1198 г. падчас ваенных дзеянняў супраць ліваў, тым самым паўтарыўшы лёс большасці хрысціянскіх прапаведнікаў.

Ватыкан быў зацікаўлены не толькі і не столькі ў выратаванні «заблукаўшых» душ, колькі ў далучэнні да сваёй улады новых зямель і атрыманні з іх новых прыбыткаў. У гэты час усё больш сталі праяўляцца рэлігійныя супярэчнасці паміж усходнім і заходнім адгалінаваннямі хрысціянства – праваслаўем і каталіцызмам. У грамадскай свядомасці насельніцтва Еўропы зацвердзілася меркаванне, што сапраўдныя хрысціяне – гэта толькі католікі, а праваслаўныя – адшчапенцы ад веры. Таму тысячы фанатычных змагароў за пашырэнне хрысціянства, якія ў імя Хрыста самі ішлі на смерць, неслі яе як прыбалтам, так і жыхарам беларускіх зямель.

Рашуча дзейнічаў у Лівоніі пераемнік Бертольда брэменскі канонік Альберт Буксгёўдэн, які надоўга ўмацаваўся ва Усходняй Прыбалтыцы. Ён прыбыў сюды з ваеннай экспедыцыяй з 23 караблёў і ў 1201 г. у вусці Заходняй Дзвіны (на месцы ліўскага паселішча) узвёў крэпасць Рыгу, якая стала галоўным апорным пунктам нямецкай каланізацыі паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Балтыйскага мора і цэнтрам каталіцкага арцыбіскупства. Узвядзенне Рыгі негатыўна адбілася на інтарэсах Полацка, бо гэта фартэцыя замыкала выхад да мора. У 1202 г. біскупам Альбертам і цыстэцыянскім манахам Тэадорыкам быў заснаваны вайскова-манаскі ордэн братоў рыцарства Хрыстовага. Афіцыйнай яго мэтай абвяшчалася абарона каталіцкага касцёла ў Лівоніі і пашырэнне хрысціянства сярод ліваў, латгалаў і эстаў. Браты-рыцары насілі белыя плашчы з выявай чырвонага мяча і крыжа над ім, таму ў Сярэднявеччы была пашырана іх назва «браты па мячы», «мечнікі», «мечаносцы», а ваенна-манаскае аб'яднанне было больш вядома як Ордэн мечаносцаў. З 1237 г. пасля аб'яднання з больш моцным Тэўтонскім ордэнам у канфедэрацыю ён пачаў называцца Лівонскім ордэнам. Ваенная арганізацыя рыцараў занялася заваёвай і хрысціянізацыяй падзвінскіх зямель. Ордэн пастаянна папаўняўся нямецкімі рыцарамі і стаў сур'ёзнай

ваеннай сілай у Прыбалтыцы. Умацаванне крыжаносцаў на гэтых месцах, пачатак іх агрэсіі прывялі да барацьбы Полацка за свае інтарэсы.

Як сведчаць крыніцы (асноўнай з іх за гэты перыяд з'яўляецца крыжацкая «Хроніка Лівоніі» Генрыха Латвійскага), пачатковае сутыкненне Полацка з Ордэнам мечаносцаў адбылося ў 1203 г., калі полацкі князь Уладзімір узяў у аблогу замак Ікскюль (Ікскуль) непадалёк ад Рыгі, а потым крэпасць Гольм. Ёсць меркаванне, што месца паходу было выбрана невыпадкова, бо менавіта замак Ікскюль разам з першым лацінскім храмам быў закладзены з дазволу Уладзіміра яшчэ першым каталіцкім місіянерам Мейнардам. Ікскюль адкупіўся ад палачан, а Гольм выбраў абарону. Пры яго аблозе палачане сутыкнуліся з перадавой зброяй – арбалетамі і балістамі – і былі вымушаны адступіць. У тым жа годзе князь Герцыке Усевалад зрабіў спробу нападу на Рыгу, але і яна скончылася няўдачай. Гэта баявая сустрэча з крыжаносцамі скончылася паражэннем для палачан, якія недаацанілі сілы праціўніка і навейшую еўрапейскую зброю.

Падзеі 1203 г. азначалі пачатак адкрытай вайны, у ходзе якой Полаччына першай з усіх усходнеславянскіх зямель уступіла ў барацьбу з крыжацкай агрэсіяй. Адстойваючы свае пазіцыі ў Прыбалтыцы, Полацк бараніў і інтарэсы мясцовых балцкіх і фіна-ўгорскіх плямён, якія супрацiўляліся заваёўнікам і бачылі ў славянскім горадзе на Дзвіне надзейную апору.

Калі насельніцтва Ніжняга Падзвіння сутыкнулася з жорсткай уладай крыжаносцаў з яе паслядоўнымі і разнастайнымі метадамі прыгнятання, яно пачало шукаць дапамогі ў Полацка. У 1206 г. па просьбе ліваў, якія ўзнялі паўстанне, полацкі князь Уладзімір паўтарыў паход на Рыгу. Так пачалася вайна Полацкага княства з Ордэнам мечаносцаў 1206–1210 гг. Нямецкія балісты спынілі полацкую дружыну пры высадцы з караблёў каля Ікскюля. Уладзімір не стаў штурмаваць замак, а нечакана падышоў да Гольма, які з'яўляўся ключом да Рыгі, і акружыў яго. Крыжакі адбіваліся 11 дзён (па сведчаннях несумненна тэндэнцыйнай «Хронікі Лівоніі», Гольм абаранялі толькі 20 рыцараў). Вырατавалі іх падмога, што прыбыла з Германіі, і кароль Даніі Вальдэмар, які прывёў сюды вялікае войска. Палачане знялі аблогу. У выніку да 1207 г. уся Лівонія была ахрышчана, што азначала і яе палітычнае падначаленне Ордэну.

Далейшыя падзеі ў Прыбалтыцы аказаліся яшчэ больш неспрыяльнымі для Полацка. У авангардзе барацьбы знаходзіўся князь Кукенойса (горад размяшчаўся за 246 км ад Полацка) Вячаслаў, празваны Вячка. У 1205 і 1207 гг. ён заключыў з рыжскім біскупам мірныя пагадненні, згодна з якімі губляў частку падначаленай яму тэрыторыі і ўласную незалежнасць. Аднак мірыцца са становішчам біскупскага васала князь Вячка не жадаў. Падчас

адной з сутычак ён трапіў у палон, але быў адпушчаны па загадзе Альберта Буксгёўдэна. У Кукенойсе з'явіўся нямецкі гарнізон, пачалося ўзвядзенне каменнага замка. Вячка нібы ператварыўся з гаспадара горада ў ганаровага вязня. У 1208 г., скарыстаўшыся зручным выпадкам, кукенойская дружына расправілася з гарнізонам праціўніка, што размяшчаўся ў фартэцыі. Вячка паслаў полацкаму князю Уладзіміру свае лепшыя трафеі і папрасіў дапамогі, раючы скарыстацца ад'ездам Альберта за новай партыяй пілігрымаў, для сумеснага паходу на Рыгу. Не атрымаўшы своечасовай дапамогі ад полацкага князя і не маючы магчымасці далей адзін на адзін весці барацьбу з крыжаносцамі, Вячка спаліў свой горад і з дружынай пайшоў у Наўгародскую зямлю. Потым ён апынуўся ў Юр'еве (сучасны Тарту), дзе ў 1224 г. загінуў пры яго абароне ад крыжаносцаў. На месцы Кукенойса ў 1209 г. па загадзе Альберта быў пабудаваны моцны замак, які стаў апорай далейшага націску Ордэна на Полацк.

У 1209 г. крыжаносцамі быў разрабаваны і спалены Герцыке. Яго князь Усевалад уратаваўся ўцёкамі і мусіў пайсці на замірэнне з біскупам Альбертам, каб вярнуць палонных, у тым ліку сваю жонку. Пры гэтым ён не толькі прызнаў сябе васалам рыжскага біскупа, але перадаў яму свае землі, што фіксаваў асобны акт і гэта рабілася без узгаднення з Полацкам. Аднак да 1214 г. Усевалад яшчэ працягваў барацьбу з крыжакамі.

Авалодаўшы Кукенойсам і Герцыке, Ордэн падпарадкаваў Ніжняе Падзвінне. Пазіцыі Полацка тут былі прыкметна падарваны і яго ўладар пагадзіўся на перагаворы з крыжаносцамі, што прывяло да падпісання ў 1210 г. першага дагавора паміж Полацкім княствам, з аднаго боку, і Ордэнам мечаносцаў і Рыжскім біскупствам – з другога. Паводле гэтага мірнага дагавора, полацкі князь Уладзімір санкцыянаваў тэрытарыяльныя набыткі, зробленыя крыжаносцамі ў прыбалтыйскіх уладаннях палачан. Пры гэтым Полацк захаваў сваё права на атрыманне даніны з ліваў, але з дазволу і пад кантролем біскупа.

Разам з ваеннай агрэсіяй праводзілася і гандлёва-эканамічная экспансія Ордэна ў адносінах да Полацка. Пры заключэнні дагавора Альберт прапанаваў адкрыць рыжскім купцам доступ у полацкія ўладанні. Праўда, гэта пагадненне было выгадна і Полацку, аб чым сведчыць тое, што гандлёвыя і палітычныя дагаворы з Рыгай пазней не раз узнаўляліся па ініцыятыве полацкага боку. Полацкія купцы, згодна з дагаворам 1210 г., мелі права гандлёвай дзейнасці ў Рызе, свабоднага суднаходства па Заходняй Дзвіне.

Дагавор 1210 г. можна разглядаць як кампраміснае пагадненне. Полацку, які толькі знешне прымірыўся з Ордэнам, ён даў магчымасць лепш

умацавацца, каб пазней з новымі сіламі супрацьстаяць нямецкай экспансіі. Для Ордэна спакой у Падзвінні дазволіў перанесці наступленне на зямлю эстаў, зону ўплыву Наўгародскай рэспублікі.

У 1212 г. полацкі князь Уладзімір выступіў з ініцыятывай сустрэчы ў Герцыке з біскупам Альбертам. Перамовы праходзілі ў напружаных абставінах і нават перарываліся (полацкі князь паспрабаваў запалохаць біскупа, пагражаў вайной). Але ўтрымацца ў Лівоніі ён не змог. Паводле новага пагаднення, заключанага ў гэтым годзе, Полацк вымушаны быў адмовіцца ад Ніжняга Падзвіння і ад ліўскай даніны на карысць Ордэна. Тым самым Полацк канчаткова страціў кантроль над гэтым раёнам. Пры гэтым шлях па Заходняй Дзвіне для полацкіх купцоў заставаўся свабодным.

Разам з тым актыўнасць крыжаносцаў у Падзвінні не зменшылася. У 1214 г. яны напалі на Герцыке і разрабавалі горад. Падставай для гэтай акцыі сталі звесткі пра падтрымку герцыкскім князем Усеваладам ваенных акцый літоўскіх плямён супраць Ордэна. Сутыкнуўшыся са знешняй небяспекай, герцыкскі князь адным з першых усвядоміў неабходнасць аб'яднання палачан з мясцовымі балцкімі плямёнамі ў барацьбе з агрэсарам. У наступным годзе крыжаносцы паўтарылі свой напад. Пасля гэтага Герцыке як фарпост Полацка ў Ніжнім Падзвінні страціў сваё значэнне.

Аднак Полацк яшчэ працягваў успрымацца мясцовымі балцкімі і фіна-ўгорскімі плямёнамі як цэнтр супраціўлення крыжаносцам. Так, у 1216 г. рыхтаваўся сумесны паход палачан разам з эстамі і літоўцамі супраць Ордэна. Толькі раптоўная смерць полацкага князя Уладзіміра (ёсць меркаванне, што ён быў атручаны) перашкодзіла яго ажыццяўленню.

Такім чынам, барацьба з крыжаносцамі, якая разгарнулася ў пачатку XIII ст., не прынесла для Полацкага княства поспеху. Яно недаацаніла выключную небяспеку ўзброеных місіянераў. Зробленыя полацкай дыпламатыяй пралікі далі магчымасць яе праціўніку замацавацца ў Прыбалтыцы, стварыць тут апорныя пункты для далейшага прасоўвання на ўсход. Такімі пунктамі сталі Рыга і іншыя замкі, пабудаваныя ў вусці і па цячэнні Заходняй Дзвіны.

Полацкае княства не здолела сыграць на супрацьстаянні паміж плямёнамі, што насялялі раён Ніжняй Прыбалтыкі, і агрэсарам. Гэты козыр перахапілі крыжаносцы, якія ўмела выкарысталі супярэчнасці паміж мясцовымі плямёнамі не толькі для таго, каб схіліць іх на свой бок, адарваць і проціпаставіць іх Полацку. Не ўдалося полацкай дыпламатыі стварыць і антыкрыжацкую кааліцыю ў саюзе з суседнімі ўсходнеславянскімі землямі. Да 40-х гг. XIII ст. Полацк фактычна адзін супрацьстаяў Ордэну. Толькі пазней да гэтай справы далучыліся Ноўгарад і Пскоў.

Паспяховай барацьбе супраць Ордэна перашкаджалі феадальныя міжусобіцы. Так, кукенойскі князь Вячка меў напружаныя адносіны з полацкім князем Уладзімірам. Герцыкскі князь Усевалад не толькі змагаўся супраць немцаў, але і ў саюзе з літоўскімі правадырамі (адзін з іх быў яго цесцем) «разбураў землі рускіх хрысціян». Нарэшце, полацкаму войску складана было супрацьстаяць рыцарам, якія мелі самую дасканалую на той час еўрапейскую зброю. Заходнееўрапейскія рыцары пастаянна папаўнялі шэрагі крыжаносцаў, забяспечвалі іх значнымі ахвяраваннямі. Гэта дазваляла Ордэну не мець цяжкасцей з неабходнымі ваеннымі і матэрыяльнымі рэсурсамі.

У 1219 г. у барацьбу, якая адбывалася ў гэтым рэгіёне, непасрэдна ўмяшалася і Данія. Паводле дамовы з біскупам Альбертам, дацкія войскі высадзіліся на паўночным узбярэжжы Эстоніі. Датчане захапілі крэпасць эстаў Лінданіс, на месцы якой быў закладзены Рэвель (Талін).

Вялікае значэнне для абароны зямель Беларусі ад нямецкіх рыцараў меў саюз Полацка, Віцебска і Смаленска. Дзеля гэтага ў першай чвэрці XIII ст. Полацк і Віцебск прызналі вярхоўную ўладу смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча, што садзейнічала згуртаванню сіл, якія супрацьстаялі агрэсіі. Аднак гаспадарчыя інтарэсы пачалі пераважаць, і Дзвіна стала шляхам узаемавыгаднага актыўнага гандлю. Так, ёсць звесткі, што ў 1222 ці 1223 г. па ініцыятыве Полацка зноў быў падпісаны новы дагавор паміж Полацкім і Смаленскім княствамі, з аднаго боку, і Ордэнам мечаносцаў і Рыжскім біскупствам з другога, аб аднаўленні міру, які паўтараў умовы дагавора 1212 г. У 1229 г. паміж Смаленскам, Полацкам і Віцебскам, з аднаго боку, і Рыгай і шэрагам нямецкіх гарадоў (Любекам, Мюнстэрам, Брэменам, Дортмундам і інш.), з другога, была падпісана новая, даволі раўнапраўная дамова аб гандлі, вядомая ў гістарычный літаратуры як «Смаленская гандлёвая праўда». Яна адкрывала «чысты шлях» купцам гэтых гарадоў у абодвух напрамках і нічым не абмяжоўвала іх гандаль. Дамова 1229 г. захоўвала сваю прававую моц да часоў вялікага князя літоўскага Вітаўта.

У 20–30-х гг. XIII ст. адбывалася пашырэнне крыжацкай агрэсіі ў Прыбалтыцы. У Холмскай зямлі ўсталяваліся браты больш моцнага Тэўтонскага ордэна. Пакліканыя мазавецкім князем Конрадам для барацьбы супраць прусаў, яны каля 1230 г. з'явіліся на Вісле, дзе пачалі ўзводзіць замкі і ўзяліся падпарадкоўваць Прусію (гэты працэс быў завершаны да 1283 г.). У 1237 г. два нямецкія ордэны ў Прыбалтыцы аб'ядналіся, што павялічыла небяспеку для Полацка. Каб згуртаваць сілы, якія супрацьстаялі нямецкай агрэсіі, полацкія князі ўмацоўвалі сувязі з літоўскімі кунігасамі, а таксама з суседнімі ўсходнеславянскімі княствамі, у прыватнасці з Ноўгарадам,

сведчаннем чаму быў шлюб наўгародскага князя Аляксандра Яраславіча (Неўскага) з дачкой полацкага князя Брачыслава, заключаны з 1239 г.

Вялікую ролю ў зрыве захопніцкіх планаў лівонскіх рыцараў, дацкіх і шведскіх феадалаў адыгралі бітвы на рацэ Няве ў 1240 г. і на Чудскім возеры ў 1242 г. У Неўскай бітве разам з наўгародцамі і суздальцамі ўдзельнічалі і прадстаўнікі Полацкай зямлі. У ёй вызначыўся адвагай палачанін Якаў, які быў на службе пры двары Аляксандра Неўскага. Перамога гэтага князя над нямецкімі рыцарамі ў бітве на Чудскім возеры 5 красавіка 1242 г. спыніла рух захопнікаў на старажытнарускія землі.

Аднак пасля названых падзей пагроза беларускім землям з боку крыжакоў не толькі не знікла, але яшчэ больш узмацнілася. Замацаваўшыся ў Прусіі, насельніцтва якой практычна было знішчана, рыцары Тэўтонскага ордэна сталі рабіць набегі і на беларускія землі. Тут асноўны ўдар прыняло на сябе Навагародскае княства. Скіраванасць паходаў тэўтонаў у Панямонне стварала небяспеку і для жыхароў Гарадзеншчыны. Першы напад на Гародню адбыўся ў 1248 г. Змешаны склад насельніцтва гэтага рэгіёна, неабходнасць сумеснай абароны ад агрэсара прадвызначылі пачатак стварэння, яднання славяна-балцкага саюзу, які некалькі пазней стаў цэнтрам стварэння новай магутнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага.

Такім чынам, барацьба з крыжацкай агрэсіяй была працяглай і ўпартай. Беларускія землі змаглі спыніць наступленне рыцараў далей на ўсход і выступілі перашкодай на шляху распаўсюджання нямецкай небяспекі.

## БАРАЦЬБА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ З МАНГОЛА-ТАТАРАМІ

У XIII ст. над старажытнарускімі землямі навісла іншая небяспека – з боку мангола-татар. Этнонім «манголы» быў шырока вядомы ў старажытнай Цэнтральнай Азіі як саманазва некалькіх плямён. Уласна ж татары ў XII – пачатку XIII ст. жылі ўздоўж паўночнай мяжы Кітая, ахоўваючы падыходы да Вялікай Кітайскай сцяны ад набегаў качэўнікаў, у тым ліку і манголаў. За гэту службу кітайскія імператары выдавалі татарскім правадырам штогадовае ўтрыманне срэбрам і разнастайнымі таварамі. Назва «татары» ў сярэднявечнай кітайскай гістарыяграфіі адпавядала еўрапейскаму паняццю «варвары». Менавіта таму кітайцы распаўсюдзілі этнонім «татары» і на іншыя плямёны, што жылі на поўнач ад уласна татар. Аднак пры гэтым апошніх яны называлі «белымі татарамі», г. зн. больш культурнымі, што мелі дачыненне да дасягненняў кітайскай цывілізацыі. Тых жа манголаў, якія жылі ў паўночных стэпах, лясах і гарах,

кітайцы называлі «чорнымі татарамі», што мела пагардлівае адценне, падкрэсліваючы іх дзікасць.

З 20-х гг. XIX ст. у расійскай гістарыяграфіі для назвы мангольскіх вайсковых атрадаў замацавалася паняцце «мангола-татары», паколькі, па меркаванні гісторыкаў той эпохі, значная частка мангольскага войска складалася з татар. Сучасныя даследчыкі больш схільныя да думкі, што татары ніколі не былі саюзнікамі манголаў і ніколі не ўдзельнічалі ў іх заваёўніцкіх паходах, а, наадварот, варагавалі з імі. Нягледзячы на гэта, тэрмін «мангола-татары» ці «татара-манголы» захоўваецца ў літаратуры і ў наш час.

З'яўленню манголаў на межах Старажытнай Русі папярэднічаў шэраг падзей. У 1206 г. на курултаі (з'ездзе) стэпавай арыстакратыі, які сабраўся на беразе цэнтральнаазіяцкай ракі Анон, вярхоўным правіцелем манголаў быў абраны Цемутжын, які ўвайшоў у гісторыю пад імем Чынгісхан, першы ўладар аб'яднанай Манголіі. У пачатку XIII ст., заваяваўшы частку Сібіры, манголы ў 1215 г. перайшлі да захопу Кітая. Ім удалося падпарадкаваць усю яго паўночную частку. З Кітая яны вывезлі навейшую для таго часу ваенную тэхніку і спецыялістаў. Акрамя таго, з ліку кітайцаў мангола-татары атрымалі кадры пісьменных і вопытных чыноўнікаў. Пасля орды Чынгісхана ў 1219 г. уварваліся ў дзяржаву Харэзмшахаў у Сярэдняй Азіі. Наступствам іх заваёўніцкага паходу стала гібель большасці землярobчых аазісаў гэтага рэгіёна. У 1222–1223 гг. магутная мангола-татарская армія захапіла Паўночны Іран, ажыццявіла грабежніцкі паход у Закаўказзе, трапіла ў прычарнаморскія стэпы, разбіла плямёны полаўцаў.

Адносіны паміж старажытнарускімі княствамі і полаўцамі ў гэты перыяд былі дастаткова своеасаблівымі. Побач з палавецкімі набегамі на Русь і паходамі рускіх князёў на полаўцаў паміж двума народамі існавалі актыўныя эканамічныя, палітычныя і культурныя кантакты. Некаторыя палавецкія ханы прынялі хрысціянства, частка рускіх князёў былі жанаты з дочкамі палавецкіх ханаў. Просьба полаўцаў аб дапамозе супраць небяспечнага ворага была прынята рускімі князямі.

31 мая 1223 г. на р. Калцы (у наш час – Кальчык, прыток р. Кальміўс у Данецкай вобласці) сышліся на першую бітву мангола-татары і аб'яднаныя сілы рускіх і полаўцаў. У ёй кааліцыйнае руска-палавецкае войска пацярпела паражэнне па прычыне сваёй раз'яднанасці. Не ўсе рускія князі, якія абяцалі ўдзельнічаць у бітве, выставілі свае дружыны. У рускіх не было агульнага камандавання, таму што іх князі – Мсціслаў Мсціславіч Галіцкі (Удалы), Мсціслаў Святаславіч Чарнігаўскі і Мсціслаў Раманавіч Кіеўскі – знаходзіліся ў такой сварцы, што не маглі прымусіць сябе дзейнічаць разам нават перад тварам смяротнай небяспекі. Не праявілі стойкасці

і полаўцы. Але і мангола-татары, не маючы сіл, не рызыкнулі ісці на Кіеў і рушылі на ўсход. Там пры пераправе праз Волгу яны пацярпелі паражэнне ад волжскіх балгар.

Праз 13 гадоў унук заснавальніка Мангольскай дзяржавы Чынгісхана Бату (у славянскай традыцыі – Батый) пачаў заваёўніцкі паход на захад. У 1236 г., разграміўшы Волжскую Балгарыю, войскі Батыя накіраваліся на рускія землі. На працягу трох гадоў ішла барацьба раздробленых княстваў Русі з мангола-татарамі. Зімой 1237/38 гг. яны захапілі і разрабавалі гарады Разань, Каломну, Маскву, Уладзімір-на-Клязьме. У бітве на р. Сіці ў 1238 г. пацярпелі паражэнне галоўныя аб'яднаныя сілы старажытнарускіх уладароў, якія сабраў вялікі князь уладзімірскі Юрый Усеваладавіч.

У 1238 г. мангола-татары захапілі і спалілі Таржок. Небяспека пагражала ў той перыяд і беларускім землям. Так, у тым жа годзе заваёўнікі наблізіліся да Смаленска, узяўшы які, яны маглі б непасрэдна дасягнуць тэрыторыі Беларусі. Аднак упартае супраціўленне смалян вымусіла мангола-татар адступіць ад горада. Пагроза навісала і над Ноўгарадам, да якога атрады Батыя не дайшлі толькі 300 км. Да сённяшніх дзён застаецца загадкай, чаму ў 1238 г. мангола-татарскія войскі не рухаліся далей, а, спыніўшыся, павярнулі назад і вярнуліся ў стэп. Паводле адной з версій, паміж вопытным палітыкам і дыпламатам Батыем і наўгародскім князем Яраславам Усеваладавічам і яго сынам Аляксандрам Неўскім мог быць заключаны дагавор, наступствам чаго стала прамангольская палітыка названых князёў і ўзвышэнне ў будучым гэтага княжацкага роду. У 1239–1240 гг. стэпавікі прайшлі па тэрыторыі Чарнігаўскай зямлі. Верагодна, тады быў разбураны і спалены Гомель, які знаходзіўся ў складзе гэтага княства.

У 1240 г. быў захоплены і зруйнаваны Кіеў. Па сведчаннях францысканскага манаха Плана Карпіні, які накіроўваўся да мангола-татар прапаведаваць хрысціянства і праязджаў праз гэты горад у 1246 г., у ім налічвалася не больш за 200 дамоў. Год узяцця Кіева лічыцца пачаткам перыяду мангола-татарскага ярма на Русі, якое доўжылася 240 гадоў.

Ад Кіева Батый накіраваўся на Уладзімір-Валынскі і па дарозе захапіў некалькі гарадоў на Случы і Гарыні. Ёсць падставы сцвярджаць, што мангола-татары, прайшоўшы па поўдні Беларусі, разрабавалі і спалілі такія гарады, як Мазыр, Петрыкаў, Тураў, Давыд-Гарадок, Пінск, Слуцк, Клецк. Захапіўшы Уладзімір-Валынскі, Батый рушыў на Галіч і таксама спустошыў яго. У Іпацьеўскім летапісе ёсць ускоснае сведчанне пра бітву з татарамі каля Берасця. Галіцкія князі Данііл і Васілька Раманавічы ў 1240 (ці 1241) г., вяртаючыся з Венгрыі пасля пагрому, не маглі пад'ехаць да Берасця з-за смуроду «мноства забітых, у полі ляжачых».

У 1241 г. мангола-татары напалі на Венгрыю, затрацiўшы на шлях праз Валынь усяго чатыры месяцы. Паход працягваўся да 1242 г. і дасягнуў Адрыятыкі. Наступленне качэўнікаў захлынулася толькі на Далмацінскім узбярэжжы каля межаў Італіі. Ахвярамі заваёўнікаў сталі землі Польшчы і асабліва Венгрыі. Падвергліся разгрому Славакія, Усходняя Чэхія і Харватыя. Аднак у Цэнтральную Еўропу качэўнікі ўступілі ўжо значна аслабленымі магутным супраціўленнем, якое яны сустрэлі на Русі, і не ўстанавілі свайго ярма.

Вяртаючыся з Венгрыі, Батый зноў спустошыў Валынь і Галіцыю. У 1242 г. мангола-татары яшчэ раз спрабавалі захапіць Смаленск, але таксама беспаспяхова. Верагодна, з адным са смаленскіх ці з чарнігаўскім паходам мангола-татар было звязана іх з'яўленне на Магілёўшчыне. Даследаванні апошніх гадоў фіксуюць сляды прычыненых імі разбурэнняў у Магілёве, Крычаве, Прапойску (Слаўгарадзе), Вішчыне і некаторых іншых месцах гэтага раёна.

Пры гэтым у цэлым беларускія землі засталіся ў баку ад галоўнага напрамку руху мангола-татар і не зведалі таго спусташэння, якому падверглася Паўночна-Усходняя, Паўднёвая і Паўднёва-Заходняя Русь. Не распаўсюджвалася на тэрыторыю Беларусі і ярмо Залатой Арды – новай дзяржавы, створанай Батыем у міжрэччы Урала і Дняпра з цэнтрам на Ніжняй Волзе ў горадзе Сараі. Адлік яе палітычнай гісторыі пачаўся з 1243 г., калі вялікі князь уладзімірскі Яраслаў Усеваладавіч першым з рускіх правіцеляў прыехаў у стаўку мангольскага хана за «ярлыком» на княжанне. Беларускія землі не абкладаліся данінай і не ведалі ардынскіх нукераў (дружыннікаў мангольскай феадальнай знаці ў XII–XIII стст.) і баскакаў (прадстаўнікоў мангольскага хана ў заваяваных землях Русі, якія ажыццяўлялі кантроль за мясцовымі ўладамі).

Гісторыкі тлумачаць гэту сітуацыю рознымі прычынамі. Адны лічаць, што войска Батыя было моцна аслаблена супраціўленнем, якое аказалі нашэсцю Уладзіміра-Суздальская, Кіеўская, Чарнігаўская і Галіцка-Валынская землі. Другія сцвярджаюць, што захопнікі не хацелі ісці ў беларускія лясы і балоты пасля ўкраінскіх прастораў, але маглі пасылаць на поўнач ад Прыпяці асобныя атрады. Існуюць і іншыя меркаванні. Некаторыя даследчыкі наогул прыходзяць да высновы аб тым, што мангола-татары тады не ставілі мэтай заваяваць гэты край. Прычым выказваецца думка, што яшчэ да паўднёвага паходу манголы дамовіліся з імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі Фрыдрыхам II Хохенштаўфенам аб падзеле Усходняй Еўропы на сферы ўплыву, і беларускія землі, а таксама Смаленск, Ноўгарад і Пскоў павінны былі перайсці пад кантроль крыжаносцаў.

Менавіта гэтым тлумачыцца і той факт, што паўднёвы паход мангола-татар супаў па часе з актывізацыяй агрэсіі нямецкіх і шведскіх рыцараў у Прыбалтыцы і Паўночна-Заходняй Русі. Вядома, што Батый вёў ліставанне, тайнае і яўнае, з імператарам Фрыдрыхам II, ворагам папы рымскага Інакенція IV. Фрыдрых II шукаў саюзу з ханам, у той час як папа рымскі разам з паўднёварускімі князямі Данілам Раманавічам Галіцкім і Міхаілам Усеваладавічам Чарнігаўскім імкнуліся стварыць антымангольскую кааліцыю, але няўдала. Нездарма сярод тых, на каго папа Інакенцій IV наклаў анафему ў 1243 г., разам з праваслаўнымі, ерэтыкамі-катарамі, харэзмійцамі былі мангола-татары і Фрыдрых II. Увогуле ж, трэба прызнаць, што прымальнага тлумачэння, чаму мангола-татары фактычна абмінулі асноўную частку тэрыторыі Беларусі, няма.

Затое даследчыкі амаль аднадушныя пры вызначэнні прычын паражэння зямель Русі ў ходзе мангола-татарскага нашэсця. На першае месца пры іх пераліку ставіцца існуючая ў той перыяд феадальная раздробленасць. Старажытнарускія княствы былі разгромлены ворагам паасобку. Паказальна тое, што міжусобная калатнеча не спынялася нават падчас непасрэднай небяспекі. Пры гэтым не было заўважана ніякіх спроб аб'яднацца для таго, каб даць адпор ворагу. Важнае значэнне мелі і тыя абставіны, што заваёўнікі, якія раней падпарадкавалі Паўночны Кітай і Сярэднюю Азію, выкарыстоўвалі падчас сваіх аперацый разбуральную ваенную тэхніку, у тым ліку машыны, якія прабівалі сцены рускіх крэпасцей, а таксама каменямёты, порах і ёмістасці з гаручымі вадкасцямі.

Трэба адзначыць, што ў далейшым, у другой палове XIII ст., мангола-татары неаднаразова спрабавалі захапіць беларускія і іншыя тэрыторыі, якія ўваходзілі тады ў Вялікае Княства Літоўскае. У той час паходы на яго землі арганізоўвала Залатая Арда. Так, першы дакументальна засведчаны паход ардынцаў на абшары Беларускага Панямоння адбыўся ў 1258 г. Яго ўзначаліў ханскі баскак Бурундай, удзел прымалі атрады князя Даніла Раманавіча Галіцкага. Ёсць меркаванне, што гэты паход меў на мэце захаваць Панямонне ў арбіце ўплыву Галіцка-Валынскага княства – васала Залатой Арды. Набегі ардынскіх атрадаў на беларускія землі былі эпізадычныя. Захаваліся сведчанні пра мангола-татар ад 1259, 1274, 1275, 1277 і 1287 гг. Разам з тым захапіць, абкласці данінай, устанавіць сістэму палітычнага ўладарання і кіравання праз выдачу мясцовым князям «ярлыкоў» для зацвярджэння іх на прастоле, як аналагічнае рабілася ў іншых рускіх землях, тут стэпавікі не змаглі.

Змаганне з мангола-татарамі стала адным з сюжэтаў, які трапіў у гістарычную памяць народа. Пра набегі мангола-татар захавалася шмат народ-

ных паданняў. Шэраг паведамленняў аб бітвах з імі змешчаны ў беларуска-літоўскіх летапісах (1249 г., бітва пад Крутагор'ем, 1284 г., бітва каля Магільна). Аднак, на думку даследчыкаў, іх даставернасць сумнеўная.

Такім чынам, у XIII ст. для беларускіх зямель існавала рэальная небяспека мангола-татарскага нашэсця. Аднак большая частка Беларусі не трапіла пад мангола-татарскі пагром 1237–1240 гг. і пазбегла ярма Залатой Арды. Пакарыць беларускія тэрыторыі мангола-татарам не ўдалося.

Беларускія землі развіваліся ў дастаткова складаных знешнепалітычных умовах. Галоўнай мэтай дзейнасці мясцовых князёў у галіне знешняй палітыкі было забяспечванне незалежнага развіцця сваіх зямель. Для гэтага выкарыстоўваліся ўсе даступныя сродкі і метады. Разам з тым у названы перыяд ужо можна адзначыць прыкметнае ўздзеянне эканамічных зацікаўленняў на знешнюю палітыку княстваў. Сутыкненне эканамічных і палітычных інтарэсаў станавілася прычынамі ваенных кафліктаў, сярод якіх на першае месца выходзіла супрацьстаянне агрэсіі крыжаносцаў у Падзвінні, а таксама барацьба супраць эпізадычных набегаў мангола-татар, дзякуючы чаму беларускія землі засталіся непакоранымі. У гэтым гістарычная роля супраціўлення насельніцтва беларускіх зямель іншаземнай агрэсіі.

# 10 УТВАРЭННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

- **Балта-славянскія адносіны**
- **Узвышэнне Новагародка. Дзейнасць Міндоўга**
- **Палітыка князёў Войшалка і Трайдзеня**

## БАЛТА-СЛАВЯНСКІЯ АДНОСІНЫ

Літва, Княства Новагародскае, Княства Літоўскае і Новагародскае, Вялікае Княства Літоўскае і Рускае, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае ды іншых зямель – пад такімі назвамі ўвайшла ў гісторыю адна з магутнейшых краін Сярэднявечча. Утварэнне ВКЛ стала магчымым у выніку заканамернага сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця балцкіх і ўсходнеславянскіх этнічных супольнасцей. На працягу X–XII стст. землі балтаў знаходзіліся ў сферы інтарэсаў славянскіх княстваў. У «Аповесці мінулых гадоў» ёсць звесткі аб паходзе кіеўскага князя Уладзіміра на яцвягаў у 983 г.: «Ішоў Уладзімір на яцвягаў, іх перамог і ўзяў зямлю іх». Вядома пра паходы на літву кіеўскага князя Яраслава Мудрага ў 1040 і 1044 гг. Летапісец Нестар называе літву ў ліку плямён, якія плацілі даніну Кіеву. Зафіксаваны ў гістарычных крыніцах паходы на літву полацкіх, смаленскіх, наўгародскіх, галіцка-валынскіх князёў. З другога боку, балцкія плямёны ў XII ст. былі ўцягнуты ў міжусобныя канфлікты ўсходнеславянскіх княстваў. У Валынскім летапісе гаворыцца аб барацьбе князёў Полацкай зямлі: «Пайшоў (у 1162 г. – *Аўт.*) Рагвалод супраць Валадара з палачанамі к Гарадцу. Валадар не біўся з ім днём, а ноччу напаў на яго з горада з літоўцамі і многа зла было зроблена ў тую ноч…».

У перыяд феадальных міжусобіц, якія прывялі да аслаблення ўсходнеславянскіх княстваў, пашырыліся напады балцкіх плямён на землі славян. На працягу 1201–1236 гг. зафіксавана 14 значных паходаў балтаў на ўсходнеславянскія тэрыторыі. «Беда бо бе в земле Володімерьтей от воеванія літовского і ятвяжского», – сцвярджаецца ў Галіцка-Валынскім летапісе. Такім чынам фарміраваліся няпростыя суседскія адносіны.

Балцкія плямёны, якія межавалі з Полацкім і іншымі славянскімі княствамі на пачатку XIII ст., яшчэ не мелі значных адміністрацыйных цэнтраў, не мелі сваёй пісьменнасці. Але ў гэты час на землях літвы, жамойтаў, аўкштайтаў фарміраваліся феадальныя адносіны. Адбыўся падзел племяннай супольнасці на знаць і просты люд. На чале асобных зямель усталяваліся дынастыі племянных князёў (кунігасаў).

У першай палове XIII ст. землі балцкіх плямён і славянскіх удзельных княстваў аказаліся пад пагрозай знішчэння. З паўночнага захаду пагражалі крыжакі, з паўднёвага ўсходу – мангола-татары. Асаблівую небяспеку ўяўлялі крыжаносцы, якія ў 1237 г. знішчылі магутнае балцкае племя прусаў. Рэальную пагрозу адчулі Пскоў і Ноўгарад Вялікі. Невыпадкова князь наўгародскі Аляксандр Яраславіч (Неўскі) з 1236 па 1251 г. падтрымліваў цесныя сувязі з Полацкам: гэта давала плён у барацьбе з ворагамі з захаду. Дзеля ўмацавання кантактаў князь Аляксандр у 1239 г. узяў шлюб з дачкой полацкага князя Брачыслава Васількавіча Аляксандрай. Першы сын Аляксандра Неўскага, Васіль, у маленстве (да 1245 г.) выхоўваўся ў Віцебску. Полацкія ваяры прымалі ўдзел у пераможных бітвах супраць шведаў на Няве (1240) і рыцараў-крыжакоў у Лядовым пабоішчы (1242). З пачатку XIII да канца XV ст. Пскоў і Ноўгарад Вялікі ўдзельнічалі ў справах дзвінска-панямонскага рэгіёна, а потым Вялікага Княства Літоўскага.

Вялікая пагроза ў 30–50-я гг. XIII ст. навісла з паўднёвага ўсходу. Адно за адным пад мангола-татарскае ярмо падпадалі рускія княствы. Нават самыя магутныя з іх – Галіцка-Валынскае, Смаленскае, Ноўгарад Вялікі – вымушаны былі сплачваць даніну ардынцам.

Для абароны незалежнасці лідары балта-ўсходнеславянскага памежжа павінны былі аб'яднаць намаганні ў барацьбе з захопнікамі. Нешта падобнае ўжо адбывалася ў першай палове XIII ст. Так, вядомы сумесныя выступленні Усевалада і Літвы супраць лівонскіх рыцараў князя Герцыке (васала Полацка) у пачатку XIII ст. Пад 1206 г. «Хроніка Лівоніі» Генрыха Латвійскага паведамляе, што полацкі князь Уладзімір (Валодша) «сабраў войска з усіх канцоў каралеўства, а таксама ад суседніх каралёў, сяброў сваіх, і з вялікай адвагай спусціўся ўніз па Дзвіне». У канцы 30-х гг. XIII ст. супраць саюзніка крыжакоў Конрада Мазавецкага падняліся воіны Ізяслава

Новагародскага і «Літвы Міндоўга». Беларуска-літоўскія летапісы прыводзяць звесткі аб сумесных бітвах «літвы і русі» з мангола-татарскімі ордамі. У легендарнай бойцы пад Крутагор'ем (сучасны Дзяржынск), якая датуецца 1249 г., супраць азіяцкіх заваёўнікаў разам з Руссю («новгорожаны, слонимчаны, пинщаны») стаялі войскі з «жамойтамі і літвою».

Як бачна, кансалідацыя была наяўнай. Аднак сцвердзіць яе ў адзінадзяржаўе балта-славянскіх зямель было не так проста, бо на лідарства ў гэтым рэгіёне прэтэндавалі па меншай меры чатыры цэнтры: Новагародак, Літва, Полацкае і Галіцка-Валынскае княствы.

Здаецца, Полацкае княства, якое ў свой час першым вылучылася са складу Кіеўскай Русі і мела традыцыі незалежнага існавання, павінна было выступіць аб'яднаўчым цэнтрам. Але Полаччына XIII ст. не мела той моцы, як у папярэднія XI–XII стст. Феадальная раздробленасць, страта выхаду да Балтыкі, цяжкая барацьба з крыжацкай агрэсіяй падтачылі яе сілы.

## УЗВЫШЭННЕ НОВАГАРОДКА. ДЗЕЙНАСЦЬ МІНДОЎГА

У сярэдзіне XIII ст. цэнтр палітычнага жыцця на беларускіх землях змясціўся ў Новагародак, аб чым сведчаць як летапісныя крыніцы, так і археалагічныя знаходкі. У «Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай» згадваецца «отцовская столица в Новгородку», «Новгородская дзержава над Немном лежачая», нявольнікаў-татар «повернули до Новгородка», урэшце, «замок столечный Новгородок» і г. д.

Археолагі, якія ў пасляваенны час вялі ў Новагародку раскопкі, апынуліся перад неабходнасцю тлумачэння таго, што ў XIII ст. гэты цэнтр быў «напоўнены імпартнымі вырабамі». Паводле высноў кіраўніка археалагічных экспедыцый расійскай даследчыцы Ф. Д. Гурэвіч, горад па сваіх памерах хоць і быў невялікім, але «па знаходках прадметаў раскошы супернічае са знакамітымі старажытнарускімі гарадамі, а ў шэрагу выпадкаў з'яўляецца ўладальнікам унікальных рэчаў». Узвышэнне Новагародка ў сярэдзіне XIII ст. звязана з яго роляй у палітычным жыцці краю. Геапалітычнае становішча горада ў сярэдзіне XIII ст. было звышпрывабным, бо з'яўлялася аднолькава аддаленым ад канфліктаў, у якіх сутыкаліся балты і славяне з крыжацкай і мангола-татарскай навваламі.

Грошы і багацце давалі моц і ўладу. Калі ў 30-я гг. XIII ст. Новагародак знаходзіўся ў залежнасці ад Галіцка-Валынскай Русі, то ў другой палове 40-х гг. таго ж стагоддзя новагародцы праводзілі самастойную палітычную лінію ў складаных міждзяржаўных стасунках у памежным балта-славянскім рэгіёне.

Усе абставіны палітычнай барацьбы ў нёманска-вілейскім арэале неабходна разгледзець з этнагеаграфічных пазіцый, якія не супадалі з нашымі сённяшнімі ўяўленнямі. Новагародскае княства займала абшары вакол сваёй сталіцы ў самым верхнім Панямонні. Найбольш спрэчак сярод гісторыкаў ідзе вакол лакалізацыі старажытнай Літвы. Літва першай паловы XIII ст., паводле меркавання большасці навукоўцаў, размяшчалася на балта-ўсходнеславянскім памежжы, убіраючы ў сябе землі сучаснай Паўднёва-Усходняй Літвы і Паўночна-Заходняй Беларусі (раёны Віленска-Трокскага і Ашмяна-Крэўскага арэалаў). Пазней, калі гэты геаграфічна-этнічны асяродак даў назву новай дзяржаве – Вялікаму Княству Літоўскаму, яго назва тэрытарыяльна пашырылася. Паводле пісьмовых крыніц XV–XVI стст., мяжа Літвы з Жамойціяй праходзіла па рацэ Нявежы, з Руссю Літва межавала паміж Браславам і Дзісной, далей на ўсходзе граніца ішла па Бярэзіне, дзе ніжэй Барысава зварочвала на паўднёвы захад, працягвалася на поўдні на ўзроўні Слуцка і Капыля да сучасных Ляхавічаў, Баранавічаў, Косава, Бярозы. Прыкладна на сярэдзіну XIII ст. у гэтым пазнейшым літоўскім арэале XV–XVI стст. вылучаліся такія балцкія адзінкі, як Дзяволтва, Нальшаны, Аўкштота. Апошняя займала тэрыторыю на поўдзень ад сярэдняга цячэння Нёмана і ў нізоўях Віліі. Гістарычная балцкая вобласць Дзяволтва размяшчалася ў сярэднім цячэнні Віліі ў раёне былога г. Вількаміра (на паўночным захадзе ад Вільні). Нальшаны займалі тэрыторыю сучаснай паўночна-заходняй часткі Беларусі. Адна з нямецкіх хронік называе Крэва сталіцай Нальшанаў. Жамойція (Жэмайты, Жмудзь), якая мела свой асобны моўны дыялект, размяшчалася ў ніжнім цячэнні Нёмана (у сучасны момант – на захадзе Літвы).

Асноўныя падзеі, што паклалі пачатак Літоўскай дзяржаве, разгортваліся ў Верхнім Панямонні. Першым князем – прэтэндэнтам на ролю яе стваральніка выступіў літоўскі князь Міндоўг. Крыжацкія крыніцы, сярод якіх важнае месца займае «Хроніка Лівоніі» Генрыха Латвійскага, неаднойчы згадваюць, што першы вялікі князь ВКЛ паходзіў з роду аднаго з вярхоўных уладароў – кунігасаў – Літвы, найбольш верагодна Даўгерда. Нарадзіўся ён, хутчэй за ўсё, на рубяжы XII і XIII стст., бо першы раз узгадваецца як малады палітычны дзеяч у летапісных крыніцах пад 1219 г. Галіцка-Валынскі летапіс паведамляе, што ў тым годзе быў заключаны сумесны мірны дагавор паміж лідарамі Уладзіміра-Валынскага княства Данілам Галіцкім і Васількам ды балцкімі «старэйшымі» князямі з Жамойціі, Дзяволтвы, Літвы, а таксама прадстаўнікамі найзнатнейшых родаў Рушкавічаў і Булевічаў. Сярод пяці літоўскіх князёў чацвёртым значыўся Міндоўг. Там жа ён згадваецца як выкрадальнік чужых жонак. Так, ён пазабіваў трох братоў Булевічаў і ў аднаго з іх, Вішымунта, «жену его поял».

На працягу наступных дзесяцігоддзяў летапісы не ўпамінаюць імя Міндоўга. Аднак ужо ў 1235 г. гэты кунігас паўстае як адзінаасобны ўладар Літвы ці большай яе часткі. Так, фраза Галіцка-Валынскага летапісу: «По том же лете (1235 г. – *Аўт.*). Данил же возведе на Конрада (Мазавецкага. – *Аўт.*) Литву Миндога, Изяслава Новгородьского» – сведчыць аб тым, што літоўскі князь быў саюзнікам ці васалам Галіцка-Валынскай Русі і меў цесныя кантакты з Новагародскай зямлёю. Узаемападтрымка паміж лідарамі Галіцка-Валынскага княства і Літвы працягвалася да другой паловы 40-х гг. XIII ст. Яшчэ ў 1245 г. Міндоўг дапамагаў Данілу Галіцкаму ў барацьбе з чарнігаўскім князем Расціславам.

На працягу 1246–1249 гг. Міндоўг умацаваўся ў рэгіёне. Ён падпарадкаваў Новагародскую зямлю, захапіў уладанні сваіх пляменнікаў Эдзівіда і Таўцівіла. Па дапамогу да яго ў барацьбе супраць крыжакоў звярнуліся куршы. Літоўскі ўладар наладзіў выправу супраць еўрапейскіх агрэсараў, але яна аказалася няўдалай. Рыцары атрымалі перамогу, а Міндоўг быў вымушаны ратавацца ўцёкамі «во град именем Ворута» (другі варыянт – Рута).

Супраць узмоцненага літоўскага князя ўтварылася кааліцыя, якая складалася з пакрыўджаных пляменнікаў. Таўцівіл звярнуўся па дапамогу да «Андрееви, мастеру рижьску», жамойцкага кунігаса Выкінта, галіцкага правіцеля Данілы Раманавіча, Лівонскага ордэна і рыжскага арцыбіскупства.

У небяспечных абставінах Міндоўгу прыйшлося аператыўна шукаць выхад. Па-першае, ён прыняў запрашэнне ўзначаліць уладу ў Новагародку, куды перабраўся са сваімі прыбліжанымі і войскам. Па пазнейшых звестках (XVII ст.), там ён ахрысціўся ў праваслаўе, але гэта не пацверджана раннімі крыніцамі. Міндоўг звярнуўся да магістра Лівонскага ордэна Андрэя Сцірланда, каб той падтрымаў яго. Падмацоўваў сваю просьбу Міндоўг «дарми многими… послал бо бе злата много и сребра, и сосуды серебренни и златыи и красныи и коне многы» з дадатковай умовай, што калі магістр заб'е ці прагоніць Таўцівіла – яго канкурэнта, то атрымае яшчэ большыя багацці. На гэту прапанову Міндоўг атрымаў адказ з Рыгі: «Не можеши избавлен бытии» ад сваіх вечных, незлічоных супраціўнікаў, «аще не послеши к папе и приимеши крещения, не одолеши врагу. Дружбу имею к тебе».

У князя Літвы дзейснай падтрымкі практычна не існавала. Ён пайшоў на прамы кантакт з Рымам у 1250–1251 гг. і прыняў заходнюю веру Хрыстову. Але, як заўважае аўтар Галіцка-Валынскага летапісу, «крещение же его льстиво бысть». Гэты балцкі лідар, нягледзячы на сваё хрышчэнне, «богом своим жряше (прыносіў ахвяры. – *Аўт.*), и мёртвых телеса сожигаше, и поганьство свое яве творяше».

Тым не менш прыняцце каталіцтва на некаторы час нейтралізавала агрэсію на заходніх суседзяў, што ўдала выкарыстаў тагачасны князь Новагародка. З дапамогай сілы Міндоўг адваяваў для сябе Літву, аб'яднаўшы яе з Новагародкам. Як адзначае Іпацьеўскі летапіс, гэты ўжо слынны ў балта-славянскіх землях кунігас «Литву заня, поимана вся земля Литовская».

Добра разумеючы, што гэты крок будзе не даспадобы магутным галіцка-валынскім князям, Міндоўг працягнуў пошук падтрымкі на Захадзе. Пасля прыняцця каталіцтва ён дамогся каранацыі. У 1253 г. (па іншых звестках, у 1252 г.) «великий князь литовский Миндовг коронован бысть на кролевство Литовское в Новогродку, за благословением папы Инокентия». У гонар каранацыі быў наладжаны баль, на які запрашаліся шматлікія госці з блізкага і далёкага замежжа. Лівонскі магістр Андрэй Сцірланд удзельнічаў у каранацыі. Холмскі біскуп Генрых, «в Прусех кардинал папежский», паклаў на галаву Міндоўга карону Яго Вялікасці караля.

Але за проста так карона папам рымскім Інакенціем IV не давалася. Міндоўгу давялося адмовіцца ад прэтэнзій на валоданне Жамойціяй, саступіць Ордэну права на панаванне ў Нальшанах і Дзяволтве. Праўда, князь лічыў гэта частковай саступкай. Па меркаванні літоўскага ўладара, трэба было спыніць крыжацкі ўціск і зрабіць заходніх суседзяў часовымі саюзнікамі ў супрацьстаянні з галічанамі ды валынянамі. Дзеля захавання міру з поўднем каранаваны Міндоўг аддаў ва ўладанне сыну Данілы Галіцкага Раману Новагародак на ўмовах васальнай залежнасці, а сваю дачку выдаў замуж за другога сына Данілы – Шварна.

Аднак надзеі Міндоўга на мір не здзейсніліся. Тройчы абрушвалася моц галіцка-валынскага войска, якое было падтрымана шматлікімі балцкімі кунігасамі, а таксама дружынамі Пінскага княства, на землі толькі што створанай маладой дзяржавы. Войскі Данілы Галіцкага прынеслі рабаванні і гвалт на землі Літвы і Новагародчыны. Як адзначае Галіцка-Валынскі летапіс, нязваныя «госці» з поўдня «плениша всю землю Новгородскую».

## ПАЛІТЫКА КНЯЗЁЎ ВОЙШАЛКА І ТРАЙДЗЕНЯ

Няўдачы, што пачалі пераследаваць Міндоўга, выклікалі незадаволенасць у баярскім асяродку новагародцаў. У хуткім часе на княжацкі пасад быў запрошаны сын Міндоўга – Войшалк. Гэта асоба, паводле трактоўкі ў блізкіх да таго часу крыніцах, даволі супярэчлівая. З аднаго боку, ён быў жорсткім тыранам (праўда, толькі пакуль прытрымліваўся язычніцтва), аб чым сведчыць Іпацьеўскі летапіс: «Войшелк же нача княжити в Новегородце, в поганьстве буда, и нача проливати крови много: убивашеть бо на всяк по три по четыри;

которого же дни не убьяшеть кого, печаловашеть тогда, колиже убьяшеть кого, тогда весел бяшеть». Але, паводле летапісу, неўзабаве на сына Міндоўга сышло азарэнне, «вниде страх божий во сердце его, помыслив собе хотя прияти святое крещение; и крестися ту в Новегородце». З гэтага моманту Войшалк прыняў «мниский чин» і адышоў ад свецкага жыцця. Невядома, ці быў гэта палітычны крок або сапраўды душэўны парыў. Тым не менш літоўскі князь да канца жыцця заставаўся прыхільнікам усходняга хрысціянства. У 1265 г. Войшалк нават спрабаваў ахрысціць у праваслаўе падуладныя яму балцкія землі. З другога боку, прыняцце ўсходняй Хрыстовай веры адным з літоўскіх лідараў дыктавалася складанымі палітычнымі рэаліямі. Вайна маладой літоўска-навагародскай дзяржавы з Галіцка-Валынскім княствам, якая працягвалася з 1248 па 1254 г., закончылася неспрыяльна для першай. Яна практычна змяніла палітычную сітуацыю ў Панямонні. Князі Раманавічы – Даніла Галіцкі і Васілька – узмацнілі тут сваю ўладу. З гэтым Войшалку трэба было лічыцца і шукаць замірэння з паўднёвымі суседзямі.

Саюз Навагародка з моцнай Галіцка-Валынскай Руссю базаваўся на значных саступках на карысць апошняй. Улада ў сталічным панямонскім цэнтры аддавалася аднаму з сыноў галіцкага князя. Даніла патрабаваў паставіць на чале Навагародскай зямлі Шварна, але той быў мужам сястры Войшалка і прэтэндаваў на спадчынныя ўладарныя правы. Таму Войшалк настойваў на лідарстве ў Верхнім Панямонні другога сына Данілы – Рамана. Урэшце галіцкі князь згадзіўся на гэта. Навагародскім князем стаў Раман. Ад імя Міндоўга ён пачаў валодаць сталічным горадам, а Войшалк ад свайго імя падараваў яму Слонім, Ваўкавыск ды іншыя панямонскія землі, якімі сам Міндоўг кіраваў да 1254 г.

Зрабіўшы значныя палітыка-тэрытарыяльныя саступкі, Войшалк дамогся галоўнага – недапушчэння поўнай інкарпарацыі Панямоння ў склад Галіцка-Валынскай Русі. Сістэма палітычнай улады тут не змянілася, памяняліся толькі галоўныя дзеючыя асобы. Такім чынам, закладзенае ядро новай дзяржаўнасці ў панямонскім рэгіёне захавалася.

Праўда, Войшалк, якому тады быў 31 год, на пэўны час сышоў з палітычнай арэны. Ён мусіў адправіцца на пражыванне ў Галіцка-Валынскае княства пад нагляд князя Данілы і тры гады правёў у Палонінскім манастыры. Сваім манаскім паслушэнствам ён пераканаў галіцка-валынскіх палітыкаў, што ўжо не вернецца ў актыўнае свецкае жыццё. Пасля трохгадовага затачэння Войшалк папрасіўся ў паломніцтва на Афон. Атрымаўшы дазвол, ён рушыў у святы шлях, але «не может дойти до Святей Горе, зане мятежь бысть велик тогда в тых землях». Пасля вяртання на Галіччыну літоўскі манах-хрысціянін звярнуўся да Данілы Галіцкага з прапановай вяртання яго

на радзіму і заснаванне пад Новагародкам праваслаўнага манастыра. Вярхоўны ўладар Галіцка-Валынскага княства згадзіўся. У 1258 г. Войшалк з манахамі, што былі адабраны ў Палонінскім манастыры, вярнуўся на Навагародчыну і заснаваў у Лаўрышаве (20 км ад Новагародка) «собе манастырь на реце Немне, межи Литвою и Новымгородком, и ту живяше».

Але палітычная стабільнасць у панямонскім рэгіёне была вельмі хісткай. У 1258 г. з ініцыятывы мангола-татарскай Арды, ад якой Галіцка-Валынская дзяржава была залежная, шматлікае татарскае войска нечакана з'явілася на Валыні і прымусіла князя Данілу падначаліцца хану Бурундаю і ісці выправай на Літву. Тое было зусім не ў інтарэсах Галіцка-Валынскага княства, бо рушыла ўсю пабудаваную на прынцыпах васалітэту сістэму адносін гэтай дзяржавы з панямонскім дзяржаўным асяродкам. Але Бурундай катэгарычна заявіў: «Иду на Литву. Оже еси мирен, пойди со мною». Даніла Раманавіч не мог аслухацца, але сам у выправу на Новагародскія землі і Літву не пайшоў, адправіўшы туды свайго брата Васільку, які адзначыўся ў гэтым рабаўнічым паходзе. Паводле Галіцка-Валынскага летапісу, «Василкови же едущу по Бурундаи одиному по Литовской земле, обрет негде Литву, избив ю». Надалей ён ва ўсім дапамагаў Бурундаю, «и воеваше ездя с ним».

Татара-валынскі паход на Панямонне вялікіх знешнепалітычных дывідэндаў не прынёс, а, наадварот, паслабіў былую моц галіцка-валынскіх князёў у гэтым рэгіёне. Больш за тое, у час гэтай спусташальнай выправы недзе знік сын Данілы, Раман, валадар Новагародка (магчыма, не без удзелу ў гэтай справе былога панямонскага лідара Войшалка). Васілька Раманавіч з войскам шукаў яго па ўсёй Літве, але беспаспяхова. Хутчэй за ўсё, лёс яго быў трагічным. Войшалк жа вярнуў сабе страчаны пасад новагародскага князя.

У гэты час абвастрыліся адносіны паміж Міндоўгам – правадыром Літвы – і яго сынам Войшалкам – князем Новагародка. У барацьбу за ўладу ўключыўся жамойцкі князь Транята. Увосень 1263 г., калі войска Міндоўга знаходзілася ў паходзе на Бранск, валадар Літвы і два яго малодшыя сыны (Рукля і Ралэкія) былі забіты змоўшчыкамі, на чале якіх стаяў Транята. Здзейснена змова была рукамі нальшанскага князя Даўмонта, на што ў яго былі асабістыя прычыны. Калі вялікі князь Міндоўг чарговы раз аўдавеў, ён склікаў на пахаванне ўсіх родных, у тым ліку сястру сваёй жонкі, мужам якой з'яўляўся нальшанскі князь. Князь літоўскі звярнуўся да яе, згодна сведчанню аўтара Іпацьеўскага летапісу: «Сестра твоя, умираючи, велела ми тя пояти за ея; тако рекла, ать иная детий не цвелить». Сваёй уладай гаспадар Літвы гвалтоўна прысвоіў законную жонку нальшанскага князя.

Таму Даўмонт бязлітасціва здзейсніў смяротны прысуд над сваім сваяком і яго сынамі, што жылі разам з бацькам. Аднак Войшалк забіты не быў, бо знаходзіўся ў Новагародку.

Пасля гэтай сямейнай драмы прэтэндэнт на першынства ў рэгіёне жамойцкі князь Транята вырашыў знішчыць усіх патэнцыяльных канкурэнтаў, каб тыя не змаглі пазбавіць яго адзінаўласнага ўладарства. Паводле Іпацьеўскага летапісу, «Тренята нача княжити во всей земле Литовьской и в Жемоти».

Самым дальнабачным у гэтай сітуацыі быў Войшалк, які «убоявся... и бежа до Пиньска». Неабачлівым аказаўся полацкі князь Таўцівіл. Полацкія баяры не хацелі стаяць убаку ад барацьбы за ўладу ў Панямонні. Калі іх стаўленік атрымаў запрашэнне ад свайго суродзіча Траняты: «Брате! Приеди семо, розделиве землю и добыток Миндовгов», – палачане накіравалі Таўцівіла з дружынай да Літвы, каб забіць новапасаджанага вялікага князя і авалодаць землямі Літвы ды Жамойціі. Але той жа Транята запрашаў свайго брата, каб звесці рахункі з ім. Мэты былі аднолькавыя. Аднак жамойцкага лідара аб задуме Таўцівіла папярэдзіў полацкі баярын-здраднік Пракопій. Пасля гэтага «Тренята же попередив и убив Товтивила и нача княжити один».

Трыумф Траняты быў нядоўгім: у тым жа 1264 г. ён быў зарэзаны чатырма конюхамі Міндоўга. Хутчэй за ўсё, арганізатарам гэтага забойства з'яўляўся Войшалк. Менавіта ён выступіў галоўнай асобай літоўска-рускай драмы пачатку 60-х гг. XIII ст.: «Войшелк пойде с Пиняны к Новугороду, и оттоле поя со собою Новгородце и пойде в Литву княжить; Литва же вся прияша и с радостью, своего господичица». Войшалк знішчыў уплывовых палітычных дзеячаў пры двары свайго бацькі Міндоўга, сярод якіх летапіс згадвае Астафія Канстанцінавіча. Каб забяспечыць бяспеку сваёй дзяржавы ад паўднёвага суседа, князь прызнаў сябе васалам Васількі Раманавіча (памёр у 1269 ці 1271 г.; Даніла Раманавіч Галіцкі – у 1264 г.) і назваў яго сваім бацькам, а на новагародскі пасад запрасіў сына Данілы, Шварна, які быў жанаты з роднай сястрой Войшалка. Справа ў тым, што гэтая пара не мела спадкаемцаў і Войшалк не баяўся згубіць уладу. У любым выпадку пасля смерці Шварна ён прэтэндаваў на паўнавартаснае гаспадарства як у Літве, так і Новагародку.

Пасля здзейсненых захадаў Войшалк атрымаў у падтрымку да свайго войска валынскую дружыну і ў 1264–1265 гг. ім былі зроблены паходы на Дзяволтву і Нальшаны, дзе «городы же поимав, и вороги своя избив», далучыў гэтыя землі да княства. Забойца ж Міндоўга, нальшанскі князь

Даўмонт, збег са сваім родам і дварам у Пскоў, дзе на доўгі час заняў пасаду служылага князя. Ён прыняў праваслаўе і імя Цімафей. У будучым быў кананізаваны хрысціянскай царквой. З'яўляўся бацькам Давыда Гарадзенскага.

У княжацкіх планах Войшалка была хрысціянізацыя Літвы па праваслаўным узоры. Дзеля здзяйснення гэтай задумы ён звярнуўся ў Пскоў па святароў. Аднак Даўмонт не пайшоў на гэты крок, і Войшалк не дачакаўся ад паўночнага суседа праваслаўных служыцеляў хрысціянскай веры. Тады князь Літвы вырашыў наведаць з зададзенай мэтай Палонінскі манастыр, дзе служыў яго настаўнік айцец Грыгорый. Разам з тым ён пайшоў на радыкальную меру: пакінуў сваё княжанне Шварну Данілавічу, «а сам опять восхоте прияти мниский чин». Той «же моляшеться ему повелику, абы еще княжил с ним в Литве: но Войшелк не хотяшеть, тако река: "Согрешил есмь много перед богом и человекы, ты княжи, а земля ть опасена"» (Абаронена, выратавана. – *Аўт.*).

Літоўска-верхнянёманская зямля сапраўды не знаходзілася пад пагрозай, але жыццё князя-манаха было ў небяспецы. Леў Данілавіч захаваў на Войшалка крыўду, што той «дал землю Литовскую брату яго Шваркови». Калі галіцка-валынскі князь даведаўся аб прыездзе на Валынь былога літоўскага лідара, ён звярнуўся з просьбай да свайго дзядзькі Васількі, каб той арганізаваў сустрэчу ўтрох. Брат Данілы Галіцкага накіраваў Войшалку прапанову: «Прислал ко мне Лев, а быхомся сняли (сустрэліся. – *Аўт.*); а не бойся ничего же». У гэтым валынскім цэнтры яны ўтрох былі запрошаны да нейкага немца Мэркалта, дзе сустрэліся і «начаша обедати, пити, и веселитися». У хуткім часе Васілька Раманавіч з'ехаў дахаты на начлег. Войшалк скіраваўся на адпачынак у месца свайго жыхарства – манастыр Св. Міхаіла. Следам за ім рушыў Леў Данілавіч, які пачаў «молвити Войшелкови: "Куме! Напиемся"». Іпацьеўскі летапіс зафіксаваў абсалютна недарэчнае забойства літоўскага князя. Яго далёкі сваяк Леў Галіцка-Валынскі, будучы на падпітку і крыўдуючы на Войшалка за дараванне Шварну зямлі літоўскай, выхапіў шаблю і забіў літоўскага князя.

Наступныя гады ў Літве і Навагародку княжыў сын Данілы Галіцкага – Шварн. Але ў 1270 г. ён памёр, і «нача княжити в Литве» яцвяжскі князь Трайдзень (1270–1282), які ўвайшоў у гісторыю з рознымі летапіснымі характарыстыкамі. Паводле ацэнкі Галіцка-Валынскага летапісу, быў ён «безаконьный, проклятый, немилостивый…». Падобная характарыстыка новага князя Літвы з боку паўднёвых суседзяў заканамерная, бо ён здолеў абараніць маладую панямонскую краіну ад знешняга ўціску. Таму, паводле вызначэння «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай», Трайдзень «панство

порадие постановивши и границы от наездов княжат руских и крижацких отвсюль опатривши (забяспечыўшы абаронай. – *Аўт.*), з великим страхом неприятелем посторонним пановал». Так, літоўскі князь яцвяжскага паходжання Трайдзень стабілізаваў за час свайго 12-гадовага княжання ўнутрыдзяржаўны стан, захаваў незалежнасць Літвы, працягнуў аб'яднаўчую палітыку Міндоўга і Войшалка.

На пачатку свайго княжання Трайдзень падзяліў галіцка-валынскіх князёў на ворагаў і сяброў. З першымі (валынскі князь Уладзімір Васількавіч і яго паплечнікі) ён ваяваў. Дарэчы, у абарону ад нападаў Трайдзеневых вайсковых злучэнняў, паводле Іпацьеўскага летапісу, паміж 1276 і 1288 гг. на памежжы балта-славянскай дзяржавы і Галіцка-Валынскай Русі дойлідам Алексам па загадзе таго ж Уладзіміра Васількавіча была пабудавана Камянецкая вежа.

З другім (Львом Данілавічам) князь літоўскі першыя гады свайго гаспадарання «живаше во величе любови, шлюче многа дары межи собою». Але тое Трайдзеню было патрэбна дзеля ўмацавання ўнутрыдзяржаўнай улады. За час княжання ім былі далучаны да першапачатковых тэрыторый краіны землі яцвягаў, земгалаў, селаў. Трайдзень даваў прытулак уцекачам з Прусіі, дзе паўстанне супраць крыжакоў ішло на заняпад, а ў 1276 г. было задушана. Рассяляліся яны ў ваколіцах Гародні і Слоніма, дзе і сёння можна сустрэць досыць вялікую колькасць вёсак з назвамі Прусаўшчызна, Прусакі, Прусы.

У 1274 г. Трайдзень паслаў сваё вайсковае злучэнне з Гародні на Драгічын Падляшскі, які належаў Льву Данілавічу. Горад быў захоплены і разрабаваны. Галіцкі князь «посла в татары ко великому царю Меньгаут-Мереви, прося себе помочи у него на Литвоу», аб чым паведамляе Іпацьеўскі летапіс. У 1275 г. адбыўся сумесны татарска-галіцка-валынскі паход на Навагародак і Літву, падтрыманы Бранскам, Смаленскам ды «инне князии заднепровские». Але значнага поспеху ён не меў, пацярпелі толькі ваколіцы першай сталіцы Літоўскай дзяржавы. У 1277 г. татарскай Ардой быў ініцыяваны новы паход у Панямонне на чале з ханам Мамшынам. Татарамі быў разрабаваны Навагародак. Галіцка-валынскае войска пайшло на Гародню, але з дапамогай прусаў гэтая выправа была прыпынена. Гарадняне адбілі штурм.

Меліся ў Трайдзеня значныя поспехі і ў супрацьстаянні з крыжакамі. У 1277 г. ім рабіліся спробы авалодаць новай крэпасцю на Заходняй Дзвіне Дынабургам (сучасным Даўгаўпілсам). Першая спроба была няўдалай, але тут адбылося саюзніцкае яднанне Трайдзеневых і полацкіх дружын. У 1279 г. князь Літвы нанёс сур'ёзнае паражэнне войскам Лівонскага

ордэна пад Ашэрдам у Курляндыі, а ўрэшце захапіў Герцыке, тым самым адрэзаўшы Дынабург ад метраполіі. У гэтай сітуацыі крыжакам давялося зрабіць вымушаны абмен новай дзвінскай цвярдыні на Герцыке.

Добра разумеючы, што войнаў з крыжакамі не пазбавіцца, Трайдзень шукаў саюзнікаў. З гэтай нагоды ім быў здзейснены дынастычны мазавецкі варыянт. У 1279 г. князь Мазовіі Баляслаў ажаніўся з дачкой Трайдзеня Гайдамундай, якая, прыняўшы хрысціянства, атрымала імя Сафія. Сам літоўскі князь у тым жа годзе ўзяў сабе ў жонкі мазавецкую княгіню Ганну, сястру мазавецкага князя Конрада Земавітавіча. Трайдзень выходзіў на міжнародную арэну, але яго ворагі не хацелі гэтага дапусціць. Сын нальшанскага князя Даўмонта, які быў ужо Цімафеем Пскоўскім, паслаў на забойства ўладара Літвы сваіх памагатых – Стуманда і Гірдзела. У 1282 г. Трайдзеня не стала.

Гісторыя балта-ўсходнеславянскай дзяржавы ў 80–90-х гг. XIII ст. вельмі цьмяная. Называюцца ў рускіх летапісах і нямецкіх хроніках літоўскія князі-браты Будзівід і Будзікід, кароль Літвы Бутэгейдэ. Храніст Пётр з Дзюзбурга згадвае ў запісе пад 1291 г. караля Літвы Пукувера – бацьку Віценя.

У апошнія дзесяцігоддзі XIII ст. перад маладой дзяржавай стаяла адна задача: выжыць у атачэнні суседзяў, якія былі не зацікаўлены ў з'яўленні новага палітычнага ўтварэння. З гэтай задачай яна паспяхова справілася, бо станаўленне дзяржаўнасці Літвы прыйшлося на той перыяд, калі гэтаму працэсу Галіцка-Валынскае княства ўжо не магло перашкодзіць, а Тэўтонскі ордэн тое ж зрабіць яшчэ не меў моцы.

Такім чынам, у 50–70-я гг. XIII ст. князі літоўскія і навагародскія Міндоўг, Войшалк і Трайдзень стварылі тое ядро дзяржавы, якое з цягам часу абрастала суседнімі землямі і пераўтварала Княства Літоўскае і Навагародскае ў Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае ды іншых зямель, якое праіснавала 550 гадоў.

# 11 ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XIV ст.

- **Фарміраванне дынастыі**
- **Збіранне зямель Усходняй Еўропы**
- **Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ і яго эвалюцыя**

## ФАРМІРАВАННЕ ДЫНАСТЫІ

Працэсы ў сістэме ВКЛ у XIV ст. звязаны з фарміраваннем манаршай дынастыі. Да ўкняжання вялікага князя Гедыміна ў 1316 г. дзяржаўная палітыка не мела афіцыйнага апелявання да спадчыннасці і традыцыі пераемнасці ўлады ад аднаго прадстаўніка роду да другога. Упершыню мы сустракаемся з тлумачэннем легальнага пераходу ўлады да Гедыміна. Спадчыннасць улады падкрэсліваецца крыніцамі, якія звяртаюць увагу на датычнасць Гедыміна да сям'і Віценя.

Ужо Віцень абапіраўся на прадстаўнікоў сваёй сям'і для замяшчэння суседніх княжацкіх удзельных пасадаў. Так, яго брат Войн у 1326 г. узгадваецца ў якасці князя полацкага. Дагэтуль унітарная дзяржава Віценя не патрабавала шырокага выкарыстання прадстаўнікоў сям'і ў адміністрацыйным кіраванні асобнымі часткамі. Сітуацыя магла змяніцца з уваходам у склад ВКЛ такой буйной тэрытарыяльнай адзінкі, як Полацкае княства (1307).

Прыход да ўлады Гедыміна (1316–1341) і яго актыўная знешняя палітыка запатрабавалі кардынальных змен у адносінах з суседзямі і асобнымі землямі ўнутры дзяржавы. Шлюбная стратэгія вялікага князя разам з яго ваеннымі кампаніямі дазволіла пашырыць тэрыторыю ВКЛ і стварыць плацдарм для збірання зямель Усходняй Еўропы ў склад сваёй дзяржавы.

Гедымін нарадзіўся прыкладна ў сярэдзіне 1270-х гг. і з'яўляўся, верагодна, братам Віценя. Пасля заўчаснай смерці вялікага князя менавіта ён узначаліў ВКЛ і практычна адразу правёў кардынальныя змены ў апараце кіравання падкантрольнымі землямі. На галоўных удзельных княствах мясцовыя князі былі заменены родзічамі-намеснікамі. Яскравым прыкладам з'яўляецца кар'ера князя Давыда, мужа дачкі Гедыміна, які атрымаў Гародню і паўнамоцтвы весці знешнюю палітыку.

У Гедыміна было сем сыноў і шэсць дачок. Дзякуючы заключэнню шлюбаў вялікі князь хутка параднiўся з суседнімі княжацкімі родамі: цвярскім і ўладзімірскім дамамі, мазавецкім і галіцка-валынскім. Кожны з сыноў атрымаў ва ўладанне ўдзельныя княствы, якія знаходзіліся ў сферы інтарэсаў ВКЛ (Любарт ажаніўся з прадстаўніцай галіцка-валынскай дынастыі Данілавічаў і павінен быў атрымаць Валынь і, магчыма, Падолле; Альгерд – Віцебск). Дзеці Гедыміна таксама атрымалі ўладанні (удзелы) у межах ВКЛ, якія з'яўляліся часткай дзяржавы (так Манівіду была выдзелена частка Навагародскага княства). Падзеленыя на дзве групы Гедымінавічы дапамагалі ствараць адміністрацыйную сістэму ВКЛ, пашыралі ўплыў роду на суседнія княствы Усходняй Еўропы.

Падобная сістэма мела толькі адносную стабільнасць. Сітуацыя змянілася пасля смерці манарха (снежань 1341 г.), калі выявіліся супярэчнасці пры спадчыннасці велікакняжацкага пасада. Кожны прадстаўнік роду меў легальныя магчымасці прэтэндаваць на вышэйшую ўладу ў дзяржаве.

Аднак гэта ж і стварала ўмовы для крызісу ўлады ў ВКЛ. Пасля смерці Гедыміна прэтэндэнтаў на вярхоўную ўладу было некалькі. Гэта і актыўны на ўсходнім памежжы Альгерд, і папулярны сярод жамойтаў і куршаў Кейстут, а таксама старэйшыя сыны Нарымунт і Манівід. Яшчэ пры жыцці Гедыміна ўдзелы былі раздадзены сынам, каб умацаваць іх уладу на рэгіянальным узроўні і пабудаваць сувязь з мясцовым баярствам. Так вакольныя з Віленскай зямлі з гарадамі Ашмяны,Ількамір і Браслаў адышлі Яўнуту, Кернава і Слонім – Манівіду, Палессе з Пінскам і Туравам – Нарымунту, Крэва – Альгерду, Берасце і Гародня – Кейстуту. На славянскіх землях пад уплывам мясцовага баярства сыны вялікага князя прымалі хрысціянства і інтэграваліся ў мясцовую палітычную культуру. Сам жа вялікі князь заставаўся язычнікам і пасля смерці быў пахаваны ў адпаведнасці з традыцыйным звычаем у Вільні. Афіцыйным наступнікам Гедыміна і вялікім князем стаў Яўнут. Большасць крыніц указвае, што гэта была воля Гедыміна.

Пасля прыходу да ўлады зімой 1341/42 гг. Яўнут пацвердзіў усе бацькавы наданні братам. Аднак да 1344 г. унутры дзяржавы адбыліся значныя маёмасныя змены. Яўнут скараціў колькасць удзельных княстваў

Гедымінавічаў. Распачалася справа вакол зямель, якія належалі Нарымунту і Манівіду, тэрыторыі не былі пераразмеркаваныя паміж братамі і пераходзілі пад кантроль вялікага князя. Да таго ж было ўзнята пытанне статусу і Полацкага княства і Валыні ў складзе ВКЛ. Верагодна, Яўнут пачаў цэнтралізаваць у сваіх руках дзяржаўную маёмасць, памяншаць удзелы прадстаўнікоў дынастыі.

Пры гэтым перыяд праўлення вялікага князя Яўнута (1341–1345) вызначальны для развіцця сістэмы кіравання дзяржавай і паказальны ў адносінах паміж прадстаўнікамі дынастыі. Пасля смерці жонкі Гедыміна Еўны сярод Гедымінавічаў выспела змова супраць вялікага князя. Афіцыйнай падставай стала нерашучасць дзеянняў Яўнута падчас пагрозы крыжовага паходу ў межы дзяржавы з боку Тэўтонскага ордэна і імператара Яна Люксембургскага зімой 1344/45 гг. Аднак можна сцвярджаць, што галоўная прычына актыўных дзеянняў супраць гаспадара – палітыка абмежавання маёмасці і ўлады Гедымінавічаў, якая была ўспрынята як пагроза дынастыі ў межах ВКЛ. Ні Альгерд, ні Кейстут не маглі дапусціць фарміравання велікакняжацкага дамена на землях Русі Літоўскай (Віленшчына і Навагародчына) і паступовага выціскання з боку Яўнута сваіх братоў па-за межы ВКЛ на пошук «уласных» дзяржаў, як гэта ўжо адбылося з Карыятам Гедымінавічам. Магчыма, смерць маці скасоўвала гарантыі, якія былі дадзены Гедымінавічамі для захавання бацькавай дзяржавы. Ад вялікага князя Яўнута браты чакалі пераразмеркавання тэрыторый удзелаў, а калі гэтага не адбылося, то здзейснілі змову, мэтай якой было адхіленне Яўнута ад улады. Сведчаннем «мірных» намераў з'яўляецца захаванне брату жыцця і наданне яму ў канцы 1340-х гг. удзельнага княства Заслаўскага, інтэграцыя былога вялікага князя ў палітычную структуру ВКЛ, але ўжо ў новым статусе ўдзельнага князя.

Новы вялікі князь Альгерд, са згоды брата Кейстута, захапіў Вільню і захаваў сістэму кіравання свайго бацькі (з вялікім удзелам прадстаўнікоў сям'і). Аднак ён унёс істотныя карэктывы ў ролю родзічаў і іх удзел у сістэме кіравання дзяржавай праз пашырэнне маёмасных і абмежаванне кіроўных функцый. Сыны Альгерда атрымалі свае ўдзелы ў землях ВКЛ. Пачаўся працэс фарміравання прыватных даменаў. Менавіта маёмаснае вылучэнне Кейстута (Трокскае княства) дазволіла вялікаму князю Альгерду знайсці ў дзяржаве надзейную апору для пераўтварэнняў унутры дынастыі.

Сістэма дуумвірату (сукіраўніка, суправіцеля) не з'яўлялася завершанай формай і абапіралася пераважна на вылучэнне адных частак дзяржавы ў асобныя адміністрацыйна-ваенныя часткі. Альгерд вымушаны быў супрацоўнічаць з братам Кейстутам і сынам Андрэем Полацкім, якія мелі ўнутры ВКЛ свае ўласныя дружыны. Астатнія Альгердавічы і Гедымінавічы

павінны былі ісці са сваімі войскамі ў склад «раці літоўскай» – агульнадзяржаўнага войска пад кіраўніцтвам вялікага князя. Таксама выглядае натуральным вылучэнне пэўных сфер адказнасці за памежную палітыку. Кейстут адказваў за кантакты з Ордэнам і Жамойціяй, а Андрэй – з Псковам і Ноўгарадам. Удзел у палітычных справах дзяцей Альгерда залежаў ад іх узросту: дзеці ад першай жонкі, віцебскай княжны, былі задзейнічаны ў сістэме кіравання ўжо з 1350-х гг., а інфармацыя пра самастойнае выкананне дзяржаўных прызначэнняў дзецьмі ад другой жонкі, Ульяны Цвярской, у летапіснай традыцыі захавана мінімальна, як і ўключэнне ў гэткую ж сферу іншых Гедымінавічаў, у тым ліку і дзяцей Кейстута.

Вядучыя ролі Кейстута і Андрэя на ўнутрыпалітычным фронце былі гарантыяй улады для вялікага князя Альгерда. Яго палітычная праграма прадугледжвала адасабленне ўсіх Гедымінавічаў ад актыўнай палітыкі праз перадачу ім і іх нашчадкам буйных зямельных уладанняў. Аднак гэта не тычылася Кейстута. Тое, што ўваходзіла ў склад ВКЛ, трапляла ў Віленскае ці Трокскае княства. Але былі і сумесныя валоданні, як, напрыклад, Бабруйск, калі скарб і войска папаўняла з воласці кожнае са сталічных княстваў пароўну.

Палітыка наданняў унутры дынастыі была рознай. Прадстаўнікі Альгердавічаў і часткова новыя адгалінаванні Гедымінавічаў атрымлівалі ўдзелы таксама ў Русі Літоўскай і «землях прыслухаючых» (далучаных). Падобная тактыка перашкаджала прадстаўнікам дынастыі асіміляваццa, пераходзіць на іншыя ідэйныя пазіцыі (рэлігія, палітычная культура, ідэнтыфікацыя), прывязвала іх да сталічнага рэгіёна, а адпаведна да агульнадзяржаўнай палітычнай ідэнтыфікацыі як «князі літоўскія». Відавочна, што працэс абрусення прадстаўнікоў дынастыі ўвайшоў у сутыкненне з поглядамі палітычнай эліты. Можна прывесці прыклад захавання афіцыйнай рэлігійнай ідэнтыфікацыі язычніцтва манархаў. Хоць вялікія князі ў сваіх асабістых рэлігійных пачуццях маглі ёй і не адпавядаць (адразу пасля ўкняжання Альгерда пачалося ўзвядзенне шэрагу хрысціянскіх храмаў у сталіцы дзяржавы – Вільні).

Ключавым элементам слабасці дзяржавы ў XIV ст. з'явілася адсутнасць сістэмы спадчыннасці велікакняжацкага прастола. Смерць манарха, нават пры аб'ектыўным абмежаванні вялікай колькасці прэтэндэнтаў і гарантах легітымнасці новага гаспадара з боку ўплывовых прадстаўнікоў дынастыі, не дазваляла стабілізаваць саму працэдуру. Вялікі князь Альгерд перад сконам мог вызначыць свайго пераемніка, магчымая кандыдатура магла быць зацверджана вузкім колам сваякоў, але пасля смерці манарха сітуацыя мянялася.

Прыход да ўлады вялікага князя Ягайлы выглядае лагічным пры ўмове прыняцця рашэння хворым Альгердам і прысутнасці асноўных уплывовых асоб яго двара – Кейстута і жонкі Ульяны. Кандыдатура Ягайлы пакідала статус-кво ў сістэме кіравання ВКЛ і размеркаванні маёмасна-ўладных функцый, забяспечвала ўзмацненне ўлады Кейстута праз апякунства над сваім пляменнікам і вылучэнне Кейстутавічаў перад іншымі Гедымінавічамі ў будучым. Аднак усё гэта заклала вялікую небяспеку – адлучала ад улады старэйшых дзяцей Альгерда, моцных палітычнымі сувязямі ў рэгіёне і забяспечаных буйнымі ўдзеламі.

Кейстут мінімальна ўмешваўся ва ўнутраную палітыку вялікага князя Ягайлы, а той не імкнуўся шукаць кампраміс са сваімі старэйшымі братамі. Раней ці пазней праблема захавання свайго палітычнага статусу і маёмасці ў дзяржаве павінна была кансалідаваць апазіцыйных Ягайлу Гедымінавічаў і выбухнуць адкрытым ваенна-палітычным канфліктам.

## ЗБІРАННЕ ЗЯМЕЛЬ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

Фарміраванне дзяржаўна-палітычнай сістэмы ВКЛ пачалося яшчэ ў час кіравання вялікага князя Віценя. Яе відавочнымі навацыямі было раздзяленне дзяржавы на дзве часткі – зямлю Літоўскую (Русь Літоўскую, Lithuania propria) і «землі прыслухаючыя»; злучэнне асобных зямель пад уладай аднаго манарха, але з рознымі адміністрацыйнымі апаратамі і статусам мясцовых жыхароў.

Працэс уключэння і інтэграцыі асобных зямель Усходняй Еўропы ў склад ВКЛ быў дастаткова складаным. За 120 гадоў паўстала тэрытарыяльна найбуйнейшая дзяржава, якая аб'яднала этнічна і рэлігійна розныя ў сваім развіцці часткі, сфарміравала сістэму кіравання, адаптавала здабыткі візантыйскай, а затым і заходнееўрапейскай палітычнай культуры. Працэс стварэння дзяржаўнага апарату прайшоў эвалюцыю ад княжацка-радавога кіравання да фарміравання вертыкалі ўлады на прынцыпах супадпарадкавання ўрадаў непасрэдна ўладзе манарха (гаспадара).

Уваходжанне Полацка і Полацкай зямлі ў склад ВКЛ у 1307 г. адкрыла новую старонку ў палітыцы дзяржавы. Фактычна ВКЛ станавілася гарантам незалежнасці славянскіх зямель Усходняй Еўропы ад Ордэна ці мангола-татарскіх баскакаў і падуладных ім іншых рускіх князёў. Можна казаць пра ідэйна-сімвалічны матыў велікакняжацкіх дзеянняў, што прадугледжваў далучэнне знакавых зямель былой Русі, першае месца сярод якіх займаў горад Кіеў – сталіца мітраполіі і палітычны цэнтр рэгіёна.

На розных этапах адбывалася далучэнне зямель да ВКЛ былой Русі: удзелаў былога Турава-Пінскага княства і Полацкага княства. ВКЛ прасоўвалася ў палітычна слабыя землі Валыні, Віцебскага і Смаленскага княстваў, на незанятыя пасады цэнтральна-еўрапейскіх дзяржаў, паступова ўваходзіла ў канфрантацыю з буйнымі дамінантамі ў рэгіёне Усходняй Еўропы – Залатой Ардой, якая кантралявала Севершчыну і Кіеўшчыну, а таксама з Каралеўствам Польскім і Мазавецкім княствам. Праз партнёрства з Цвярскім княствам ВКЛ атрымала падкантрольныя землі Ноўгарада, Пскова, Верхняокскіх княстваў. Збіранне зямель завяршылася вырашэннем тэрытарыяльных пытанняў з Тэўтонскім ордэнам за кантроль над насельніцтвам Жамойціі і зямель куршаў, якое зацягнулася да 20-х гг. XV ст.

Тэрытарыяльнае пашырэнне ВКЛ падчас кіравання вялікіх князёў Гедыміна і Альгерда было абумоўлена карэннай зменай кіруючай эліты зямель Усходняй Еўропы. Згасалі мясцовыя княжацкія роды, удзельныя княствы пераходзілі пад апеку больш моцных суседніх дзяржаў – Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства. Адчуваўся ўплыў Залатой Арды на стасункі княстваў Усходняй Еўропы праз падтрымку канкурэнцыі паміж вялікімі княжаннямі, сярод якіх яскрава прамалёўвалася барацьба за лідарства паміж Цвярскім і Маскоўскім. У гэтых умовах адбывалася фарміраванне новых сувязей, у якіх ВКЛ паступова выйшла на ўзровень ваенна-палітычнага партнёра, а затым і сюзерэна для дзяржаўных фарміраванняў Ноўгарада, Пскова, Смаленскага княства, Валыні, Кіеўшчыны і г. д. Праз згасанне мясцовых княжацкіх родаў адбыўся паступовы пераход асобных удзельных княстваў у склад ВКЛ. Прадстаўнікі дынастыі вялікіх князёў літоўскіх станавіліся канкурэнтназдольнымі ў параўнанні з Рурыкавічамі і Пястамі, а таксама выступалі аўтарытэтнымі саюзнікамі ў барацьбе з ордэнскай экспансіяй на землі Усходняй Прыбалтыкі.

Пашырэнню ўлады вялікіх князёў на славянскія землі папярэднічала ўключэнне іх у арбіту шлюбных і ваенна-саюзніцкіх адносін, а згасанне мясцовых дынастый прыводзіла да мяккай інтэграцыі ў склад ВКЛ. Так адбыўся пераход улады ў Віцебскім княстве (пасля 1320 г.) і на Валыні (у памежку часу ад 1323 да 1340 г.). Улада спачатку перадавалася прадстаўніку дынастыі ВКЛ – сыну ці брату вялікага князя, а затым сама зямля патрапляла пад уладу гаспадара і магла быць перададзена іншаму Гедымінавічу.

Цікавым выглядае ўключэнне ў склад ВКЛ былога Менскага княства, якое інтэгравалася ў склад дзяржавы па частках. Першапачаткова да роду вялікіх князёў перайшоў сам Менск. Пад 1326 г. узгадваецца апошні ўдзельны князь Васіль, які ўжо быў уключаны ў палітыку ВКЛ і залежаў ад Гедыміна. Да 1346 г. Менск з Лагойскам уваходзілі ўжо ў склад Віленскага

княства (непасрэдна падпарадкоўваюцца вялікаму князю Альгерду). Наступным у склад ВКЛ увайшло дастаткова вялікае Свіслацкае княства. Пасля смерці апошняга вядомага ўдзельнага князя Сямёна ў 1350-я гг. Свіслацкі ўдзел быў значна паменшаны і перададзены пад кіраванне Сямёна Яўнутавіча. Астатнія воласці (напрыклад, Бабруйская) былі падзелены паміж Віленскім і Трокскім княствамі Альгерда і Кейстута. У 1387 г. Свіслач была перададзена Івану-Скіргайлу, а пасля яго смерці апынулася ў складзе дзяржаўных уладанняў.

Асобная група княстваў з другой паловы XIII ст. знаходзілася ў шчыльным кантакце з ВКЛ і прадстаўнікамі пануючай дынастыі. Так, Пінскае княства ўвайшло ў склад ВКЛ у першай чвэрці XIV ст., верагодна, праз згасанне мясцовага роду князёў. Ужо ў 1320 г. зямля належала сыну Гедыміна Нарымунту, а з 1348 г. яго нашчадкам. Таксама ў склад ВКЛ у першай трэці XIV ст. патрапіла і Лагойскае княства. Уваходжанне Ваўкавыскага княства адбылося пасля прыходу да ўлады вялікага князя Гедыміна. Толькі з узыходжаннем на пасад ВКЛ Альгерда і Кейстута землі Ваўкавыскага княства трапілі ў склад Трокскага княства.

Такім чынам, згасанне княжацкіх родаў у памежных з ВКЛ удзельных княствах стварала магчымасць замяшчэння іх прадстаўнікамі пануючай велікакняжацкай дынастыі з паступовым уключэннем тэрыторый у другой палове XIV ст. у склад Трокскага і Віленскага княстваў. З цягам часу на гэтых землях змянялася сістэма кіравання, да ўлады прыходзілі прадстаўнікі мясцовага баярства.

Іншым шляхам уваходжання зямель Усходняй Еўропы ў склад ВКЛ былі ваенныя паходы і ваеннае падпарадкаванне асобных зямель уладзе вялікага князя. У 1356–1359 гг. Альгерд выкарыстаў унутраную барацьбу ў Бранскім княстве, якое ён захапіў і далучыў да ВКЛ. Княжанне было вернута прадстаўніку мясцовага роду Раману Міхайлавічу, але ў 1370 г. перададзена Дзмітрыю Альгердавічу, які кіраваў княствам да 1375 г. Нягледзячы на перамены на княжацкім пасадзе, інкарпарацыя княства ў склад ВКЛ была праведзена. Разам з Браншчынай у склад ВКЛ у 1370–80-я гг. увайшлі Старадуб і Трубчэўск. Такім чынам, памежны з Маскоўскім княствам рэгіён канчаткова ўвайшоў у склад ВКЛ.

У пачатку XIV ст. пачаўся працэс паступовага ўключэння асобных удзелаў Смаленскага княства (Падняпроўя) у склад ВКЛ. Пры князі Іване Аляксандравічы (1313–1358) Смаленск трапіў у сферу уплыву ВКЛ. Князь Святаслаў Іванавіч (1358–1386) імкнуўся да захавання незалежнасці княства, але ў выніку яно страціла значную частку тэрыторыі на карысць ВКЛ. Так, Мсціслаўскае княства было захоплена і далучана да ВКЛ вялікім

князем Альгердам толькі ў 1358 (1359) г. У перыяд кіравання вялікіх князёў Ягайлы і Вітаўта прадстаўнікі дынастыі смаленскіх князёў былі заменены намеснікамі гаспадара.

У пачатку 60-х гг. XIV ст. у склад ВКЛ патрапілі вялікія абшары Кіеўшчыны і Севершчыны. Уключэнне значнай часткі Усходняй Еўропы з горадам Кіевам у склад ВКЛ у другой палове XIV ст. дазволіла вялікім князям заявіць пра сябе як збіральнікаў рускіх зямель і пераемнікаў улады вялікіх кіеўскіх князёў.

## АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ ВКЛ І ЯГО ЭВАЛЮЦЫЯ

У адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле ВКЛ XIV – пачатку XV ст. можна вылучыць чатыры ўзроўні: велікакняжацкі, земскі, удзельна-княжацкі (яшчэ не інтэграваны ў земскую сістэму дзяржавы) і валасны (розны ў асобных рэгіёнах дзяржавы і ў дачыненні да гарадоў ВКЛ). Фарміраванне адміністрацыі на кожным з узроўняў прайшло ў XIV ст. сваю эвалюцыю і падверглася ўплыву як знешніх, так і ўнутраных фактараў. Сярод апошніх немалую ролю адыгрывала з'яўленне рэгіянальных эліт на аснове сімбіёзу мясцовых феадалаў-баяр і прызначаных вялікім князем прадстаўнікоў дынастыі.

Праз XIV ст. ішло фарміраванне тытула манарха, а адпаведна і назвы дзяржавы, якая выкарыстоўвалася ў афіцыйных дакументах. Ва Усходняй Еўропе ў параўнанні з заходнееўрапейскай лацінамоўнай традыцыяй вялікай увагі скрупулёзнаму выкарыстанню наймення дзяржавы і поўнага тытула не надавалася. Аднак можна казаць, што ў XIV ст. пaступова славянскі тытул вялікага князя інтэрпрэтуецца ў нямецкамоўных крыніцах у датычэнні да вялікага князя Гедыміна як «кароль», а назва яго ўладанняў – у формулу «Каралеўства Літвы і Русі». Падобны антаганізм вынікаў з разумення гістарычнай геаграфіі першай паловы XIV ст. Такія вядомыя цэнтры, як Полацк і Кіеў, дазвалялі казаць нямецкім храністам пра Русь у складзе дзяржавы. З іншага боку, выкарыстанне славянскімі інтэлектуаламі падобнай дуалістычнай формулы ўказвае на дакладнае размежаванне традыцыйных зямель Літвы (Русі Літоўскай) і навадалучаных (прыслухаючых).

У пачатку XV ст. у сувязі з абвастрэннем канфлікту ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам вакол спрэчных тэрыторый Жамойціі ў дакументах пачынае сустракацца назва Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. Гэта назва ўказвала на трохскладовы характар дзяржавы, якая аб'ядноўвае землі яе ядра (Літву), і далучаныя землі Русі (славянскай) і Жамойціі (балцкай).

У адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле ВКЛ неабходна вылучаць з тэрыторый дзяржавы тыя землі, якія непасрэдна кіраваліся манархам і дзе ён меў неабмежаваную ўладу. Віленскае княства ў канцы XV ст. патэнцыйна магло быць пераўтворана ў вялікакняжацкі дамен еўрапейскага манарха. Такая структура не была стабільнай і дазваляла некаторым прадстаўнікам дынастыі асядаць на занятых землях, пераўтвараючы іх ва ўласныя ўдзелы, ці станавіцца дзяржаўнымі землеўласнікамі, не звязанымі з адміністрацыйна-тэрытарыяльнай сістэмай княства (напрыклад, фарміраванне дамена Кейстута).

У пачатку XIV ст. уся тэрыторыя ВКЛ уваходзіла ў склад Lituania propria, але пасля далучэння Полацкага княства істотна змяніліся адносіны паміж тэрыторыямі. Фарміравалася супрацьпастаўленне цэнтра і перыферыі. Кожная навадалучаная зямля ўваходзіла ў адносіны з вялікім князем па-свойму. Гэта магла быць форма дагавора, у якім прапісваўся характар адносін паміж манархам і прадстаўнікамі зямельных эліт. Другі шлях – паступовая інтэграцыя ў склад ВКЛ праз пасрэдніцтва шлюбу паміж прадстаўнікамі дынастыі і пануючага роду дадзенага княства. Па праву вымарачнасці ў склад ВКЛ увайшлі Валынская і Віцебская землі. Яшчэ адзін шлях – ваенны трафей, перададзены адной дзяржавай другой. Падобны працэс прадугледжваў перадачу часткі праў на тэрыторыі (захаванне ардынскага выхаду з некаторых украінскіх зямель), ці прызнанне часовага права карыстання (Заходняе Падолле), ці страты права на землі ў выніку падпісання адпаведнага дагавора (Жамойція паводле Мельнскага дагавора 1422 г.).

Падзел ВКЛ на цэнтр (Lituania propria з асноўнай лакалізацыяй яе ў землях Віленскага і Трокскага княстваў) і перыферыю (Полацкая зямля, Віцебскае княства, Валынь, Кіеўшчына, Севершчына, Жамойція) быў замацаваны наданнем асобным землям так званых земскіх, ці абласных, прывілеяў. Гэта дало штуршок для вылучэння другога ўзроўню адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ВКЛ у XIV ст., фарміравання на аснове мясцовай эліты свайго адміністрацыйнага апарату на чале з вялікакняжацкімі намеснікамі. А ў сярэдзіне – канцы XV ст. менавіта на барацьбу з сепаратысцкімі абласнымі рухамі было накіравана стварэнне агульнадзяржаўнага пісанага права – агульназемскіх прывілеяў 1447 і 1492 гг.

Земскі ўзровень адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ВКЛ характарызуецца палітыкай, якую праводзілі вялікія князі Гедымін і Альгерд. Яна атрымала ў літаратуры найменне «старина». Гэта відавочны сімбіёз вялікакняжацкага кантролю над навадалучанымі тэрыторыямі і захаваннем унутранага адміністравання, імкненнем цэнтральнай улады хутка ўключыць новыя тэрыторыі ў склад ВКЛ, захаваўшы іх унутраную самастойнасць.

Вялікі князь не імкнуўся праводзіць глыбокія змены, прызначаць у якасці намесніка прадстаўніка дынастыі, захоўваў уладную іерархію зямель за мясцовай палітычнай элітай.

Велікакняжацкая ўлада не імкнулася ўмешвацца ва ўдзельныя княствы. Аднак за XIV ст. завяршыўся працэс замяшчэння мясцовых князёў прадстаўнікамі роду Гедымінавічаў ці пароднененых з імі баярскіх родаў. Адпаведныя землі сталі экстэрытарыяльнымі для велікакняжацкага судаводства, а мясцовае баярства было падначалена ваеннай, падатковай і адміністрацыйнай уладзе ўладальніка ўдзельнага княства.

Пасля смерці вялікага князя Альгерда Ягайла пачаў перадачу ўдзельных княстваў прадстаўнікам свайго роду на спадчынных ўмовах, замяніў іх на дзяржаўныя землі-намесніцтвы, тым самым абмежаваўшы палітычную і маёмасную магчымасць кожнага. У час кіравання вялікага князя Вітаўта былі ліквідаваны Кіеўскае і Полацкае княствы. Перавод князёў Гедымінавічаў на ўдзельныя княствы моцна запаволіўся ў час канфлікту Свідрыгайлы Альгердавіча і Жыгімонта Кейстутавіча, аднак аднавіўся ў сярэдзіне XV ст., паступова ўключыўшы і знаць ВКЛ (Валімунтавічы, Гальшанскія).

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ закрануў дзве розныя катэгорыі – воласці (на якія першапачаткова дзяліліся землі) і гарады (працэс паступовага аддзялення іх ад зямлі адбываўся цягам XIV ст.). Як для валаснoй, так і для гарадской сістэмы кіравання было характэрна захаванне самакіравання і стабільнае прадстаўніцтва мясцовага элемента ва ўсіх сферах (адміністрацыйнай, судовай, ваеннай). Самакіраванне заключалася ў захаванні грамады (абшчыны), якая супольна вырашала штодзённыя пытанні, выбірала старасту, удзельнічала ў копным судзе.

Такім чынам, ВКЛ мела складаную структуру адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і ўзроўняў адміністрацыйнага кіравання. Гэта структура склалася ў кароткі час і на аснове буйнога па плошчы тэрытарыяльнага ўключэння зямель у склад дзяржавы, дзе ўжо існаваў падзел на велікакняжацкую тэрыторыю і славянскія княствы. Тэрыторыі суіснавалі на розных прававых умовах. Аднак унутраная палітыка старыны і паступовая інтэграцыя зямель у адміністрацыйную сістэму ВКЛ запаволіла працэс уніфікацыі, закансервавала статус удзельных княстваў і мясцовае абшчыннае адміністраванне.

# 12 ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ І САЦЫЯЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII – XIV ст.)

- **Феадальнае землеўладанне і феадальная іерархія**
- **Развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы**
- **Сялянская гаспадарка і павіннасці сялян**
- **Гарады, рамёствы і гандаль**

## ФЕАДАЛЬНАЕ ЗЕМЛЕЎЛАДАННЕ І ФЕАДАЛЬНАЯ ІЕРАРХІЯ

У XIII–XIV стст. на беларускіх землях паступова ўсталёўвалася сталае феадальнае грамадства. Феадальныя адносіны набывалі дамінуючае становішча ў вытворчасці і ў працэсе размеркавання атрыманай прадукцыі. Развіццё новага эканамічнага ўкладу суправаджалася зменай форм землеўладання і землекарыстання, узмацненнем прыгонніцтва, афармленнем сацыяльна-эканамічных пазіцый феадалаў і замацаваннем новых адносін у заканадаўстве дзяржавы.

Самым значным феадалам з'яўлялася дзяржава. На чале дзяржавы і ўсіх феадалаў быў вялікі князь літоўскі – гаспадар. Ён з'яўляўся ўладаром дзяржавы, таму выступаў вярхоўным уласнікам усёй зямлі княства. Іншыя князі, сярэднія і дробныя землеўласнікі знаходзіліся ў залежнасці ад гаспадара. Васальныя князі захавалі пэўную адасобленасць сваіх зямель, але прыносілі прысягу і плацілі даніну вялікаму князю, неслі з апалчэннем сваіх зямель на яго карысць ваенную службу. Даніна, якую плацілі васальныя князі, атрымала розныя назвы ў тых ці іншых землях: «падданшчына», «падымшчына», «пасошчына». Вызваленне ад выплаты даніны было рэдкім

выключэннем і з'яўлялася для падданага князя праяўленнем асобай міласці гаспадара. Феадальная ўласнасць на зямлю мела ўмоўны (абмежаваны) і безумоўны (неабмежаваны) характар.

Фактычна на правах удзельных князёў неабмежавана валадарылі ў сваіх землях нашчадкі Рурыкавічаў – князі Друцкія, Лукомскія, Адоеўскія, Варатынскія, Вяземскія і інш. Прызнаючы вялікага князя як вярхоўнага правіцеля і ўладара дзяржавы, яны самастойна распараджаліся сваімі зямельнымі ўладаннямі, мелі права надзяляць зямлёй, пакідаць яе ў спадчыну і інш. Князі Гедымінавічы ў XIV ст. яшчэ валодалі землямі «да волі» вялікага князя, які мог іх забраць, замяніць на іншыя і асобнай граматай дазваляў перадачу зямлі ў спадчыну. Так, пры вялікім князе Альгердзе ніхто з князёў Гедымінавічаў, за выключэннем Кейстута, не меў права надзяляць сыноў, іншых набліжаных асоб зямлёй у межах сваіх княжанняў. Непарушныя вотчынныя правы Гедымінавічы атрымалі толькі ў XV ст. пасля ліквідацыі буйных абласных (у тым ліку некаторых спадчынных) княжанняў.

Ліквідацыя Вітаўтам буйных абласных княжанняў (у Полацку, Віцебску, Смаленску, Ноўгарад-Северскім і інш.) і ўвядзенне там намесніцтваў значна ўзбагацілі вялікага князя і пашырылі гаспадарскія ўладанні. Акрамя даніны з гэтых зямель, у велікакняжацкую казну пачалі паступаць шматлікія даніны і падаткі, якія раней ішлі абласным князям: грашовая, мядовая,ババровая, кунічная даніны, дзякла, мыта, віны і інш. Прычым падаткі і павіннасці ўскладаліся не толькі на сялян княжацкіх зямель, але і на насельнікаў баярскіх і царкоўных уладанняў, за выключэннем зямель каталіцкай царквы з канца XIV ст. Да вялікага князя пераходзілі таксама ўсе двары і палацы, зямельныя ўгоддзі, чэлядзь былых абласных князёў. Ускладненне гаспадаркі патрабавала ўвядзення больш разгалінаванага апарату кіравання – новых намеснікаў, цівуноў і г. д. За кошт незанятых зямель былых княжанняў папаўняўся і гаспадарскі фонд, з якога рабіліся падараванні за службу іншым князям, феадалам, набліжаным да князя асобам. Такім чынам, ліквідацыя буйных абласных княжанняў умацавала не толькі палітычную ўладу вялікага князя, але і матэрыяльнае становішча князя і дзяржавы. У канцы XIV ст. гаспадарскія землі складалі каля 70 % усёй тэрыторыі дзяржавы.

Вялікі князь таксама меў значныя ўласныя зямельныя ўладанні – воласці гаспадарскія. Частка гэтых зямель пераходзіла да князя па спадчыне, частка набывалася ў выніку падпарадкавання іншых князёў, далучэння вымарачных маёнткаў, падараванняў і інш. Уласныя ўладанні вялікі князь таксама пашыраў шляхам заснавання на незанятых землях двароў і палацаў. Яны хутка ператвараліся ў буйныя феадальныя гаспадаркі, дзе працавала княжацкая чэлядзь і ў залежнасць ад іх траплялі навакольныя свабодныя

сяляне. Апошнія паступова абкладаліся павіннасцямі, станавіліся цяглымі, страчвалі права свабоднага пераходу на іншыя землі.

Да сярэдзіны XVI ст. асабісты дамен вялікага князя яшчэ не меў пэўнага прававога статусу і не вылучаўся дакладна сярод іншых гаспадарскіх зямель, таму фактычна з'яўляўся часткай дзяржаўных уладанняў. Прыбыткі з уласных княжацкіх зямель ішлі як на ўтрыманне самога князя, яго сям'і, двара, так і на пакрыццё шматлікіх дзяржаўных выдаткаў.

Пераважна за кошт гаспадарскіх уладанняў адбываліся падараванні царкве, якая валодала землямі звычайна на ўмовах неабмежаванай уласнасці. Так, полацкі князь Ануфрый у грамаце, датаванай 1399 годам (верагодна, гэта дакумент 1350 ці 1377–1381 гг.), перадаў Прадцечанскаму манастыру бортныя землі на азёрах Сомніца і Лісна, рэках Уле і Начы: «...а в церков святого Иоана не вступатися никому. А владыце с игумена иоаньского и с нашего монастыря Островьского куницы не брати, а никаких пошлин». З канца XIV ст. імкліва пашыраліся ўладанні каталіцкай царквы. У 1399 г. Вітаўт падараваў віленскім канонікам зямлю паміж Стрэшынам і Рагачовам, адзначаючы: «...А в ту землю первописаную не уступатися никому, а ни рогачевцем, а ни иному кому, ниж держать кановником виленским и Стрешин вечно, непорюшно, никимже». Але ў гэты час царква яшчэ не выступала буйным землеўласнікам.

Зямельная ўласнасць свецкіх феадалаў мела розныя формы. У другой палове XIII – XIV ст. асноўнай формай з'яўляліся вотчыны – уладанні, якія пераходзілі ад бацькі да сына ў спадчыну або былі падараваны гаспадаром «на вечнасць», «в отчину». Падобнымі да вотчын па прававым становішчы былі «куплі» – землі, набытыя за грошы з правам неабмежаванага распараджэння. Таксама існавалі «заставы» – маёнткі, атрыманыя ў часовае валоданне ад крэдытазаёмшчыка да выплаты пазыкі.

Гаспадарскія ўладанні выступалі важнай крыніцай пашырэння зямельнай уласнасці свецкіх феадалаў. Феадалы атрымлівалі «даніны» і «выслугі» – велікакняжацкія падараванні. У гаспадарскіх граматах вызначаюцца два асноўныя тыпы падараванняў – часовае і «на вечнасць». Часовае акрэслівала пэўныя тэрміны валодання феадалам зямлёй – «да волі», «да волі гаспадарскай», «да сваёй волі», «да жывата», «да двух жыватоў» і інш. Таксама існавалі падараванні з правам перадачы ў спадчыну толькі нашчадкам па мужчынскай лініі. Падараванні «на вечнасць», «с полным правом и панством», «в отчизну» прадугледжвалі або не прадугледжвалі права на адчужэнне зямельнай уласнасці, што вызначала наяўнасць права поўнага распараджэння ёю: продаж, падараванне і г. д. Усе формы феадальнага зямельнага ўладання мелі ўмоўны характар, таму што патрабавалі

ад феадалаў выканання ваеннай павіннасці на карысць вялікага князя. Парушэнне гэтай умовы вяло да страты маёнткаў.

Правы феадалаў на зямельную ўласнасць пачалі набываць заканадаўчае афармленне з канца XIV ст. Прывілеем 1387 г. феадалам каталіцкага веравызнання гарантавалася права валодаць вотчынамі, а таксама, згодна з існуючым парадкам, перадаваць іх у спадчыну, прадаваць, дарыць, мяняць і г. д. Крыху пазней, у XV ст., падобныя правы атрымалі феадалы праваслаўнага веравызнання. Гэтае становішча было пацверджана і замацавана шэрагам прывілеяў і статутамі ВКЛ. Падараванні ў часовае карыстанне, вядома, не задавальнялі феадалаў, і ў сярэдзіне XVI ст. яны атрымалі права пераўтвараць яго ў спадчыннае з поўным распараджэннем уласнасцю. З часоў Вітаўта падараванні маёнткаў сталі галоўным сродкам узнагароджання феадалаў за верную службу. Паступова гэтая практыка прывяла да пераразмеркавання зямельнай уласнасці, што найбольш інтэнсіўна адбывалася ў XV–XVI стст.

Фарміраване феадальнай іерархіі ў Вялікім Княстве Літоўскім праходзіла паступова і даволі марудна, што было абумоўлена як знешнепалітычнымі стратэгіямі, так і ўнутрыпалітычным і канфесіянальным становішчам дзяржавы. На чале феадальнай лесвіцы быў гаспадар – вялікі князь. Большая частка тытулаваных і нетытулаваных феадалаў з'яўляліся непасрэднымі васаламі вялікага князя, частка знаходзілася ў васальнай залежнасці ад іншых князёў і паноў. Велікакняжацкія граматы XIV ст. звычайна ўтрымліваюць зварот «князям, панам і баярам». Бліжэйшую да гаспадара знаць складалі прадстаўнікі княжацкіх родаў Рурыкавічаў і Гедымінавічаў, колькасць якіх не была значнай. Паступова фарміравалася знаць з ліку служылых тэрытарыяльных князёў і паноў-намеснікаў. Сярод паноў з канца XV ст. пачалі вылучацца буйныя землеўладальнікі-латыфундысты. Такім прыкладам можа з'яўляцца набліжаны да Вітаўта староста, а потым віленскі ваявода Манівід, які ў выніку падараванняў вялікага князя ў пачатку XV ст. валодаў амаль 500 сялянскімі дымамі. Падобным чынам істотна павялічылі свае зямельныя ўладанні прадстаўнікі родаў Гаштольдаў, Кезгайлаў, Радзівілаў. Спалучэнне вялікіх зямельных уладанняў і ўплывовых дзяржаўных пасад урэшце з'явілася асновай фарміравання магнатэрыі. Асноўная частка феадалаў, якая не мела тытула, у канцы XIV ст. пачала называцца баярамі. З XV ст. у дакументах шырока ўжываюцца ўжо назвы «баяре-шляхта», «рыцарства», якія выступаюць як сінонімы. Да гэтай катэгорыі адносіліся службовыя людзі з ліку дробных феадалаў – землеўласнік адной вёскі, часткі вёскі, зямельных угоддзяў без падданых ці нават беззямельны. Кансалідацыя і канчатковае заканадаўчае афармленне праў пануючага саслоўя завяршылася ў XVI ст.

## РАЗВІЦЦЁ ПРАДУКЦЫЙНЫХ СІЛ У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў грамадстве былі абумоўлены развіццём прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы, якая складала аснову тагачаснай эканомікі. З аграрнай працай была звязана дзейнасць значнай большасці насельніцтва. Асноўным заняткам насельніцтва з'яўлялася земляробства. У гэты перыяд, асабліва з канца XV ст., у земляробстве адбываліся якасныя змены: пашыраліся плошчы ворыўных зямель, распаўсюджваліся больш прагрэсіўныя спосабы апрацоўкі глебы, з'яўляліся новыя формы арганізацыі землекарыстання.

У другой палове XIII – XIV ст. на беларускіх землях суіснавалі розныя сістэмы і спосабы захавання і павышэння ўрадлівасці глебы. У далінах буйных рэк на добра асвоеных старажытных ворыўных землях для аднаўлення ўрадлівасці яшчэ шырока выкарыстоўвалі аблогу. Пры такой сістэме зямельны надзел пэўны час апрацоўвалі штогод, а пасля змяншэння ўрадлівасці раллю пакідалі для адпачынку на перыяд ад трох да дзесяці гадоў без апрацоўкі. З развіццём гаспадаркі патрабаваліся новыя землі. Павелічэнне плошчы ворыўных зямель адбывалася з рознай інтэнсіўнасцю, але пастаянна. У значнай ступені пашырэнне апрацаванай зямлі адбывалася за кошт асваення лясных прастораў, якія займалі большасць тэрыторыі. Асабліва актыўна гэты працэс праходзіў у XV – першай палове XVI ст., што абумовіла інтэнсіўнае выкарыстанне падсечна-агнявой сістэмы земляробства на беларускіх землях. Участак лесу падсякалі, выкарчоўвалі, пасля высахлыя дрэвы і хмызняк спальвалі, а дзялянку ўзорвалі, пры гэтым атрыманы попел ішоў на ўгнаенне раллі. Расчышчаныя такім чынам землі гарантавалі добры ўраджай на чатыры – восем гадоў, пасля чаго ўчастак закідваўся.

У другой палове XIII – XIV ст. значна пераважаў двухпольны севазварот, калі палова ворыва пакідалася пад папарам (адпачывала), а другая палова засявалася азімымі і яравымі культурамі ў розных долях. У XIV ст. паступова пашырыўся больш эфектыўны рэгулярны трохпольны севазварот (1/3 – папар, 1/3 – азімыя, 1/3 – яравыя), які з канца XV ст. стаў пераважаючым. Канчаткова дамінуючае становішча трохпольнай сістэмы замацавалася ў выніку правядзення аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст.

Земляробства было скіравана на вырошчванне зерневых культур, асноўнай з якіх з'яўлялася жыта, пераважна азімае. Як і раней, сеялі авёс, грэчку, ячмень, пшаніцу, проса. У дзяржаўных і буйных прыватнаўласніцкіх гаспадарках пашырыліся пасевы яравой і азімай пшаніцы. Апрацоўвалі зямлю драўлянай сахой з жалезнымі нарогамі, бараной, матыгай, а ў жніво

выкарыстоўвалі сярпы і цапы. У якасці цяглай жывёлы ў заходніх землях пераважалі валы, а на ўсходзе Беларусі – коні.

Ураджайнасць асноўных зерневых культур у той час складала каля «сам»-3* (прыкладна чатыры цэнтнеры з гектара), а на самых лепшых, добра ўгноеных землях даходзіла да «сам»-4–5. Але ўраджайнасць не была ўстойлівай. Неўраджаі, якія вялі да недаядання, а часам і голаду, не былі рэдкай з'явай. Так, у пачатку XIV ст. у Еўропе назіралася працяглае пахаладанне. Дажджы, неспрыяльнае надвор'е выклікалі неўраджай і голад у еўрапейскіх краінах, у тым ліку на беларускіх землях. Паводле падлікаў В. П. Грыцкевіча, за перыяд XI–XV стст. на беларускіх землях у крыніцах узгадваецца не менш за 25 галодных гадоў.

Акрамя збожжа, паўсюдна вырошчвалі гародніну: рэпу, капусту, моркву, буракі, рэдзьку, цыбулю, часнок, бабовыя, гуркі, зяляніну. Значную ролю адыгрывала і жывёлагадоўля. У гаспадарках, акрамя цяглай, разводзілі розныя віды прадукцыйнай жывёлы: кароў, авечак, коз, свіней, птушку. Заняткі земляробствам і жывёлагадоўляй дапаўняліся шматлікімі промысламі: пчалярствам (пераважна ў форме бортніцтва), паляваннем, рыбалоўствам.

Сялянская гаспадарка захоўвала натуральны характар. Сяляне валодалі рознымі рамёствамі: выраблялі прылады працы, прадметы хатняга ўжытку, займаліся гарбарнай справай, ткацтвам, цяслярствам і інш. Пераважная большасць вырабленай прадукцыі прызначалася для ўласнага спажывання, частка ішла на выплату падаткаў. Некаторая нязначная частка прадукцыі прадавалася на бліжэйшых рынках у гарадах, дзе сяляне маглі набыць патрэбныя для гаспадаркі прылады працы з жалеза, посуд, соль, вырабы гарадскіх рамеснікаў. Часам вываз сялянамі прадукцыі на рынак быў абумоўлены неабходнасцю ўнясення грашовай рэнты феадалу. Такім чынам, сялянская гаспадарка ў другой палове XIII – XIV ст. набыла складаны, шматгаліновы характар.

## СЯЛЯНСКАЯ ГАСПАДАРКА І ПАВІННАСЦІ СЯЛЯН

Сяляне з'яўляліся самай шматлікай групай насельніцтва і асноўнай вытворчай сілай дзяржавы і феадалаў. У крыніцах сяляне часцей называюцца «людьми», «мужиками». Яны адносіліся да людзей простага стану, якія не мелі прывілеяў, захавалі асабістую свабоду, але паступова траплялі ў залежнасць за права карыстацца зямлёй. Без дазволу ўласніка зямлі селянін не меў магчымасці распараджацца сваім надзелам. Абмежаваная правадольнасць

* «Сам» – мера вымярэння ўраджайнасці; лічбай пазначаецца, у колькі разоў сабралі больш, чым пасеялі.

сялян у зямельных адносінах заключалася ў праве карыстання зямлёй, перадачы права карыстання ў спадчыну, але праў уласнасці сяляне не мелі.

Сялянская гаспадарка атрымала назву «дым». Звычайна яна ўключала адну сялянскую сям'ю з пяці-шасці дарослых чалавек – бацькоў і іх дзяцей. У гаспадарчых адносінах дым складаўся з хаты, дапаможных будынкаў (гумно, хлеў і інш.), сельскагаспадарчых угоддзяў, цяглай і прадукцыйнай жывёлы, інвентару. Дым з'яўляўся адной з асноўных адзінак абкладання дзяржаўнымі падаткамі і феадальнымі павіннасцямі. У іншых мясцовасцях такой адзінкай падаткаабкладання выступалі служба, дворышча, жарэб'е і інш. Адзінай сістэмы падаткаабкладання яшчэ не існавала. Нават пасля ліквідацыі буйных абласных княжанняў на іх землях захоўвалася «старына», ранейшыя парадкі. Зямельныя надзелы, як правіла, сельскагаспадарчыя ўгоддзі, знаходзіліся ў карыстанні не адной сялянскай сям'і, а больш значнай і складанай супольнасці. Гэта было абумоўлена патрэбамі разгалінаванай гаспадаркі і цяжкай сялянскай працай. На паўднёвым захадзе Беларусі атрымалі распаўсюджанне дворышчы, у склад якіх уваходзілі прыкладна два – чатыры дымы. У большасці выпадкаў гаспадары дымоў, аб'яднаных у дворышча, з'яўляліся родзічамі, сваякамі, але часам для дапамогі і вядзення гаспадаркі запрашаліся чужыя людзі – «патужнікі», «сябры», «саўдзельнікі». Яны атрымлівалі пэўную частку, долю прадукцыі. У дворышча ўваходзілі сенажаці, выганы, ворныя землі, лясныя ўгоддзі, якімі карысталіся супольна, а таксама сядзіба – хаты, гаспадарчыя пабудовы, агароды. Тэрыторыя дворышча была акрэслена межамі і мела сваю назву. Падобнай адзінкай абкладання падаткамі і павіннасцямі поруч з дворышчам з'яўлялася служба. Звычайна службай – зямельным участкам – карысталіся тры-чатыры дымы па тэрытарыяльнай прыкмеце.

За карыстанне зямельнымі надзеламі сяляне выконвалі павіннасці і плацілі падаткі ўласніку зямлі – феадалу. На працягу XIII–XIV стст. пануючай формай зямельнай рэнты заставалася натуральная (прадуктовая). Яна дапаўнялася грашовымі плацяжамі і адпрацовачнымі павіннасцямі. Да сярэдзіны XVI ст. прыкладныя памеры падаткаў і павіннасцей вызначыць даволі складана, таму што агульнай сістэмы не існавала. Найбольшую групу складалі сяляне-даннікі, для якіх пераважнай формай рэнты быў прадуктовы аброк. Даніна выплочвалася мёдам, вавёркамі, бабрамі, куніцамі, часткай ураджаю, рознымі відамі сельскагаспадарчай прадукцыі. Як правіла, даніна дапаўнялася адпрацовачнымі работамі ў час жніва, грашовай подаццю. Натуральная даніна ў сукупнасці з рознымі адпрацовачнымі павіннасцямі (рамонт замка, вартаўнічая служба і інш.) заставалася галоўнай павіннасцю сялян у Падняпроўі і Падзвінні да сярэдзіны XVI ст. З развіццём таварна-грашовых адносін у XV ст. з'явілася асобная катэгорыя чыншавых сялян,

для якіх аснову феадальнай рэнты складаў грашовы аброк – чынш. З XIV ст. у беларускіх землях вядома паншчына, якую адбывалі цяглыя сяляне. Яны працавалі на зямлі феадала са сваімі інвентаром і цяглай жывёлай адзін-два дні на тыдзень. Пашырэнне паншчыны адбывалася ў XV–XVI стст. Асобную групоўку складалі сяляне-слугі. Яны выконвалі на карысць феадала пэўную службу, якая патрабавала больш высокай падрыхтоўкі, кваліфікацыі. Да іх належалі панцырныя баяры, выбранцы, служкі, якія неслі ратную службу падчас вайны, а таксама сяляне-рамеснікі, прадстаўнікі адміністрацыйнага апарату (старцы, цівуны, войты) і інш. Асобную катэгорыю залежнага насельніцтва складала «чэлядзь нявольная», якая не мела сваёй гаспадаркі, служыла пры двары феадала, не валодала ніякімі правамі, знаходзілася на ўтрыманні феадала і цалкам была яму падуладнай.

У другой палове XIII – XIV ст. пашырылася маёмасная дыферэнцыяцыя сялянства. Аб гэтым сведчаць адрозненні ў забеспячэнні сялянскіх гаспадарак надзеламі зямлі, працоўнай і прадукцыйнай жывёлай. Частка сялян не мела коней, валоў і была вымушана аддаваць свае надзелы ў апрацоўку сваякам, іншым сялянам, здаваць пад заклад і г. д. Найбольш збяднелыя сяляне пакідалі надзелы, станавіліся «наймитами» – працавалі на іншых сялян – «людьми волочащими», якія перабіваліся выпадковымі заробкамі, жабравалі.

Удасканаленне культуры земляробства, актыўнае асваенне сялянамі новых зямель, занятых раней лесам, спрыяла ўзбуйненню старых паселішчаў і ўзнікненню новых. Новыя, утвораныя «на сырым корани», «на сырым лесе», былі звычайна невялікімі і маладворнымі. Дробныя паселішчы – вуглы, урочышчы, сельцы – былі самымі распаўсюджанымі на ўсёй тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Больш значныя сельскія паселішчы (вёскі, сёлы, пагосты) пераважна існавалі на стараворыўных землях значнай плошчы. Пагосты і сёлы, як правіла, з'яўляліся цэнтрамі валасцей – дробных адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак. Там звычайна пражывала мясцовая адміністрацыя: старэйшыны, валасныя старцы, сельскія лаўнікі, прадстаўнікі велікакняжацкай улады і духавенства, існавала царква. Старцы і іншыя сельскія старшыны ўзначальвалі сялянскае самакіраванне, ажыццяўлялі збор падаткаў, кіравалі копнымі сходамі і кіравалі іх дзейнасцю, адказвалі за наяўнасць межавых знакаў. Найбольш значныя і важныя справы выносіліся на капу – сход дарослага мужчынскага насельніцтва сяла. На копных сходах маглі прысутнічаць не толькі дзяржаўныя, але і прыватнаўласніцкія, царкоўныя сяляне. Копны сход мог адбывацца некалькі дзён, а для вырашэння спрэчак з бліжэйшымі паселішчамі запрашалі на капу і «суседзей аколішных». Меншымі за сёлы па плошчы і колькасці насельніцва з'яўляліся вёскі. Невялікія памеры сельскіх паселішчаў, у параўнанні

з еўрапейскімі краінамі, былі абумоўлены невысокай шчыльнасцю насельніцтва на тэрыторыі ВКЛ.

Развіццё феадальных адносін суправаджалася ўсё большым адчужэннем сялян ад зямлі і замацаваннем праў на зямлю за феадаламі.

## ГАРАДЫ, РАМЁСТВЫ І ГАНДАЛЬ

Змены, якія адбываліся ў сельскай гаспадарцы, паскорылі грамадскі падзел працы, пашырылі рамесную дзейнасць і гандаль, спрыялі развіццю гарадоў, павелічэнню іх колькасці. У «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх», створаным у канцы XIV – XV ст., разам з гарадамі старажытнарускага перыяду (Барысаў, Берасце, Віцебск, Гародня, Друцк, Лагойск, Менск і пад.) – названы Абольцы, Беразуеск, Быхаў, Гальшаны, Горваль, Капыль, Крычаў, Крэва, Ліда, Расна, Свіслач і інш. У другой палове XIII – XIV ст. не ўсе яны былі ў поўным сэнсе ўрбаністычнымі паселішчамі, частка хутчэй з'яўлялася памежнымі крэпасцямі, замкамі. Аднак паступова яны прыцягвалі рамесных і гандлёвых людзей і пераўтвараліся ў сапраўдныя гарады. Невыпадкова тэрмін «горад» паходзіць ад «гарадзіць», «агароджваць» і спалучаецца з паняццем умацаваных паселішчаў.

У развіцці старых гарадоў на беларускіх землях у XIV ст. даследчыкі адзначаюць крызісныя з'явы: збядненне рамеснай вытворчасці, скарачэнне плошчаў пасадаў, змяншэнне насельніцтва. На думку вучоных, негатыўныя тэндэнцыі ў развіцці выклікалі рэзкія кліматычныя змены на мяжы XIII–XIV стст. (значнае пахаладанне, працяглая засуха), што абумовіла неўраджаі і голад, а таксама эпідэмія бубоннай чумы, якая пракацілася па еўрапейскіх краінах у XIV ст. і дасягнула беларускіх гарадоў. Магчыма, заснаванне новых невялікіх градаў таксама спрыяла перамяшчэнню ў іх насельніцтва з гарадоў старажытнарускага перыяду. Адначасова адбываўся працэс перасялення «на зямлю» з горада часткі феадалаў, якія атрымалі маёнткі – падараванні вялікага князя або іншых сеньёраў. Таксама для гарадоў заходніх зямель у XIV ст. узрасла знешняя пагроза з боку крыжакоў, што прымушала ўзводзіць дадатковыя абарончыя рубяжы і стрымлівала пашырэнне плошчы гарадоў. Так, крыжацкія напады з'явіліся адной з галоўных прычын запавольвання гаспадарчага і гандлёвага развіцця Гародні з канца XIII ст. У пачатку XIV ст. пасад у Гародні быў абнесены лініяй умацаванняў.

У ранні перыяд існавання Вялікага Княства Літоўскага (да канца XIV ст.) значны ўплыў на развіццё беларускіх гарадоў мела старажытнаруская традыцыя. Гарады ў асноўным захавалі трохчастковую структуру ранейшага перыяду: дзядзінец, вакольны горад, пасад. Як і ў сельскай мясцовасці,

галоўнае багацце ў горадзе складала зямля. Зямлёй валодалі феадалы, царква, купцы, заможныя жыхары горада. Набыты зямельны ўчастак з узведзенымі на ім пабудовамі атрымаў назву «пляц». На ім месціліся жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Пляцы маглі драбіцца, прадавацца і г. д. У XIII–XIV стст. пляцы ў гарадах звычайна былі невялікія, размяшчаліся скучана, таму што плошча гарадоў была абмежаваная. Звычайна вуліцы радыяльна разыходзіліся ад дзядзінца, замка. Заможныя гараджане імкнуліся сяліцца бліжэй да гарадскога цэнтра – замка, рынку, на галоўнай вуліцы. Рамеснікі сяліліся бліжэй да крыніц патрэбнай сыравіны, уздоўж ракі і г. д. Гарады ў гэты перыяд мелі нерэгулярную мадэль вулічнай сеткі. Вуліцы адрозніваліся даўжынёй, колькасцю сядзіб і пляцаў і, безумоўна, прэстыжнасцю. У адрозненне ад заходнееўрапейскіх беларускія гарады былі пераважна драўлянымі. У забудове горада выкарыстоўвалі рачныя тэрасы, на ўзгорках месціліся замак, храмы. Могілкі звычайна выносілі за межы горада.

У XIV ст. адбываліся значныя змены ва ўзвядзенні абарончых збудаванняў. Поруч з дрэва-насыпнымі ўмацаваннямі ўсё шырэй выкарыстоўваліся мураваныя элементы. Пераход да мураванага абарончага дойлідства паскараўся і ў сувязі з пашырэннем агнястрэльнай зброі. У сярэдзіне XIV ст. (да 1351 г.) дзядзінец і вакольны горад Віцебска былі абнесены мураванымі сценамі з вежамі (Верхні і Ніжні замкі). Змены закранулі і ўнутраную структуру горада. Пашырылася замкавае будаўніцтва, многія старыя дзядзінцы пераўтвараліся ў моцныя абарончыя комплексы. Адным з прыкладаў стаў адбудаваны пасля пажару па загадзе князя Вітаўта Гарадзенскі замак (пасля 1398 г. і да 1402 г.). Змены адбіліся і ў назвах частак горада. У дачыненні да ўмацаванага дзядзінца шырока пачалі ўжываць назву «замак» (Верхні, Высокі і інш.), а адносна ўмацаванага вакольнага горада часцей выкарыстоўвалася найменне Ніжні (Дольны) замак.

Замкавае будаўніцтва атрымала шырокае распаўсюджанне на беларускіх землях, што было выклікана небяспекай і неабходнасцю ўмацаваць абарону як меж дзяржавы, так і асобных гарадоў. Напрыклад, ва ўзведзеным у другой палове XIII ст. Навагародскім замку спачатку была толькі адна чатырохгранная магутная вежа. Аднак у пачатку XVI ст. замак меў ужо сем вежаў, быў абаронены земляным валам і ровам. Найбольшыя разбурэнні фартэцыя атрымала ў XVII–XVIII стст., у выніку захаваліся толькі рэшткі гэтага абарончага комплексу. У першай палове XIV ст. на Гарадзенскай і Навагародскай землях для абароны было ўзведзена некалькі фартэцый па тыпу замка-кастэля. Найбольш вядомыя сярод іх – Лідскі і Крэўскі, пабудаваныя па загаду вялікага князя Гедыміна. Замкі з'яўляліся

рэзідэнцыямі князёў, спрыялі абароне насельніцтва, развіццю гандлёвай і рамеснай вытворчасці.

Па колькасці насельніцтва беларускія гарады не былі вялікімі – да 10 тысяч налічвалі буйнейшыя з іх, як, напрыклад, Віцебск, Полацк. Але пераважалі гарады з насельніцтвам дзве-тры тысячы чалавек. Паводле меркавання даследчыкаў, агульная доля гараджан не перавышала 2–3 % ад усяго насельніцтва.

Насельніцтва тагачасных гарадоў не было аднародным. Асноўную частку складалі прадстаўнікі мясцовага баярства і духавенства, заможныя купцы, рамеснікі, дробныя гандляры, узгадваюцца гарадскія дваране, людзі чорныя. Да заможных слаёў адносіліся ўладальнікі нерухомай маёмасці, багатыя купцы, рамесныя майстры, а пазней –ураднікі магістрата, цэхмістры. У шэрагу гарадоў знаходзіліся праваслаўныя манастыры. У канцы XIV ст. у некаторых гарадах з'явіліся каталіцкія парафіі. Гарадское насельніцтва, у параўнанні з сялянствам, было больш дынамічным, мабільным, этнічна і канфесійна разнастайным, адрознівалася большай маёмаснай дыферэнцыяцыяй і вышэйшым узроўнем адукаванасці.

Ужо ў канцы XIV ст. у буйнейшых гарадах Вялікага Княства Літоўскага – Вільні, Троках, Полацку, Віцебску – існавалі суполкі нямецкіх мяшчан і гандляроў. Палітыка прыцягнення каланістаў, як адзначаў Ю. Бохан, больш выразна пачала праяўляцца з часоў вялікага князя Гедыміна, які надаваў значную ўвагу пашырэнню гандлёвых сувязей з еўрапейскімі краінамі, і працягвалася пазней іншымі гаспадарамі дзяржавы. У гарадах пражывалі татары, яўрэі, палякі, рускія, немцы, італьянцы і інш. Сярод першых масавых іншаземных абшчын у беларускіх гарадах былі яўрэйскія, аб чым сведчыць прывілей, які ў 1398 г. вялікі князь Вітаўт выдаў берасцейскім яўрэям. У прывілеі вялікая ўвага надавалася рэгуляванню ўзаемаадносін паміж хрысціянскім і іўдзейскім насельніцтвам горада і пытанням гаспадарчага характару: гандлю, закладам, ліхвярству.

У другой палове XIII – XIV ст. у гарадах было вядома шмат рамёстваў. Найбольш прэстыжнымі сярод рамеснікаў лічыліся муляры, каменячосы, стрыхары, рэзчыкі. Некаторыя муляры самі выраблялі цэглу, выконвалі стрыхарскія работы. Запатрабаванымі былі і спецыялісты па дрэваапрацоўцы: цесляры, пільшчыкі, сталяры, бондары. Апошнія выраблялі рэчы хатняга і гаспадарчага ўжытку – бочкі, вёдры, кубкі і інш. Шматлікія рамеснікі займаліся металаапрацоўкай, кавальскай і ювелірнай справай. Карысталіся папулярнасцю катляры, мечнікі, слесары. Былі добра развіты чабатарства (вытворчасць абутку), кушнерства, швецтва, кравецтва. Рымары выраблялі збрую, сядзельнікі. Харчовую галіну прадстаўлялі хлебнікі,

якія гатавалі галоўны прадукт харчавання на той час, меснікі (мяснікі), млынары. У большай ступені рамеснікі працавалі «на заказ», па замаўленні, і толькі частку прадукцыі выраблялі на свабодны продаж. Поруч з раменнымі заняткамі, гандлем жыхары гарадоў займаліся таксама агародніцтвам, промысламі, хатнім ткацтвам, прадзеннем, часам мелі ворыўныя землі каля горада. Асабліва значнай натуральная гаспадарка заставалася для жыхароў невялікіх гарадоў.

Развіццё сельскай гаспадаркі і рамеснай вытворчасці прывяло да пашырэння гандлёвых аперацый. Торг (рынак) з'яўляўся важнай часткай у структуры феадальнага горада. Там заключаліся афіцыйныя гандлёвыя аперацыі, збіралася пошліна. Таргі, якія раней спарадычна адбываліся каля замкаў і градаў, пастунова набылі рэгулярны характар. У гандлёвых адносінах пераважалі аперацыі на мясцовых рынках паміж сельскімі і гарадскімі жыхарамі: сыравіна, рамесныя вырабы, прадукты харчавання і інш. Купцы прапаноўвалі замежныя тавары з Чэхіі, Прыбалтыкі, Маскоўскай дзяржавы, Ноўгарада. У асноўным з замежных краін прывозілі разнастайныя рамесныя вырабы, каштоўнае футра, тавары для феадалаў, ювелірныя вырабы, сыравіну для металаапрацоўкі (медзь, волава, свінец), віно, шаўковыя тканіны і вырабы з каштоўных тканін, сукно. За межы прадавалі воск, збожжа, лён, хмель, лес, дзёгаць, смалу, скуры, футра і іншыя тавары. Аб гандлёвых стасунках сведчыць тэкст берасцяной граматы Сцяпана да Няжылы, знойдзенай у Віцебску ў 1959 г.: «Калі ты прадаў адзенне, то купі мне жыта на 6 грыўняў. А калі чаго не прадаў, то прышлі мне ў наяўнасці. Калі ж прадаў, то дабрадзей мой, купі мне жыта». Значную ролю працягваў захоўваць і транзітны гандаль, які вёўся па галоўных рэках: Заходняй Дзвіне, Дняпры, Прыпяці, Заходнім Бугу, Нёмане.

Да фарміравання агульнадзяржаўнай грашова-вагавай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага ў разліковых аперацыях не было адзінства. У полацкіх і віцебскіх землях на змену смаленскай грашовай сістэме, якая дзейнічала да 1250-х гг., прыйшла полацка-віцебская грашова-вагавая сістэма (сярэдзіна XIII ст. – 1386/1392 г.). Найбольшае распаўсюджанне на тэрыторыі ВКЛ у XIV ст. атрымаў пражскі грош.

Аб існаванні трывалых гандлёвых стасункаў беларускіх гарадоў з далёкім замежжам сведчаць археалагічныя і актавыя крыніцы. У Беларускім Падзвінні (Полацк і Віцебск) і ў Друцку выяўлены свінцовыя пломбы, мерныя вагавыя гіркі. У другой палове XIII – XIV ст. асноўным напрамкам з'яўляліся паўночнаеўрапейскія дзяржавы і гарады – Польшча, Балтыйскі рэгіён, нямецкія гарады, Лівонскі і Тэўтонскі ордэны. Значную ролю ў ажыццяўленні знешніх гандлёвых аперацый адыгрывалі паўночна-ўсходнія гарады. У XIII–XIV стст.

асабліва актыўныя гандлёвыя адносіны склаліся паміж Полацкам, Віцебскам, Псковам і Ноўгарадам, а таксама паміж Віцебскам, Полацкам і Рыгай. Ужо ў дагаворы 1229 г. Смаленска, Полацка і Віцебска з Рыгай узгадваўся нагляд за мерамі і вагамі. Іх эталоны павінны былі зберагацца ў праваслаўным саборы і каталіцкай царкве. Падобныя патрабаванні захаваліся і ў наступных дагаворах з Рыгай, што пацвярджаюць тэксты Полацкіх грамат. Дагаворы дакладна рэгламентавалі гандлёвыя аперацыі, праезд купцоў па тэрыторыі іншых краін, усталёўвалі пошліны на тавары, вызначалі крымінальныя аспекты, маральныя паводзіны і г. д. Гэтыя дагаворы яскрава сведчаць аб прававым характары існуючых адносін і ўключэнні беларускіх гарадоў у сістэму міжнародных нормаў гандлёвага права. У XIV ст. ініцыятыва ў гандлёвых аперацыях перайшла да Рыгі, якая імкнулася выступаць пасрэднікам у аперацыях паміж купцамі «рускіх» гарадоў з гандлярамі іншых еўрапейскіх краін. Насуперак ранейшым дамовам у XIV ст. купцам з Полацка, Віцебска, Смаленска не дазвалялася выязджаць за межы Рыгі. Рыга таксама дамаглася пераходу ў разліках з кёльнскага фунта, які выкарыстоўваўся раней у полацка-рыжскіх гандлёвых аперацыях, на рыжскія вагавыя адзінкі. Такім чынам, у канцы XIV ст. Рыга стала адзіным пасрэднікам у гандлёвых стасунках Падзвіння і Падняпроўя з балтыйскім рэгіёнам.

Рост гарадоў, узмацненне іх ролі ў эканамічным і сацыяльным жыцці дзяржавы, а таксама збліжэнне з Польшчай пасля заключэння Крэўскай уніі і пашырэнне адносін з еўрапейскімі дзяржавамі садзейнічалі развіццю самакіравання гарадоў. У XIV–XV стст. гарады больш выразна адасабляліся ад воласці, выступалі ў дакументах самастойна як «мужы», «вси полочане», «вси добрые люди и малые», «мешчане» і інш. Поруч з вечавымі парадкамі ўсталёўвалася адміністрацыя ў складзе войта, яго намесніка, пісара, лаўнікаў («прысяглых», сотнікаў) са складу гарадской абшчыны. «Гарадскія ўрады» звычайна выбіраліся ці прызначаліся з улікам меркавання абшчыннікаў. Гарадскія вольнасці, правы, памеры падаткаў, правілы гандлю і іншыя нормы пачалі замацоўвацца велікакняжацкімі, уладальніцкімі граматамі – уставамі. Такія граматы пацвярджалі мясцовыя асаблівасці і традыцыі самакіравання, якія склаліся яшчэ ў вечавы перыяд – «віцебскае права», «пінскае права».

З канца XIV ст. гарады Вялікага Княства Літоўскага пачалі атрымліваць самакіраванне на аснове нямецкага магдэбургскага права. Пачатак гэтаму паклалі фундацыйныя граматы Вільні (1387) і Берасцю (1390). Яны сталі адпраўной кропкай у станаўленні новай сістэмы самакіравання беларускіх гарадоў. Як адзначаў яшчэ У. І. Пічэта, першымі магдэбургскае права надавалі «вузлавым» гарадам. У берасцейскім прывілеі быў замацаваны

шэраг палажэнняў, якія ляглі ў аснову іншых фундацыйных грамат на самакіраванне. Берасцейскі прывілей гаворыць аб пераводзе «з рускага права» на права магдэбургскае, аб вызваленні мяшчан ад «усіх праў польскіх і рускіх і ўсялякіх звычаяў», якія супярэчаць магдэбургскаму праву, ад «усялякага суда і ўлады ўсіх дзяржаўных намеснікаў, кашталянаў, старостаў, ваяводаў, гараднічых, суддзяў, слугаў і возных». Магдэбургскае права ў Берасці надавалася «ўсялякага рода людзям – хрысціянам», «як немцам, гэтак палякам і рускім». Такім чынам, у грамаце адбіўся даволі стракаты канфесійны і этнічны склад насельніцтва горада.

Магдэбургскае права вызваляла горад ад улады дзяржаўных службоўцаў і падпарадкаванасці замку падчас вайны, вызначала непасрэднае падначаленне вялікаму князю і захаванне яго вярхоўнай улады. Горад атрымліваў правы на герб і пячатку, у тым ліку асобныя пячаткі надаваліся войту і лаўнікам, права мець цэхі, гарадскую і цэхавыя харугвы. Узначальваў сістэму магдэбургскага самакіравання войт, які адказваў выключна перад вялікім князем. Непасрэдна гарадскімі справамі займаліся бурмістры, радцы, лаўнікі, якія прадстаўлялі выбарны орган самакіравання – магістрат. Бурмістры і радцы складалі раду, а лаўнікі – гарадскую лаву. Яны выбіраліся штогод з ліку гарадскіх абшчыннікаў і прыступалі да сваіх абавязкаў пасля прынясення прысягі. У кампетэнцыі лавы былі крымінальныя справы. Рада на чале з бурмістрамі разглядала грамадзянскія справы мяшчан, вырашала гаспадарчыя пытанні, кантралявала збор падаткаў і інш. Войта ў большасці гарадоў прызначаў вялікі князь ці ўладальнік горада, але права выбіраць чалавека на гэтую пасаду таксама адлюстравана ў прывілеях на самакіраванне асобных гарадоў (Орша, Камянец, Пінск, Пружаны, Кобрын і інш.). Магістраты распараджаліся гарадской маёмасцю, вызначалі парадак падаткаабкладання, дзейнасць рамесных і гандлёвых аб’яднанняў, адстойвалі інтарэсы горада.

Пасля працяглага перапынку ў наданні магдэбургскага права з канца XV ст. яго атрымалі шэраг беларускіх гарадоў: Гародня (1496), Полацк (1498), Менск (1499), Камянец (1503) і інш. Сімвалам магдэбургскага горада з’яўлялася ратуша, дзе засяроджвалася гаспадарчае і грамадскае жыццё. Так, першыя звесткі аб Менскай ратушы з’явіліся праз чатыры гады пасля атрымання магдэбургскага права. У ратушы праходзілі пасяджэнні магістрата, размяшчаліся канцылярыя, архіў, скарб, захоўваліся гарадская пастрыгальня і вага («мера збожжа, г. зн. бочка ратушная»). На ратушнай вежы звычайна ўстанаўлівалі гадзіннік (гадзіннікі з’явіліся ў XIV ст. і былі атрыбутам, які сведчыў аб прэстыжы, багацці). У падзямеллі ратушы часам знаходзілася вязніца.

Ратуша вызначыла новую дамінанту ў структуры горада. Цэнтр перамясціўся ад замка да рыначнай плошчы вакол ратушы. На рынку месціліся крамы. Яны належалі гораду, мяшчанам, духавенству і нават шляхце. Крамы на рынку з'яўляліся прадметам куплі-продажу. Часам свае крамы прадаваў і горад, калі матэрыяльнае становішча пагаршалася або тэрмінова патрабаваліся сродкі.

У якасці пакарання гарадская абшчына магла быць пазбаўлена права на самакіраванне. Найбольшая колькасць прывілеяў на самакіраванне выдадзена ў XVI–XVII стст. І хоць арганізацыя гарадскога жыцця не выходзіла за межы феадальнай падпарадкаванасці, магдэбургскае права садзейнічала эканамічнаму і культурнаму развіццю гарадоў. Гарадская абшчына пастаянна папаўнялася новымі жыхарамі living рознай этнічнай і канфесійнай прыналежнасці, майстрамі, гандлярамі, якія стваралі цэхі, гільдыі, брацтвы, актыўна ўдзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці гарадской абшчыны.

# 13 УНУТРАНАЯ І ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ВКЛ. КНЯЖАННЕ ВІТАЎТА

- **Крызіс 1377–1392 гг.**
- **Унутраная палітыка Вітаўта**
- **Адносіны з рускімі княствамі**
- **Татарскі напрамак знешняй палітыкі Вітаўта**
- **Заходні напрамак знешняй палітыкі ВКЛ**

## КРЫЗІС 1377–1392 гг.

Пасля смерці вялікага князя Альгерда 24 мая 1377 г. улада ў ВКЛ са згоды суправіцеля Кейстута перайшла да Ягайлы (у праваслаўі Якаў) – старэйшага сына Альгерда ад Ульяны Цвярской. У ВКЛ працягвала рэалізоўвацца схема сумеснага кіравання дзяржавай праз дзвюма асобамі – віленскім і трокскім князямі.

Пераход улады да Ягайлы характарызуецца не толькі зменай адносін унутры роду Альгердавічаў, але і кардынальным пераглядам гаспадаром і палітычнай элітай сваіх знешнепалітычных арыенціраў. Пасля харызматычнага Альгерда вялікі князь Ягайла падаваўся слабым, супраць яго і дзяржавы былі настроены іншыя Альгердавічы (Дзмітрый, Уладзімір і, канешне, Андрэй). Акрамя гэтага, на ўскраінах ВКЛ (Смаленскае княства) узмацніліся сепаратысцкія настроі. Прагназуючы аслабленне ВКЛ, актывізаваліся суседнія дзяржавы. Як вынік наступіў крызіс улады, і перад новым вялікім князем паўстала пытанне захавання цэласнасці краіны.

Першы этап крызісу пачаўся, калі ўзніклі непаразуменні па пытанні ўнутранай палітыкі і пераразмеркаванні ўдзельных княстваў, якое праводзіў

вялікі князь Ягайла ў дачыненні да сваіх зводных братоў Андрэя, Дзмітрыя і Уладзіміра. Да таго ж пры гаспадары пачаў вылучацца муж роднай сястры Ягайлы Вайдыла, які не толькі выконваў ключавую ролю ў знешнепалітычных стасунках свайго шурына з Тэўтонскім ордэнам (верагодная змова супраць асобы Кейстута), але і атрымаў у карыстанне віцебскі велікакняжацкі ўдзел, родавую маёмасць Альгерда. У 1380 г. падчас разгорнутай ваеннай кампаніі за Полацк паміж Ягайлам і Скіргайлам з аднаго боку і Андрэем Альгердавічам з другога Кейстут зрабіў захады па нейтралізацыі ўлады пляменніка, акупаваўшы Вільню і фактычна абмежаваўшы ўладу гаспадара. Падчас акцыі па загадзе Кейстута забілі паплечніка Ягайлы Вайдылу. Пры гэтым маёмасць і часткова дзяржаўныя функцыі ўнутры дзяржавы былі вернуты Ягайлу на працягу года. Падчас перамоў Кейстута і яго сына Вітаўта захапілі ў палон, а ў 1382 г. Кейстут з жонкай былі забіты.

Другі этап крызісу пачаўся на ўзроўні стварэння ўнутры ВКЛ альтэрнатывы манарху з боку палітычнай эліты. З 1382 г. у дзяржаве працягвалася эксплуатацыя сістэмы сумеснага кіравання, у якой месца Кейстута заняў родны брат Ягайлы Іван-Скіргайла. Аднак знешнепалітычныя і ўнутрыпалітычныя функцыі паміж князямі былі поўнасцю перайначаны. Ягайла займаўся пераважна знешняй палітыкай, актыўна ўдзельнічаў у справах Усходняй Еўропы, падтрымліваў Мамая ў барацьбе з маскоўскім князем Дзмітрыем, спрабаваў праз уласны шлюб працягнуць матрыманіяльную палітыку Гедыміна і Альгерда сярод рускіх вялікіх княжанняў. Князь Іван-Скіргайла пераважна адказваў за правядзенне ўнутранай палітыкі, галоўным напрамкам якой стала стварэнне ўласнага дамена праз ліквідацыю шэрагу буйных удзельных княстваў, у першую чаргу Полацкага.

Падобная палітыка выклікала супраціўленне ўнутры краіны і прывяла да гуртавання апазіцыі адносна дуумвірату Ягайла – Скіргайла. Магчымымі прэтэндэнтамі на замену Ягайлу і Скіргайлу бачыліся Андрэй Альгердавіч і Вітаўт Кейстутавіч. Таму ў складаных унутрыпалітычных умовах вялікі князь Ягайла пайшоў на рашучы крок і заключыў палітычны саюз з Каралеўствам Польскім – Крэўскую унію 1385 г., якая дазволіла абаперціся на знешніх саюзнікаў у падаўленні апазіцыі і наёмнае войска для кантролю сталічных замкаў. У 1386 г. было задушана паўстанне на паўночным усходзе дзяржавы, на чале якога стаялі Андрэй Полацкі і Святаслаў Смаленскі. Удзельнікі былі пакараны, а іх маёмасць перададзена іншым князям. Паўстанне супраць цэласнасці дзяржавы і яго вынікі згуртавалі вакол асобы гаспадара большасць Гедымінавічаў, за выключэннем старэйшых сыноў Альгерда, і дазволілі працягнуць палітыку кансалідацыі зямель ВКЛ Скіргайлу.

Трэці этап пачаўся з пранікнення польскага ўплыву ў палітычную прастору ВКЛ і пераарыентацыі велікакняжацкага двара і палітыкі дзяржавы на прапольскі напрамак. Узмацніўся ордэнскі знешнепалітычны курс, Тэўтонскі ордэн пачаў актыўна падтрымліваць апазіцыйных Ягайлу прадстаўнікоў роду Гедымінавічаў, прадставіў ім прытулак і даў сродкі на арганізацыю барацьбы за сваю маёмасць і вяртанне да ўлады ў ВКЛ. Князь Вітаўт, які два разы збягаў з ВКЛ у Ордэн, сваю матывацыю ўцёкаў выкладаў перад ордэнскім саветам у «Мемарыяле», дзе пісаў, што маёмасна пакрыўджаны гаспадаром ВКЛ і не верыць гарантыі бяспекі ўласнага жыцця. Вітаўт здзейсніў два паходы на сталічныя замкі ў 1390 і 1391 гг.

У перыяд з 1386 па 1392 г. унутрыпалітычнае жыццё ВКЛ можна ахарактарызаваць як выцісканне з палітычнай прасторы актыўных канкурэнтаў уладзе. Іван-Скіргайла стаў намеснікам вялікага князя і сфарміраваў свой асабісты дамен за кошт ліквідаваных буйных удзелаў Альгердавічаў-старэйшых і іншых Гедымінавічаў. У праекцыі на супрацьстаянне Скіргайла – Вітаўт знешняя палітыка і асабістая справа Вітаўта аб'ядналіся ў адну праблему, вырашэнне якой стала магчыма толькі 12 жніўня 1392 г. падчас заключэння Астраўскага пагаднення, паводле якога ўлада ў ВКЛ перайшла да Кейстутавіча, а само яго становішча давала гарантыі адноснай бяспекі.

Перадача ўлады Вітаўту ў 1392 г. была вымушанай мерай з боку Ягайлы, які не мог кантраляваць дзяржаву старымі метадамі. Антаганізм палітычнай эліты ў адносінах да Скіргайлы вымусіў караля і вялікага князя замяніць асобу свайго намесніка і прапісаць перададзеныя яму кампетэнцыі ў Астраўскім пагадненні. Прыход да ўлады ў ВКЛ Вітаўта разглядаўся Ягайлам толькі як замена непапулярнай асобы Скіргайлы. А разам з тым і палітычная лінія на цэнтралізацыю ўлады велікакняжацкага намесніка працягвалася. Пры гэтым Вітаўт мог прэтэндаваць на фарміраванне свайго ўдзела на аснове былой маёмасці Кейстута, але да яго не пераходзілі землі, назбіраныя Скіргайлам за папярэдні час. У 1395 г. князя Івана-Скіргайлу атруцілі. Пытанне з пераходам маёмасці было канчаткова вырашана – землі вярнуліся пад кантроль гаспадара.

Вітаўт змяніў палітыку цэнтралізацыі і для кіравання асобнымі тэрытарыяльнымі адзінкамі пачаў прыцягваць арыстакратыю і знаць ВКЛ, ігнаруючы прадстаўнікоў роду Гедымінавічаў. Застаючыся ў межах дзяржавы адзіным Кейстутавічам, Вітаўт не давяраў іншым прадстаўнікам дынастыі. Ён распачаў ператварэнне дзяржавы з федэратыўнай ва ўнітарную. Стварыў дзяржаўны апарат кіравання, заклаў аснову прававой сістэмы і юрыдычнай базы ўзаемаадносін розных тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак з цэнтральнай уладай, акрэсліў асноўныя інстытуты і сімвалы дзяржаўнай

самастойнасці (Гаспадарскую Раду, канцылярыю, афіцыйную рэзідэнцыю, усыпальніцу вялікіх князёў і г. д.), стымуляваў працэс развіцця шматканфесійнай палітыкі, адрознай для асобных тэрыторый княства. Распачаў фарміраванне «новай арыстакратыі» вакол палітычнай эліты і феадалаў Віленшчыны і Троччыны на аснове каталіцкіх феадалаў у супрацьвагу прадстаўнікам роду Гедымінавічаў і праваслаўнай славянскай арыстакратыі зямель прыслухаючых.

Адбывалася вестэрнізацыя палітычнай і вайсковай культуры і гаспадарскага двара. Агульнадзяржаўнай стала ідэя ўзвышэння асобы Вітаўта-Аляксандра, які сваімі дасягненнямі перад хрысціянскім светам заслугоўваў ўласнай кароны (стварэнне ў Смаленску афіцыйнай гісторыі дзяржавы, якая праявілася ў «Летапісцы вялікіх князёў», напісанне «Пахвалы Вітаўту»). Адпаведная ідэя ўвасоблена ў іканаграфіі Трокскага замка вобразам Вітаўта як цара Давіда, што прымае дары.

## УНУТРАНАЯ ПАЛІТЫКА ВІТАЎТА

У 1413 г., паводле Гарадзельскага прывілея, які замацоўваў адпаведную унію, у ВКЛ ствараліся Віленскае і Трокскае ваяводствы і ўводзіліся пасады віленскага і трокскага ваявод. Як вынікае з тэксту самога прывілея, пераўтварэнні былі праведзены з мэтай уніфікацыі сістэмы дзяржаўных пасад у Вялікім Княстве Літоўскім і Польскім каралеўстве.

Асновай для вызначэння тэрыторыі Віленскага і Трокскага ваяводстваў стаў адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, які замацаваўся яшчэ ў часы Альгерда і Кейстута. У склад Віленскага ваяводства ўвайшлі былыя ўладанні Альгерда і яго нашчадкаў: былое княства Віленскае, былое княства Навагародскае і княства Мсціслаўскае. Трокскае ваяводства аб'яднала ўладанні Кейстута і яго сыноў: былое княства Трокскае з асобнай Ковенскай акругай, былое княства Гарадзенскае, Берасцейскую зямлю і тры Падляшскія паветы: Бельскі, Дарагічынскі і Мельніцкі. У адпаведнасці з папярэднімі цеснымі рэгіянальнымі сувязямі Слуцкае і Клецкае княствы ўвайшлі ў Віленскае ваяводства, а Кобрынскае, Пінскае, Гарадзецкае і Тураўскае – у Трокскае.

Хоць інстытут ваявод у некаторых землях існаваў і да Гарадзельскага прывілея, вылучаецца пэўная розніца паміж рускім ваяводам, які меў судовыя, адміністрацыйныя і вайсковыя абавязкі, і польскім ваяводам-палацінам. Аднак адміністрацыйна-гаспадарчыя і вайсковыя абавязкі ваяводы-палаціна ў Каралеўстве Польскім з'яўляліся вынікам доўгатэрміновага палітычнага і сацыяльнага развіцця дзяржаўных інстытутаў, таму дакладна

пераняць польскі вопыт не атрымалася, і палажэнне ваяводы ў Вялікім Княстве Літоўскім мела свае асаблівасці.

Права прызначэння ваявод належала вялікаму князю. На пасады віленскага і трокскага ваявод прызначаліся мясцовыя феадалы (да 40-х гг. XV ст. іх займалі выключна католікі балцкага паходжання). Паводле польскага ўзору віленскі і трокскі ваяводы сталі на чале мясцовай шляхты. Іх кампетэнцыя военачальнікаў пашырылася на тэрыторыі, якія не былі ім падуладныя як намеснікам вялікага князя, у той час як велікакняжацкімі намеснікамі яны з'яўляліся толькі для тых землеўласнікаў, якія мелі землі ў былых Віленскім і Трокскім княствах. Паступова да функцыі ваяводы як ваеннага кіраўніка шляхты ў асобных выпадках стала дадавацца і функцыя судовай улады над князямі, панамі і шляхтай усяго ваяводства.

Такім чынам, можна меркаваць, што ўзор польскага ваяводы-палаціна аказаў значны ўплыў на развіццё вышэйшых дзяржаўных інстытутаў у Вялікім Княстве Літоўскім, як бы ствараючы агульную знешнюю форму. Але многія абавязкі ў сферы адміністрацыйнай улады і судовай юрысдыкцыі перайшлі да ваявод ад удзельных князёў. У адміністрацыйным плане Гарадзельскі прывілей замацаваў ваенна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ, які быў праведзены ў часы Альгерда і Кейстута, што адпавядала патрэбам дзяржавы і рабіла сувязі паміж яе асобнымі часткамі больш трывалымі.

Ад самага пачатку свайго кіравання Вітаўт імкнуўся падпарадкаваць удзельных князёў. Гэта праблема была не толькі ўнутрыпалітычнай, але і дынастычнай, бо Вітаўт Кейстутавіч зрабіўся гаспадаром сыноў Альгерда, якія былі братамі польскаму каралю і «найвышэйшаму князю» (princeps supremus) Ягайлу. Першым паўстаў Карыбут Альгердавіч, але хутка быў разбіты Вітаўтам і ўзяты ў палон. Такім чынам ён страціў Навагародскае княства. У 1392 г. пры пасрэдніцтве Ягайлы было заключана пагадненне са Скіргайлам Альгердавічам. Скіргайла прызнаў за Вітаўтам тытул вялікага князя літоўскага, за што атрымаў Кіеў і Крамянец. Аднак Кіеў належаў князю Уладзіміру Альгердавічу, і, каб выканаць сваё абяцанне, Вітаўт увесну 1395 г. пайшоў на таго з войскам. Уладзімір, не чакаючы наступства гэтага паходу, добраахвотна саступіў Кіеў Скіргайлу і ўзамен атрымаў Капыль. Затым надышла чарга Фёдара Карыятавіча. Вялікі князь Альгерд у 1362 г. забраў Валынь у татар і аддаў яе сваім пляменнікам, сынам князя Карыята Гедымінавіча. Фёдар Карыятавіч паўстаў супраць Вітаўта і праз гэта быў пазбаўлены ўладанняў, а Падолле, як і Валынь, Вітаўт пакінуў за сабою. Пасля Вітаўт выправіўся супраць Свідрыгайлы, апошняга сына Альгерда. Той жыў разам са сваёй маці Ульянай у Віцебску, але пасля яе

смерці ў 1392 г. Ягайла не перадаў яму горад. Свідрыгайла паспрабаваў выступіць супраць волі гаспадара, бо лічыў Віцебск сваім уладаннем. Ягайла даручыў Вітаўту вырашыць праблему. Свідрыгайла ўпарта супраціўляўся, але ўрэшце быў вымушаны здацца на волю гаспадара.

Так, да сярэдзіны 1390-х гг. Вітаўт пазбавіў уладанняў найбольш уплывовых князёў. І хоць большасць з іх атрымалі іншыя землі, новыя ўдзелы былі меншымі па памерах, а князі ўжо не карысталіся такой самастойнасцю, як раней. Так, Карыбут, якога вызвалілі праз заступніцтва цесця – Алега Разанскага, атрымаў Ноўгарад-Северскі, старэйшы сын Альгерда Андрэй пасля вызвалення з польскага палону ўвогуле не меў уладанняў у межах ВКЛ і быў вымушаны з'ехаць да свайго сына Івана, князя пскоўскага. У выніку самым небяспечным сапернікам Вітаўта стаў Скіргайла, які валодаў вялікім Кіеўскім княствам і карыстаўся падтрымкай русінскага насельніцтва і польскага караля. Але ў 1395 г. Скіргайла нечакана памёр. У 1398 г. Вітаўт, які рыхтаваўся да вялікага паходу на татар, быў вымушаны на нявыгадных умовах прымірыцца са Свідрыгайлам і паабяцаў яму Ноўгарад-Северскі, Падолле і некаторыя гарады Чырвонай Русі. Адносіны паміж Вітаўтам і Свідрыгайлам і надалей заставаліся вельмі складанымі. У 1402 г. апошні збег у Прусію, але на наступны год ён у чарговы раз памірыўся, і зноў атрымаў Севершчыну. Свідрыгайла прымаў актыўны ўдзел у палітычных справах і нават хадзіў з Вітаўтам у 1406 г. на Смаленск. Аднак у 1408 г. збег да Васіля І у Маскву, дзе атрымаў Уладзімір-на-Клязьме, Пераяслаў, Юр'еў, Волак і Ржэў. У 1409 г. Свідрыгайла вярнуўся ў ВКЛ, але быў прыняты з недаверам і за перамовы з Ордэнам закуты ў кайданы. Супярэчнасці сярод Гедымінавічаў яшчэ больш пашырылі падазронасць Вітаўта да родзічаў. Фарміраваліся ўмовы для з'яўлення новай эліты дзяржавы, персанальна адданай гаспадару.

## АДНОСІНЫ З РУСКІМІ КНЯСТВАМІ

ВКЛ у канцы XIV – пачатку XV ст. праводзіла актыўную знешнюю палітыку ў адносінах да сваіх усходніх суседзяў. Гэтаму спрыялі трывалыя дынастычныя сувязі паміж Вялікім Княствам Літоўскім і рускімі княствамі: у 1390 г. Вітаўт выдаў сваю дачку Сафію замуж за будучага маскоўскага князя Васіля І; сам быў жанаты з Ганнай Святаславаўнай са смаленскіх князёў; сын вялікага князя цвярскога Іван Міхайлавіч быў жанаты з Марыяй, роднай сястрой Вітаўта; стрыечныя ж сёстры Агрыпіна, Алена і Феадора былі замужам за рускімі князямі Барысам Суздальскім, Уладзімірам Андрэевічам (братам Дзмітрыя Данскога) і Святаславам Звенігародскім

адпаведна. У канцы XIV ст. Вялікае Княства Літоўскае было самай моцнай палітычнай сілай на ўсходзе Еўропы, якой не маглі супрацьстаяць паасобку іншыя рускія княствы.

Пасля смерці смаленскага князя Святаслава, калі паміж яго сынамі пачалася барацьба за ўдзелы, Вітаўт зрабіў спробу далучыць Смаленскае княства. У 1395 г. Вітаўт нечакана для смалян апынуўся пад горадам і прапанаваў сябе ў якасці трацейскага суддзі. Калі яны разам са сваімі баярамі прыехалі да Вітаўта, іх зняволілі і адвезлі ў Вялікае Княства Літоўскае. Горад быў узяты войскамі ВКЛ, тут пакінулі наменнікаў вялікага князя.

Аднак гараджане забілі наменнікаў і запрасілі на княжанне Юрыя Святаславіча. Менавіта ён пасля смерці бацькі атрымаў уладу над Смаленскім княствам, але з-за ўсобіц напярэдадні паходу войск Вялікага Княства Літоўскага на Смаленск быў вымушаны хавацца ў Разанскім княстве. Спроба Вітаўта другі раз узяць Смаленск не мела поспеху. У 1401 г. ён заключыў мір з Юрыем Святаславічам. У 1404 г. Вітаўт зрабіў трэцюю спробу, таксама безвыніковую, заваяваць Смаленск. Пасля гэтага Юрый Святаславіч звярнуўся па дапамогу да вялікага магістра і асабіста адправіўся ў Маскву да Васіля I. Ліст магістра да Вітаўта адносна смаленскіх спраў вынікаў не прынёс, а маскоўскі князь не жадаў сварыцца з цесцем. Скарыстаўшыся адсутнасцю князя ў горадзе, Вітаўт у 1405 г. у чарговы раз напаў на Смаленск, нарэшце ўзяў горад і такім чынам завяршыў далучэнне Смаленскай зямлі да Вялікага Княства Літоўскага.

Не апошняе месца ў планах Вітаўта па пашырэнні тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага на поўнач займалі Пскоў і Ноўгарад. Гэтыя гарады атрымлівалі вялікія прыбыткі ад гандлю з немцамі. Іх асноўнымі контрагентамі былі Любек, Дэрпт і Рэвель. Але становішча Ноўгарада ў канцы XIV ст. было вельмі няўстойлівым: Маскоўскае княства вяло наступальную палітыку ў адносінах да наўгародскіх зямель. Каб захаваць свае ўладанні, ноўгарадцы былі вымушаны звярнуцца па дапамогу да вялікіх князёў літоўскіх.

У 1389 г. у Ноўгарад прыехаў княжыць Сямён (Лунгвен) Альгердавіч, які ад свайго імя і ад імя ноўгарадцаў даў Ягайлу пісьмовае абяцанне трымацца саюзу з ім. Такім чынам Ноўгарад патрапіў у залежнасць ад Польскага каралеўства. Аднак Вітаўт меў на гэтыя землі свае віды. У 1396 г. ён запатрабаваў ад ноўгарадцаў прызнаць яго сваім вялікім князем, але атрымаў адмову і ў 1399 г. аб'явіў ім вайну, не змог здзейсніць задуманае з-за татарскіх спраў.

Наступальная палітыка вялікага князя ў адносінах да Пскова ўскладнялася яшчэ і папярэдняй мірнай дамовай паміж Вітаўтам і Ордэнам,

у адпаведнасці з якой князь не толькі адмаўляўся ад усялякіх прэтэнзій на пскоўскія землі, але і абавязаўся дапамагчы рыцарам захапіць гэтыя тэрыторыі. У пачатку XV ст. узаемная незадаволенасць паміж Вітаўтам і Ноўгарадам толькі ўзрастала. Некаторы час у Ноўгарадзе знаходзіўся Юрый Святаслвіч Смаленскі, і Вітаўт патрабаваў яго выдачы, але наўгародцы палічылі за лепшае адправіць таго да маскоўскага князя. Далучэнне Смаленскай зямлі ў пэўнай ступені развязала рукі Вітаўту ў барацьбе з паўночнымі суседзямі. У 1406 г. ён захапіў асобныя пскоўскія ўладанні і моцна абрабаваў Пскоўскую зямлю, пасля чаго пскавічы звярнуліся да Ноўгарада і вялікага князя маскоўскага. На гэты раз Васіль I прыняў бок Пскова, што выклікала ў 1406–1408 гг. шэраг памежных канфліктаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім, якія завяршыліся мірам у 1408 г. Ноўгарад заключыў пагадненне з Вітаўтам яшчэ раней, у 1407 г., і прыняў сваім князем Сямёна Альгердавіча. Такім чынам, напярэдадні Грунвальдскай бітвы адносіны Вітаўта з рускімі княствамі нармалізаваліся. Наўгародцы на чале з Альгердавічам удзельнічалі ў Грунвальдскай бітве, а ў 1411 г. заключылі дагавор з Вітаўтам і Ягайлам, што ў выпадку парушэння Ордэнам Торуньскага міру будуць ваяваць супраць рыцараў.

Між тым у 1410–20-х гг. адносіны паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Псковам і Ноўгарадам заставаліся напружанымі, паколькі Вітаўт не пакідаў памкненняў далучыць гэтыя землі. У 1418 г. ён разам з Ягайлам нават быў прызначаны папам Марцінам V галоўным вікарыем каталіцкай царквы ў Пскове і Ноўгарадзе з мэтай вяртання іх жыхароў у каталіцкую веру. У 1426 г. Вітаўт распачаў вайну супраць Пскова, а ў 1428 г. – супраць Ноўгарада.

Адносіны Вітаўта з Маскоўскім, Разанскім, Цвярскім і іншымі больш дробнымі рускімі княствамі былі стабільна прыязнымі. Вітаўт неаднойчы сустракаўся з маскоўскім князем Васілём I, і нават захоп Смаленскай зямлі войскам Вялікага Княства Літоўскага не перашкодзіў спатканню двух князёў у Смаленску ў 1396 г. Толькі калі незадаволены асабістым становішчам у Вялікім Княстве Літоўскім князь Свідрыгайла Альгердавіч пераехаў у Маскоўскае княства і падтрымаў Васіля I, той пайшоў на адкрытае выступленне супраць агрэсіўнай палітыкі Вітаўта ў адносінах да Пскоўскай зямлі. Узаемнаму паразуменню паміж Маскоўскім княствам і Вялікім Княствам Літоўскім спрыяла дзейнасць княгіні Соф'і Вітаўтаўны. Згодна з тэстаментам Васіля I, пасля яго смерці Вітаўт стаў апекуном і абаронцам сваёй дачкі і ўнука, князя Васіля II.

Такія ж прыязныя адносіны былі ў Вітаўта з Цвер'ю. У 1427 г. вялікі князь літоўскі заключыў саюз з цвярскім князем Барысам Аляксандравічам,

у адпаведнасці з якім ўсталёўваліся ўзаемныя абавязкі ў палітычнай, ваеннай, эканамічнай сферах, вырашаліся тэрытарыяльныя пытанні. Падобныя дамовы былі заключаны Вітаўтам у 1430 г. з разанскім і адоеўскім князямі. На з'ездзе 1430 г. разам з мітрапалітам Фоціем прысутнічалі і рускія князі: маскоўскі, цвярскі, разанскі і адоеўскі, што падкрэслівала аўтарытэт і вагу вялікага князя Вітаўта ў рускіх землях.

## ТАТАРСКІ НАПРАМАК ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВІТАЎТА

Адносіны з татарамі ў канцы XIV ст. сталі прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага. Пачатак сувязям Вітаўта з татарамі паклаў хан Тахтамыш. Ён аб'яднаў пад сваёй уладай Белую і Залатую Арду, а потым нават выступіў супраць Тамерлана, які здзейсніў тры паходы супраць мяцежнага Тахтамыша і пазбавіў яго ўладанняў. Вітаўт прыняў апальнага хана, бо бачыў магчымасць з яго дапамогай пашырыць сваю ўладу на ўсходзе Усходняй Еўропы. Па звестках летапісцаў, яны заключылі дамову, паводле якой Вітаўт абавязваўся дапамагчы Тахтамышу вярнуць Залатую Арду, а той – зрабіць Вітаўта ўладаром не толькі Маскоўскага княства і Наўгародскай зямлі, але і ўсёй Русі. Сапернік Тахтамыша, хан Залатой Арды Цімур-Кутлуг неаднойчы патрабаваў выдаць мяцежніка, але Вітаўт адмаўляўся і рыхтаваўся да вайны з татарамі.

Першы паход супраць татар Вітаўт здзейсніў яшчэ ў 1398 г. Ён атрымаўся дастаткова паспяховы: была пабудавана крэпасць у ніжнім цячэнні Дняпра, у Вялікае Княства Літоўскае вывезлі татарскі палон. Менавіта з гэтага моманту пачынаецца гісторыя беларускіх татар. У 1399 г. супраць татарскай конніцы Цімура-Кутлуга Вітаўт павёў не толькі войска Вялікага Княства Літоўскага, але і татар Тахтамыша, а таксама дапаможныя атрады палякаў і немцаў. Папа рымскі абвясціў крыжовы паход супраць Залатой Арды. Зборным пунктам быў прызначаны Кіеў, а адтуль аб'яднаныя войскі Вітаўта рушылі да р. Ворсклы, дзе спаткалі арду Цімура-Кутлуга. Залатаардынскі хан чакаў дапамогі ад цемніка Эдыгея, таму зрабіў выгляд, што згодны заключыць мір і плаціць Вітаўту даніну. Але, пасля таго як да р. Ворсклы падышла арда Эдыгея, перавага апынулася на баку татар. Бітва адбылася 12 жніўня 1399 г., войскі Вітаўта былі акружаны і разбіты.

Планы Вітаўта зрабіцца ўладаром Усходняй Еўропы рухнулі. Перамога ў гэтай бітве дазволіла Цімуру-Кутлугу зрабіць спусташальны набег на землі Кіеўшчыны і Валыні, але Вялікае Княства Літоўскае здолела захаваць кантроль над Паўночным Прычарнамор'ем. Тахтамыш збег у Сібір, дзе

было нямала яго паплечнікаў. У бітве на р. Ворскле загінула значная колькасць князёў Гедымінавічаў, сярод іх Андрэй і Дзмітрый Альгердавічы, а таксама Глеб Святаславіч Смаленскі, Іван Бельскі, без вестак прапаў кракаўскі кашталян Спытка з Мельштына. Паражэнне на р. Ворскле стала адной з прычын змен у адносінах з Каралеўствам Польскім і падпісання Віленска-Радамскай уніі 1401 г.

У пачатку XV ст. у Залатой Ардзе працягваліся ўсобіцы. У 1416 г. хан Саладзін, сын Тахтамыша, які прыязджаў да Вітаўта, быў забіты сваім братам Керымбярдзеем. Ад свайго імя Вітаўт у Вільні паставіў ханам Бетсабулу, каб той змагаўся з Керымбярдзеем. Але Эдыгей, які падтрымліваў апошняга, здзейсніў разбуральны набег на Кіеўскую зямлю. Керымбярдзей здолеў перамагчы ва ўнутрыпалітычнай барацьбе і забіў свайго саперніка Бетсабулу, але ў хуткім часе сам быў забіты сваім братам. Хан Залатой Арды абапіраўся на падтрымку Вітаўта, і Эдыгей быў вымушаны шукаць міру з вялікім князем літоўскім. І надалей барацьба ў Ардзе, дзе часам змагалася шэсць прэтэндэнтаў за ўладу, не абыходзілася без уплыву Вітаўта. З аднаго боку, гэта давала вялікаму князю магчымасць вырашаць на сваю карысць пытанні, якія тычыліся адносін з рускімі княствамі, бо іх вярхоўным гаспадаром з'яўляўся залатаардынскі хан. Многія прэтэндэнты на ўладу, якія не адчувалі сябе ўпэўнена, шукалі ў Вітаўта падтрымкі і імкнуліся выказаць яму сваю павагу, як, напрыклад, хан Махмет, які быў абавязаны вялікаму князю літоўскаму сваім узвышэннем. З іншага боку, варожа настроеныя прэтэндэнты на ўладу ў Ардзе час ад часу рабілі разбуральныя напады на паўднёвыя межы Вялікага Княства Літоўскага і выводзілі палон.

У цэлым знешнюю палітыку Вітаўта на ўсходнім напрамку можна прызнаць паспяховай. Яму ўдалося далучыць да Вялікага Княства Літоўскага вялікія тэрыторыі. На ўсходзе яго ўладанні сягалі вярхоўяў Акі і Мажайска, ён адабраў у татар Паўднёвую Падолію і пашырыў межы сваёй дзяржавы да Чорнага мора, а каб замацавацца там, пабудаваў апорныя гарады Дашэў (Ачакаў), Сакалец (Вазнясенск), Каравул, Хаджыбей. ВКЛ пры Вітаўце стала самай значнай сілай ва Усходняй Еўропе. Вялікі князь прымаў самы актыўны ўдзел ва ўнутрыпалітычнай барацьбе ў Ардзе. Ён стаў апекуном свайго ўнука, маскоўскага князя Васіля II, і без яго згоды ў Вялікім Княстве Маскоўскім не магло быць прынята ні адно значнае палітычнае рашэнне. Нявырашаным пры жыцці Вітаўта засталося пытанне аб далучэнні Ноўгарада і Пскова. Пры гэтым у сваёй знешнепалітычнай дзейнасці Вітаўт выкарыстоўваў самыя розныя сродкі: сямейна-шлюбныя сувязі, палітычныя саюзы, прамое палітычнае і ваеннае ўмяшальніцтва.

# ЗАХОДНІ НАПРАМАК ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВКЛ

Стаўленне Вітаўта да Ордэна пасля 1392 г. значным чынам адрознівалася ад адносін паміж імі ў 80-я гг. XV ст. Падчас сваёй барацьбы супраць Ягайлы Вітаўт двойчы звяртаўся па дапамогу да крыжакоў. Першы раз – пасля пабегу з Крэўскага замка ў 1382 г. Тады Вітаўт атрымаў, акрамя прытулку, дыпламатычную і ваенную падтрымку: з тэрыторыі Ордэна ён вёў перамовы са сваімі прыхільнікамі ў Жамойціі, вялікі магістр звярнуўся да Ягайлы з просьбай вярнуць Вітаўту і яго брату Таўцівілу хаця б частку іх уладанняў. За гэта Вітаўт нават прымаў удзел у вайне крыжакоў супраць Вялікага Княства Літоўскага. Там жа ў 1383 г. князь быў хрышчоны і прыняў імя Вігунд, а 14 чэрвеня 1384 г. адбылося новае пацвярджэнне дамовы паміж ім і вялікім магістрам. У адпаведнасці з дамовай магістр абяцаў дапамагчы вярнуць уладанні Кейстутавічаў, а Вітаўт – служыць Ордэну і ў выпадку адсутнасці дзяцей, перадаць яму свае землі. Аднак Ягайла ў гэты час вёў перамовы пра шлюб з польскай каралевай Ядзвігай і быў зацікаўлены ў вырашэнні праблем са сваім стрыечным братам, паабяцаў вярнуць яму бацькоўскую спадчыну. Вітаўт прыбыў у Вялікае Княства Літоўскае, але Ягайла свае абяцанні не выканаў. Трокі, уладанні Кейстута, былі перададзены Скіргайлу, а пісьмовых гарантый на тыя землі, якія Вітаўт атрымаў пасля 1384 г., Ягайла выдаць не пажадаў.

З гэтай прычыны Вітаўт другі раз звярнуўся за падтрымкай у Ордэн і 19 студзеня 1390 г. падпісаў грамату, у якой пацвердзіў свае папярэднія абяцанні. Напачатку 90-х гг. XV ст. Вітаўт актыўна ўдзельнічаў у аперацыях крыжакоў супраць Вялікага Княства Літоўскага. Напрыклад, у 1391 г. ён захапіў Гародню, праўда, не без дапамогі літоўскай часткі гарадзенскага гарнізона. Але залежнае становішча і цьмяныя перспектывы вяртання сваёй спадчыны прымушалі Вітаўта шукаць іншыя шляхі. Магчыма, планы адносна паўторнай здрады Ордэну ўзніклі ў Вітаўта ў 1391 г., калі ён з дазволу крыжакоў сабраў сваякоў, якія былі размешчаны па розных прускіх гарадах як закладнікі, у Рытэрсвердзе, сваёй рэзідэнцыі. У гэты ж час плоцкі епіскап Генрых, афіцыйны польскі пасол на мірных перамовах з Ордэнам, паведаміў Вітаўту, што Ягайла гатовы перадаць яму землі Кейстута, як і іншыя землі разам з тытулам вялікага князя літоўскага.

Летам 1392 г. Вітаўт нечакана правёў шэраг аперацый: спаліў ордэнскія ўладанні Нейгартэн і Метэмбург, захапіў немцаў, якія размяшчаліся ў Гародні, і пакінуў там моцны гарнізон. За гэта вялікі магістр пакараў апошніх закладнікаў, якія яшчэ заставаліся ў яго руках. Былі забіты абодва сыны Вітаўта, а Жыгімонта Кейстутавіча закавалі ў кайданы. Адносіны паміж

Ордэнам і Вітаўтам сталі адкрыта варожымі. Паходы рыцараў у ВКЛ адбываліся адзін за адным. У 1392 г. аб'яднаныя сілы крыжакоў асадзілі Вільню, праўда, безвынікова. Пасля гэтага зносіны паміж рыцарамі і Вялікім Княствам Літоўскім абмяжоўваліся кароткімі памежнымі сутычкамі і перамір'ямі для абмену палоннымі. Вялікі магістр знаходзіўся пад моцным знешнепалітычным ціскам з боку імператара Венцэслава, але ён імкнуўся заключыць асобны мір з Каралеўствам Польскім, каб мець магчымасць і далей ваяваць за далучэнне Жамойціі і іншых зямель Вялікага Княства Літоўскага. Гэтаму актыўна супраціўляліся як польскія кіруючыя колы, так і сам Вітаўт.

Перамовы паміж усімі зацікаўленымі бакамі беспаспяхова цягнуліся да красавіка 1398 г., калі Вітаўт заключыў асобную мірную дамову з Ордэнам. Напярэдадні польская каралева Ядзвіга заявіла свае правы на землі Вялікага Княства Літоўскага і запатрабавала ад Вітаўта штогадовую даніну. Яе непакоіла пашырэнне меж Вялікага Княства Літоўскага і яго палітычнае ўмацаванне, і ў першую чаргу далучэнне Вітаўтам Падолля. І хоць пазіцыя Ядзвігі не супадала з пазіцыяй Ягайлы па гэтым пытанні, Вітаўт вырашыў больш не трымацца агульнай з Каралеўствам Польскім палітыкі ў адносінах да крыжакоў. Дамова паміж Вітаўтам і вялікім магістрам Ульрыхам фон Юнгінгенам была заключана 12 кастрычніка 1398 г. на выспе Салін у ніжнім цячэнні Нёмана. У адпаведнасці з гэтым актам Вітаўт саступаў частку сваіх уладанняў (пераважна ў Жамойціі) і абяцаў пабудаваць за свой кошт дзве або тры крэпасці для рыцараў. За гэта яны павінны былі вызваліць Жыгімонта Кейстутавіча, які ўсё яшчэ знаходзіўся ў Ордэне. Вітаўт абяцаў клапаціцца пра распаўсюджанне каталіцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім і абавязваўся дапамагчы рыцарам заваяваць Пскоў, а тыя – падпарадкаваць Вітаўту Вялікі Ноўгарад і стрымаць націск татар. Асобна было прапісана, што Вітаўт не будзе прапускаць праз свае землі войскі, нават хрысціянскіх уладароў, якія будуць ісці супраць крыжакоў. Аналагічныя абавязкі наконт праходу варожых сіл па тэрыторыі Ордэна ў бок Вялікага Княства Літоўскага бралі на сябе і рыцары. Апошні пункт пагаднення меў яўны антыпольскі характар, бо праз Вялікае Княства Літоўскае на Ордэн маглі прайсці войскі толькі аднаго хрысціянскага манарха – польскага караля.

Пасля Салінскага пагаднення мірныя адносіны з крыжакамі пратрывалі нядоўга – да 1401 г. За гэты час рыцары ўдзельнічалі ў кампаніі супраць татар, а Вітаўт дапамагаў ім падчас паходаў у Жамойцію. Заключэнне Віленска-Радамскай уніі прывяло да пагаршэння адносін паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Ордэнам. У 1402–1403 гг. рыцары правялі некалькі

спусташальных набегаў на ВКЛ. Летам 1402 г. яны арганізавалі вялікі паход на Вільню, у якім удзельнічаў князь Свідрыгайла. Вітаўт у адказ арганізаваў ваенную кампанію супраць некаторых ордэнскіх гарадоў. Але абодва бакі былі абмежаваны знешнімі абставінамі ў заключэнні мірнай дамовы.

Вялікага князя літоўскага непакоілі ўсходнія суседзі, асабліва смаляне, а вялікі магістр атрымаў ад папы ліст, у якім забаранялася ваяваць з Вітаўтам. Чарговы мір паміж Вялікім Княствам Літоўскім, Каралеўствам Польскім і Ордэнам быў заключаны 23 мая 1404 г. у Рацянжы і па змесце адпавядаў Салінскаму міру, за выключэннем артыкула, у якім Вітаўт абяцаў дапамагаць вялікаму магістру супраць усіх ворагаў, акрамя польскага караля.

Чарговы разлад паміж Тэўтонскім ордэнам з аднаго боку і Каралеўствам Польскім і Вялікім Княствам Літоўскім з другога выклікаў паўстанне жамойтаў супраць ордэнскай улады, якое пачалося ў канцы 1409 г. Вітаўт заступіўся за жамойтаў, а польскі кароль яго падтрымаў. У сваю чаргу вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген аб'явіў Ягайлу вайну. Менавіта так была справакавана ваенная кампанія 1409–1411 гг., якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай Вялікая вайна. У 1409 г. ордэнскае войска хутка заняло спрэчныя польска-ордэнскія тэрыторыі – Добжынскую зямлю і Паўночную Куявію (на поўначы Польшчы), а Вітаўт авалодаў Жамойціяй. Пасля ў баявых дзеяннях наступіў перапынак, неабходны варагуючым бакам для адпаведнай дыпламатычнай і ваеннай падрыхтоўкі. Разам з тым канфлікт паспрабавалі вырашыць пры дапамозе міжнароднага арбітражу пад старшынствам чэшскага караля Вацлава IV, але вынесены ім прысуд быў цалкам на карысць Ордэна, за якім пакідаліся ўсе правы на спрэчныя землі, і Вітаўт, як і Ягайла, не прызнаў яго.

У снежні 1409 г. Вітаўт і Ягайла сустрэліся ў Берасці, дзе абмеркавалі план летняй кампаніі 1410 г.: час і месца збору аб'яднаных сіл, далейшы ход вайны і г. д. Войска Вялікага Княства Літоўскага было прадстаўлена харугвамі з Берасця, Віцебска, Ваўкавыска, Дарагічына, Ліды, Полацка, Пінска, Смаленска і інш., а таксама татарскай конніцай і чэшскімі атрадамі.

Баявыя дзеянні былі распачаты вясной 1410 г. У канцы чэрвеня – пачатку ліпеня аб'яднаныя польска-літвінскія сілы здолелі пераправіцца праз Віслу на тэрыторыю Ордэна і рушылі ў бок сталічнай цытадэлі Ордэна – Мальбарка. Вялікі магістр не чакаў з'яўлення арміі праціўніка на сваёй тэрыторыі, але здолеў своечасова сабраць неабходныя сілы і перакрыць шлях да сталіцы. Вырашальная бітва адбылася 15 ліпеня 1410 г. на полі паміж Таненбергам і Грунвальдам. У ордэнскага войска была больш зручная пазіцыя для атакі, бо яно размяшчалася на ўзгорку. Пасля шасці гадзін напружанай бітвы рыцары пачалі адступаць і Ульрых фон Юнгінген павёў

у наступленне харугвы рэзерву, якія прарвалі фронт і выйшлі ў тыл войска, але былі акружаны і знішчаны. Загінуў і сам вялікі магістр.

Перамога ў Грунвальдскай бітве вырашыла далейшы ход вайны. Саюзнікі рушылі пад сцены Мальбарка. Аднак доўгатэрміновая аблога не прынесла чаканага выніку – замкі не былі ўзяты, а Ордэн не прызнаў свайго канчатковага паражэння і не згадзіўся на тэрытарыяльныя саступкі. Фактычна да 1411 г. падчас зняцця аблогі і вяртання войск у свае дзяржавы і Ягайла, і Вітаўт адчувалі прысмак паразы. Нават беларускае летапісанне праз дзясяткі гадоў адзначала паход у Прусію як прыватную вайну караля і вялікага князя.

Пазіцыя вялікага князя Вітаўта, як і польскага караля Ягайлы, па гусіцкім пытанні ад самага пачатку была неадназначнай. З аднаго боку, абодва манархі выступалі як барацьбіты за распаўсюджанне каталіцкай веры сярод паганцаў і схізматыкаў, а таксама за аб'яднанне цэркваў. Яны пастаянна падвяргаліся ціску ад каталіцкай царквы ў справе барацьбы з гусіцкай ерассю. З іншага боку, пазіцыі Каралеўства Польскага, Вялікага Княства Літоўскага і гусітаў шмат у чым былі блізкімі.

Кароль Жыгімонт Люксембургскі, які атрымаў чэшскую карону ў жніўні 1419 г., быў непрымальнай фігурай для гусітаў, бо вельмі нецярпіма адносіўся да своеасаблівага веравызнання і лічыўся галоўным ініцыятарам пакарання смерцю Яна Гуса. Разам з тым у яго былі напружаныя адносіны і з Вітаўтам з-за т. зв. Брэслаўскага прыгавору. Калі ў 1419 г. Жыгімонт выступіў пасрэднікам у спрэчках паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Тэўтонскім ордэнам аб правах на Жамойцію, то цалкам падтрымаў патрабаванні рыцараў. Збліжэнню Вітаўта і гусітаў таксама спрыяла барацьба супраць агульнага ворага – немцаў. Спачуванне ў польскага і літоўскага набілітэту выклікала палажэнне гусіцкага вучэння аб духавенстве. І калі польскія каталіцкія епіскапы не дазвалялі Ягайлу адкрыта прыняць пад сваю апеку гусітаў, Вітаўт не быў так абмежаваны з-за слабасці каталіцкай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Да таго ж Вітаўт быў абсалютна індыфірэнтным у справах асабістага веравызнання, хоць яго цікавілі сацыяльны і палітычны аспекты гусіцкага вучэння (у 1413 г. Іеранім Пражскі прыязджаў у Вялікае Княства Літоўскае, быў прыняты Вітаўтам і прапаведаваў у Полацку). Нават на Канстанцкім саборы (1414–1418) свецкая дэлегацыя Каралеўства Польскага, якая па гусіцкім пытанні прадстаўляла і пазіцыю Вітаўта, выступала за мяккі прыгавор у адносінах да Яна Гуса і нават наведала яго ў зняволенні.

Таму і не дзіўна, што ў 1420 г. гусіты прапанавалі чэшскую карону Ягайлу, але той пад ціскам каталіцкай царквы і польскай знаці быў выму-

шаны адмовіцца. Пасля гэтага гусіты звярнуліся да Вітаўта, і той згадзіўся прыняць чэшскую карону. У адпаведнасці з заключаным пагадненнем Вітаўт прызначыў намеснікам у Чэхіі свайго пляменніка Жыгімонта Карыбутавіча, але чэхі настойвалі на тым, каб вялікі князь асабіста прыехаў у Прагу. Акрамя таго, Вітаўт абвясціў намер прымірыць гусітаў з каталіцкай царквой (гэта задавальняла памяркоўнае крыло гусіцкага руху).

На працягу двух гадоў (1421–1422) Жыгімонт Люксембургскі і пантыфік угаворамі спрабавалі прымусіць Вітаўта адмовіцца ад падтрымкі гусітаў. У сваю чаргу вялікі князь прасіў папу рымскага зняць праклён хаця б з часткі гусітаў і вярнуцца да перамоў, бо рэпрэсіўныя меры не далі плёну. У выніку перамовы зайшлі ў тупік, і ў 1422 г. Жыгімонт Карыбутавіч з войскам рушыў у Чэхію. Ён сабраў сойм у Чаславах і на ім прысягнуў прытрымлівацца гусіцкіх кампактаў, а затым быў абвешчаны намеснікам Чэшскага каралеўства. Па першым часе Жыгімонт Карыбутавіч удала падавіў хваляванні і заключыў пагадненне з апазіцыйна настроеным лідарам табарытаў Янам Жыжкам.

Аднак хутка сітуацыя пагоршылася як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне. Пастаянныя скаргі імператара, пагрозы папы і магчымая вайна з Ордэнам, якія сталі рэакцыяй на паход Жыгімонта Карыбутавіча ў Чэхію, зрабілі пазіцыю Вітаўта больш кампраміснай. У сакавіку 1423 г. адбылася сустрэча польскага караля і германскага імператара, падчас якой Ягайла ад свайго імя і імя Вітаўта заключыў пагадненне з Жыгімонтам. Пасля гэтага Вітаўт адазваў Жыгімонта Карыбутавіча з Чэхіі і паведаміў гусітам, што яны памыліліся наконт яго абяцання абараняць іх артыкулы, а таксама раіў ім памірыцца з каталіцкай царквой. У адказ імператар адмовіўся ад свайго рашэння адносна мяжы паміж землямі Вітаўта і Ордэнам, у выніку чаго Жамойція была канчаткова далучана да Вялікага Княства Літоўскага.

Загад на вяртанне Жыгімонта Карыбутавіча не быў успрыняты гусітамі як канчатковы разрыў з вялікім князем Вітаўтам. Яны працягвалі лічыць яго сваім гаспадаром. Вітаўт таксама не прадпрымаў рашучых крокаў для падтрымкі Жыгімонта Люксембургскага ў яго барацьбе з чэхамі. На думку некаторых гісторыкаў, менавіта нежаданне Ягайлы і Вітаўта ваяваць супраць нядаўніх саюзнікаў сарвала вялікі крыжовы паход супраць гусітаў у 1423 г. Хоць абодва манархі і абяцалі сваю дапамогу папу рымскаму і імператару Жыгімонту ў гусіцкім пытанні, рашучых дзеянняў не прадпрымалі і далей.

У такіх абставінах памяркоўнае крыло гусітаў звярнулася да Жыгімонта Карыбутавіча з просьбай вярнуцца. У чэрвені 1424 г. разам з паўтаратысячным атрадам ён з'явіўся пад сценамі Прагі, дзе быў сустрэты з вялікай

павагай. Жыгімонт Карыбутавіч публічна прыняў прычасце (хлебам і віном) і абвясціў сябе каралём, за што быў адлучаны ад каталіцкай царквы. На некаторы час ён змог аб'яднаць вакол сябе Чэхію: памірыўся з лідарам табарытаў Янам Жыжкам, заваяваў прыхільнасць памяркоўнай зямельнай шляхты і замацаваўся ў Празе. Пад яго кіраўніцтвам 16 ліпеня 1426 г. аб'яднаныя сілы гусітаў перамаглі войскі імператара пры Аўсінгу на Эльбе. Але Жыгімонт Карыбутавіч імкнуўся да паразумення з польскім каралём, вялікім князем літоўскім і папам рымскім, бо разумеў, што непапулярнасць Жыгімонта Люксембургскага ў Чэхіі можа даць яму шанец стаць легітымным чэшскім каралём, прызнаным і іншымі манархамі. Яго лісты былі перахоплены радыкальна настроенай беднатой, якая адмоўна ставілася да кампраміснай палітыкі караля-іншаземца. Паднялося паўстанне, Жыгімонт Карыбутавіч быў зняволены і праз чатыры месяцы высланы за межы Чэхіі.

У межах рэалізацыі дамовы уніі, заключанай у замку ў Крэве 14 жніўня 1385 г., 15 лютага 1386 г. Ягайла прыняў у Кракаве каталіцкі хрост, а праз тры дні абвянчаўся з прадстаўніцай Анжуйскага дому, манархам Польшчы Ядзвігай, і пад імем Уладзіслава II узышоў на каралеўскі трон. Ужо ў час каранацыі ў ВКЛ успыхнула паўстанне, якое, хоць і было падаўлена намеснікамі вялікага князя, паказала недасканаласць сістэмы кіравання дзяржавай у час адсутнасці гаспадара ў межах дзяржавы. У кароткі перыяд большасць прадстаўнікоў роду Гедымінавічаў былі вымушаны прынасіць васальныя прысягі на імя каралевы Ядзвігі і караля Уладзіслава, якія пацвярджалі права на валоданне ўдзеламі ўнутры ВКЛ. А ў 1387 г. Ягайла асабіста наведаў дзяржаву, дзе правёў хрост жыхароў-язычнікаў, заснаваў каталіцкую віленскую епархію, выдаў прывілеі, якія сфарміравалі новую прававую аснову для развіцця феадальнага саслоўя (а магдэбургскае права, нададзенае жыхарам Вільні, спрыяла развіццю і мяшчанскага саслоўя на аснове заходнееўрапейскай прававой сістэмы).

Гэта прывяло да змен і адначасова да канфрантацыі паміж прадстаўнікамі арыстакратыі, знаццю, намеснікамі вялікага князя (Скіргайлы, а затым і Вітаўта) і прадстаўнікамі роду Гедымінавічаў. Каралеўства Польскае адначасова станавілася і партнёрам (ваенным, знешнепалітычным), і канкурэнтам для палітычнай эліты ў барацьбе за атрыманне кантролю над уласным манархам. Менавіта таму перад 1399 г. адбылася кансалідацыя ўсіх феадалаў дзяржавы вакол ідэі паходу ў поле супраць татар, які быў падтрыманы і прадстаўнікамі роду Гедымінавічаў, і арыстакратыяй (князямі), і прыхільнымі да Вітаўта суседнімі магнатамі (напрыклад, Спыткам з Мельштына). Аднак расчараванне ад паразы закранула статус Вітаўта як самастойнага кіраўніка ВКЛ і ідэю вядзення свяшчэннай вайны супраць татар сіламі толькі

заходніх зямель Русі. Таму паражэнне на р. Ворскле 12 жніўня 1399 г. поўнасцю змяніла расстаноўку сіл у дзяржаве (быў страчаны ўзаемны давер паміж Вітаўтам і феадаламі). З гэтага моманту паміж Каралеўствам Польскім і ВКЛ наступіў новы этап стасункаў – этап паступовай інтэграцыі, якая прывяла да выбудовы сістэмы ўзаемаадносін новага тыпу.

Паспрыяла змене формы адносін не толькі паражэнне Вітаўта на Ворскле, але і смерць каралевы Ядзвігі, і прызнанне польскай палітычнай элітай Ягайлы самастойным каралём. Уладзіслаў II пашырыў правы польскай шляхты і паспрабаваў уключыць яе ў вырашэнне лёсу ўлады і дзяржаўнасці ВКЛ. У 1401 г. у Вільні, а затым у Радаме пачынаюцца перамовы паміж прадстаўнікамі дзяржаў, якія завяршыліся падпісаннем трох актаў уніі. Галоўныя дасягненні перамоў заключаліся ў кантролі з боку польскай палітычнай эліты пасада пасля смерці Вітаўта, удзелу феадалаў ВКЛ нароўні са шляхтай Польшчы ў выбарах свайго манарха і нават польскага караля.

Ужо ад пачатку XV ст. дзве дзяржавы рыхтаваліся да вырашальнай вайны з Тэўтонскім ордэнам, таму палітычны саюз, прапісаны ў актах Віленска-Радамскай уніі, быў абумоўлены больш шчыльнай падрыхтоўкай да вайны, дзе ВКЛ павінна было выступіць на баку Польшчы і не здрадзіць ёй у апошні момант. Пасля выйгранай Вялікай вайны 1409–1411 г. і доўгага шляху караля Уладзіслава-Ягайлы праз землі ВКЛ да Кракава Вітаўт дамогся змены ўмоў уніі 1401 г.

Так, у мястэчку Гародля на Валыні прайшоў сумесны сойм Каралеўства Польскага і ВКЛ, які завяршыўся падпісаннем 2 кастрычніка 1413 г. новай уніі, якая стала своеасаблівым пераглядам умоў папярэдняй Віленска-Радамскай уніі і больш поўна ўлічвала інтарэсы ВКЛ як раўнапраўнага палітычнага партнёра Польшчы, адасабляючы дынастычныя інтарэсы ад дзяржаўных. Шляхта і гаспадар атрымалі права выбіраць манарха Каралеўства Польскага, а працэдура выбару вялікага князя даручалася Радзе, манарху і панам Польшчы.

Гарадзельская унія паклала пачатак пераймання феадаламі ВКЛ традыцый рыцарскай рэпрэзентацыі (гербавае брацтва), абмяжоўвала доступ да кіравання дзяржавай знаці некаталіцкага веравызнання, што выяўлялася ў модзе двара вялікага князя Вітаўта, афармленні яго рэзідэнцыі ў Троках, актыўным ўдзеле ў справах царкоўных сабораў. Пачалася вестэрнізацыя палітычнага жыцця ВКЛ. Чым больш відавочнай станавілася роля ў гэтым самога Вітаўта, тым больш ясна бачыўся прагрэс інтэграцыі ў цэнтральнаеўрапейскую палітычную і культурную прастору.

Апошнім этапам, які падзяліў палітычныя колы дзяржаў на антаганістычныя групы, стаў перыяд «шлюбных войнаў». Да 1424 г. ні Ягайла,

ні Вітаўт так і не займелі нашчадкаў. У 1422 г. Ягайла вырашыў ажаніцца з літвінкай – Соф'яй Гальшанскай, прадстаўніцай знаці ВКЛ. У шлюбе з Ягайлам Соф'я Гальшанская нарадзіла каралю трох сыноў (двух Казіміраў і аднаго Уладзіслава), двое з якіх выжылі і маглі прэтэндаваць на каралеўскі пасад. У 1427 г. у Каралеўстве Польскім быў праведзены судовы працэс, мэтай якога было высвятленне сапраўднага паходжання спадчыннікаў Ягайлы. Падчас працэсу Вітаўту прапаноўвалася афіцыйнае пагадненне паміж польскай знаццю і вялікім князем літоўскім пра магчымасць апошнім заняць каралеўскі трон у Кракаве. Аднак палітычная акцыя не была рэалізавана: Вітаўт стаў на бок Ягайлы. І пасля апраўдання Соф'і Гальшанскай кароль Уладзіслаў быў зацікаўлены ў працэсе адасаблення ВКЛ ад Каралеўства Польскага, маючы патрэбу не ў адной, а ў дзвюх каронах для двух сваіх сыноў.

У студзені 1429 г. адбыўся еўрапейскі кангрэс у Луцку, дзе абмяркоўвалі правядзенне Усяленскага царкоўнага сабора і вырашэнне сітуацыі ў Чэхіі. Прысутныя не прыйшлі да адзінага рашэння, і галоўным вынікам мерапрыемства стала агучаная Жыгімонтам Люксембургскім прапанова аб утварэнні новага еўрапейскага каралеўства і каранацыя Вітаўта. Працэс па легалізацыі падобнага рашэння ў межах Еўропы вырашаўся больш за палову года на ўзроўні іерархаў царквы і легістаў універсітэтаў. Была створана адмысловая карона. Знайшоўся біскуп, які яе асвяціў. Аднак у прызначаны час – на Раство Найсвяцейшай Дзевы Марыі (8 верасня 1430 г.) – каранацыі так і не адбылося.

У крыніцах і літаратуры гэты эпізод пазначаны як «каранацыйная бура». Узвядзенне вялікага князя Вітаўта ў каралеўскую годнасць і пераўтварэнне Вялікага Княства ў каралеўства было выгадна і абодвум манархам, і палітычнай эліце. Змена статусу дзяржавы дазваляла арыстакратам і знаці трымаць пад кантролем уладу ў ВКЛ як пры старым Вітаўце, так і пасля яго смерці, уплываць на палітыку дзяржавы, не спадзяваючыся на волю польскіх намеснікаў. Аднак 27 кастрычніка пасля хваробы вялікі князь памёр на руках у караля Ягайлы, так і не дачакаўшыся прызнання сваіх дасягненняў у еўрапейскай палітыцы.

Вялікі князь Вітаўт змог пераадолець дынастычны крызіс, умацаваўшы сваю ўладу з дапамогай адміністрацыйна-тэрытарыяльнага пераўладкавання дзяржавы і рэалізацыі палітыкі цэнтралізацыі, стварэння дзяржаўнага апарату, які не залежаў ад прысутнасці ў кіраванні прадстаўнікоў роду Гедымінавічаў, быў адданы толькі ўласна Вітаўту. У царкоўнай палітыцы Вітаўт прытрымліваўся прынцыпу шматканфесійнасці, пры гэтым спрабаваў прэзентаваць свае палітычныя рашэнні на трывалым ідэалагічным

падмурку: ці царкоўны сабор у Навагародку, ці крыжовы паход на татар, ці еўрапейскі кангрэс у Луцку. Знешняя палітыка Вітаўта была накіравана на ўмацаванне меж ВКЛ і максімальнае замірэнне з дзяржавамі-суседзямі.

Смерць вялікага князя Вітаўта пакінула шмат пытанняў перад палітычнай элітай дзяржавы. Новая арыстакратыя ўжо не магла згадзіцца на абмежаванні сваіх праў і пераваг, якія давалі княжацкія прывілеі, новая вера і статус, гарантаваныя уніямі з Польшчай.

Знешняя палітыка ВКЛ у канцы XIV – першай трэці XV ст. характарызавалася актыўнымі ваенна-палітычнымі дзеяннямі на ўсходнім напрамку, далучэннем рускіх княжанняў і ўстанаўленнем кантролю на паўднёва-ўсходнім памежжы татарскіх орд, актыўнай палітыкай у адносінах да Прусіі і Лівоніі, пашырэннем палітычнай прысутнасці ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе (прынамсі, Чэхіі і Валахіі). Адбылася эвалюцыя адносін з Каралеўствам Польскім і каралём Уладзіславам-Ягайлам, якія прайшлі шлях ад васальнай залежнасці да прызнання неабходнасці пераўтварэння ВКЛ у новае еўрапейскае каралеўства.

У перыяд кіравання Вітаўта княства перажыло не толькі вялікія перамогі, якія ўзвышалі вобраз манарха і дзяржавы, але і значныя палітычныя паражэнні, на якія своеасабліва рэагавала і палітычная эліта дзяржавы, і сістэма кіравання. Аднак асоба Вітаўта як харызматычнага і жорсткага палітычнага лідара дазволіла закансерваваць асноўныя сацыяльна-палітычныя праблемы да смерці гаспадара.

# 14 УНУТРЫПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У 30–40-я гг. XV ст.

- **Асноўнае кола канфлікту**
- **Этапы канфлікту**
- **Вынікі ўнутрыпалітычнай барацьбы ў 30–40-я гг. XV ст.**

## АСНОЎНАЕ КОЛА КАНФЛІКТУ

Падзеі 1430–40-х гг. завяршылі перыяд станаўлення ВКЛ, фарміравання тэрытарыяльнай і адміністрацыйнай цэласнасці дзяржавы, яе найвышэйшага тэрытарыяльнага пашырэння, знешнепалітычнай вагі ва Усходняй Еўропе, пацверджанай запланаванай акцыяй стварэння новага еўрапейскага каралеўства – Regni Lithuanorum. Смерць вялікага князя Вітаўта выклікала неабходнасць змен, якія трэба было правесці ў дзяржаве і якіх так чакала грамадства. Уніі з Каралеўствам Польскім, планаваная царкоўная унія і роля ў ёй Гедымінавічаў; пераўтварэнні ў самім уладкаванні ВКЛ (цэнтралізацыя апарату кіравання), хуткая вестэрнізацыя палітычнай культуры і культуры эліты грамадства – усё патрабавала кардынальных змен, якія не былі праведзены за час кіравання Вітаўта. Відавочна, што для стабільнасці ўнутранага жыцця на замену харызматычнаму гаспадару патрабавалася не менш моцная і аўтарытэтная асоба. У 1430 г. гаспадаром стаў малодшы брат польскага караля Ягайлы – Баляслаў-Свідрыгайла Альгердавіч.

У аснову ўнутрыпалітычнай барацьбы ў 30–40-я гг. XV ст. была пакладзена нявырашанасць пытання землекарыстання, яго статусу для ўсіх катэгорый феадалаў ВКЛ. Вялікія зрухі ў бок афармлення праў феадалаў на зямлю (маёмасць) адбываліся дзякуючы прывілею караля Уладзіслава-

Ягайлы 1387 г. для феадалаў-католікоў. Але пытанне так і не было вырашана на агульнадзяржаўным узроўні.

Віленскі прывілей 1387 г. закранаў толькі асобную катэгорыю феадалаў ВКЛ – «новую арыстакратыю». Ён не тычыўся правоў тытулаванай знаці – князёў рускіх зямель ВКЛ. Іх маёмасныя правы былі забяспечаны на земскім узроўні «стариной». Прывілей не тычыўся пануючай дынастыі Гедымінавічаў, прадстаўнікі якой знаходзіліся ў спецыфічным становішчы ў адносінах да манарха ВКЛ і астатняй часткі феадалаў дзяржавы. Яшчэ М. К. Любаўскі адзначыў, што за права кіраваць княствамі-ўдзеламі на тэрыторыі рускіх зямель дзяржавы (зямель прыслухаючых), прадстаўнікі велікакняжацкага роду пазбаўляліся права спадчыннасці на ўладанні і маглі спадзявацца на іх перадачу сваім нашчадкам толькі пры ўмове «ласкі гаспадарскай».

Прадстаўнікі баярства мелі розныя правы, абмежаваныя і звязаныя са службай, валодалі маёмасцю «да жывата» ці «да ласкі гаспадара». Маёмаснае становішча рознілася не толькі ў залежнасці ад тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак дзяржавы, але і ад статусу службы баярына. Увядзенне намесніцтваў прывяло да змен у баярскім асяродку. Мянялася не толькі сістэма службы баяр, але і іх статус, ішло ўзвышэнне новых радоў, канцэнтрацыя ў іх руках улады пры намесніку вялікага князя (напрыклад, узвышэнне ў Полацкай зямлі роду Корсакаў) і маёмасныя наданні за службу.

Размежаванне падданых дзяржавы па канфесійнай прыналежнасці з'яўляецца досыць штучным ва ўмовах панавання цярпімасці вернікаў і ўлад да іншаверцаў ВКЛ, а таксама рэгіянальных асаблівасцей размяшчэння прыхадской сеткі хрысціянскіх канфесій.

Другой праблемай унутранай палітыкі ВКЛ з'яўлялася афармленне сістэмы кіравання. Яна не была канчаткова вырашана ні шляхам захавання права даўніны для рускіх зямель ВКЛ, ні скасаваннем буйных удзелаў прадстаўнікоў пануючай дынастыі, ні правядзеннем цэнтралізацыі дзяржавы шляхам пабудовы велікакняжацкай вертыкалі ўлады ў час праўлення вялікага князя Вітаўта, ні пачаткамі афармлення заканадаўчай сістэмы дзяржавы праз наданне абласных (земскіх) прывілеяў, прывілеяў на магдэбургскае права (Вільня, Трокі, Берасце), вызначэнне статусу царквы і г. д. Функцыянаванне гэтай сістэмы вымагала прыцягнення новых людзей, новых родаў. Узнікла кадравая праблема, абумоўленая канфесійнымі і этнічнымі складнікамі. На земскім узроўні – гэта баярства ВКЛ, на агульнадзяржаўным – арыстакратыя. Але ўзнікла розніца паміж прадстаўнікамі асобных зямель ВКЛ (аддаленасць ад рэзідэнцый манарха, залежнасць ад

ваеннай запатрабаванасці ў рэгіёне, сувязь з мясцовай элітай). На ўзроўні велікакняжацкага двара і Рады пры вялікім князі па ступені вымірання дынастыі Гедымінавічаў ішло станаўленне і кар'ерны (а таксама і маёмасны) рост прадстаўнікоў мясцовай віленскай і трокскай знаці. І, адпаведна, выцісканне знаці іншых зямель ВКЛ. У «Летапісцы» сітуацыя атрымала сваё інтэлектуальнае вымярэнне – падзел дзяржавы на Вялікае Княства Літоўскае і Вялікае Княства Рускае.

Праблемай, якая патрабавала тэрміновага вырашэння, з'яўляўся статус дзяржавы. Прыняўшы каралеўскую пасаду і не жадаючы губляць кантроль над сваёй вотчынай – Вялікім Княствам Літоўскім, – Уладзіслаў-Ягайла змяніў статус дзяржавы. Вялікі князь Іван-Скіргайла (1386–1392) кіраваў ад імя Ягайлы і з'яўляўся намеснікам і васалам манархаў Каралеўства Польскага, а не суверэнам ВКЛ. Статус вялікага князя Вітаўта пацвярджаўся неаднаразова, але статус Ягайлы вызначаўся формулай «найвышэйшы князь». Такім чынам, менш чым за 40 гадоў заходнееўрапейская тытулатура манарха ВКЛ была нівеліравана ад вялікага князя, роўнага ў статусе заходнееўрапейскаму каралю, да вялікага герцага, васала іншага гаспадара. Стаяла задача выпраўлення тытулатурнага казусу. Выйсце было прапанавана ў 1429 г. у выглядзе каранацыі вялікага князя Вітаўта і стварэння такім чынам новай дзяржаўнай адзінкі. Статус каралеўства для ВКЛ быў прынцыповы, бо толькі ён дазваляў не быць інкарпараваным у склад Польшчы. Вітаўт не дачакаўся сваёй кароны, але сама ідэя заставалася актуальнай. Таму і з імем Свідрыгайлы, і з імем Жыгімонта Кейстутавіча звязаны перамовы аб узвышэнні манарха ВКЛ шляхам атрымання каралеўскай кароны ад імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі.

Сацыяльны склад удзельнікаў унутрыпалітычнай барацьбы быў досыць разнастайны. У падзеях 30–40-х гг. XV ст. бралі ўдзел усе феадалы дзяржавы, бо іх абавязак – служыць свайму сюзерэну. На баку абодвух прэтэндэнтаў яны фарміравалі так званыя партыі. Арыстакратыя (і «старая», і «новая») рабіла выбар на карысць ці Свідрыгайлы, ці Жыгімонта. Знаходзячыся пры тым ці іншым двары, яна забяспечвала сабе кар'ерны рост і новыя маёмасныя наданні (часам замест тых, што былі ўжо згублены ў зоне кантролю саперніка). Што тычыцца баярства, то яно пераходзіла на бок моцнага разам з акупаванымі абласцямі. Адсюль узмацненне партыі Жыгімонта Кейстутавіча па меры ўзрастання кантролю над большай часткай тэрыторыі.

Гарады ВКЛ прынялі актыўны ўдзел у ваенных дзеяннях. Беларуска-літоўскія і рускія летапісы адзначаюць вядучую ролю Полацка і нават называюць яго сталіцай Свідрыгайлы. Віцебск фактычна быў рэзідэнцыяй

вялікага князя на паўночных землях. Менавіта адтуль дасылалася знешняя карэспандэнцыя. Сваю ролю ў барацьбе за ВКЛ адыгралі таксама Смаленск, Луцк і Кіеў. Гарады як цэнтры зямель вырашалі рэгіянальныя задачы (у першую чаргу паслаблялі сваіх эканамічных канкурэнтаў). З іншага боку, у асобе Свідрыгайлы яны бачылі ахоўніка «старины», непарушнасці сваіх праў і значэння ўнутры зямель.

Цікавай бачыцца і пазіцыя іерархаў хрысціянскіх цэркваў у ВКЛ. І каталіцкія біскупы, і праваслаўныя епіскапы ўяўлялі сабе наступствы кардынальных перамен у дзяржаве. У момант перавароту 1432 г. пад кантролем Жыгімонта Кейстутавіча засталіся Віленскае і Медніцкае біскупствы, пры тым што на тэрыторыі, кантралюемай Свідрыгайлам, размяшчаліся ўсе праваслаўныя епархіі ВКЛ. Перад каталіцкай іерархіяй стаяла задача падтрымкі з боку князя-патрона менавіта каталіцкай царквы. У XV ст. яна яшчэ не магла паспрачацца з праваслаўнай царквой у правядзенні місіі на беларускіх і ўкраінскіх землях без манаршай падтрымкі. Толькі прывілеі і фінансаванне з боку пануючай дынастыі дазвалялі паўстаць парафіяльнай сетцы на тэрыторыі біскупстваў. Пры гэтым іерархі каталіцкай царквы ў ВКЛ знаходзіліся ў пасіўнай апазіцыі да любых перамоў аб царкоўнай уніі з праваслаўнымі, што яскрава праявілася ў пазіцыі віленскага біскупа Мацея (у 40-я гг. XV ст. ён нават абвінавачваўся ў Рыме ў наўмысным зрыве місіі мітрапаліта-ўніята Ісідора на ўсходзе Еўропы). Праваслаўная царква ў ВКЛ была пастаўлена ў вельмі складанае юрыдычнае становішча актамі канца XIV – пачатку XV ст. Яе статус быў нявызначаны, місіянерская дзейнасць і функцыянаванне прыхадской сеткі заставаліся без прававога афармлення. Праваслаўная царква была больш незалежнай ад велікакняжацкага фінансавання, яе фундатарамі заставалася пераважная колькасць знаці ВКЛ. У 1432 г. з'явілася рэальная магчымасць мець лаяльнага да ВКЛ главу Кіеўскай мітраполіі, пасля высвячэння ў Канстанцінопалі кандыдата Свідрыгайлы – епіскапа Герасіма – мітрапалітам усяе Русі. У 1433 г. пачаліся перамовы паміж мітрапалітам Герасімам і папам Яўгенам IV аб удзеле іерарха ў рабоце Базэльскага сабора і падрыхтоўцы Усяленскага сабора. Першапачаткова абумоўленая палітычнымі рэаліямі пазіцыя каталіцкіх і праваслаўных іерархаў, а таксама знешні ціск Кракава і Канстанцінопаля ў справах царкоўнай уніі прывялі іерархаў да пазіцыі спрыяння заканчэнню ўнутрыпалітычнай барацьбы ў ВКЛ і нармалізацыі міжцаркоўных адносін на рэгіянальным узроўні.

Пэўны ўплыў на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў ВКЛ аказала палітычная і эканамічная міграцыя (у першую чаргу выхадцаў з Арды і паўночна-заходніх рускіх княстваў, а таксама выхадцаў з Цэнтральнай Еўропы).

Мігрантаў планавалася накіроўваць на ўзмацненне абароны меж дзяржавы. Яны былі зацікаўлены ў вядзенні баявых дзеянняў, якія дазвалялі атрымліваць новыя зямельныя наданні і ўзвышаць палітычную вагу пры двары гаспадара. Пры гэтым велікакняжацкая ўлада выкарыстоўвала іх сувязі з «радзімай», каб прыцягваць да сябе новыя саюзніцкія сілы.

Самай буйной катэгорыі насельніцтва ВКЛ – сялянству – ні Жыгімонт, ні тым больш Свідрыгайла не абяцалі ніякіх кардынальных змен. Адзіным засведчаным супраціўленнем развязанаму канфлікту з'яўляюцца ўцёкі «людзей» з зоны баявых дзеянняў ва ўскраінныя раёны. Тыя, хто ўжо меў абмежаваны статус у адносінах да свайго феадала, імкнуўся пазбавіцца ад яго, перасяляючыся да іншага.

Мэты і задачы ўдзельнікаў унутрыпалітычнай барацьбы адрозніваліся не толькі паміж сацыяльнымі групамі, але і ўнутры іх. Галоўнай мэтай для ўсіх катэгорый насельніцтва было вырашэнне статуснага пытання ў дзяржаве: маёмаснага і палітычнага права, а таксама месца ВКЛ адносна іншых дзяржаў рэгіёна (у першую чаргу Каралеўства Польскага). Так, перад феадаламі-каталікамі стаяла вельмі важная задача – не дапусціць ураўнання ў правах прадстаўнікоў каталіцкай і праваслаўнай знаці, між якімі існавала рознасць інтарэсаў. На паўночна-заходніх землях, Віленшчыне і Троках, «новая» арыстакратыя (Валімунтавічы, Гаштольды, Гальшанскія, Осцікавічы) адчувала патрэбу ў замацаванні свайго становішча шляхам усталявання кантролю над новым гаспадаром і памяркоўнай палітыкі ў адносінах да Польшчы. Але ўжо ў ходзе Луцкай вайны з Польшчай (1431 г.) і пасля замаху ў Ашмянах на вялікага князя гэтая частка знаці стала пераважна на бок Жыгімонта Кейстутавіча і Кароны. На поўдні ВКЛ «старая» (руская) арыстакратыя адчувала сваю недатыкальнасць у маёмасных правах, а ва ўмовах вайны за Валынь і Падолле паступова патрапіла ў вялікую палітыку. Яе задачай з'яўляўся разрыў уніі з Польшчай, перамога ў вайне над малапольскай шляхтай, вяртанне ўсяго Падолля ў склад ВКЛ.

Беларускія землі ВКЛ з 1432 г. сталі арэнай высвятлення адносін паміж войскамі Свідрыгайлы і Жыгімонта Кейстутавіча. Землі, якія не ведалі ваенных дзеянняў ужо па некалькі дзесяцігоддзяў, імкнуліся як мага хутчэй вырашыць унутрыпалітычнае пытанне. Што тычыцца галоўных гарадоў Падзвіння і Падняпроўя (Полацк, Віцебск, Смаленск), то яны сталі цытадэлямі апальнага на Літве вялікага князя Свідрыгайлы. Менавіта гэтыя гарады ўваходзілі ў летапіснае Вялікае Княства Рускае. Падчас баявых дзеянняў і бязладдзя ў дзяржаве яны праводзілі рэстаўрацыю свайго прававога становішча. Полацк фактычна змог вярнуць сабе статус палітычнага і эканамічнага цэнтра. З 1433 г. Смаленск стаў рэзідэнцыяй мітрапаліта ўсяе

Русі Герасіма і працягваў выконваць функцыі ідэалагічнага цэнтра ВКЛ (менавіта тут ствараюцца такія творы, як «Пахвала Вітаўту» і «Летапісец» 1446 г.). Віцебск стаў рэзідэнцыяй вялікага князя Свідрыгайлы, чаму не ў малой ступені садзейнічалі яго каменныя ўмацаванні. Цэнтр палітычнага жыцця дзяржавы паступова пераносіўся ў «землі прыслухаючыя», што адбівалася на актыўнасці мясцовай знаці. Феадалы-прыхільнікі Свідрыгайлы ў 1434 г. з Віцебска сведчылі лістом да Базэльскага сабору пра вернасць свайго манарха каталіцкай царкве і яго жаданні аб заключэнні уніі паміж хрысціянскімі цэрквамі на спецыяльным Усяленскім саборы.

Пры ўсёй стыхійнасці антыманаршага выступлення ў 1432 г. перад феадаламі ВКЛ стаялі дакладныя задачы. Па-першае, вайна давала шанец дамагчыся ад вярхоўнай улады новых і дакладных маёмасных праў, як гэта было ўжо зроблена польскай шляхтай у Кароне. Падзеі Луцкай вайны агалілі супярэчнасці рэгіёнаў ВКЛ. Калі на Валыні і Падоллі ў канфлікце з Польшчай бачылі выйсце з сітуацыі аб статусе дзяржаўнасці ВКЛ (аб уніях), то ў паўночнай частцы краіны гэтай вайны не жадалі. Пасля паражэння пад Луцкам у 1431 г. назіраліся ініцыятывы аб прымірэнні, якія падтрымліваў сам вялікі князь Свідрыгайла. Нарэшце ўзнікла справа замяшчэння дзяржаўных пасад пасля паражэння пад Луцкам, калі ў палон патрапілі ўраднікі ВКЛ, на іх месца манархам былі прызначаны некатолікі, што парушыла артыкул Гарадзельскага акта 1413 г.

Аднак барацьбу за ўладу паміж віленска-трокскімі і рускімі радамі нельга зводзіць да этнарэлігійных супярэчнасцей ва ўсёй дзяржаве. На баку абодвух князёў ваявалі феадалы, якія спавядалі хрысціянства і ўсходняга, і заходняга абраду.

Кароль Ягайла меў на мэце замацаванне сваёй улады і ўлады сваіх нашчадкаў у ВКЛ. Варыянт з дзвюма каронамі падыходзіў як мага лепей, бо забяспечваў абодвух сыноў Ягайлы і Соф'і Гальшанскай, каралевічаў Уладзіслава і Казіміра, уласнымі гаспадарствамі. Свідрыгайла з'яўляўся найлепшай кандыдатурай на вялікага князя, бо з'яўляўся апошнім родным братам польскага караля і, што самае галоўнае, бяздзетным. Сярод іншых законных прэтэндэнтаў на ВКЛ былі прадстаўнікі розных галін дынастыі Гедымінавічаў: Сямён-Лугвен, Жыгімонт Кейстутавіч, а таксама Алелька Уладзіміравіч і Жыгімонт Карыбутавіч. Але да прамой галіны – Альгердавічаў ад Ульяны Цвярской – адносіўся толькі Баляслаў-Свідрыгайла.

Князь Свідрыгайла ад смерці свайго бацькі Альгерда на працягу чатырох дзесяцігоддзяў змагаўся за найвышэйшы статус у дзяржаве, і яго «вайна» скончылася перамогай. Са згоды караля польскага ён быў абраны вялікім князем. Свідрыгайла хутка атрымаў паўнату ўлады ў дзяржаве, чым

выклікаў супрацьдзеянне з боку малапольскай шляхты на чале з кракаўскім біскупам Збігневам Алясніцкім. Ужо ў 1431 г. малапольская шляхта правакавала ВКЛ захопам замкаў Падолля ад імя караля. У адказ на гэта быў арыштаваны сам Ягайла. Перамовы не прывялі да згоды, і ў жніўні 1431 г. войскі ВКЛ пацярпелі паражэнне на Валыні. У дзяржаве наспела змова, галоўную ролю ў якой адыграў князь Міхаіл, сын Жыгімонта Кейстутавіча, і польскі ваявода Зарэмба Вавжынец. Такім чынам, у палітычнай гісторыі княства чарговы раз з'явілася «польская партыя». Галоўны кандыдат ад яе – Жыгімонт Кейстутавіч – пасля замаху ў Ашмянах у жніўні 1432 г. быў абвешчаны вялікім князем літоўскім, прызнаны палякамі кіраўніком ВКЛ, але толькі пажыццёва. Фармальна ВКЛ губляла сваю самастойнасць і пасля смерці князя павінна было інкарпаравацца ў склад Каралеўства Польскага.

З восені 1432 г. перад Свідрыгайлам стаяла задача вярнуць кантроль над усімі землямі ВКЛ праз усталяванне сваёй улады ў Вільні, а таксама адстаяць цэласнасць дзяржавы ў вайне з Польшчай за Падолле і Валынь. На гэта былі накіраваны ўсе паходы вялікага князя. Што тычыцца Жыгімонта Кейстутавіча, то ў яго задачы ўваходзіла ўсталяванне кантролю над як мага большай тэрыторыяй ВКЛ і паступовае прызнанне мясцовымі феадаламі сваёй улады. За персонай Жыгімонта стаялі значныя палітычныя сілы, чые мэты і задачы рэалізоўваў князь, у першую чаргу сын Жыгімонта Міхаіл. Апошні меў надзею на ўтварэнне дамена роду Кейстутавічаў у ВКЛ з тых зямель, якія ў свой час належалі Кейстуту і Вітаўту. Другую сілу ўяўляла сабой Каралеўства Польскае. Вайсковы кантынгент і польскія прадстаўнікі пры двары Жыгімонта кантралявалі манарха, «захоўвалі» яго вернасць ідэі далучэння ВКЛ да Кароны. Усё гэта цалкам адпавядала прыватным інтарэсам караля Уладзіслава-Ягайлы, які выйграваў ад усталявання ўлады сваёй дынастыі ў гэтай частцы Еўропы. Дзеля такой патрэбы польская шляхта атрымала ад манарха новыя правы і прынесла прысягу ў вернасці спадкаемцу Ягайлы Уладзіславу (будучаму каралю Уладзіславу III Варненчыку).

На палітычную барацьбу ўплываў такі ўнутраны фактар, як прававое становішча старой арыстакратыі («рускае пытанне»). Існаванне ў 30-я гг. XV ст. двух Вялікіх Княстваў з'яўляецца адначасова адлюстраваннем палітычнай рэальнасці і алегорыі крыніц XV ст. Палітычна дзяржава распалася на Вялікае Княства на чале са Свідрыгайлам і Вялікае Княства на чале з Жыгімонтам у 1432 г. і праіснавала да моманту перамоў аб пераходзе падольскіх уладанняў у васальную залежнасць да польскага караля Свідрыгайлы. Так, у 1436 г. Свідрыгайла фактычна вызнаў паражэнне ў барацьбе за велікакняжацкі пасад.

Князь Жыгімонт сеў на вялікім княжанні толькі пасля паражэння Свідрыгайлы пад Вількамірам, яго адыходу ва Украіну і падпарадкавання сваёй уладзе ў 1436 г. Полацка і Віцебска. Толькі кантроль над паўночнай часткай княства даў магчымасць Жыгімонту ў поўнай меры выконваць функцыі вялікага князя. Такім чынам, вылучэнне Вялікага Княства Свідрыгайлы і Вялікага Княства Жыгімонта – умоўнасць. Яны не мелі ні дзяржаўнага, ні этнічнага ці рэлігійнага статусу. У аснове падзелу ляжала тэрытарыяльная падначаленасць сюзерэну, якая страціла актуальнасць пры выключэнні аднаго з вялікіх князёў з сістэмы канфлікту. Метафара двух Вялікіх Княстваў – летапісны варыянт ацэнкі праблемы дзвюх частак аднаго цэлага, старой і новай.

## ЭТАПЫ КАНФЛІКТУ

Кожнаму этапу ўнутрыпалітычнай барацьбы 30-х гг. XV ст. адпавядае перамена метадаў і сродкаў вядзення барацьбы.

Першы этап ахоплівае перыяд ад замаху на вялікага князя Свідрыгайлу ў Ашмянах у 1432 г. да 1436 г. У гэты час баявыя дзеянні насілі характар прэвентыўных мер для выціскання апанентаў з палітычнай арэны дзяржавы. Асноўныя ваенныя падзеі адбываліся на двух франтах: паўночным і паўднёвым. Акцыі ў паўночных землях ВКЛ павінны былі вырашыць лёс велікакняжацкага пасада. Свідрыгайла меў за мэту вяртанне Вільні і знішчэнне Жыгімонта, а Кейстутавіч – падпарадкаванне як мага большай тэрыторыі на ўсходзе. Для Свідрыгайлы асобае значэнне мелі буйныя паходы, для Жыгімонта – рэйды ў глыб непадкантрольнай яму тэрыторыі. Асаблівасцю кампаній Свідрыгайлы можна лічыць імкненне дасягнуць бяспекі сталіцы Вільні і вымусіць знаць Віленшчыны перайсці на яго бок. Для Жыгімонта знясільванне і вынішчэнне тэрыторый адкрывала шлях для пераходу феадалаў на іншы бок. Ён, у адрозненне ад Свідрыгайлы, мог не хваляваца за сваю «велікакняжацкую рэпутацыю», бо абарона маёмасці васалаў – абавязак сюзерэна. Вялікі князь не меў дастаткова войскаў і не паспяваў на ўсіх франтах. Яму патрабавалася ці здрада і фізічнае забойства апанента, ці генеральная бітва.

Першы буйны паход на Вільню распачаўся ў лістападзе 1432 г. Ён не дасягнуў станоўчага выніку: пасля бітвы пад Ашмянамі 8 студзеня 1433 г. Свідрыгайла адступіў да Полацка. У жніўні 1433 г. войскі вялікага князя дайшлі да Коўна, дзе быў знішчаны польскі гарнізон. Але Свідрыгайла зноў вярнуўся на ўсход, спаліўшы на сваім шляху Менск і Заслаўе. Восенню 1433 г. войскі Жыгімонта Кейстутавіча ў адсутнасць вялікага князя і

асноўных ваенных сіл спрабавалі авалодаць Мсціславам і Віцебскам, але беспаспяхова. Зімой 1433/34 г. Свідрыгайла здзейсніў яшчэ адзін паход на Віленшчыну, падтрыманы палескай акцыяй Аляксандра Носа з Валыні, які захапіў Гарадок і Пінск. Але з-за наступу польскіх войск луцкі староста вярнуўся на Валынь. Рашаючы паход быў прызначаны на лета – восень 1435 г.

На паўднёвым фронце адбывалася пазіцыйная вайна паміж войскамі вялікага князя Свідрыгайлы і Каралеўства Польскага на чале з каралём за тэрыторыі Падолля і Валыні: акцыі ў ваколіцах Луцка і Бельска, паходы пад Львоў і крэпасці Падолля. Тут праявілі сябе палкаводцы Свідрыгайлы (князь Аляксандр Нос, ваявода Юрша, князь Фёдар Астрожскі) і саюзнікі (малдаўскі гаспадар Аляксандр, царэвіч Айдар і інш.).

Вайна на два франты знясільвала ваенны патэнцыял Свідрыгайлы. Ён імкнуўся хутчэй пазбавіцца ўнутранага ворага і з гэтай мэтай шукаў генеральнай бітвы. У жніўні 1435 г. да яго войск далучыліся саюзнікі з Арды і Цверы. У Браславе вялікі князь сустрэў лівонскага магістра Ф. Керскорфа, у лагеры Свідрыгайлы знаходзіліся чэшскія наёмнікі Жыгімонта Карыбутавіча. Манарх спадзяваўся перамагчы Жыгімонта Кейстутавіча адной акцыяй, але яго разрозненае ў кіраўніцтве і тактыцы бою войска нічога не магло зрабіць з арганізаваным войскам праціўніка, складзеным пераважна з польскіх наёмнікаў пад кіраўніцтвам Міхаіла Жыгімонтавіча і Якуба з Кабылян. Пад Вількамірам 1 верасня 1435 г. адбылася самая буйная бітва за гады супрацьстаяння. Свідрыгайла атрымаў паражэнне і панёс вельмі значныя страты. Вількамірская бітва паклала пачатак канца ўлады Свідрыгайлы над паўднёвай часткай ВКЛ.

Вялікі князь Свідрыгайла пайшоў на новы палітычны крок – спробу раз'яднаць саюз Польшчы і Жыгімонта. Перамовы пра пошук кампраміснага варыянта, на думку М. С. Грушэўскага, пачаліся яшчэ ў пачатку 1434 г. і працягваліся да канца 1436 г. Адначасова князь выкарыстоўваў настроі шляхты Львова, Галіча, Перамышля, Хэлма, Бэлза. У пачатку верасня 1436 г. ён заключыў дамову з польскімі панамі, паводле якой усе землі Свідрыгайлы пасля яго смерці перадаваліся польскаму каралю Уладзіславу.

Другі этап – усталяванне кантролю вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча над усёй тэрыторыяй дзяржавы, які расцягнуўся ад 1436 да 1439 г., але цалкам не быў завершаны да сакавіка 1440 г.

У ваеннай кампаніі 1435–1436 гг. Жыгімонт здолеў падначаліць сабе Смаленск. Сітуацыя на ўкраінскіх землях была іншай: вясной 1436 г. Свідрыгайла кантраляваў тэрыторыі Севершчыны, Кіеўшчыны, Усходняга Падолля і Валыні. Летам 1436 г. пад уладу Жыгімонта Кейстутавіча

перайшлі Полацк і Віцебск. Ваенны паход Жыгімонта на Луцк і Кіеў не прынёс поспеху, як і чарговая акцыя ў верасні 1437 г., калі кіеўскі ваявода Юрша нанёс паражэнне войску, накіраванаму Жыгімонтам на захоп горада. Паступова баявыя дзеянні саступілі перамовам.

У канцы 1436 г. быў скліканы сойм у Серадзі. Яго пастановы вырашылі спрэчныя тэрытарыяльныя пытанні паміж ВКЛ і Каронай на карысць Жыгімонта Кейстутавіча. Каралеўскія войскі адклікалі з Валыні ў Малапольшчу ўжо да 25 студзеня 1437 г., іх стасункі са Свідрыгайлам забараняліся. Але выкананне дагавора не было поўным: Свідрыгайла вольна знаходзіўся на Падоллі і ў Перамышлі, што адбілася на познім пакарэнні Валыні – Луцк перайшоў пад кантроль вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча толькі ў студзені 1439 г.

Такім чынам, у пачатку 1439 г. Жыгімонт Кейстутавіч змог падавіць апошні адкрыты ачаг супраціўлення сваёй уладзе. Але ў Вербную нядзелю 1440 г. «сотворися зло велико в Литве» – вялікі князь быў забіты ў замку ў Троках. У літаратуры існуе некалькі варыянтаў тлумачэння жорсткай расправы над манархам. Самы папулярны вынікае з апавядальных крыніц: князю адпомсцілі за намер знішчыць знаць у дзяржаве. Другая версія вылучае ролю вялікага князя Свідрыгайлы, які не спыніў сваёй барацьбы і толькі чакаў магчымасці нанесці ўдар. У пацвярджэнне гэтай версіі пераважна расійскія дарэвалюцыйныя гісторыкі звярталі ўвагу на двух братоў Чартарыйскіх з акружэння Свідрыгайлы. У польскай гістарыяграфіі абмяркоўваецца версія аб забойстве ў палітычных інтарэсах Ягелонаў, Уладзіслава і Уладзіміра.

Падставай для забойства сталі перамовы вялікага князя Жыгімонта з імператарам Альбрэхтам Габсбургам аб верагоднасці каранацыі Кейстутавіча і стварэнні Regni Lithuanorum, якое б адрывала землі ВКЛ ад уплыву з боку Польшчы. Гэта непакоіла палітычныя колы Кракава і не дазваляла Ягелонам забраць ВКЛ сабе.

Само забойства не выклікала палітычнай нестабільнасці ў ВКЛ. Больш за тое, праявілася падрыхтаванасць палітычнай эліты дзяржавы да рашучых дзеянняў у адносінах да манарха, спыненне эскалацыі ўнутрыпалітычнай барацьбы. Гэта прывяло да недапушчэння да ўлады ні Свідрыгайлы, ні Міхаіла Жыгімонтавіча.

Трэці этап цягнуўся ад пачатку да сярэдзіны 40-х гг. XV ст. Ён характарызуецца стабілізацыяй палітычнай сітуацыі ў краіне і падаўленнем апошніх ачагоў антыдзяржаўных выступленняў. Ішлі працэсы аб'яднання палітычнай эліты вакол маладога вялікага князя Казіміра і пераразмеркавання ўладных функцый у ВКЛ. Адбыўся канчатковы разрыў уніі з Польшчай.

На фоне рэгіянальных паўстанняў ішоў працэс рэканструкцыі палітычных адносін паміж цэнтрам і рэгіёнамі.

Пасля Вялікадня 1440 г. ураднікі ВКЛ, сярод якіх крыніцы вылучаюць біскупа віленскага Мацея, кашталяна віленскага Івана Осціка, маршалка земскага Яна (Івашку) Гаштольда, а таксама Манівіда і Пятра Манцігірадавіча, прапанавалі польскаму каралю Уладзіславу III Ягелону і каралевемаці Сафіі даслаць у ВКЛ свайго прадстаўніка. Каралевіч Казімір прыехаў у ВКЛ і ўжо 29 чэрвеня 1440 г. быў каранаваны ў кафедральным саборы Вільні ў якасці самастойнага манарха. Акцыя палітычнай эліты княства выклікала абурэнне з боку Польшчы, але да шырокамаштабных баявых дзеянняў справа не дайшла. У самім ВКЛ свае правы на велікакняжацкі пасад заявілі прадстаўнікі роду Гедымінавічаў: Свідрыгайла Альгердавіч, Аляксандр (Алелька) Уладзіміравіч і Міхаіл, сын Жыгімонта Кейстутавіча. Але ўсе яны былі заспакоены вялікімі маёмаснымі наданнямі на выключных правах. Так, Алелька атрымаў у пажыццёвае валоданне Кіеўскае княства, якое ў канцы XIV ст. было адабрана ў яго бацькі Уладзіміра Альгердавіча. Міхаіл Жыгімонтавіч таксама атрымаў спадчыну па бацьку – Ноўгарад-Северскі. Што тычыцца Свідрыгайлы, то за ім пакідаліся тытул «вялікі князь», першае месца ў Радзе і Валынь на правах пажыццёвага валодання (па згодзе з Польшчай Валынь павінна была потым перайсці да Кароны).

Усё ж, нягледзячы на намаганні палітычнай эліты, пасля смерці вялікага князя Жыгімонта ўнутрыпалітычная барацьба не скончылася, а перайшла ў фазу супрацьстаяння цэнтра і рэгіёнаў (Падляшская вайна 1440 г., Жмудскае паўстанне 1440–1441 гг., паўстанне Чорных людзей у Смаленску ў 1441–1442 гг.). Новаабраны вялікі князь Казімір цалкам залежаў ад сваёй Рады, якая вырашыла стабілізаваць унутрыпалітычнае становішча ў дзяржаве. Адначасова з падаўленнем выступленняў асобных арыстакратаў (Юрыя Сямёнавіча Мсціслаўскага і Міхаіла Жыгімонтавіча ў 40-я гг. XV ст.) велікакняжацкая ўлада забяспечыла «землі прыслухаючыя» кампраміснымі правамі, якія задаволілі канфліктуючыя бакі.

Чацвёрты этап – ад сярэдзіны 40-х да сярэдзіны 50-х гг. XV ст. – ужо не выяўляе адкрытага ваеннага супрацьстаяння, але ўзмацненне ўлады Казіміра Ягелончыка прывяло да росту незадаволенасці з боку яго былых рэгентаў. Нават выспела змова супраць манарха, якая так і засталася нерэалізаванай у 50-я гг. XV ст. (верагодна, у сувязі са смерцю Яна Гаштольда). Адбылася змена пакаленняў палітычных дзеячаў. Змяніліся не толькі асобы, але і адносіны да вялікага князя і караля Казіміра. Новае пакаленне было цалкам аддана манарху, яно з'яўлялася абавязаным яму сваім маёмасным становішчам. Пасля смерці вялікага князя Свідрыгайлы (1452) Валынь, якая павінна была

адысці да Польшчы, перайшла пад кантроль ВКЛ. У Луцку быў размешчаны гарнізон намесніка вялікага князя. Такім чынам, да сярэдзіны 50-х гг. XV ст. Валынь, а крыху раней і Кіеўшчына (пасля смерці кіеўскага «цара» Алелькі Уладзіміравіча) уключыліся ў адміністрацыйны склад ВКЛ на правах іншых зямель. Пасля смерці віленскага біскупа Мацея ў 1453 г. Казімір дамогся ад папы прызначэння яго на месца свайго кандыдата. Таксама ў 1457 г. Казімір афіцыйна вызнае над праваслаўнымі епіскапствамі ВКЛ уладу мітрапаліта-ўніята Рыгора, пераемніка мітрапаліта Ісідора, выгнанага з тэрыторыі дзяржавы яшчэ ў 1442 г. Так вялікі князь Казімір Ягелончык завяршыў падпарадкаванне сабе свецкай і царкоўнай улады ў ВКЛ, чым спыніў любыя выступленні супраць манарха ў дзяржаве.

## ВЫНІКІ ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНАЙ БАРАЦЬБЫ Ў 30–40-я гг. XV ст.

Унутрыпалітычная барацьба 30–40-х гг. XV ст. не была штучна справакаванай акцыяй суседняй дзяржавы, а з'яўлялася вынікам нявырашаных сацыяльна-палітычных пытанняў ВКЛ. Ва ўмовах знешнепалітычнай нестабільнасці пачатку 30-х гг. XV ст. у ВКЛ адбывалася фарміраванне двух палітычных лагераў пры вялікіх князях Свідрыгайле і Жыгімонце Кейстутавічы. Дзейнасць «партый» насіла падобны характар, мэты і задачы супадалі, што прывяло да іх аб'яднання ў 40-я гг. XV ст. вакол новага манарха – каралевіча Казіміра. Выпраўленне ўнутрыпалітычнай сітуацыі адбылося праз усталяванне непасрэднага кантролю палітычнай эліты над асобай вялікага князя.

Маёмасныя правы ўсіх феадалаў ВКЛ былі ўнармаваны агульназемскім прывілеем 1447 г., выдадзеным Казімірам у падзяку знаці ВКЛ за згоду на каранацыю польскім каралём. Але гэты акт падсумаваў папярэднія дакументы: прывілеі Ягайлы ад 1387 і 1432 гг., акт Жыгімонта Кейстутавіча ад 1434 г., земскія прывілеі, выдадзеныя на працягу кіравання Казіміра як вялікага князя з 1440 г. Агульназемскі прывілей дэклараваў правы дзяржаўных органаў ВКЛ, вызначаў правы і абавязкі Рады, чым фактычна паклаў пачатак абмежаванню манаршай улады гэтым прадстаўнічым органам.

Афармленне прававога становішча гарадоў і зямель адбывалася шляхам пошуку кампрамісу. Так, велікакняжацкая канцылярыя з 1440 г. пачала пацвярджаць і выдаваць новыя земскія прывілеі, дзе ўлічваліся рэгіянальныя асаблівасці і сацыяльныя катэгорыі насельніцтва, якія адыгрывалі значную ролю ў развіцці рэгіёна. Вылучаюцца граматы прыстэпавай Кіеўскай зямлі і палітычна архаічнай Жамойціі. Па-за непасрэдным праўленнем

велікакняжацкай канцылярыі засталася Валынь, а яе ўдзельны князь Свідрыгайла стварыў сваю ўласную канцылярыю.

Працэсы, якія праходзілі ў Сусветнай царкве, адбіваліся на становішчы царквы памеснай. Аслабленне Канстанцінопаля і Саборны рух у Заходняй Еўропе паклалі пачатак выкарыстанню ідэі царкоўнай уніі свецкімі і царкоўнымі ўладамі ў палітычным жыцці ВКЛ. Дастаткова шырока выкарыстоўвалі іх вялікі князь Свідрыгайла і віленскі біскуп Мацей. Становішча ў царкве пасля Фларэнтыйскага сабору 1439 г. дазволіла іерархам царквы кантраляваць грамадскае жыццё ВКЛ. Так, для віленскай біскупскай кафедры ў 40–50-я гг. XV ст. было выгадна абараняць праваслаўную царкву ў ВКЛ ад злучэння ў адзінае царкоўна-адміністрацыйнае падпарадкаванне перад пагрозай польскага ўплыву.

У сярэдзіне XV ст. наступіў час істотных змен: новую дынастыю больш цікавілі еўрапейскія справы і супрацьстаянне дынастыі Габсбургаў у рэгіёне Венгрыі і Малдавіі, вайна за хрысціянскія землі Цэнтральнай Еўропы з туркамі, вяртанне Польскага Памор'я і стварэнне «Уніі Ягелонаў» праз распаўсюджанне ўлады дзяцей Казіміра на дзяржавы ўсходняй часткі заходнееўрапейскага свету. ВКЛ усё больш ператваралася ў перыферыю дынастычных інтарэсаў, што абумовіла адыход вялікага князя ад ідэі збірання рускіх зямель, прывяло да страты сатэлітаў у рэгіёне: паступова Цвер, Разань, Ноўгарад, Пскоў і іншыя больш дробныя рускія княствы перайшлі пад уладу Масквы. Вялікі князь Казімір змог вывесці ВКЛ з доўгай унутрыпалітычнай барацьбы, стабілізаваць яе тэрытарыяльныя адрозненні і антаганізм паміж прававымі сістэмамі асобных зямель, вызначыў правы феадалаў, а кіраванне дзяржавай часткова дэлегіраваў прадстаўнікам новай арыстакратыі. Адначасова з тым Казімір выключыў ВКЛ з актыўнай знешняй палітыкі ў рэгіёне і больш шчыльна звязаў знешнепалітычны курс ВКЛ з Каралеўствам Польскім. 1447 год адкрыў новыя магчымасці для вырашэння палітычнай уніі дзвюх дзяржаў праз персанальную унію.

# 15 ПАЛІТЫКА КАЗІМІРА ЯГЕЛОНЧЫКА

- **Першыя гады праўлення**
- **Галоўныя напрамкі ўнутранай палітыкі**
- **Знешняя палітыка**

## ПЕРШЫЯ ГАДЫ ПРАЎЛЕННЯ

Пасля забойства Жыгімонта Кейстутавіча, якое адбылося 20 сакавіка 1440 г., перад Вялікім Княствам Літоўскім зноў паўстала рэальная перспектыва грамадзянскай вайны. На ўладу прэтэндавалі адразу некалькі асоб, але ўплывовая групоўка літоўскіх вяльмож, на чале якой стаялі трокскі ваявода Ян Гаштольд і князь Юрый Гальшанскі, 29 чэрвеня 1440 г. узвяла на велікакняжацкі прастол малодшага сына Ягайлы і Соф'і Гальшанскай 12-гадовага каралевіча Казіміра (Андрэя Казіміра). Менавіта гэта групоўка першы час рэальна і кіравала дзяржавай. З мэтай стабілізацыі сітуацыі і пашырэння палітычнай падтрымкі новага гаспадара зноў створаны ўрад быў вымушаны пайсці на ўступкі князям, а таксама некаторым рэгіёнам краіны. У прыватнасці, былі адноўлены Кіеўскае і Мсціслаўскае ўдзельныя княствы, якія перайшлі да Альгердавых унукаў: Аляксандра (Алелькі) Уладзіміравіча і Юрыя Лынгвеневіча адпаведна. Тым не менш першы час сітуацыя была вельмі няўстойлівай. У тым жа 1440 г. Юрый Лынгвеневіч узняў мяцеж, бо не задаволіўся вяртаннем вотчыны і здолеў на кароткі час захапіць Смаленск, Полацк і Віцебск. Аднак ужо на пачатку 1441 г. цаной надзвычайных ваенных намаганняў урад змог падавіць гэта выступленне. У 1441 г. выбухнулі новыя мяцяжы – на гэты раз у Жамойціі

і на Падляшшы, дзе традыцыйна моцнымі былі пазіцыі Кейстутавічаў. Жамойты жадалі бачыць на прастоле сына забітага вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча – Міхаіла. Было арганізавана некалькі змоў супраць Казіміра. Самую небяспечную з іх падрыхтавалі валожынскія князі Сухты, за якімі стаяў Міхаіл Жыгімонтавіч. Аднак спроба замаху, здзейсненая імі ў 1446 г., аказалася няўдалай.

У гэтай няпростай сітуацыі ўрад дзейнічаў гнутка. Каб выправіць становішча, ён выкарыстоўваў усе даступныя сродкі: юрыдычныя, дыпламатычныя, ваенныя. Яго курс на стабілізацыю сітуацыі знайшоў сваё заканадаўчае падмацаванне ў шэрагу абласных прывілеяў, якія вялікі князь выдаў у хуткім часе. «Землі прыслухаючыя»: Полацкая, Віцебская, Смаленская, – атрымалі пацвярджэнне сваіх старых праў і набылі ў дадатак шэраг новых.

У першыя ж гады свайго праўлення Казімір заключыў мірныя дагаворы з суседнімі дзяржавамі: Вялікім Ноўгарадам, Псковам, Валахіяй (Малдовай). Крыху пазней быў заключаны таксама мірны дагавор з Масквой. Такая падкрэслена мірная палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў гэты перыяд мела як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя прычыны. Краіна патрабавала перадышкі пасля гадоў цяжкой грамадзянскай вайны, у якую актыўна ўмешваліся і суседнія дзяржавы. Адыграла сваю ролю і непаўналецце вялікага князя. Некалькі гадоў Казімір быў вымушаны ўлічваць пагрозу з боку іншых прэтэндэнтаў на трон, якія не адмовіліся ад сваіх планаў. У Мазовіі хаваўся Міхаіл Жыгімонтавіч, у Маскве і Ноўгарадзе – Юрый Мсціслаўскі, на Валыні – Свідрыгайла. Тым не менш гнуткая палітыка ўрада Казіміра зрабіла сваю справу, і сітуацыя пастунова стабілізавалася.

Важным фактарам укняжання і далейшага ўзмацнення ўлады Казіміра ў Вялікім Княстве Літоўскім былі стабільныя адносіны з Польшчай. Праўда, і тут існавалі супярэчнасці – палякі не жадалі прызнаваць Казіміра вялікім князем, лічачы яго ўсяго толькі намеснікам свайго брата, польскага караля Уладзіслава III у ВКЛ. Тым не менш Казімір мог разлічваць на добрыя стасункі з Польшчай.

Гібель польскага і венгерскага (з 1440 г.) караля Уладзіслава III у бітве з туркамі пад Варнай у 1444 г. змяніла становішча і ў Вялікім Княстве Літоўскім. Казімір Ягелончык атрымаў прапанову заняць вакантны польскі трон, аднак знаць ВКЛ прагнула, каб Казімір застаўся толькі вялікім князем літоўскім і адмовіўся ад польскай кароны. У Вялікім Княстве Літоўскім было зусім няшмат прыхільнікаў аднаўлення персанальнай уніі з Каронай – уніі, якая на той час была ўжо добра падзабыта. Тым не

менш пасля доўгіх ваганняў і перагавораў з усімі зацікаўленымі бакамі пагадненне было выпрацавана, і Казімір пагадзіўся прыняць карону, застаючыся вялікім князем літоўскім. Ад'язджаючы на каранацыю ў Кракаў, 2 мая 1447 г. Казімір выдаў агульназемскі прывілей, які стаў адным з найважнейшых заканадаўчых актаў Вялікага Княства Літоўскага. Перш за ўсё, прывілей вельмі істотна пашырыў правы шляхецкага саслоўя. Шляхце, незалежна ад веравызнання, была гарантавана асабістая недатыкальнасць; пацвярджаліся правы на спадчынныя землі (вотчыны) і права свабодна распараджацца імі; пацвярджалася права без ведама вялікага князя выдаваць замуж удоў, дачок, пляменніц; шляхта атрымала права судовага імунітэту над сваімі прыгоннымі сялянамі, якія да таго ж былі вызвалены ад большасці падаткаў і павіннасцей на карысць дзяржавы. Шляхта атрымала права выязджаць за мяжу для прыдворнай і ваеннай службы (за выключэннем непрыяцельскіх зямель). Права асабістай недатыкальнасці атрымалі і свабодныя прадстаўнікі «простых» саслоўяў, у першую чаргу мяшчане. Казімір Ягелончык абяцаў захоўваць суверэнітэт і тэрытарыяльную цэльнасць Вялікага Княства Літоўскага, абавязваўся не раздаваць дзяржаўных і царкоўных пасад іншаземцам. Пад апошнімі разумеліся перш за ўсё новыя падданыя Казіміра – палякі.

Аднаўленне персанальнай уніі з Каралеўствам Польскім мела для Вялікага Княства Літоўскага як плюсы, так і мінусы. З аднаго боку, Вялікае Княства магло разлічваць на гарантавана добрыя адносіны з Польшчай і бяспечную заходнюю мяжу. Але ў той жа час было зразумела, што Казімір будзе вымушаны шмат часу і сіл аддаваць польскім справам, падоўгу знаходзячыся ў суседняй краіне. Гэта пагражала занядбаннем справамі Вялікага Княства Літоўскага, эфектыўнае вырашэнне якіх, як правіла, патрабавала асабістага ўдзелу манарха. Першапачаткова Казімір даволі часта наведваў Вялікае Княства, але з цягам часу гэтыя паездкі адбываліся радзей. У такой сітуацыі павялічылася значэнне Гаспадарскай Рады, якая ў адсутнасць вялікага князя фактычна кіравала дзяржавай.

Незадаволенасць частай адсутнасцю манарха праявілася ў Вялікім Княстве Літоўскім даволі хутка. У 1456 і 1461 гг. вяльможы звярталіся да Казіміра Ягелончыка з настойлівымі просьбамі даць ім асобнага ад Польшчы гаспадара. Яны прапанавалі кандыдатуру кіеўскага князя Сямёна Алелькавіча, але Казімір ні пры якіх абставінах не жадаў выпускаць з рук гэта спадчыннае ўладанне Ягелонаў. Яго пазіцыя не змянілася і пазней: калі ў 1478 г. на Берасцейскім сойме паны звярнуліся да Казіміра з прапановай прызначыць намеснікам у Вялікім Княстве аднаго са сваіх сыноў (Казіміра ці Яна Альбрэхта), ён зноў адмовіў.

## ГАЛОЎНЫЯ НАПРАМКІ ЎНУТРАНАЙ ПАЛІТЫКІ

Адным з самых важных мерапрыемстваў, праведзеных Казімірам Ягелончыкам у галіне ўнутранай палітыкі, стала спроба кадыфікацыі крымінальнага права. 29 лютага 1468 г. сойм зацвердзіў Судзебнік, які быў распрацаваны галоўным чынам на аснове норм мясцовага звычаёвага права. Судзебнік замацаваў норму індывідуальнай адказнасці злачынцы, хоць і не адмяніў цалкам ранейшага звычая, згодна з якім пакаранне нёс не толькі сам злодзей, але і члены яго сям'і. У прыватнасці, было забаронена караць жонку і дзяцей злодзея ў выпадку, калі яны не ведалі пра злачынства і не карысталіся крадзеным. Кодэкс замацаваў вельмі жорсткія пакаранні за маёмасныя злачынствы: крадзеж трыццаці грошаў, каровы ці хатніх рэчаў на пяцьдзясят грошаў караўся смерцю. Строга забаранялася вызваляць злачынцу ад пакарання нават у выпадку вяртання ім скрадзенай маёмасці ці пераводзіць яго ў нявольніцкі стан. Пакаранне было абавязковым: «А над злодеем милости не надобе». Судзебнік рэгламентаваў парадак разгляду спраў у судзе. Замацоўвалася норма, згодна з якой зямельныя спрэчкі павінны былі разглядацца толькі з выездам на месца. Строга забараняўся самасуд: напады на чужыя маёнткі, парубкі і г. д.

У цэлым артыкулы Судзебніка адпавядаюць нормам права эпохі позняга Сярэднявечча. Аднак у ім знайшлі адлюстраванне і тыя гуманістычныя тэндэнцыі, якія абазначыліся ў XV ст. у развіцці заканадаўства цэлага шэрагу краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Да іх трэба аднесці, у прыватнасці, пашырэнне канцэпцыі абмежавання калектыўнай адказнасці за злачынства і ідэі індывідуалізацыі пакарання. Лічыцца, што першапачаткова Судзебнік быў выдадзены толькі для т. зв. «Літоўскай зямлі» – Віленскага і Трокскага ваяводстваў. Аднак не выключана, што з цягам часу яго дзеянне было пашырана на ўсю дзяржаўную тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага. Нягледзячы на тое, што ўплыў Судзебніка на пазнейшыя юрыдычныя кодэксы ВКЛ, у прыватнасці на Статут 1529 г., быў дастаткова абмежаваным, яго прыняцце стала важным этапам у развіцці мясцовага заканадаўства.

Традыцыйна складанай для Вялікага Княства была канфесійная праблема. Становішча праваслаўных феадалаў па-ранейшаму заставалася нераўнапраўным у адносінах да прывілеяванай каталіцкай знаці. Прывілеі 1432 і 1434 гг. толькі часткова знялі рэлігійныя супярэчнасці. Нейкі час урадавыя колы Вялікага Княства Літоўскага спрабавалі залагодзіць сітуацыю з дапамогай царкоўнай уніі, аднак рэчаіснасць паказала, што ідэю саюзу паміж заходняй і ўсходняй цэрквамі не так лёгка рэалізаваць на практыцы.

Для правядзення уніі ва ўсяленскім маштабе існавалі сур'ёзныя перашкоды. У першую чаргу трэба адзначыць негатыўнае стаўленне многіх вернікаў, а таксама арганізацыйныя цяжкасці. Дамова пра царкоўны саюз, заключаная 6 ліпеня 1439 г. на саборы ў Фларэнцыі, спачатку не знайшла дзейснай падтрымкі ў свецкіх улад Вялікага Княства Літоўскага. Тутэйшая каталіцкая іерархія ў цэлым непрыхільна ставілася да папы рымскага Яўгена IV і скліканага ім Ферара-Фларэнтыйскага сабора, прызнаючы Базэльскі сабор і абранага ім антыпапу Фелікса V. Адпаведна, стаўленне ўлад Вялікага Княства Літоўскага да царкоўнай уніі, заключанай у Фларэнцыі, было дваістае. З аднаго боку, сама яе ідэя безумоўна віталася, але з другога – каталіцкая іерархія і свецкія ўлады ВКЛ і Польшчы не вельмі жадалі прызнаваць рашэнні Ферара-Фларэнтыйскага сабора. У выніку мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі Ісідар, які прымаў актыўны ўдзел у працы сабора і падпісаў акт Фларэнтыйскай уніі, быў вымушаны не толькі ўцякаць з Масквы, але вельмі хутка пакінуў таксама тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага і накіраваўся ў Рым. Унія не знайшла падтрымкі і ў мясцовага праваслаўнага насельніцтва ВКЛ. Нягледзячы на гэта, Казімір Ягелончык перыядычна звяртаўся да ідэі уніі, – праўда, без асаблівага поспеху.

У 1458 г. кіеўскім мітрапалітам стаў Грыгорый Балгарын, вучань і паплечнік Ісідара. Гэту падзею прынята лічыць момантам канчатковага расколу мітраполіі Кіеўскай і ўсяе Русі на дзве паловы. Мітрапаліты паўночна-ўсходніх і паўночна-заходніх зямель некалі адзінай рускай мітраполіі па месцы рэзідэнцыі сталі тытулаваць сябе мітрапалітамі Маскоўскімі і ўсёй Русі, мітрапаліты ж у Вялікім Княстве Літоўскім і Польшчы сталі называць сябе мітрапалітамі, архіепіскапамі Кіеўскімі, Галіцкімі і ўсёй Русі. Часцей за ўсё яны жылі ў Вільні, але мітрапалічыя рэзідэнцыі (двары) былі таксама ў Навагародку, Менску і, зразумела, Кіеве. Першапачаткова мітрапаліт Грыгорый Балгарын быў уніятам, аднак у канцы жыцця ён адышоў ад уніі і прызнаў вяршэнства праваслаўнага канстанцінопальскага патрыярха. Тым не менш у Вялікім Княстве Літоўскім дзеянні на карысць царкоўнай уніі мелі працяг. У 1476 г. група з 16 духоўных і свецкіх асоб на чале з нарачоным кіеўскім мітрапалітам, смаленскім епіскапам Місаілам склала пасланне да папы рымскага Сікста IV, у якім выказала прызнанне Фларэнтыйскай уніі. Аднак і на гэты раз крок у напрамку практычнай рэалізацыі уніі не меў колькі-небудзь значных наступстваў. Дакладна невядома нават, ці было гэта пасланне адпраўлена ў Рым. У далейшым, аж да часоў Берасцейскай уніі мітраполія Кіеўская і ўсяе Русі была праваслаўнай. Вельмі высокае месца сярод яе іерархаў у гэты час займалі полацкія архіепіскапы. Двое з іх (Сямён і Іёна Глезна) сталі кіеўскімі мітрапалітамі.

Аднаўленне шэрагу ўдзельных княстваў і ўзмацненне тамтэйшых князёў у пачатковы перыяд праўлення Казіміра было часовай з'явай, абумоўленай палітычнай сітуацыяй. Аднак па меры ўзмацнення сваёй улады Казімір вярнуўся да курсу Вітаўта, пачынаючы мэтанакіравана аслабляць, а пры нагодзе і ўвогуле скасоўваць удзелы. Праўда, Казімір дзейнічаў не так жорстка, як Вітаўт, і абыходзіўся без ваенных акцый. Тым не менш тэндэнцыя да скарачэння ўдзельных княстваў прасочваецца ў яго палітыцы вельмі выразна. У першую чаргу гэта датычылася буйных удзелаў, адным з якіх быў кіеўскі, на чале з князямі Алелькавічамі (пазней Алелькавічамі-Слуцкімі). Асаблівай магутнасці Кіеўскае княства, што распасціралася да Чорнага мора, дасягнула ў 1454–1470 гг. пры Сямёне Алелькавічы, якога сучаснікі часам называлі царом. Калі ў 1470 г. гэты князь памёр, Казімір не дазволіў заняць Кіеў ні яго брату Міхаілу, які валодаў Копылем і Слуцкам, ні ўдаве і дзецям, якім у выніку дастаўся Пінск. Кіеўскае княства было пераўтворана ў намесніцтва.

Гэты і падобныя крокі Казіміра выклікалі незадаволенасць князёў, якая абвастралася ўзвышэннем нетытулаванай знаці – паноў, што пачалося ў часы Вітаўта. У эпоху Казіміра паны (пераважна каталіцкія) набылі яшчэ большую вагу ў велікакняжацкай Радзе і пры двары. Менавіта яны займалі большасць пасад не толькі агульнадзяржаўнага, але і мясцовага ўзроўню: ваявод, намеснікаў і г. д. Становішча паноў паступова ўзмацнялася за кошт шматлікіх зямельных падараванняў вялікага князя.

Адным з вынікаў акрэсленых працэсаў стала змова князёў супраць Казіміра Ягелончыка 1481 г. Самымі віднымі яе ўдзельнікамі былі Міхаіл Алелькавіч, Іван Гальшанскі і Фёдар Бельскі. Яны вырашылі скарыстаць вяселле апошняга, якое павінна было адбыцца ў Кобрыне, і забіць запрошанага туды Казіміра. Аднак змова была выкрыта. Князёў пакаралі смерцю, толькі Фёдар Бельскі вывратаваўся ўцёкамі ў Маскву. Планы змоўшчыкаў дакладна невядомыя. Тэарэтычна на трон Вялікага Княства Літоўскага мог прэтэндаваць Міхаіл Алелькавіч – праўнук Альгерда па мужчынскай лініі і Вітаўта па жаночай. Маскоўскія ж летапісцы паведамляюць пра намер змоўшчыкаў перайсці пад уладу вялікага князя маскоўскага Івана III разам з землямі на ўсход ад ракі Бярэзіны (прытока Дняпра).

Стабільнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага ў 50-гадовае праўленне Казіміра Ягелончыка моцна паўплывала на знешне непрыкметныя ўнутраныя працэсы, якія, тым не менш, мелі велізарнае значэнне для далейшага развіцця грамадства і дзяржавы. Да ліку такіх працэсаў адносіцца кансалідацыя шляхты. Канфесійныя адрозненні, якія абвастрыліся ў час грамадзянскай вайны 30-х гг. XV ст., паступова адышлі на другі план. Яны былі знівеліраваны змяшанымі шлюбамі, удзелам у супольных акцыях (дыпламатычных, ваенных, прыдворнай службе) і праз дзеянне іншых механіз-

маў. Як вынік, у час праўлення Казіміра Ягелончыка ў Вялікім Княстве ўжо не існавала палітычных груповак, у аснову прыналежнасці да якіх была б пакладзена канфесійная прыкмета.

Працяглы мірны перыяд прывёў да ажыўлення эканамічнага жыцця на землях Вялікага Княства Літоўскага. Магнаты і шляхта ўсё больш адыходзілі ад ваеннай дзейнасці і пераключаліся на гаспадарчыя заняткі. Зямельныя падараванні Казіміра магнатэрыі і шляхце былі шматлікімі і шчодрымі. У большасці выпадкаў яны ўтрымлівалі дазвол заснаваць на атрыманай зямлі (нярэдка незаселенай) вёскі і перасяліць ці запрасіць туды людзей. Землеўладальнікі актыўна карысталіся гэтым дазволам, і сярэдзіна – другая палова XV ст. сталі часам інтэнсіўнай унутранай каланізацыі края.

## ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

Курс на мірныя адносіны з суседзямі, узяты кіраўнікамі Вялікага Княства Літоўскага яшчэ ў пачатковы перыяд праўлення Казіміра Ягелончыка, быў працягнуты і ў далейшым. Як рэалістычны палітык Казімір імкнуўся замацавацца на тых рубяжах, якія былі дасягнуты Вітаўтам, і не стаў разгортваць далейшую экспансію на Русі – нягледзячы нават на тое, што такія магчымасці існавалі. Прыблізна тое самае можна сказаць і пра іншыя напрамкі магчымага тэрытарыяльнага росту Вялікага Княства Літоўскага. Стаўшы польскім каралём, Казімір засяродзіўся на справах у Цэнтральнай Еўропе, дзе ён дзейнічаў энергічна і дзе ў выніку атрымаў значныя поспехі. Гэта, аднак, прывяло да занядбання справамі на ўсходзе, што стала адным з істотных фактараў хуткага фарміравання ў 2-й палове XV ст. Рускай цэнтралізаванай дзяржавы. Маскоўская Русь імкліва ператваралася ў самага небяспечнага праціўніка Вялікага Княства Літоўскага.

На працягу 1440-х гг. сітуацыя ў Паўночна-Усходняй Русі складвалася такім чынам, што Масква і Вільня ўрэшце пайшлі на заключэнне мірнага дагавора. Пагадненню папярэднічаў небяспечны паход войска Вялікага Княства Літоўскага на Калугу, Казельск, Вярэю і Мажайск у 1445 г., а таксама чарговы выбух дынастычнай вайны ў Маскве. Вялікае Княства Маскоўскае ў той момант было вельмі зацікаўлена ў міры на сваіх заходніх межах. Са свайго боку, Вялікае Княства Літоўскае імкнулася не дапусціць варожых кааліцый з удзелам Масквы і выключыць падтрымку Масквой канкурэнтаў Казіміра Ягелончыка, асабліва Міхаіла Жыгімонтавіча.

31 жніўня 1449 г. бакі заключылі дагавор, які падзяліў сферы ўплываў у Паўночнай і Усходняй Русі. Гэта не быў новы перадзел тэрыторый, дагавор толькі юрыдычна замацаваў становішча, якое фактычна склалася ў рэгіёне

ў канцы 40-х гг. XV ст. Вялікі Ноўгарад і Пскоў былі прызнаны зонай інтарэсаў Масквы. Разанскае княства стала своеасаблівай нейтральнай тэрыторыяй. Шматлікія дробныя вярхоўскія (у верхнім цячэнні Акі) князі прызнавалі вярхоўную ўладу Казіміра. У цэлым, кожны з бакоў дасягнуў сваёй мэты і атрымаў важны для сябе мір, які аказаўся дастаткова трывалым і доўгім. Праўда, Масква выкарыстала гэты мір больш эфектыўна, рашуча далучаючы да тэрыторыі Рускай дзяржавы ўсё новыя і новыя землі на поўначы і паўночным усходзе Русі. Найважнейшымі набыткамі былі Вялікі Ноўгарад (1478) і Цвер (1485). Казімір Ягелончык, заняты справамі на захадзе, на дзіва спакойна назіраў за поспехамі Масквы – нягледзячы нават на тое, што меў уплывовых прыхільнікаў як у Ноўгарадзе, так і ў Цверы.

Усталяванне гегемоніі Масквы на ўсходзе і поўначы Русі мела для Вялікага Княства Літоўскага самыя небяспечныя наступствы, якія выходзілі далёка за рамкі знешняй палітыкі. У сувязі з атрыманымі поспехамі ў аб'яднанні рускіх зямель вялікі князь маскоўскі Іван III абвясціў сябе гасударом усёй Русі. А гэта ўжо прама закранала не толькі знешнепалітычныя інтарэсы, але і ўнутрыпалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага, у склад якога ўваходзіла шмат «рускіх» (беларускіх, украінскіх і ўласна рускіх/расійскіх) зямель.

Казімір Ягелончык не ўмяшаўся ў сітуацыю і ў 1480 г., калі Вялікае Княства Маскоўскае здолела вызваліцца ад ардынскай залежнасці. Адносіны з татарамі здаўна былі адным з найважнейшых напрамкаў знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага. На працягу XV ст. магутная еўразійская імперыя Залатая Арда павольна, але незваротна распадалася на часткі. Адным з першых адасобілася Крымскае ханства. Род Гірэяў, які стаў на чале новай дзяржавы, атрымаў і замацаваў сваю ўладу ў Крыме пры падтрымцы Вялікага Княства Літоўскага. У 1440-х гг. Казімір дапамог усталявацца ў Крыме хану Хаджы-Гірэю, які падтрымліваў сяброўскія адносіны з Вялікім Княствам Літоўскім да канца свайго жыцця ў 1466 г.

Нейкі час на ролю адзінага спадчынніка Залатой Арды прэтэндавала Заволжская Арда, якую ў Маскве называлі Вялікай. Ханы Заволжскай Арды спрабавалі праводзіць шырокую знешнюю палітыку, не асабліва клапоцячыся пра набыццё саюзнікаў. Заволжскія татары доўгі час варагавалі і з Крымам, і з Масквой, і з Вялікім Княствам Літоўскім. На працягу 1440–60-х гг. яны здзяйснялі частыя і вельмі небяспечныя напады на паўднёва-ўсходнія і паўднёвыя ўскраіны Вялікага Княства Літоўскага: Кіеўскую, Чарнігаўскую, Падольскую, Валынскую землі. Толькі каля 1470 г. сітуацыя змянілася, і Заволжская Арда ўзяла курс на саюз з Вялікім Княствам Літоўскім. Гэты саюз меў выразную антымаскоўскую накіраванасць. Апрача таго, збліжэнне

з заволжскімі татарамі дало Вялікаму Княству Літоўскаму дадатковы сродак уздзеяння на Крым, адносіны з якім пад уплывам розных фактараў сталі паступова псавацца.

Барацьба Заволжскай Арды з Масквой доўгі час не магла выявіць пераможцу. Справа дайшла да сутыкнення ў 1480 г., калі хан Ахмат паспрабаваў вярнуць Маскоўскую Русь у сваё падпарадкаванне. Насуперак абяцанню, Казімір не прадставіў яму дапамогі. Для Ахмата гэта скончылася катастрофай – адступленнем з Русі і хуткай гібеллю.

Практычна адначасова ўскладніліся адносіны Вялікага Княства Літоўскага з Крымам. У 1475 г. турэцкія войскі высадзіліся на паўвостраве і за некалькі месяцаў падпарадкавалі яго сваёй уладзе. Былі захоплены размешчаныя на ўзбярэжжы генуэзскія калоніі, а таксама невялікае грэчаскае княства Мангуп (Феадаро). Крымска-татарскае ханства трапіла ў залежнасць ад Асманскай імперыі і з таго часу ішло ў фарватэры палітыкі Стамбула. Туркі ж у апошняй чвэрці XV ст. няўхільна ўзмацнялі ціск на сваіх паўночных суседзяў. Адначасова з адыходам ад саюзу з Вялікім Княствам Літоўскім намецілася збліжэнне Крыма з Масквой.

У 1482 г., выконваючы загад турэцкага султана і будучы заахвочаным Іванам III, крымскі хан Менглі-Гірэй на чале вялізнага войска нечакана з’явіўся пад Кіевам і захапіў горад. Разбурэнне Кіева выразна паказала безабароннасць паўднёвых граніц Вялікага Княства Літоўскага і сур’ёзнасць пагрозы з боку Крыма. І сапраўды, напады крымскіх татар год ад года станавіліся ўсё больш небяспечнымі і глыбокімі, дасягнуўшы ў рэшце рэшт і беларускіх зямель.

Такім чынам, у 1470-х гг. адбыліся карэнныя змены ў расстаноўцы сіл ва Усходняй Еўропе. Аформіліся саюзы: Масква – Крым і Вялікае Княства Літоўскае – Заволжская Арда, якія праіснавалі аж да пачатку XVI ст.

На заходнім кірунку прынцыпова важнае значэнне для Вялікага Княства Літоўскага мелі адносіны з Тэўтонскім ордэнам. Эпоха канфрантацыі паміж імі скончылася ў 1435 г., калі Вялікае Княства разам з Польшчай заключылі ў Брэсце-Куяўскім мір з немцамі. З таго часу Вялікае Княства Літоўскае больш не вяло войн з крыжакамі. Усе спробы Казіміра Ягелончыка дабіцца ад Вялікага Княства ўступлення ў Трынаццацігадовую вайну, якую Каралеўства Польскае ў 1454–1466 гг. вяло супраць Тэўтонскага ордэна, не мелі выніку. Вільня захавала нейтралітэт.

Персанальная унія змякчыла супярэчнасці паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай, але поўнасцю не зняла іх. Палякі рэгулярна прыгадвалі крэўскае пагадненне 1385 г. і факт інкарпарацыі Вялікага Княства ў склад Кароны. Аднак радныя паны, якія ўсё больш упэўнена трымалі

ў руках рычагі кіравання Вялікім Княствам Літоўскім, катэгарычна адмаўляліся прызнаваць залежнасць ад Польшчы і ўпарта адстойвалі суверэнітэт сваёй дзяржавы. Трэба мець на ўвазе, што Каралеўства Польскае яшчэ прэтэндавала на шэраг зямель, пераважна ўкраінскіх, якія знаходзіліся пад фактычным кантролем Вільні. Калі ў 1452 г. памёр Свідрыгайла, які кіраваў Валынню, палякі паспрабавалі далучыць гэту багатую вобласць да Кароны. Аднак спроба не ўдалася, і Валынь была канчаткова замацавана за Вялікім Княствам Літоўскім.

Для многіх манаршых дамоў Еўропы эфектыўным сродкам прасоўвання сваіх знешнепалітычных інтарэсаў была ў той час дынастычная палітыка. Не былі выключэннем і Ягелоны. Казімір, які меў ад шлюба з Лізаветай Габсбург шасцярых сыноў і сем дачок, валодаў для гэтага добрымі магчымасцямі. У 1471 г. ён здолеў правесці кандыдатуру свайго старэйшага сына Уладзіслава на чэшскі трон. У 1490 г., калі памёр венгерскі кароль Мацьяш Корвін, Уладзіслаў дамогся і венгерскай кароны. На нейкі час пад уладай Ягелонаў аказаліся адразу чатыры буйныя дзяржавы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Гэта быў вялікі поспех дынастычнай палітыкі Казіміра Ягелончыка – праўда, як паказалі далейшыя падзеі, поспех часовы. Не злучаныя фактычна больш ніякімі сувязямі, акрамя кіраўнічай дынастыі, гэтыя дзяржавы ўжо ў вельмі хуткім часе пайшлі рознымі гістарычнымі шляхамі.

Апошнія гады праўлення Казіміра былі пазначаны ўскладненнем адносін з Масквой. Сутыкненні на граніцах пачаліся ў 1486 г. і працягваліся некалькі гадоў. Гэта «вайна на міру» вельмі нервавала кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага, якія прытрымліваліся палажэнняў дагавора 1449 г. Тым часам памежныя князі, васалы Казіміра, ужо не маглі самастойна супрацьстаяць маскоўскім атрадам і спакусіліся на абяцанні Івана III захаваць за імі ўсе землі і нават дадаць новыя ў выпадку пераходу пад яго ўладу. У выніку некаторыя з іх (у прыватнасці, вярхоўскія князі) разам са сваімі вотчынамі перайшлі на бок Масквы. Сігналам для перарастання вайны ў новую, адкрытую фазу стала смерць Казіміра 7 чэрвеня 1492 г. у Гародні.

Доўгае мірнае праўленне Казіміра Ягелончыка стала заключным перыядам магутнасці Вялікага Княства Літоўскага. Адной з галоўных задач асцярожнай, абачлівай унутранай палітыкі Казіміра была паступовая цэнтралізацыя ўлады ў Вялікім Княстве, якое ўсё яшчэ заставалася слаба інтэграванай дзяржавай. У гэтай сферы ён дасягнуў немалых поспехаў. Што ж датычыцца знешнепалітычнага становішча Вялікага Княства, дык Казіміру ў цэлым удавалася захоўваць гэта сваё спадчыннае ўладанне ў межах, усталяваных яшчэ Вітаўтам. Тым не менш канцэнтрацыя сіл і рэсурсаў ягелонскай дынастыі на заходнім напрамку прывяла да занядбання справамі на ўсходзе, дзе ініцыятыва паступова перайшла да Масквы.

# 16 КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў XIV–XV стст.

- **Асаблівасці матэрыяльнай культуры**
- **Развіццё духоўнай культуры**
- **Летапісанне**
- **Перакладная і арыгінальная літаратура**
- **Дойлідства, жывапіс, скульптура**

## АСАБЛІВАСЦІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Уваходжанне беларускіх зямель у склад адзінай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага – садзейнічала паступоваму пераадольванню рэгіянальнай адасобленасці і ўтварэнню адзінай культурнай прасторы. У XIV–XV стст. асновы матэрыяльнай і духоўнай культуры ВКЛ у большай ступені вызначалі ўсходнеславянскія традыцыі, але пашырэнне дынастычных, палітычных, канфесіянальных, эканамічных і іншых стасункаў з еўрапейскімі дзяржавамі суправаджалася пранікненнем і заўважным пашырэннем заходнееўрапейскіх уплываў. У XV ст. гэтыя культурныя павеі станавіліся больш моцнымі, праяўляліся рэнесансныя рысы. Такому пашырэнню заходняй культуры садзейнічала ўмацаванне каталіцтва ў дзяржаве. Але ўзаемадзеянне ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай плыняў адбывалася няроўна, і на гэты працэс уздзейнічалі іншыя шматлікія этнапалітычныя і культурныя вектары.

Захаванне цэласнасці былых старажытнарускіх зямель і іх перавага ў складзе новай дзяржавы абумовілі значны ўплыў усходнеславянскага этнасу на развіццё гаспадарчага і культурнага жыцця Вялікага Княства Літоўскага. Палітычнае аб'яднанне зямель і эканамічная інтэграцыя

садзейнічалі кансалідацыі насельніцтва, якая ўзмацнялася гандлёвымі стасункамі, юрыдычнымі нормамі, канфесіянальным фактарам і станаўленнем адзінай моўнай прасторы. Адначасова фарміраваліся асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. У пэўнай ступені яны акрэслены дзяржаўна-палітычнымі фактарамі, фізіка-геаграфічнымі і кліматычнымі ўмовамі, гаспадарчай дзейнасцю.

Галоўным гаспадарчым заняткам беларускага насельніцтва заставалася земляробства. У XIV–XV стст. атрымалі развіццё і пашырыліся старадаўнія спосабы апрацоўкі зямлі, але з'явіліся і новыя. У XIV ст. старажытны двухпольны севазварот замяшчаўся больш эфектыўным трохпольным (азімыя, яравыя, папар), які ўжо ў канцы XV ст. стаў пераважаючым. Разам з тым да сярэдзіны XVI ст. захаваліся і больш старажытныя аблогавая і падсечна-агнявая сістэмы земляробства. У заходніх, паўднёвых і прылеглых да іх землях Цэнтральнай Беларусі для апрацоўкі глебы выкарыстоўвалі парную валовую запрэжку і драўляную саху. У землях Беларускага Падзвіння і Падняпроўя выкарыстоўвалі конскую запрэжку і лягчэйшую саху, што было абумоўлена больш лёгкай пясчаністай глебай. Каб павялічыць вытворчасць, рабочыя часткі драўлянай сахі ўмацоўвалі жалезнымі нарогамі, лемяшамі. Улічваючы рэгіянальныя адметнасці, этнолагі вылучаюць віцебскую (рускую) саху з перакладной паліцай, падняпроўскую (беларускую, або магілёўскую) і палескую (літоўскую, падляшскую).

Асноўнай сельскагаспадарчай культурай было жыта, пераважна азімае. Пад яго адводзілі да паловы ворыўнай плошчы. У дзяржаўных і буйных феадальных гаспадарках значнае месца адводзілася таксама пад пасевы яравой і азімай пшаніцы. Паўсюдна сеялі авёс, ячмень, грэчку, проса, бабовыя, лён, каноплі, хмель. Шырока распаўсюдзілася агародніцтва, якім займаліся таксама жыхары гарадоў і мястэчак. Асноўнымі культурамі з'яўляліся рэпа, капуста, морква, буракі, рэдзька, мак, агуркі, цыбуля, часнок, розная зяляніна. Агародніцтва дапаўнялася садаводствам (яблыні, грушы, вішні і інш.), якое мела дадатковы характар і было слабаразвітым.

Другім важным сельскагаспадарчым заняткам была жывёлагадоўля, гаспадарчае значэнне якой паступова ўзрастала. Разводзілі коней, рагатую жывёлу, свіней, птушку. Жывёлагадоўля значна пашырала харчовыя запасы, давала сыравіну, угнаенні для палеткаў. Гаспадарчую значнасць захавалі паляванне, рыбалоўства, бортніцтва, іншыя промыслы.

Асваенне новых зямель і рост прадукцыйнасці працы садзейнічалі развіццю традыцыйнага мукамольнага промыслу, які ажыццяўляўся з дапамогай жорнаў, вадзяных млыноў і млыноў на коннай ці валовай цязе. Развіццё гандлёвых адносін з заходнееўрапейскімі краінамі прывяло да з'яўлення

на беларускіх землях у канцы XV ст. ветраных млыноў галандскага і нямецкага тыпаў. Пэўная механізацыя працы (выкарыстанне механічнага молата, вадзянога кола і інш.) вызначыла ў XV ст. удасканаленне металургічнага і жалезаплавільнага промыслаў. Развіваліся каменячосная справа, перапрацоўка драўніны на вугаль, смалу, паташ, дзёгаць і іншыя прадукты.

Асобнае месца ў гаспадарчай дзейнасці насельніцтва мела бортніцтва. Аб значнасці гэтага промыслу сведчыць бортнае права, якое склалася ў Вялікім Княстве Літоўскім. Паводле яго як за цяжкае злачынства каралі не толькі за крадзеж мёду, але і за рубку бортнага дрэва. Дрэвы з борцю пазначалі спецыяльна высечанымі бортнымі знакамі (аналагічна межаванню зямлі), якія абазначалі гаспадарчую прыналежнасць. У XV ст. традыцыйнае бортніцтва дапоўнілася пчалярствам па вуллёваму тыпу – у калодах (пяньках, караньках). Аб гэтым промысле красамоўна ўзгадваў М. Гусоўскі:

Бортнікі нашы на стаўках – разлапістых соснах –
Ставяць вуллі, а часам і ў дрэве пад верхам
Выдзеўбуць долатам борці і лётвы прыладзяць –
Вось і стаяк-каранёк для залётнага рою.
Так прыручаем пчалу і частуемся мёдам.

Сярод іншых відаў прамысловай дзейнасці, што існавалі ў гэты час, неабходна адзначыць пляценне розных вырабаў з лазы, бярозавай кары, саломы, разьбу па дрэве і камені, ткацтва, сукнаробства, ганчарства, выраб хмельных напояў і інш.

Асобныя промыслы станавіліся галоўным відам рамеснай дзейнасці для некаторых сямей сялян і гараджан. Рамёствы, гандаль, розныя службовыя абавязкі былі асноўнымі заняткамі жыхароў гарадоў і мястэчак. Але рамесныя заняткі ў гарадах існавалі пераважна на стадыі кустарнай вытворчасці і хатніх промыслаў. Многія сем'і імкнуліся вырабляць неабходныя рэчы ў хатняй гаспадарцы (займаліся ткацтвам, прадзеннем, сталярствам і інш.), а не набываць іх. Гаспадарча-вытворчыя адносіны і побыт насельніцтва ў той час былі не вельмі дыферэнцаванымі ў залежнасці ад месца пражывання – вёска або горад. У гаспадарчай дзейнасці гараджан даволі значную ролю адыгрывалі земляробства, агародніцтва, жывёлагадоўля, промыслы, доля якіх пачала скарачацца толькі з другой паловы XVI ст.

У XIV – першай палове XVI ст. сфарміравалася характэрнае беларускае народнае адзенне, склалася самабытная нацыянальная кухня. Пашырэнне сувязей з іншымі краінамі прывяло да перапраймання жыхарамі Беларусі асобных відаў вопраткі. Але гэты працэс адбіўся пераважна на строях феадальнага саслоўя і гараджан. У XIV–XV стст. пачаў складвацца своеасаблівы гарадскі касцюм, які сумяшчаў традыцыйныя і новыя элементы адзення.

У традыцыйным адзенні беларусаў пераважаў светлы колер. Вопратку шылі з саматканых тканін, якія выраблялі з ільну, воўны, канаплі. Асноўнай адзінкай традыцыйнага касцюма была доўгая кашуля (сарочка). Мужчынскі строй дапаўняўся паясным адзеннем (нагавіцы, порткі, штаны) і плечавым (світы, кафтаны, жупаны). Жаночы касцюм дапаўнялі саматканыя спадніцы, сукні, плахты, панёвы, фартукі, безрукаўкі. Верхнім адзеннем служылі кажухі, шубы, зіпуны. Касцюм завяршаў галаўны ўбор – кучма, шлык, магерка, капялюш, рантух, кіфера, намітка, хустка, чапец і інш. Касцюм дапаўняўся螺 рознымі шнурамі, гузікамі, тканымі, скуранымі і плеценымі паясамі.

На беларускіх землях быў распаўсюджаны скураны абутак – боты, чаравікі, туфлі, – які насілі не толькі феадалы, але і гараджане, сяляне. У сялянскім асяроддзі таксама насілі лапці-пасталы з лыка або са скуры. Зімовым абуткам былі валёнкі.

Адзенне ў пэўнай ступені вызначала саслоўную прыналежнасць, сямейны і маёмасны стан чалавека. Замужнія жанчыны на людзях павінны былі насіць галаўныя ўборы, якія поўнасцю пакрывалі валасы. Непакрытая галава мужчыны на вуліцы сведчыла аб яго беднасці, хваробе, непрытуленасці. Дрэнным учынкам, абразай лічылася збіць шапку з іншага чалавека. Людзям простага стану забаранялася насіць адзенне з дарагіх тканін, напрыклад з шоўку або з каштоўнымі ўпрыгожаннямі. Да адзення ставіліся з павагай, яго зберагалі, пакідалі ў спадчыну. Існавалі звычаі адорваць адзеннем, раздаваць яго ў дні свят у якасці міласці вандроўнікам, жабракам.

Харчаванне беларускага насельніцтва ў XIV–XV стст. захоўвала традыцыйны характар і вызначалася ў першую чаргу прыродна-кліматычнымі ўмовамі і гаспадарчымі заняткамі. У харчовым рацыёне насельніцтва вылучыліся агульныя рысы – пераважнае месца пачалі займаць крупяныя і мучныя стравы, гародніна.

Пачэснае месца займала гатаванне хлеба, які выпякалі звычайна ў форме авальных або круглых боханаў вагой да 3 кг адразу на некалькі дзён і нават тыдняў. Яшчэ з язычніцкіх часоў усходнеславянскія народы надавалі хлебу сакральны сэнс у каляндарных, сямейных, гаспадарчых абрадах і святах. Распаўсюджанне атрымалі і такія стравы з круп і мукі (жытняй, пшанічнай, грэцкай, аўсянай), як кашы і кісялі, крупнікі, заціркі, бліны і аладкі, якія таксама цесна звязаныя з народнымі абрадамі. Шырока ўжывалі гародніну, асабліва рэпу і капусту, з якой гатавалі гарачыя стравы (парылі, варылі, смажылі), а таксама квасілі, мачылі, салілі ў запас. Сярод мясных прадуктаў перавагу мелі вырабы са свініны. Паўсюдна былі вядомы каўбасы, якія абавязкова гатавалі да святочнага стала. Але ўжыванне

мясных прадуктаў абмяжоўвалася рэлігійнымі пастамі і абумоўлівалася саслоўным і маёмасным станам сямей, рэгіёнам пражывання. Малочныя прадукты, рыба, садавіна, арэхі, грыбы, ягады дапаўнялі харчовы рацыён. Варта заўважыць, што малочных прадуктаў ужывалі значна менш, чым у сучасны перыяд. Магчыма, гэта было абумоўлена невысокай малочнай прадукцыйнасцю мясцовай «чырвонай» пароды кароў, а таксама шырокім выкарыстаннем валоў у гаспадарцы.

У якасці напояў традыцыйнай беларускай кухні ў гэты перыяд былі вядомы разнастайныя квасы, кісялі, адвары (узвары), піва, слабаалкагольныя напоі з дадаваннем хмелю. У канцы XV – XVI ст. значнае распаўсюджванне атрымалі разнастайныя слабаалкагольныя напоі з мёду. Гарэлка на тэрыторыі Беларусі да сярэдзіны XVI ст. была малавядомай і выкарыстоўвалася як лекавы сродак. Віно было даступна толькі найбольш заможным феадалам, таму што завозілася выключна з-за межаў княства і каштавала вельмі дорага.

Да XVI ст. можна казаць аб адзінай кулінарнай традыцыі беларускіх зямель. Харчаванне розных слаёў насельніцтва істотна не адрознівалася. Шляхта, заможныя гараджане ўжывалі амаль тыя ж прадукты, што і сяляне, але лепшай якасці і ў іншых прапорцыях. Віно, спецыі, цукар імпартаваліся і з прычыны значнай дарагавізны спажываліся нязначна нават прадстаўнікамі вышэйшага саслоўя.

## РАЗВІЦЦЁ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ

Адначасова з фарміраваннем беларускай народнасці адбывалася станаўленне і развіццё адметных рыс духоўнай культуры беларусаў. Важнейшай часткай яе з’яўляецца вусна-паэтычная творчасць. У гэты перыяд беларускі фальклор быў прадстаўлены жанрамі, вядомымі з больш старажытных часоў (песні, быліны, казкі, легенды, магічныя заклінанні, замовы). Але ў XIV–XV стст. узніклі і пашырыліся новыя жанры – гістарычныя песні і казанні, гераічныя быліны, лірычныя песні, паданні. Звесткі аб фальклорных героях, пераказы легенд, прыказкі часткова захавалі летапісы XIV–XVI стст., хронікі, дакументы дзяржаўнага справаводства.

Беларускаму фальклору ўласцівы культ прыроды, анімістычныя ўяўленні, сімвалізм. Шматлікія вусна-паэтычныя цыклы беларускага фальклору датычыліся каляндарна-абрадавых свят: Каляды, Масленіца, Вялікдзень, Сёмуха, Русалачны тыдзень, Купалле і інш. З земляробчымі абрадамі звязаны талочныя, ільнаробчыя, ярылавыя, жніўныя песні. Разнастайныя сямейна-бытавыя і каляндарна-земляробчыя абрады ўвабралі ў сябе дахрыс-

цыянскія культы і ўяўленні: шанаванне агню, зямлі, грому, маланкі, сонца, дажджу і вады, валуноў, пэўных аб'ектаў расліннага і жывёльнага свету (папараць-кветка, тур, мядзведзь, воўк і інш.). З ушанаваннем памяці продкаў звязаны абрады Радуніцы, Дзядоў, памінанне русалак, плачы. У памінальных абрадах сумныя плачы чаргуюцца з вясёлымі песнямі. Такое сінкрэтычнае ўспрыманне жыццёвага цыклу адбілася ў народнай прымаўцы: «На Радуніцу да абеду пашуць, у абед плачуць, вечарам скачуць».

Адметнай рысай беларускага фальклору з'яўляюцца валачобныя песні. Такія абрадавыя абходныя песні захаваліся толькі ў беларусаў і часткова ў сербаў. Валачобніцтва было пашырана ў паўночных, усходніх і цэнтральных землях Беларусі, а таксама вядома ў расійскіх памежных землях, якія раней уваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. У паэтычна-песеннай форме валачобнікі ўслаўлялі гаспадара і з пажаданнямі багацця, дабрабыту, ураджаю ўзгадвалі ў паслядоўнасці каляндарныя поры года, язычніцкія і хрысціянскія святы, сельскагаспадарчыя заняткі:

А святы Іван ён пятку спяліць,
А святы Пятро паспяваець,
Святая Ілля – ды скорая жняя,
А шахнець, махнець – і, вой, снапок нажнець…

Валачобнікаў суправаджалі музыкі – дудар і скрыпач. У якасці падзякі гаспадары выносілі розныя пачастункі – хлеб, каўбасы, аладкі. Язычніцкія ўяўленні і абрады не зніклі з пашырэннем хрысціянства. Нават у 1511 г. даравальная грамата на самакіраванне жыхарам Навагародка ўзгадвала калядаванне і валачобніцтва і вызваляла гэтыя заняткі ад падатку: *«...мяшчане нынешнія і па ніх будучыя... коляды і волочобного не мають на замак наш давати, подле давнего обычая...»*. Валачобніцтва ў асобных месцах Беларусі захавалася да нашых дзён.

Неабрадавая паэзія беларусаў прадстаўлена баладамі (вядома звыш 100 сюжэтаў балад), лірычнымі і гістарычнымі песнямі. Большая частка гістарычных песень прысвечана набегам ворагаў. Звычайна ў такіх песнях перадаюцца перажыванні герояў на фоне гістарычных падзей, а не самі падзеі. Да гераічнага эпасу адносяцца казкі аб волатах-асілках, перамагаючых розных жудасных пачвар («Каваль-волат», «Удовін сын»). Гістарычныя песні, быліны, балады выконваліся бахарамі (казачнікамі) звычайна пад акампанемент музычных інструментаў.

Каляндарна-земляробчую і сямейна-бытавую абрадавую песнятворчасць суправаджалі пэўныя тэатралізаваныя (гуканне вясны, пераапрананне ў казу) і танцавальныя (карагоды) дзеянні. У XIV–XVI стст. паступова адбываўся

распад карагода і вылучэнне на яго аснове асобных танцаў. Характэрнымі для беларусаў становяцца парна-масавыя танцы, дзе жаночы танец істотна не адрозніваецца ад мужчынскага, а пераважаючымі з'яўляюцца дробныя парныя рухі, прытуп. У масавых святах, асабліва ў гарадах і мястэчках, удзельнічалі скамарохі, павадыры з мядзведзямі. Скамарохі былі як аселыя, так і вандроўныя. Паступова ўлады ўскладнялі ім дзейнасць, абкладалі значнымі падаткамі. Так, ужо ў сярэдзіне XVI ст. Віленскі сойм (1565–1566) пастанавіў: «*А з людей волочащих, которые без службы мешкают, и тех з медведников, дудников, скрипков, и с каждого гудка и иных, вместе мешкающих, хто службы певнае не маець, з головы самого и белых голов и детей их по осьми грошей*».

Барацьба з боку дзяржавы і царквы з паганскімі звычаямі і ўяўленнямі ўзмацнілася ў XV і асабліва XVI ст., але аб шырокім распаўсюджванні дахрысціянскіх вераванняў гавораць нават радкі з паэмы Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра»:

Часта з трывогаю думаеш: чым растлумачыць
Сілу, што ў нас надаецца замовам і травам,
Песні і магіі слова? Адказу не знойдзеш
І мімаволі згаджаешся: мы яшчэ дзеці
Ў свеце хрышчоных…

Не толькі простыя людзі, але і прадстаўнікі знаці звярталіся да варажэй, знахараў. Захаваліся звесткі, што нават да жонкі вялікага князя Аляксандра, Алены, запрашалі лекарку-яўрэйку, якая, праўда, пазней была абвінавачана ў вядзьмарстве. Аб моцным перапляценні паганскіх абрадаў з хрысціянскімі святамі сярод мясцовага насельніцтва з абурэннем пісаў у пасланні да князя Васілія (Канстанціна) Астрожскага ў канцы XVI ст. афонскі манах Іаан з Вішні, які патрабаваў ачышчэння хрысціянства: «Валочебное по Воскресении з мест и сел выволокши, утопите. Не хочет бо Христос при своем славном Воскресении того смеху и ругани дъявольского имети».

Але рэлігійная верацярпімасць, што пэўны час існавала ў ВКЛ, спрыяла працягламу захаванню язычніцкіх абрадаў і ўяўленняў, сінтэтычна дапаўняючы іх хрысціянскімі вобразамі:

Ішоў сам гасподзь-бог
Калінавым мастом,
Сустрэў сонцавыя дочкі.
Пытаецца:
– Куды вы ідзяцё?
(урывак з замовы)

Традыцыйная народная культура ў XIV–XV стст. менш за іншыя духоўныя сферы зведала ўплыў новых з'яў. Яе спадчына арганічна спалучылася з хрысціянскімі каштоўнасцямі, знайшла далейшы працяг у сінтэзе з візантыйска-балгарскімі і заходнееўрапейскімі ўплывамі.

У XIV–XV стст. у Вялікім Княстве Літоўскім істотна павялічылася колькасць храмаў і манастыроў, якія станавіліся цэнтрамі духоўнай хрысціянскай культуры, распаўсюджвалі асвету, хрысціянскую мараль і абраднасць. У праваслаўных храмах, якія складалі большасць у Беларусі, у богаслужэбнай дзейнасці вялікую ролю адыгрывалі песнапенні. Старабеларуская літургічная практыка адбывалася на аснове знаменнага распеву, які захаваў адзінства з візантыйска-балгарскай традыцыяй, характэрнай для праваслаўнай культуры ўсіх усходніх славян. Царкоўнаму песнапенню былі ўласцівы кананічнасць, устойлівасць узораў, дэперсаніфікаваны (ананімны) характар. Знакамі сярэдневяковага нотнага пісьма (неўменная натацыя) у манастырскім асяроддзі ствараліся беларускія нотныя рукапісы. Ужо ў XV ст. сустракаюцца выпадкі фіксавання аўтарства асобных песнапенняў і нотных рукапісаў. Як адзначае даследчыца такіх рукапісаў Л. Касцюкавец, у XV ст. складаліся і першыя нотныя азбукі. Таксама ў шэрагу праваслаўных цэркваў Беларусі пачаў гучаць не толькі манадычны (аднагалосы), але і шматгалосы спеў, уласцівы каталіцкім багаслужэнням. У гэты перыяд у праваслаўныя песнапенні праніклі ўплывы заходняй хрысціянскай традыцыі, пашыраўся гукарад, узбагацілася сістэма папевак і паглыбляліся іх мясцовыя адрозненні. Як вынік у XVI ст. сфарміраваліся праваслаўныя песнапенні з адметнымі варыянтамі знаменнага распеву – кіеўска-літоўскага, беларускага, віцебскага, слуцкага, нясвіжскага, магілёўскага і інш.

З пашырэннем храмавага будаўніцтва ў Беларусі шырылася і званарная культура, аб чым сведчаць і археалагічныя крыніцы. Фрагменты званоў XIV ст. знойдзены ў Берасці, Віцебску, Мсціслаўлі, Друцку. Да XIV ст. у Беларусі выкарыстоўвалі званы толькі візантыйскага тыпу, з пашырэннем каталіцтва з'явіліся і званы заходняй традыцыі. Распаўсюджванне званарнай культуры адбывалася няроўна і павольна, што тлумачыцца адсутнасцю мясцовых майстроў-ліцейшчыкаў і патрэбнай сыравіны, дарагавізнай замежных званоў і цяжкасцямі іх дастаўкі.

Званы адлівалі з бронзы, волава, медзі майстры з Венецыі, нямецкіх зямель, Рыгі і Польшчы. У працах Т. Нарбута ўзгадваецца звон бернардзінскага манастыра ў Навагародку, нібыта прывезены з Венецыі ў 1385 г. Вядомы зварот жыхароў Полацка да рыжскай Рады з просьбай перадаць заказ на званы для Сафійскага сабора іншаму майстру ў сувязі са смерцю майстра Гануса Смольбаха, з якім палачане дамаўляліся раней. Магчыма,

самы старажытны (які захаваўся ў непашкоджаным стане) на тэрыторыі Беларусі колакал быў выяўлены ў храме Св. Аляксандра Неўскага ў вёсцы Верцялішкі Гродзенскай вобласці. Ён датуецца XV ст., мае выцягнутую трохвугольную форму і змяшчае надпіс «*ANNO DOMINI AYTI (1480)*».

Першыя звесткі аб адліўцы званоў на тэрыторыі Беларусі непасрэдна каля храмаў адносяцца да першай паловы XVI ст. і звязаны з запрошанымі замежнымі майстрамі-ліцейшчыкамі. Пашырэнню званарнай традыцыі ў XVI ст. значна паспрыяла дзейнасць праваслаўных брацтваў і мецэнацтва. Такім прыкладам з'яўляецца яшчэ адзін старажытны непашкоджаны колакал 1583 г., які захаваўся ў вёсцы Моладава (цяпер Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці). Ён быў адліты майстрам Гофманам з Коўна па заказе ваеннага і дзяржаўнага дзеяча Сімяона Войны ў памяць аб бацьках. Звон багата арнаментаваны, змяшчае шэсць фрагментаў тэксту на беларускай мове лацінкай, а таксама выяву герба рода Войнаў. Званоў XIV–XVI стст. на тэрыторыі Беларусі амаль не захавалася: яны былі знішчаны пажарамі і войнамі або вывезены.

Духоўная музыка каталіцкіх храмаў прадстаўляла заходнееўрапейскую традыцыю ў культуры Вялікага Княства Літоўскага. З пашырэннем каталіцтва звязана з'яўленне арганнай музыкі. Упершыню гэты інструмент узгадваецца ў ВКЛ у пачатку XV ст. (1408 г.). Арганную музыку слухалі не толькі ў касцёлах, але і пры велікакняжацкім двары. Хуткаму распаўсюджванню арганаў спрыяла выкарыстанне гэтага інструмента ў пазнейшы час у кальвінісцкіх і грэка-каталіцкіх набажэнствах. Навучыцца ігры на аргане, касцельным спевам, атрымаць агульныя веды ў XV ст. можна было ў спецыяльных пеўчых школах – метрызах, якія актыўна дзейнічалі ў XV–XVIII стст. у Заходняй Еўропе. Ужо ў XVI–XVII стст. крыніцы ўзгадваюць арганы не толькі ў Вільні, але і ў Гародні, Нясвіжы, Берасці, Менску, Пінску, Паставах, Жыровічах, Ружанах, Смаленску, Магілёве.

У XIV–XV стст. характэрнай рысай духоўнага жыцця Беларусі з'яўлялася пашырэнне свецкіх форм музычнай культуры. У рыцарска-шляхецкім асяроддзі ахвотна пераймалі музычныя густы Заходняй Еўропы. З гістарычных крыніц вядома аб існаванні капэл пры дварах вялікіх князёў Альгерда, Ягайлы і Вітаўта. Сярод музычных інструментаў, якія былі ў велікакняжацкіх дварах, згадваюцца трубы, флейты, лютні, арфы, віёлы, партатыў і інш. Вядома, што ў 1408 г. вялікі магістр Тэўтонскага ордэна Конрад фон Юнгінген адаслаў у падарунак жонцы вялікага князя Вітаўта Ганне музычныя інструменты клавікорд і партатыў. Як адзначаюць музыказнаўцы, першыя звесткі пра партатыў у Еўропе адносяцца менавіта да двара вялікага князя Вітаўта. Вялікі князь і кароль польскі Аляксандр

меў пры сваім двары «літоўскага» музыку Чурылу, які кіраваў капэлай і славіўся спевамі пад акампанемент лютні. У княжацкіх дварах ладзіліся турніры і танцы, дзе таксама гучала музыка.

У музычную культуру рыцарскага саслоўя ўваходзіў багаты комплекс вайсковых (баявыя, вартавыя, маршавыя і інш.), цырыманіяльных і паляўнічых сігналаў, якія падавалі трубы, рог, барабаны. Невыпадкова рог і трубы выкарыстоўваліся як геральдычныя сімвалы ў родавых гербах (Осцікі, Радзівілы, усяго звыш 100 гербаў).

У штодзённай практыцы адбывалася спалучэнне царкоўнай і свецкай музыкі ў розных формах. Так, самым вядомым гімнам Вялікага Княства Літоўскага ў гэты перыяд лічыцца царкоўны гімн «Багародзіца». Найбольш старажытны запіс яго тэксту і мелодыі (1407) быў змешчаны ў зборы лацінскіх казанняў, складзеным Матэўшам з Грохава, які захоўваецца ў Ягелонаўскай бібліятэцы ў Кракаве. Усяго з XV ст. вядома пяць запісаў гімна, які стаў і рыцарскай песняй. Аб папулярнасці гэтага твора сведчыў і Я. Длугаш, які паведамляў, што ў 1410 г. пад Грунвальдам «Багародзіцу» спявалі як баявую песню і як царкоўны гімн.

Абапіраючыся на традыцыі пісьменнасці, перанятыя з Візантыі, праваслаўныя храмы і манастыры працягнулі традыцыю асветніцтва і кніжнасці на беларускіх землях. Манастыры зберагалі і множылі кнігі. У буйнейшых з іх дзейнічалі скрыпторыі. Спецыяльна падрыхтаваныя манахі перапісвалі рэлігійныя тэксты для патрэб самога манастыра і прыходаў, а таксама на продаж. Перапіска кнігі сярэдняга памеру і яе афармленне патрабавала некалькі месяцаў працы, таму кнігі каштавалі дорага і існавалі ў адзінкавых экзэмплярах. Пісалі спачатку на пергаменце, а з XV ст. пачалі ўжываць паперу. Для пісьма выкарыстоўвалі спецыяльна расшчэпленае гусінае пяро і фарбы на аснове арганічных і мінеральных кампанентаў. Рукапісны тэкст не меў абзацаў і звычайна не падзяляўся на словы. Прасветамі аддзяляліся асобныя фразы або іх часткі. Тэкставае поле кніг было звычайна прамавугольным (у адносінах 10:13 або 10:15), а заключны тэкст маглі змяшчаць у форме трохкутніка. Тэксты рукапісных кніг упрыгожвалі застаўкі, ініцыялы, мініяцюры.

У XIV–XV стст. сярод рукапісаў рэлігійнага характару пераважалі тэксты на царкоўнаславянскай мове. Раннебеларускае пісьменства пашыралася пераважна ў дзяржаўнай, актавай сферы. Манахі-перапісчыкі ў большасці зыходзілі з пазіцый «літаратурнай кансервацыі» і імкнуліся захаваць ранейшыя тэксты амаль без змен. Магчыма, таму спісы тэкстаў гэтага перыяду маюць менш розных дапаўненняў і ўставак, чым тэксты XII ст. Ужо ў канцы XV ст. сустракаюцца выпадкі, калі царкоўнаславянскія тэксты ўзбагачаліся беларускімі рысамі. Прыкладам можа служыць Чэцця 1489 г., перапісаная ў Камянцы паповічам Бярозкам з Навагародка.

Некаторыя праваслаўныя манастыры і саборы мелі значныя кніжныя зборы – бібліятэкі. На жаль, звесткі аб іх захаваліся фрагментарна. Спіс асобнікаў бібліятэкі Троіцкага манастыра ў Слуцку 1494 г. налічваў 47 кніг пераважна царкоўна-рэлігійнага характару. Пэўныя ўяўленні аб бібліятэках праваслаўных манастыроў дае вопіс кніжнага збору Супрасльскага манастыра, складзены ў 1557 г. архімандрытам Сергіем Кімбарам, у якім пазначана 211 кніг. Вялікую бібліятэку рукапісаў меў Сафійскі сабор у Полацку. Аб яе каштоўных скарбах напісаў Р. Гейдэнштэйн у «Запісах пра Маскоўскую вайну» (1584): «акрамя летапісаў, у ёй было шмат твораў грэчаскіх айцоў царквы…». Бібліятэка была страчана падчас Лівонскай вайны. Адзінкавыя рукапісы гэтай бібліятэкі выяўлены даследчыкамі ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве і ў Львове. Першыя пісьмовыя звесткі аб прыватных бібліятэках у ВКЛ адносяцца да канца XV – пачатку XVI ст. Магнаты замаўлялі перапісчыкам кнігі для сваіх прыватных калекцый, што сведчыць аб пашырэнні кніжнасці і пісьменства.

Пэўнай сістэмы адукацыі ў ВКЛ у XIV–XV стст. яшчэ не склалася. Першапачаткова выхаванне і адукацыя дзяцей адбываліся ў сям’і. Сялянскіх і мяшчанскіх дзяцей з маленства далучалі да хатніх спраў, сельскагаспадарчых заняткаў і рамёстваў, імкнуліся перадаць ім неабходныя веды аб звычаях, прыродзе, уладкаванні свету. Вялікую дыдактычную ролю адыгрывалі фальклор і царква. У заможных сем’ях феадальнай знаці да выхавання і адукацыі дзяцей прыцягвалі вандроўных настаўнікаў, спецыяльных слуг, вучоных манахаў. Працэс навучання адбываўся на аснове царкоўна-рэлігійных тэкстаў. У выхаванні шляхецкіх дзяцей значная ўвага таксама надавалася рыцарскаму майстэрству і этыкету.

Асобныя школы прасцейшага тыпу існавалі пры храмах і манастырах. Яны дзейнічалі спарадычна і істотна адрозніваліся па якасці выкладання. У такіх школах звычайна не было абмежаванняў канфесіянальнага характару, а далучыцца да ведаў маглі і бяднейшыя простыя людзі. Аб распаўсюджванні пісьменства сярод насельніцтва беларускіх зямель сведчаць і эпіграфічныя помнікі гэтага перыяду. Да XIV ст. адносіцца надпіс у шэсць радкоў кірылічнымі літарамі на шыфернай пласціне з Полацка, якая, на думку Г. В. Штыхава, выкарыстоўвалася як запісная кніжка вучня.

Аб пачатках сваёй адукацыі радкамі паэмы «Песня пра зубра» паведамляе Мікола Гусоўскі:

> Свет даўніны вывучаў я па кнігах славянскіх,
> Граматах рускіх, кірыліцай пісаных вязкай.
> Лад алфавіту наш прашчур для ўласнай карысці
> Ў грэкаў пазычыў і, гукі мясцовых гаворак
> Зладзіўшы з ім, іншаземцам, застаўся сабою.

У XIV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім з'явіліся кафедральныя школы. Яны ствараліся пры галоўным саборы епархіі і дзейнічалі пад наглядам епіскапа. Нягледзячы на клерыкальны характар, узровень такіх школ быў даволі высокім. Акрамя малітваў і рэлігійных тэкстаў, у іх вывучаліся «руская» і лацінская мовы, арыфметыка, дыялектыка, а часам і ўсе сем вольных навук, грэчаская, царкоўнаславянская мовы. Першае ўзгадванне такіх устаноў у крыніцах датычыцца Віленскай кафедральнай школы, заснаванай віленскім біскупам Андрэем прыкладна ў 1387/1388 гг. Сярод іншых свецкіх навук там выкладалі і старабеларускую («рускую») мову. Так, у канцы XV ст. будучы гаспадарскі пісар і віленскі канонік Адам Якубовіч з Котры Гарадзенскай воласці вывучаў «рускую» мову ў школе віленскага кафедральнага касцёла. У канцы XV – пачатку XVI ст. касцёльныя школы дзейнічалі ў Гародні, Гарадзішчы, Мастах, Трабах, Зэльве і некаторых іншых месцах.

У XIV–XV стст. пашыралася ўніверсітэцкая адукацыя. Яе набывалі ў еўрапейскіх універсітэтах: Падуанскім, Пражскім, Кракаўскім і інш. За навукамі выпраўляліся прадстаўнікі розных саслоўяў. У XV ст. найбольш значную ролю для ВКЛ адыгрываў Кракаўскі (Ягелонскі) універсітэт. Іматрыкуляцыйныя запісы (спісы прынятых у студэнцкую супольнасць) дазваляюць прасачыць колькасць студэнтаў з ВКЛ у Кракаўскім універсітэце па дзесяцігоддзях: у 1400-х гг. з ВКЛ паступіў 1 студэнт, у 1410-х – 13, у 1420-х – 15, у 1430-х – 3, у 1440-х – 21, у 1450-х – 15, у 1460-х – 20, у 1470-х – 38, у 1480-х – 36, у 1490-х – 39. Такім чынам, толькі ў Кракаўскім універсітэце ў XV ст. зафіксаваны 201 студэнт з ВКЛ. Як адзначаюць даследчыкі, прыкладна чвэрць студэнтаў Кракаўскага ўніверсітэта з ВКЛ у канцы XV ст. належалі да мяшчанскага саслоўя, а астатнія – да шляхецкага. Некаторыя студэнты вучыліся на сродкі мецэнатаў. Так, узгаданы Адам Якубовіч з Котры (які, дарэчы, не належаў да шляхецкага саслоўя) за кошт князя Андрэя Свірскага вучыўся ў Кракаўскім універсітэце ў 1478–1489 гг. і атрымаў ступень бакалаўра, а потым – магістра. Крыніцы даюць уяўленні і аб месцах, адкуль прыбылі кракаўскія студэнты з ВКЛ: Берасце, Ваўкавыск, Вільня, Віцебск, Гародня, Клецк, Любань, Менск, Орша, Полацк, Слуцк і інш.

Разам з вучобай ва ўніверсітэтах сярод шляхецкай моладзі пашыралася практыка службы пры адным з еўрапейскіх двароў. Набытыя вопыт і веды дазвалялі потым атрымаць добрую пасаду на радзіме. Не толькі шляхта, але і некаторыя падмасцер'і, мяшчане адпраўляліся ў далёкія краіны – спасцігалі сакрэты рамёстваў у майстроў Польшчы, Чэхіі, нямецкіх і іншых зямель. Пад уплывам еўрапейскай медыцыны ў ВКЛ распаўсюджваліся медыцынскія трактаты і траўнікі, лекавыя сродкі («яды»), анатамічныя

веды, дыягнастычныя прыёмы. Вядома аб існаванні рукапісу 1487–1490 гг., які з'яўляўся перакладам на старабеларускую мову старажытнай лекарскай кнігі, дапоўненага ў пазнейшых спісах звесткамі аб беларускіх раслінах і мясцовых лекавых сродках.

Разам з адукацыяй з еўрапейскіх краін у ВКЛ прыходзілі рэнесансныя ідэі, гуманізм, лацінамоўная літаратура, свецкая музыка і мастацтва, пашыраліся медыцынскія і астралагічныя веды.

## ЛЕТАПІСАННЕ

У культуралагічным плане XIV–XV стагоддзі на беларускіх землях можна лічыць пралогам Адраджэння. У гэты перыяд адбывалася фарміраванне беларускай мовы і станаўленне ўласна беларускай літаратуры. Непарыўная сувязь гэтых працэсаў назіраецца ў беларуска-літоўскім летапісанні. Беларуска-літоўскія летапісы, з аднаго боку, працягвалі традыцыі Старажытнай Русі, захоўваючы дзелавы стыль і лаканічнасць, але з другога боку, мастацка-жанравыя асаблівасці набліжалі іх да літаратурных твораў. Летапісы з'яўляюцца найбольш значным жанрам беларускай літаратуры XIV – пачатку XVI ст.

На беларускіх землях добра ведалі агульнарускія летапісы і складалі свае. У XIV ст. летапісная традыцыя мела пераважна мясцовы характар. Своеасаблівымі цэнтрамі летапісання станавіліся буйныя гарады – цэнтры княстваў. Летапісы гэтага часу перадавалі падзеі, якія тычыліся асобнага княства і яго правіцеляў. Як і старажытнарускія летапісы, яны не былі цэласнымі творамі, мелі фрагментарны характар, складаліся з пагадовых запісаў, аб'яднаных адной тэмай і формай выкладання. Раннія беларускія летапісы, на жаль, не збераглісся. Захаваліся звесткі аб вядзенні летапісання ў Полацку, Пінску, Слуцку, Тураве, Новагародку, Смаленску. Урыўкі некаторых з іх увайшлі ў склад рускіх і беларускіх летапісаў і зводаў.

У XV ст. характар беларуска-літоўскага летапісання істотна змяніўся. Палітычная і этнічная кансалідацыя беларускіх зямель прывяла да заняпаду мясцовага летапісання і ўзнікнення агульнадзяржаўных летапісаў. Беларуска-літоўскія летапісы ствараліся ў асноўным на старабеларускай мове, але з пэўным царкоўнаславянскім уплывам. Урыўкі з традыцыйных агульнарускіх летапісаў, якія трапілялі ў іх тэкст, змяшчаліся на царкоўнаславянскай мове. У XV ст. вядомы пераклады частак беларускіх летапісаў на лацінскую мову («Паходжанне караля Ягайлы і Вітаўта, князя Літвы»).

У адрозненне ад традыцыйнага летапісання Старажытнай Русі беларускія летапісы вяліся не сістэматычна (пагадова), а складаліся паэтапна з аб'ёмных

сюжэтных фрагментаў, урыўкаў з завершанай кампазіцыяй. Яны ўяўлялі сабой пэўныя аповеды аб падзеях мінулага, гістарычных асобах, іх учынках. Уключаны ў беларускія летапісы пагадовы матэрыял звычайна запазычваўся са старажытнарускіх летапісаў. Беларуска-літоўскія летапісы вылучаліся мастацкай навізной. Для іх не былі характэрны ўрыўкі з царкоўных твораў, казанняў, жыцій, затое шырока ўключаліся рамантычна-фантастычныя элементы (легенды, фальклор). Беларускія летапісы маюць пэўны псіхалагізм – паказваюць матывацыю ўчынкаў чалавека, перш за ўсё князёў і знаці, а таксама героіка-эпічныя рысы – менавіта князі выступаюць галоўнымі героямі сюжэтаў. Летапісы з'яўляюцца вынікам працы шматлікіх летапісцаў-інтэлектуалаў і перапісчыкаў. З XV ст. дайшло каля 50 беларускіх летапісных спісаў. Цэнтрам беларускага летапісання ў гэты час выступаў Смаленск.

Найбольш раннім помнікам беларуска-літоўскага летапісання з'яўляецца «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх». Гэты твор створаны ў Смаленску ў канцы 1420-х – 1430-я гг. на старабеларускай мове. Летапіс ахоплівае палітычныя падзеі ў ВКЛ ад сярэдзіны да канца XIV ст. Ён ствараўся ў два этапы (канец XIV і першая трэць XV ст.) дзвюма рознымі асобамі. У гэтым творы ўпершыню ў беларускай старажытнай літаратуры пераадолены старыя традыцыі – пагадовая форма выкладання падзей. Галоўнай тэмай летапісу з'яўляецца цэнтралізатарская палітыка князёў ВКЛ.

Першая частка твора напісана ў 1390-я гг. з мэтай абгрунтаваць правы Вітаўта на велікакняжацкі пасад, верагодна, асобай з блізкага атачэння князя. Аўтар распавядае аб барацьбе ў ВКЛ пасля смерці князя Гедыміна, завяршаючы аповед забойствам Кейстута. Падзеі выкладаюцца ў форме, блізкай да гістарычнай аповесці з займальным сюжэтам, але грунтуюцца на сапраўдных гістарычных фактах. Другая частка летапісу напісана каля 1430 г. у Смаленску, хутчэй за ўсё ў асяроддзі мясцовага праваслаўнага духавенства, якое падтрымлівала аб'яднанне рускіх зямель у складзе ВКЛ. Яна ўключае кароткія самастойныя апавяданні, розныя па памеры і часам не звязаныя паміж сабой. Сюжэты гэтай часткі паведамляюць аб паходах князя Вітаўта на розных князёў, каранаванні Ягайлы на польскі трон, шлюбе дачкі Вітаўта з маскоўскім князем і іншых падзеях апошняй чвэрці XIV ст. Асобна ў «Летапісцы» выступае «Аповесць пра Падолле», якая храналагічна пачынаецца з часоў Альгерда і даводзіцца да першай трэці XV ст. Аповесць напісана лаканічна і сціпла, як палітычны дакумент, які складзены з мэтай абараніць правы ВКЛ на гэтыя землі і супрацьстаяць захопніцкім памкненням Польшчы.

«Летапісец вялікіх князёў літоўскіх» вядомы ў розных спісах – Віленскім, Супрасльскім, Слуцкім, Рачынскага і інш., захаваўся ў летапісных

зводах і гістарычных кампіляцыях. Твор з'явіўся асновай арыгінальнай часткі Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г., выкарыстоўваўся як крыніца польскімі храністамі і гісторыкамі. Упершыню «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх» апублікаваны І. Даніловічам у 1823 г. у «Віленскім дзённіку».

Першым агульнадзяржаўным летапісным зводам Вялікага Княства Літоўскага з'яўляецца Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г., складзены ў Смаленску. Яго асаблівасцю з'яўляецца ўключэнне падзей, якія адбываліся ў княстве, у агульнарускі кантэкст. Храналагічна звод ахоплівае перыяд ад сярэдзіны IX да сярэдзіны XV ст. і выкладае гісторыю Старажытнай і Маскоўскай Русі, Вялікага Княства Літоўскага. Існуюць меркаванні, што гэты звод быў створаны па ініцыятыве смаленскага епіскапа, а пазней мітрапаліта Герасіма.

Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. складаецца з некалькіх няроўных частак, напісаных як свецкім дзелавым, так і кніжна-славянскім стылем на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах. Важнейшая частка зводу – «Выбар летапісання, выкладзены коратка», па стылі набліжаецца да царкоўнага летапісання і вядзе выкладанне ад часоў Старажытнай Русі да 1446 г. Гэтая частка зводу была складзена каля 1430 г. таксама ў Смаленску аўтарам духоўнага сану з кола епіскапа Герасіма. У аснову «Выбару летапісання» пакладзены наўгародскія і маскоўскія летапісы, у тым ліку летапіс мітрапаліта Фоція канца 1420-х гг., мясцовыя і некаторыя невядомыя летапісы. Матэрыял падаецца ў форме пагадовых запісаў, але часам падзеі розных гадоў аб'ядноўваюцца пад адной датай, калі яны звязаны паміж сабой. Гісторыя Старажытнай Русі выкладаецца вельмі сцісла і фрагментарна. Аўтар выкарыстоўваў урыўкі з многіх летапісаў, прыбягаючы да кампіляцыі і скарачэння, а часам і правак тэкстаў. Больш ярка і разгорнута перадаюцца падзеі XII–XIII стст., звязаныя з барацьбой супраць Батыя і крыжакоў. У XIV – першай чвэрці XV ст. выкладаецца гісторыя Маскоўскага княства, а з другой чвэрці XV ст. – Вялікага Княства Літоўскага. Неабходна адзначыць, што смаленскія летапісцы значна адрэдагавалі маскоўскі летапіс Фоція і выкраслілі з яго адмоўныя характарыстыкі літоўскіх князёў. Так былі перапраўлены запісы паходаў князя Альгерда (1368, 1370, 1372 гг.) на Маскву, а з запісу аб яго смерці ў 1377 г. выкінуты выраз «зловредный, безбожный и нечестивый».

Акрамя запісаў, запазычаных з рускіх летапісаў, у Беларуска-літоўскім летапісе 1446 г. змешчаны так званая Смаленская хроніка аб падзеях 1430–1436 гг., мясцовыя запісы 1432–1445 гг., а таксама «Пахвала вялікаму князю Вітаўту». Завяршае звод «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх» з «Аповесцю пра Падолле».

Па сваім характары Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. з'яўляецца агульнарускім зводам, бо падае інфармацыю з палітычнай гісторыі кіеўскіх, маскоўскіх, беларускіх зямель. Аўтар імкнуўся паслядоўна давесці ідэю неабходнасці палітычнага аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель у складзе ВКЛ. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць звесткі з беларуска-літоўскай часткі зводу, большасць якіх унікальная і не паўтараецца. Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. стаў крыніцай для іншых летапісных твораў ВКЛ і Расіі XVI–XVII стст.

Афармленне афіцыйнага летапісання ВКЛ завяршылася ў пачатку XVI ст. У гэты час беларуска-літоўскія летапісы канчаткова страцілі агульнарускі характар, а пераважаючай для іх стала ідэя агульнадзяржаўнага патрыятызму.

## ПЕРАКЛАДНАЯ І АРЫГІНАЛЬНАЯ ЛІТАРАТУРА

Адметныя рысы беларускай старажытнай літаратуры прадвызначаны гістарычнай эпохай, у якую яна стваралася. Для розных жанраў свецкіх і рэлігійных твораў XIV–XV стст. характэрны традыцыйнасць, устойлівасць форм, імкненне адпавядаць наяўным узорам. Асобныя жанры ў гэты перыяд яшчэ не набылі дастатковага развіцця, таму перавагу мела практычнае прызначэнне твораў, а не іх мастацкія якасці. Старажытная беларуская літаратура спалучала службовае, дзелавое прызначэнне з пазнавальнай і эстэтычнай функцыямі. Таму ў яе ўключаюцца, акрамя іншага, і службовыя лісты, царкоўна-рэлігійная палеміка, летапісы і г. д. Яшчэ адной адметнай рысай старажытнай беларускай літаратуры з'яўляецца гістарызм – у аснову арыгінальных твораў XIV–XV стст. пакладзены звычайна рэальныя падзеі. Большасць тэкстаў гэтага часу мела ананімны і сінкрэтычны характар, але ўжо вылучаліся індывідуальныя пісьменніцкія стылі. Станоўчы ўплыў на фарміраванне беларускай літаратуры меў дзяржаўны статус старабеларускай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Галоўнае месца ў літаратуры гэтага часу займалі рэлігійныя царкоўнаславянскія творы. Яны працягвалі візантыйскія і старажытнарускія традыцыі. Пры манастырах і храмах актыўна перапісваліся неабходныя для богаслужэбнай дзейнасці і запатрабаваныя для вывучэння кнігі Бібліі: Псалтыр, Апостал, Евангелле. Засталіся звесткі аб шматлікіх Псалтырах: Смаленскім 1395 г., Віленскай Мікалаеўскай царквы 1397 г., Віцебскім 1492 г. і інш. Захаваліся пергаментныя высокамастацка ўпрыгожаныя Евангеллі: Друцкае (XIV ст.), Лаўрышаўскае (першая палова XIV ст.), Мсціжскае (XIV ст.), Жыровіцкае (XV ст.). Паступова рэлігійная літаратура ўзбагачалася

старабеларускай мовай. Так, у Лаўрышаўскім евангеллі, напісаным царкоўнаславянскай мовай, прысутнічаюць надпісы-ўстаўкі на старабеларускай мове. У XV ст. з'явіліся першыя пераклады твораў рэлігійнага характару на беларускую мову, сярод якіх былі асобныя кнігі Бібліі, аповесць «Пакуты Хрыста», апакрыфічная «Аповесць пра трох каралёў» і інш. З канца XIV ст. пачала ўзрастаць колькасць лацінамоўных твораў, што тлумачыцца пашырэннем каталіцызму ў ВКЛ.

У рэлігійнай літаратуры захаваліся традыцыйныя жанры: казанні, жыціі, хаджэнні, словы і г. д. Як і раней, у царкоўна-рэлігійнай літаратуры пераважалі перакладныя творы, а арыгінальных было створана няшмат. Жанры рэлігійнай літаратуры развіваліся не ў роўнай ступені. Агіяграфічная літаратура прадстаўлена ў асноўным перайшоўшымі з ранейшага перыяду жыціямі агульнарускіх і мясцовых святых (Барыса і Глеба, Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Аўрамія Смаленскага і інш.), якія актыўна перапісваліся і множыліся. У XV ст. на старабеларускую мову было перакладзена «Жыціе Аляксея, чалавека Божага» – твор, папулярны і вядомы на беларускіх землях на царкоўнаславянскай мове яшчэ з XI ст. Тым не менш пры перакладзе на старабеларускую мову выкарыстоўваліся лацінскі варыянт і чэшскія крыніцы. У жыціі прадстае ўзорны вобраз хрысціянскага святога, які адрынуў чалавечы свет і праз пакуты набыў свет Божы. Беларуская рэдакцыя твора адрознівалася ад царкоўнаславянскага варыянту тэксту большым псіхалагізмам і драматычнасцю.

Да сярэдзіны XIV ст. адносіцца жыціе трох віленскіх (літоўскіх) пакутнікаў: Антона, Івана і Астапа. Усе яны служылі пры двары князя Альгерда і спачатку вызнавалі паганства (язычніцкія імёны – Круглец, Кумец, Няжыла). Прыняўшы хрост, браты Антон і Іван адмовіліся парушаць пост і галіць бароды, за што па загадзе князя былі пакараны смерцю. Крыху пазней, у 1347 г., быў павешаны і сваяк гэтых братоў, Астап. У 1374 г. па ініцыятыве мітрапаліта Кіпрыяна пакутнікі былі кананізаваны канстанцінопальскім патрыярхам і сталі першымі праваслаўнымі святымі Вялікага Княства Літоўскага. Але казанне аб пакутніках у гэты перыяд было яшчэ малавядомае на беларускіх землях. Жыціе віленскіх пакутнікаў створана ў Візантыі на грэчаскай мове, а ў XV ст. на Балканах перакладзена на царкоўнаславянскую. Захавалася сербская рэдакцыя жыція XV ст. У другой палове XV ст. згадкі аб Антоне, Іване і Астапе з'яўляюцца ў маскоўскіх і наўгародскіх летапісах, а ў 1549 г. яны былі кананізаваны ў Маскве. Менавіта ў XVI ст. культ віленскіх пакутнікаў пашыраецца і ў ВКЛ. Да XV ст. адносяцца і два мясцовыя жыційныя творы, прысвечаныя Парфену і цудам ад рэліквій Св. Мікалая, у гонар якога Парфен пабудаваў царкву ў Лукомлі.

Элементы жыційнай літаратуры, гераічнага эпасу і хрысціянскай аповесці спалучыла «Слова пра Меркурыя Смаленскага» (XV ст.). Існуюць некалькі рэдакцый гэтага твора. Але ва ўсіх рэдакцыях «Слова...» прысутнічаюць культ Багародзіцы, чароўныя сілы, нейкі чалавек Меркурый, які абараняў Смаленск і потым вярнуўся ў горад са сваёй адсечанай галавой у руках, але з перамогай. У адных рэдакцыях Меркурый змагаецца з войскам Батыя, а ў другіх – з волатам.

Значнае распаўсюджванне атрымала паломніцкая хрысціянская літаратура, прадстаўленая хаджэннямі. Па сутнасці хаджэнні ўяўлялі сабой нататкі вандроўнікаў падчас паломніцтва ў святыя землі. Творы лаканічна перадавалі маршрут паломнікаў і падзеі, якія здараліся на шляху, але хаджэнні былі, звычайна, пазбаўлены мастацкіх замалёвак і аўтарскіх ацэнак. Некаторыя з іх ўтрымлівалі назіранні і практычныя звесткі. Паломніцкая літаратура прадстаўлена хаджэннямі смаленскага архімандрыта Аграфенія, які здзейсніў паход у Іерусалім у 1375 г., смаленскага дзяка Ігнацыя Смаляніна і полацкага ігумена Варсанофія. У сваім «Хаджэнні» Ігнацій Смалянін у строгай храналагічнай паслядоўнасці адлюстраваў паездку ў свіце мітрапаліта Пімена ў Канстанцінопаль у 1389–1393 гг. Твор утрымлівае разгорнутыя дыялогі, каштоўныя звесткі аб прыездзе ў ВКЛ мітрапаліта Кіпрыяна. У «Хаджэнні» ігумена Бельчыцкага манастыра з Полацка Варсанофія, які двойчы наведваў Святую зямлю (1465 і 1471–1472 гг.), акрамя традыцыйнага зместу, змешчаны замалёўкі прыроды Егіпта.

У XV ст. з’явілася царкоўна-катэхізічная літаратура, прадстаўленая пераважна тлумачэннямі асноўных дагматаў. Значную спадчыну ў царкоўнаславянскай літаратуры пакінуў царкоўны дзеяч, пісьменнік і прапаведнік Грыгорый Цамблак (каля 1364–1419/1420). Прадстаўнік Тырноўскай кніжнай школы, Цамблак быў прыхільнікам паўднёва-славянскай містычна-элітарнай ерасі – ісіхазму, з якім было звязана з’яўленне новага літаратурнага стылю ў царкоўнаславянскай літаратуры, што атрымала назву «сплятанне слоў» (плетение словес). Гэты стыль вылучаўся вобразнасцю, выкарыстаннем складанай кніжнай лексікі, сінонімаў, рытарычных фігур (воклічаў, пытанняў, паўтораў і інш.), экспрэсіўнасцю. З беларускім перыядам звязана 15 твораў Грыгорыя Цамблака, сярод якіх шмат «слоў» – «Слова пахвальнае Дзмітрыю» [Салунскаму], «Надмагільнае слова Кіпрыяну» і інш., пахвалы, прамовы, палемічны твор «Слова, як трымаюць веру немцы», духоўны верш «На Успенне Багародзіцы». Творы Цамблака былі вядомымі і папулярнымі не толькі ў Вялікім Княстве Літоўскім, але і на рускіх землях.

У XV ст. з’явіўся жанр панегірычнай літаратуры, мэтай якой было праслаўленне пэўных асоб. «Пахвала Вітаўту», створаная каля 1430 г. у Сма-

ленску, – першы ў старабеларускай літаратуры твор свецкага панегірычнага характару. Гэта ўрачыстае, пафаснае казанне з мэтай праслаўлення ўладара-князя і яго магутнай дзяржавы. У гэтым творы Вітаўт паўстае магутным правіцелем, палітычнай асобай еўрапейскага маштабу: «Як не дзівіцца славе вялікага гаспадара. Няма земляў ні на ўсходзе, ні на захадзе, адкуль не прыходзілі б пакланіцца гэтаму славутаму гаспадару».

Сярод свецкай перакладной літаратуры набылі вядомасць рыцарскія аповесці «Александрыя», «Аповесць аб Троі», астралагічныя, магічныя кнігі. Але станаўленне старажытнабеларускай літаратуры адбывалася пераважна на аснове ўсходняй царкоўнаславянскай традыцыі.

## ДОЙЛІДСТВА, ЖЫВАПІС, СКУЛЬПТУРА

У XIV–XV стст. на развіццё архітэктуры, жывапісу, скульптуры Беларусі значна пашырыўся ўплыў заходнееўрапейскіх стыляў; з'явіліся новыя мастацкія прыёмы і формы, былі засвоены новыя тэхналогіі і матэрыялы. Элементы заходнееўрапейскай мастацкай культуры інтэграваліся са старажытнай культурай беларускіх зямель, заснаванай на візантыйскай традыцыі. Гэты цывілізацыйны сімбіёз прадвызначыў адметныя рысы беларускага дойлідства, жывапісу, скульптуры. Пануючым мастацкім стылем XIV–XV стст. стала готыка, але, як правіла, у спалучэнні з іншымі элементамі.

Значныя зрухі адбываліся ў архітэктуры. У XIII–XIV стст. паступова страцілі ўплыў мясцовыя школы дойлідства, зменшылася роля драўляных абарончых збудаванняў. Знешняя небяспека спрыяла развіццю манументальнага дойлідства. Пераважаючая частка абарончых збудаванняў у XIV–XV стст. захавала драўляна-земляны характар, але была дапоўнена муранымі элементамі. Асноўным тыпам манументальнага будаўніцтва ў гэты перыяд быў замак. Ён меў замкнёную кампазіцыйную структуру з унутраным дваром, ахоўваўся магутнымі сценамі, непрыступнасць якіх павялічваў адпаведны складаны рэльеф мясцовасці (балота, бераг і г. д.). Замак спалучаў некалькі функцый: фартыфікацыйную, прадстаўнічую, практычную – з'яўляўся жыллём. У адрозненне ад заходнееўрапейскіх краін большасць замкаў у Вялікім Княстве Літоўскім будаваліся драўлянымі, але прынцыпы іх размяшчэння былі падобнымі да мураваных. У гэты час пачыналі ўзводзіцца замкі з рэгулярнай планіроўкай – дакладна вызначанай сіметрыяй і палацавым прызначэннем галоўнага будынка.

Да сярэдзіны XV ст. найбольш значныя і добра ўмацаваныя замкі належалі вялікаму князю, але з другой паловы XV ст. пачалося актыўнае будаўніцтва замкаў магнатамі. Такім чынам, ужо ў канцы XV ст. з'явіліся

замкі-рэзідэнцыі – уладальніцкія замкі ў прыватнаўласных гарадах і мястэчках, цэнтрах латыфундый.

У XIV – пачатку XV ст. для абароны заходніх меж краіны былі ўзведзены мураваныя велікакняжацкія замкі ў Вільні, Троках, Гародні, Крэве, Лідзе, Новагародку і некаторых іншых месцах. Яны мелі агульнадзяржаўнае прызначэнне і адначасова выступалі ў якасці велікакняжацкіх рэзідэнцый. Замкі ў Гародні, Новагародку і Вільні склаліся на ранейшых умацаваных дзядзінцах, таму паўтаралі іх канфігурацыю і мелі нерэгулярную планіроўку. Гродзенскі замак быў пабудаваны на мяжы XIV–XV стст. пасля вялікага пажару 1398 г. Замкавы комплекс складаўся з пяці злучаных вежаў і палаца і размяшчаўся па перыметры трохвугольнай пляцоўкі Замкавай гары. Таўшчыня сцен дасягала трох метраў, а з вонкавых бакоў фартэцыю дадаткова ўмацоўвалі контрфорсы. Палац Вітаўта быў двухпавярховым, таксама меў моцныя сцены з камянёў і буйнапамернай цэглы і вузкія вокны. Палац праіснаваў да 1580-х гг. і быў перабудаваны ў рэнесансным стылі па загадзе Стэфана Баторыя.

Адзін з магутнейшых абарончых комплексаў, які складаўся з двух замкаў, існаваў у Віцебску. Паводле летапісных крыніц ён быў завершаны ў 1351 г. Верхні замак меў восем вежаў у лініі сцен і ў плане нагадваў няправільную трапецыю. Унутры комплексу знаходзіўся палац Альгерда (на думку даследчыкаў, гэта была жылая вежа-данжон). Ніжні замак уключаў сем вежаў і тры брамы. У замкавай архітэктуры ВКЛ выкарыстоўвалі буйнапамерную цэглу («літоўскую») і неапрацаваныя камяні. Знешні выгляд замкаў быў сціплым і суровым, што адлюстроўвала тагачасную эстэтыку.

У храмавым будаўніцтве пераважалі драўляныя цэрквы купальнага і базілікальнага тыпаў, пастаўленыя па прынцыпах народнага дойлідства мясцовымі майстрамі. Адначасова з праваслаўнымі будаваліся і каталіцкія, пераважна драўляныя храмы. Да канца XIV ст. у ВКЛ было шэсць касцёлаў, а ў XV ст. з’явілася яшчэ 50. З пашырэннем каталіцтва ў храмабудаўніцтве распаўсюджваюцца элементы гатычнага стылю (нервюры, зорчатыя і сотавыя скляпенні, стральчатыя аркі, контрфорсы). Спалучэнне традыцый візантыйскага дойлідства і элементаў готыкі прывяло да з’яўлення самабытнай архітэктуры «абарончых» (інкастэляваных) беларускіх храмаў канца XV – пачатку XVI ст. Да іх адносяцца бязвежавы Троіцкі касцёл у Ішкалдзі (1472 г., Брэсцкая вобл.), царква Св. Міхаіла ў вёсцы Сынкавічы (канец XV – пачатак XVI ст., Гродзенская вобл.), Сафійскі сабор у Полацку (1494–1505 гг., разбураны у час Паўночнай вайны), царква Раства Багародзіцы ў вёсцы Мураванка (1516–1542 гг., Гродзенская вобл.), апошняя ўвабрала і элементы рэнесанснага стылю.

Новымі рысамі гарадской архітэктуры XIV–XV стст. з пашырэннем магдэбургскага права сталі ратушы, часам двухпавярховыя, пераважна мураваныя. Дарэчы, цэнтр большасці беларускіх гарадоў у гэты час быў мураваным.

У выяўленчым мастацтве XIV–XV стст. атрымалі развіццё фрэскавы жывапіс і іканапіс, партрэт, дэкаратыўная скульптура і кніжная графіка. Нешматлікія творы гэтага перыяду, якія дайшлі да нашага часу, адкрываюць толькі маленькую частку багатай і разнастайнай мастацкай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага. Да страчаных каштоўнасцей можна аднесці фрэскавы жывапіс. Шматлікія крыніцы паведамляюць аб існаванні фрэскавых роспісаў у цэрквах і касцёлах княства. Фрэскі ўпрыгожвалі сцены княжацкіх палацаў і замкаў у Вільні, Троках, Крэве, Гародні, Віцебску, Полацку. Самымі вядомымі фрэскамі, выкананымі беларускімі майстрамі Андрэем, Кірылам і Юшкай (Юшко) (імёны выяўлены падчас рэстаўрацыі), з'яўляюцца роспісы XV ст. капліцы Св. Троіцы ў Любліне 1418 г. Вызначальнымі рысамі гэтых фрэсак з'яўляюцца выразная каларытнасць і ўрачыстасць, а таксама прысутнасць партрэтных выяў, у тым ліку – Ягайлы. Беларускае аўтарства прызнаюць мастацтвазнаўцы і за роспісамі капліцы Св. Крыжа Вавельскага замка ў Кракаве.

Атрымаў далейшае развіццё партрэтны жывапіс, які працягваў традыцыі візантыйскага мастацтва ў форме данатарскага і ктытарскага партрэтаў, прыкладамі якіх з'яўляюцца выявы Ягайлы са Св. Мікалаем з замкавай капліцы Св. Троіцы ў Любліне, Вітаўта – на фрэсках Трокскага замка, Альгерда і Ульяны – у Віцебску. Партрэты прыцягвалі ўвагу гледача да саслоўна-рэпрэзентатыўнага, а не псіхалагічна-асабовага статусу чалавека. Партрэтнаму жывапісу таго часу ўласцівы прадстаўнічыя і дыпламатычныя функцыі. У XV ст. пашырыўся склад заказчыкаў партрэтных твораў (удзельныя князі, баярства) і іх геаграфія – Слуцк, Мсціслаўль, Берасце, з'явіліся новыя жанры – пахавальны, эпітафійны і інш.

Сціплая іканапісная спадчына XV ст. прадстаўлена ўнікальнымі помнікамі візантыйскай традыцыі, сярод якіх абраз «Маці Божай Замілаванне» з Мікалаеўскай царквы г. Маларыта (Брэсцкая вобл.) афінскага майстра Ніколаса Ламбудзе, абраз «Успенне Маці Божай» з Мінска (вядомы як «Блакітнае Успенне», быў вывезены у 1914–1917 гг. у Маскву і захоўваецца ў Траццякоўскай галерэі). Да гэтага ж архетыпа адносіцца цудатворны абраз Маці Божай Мінскай. Паводле легенды, яўленне гэтай іконы адбылося 13 жніўня 1500 г. на рацэ Свіслач у Менску, ікона адразу была перанесена ў замкавую царкву. Убачыць кампазіцыю гэтага твора дазваляе толькі рэнтгенаграма, бо абраз знаходзіцца пад пазнейшымі запісамі XVII–XVIII стст.

З іканаграфічнымі тыпамі Маці Божай Смаленскай і Іерусалімскай звязаны «Адзігітрыі» з Дубянца, Слуцка, Пінска XV – пачатку XVI ст.

Значнае развіццё ў XIV–XV стст. набыла скульптура, у якой па-ранейшаму асноўнае месца займалі творы малых форм: крыжы, складні, металічныя абразкі-змеевікі, амулеты і іншыя рэчы. Атрымалі распаўсюджванне разныя з каменю барэльефныя абразы. Адзін з іх, – цудатворны абраз XV ст. Жыровіцкай Божай Маці, выкананы на яшмавым камені, можа па праву называцца помнікам сусветнага значэння. На гэтай іконе пададзена выява Маці Божай Замілаванне. Малюнак і пластыка твора сведчаць аб высокай таленавітасці майстра-рэзчыка. Абраз знаходзіцца ў Жыровіцкім манастыры і мае багатую гісторыю ўшанавання.

XIV–XV стагоддзі з'явіліся важным перыядам у фарміраванні самабытнай беларускай культуры. Існаванне сваёй дзяржаўнасці, высокі статус старабеларускай мовы, станаўленне ўласнай літаратуры, умацаванне хрысціянства садзейнічалі як этнакультурнай, так і палітычнай кансалідацыі. Пашырэнне ўплываў заходнееўрапейскай свецкай і лацінскай культуры не знішчылі, а ўзбагацілі грэка-візантыйскія і старажытнарускія традыцыі беларускіх зямель, заклалі трывалы падмурак надыходзячай эпосе Адраджэння.

# 17 РЭЛІГІЙНАЕ СТАНОВІШЧА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У XIV–XV стст.

- **Рэструктурызацыя праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім**
- **Зацвярджэнне каталіцтва ў дзяржаве. Уніяцкія тэндэнцыі ў Вялікім Княстве Літоўскім**

## РЭСТРУКТУРЫЗАЦЫЯ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

З канца X ст. у Старажытнай Русі фарміравалася структура праваслаўнай царквы, якая ўключала Кіеўскую (пазней Кіеўскую і ўсяе Русі) мітраполію, каля 16–17 епархій, прыходы. У другой палове XIII – XV ст. за падначаленне ўсёй або часткі Кіеўскай мітраполіі сапернічалі некалькі дзяржаў. Сярод іх: Польшча з прэтэнзіямі на Галіцка-Валынскую Русь, Вялікае Княства Літоўскае, у склад якога ўвайшлі землі Беларусі і Украіны, а таксама Вялікае Княства Маскоўскае (Уладзімірскае), якое імкнулася пашырыць уплыў на ўсе рускія княствы. Кантроль над мітраполіяй і даходы з яе намагаліся захаваць канстанцінопальскія патрыярхі. У акрэслены перыяд актывізавалася дзейнасць рымскіх пантыфікаў з мэтай зацвярджэння хрысціянства заходняй традыцыі сярод балцкага і ўсходнеславянскага насельніцтва.

У 1299 (1300) г. кафедра кіеўскага мітрапаліта была перанесена ва Уладзімір-на-Клязьме, а ў 1326 г. – у Маскву. Перамяшчэнне мітрапаліцкай рэзідэнцыі не адпавядала інтарэсам гаспадароў Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага, а таксама князёў Галіцка-Валынскай Русі.

Распачалася барацьба за панаванне ў Заходняй Русі праз стварэнне асобных мітраполій – Галіцка-Валынскай (далей – Галіцкай) і Літоўскай.

Прыкладна ў 1303–1304 гг. па ініцыятыве галіцка-валынскага князя Юрыя Львовіча канстанцінопальскім патрыярхам Афанасіем I была створана Галіцкая праваслаўная мітраполія, якая праіснавала да 1326 г. У яе склад уваходзілі Галіцкая, Луцкая, Перамышльская, Уладзімірская, Холмская і Тураўская епархіі. У 1337–1338 гг. гэта мітраполія адрадзіла сваю дзейнасць, аднак ужо ў 1347 г. канстанцінопальскі патрыярх Ісідор I і візантыйскі імператар Іаан VI Кантакузін далучылі яе да Кіеўскай мітраполіі.

Праз клопаты польскага караля Казіміра III Галіцкая мітраполія была адноўлена ў 1371 г. у складзе Галіцкай, Перамышльскай, Уладзімірскай, Холмскай і Тураўскай епіскапій (Тураўская неўзабаве выйшла з яе складу). Аднак ужо ў канцы 1390-х гг. кіеўскі мітрапаліт Кіпрыян (1375–1380, 1389–1406) дамогся фактычнага скасавання згаданай мітраполіі і распаўсюдзіў сваю ўладу на яе епархіі. Фармальна яна (ужо як уніяцкая) была скасавана папам рымскім у 1458 г.

Адказам на ўзнікненне Галіцка-Валынскай мітраполіі з'явілася ўтварэнне Літоўскай. У 1316 (1317) г. канстанцінопальскім патрыярхам Іаанам Глікам пры падтрымцы вялікага князя Гедыміна (1316–1341) была створана праваслаўная мітраполія з кафедрай у Навагародку, у склад якой увайшлі Полацкая і Тураўская епархіі. Першы літоўскі мітрапаліт грэк Феафіл тройчы – у 1317, 1327 і 1329 гг. – прысутнічаў на пасяджэннях Патрыяршага Сінода, што сведчыла аб важным значэнні новай царкоўнай структуры.

Пасля смерці Феафіла ў 1335 г. новы ўладыка ў Вялікае Княства Літоўскае не быў прызначаны. Кіеўскі і ўсяе Русі мітрапаліт Феагност (1328–1353), прыехаўшы з Масквы ў Навагародак, узяў маёмасць архірэйскага дома пад свой кантроль. Літоўская мітраполія перастала існаваць.

Спробы падначалення ўсёй Кіеўскай мітраполіі ці значнай яе часткі набылі больш выразны характар у часы вялікага князя Альгерда (1345–1377), калі тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага дасягнула значных памераў за кошт зямель з усходнеславянскім праваслаўным насельніцтвам. У 1354 (1355) г. канстанцінопальскі патрыярх прызначыў літоўскім мітрапалітам кандыдата князя Альгерда цверскога баярына Рамана, пакінуўшы за маскоўскім архірэем Алексіем (1354–1378) тытул мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі. У склад мітраполіі ўвайшлі Навагародская мітрапаліцкая, Полацкая, Тураўская епіскапіі, пазней – Уладзімірская, Луцкая, Холмская, Галіцкая і Перамышльская епіскапіі. Царкоўна-адміністрацыйнай уладзе Рамана падлягалі землі Браншчыны і фактычна Цверы. Спробы «кіева-маскоўскага» ўладыкі нейтралізаваць дзейнасць Рамана, які да таго ж карыстаўся тытулам

мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі, не ўвянчаліся поспехам. Аднак цэласнасць Кіеўскай мітраполіі на чале з Алексіем усё ж была адноўлена са смерцю Рамана ў 1362 г. і замацавана патрыяршай граматай 1364 г.

Чарговая спроба стварэння незалежнай царкоўнай арганізацыі ў межах Вялікага Княства Літоўскага была зроблена вялікім князем Вітаўтам (1392–1430). У 1406 г. памёр мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі Кіпрыян (Цамблак), які здолеў злучыць пад сваёй духоўнай уладай усе ўсходнеславянскія землі. Вялікі князь Вітаўт разам з праваслаўным духавенствам ВКЛ прасіў канстанцінопальскага патрыярха зацвердзіць ім асобнага мітрапаліта. У якасці кандыдата прапаноўваўся полацкі архіепіскап Феадосій. Патрыярх адмовіў і праз два гады пасвяціў у мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі маскоўскага стаўленіка Фоція (1408–1431).

Незадаволены дзейнасцю Фоція ў Вялікім Княстве Літоўскім, Вітаўт склікаў сабор праваслаўных іерархаў у пачатку 1414 г. Вялікі князь прапанаваў паставіць у дзяржаве асобнага мітрапаліта, бо Фоцій, «съдяху но столе митропольстеем всея Руси», не займаўся манастырамі, цэрквы разбураліся і беднелі, «весь Киев и всю землю пусту сотвори тяжкими пошлинами и данми великыми и неудобь носимыми». Вітаўт адправіў ў Канстанцінопаль дэлегацыю на чале з Грыгорыем Цамблакам за благаславеннем. Але канстанцінопальскі патрыярх, не жадаючы падзелу ўсходнеславянскай царквы, не задаволіў просьбу вялікага князя.

15 лістапада 1415 г. у Навагародку па ініцыятыве Вітаўта быў скліканы сабор праваслаўнага духавенства і свецкай эліты, на якім без згоды патрыярха на мітраполію «Киева и всея Руси» быў пастаўлены Грыгорый I Цамблак (1415–1419). Праваслаўная царква ў Вялікім Княстве Літоўскім стала фактычна аўтакефальнай.

У склад мітраполіі ўвайшлі епархіі: Кіеўская, Луцкая, Перамышльская, Полацкая, Смаленская, Тураўская, Уладзімірская, Холмская, Чарнігаўская. Мітрапаліцкая кафедра Грыгорыя I спачатку знаходзілася ў Кіеве. Пасля 1416 г. ён перанёс яе ў Вільню, а сваёй рэзідэнцыяй зрабіў Навагародак.

Канстанцінопальскі патрыярх Іосіф II і мітрапаліт Фоцій абвясцілі адлучэнне Грыгорыя I Цамблака ад царквы, але ў Вялікім Княстве Літоўскім ён лічыўся законным мітрапалітам да самай смерці ў 1419 г. або ў 1420 г. У 20-я гг. XV ст. Кіеўская мітраполія была аб'яднана пад амафорам уладыкі Фоція, які прымірыўся з вялікім князем Вітаўтам.

Барацьба за мітрапаліцкі прастол адлюстроўвала саперніцтва свецкай улады і царкоўнай іерархіі Вялікага Княства Літоўскага і Вялікага Княства Маскоўскага за першынство ва ўсходнеславянскіх землях. Абодва бакі звярталіся за прызнаннем і падтрымкай да канстанцінопальскіх

патрыярхаў. Апошнія, як правіла, негатыўна ставіліся да спроб падзелу Кіеўскай мітраполіі. Таму да сярэдзіны XV ст. мітрапаліты ў Вялікае Княства Літоўскае прызначаліся нерэгулярна, а епархіі траплялі ў юрысдыкцыю маскоўскіх архірэяў.

У 1458 г. кіеўскім мітрапалітам быў прызначаны прыхільнік Фларэнтыйскай уніі 1439 г. Грыгорый Балгарын. Яго прэтэнзіі на кананічную ўладу над усёй тэрыторыяй былой Кіеўскай Русі выклікалі рэзкі пратэст з боку Масквы. Агульная мітраполія канчаткова падзялілася на дзве самастойныя: Кіеўская мітраполія ў Вялікім Княстве Літоўскім і Галіцыі з цэнтрам у Навагародку (у 1472 г. мітрапаліт Грыгорый Балгарын атрымаў кананічнае прызнанне канстанцінопальскага патрыярха) і Маскоўскую (афіцыйна названа з 1459 г.).

Такім чынам, у XIV – сярэдзіне XV ст. адбылося адміністрацыйна-тэрытарыяльнае афармленне праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Канфесійная палітыка дзяржавы, скіраваная на падначаленне ўсёй Кіеўскай мітраполіі, была абумоўлена рознымі фактарамі. Важнейшымі сярод іх былі саперніцтва з Вялікім Княствам Маскоўскім за панаванне над землямі Русі, заняпад Візантыйскай імперыі і канстанцінопальскага патрыярхату.

У канцы XV – пачатку XVI ст. Кіеўская мітраполія складалася з епархій: Кіеўска-Літоўскай, Полацка-Віцебскай, Смаленска-Северскай, Чарнігава-Бранскай, Турава-Пінскай, Уладзімірска-Берасцейскай, Луцка-Астрожскай, Холмска-Бельскай, Перамышльска-Самборскай, Галіцка-Львоўскай. У пачатку XVI ст. у выніку войнаў Смаленска-Северская і Чарнігава-Бранская епархіі адышлі ў склад Маскоўскай дзяржавы. Праваслаўныя епіскапіі былі падзелены на пратапопіі, а драбнейшай епархіяльнай адзінкай з'яўляўся прыход. У першай палове XVI ст. у Полацку дзейнічалі 22 прыходы, Пінску – 16, Вільні – 12, Берасці – 8, Гродне – 6.

Складана вызначыць дакладныя межы епархій у XIV–XV стст. Яны мяняліся ў адпаведнасці са зменамі епархіяльнай структуры Кіеўскай мітраполіі, а таксама з фарміраваннем адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у Вялікім Княстве Літоўскім. Землі Беларусі ўваходзілі ў склад мітрапаліцкай Кіеўскай, Полацка-Віцебскай, Турава-Пінскай, Уладзімірска-Берасцейскай, Смаленска-Северскай, Чарнігава-Бранскай епархій.

Неад'емнай часткай праваслаўнай царквы з'яўляліся манастыры. У другой палове XV ст. узніклі новыя манаскія цэнтры. Пашырэнню манаскага жыцця спрыяў шэраг фактараў. У першую чаргу, гэта прыбыццё з Візантыі і з Балканаў значнай групы манахаў грэцкага, балгарскага і сербскага паходжання. Пасля падзення Канстанцінопаля Турцыя пагражала паўднёвым землям Вялікага Княства Літоўскага. Пад уплывам турэцкай пагрозы част-

ка манахаў з праваслаўных манастыроў Брацлаўшчыны і Кіеўшчыны пераехала на поўнач, дзе дала пачатак манастырам на беларускіх землях, Валыні і Падляшшы. Пашырэнню манастырскага жыцця спрыяла дзейнасць магнатаў і шляхты, якія фундавалі манастыры з прычын набожнасці і прэстыжу. У XV – першай палове XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім існавала больш за 50 праваслаўных манастыроў, з іх 8–10 жаночых.

Праваслаўныя манастыры з'яўляліся асяродкамі асветы і адукацыі. Яны садзейнічалі распаўсюджванню хрысціянскіх кніг, якія перапісваліся ўручную. Дзякуючы працы манахаў, паступова фарміраваліся манастырскія бібліятэкі, якія разам з царкоўнымі і прыватнымі былі сховішчамі рукапісных, а з XVI ст. і друкаваных кніг. У манастырах вялося летапісанне і дзейнічалі школы.

Праваслаўная царкоўная іерархія складалася з мітрапалітаў, епіскапаў, прыходскіх святароў, манахаў, дыяканаў, дзякаў і іншых царкоўных ураднікаў. Мітрапаліты, якія ў XIV–XV стст. узначальвалі Кіеўскую мітраполію, паходзілі з маскоўцаў, балгар і грэкаў, а з 70-х гг. XV ст. да Люблінскай уніі былі мясцовымі ўраджэнцамі. Што тычыцца іншага духавенства, то тут удзельная вага мясцовых святароў была значная, асабліва гэта тычылася ніжэйшых пасад духоўнай іерархіі. Па сацыяльным статусе праваслаўнае святарства паходзіла з саслоўяў духавенства, баярства-шляхты (часам з магнацкіх родаў) і мяшчанства.

Дзейнасць праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім рэгламентавалася актамі, якія выходзілі ад імя патрыярхаў, мітрапалітаў і епіскапаў, пастановамі, зацверджанымі на пасяджэннях събораў духавенства, Кормчымі кнігамі. Статус і сферы дзейнасці царквы ўзгадняліся ў адпаведнасці з граматамі каралёў і вялікіх князёў, фундатараў і апекуноў, агульназемскімі прывілеямі, Статутамі і пастановамі соймаў Вялікага Княства Літоўскага. Складана вызначыць агульныя памеры царкоўнай зямельнай уласнасці ў XIII–XV стст., таму што большасць захаваных крыніц не дае канкрэтных звестак пра аб'ём уладанняў і сельскагаспадарчых угоддзяў, колькасць залежнага сялянства. Можна толькі адзначыць, што землеўладанне праваслаўнай царквы пачало складвацца яшчэ да ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага і ў далейшым пашыралася галоўным чынам за кошт данін праваслаўных князёў, паноў і баярства, некаторых даравальных актаў з боку вярхоўнай улады.

Нягледзячы на створаную структуру царквы і значную колькасць вернікаў, праваслаўю не наканавана было манапольна панаваць у Вялікім Княстве Літоўскім, як гэта было ў Маскоўскай дзяржаве. Пачынаючы з XIII ст., на землях Вялікага Княства Літоўскага стаў дастаткова адчувальным уплыў

заходняга хрысціянства. У канцы XIV ст. прадстаўнікі кіруючых колаў прынялі каталіцтва і яно такім чынам трапіла пад апеку дзяржавы.

Пасля Крэўскай уніі 1385 г. польскі кароль і вялікі князь літоўскі Ягайла зацвердзіў прывілеі, якія фарміравалі статус каталіцкага касцёла і правы яго вернікаў у Вялікім Княстве. У грамаце ад 20 лютага 1387 г. паведамлялася: «Каждый рыцарь или боярин, принявший католическую веру, и его потомки, законные наследники, имеют и будут иметь полную и всякую возможность владеть, держать, пользоваться, продавать, отчуждать, обменять, дать, дарить, согласно своей доброй воле и желанию, замки, волости, деревни и дома и все, чем владел бы по отцовскому наследству, как владеют, пользуются и употребляют на основании одинаковых прав нобили в других землях нашего королевства Польского, чтобы не было различия в правах…».

Умацоўвала пазіцыі католікаў пастанова Гарадзельскага сойма 1413 г. аб уніі Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай. Згодна з ёй, усе касцёлы і каталіцкі клір забяспечваліся ўсімі правамі і свабодамі духавенства Каралеўства Польскага. Паны, шляхта і баяры Вялікага Княства Літоўскага, якія прынялі каталіцкую веру, маглі карыстацца тымі ж прывілеямі, што і польскія паны і шляхта. Падданым рымскага касцёла пацвярджаліся правы на свабоднае распараджэнне ўласнай маёмасцю і атрыманне спадчыны. Толькі католікам гарантаваліся магчымасць займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады, права выбіраць вялікага князя і ўдзельнічаць ў соймах. Такім чынам Гарадзельскі прывілей пазбаўляў праваслаўную знаць магчымасці ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны. Прыняцце прывілеяў 1387 і 1413 гг. сведчыла аб зменах у дзяржаўнай палітыцы і азначала адыход улады Вялікага Княства Літоўскага ад традыцый рэлігійнай талерантнасці.

Падчас грамадзянскай вайны 1432–1439 гг. вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч (1432–1440), каб схіліць на свой бок праваслаўных, зацвердзіў у 1434 г. грамату, якая фактычна адмяніла палажэнні Гарадзельскага прывілея ў адносінах да іх. Аднак поўнае раўнапраўе з католікамі яны атрымалі толькі ў 1563 г., калі Жыгімонтам II Аўгустам (1548–1572) была падпісана даравальная грамата, згодна з якой «не только подданые костелу Римскому от того часу обираны и прекладаны быти мают, але одинако и заровно все рыцерского стану з народу шляхетского люди веры хрестиянское, яко Литва, так и Русь, кождый водле заслуг и годности своее, от нас, господаря, на местца зацные и преложеньства з ласки нашое браны быти мають…».

Канфесійная палітыка Казіміра IV (1440–1492) і яго пераемнікаў на прастоле характарызавалася рэлігійнай цярпімасцю. Згодна з даравальнай

граматай ад 2 мая 1457 г. за царквой захоўваліся ўсе ранейшыя прывілеі: «А на первей, вся дарованя, привилиа, твердости церквей головных, зборных и кляштырных, в землях наших великого князьства Литовского и Руского, Жемоитского и иных... хочом без порушениа и без обид ховати, боронити и щинити, вподлуг всее наше моци». Выключэннем у гэтым сэнсе з'яўлялася забарона Казіміра IV у 1481 г. будаваць новыя і рамантаваць старыя праваслаўныя храмы. Праўда, гэта абмежаванне тычылася толькі тэрыторыі Літвы.

З канца XV ст. прававы статус праваслаўнай царквы атрымаў значную юрыдычную падтрымку. У 1499 г. кіеўскі мітрапаліт Іосіф I Балгарынавіч (1498–1501) прадставіў вялікаму князю Аляксандру (1492–1506) «свиток прав великого князя Ярослава Володимеровича», г. зн. царкоўны статут Яраслава Мудрага. Уладыка скардзіўся, што некаторыя «князи и панове, воеводы, старосты, наместники и тивунове... митрополиту и епископом кривду чинивали, в доходы их церковные и суды духовные вступывалися...». Мітрапаліт Іосіф прасіў вялікага князя пацвердзіць палажэнні скрутка Яраслава, што і было зроблена спецыяльным прывілеем ад 20 сакавіка 1499 г. Грамата перадавала ў суд мітрапаліта справы «хрестиянства Греческого закону», забараняючы ўраднікам, незалежна ад іх веравызнання, умешвацца ў царкоўнае судаводства, не дазваляла вяльможам здымаць з пасад святароў без дазволу мітрапаліта і аберагала маёмасць царквы. Ніхто не мог чыніць праваслаўнай царкве «кривды» і ўмешвацца ў яе справы.

Віленскі сабор 1509 г. зацвердзіў прынцыпы цалкам незалежнай юрысдыкцыі мітрапаліта і епіскапата. Прывілей Аляксандра праваслаўным іерархам быў паўтораны вялікім князем Жыгімонтам I Старым (1506–1548) у 1511 г. Такім чынам, аформіўся эканамічны і судовы імунітэт праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім, і з пункту гледжання закону яна карысталася тут такой жа самастойнасцю, як і каталіцкі касцёл.

Канчаткова кірункі дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да вернікаў розных канфесій і духавенства былі вызначаны статутамі Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Статут 1529 г. вызначаў і зацвярджаў усе правы і прывілеі «костелные, так латынского закону, яко и греческого». Адзін з артыкулаў Статута 1588 г. абвяшчаў, што гаспадар «усіх князёў і паноў-рад, як духоўных, так і свецкіх, і ўсіх ураднікаў земскіх, прыдворных паноў харунговых, шляхту, рыцарства, мяшчан і ўсіх простых людзей у Вялікім Княстве Літоўскім і ва ўсіх землях таго панства» будзе захоўваць «пры свабодах і вольнасцях хрысціянскіх». Гаспадар абавязваўся сам і заклікаў сваіх падданых да таго, каб «...у сувязі з розніцай веры і адрозненнем у цэрквах крыві не праліваць і не караць адсуджэннем маёмасці,

пазбаўленнем гонару, турэмным зняволеннем і выгнаннем, і ніякаму вяршэнству, ані ўраду, да такога ўчынка ніякім чынам не дапамагаць…».

Важным фактарам, які ўплываў на ўзаемаадносіны паміж свецкім грамадствам і духоўнай іерархіяй, праваслаўнай і каталіцкай, з'яўлялася права патранату (jus patronatus) – магчымасць удзелу свецкіх асоб у царкоўным будаўніцтве і забеспячэнні. Найбольш шырока выкарыстоўвалася ў межах Вялікага Княства Літоўскага адна з форм патранату – права падавання «хлябоў духоўных», аб'ектамі якога былі цэрквы і манастыры з іх маёмасцю.

Згаданае права вызначалася феадальным дзяржаўным ладам. Вялікі князь прызнаваўся вярхоўным гаспадаром усіх зямель княства, у тым ліку і царкоўных. Амаль усе асобы, якія займалі тую ці іншую царкоўную пасаду, надзяляліся правам распараджэння царкоўнай маёмасцю, часта вельмі значнай. Таму пры абранні на мітрапаліцкую ці архірэйскую кафедры, на месцы ігуменаў значных манастыроў і святароў некаторых цэркваў патрабавалася зацвярджэнне кандыдата вялікім князем. Дадзенае зацвярджэнне і называлася падаваннем. Так, у грамаце Казіміра IV ад 2 мая 1447 г. адзначалася: «Которая ж то церква головная, зборная, кляштырная… иж бы пуста была, а пастыря не держала, которое ж поданье к нам и к нашим наместником пригодило бы ся, тогда им с полного права, не иного, а любо не иных, пастыря, а любо пастырев давати имаем…».

З цягам часу, па меры перадачы гаспадарамі Вялікага Княства Літоўскага зямельных маёнткаў служылым людзям у прыватную ўласнасць, уладальнікі здабывалі і права падавання ў адносінах да цэркваў і манастыроў, якія знаходзіліся на іх землях. Згаданае права было пацверджана даравальнымі граматамі вялікіх князёў Аляксандра і Жыгімонта I у 1499 г. і 1511 г.: «…если бы ж которая церковь была в подании здавна державцы того именья, ино и теперь нехай тот державца подает з благословеньем митропольим».

Асноўныя паўнамоцтвы патронаў у адносінах да духоўных устаноў былі наступныя: судовая ўлада і судовае прадстаўніцтва; права прызначэння на іерархічныя пасады; права вызначаць статуты царкоўным установам; матэрыяльнае забеспячэнне і кантроль за цэласнасцю царкоўнай маёмасці; права карыстання царкоўнай маёмасцю і даходамі з яе. Значныя магчымасці патронаў у адносінах да падапечных цэркваў і манастыроў сталі глебай для злоўжыванняў. Найбольш ранняе сведчанне аб гэтых з'явах можна знайсці ў актах вядомага Віленскага сабора 1509 г., удзельнікі якога скардзіліся: «…Якоже нецыи и въ нашомъ законе, славы ради мирскыя и властельства, еще живу сущу епископу и здраву, прежде преставлениа его, на тое епископъство подъкупаютъся и берутъ, безъ съвета и воли митрополии и епископовъ и безъ осмотрениа и събраниа князей и пановъ нашого закону Греческого».

З тэксту дакумента бачна, якім шляхам здабываліся іерархічныя пасады. Паводле саборнага акта, часам аналагічна набываліся і настаяцельскія месцы ў манастырах, і свяшчэнніцкія ў прыходах. Факты злоўжыванняў пры прызначэнні на царкоўныя пасады дыскрэдытавалі духавенства ў вачах грамадства, наносілі значную шкоду аўтарытэту праваслаўнай царквы.

Такім чынам, у Вялікім Княстве Літоўскім былі створаны спрыяльныя прававыя ўмовы для існавання праваслаўнай царквы. Заканадаўча праваслаўная царква была ўраўнавана ў правах з каталіцкай. Прававы статус падмацоўваўся дзейнасцю гаспадароў Вялікага Княства Літоўскага па стварэнні цэласнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры царквы. Праваслаўе па колькасці вернікаў пераўзыходзіла іншыя канфесіі ў дзяржаве. Нягледзячы на адзначаныя факты, праваслаўнае духавенства не мела такой значнай палітычнай вагі, якой валодала каталіцкае. Праваслаўная царква не атрымлівала або мела слабую маёмасную падтрымку з боку дзяржавы і кіруючых колаў, якія з канца XIV ст. пачалі аддаваць перавагу каталіцтву.

У канцы XV – XVI ст. вызначальным фактарам ва ўзаемаадносінах паміж праваслаўнай царквой і дзяржавай стала права падавання. Згаданае права павінна было абмяжоўвацца дабрачыннасцю і клопатам з боку свецкага грамадства аб царкоўным дабрабыце і забеспячэнні. Аднак у рэальнасці яно ператварылася ў права свецкіх асоб прызначаць на іерархічныя пасады і распараджацца маёмасцю царквы, што стала глебай для з'яўлення шматлікіх злоўжыванняў.

## ЗАЦВЯРДЖЭННЕ КАТАЛІЦТВА Ў ДЗЯРЖАВЕ. УНІЯЦКІЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

З часоў станаўлення Вялікага Княства Літоўскага рабіліся неаднаразовыя спробы хрышчэння ў каталіцтва язычніцкага насельніцтва Літвы і распаўсюджвання заходняга хрысціянства на славянскія тэрыторыі дзяржавы. Вялікія князі літоўскія, захоўваючы ўласную прыхільнасць да язычніцтва, разумелі значэнне хрысціянскай канфесіі ва ўзаемаадносінах з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Аднак уладары Вялікага Княства Літоўскага свае абяцанні аб хрышчэнні язычнікаў і праваслаўных выкарыстоўвалі часцей за ўсё ў тактычных мэтах і ў адпаведнасці з абставінамі палітычнай кан'юнктуры.

Так, у 1249 г. супраць Міндоўга склалася магутная кааліцыя ў складзе ландмайстра Лівонскага ордэна Андрэя фон Сцірланда, галіцкага і валынскага князя Данілы Раманавіча, жамойцкага князя Выкінта і пляменніка Міндоўга Таўцівіла. Пад ціскам абставін вялікі князь ахрысціўся па ка-

таліцкім абрадзе ў 1251 г. Двума гадамі пазней з благаславення папы Інакенція IV Міндоўг быў абвешчаны каралём Літвы і атрымаў карону, дасланую з Рыма. Папа рымскі браў новае каралеўства пад сваё заступніцтва. Гэта дало магчымасць вялікаму князю нейтралізаваць ворагаў – крыжакоў і літоўскіх князёў. Аднак праз дзесяць гадоў пасля хрышчэння Міндоўг адрокся ад каталіцтва і падтрымаў паўстанне супраць крыжакоў у Жамойціі.

У цяжкім супрацьстаянні з Тэўтонскім ордэнам вялікі князь літоўскі Гедымін ініцыяваў праект хрышчэння Літвы. У лістах 1322–1323 гг. да папы Іаана XXII гаспадар выразіў жаданне прыняць хрысціянства. Апостальская сталіца падтрымала яго ініцыятыву. Гэта дало магчымасць Гедыміну заключыць перамір'е з Тэўтонскім ордэнам у 1324 г. Папа Іаан XXII заступіўся за Вялікае Княства Літоўскае і нават забараніў рыцарам рабіць выправы на яго тэрыторыю.

У Вільню былі накіраваны прадстаўнікі рымскага пантыфіка, якія мелі некалькі размоў з Гедымінам і пераканаліся ў яго лаяльным стаўленні да каталіцкага касцёла і папы. Аднак у час афіцыйнай сустрэчы паслоў з Гедымінам у лістападзе 1324 г. планы вялікага князя змяніліся. Ён адмовіў у правядзенні каталіцкай місіі па хрысціянізацыі Літвы і навяртанні схізматыкаў (праваслаўных) да «сапраўднай» веры.

Канфесійныя ініцыятывы Альгерда і Кейстута па хрышчэнні Літвы былі прадыктаваны неспрыяльнымі знешнепалітычнымі абставінамі – актывізацыяй дзейнасці Тэўтонскага ордэна і Польшчы. У 1348 г. вялікае прускае войска, у складзе якога таксама былі французскія і англійскія рыцары, на працягу тыдня бесперашкодна рабавала землі Літвы ў Панямонні. Армія Альгерда і Кейстута, якая апрача ўласна літоўскіх сіл уключала палкі з Берасця, Віцебска, Смаленска, Уладзіміра Валынскага і, верагодна, з Полацка, сустрэлася з крыжакамі на рацэ Стрэве. Адбылася жорсткая бітва, якая скончылася поўнай перамогай рыцараў. Нямецкімі храністамі адзначалася, што з боку літвінаў і русінаў загінулі дзясяткі тысяч, у тым ліку Альгердаў брат князь Нарымонт.

У 1348 г. Кейстут звярнуўся да нямецкага імператара і багемскага (чэшскага) караля Карла IV Люксембургскага з просьбай дапамагчы ахрысціць Літву. Праз тры гады з такой жа просьбай літоўскія князі звярнуліся да венгерскага караля Людовіка І Вялікага, а ў 1358 г. зварот зноў быў накіраваны да імператара Карла IV. Час актыўных перагавораў аб хрысціянізацыі Літвы стаў перадышкай для ВКЛ. Паміж Тэўтонскім ордэнам і Вялікім Княствам Літоўскім двойчы заключаўся мір – на 1349–1351 гг. і ў 1355 (1356) г.

Разлічваючы на дапамогу супраць Тэўтонскага ордэна (паводле іншага меркавання, каб прадухіліць напад Польшчы на Валынь) у 1349 г. Кей-

стут пачаў перамовы з папам Кліментам VI. Апошні выказаў падтрымку планам Кейстута і яго братоў і ў верасні таго ж года зацвердзіў булы, згодна з якімі гнезненскаму арцыбіскупу прапаноўвалася выслаць святароў у Вялікае Княства Літоўскае для хрышчэння літвінаў. Пад прыкрыццём распачатай кампаніі пасрэднік на перамовах польскі кароль Казімір III Вялікі захапіў Валынь у кастрычніку 1349 г. Канфрантацыя паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай спыніла чарговую спробу каталіцкага хросту Літвы і Русі.

Такім чынам, пачынаючы з сярэдзіны XIII ст. да часоў гаспадарання Альгерда і Кейстута шматлікія праекты каталіцкага хрышчэння Вялікага Княства Літоўскага так і не былі рэалізаваны. Прычыны няўдач, з аднаго боку, палягалі ў неспрыяльных умовах правядзення каталіцкіх місій, якія часам прыкрывалі тэрытарыяльную экспансію Тэўтонскага ордэна і Польшчы на заходніх землях Вялікага Княства Літоўскага. Саперніцтва і супярэчнасці паміж ініцыятарамі акцый – папствам, еўрапейскімі краінамі, ордэнскімі ўтварэннямі – таксама не давалі магчымасці паспяхова завяршыць працэс. З другога боку, кансерватызм і традыцыйнасць унутраных палітычных і канфесійных адносін у Вялікім Княстве Літоўскім, значная частка насельніцтва якога вызнавала праваслаўе, другая – язычніцтва, з'яўляліся перашкодай для каталіцкага хросту жыхароў дзяржавы ў акрэслены перыяд.

Вялікае Княства Літоўскае ў гады праўлення Ягайлы (1377–1392) было ахоплена дынастычнай барацьбой. У гэты ж перыяд адчуваўся моцны ціск з боку Тэўтонскага ордэна, у выправах якога на ВКЛ удзельнічала войска Вітаўта. У 1382 г. Ягайла быў вымушаны падпісаць пагадненне з Ордэнам, паводле якога вялікі князь саступаў рыцарам землі Жамойціі, абяцаў хрысціць Літву і ўзгадняць з крыжакамі сваю замежную палітыку. Гэты дагавор паставіў князя ў складанае становішча. Дзеля стабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі і барацьбы з Тэўтонскім ордэнам ён шукаў саюзніка. Яго намаганні скончыліся падпісаннем Крэўскай уніі з Каралеўствам Польскім у 1385 г.

Згодна з умовамі уніі Ягайла павінен быў прыняць каталіцтва, перавесці ў гэтую веру сваіх неахрышчаных братоў, сваякоў і суайчыннікаў. 15 лютага 1386 г. у кафедральным саборы Св. Станіслава і Вацлава ў Кракаве адбыўся хрост Ягайлы (у каталіцтве – Уладзіслаў), яго сваякоў і службоўцаў, а 4 сакавіка 1386 г. прайшла ўрачыстая каранацыя вялікага князя. У 1387 г. польскі кароль і вялікі князь Ягайла з каталіцкім духавенствам накіраваўся ў Літву, дзе ажыццявіў хрышчэнне супляменнікаў – пераважна знаці і баяр з Аўкштайціі.

Каб забяспечыць падтрымку сваёй праграмы, Ягайла зацвердзіў прывілеі, якія пашырылі правы баяр-католікаў, а таксама паспрыялі фарміраванню структуры каталіцкага касцёла на новаахрышчаных землях. Згодна з прывілеем ад 17 лютага 1387 г. у Вялікім Княстве Літоўскім засноўвалася біскупства з кафедрай у Вільні пры касцёле святых Станіслава і Уладзіслава. Біскупству былі нададзены землі на Віленшчыне – «дыстрыкт» з замкам у Таўрогіне і шэрагам дробных валасцей і вёсак, а таксама валасці ў Беларусі – Бакшты і Дуброўна. Уладанні касцёла атрымалі поўны фінансавы і судовы імунітэт. 22 лютага 1387 г. Ягайла дараваў аналагічныя правы ўсім новаўтвораным касцёлам. У хуткім часе каталіцкія храмы былі ўзведзены ў Вількаміры, Майшаголе, Медніках, Немянчыне, Крэве, Гайне і Абольцах. Манарх забяспечыў касцёлы часткай дзяржаўных даходаў.

У сакавіку 1388 г. папа Урбан VI зацвердзіў булу, якая дазваляла заснаваць новае біскупства з кафедрай у Вільні. Була вызначала кандыдата на пасаду першага віленскага біскупа – сярэцкага (малдаўскага) біскупа Андрэя. Першапачаткова Віленскае біскупства (дыяцэзія) падначальвалася непасрэдна Рыму, пазней яно стала суфраганіяй (намесніцтвам) Гнезненскага арцыбіскупства Польшчы. Унутраная структура дыяцэзіі складалася з дэканатаў і парафій (прыходаў). Тэрытарыяльна яна ўключала амаль усе парафіі Беларусі і Усходняй Літвы (акрамя парафій Берасцейскага ваяводства). Акрамя Віленскага, у ВКЛ дзейнічалі Кіеўскае, Жамойцкае і Луцкае біскупствы. У апошнюю дыяцэзію ўваходзіла частка паўднёва-заходняй Берасцейшчыны.

У часы панавання Ягайлы і Вітаўта ў Вялікім Княстве Літоўскім пачала фарміравацца сетка каталіцкіх парафій і касцёлаў. Да 1430 г. у Віленскім біскупстве было заснавана 27 парафіяльных касцёлаў, з іх 12 размяшчаліся на Беларусі – у Абольцах (1387 г.), Крэве (каля 1387 г.), Навагародку (каля 1393 г.), Лідзе (1397 г.), Браславе (да 1423 г.), Гародні, Ваўкавыску (да 1430 г.) і інш.

Да сярэдзіны XVI ст. на тэрыторыі Віленскага біскупства было створана 259 парафіяльных адзінак. На беларускіх землях дзейнічалі 22 з 33 самых забяспечаных парафій, у тым ліку найбольш значная – у Віцебску. Парафіяльная структура і касцёлы размяшчаліся пераважна на захадзе Беларусі, а таксама ў Полацку, Віцебску, Абольцах і Слуцку.

Парафіяльная сетка ў Вялікім Княстве Літоўскім складвалася дзякуючы фундацыям вялікіх князёў літоўскіх, магнатаў і шляхты, духавенства. Дзейнасць духоўных устаноў была падмацавана заканадаўчымі актамі вярхоўнай улады дзяржавы, рымскіх пантыфікаў, прыватных асоб. Правы

каталіцкага касцёла сістэматычна пацвярджаліся ва ўсіх агульназемскіх прывілеях канца XIV – першай паловы XVI ст.

Адначасова з фарміраваннем адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры каталіцкага касцёла ў Вялікім Княстве ўзніклі цэнтральныя і мясцовыя органы – капітулы, сіноды, біскупскія курыі. У 1388 г. папа Урбан VI зацвердзіў булу, згодна з якой у Вільні ствараўся капітул – калегія духоўных асоб пры біскупе па кіраванні дыяцэзіяй і кафедральным касцёлам. Першапачаткова гэты орган уключаў двух прэлатаў – прэпазіта (парафіяльны святар) і дэкана (меў права прызначаць святароў у кафедральны касцёл) і 10 канонікаў. Потым да яго складу былі далучаны новыя пасады прэлатаў – кусташа (хавальнік архіва), архідыякана (інспектаваў парафіі), схаластыка (кіраўнік школы) і кантара (літургічны спявак, кіраўнік хору). Капітул мог кіраваць біскупствам у выпадку смерці кіраўніка. У канцы XIV ст. ён атрымаў судовыя паўнамоцтвы ў справах аб касцёльнай маёмасці.

Для вырашэння істотных пытанняў біскупы склікалі сіноды, у якіх удзельнічала духавенства дыяцэзіі. Першы вядомы сінод у Вільні, звестак аб якім амаль не захавалася, адбыўся ў 1520 г. ці ў пачатку 1521 г. Далей Віленскія сіноды збіраліся рэгулярна.

Штодзённымі справамі біскупства займалася біскупская курыя. Яна складалася з канцылярыі, духоўнага суда і прыватнага двара біскупа, у які ўваходзілі маршалак, падскарбі, кухмістр, ключнік і іншыя прыдворныя, а таксама капеланы.

Працэс юрыдычнага афармлення зямельнай уласнасці каталіцкага касцёла ў Вялікім Княстве Літоўскім адбываўся пры актыўнай падтрымцы вярхоўнай улады дзяржавы. У адпаведнасці з прывілеем ад 17 лютага 1387 г. Віленская дыяцэзія атрымала шэраг валасцей і вёсак на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Пазней біскупству былі нададзены Стрэшын на Дняпры; Корань, Ганявічы і Ваўча на Міншчыне; Убарць на Мазыршчыне; Параф'янава каля Докшыц і інш. У сярэдзіне XVI ст. уладанні біскупства ўключалі каля 300 вёсак (прыкладна 11,5 тыс. двароў, 60–80 тыс. прыгонных сялян). Яны падзяліліся на сталовыя біскупскія (прыбытак ад іх ішоў на патрэбы біскупа і яго памочнікаў), сталовыя капітульныя (на ўтрыманне капітула) і прэстыманіяльныя (на патрэбы асобных канонікаў капітула). Найбольш значнымі біскупскімі маёнткамі на Беларусі былі Ігумен і Убарць, сталовымі капітульнымі – Горваль і Стрэшын, прэстыманіяльнымі – Бакшты, Корань, Ганявічы, Ваўча, Параф'янава і інш.

З канца XIV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім актывізаваліся манаскія ордэны. Місіянерская дзейнасць манахаў, якія праводзілі хрышчэнне, выкладалі асновы веравучэння, вучылі чытаць малітвы, спрыяла пашырэнню

каталіцтва сярод насельніцтва дзяржавы. Да сярэдзіны XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім дзейнічалі 8 каталіцкіх ордэнаў, 18 кляштараў (манастыроў) у Віленскай дыяцэзіі, 7 – у Луцкай і 1 – у Кіеўскай. На беларускіх землях былі заснаваны кляштары францысканцаў (Ліда, Навагародак, Ашмяны, Пінск), бернардзінцаў (Гародня, Полацк), аўгусцінцаў (Быстрыца, Берасце).

Каталіцкая іерархія ў Вялікім Княстве складалася з біскупаў, членаў капітула, ксяндзоў і іншых духоўныхураднікаў. Да сярэдзіны XV ст. віленскую кафедру займалі тры (або чатыры) палякі, адзін літовец і адзін – з інфлянцкага купецкага роду. У 1462–1569 гг. Віленскае біскупства ўзначальвалі чатыры літоўцы, адзін паляк, адзін выхадзец з мяшчанскай сям'і, этнічнае паходжанне якога не высветлена. Большасць біскупаў паходзілі з сямей духавенства і шляхты, некалькі былі князямі, магнатамі, два вылучаліся роднасцю з велікакняжацкай сям'ёй – Ян «з князёў літоўскіх» (пазашлюбны сын Жыгімонта Старога) і Павел Гальшанскі. Падобныя працэсы адбіліся на складзе біскупаў іншых дыяцэзій Вялікага Княства Літоўскага.

Такім чынам, падпісанне Крэўскай уніі ў 1385 г. паклала пачатак новаму перыяду канфесійнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Наступствамі прыняцця каталіцтва кіруючымі коламі грамадства былі хрышчэнне язычнікаў, распаўсюджванне хрысціянства заходняга абраду сярод насельніцтва, стварэнне сеткі духоўных устаноў. Спецыфікай працэсу былі нераўнамернае па часе і выніках фарміраванне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры касцёла, падначаленне каталіцкай іерархіі Вялікага Княства польскаму арцыбіскупу, адсутнасць дастатковай колькасці вышэйшых духоўных асоб і простага кліру. На беларускіх землях парафіяльная сетка канцэнтравалася галоўным чынам у паўночна-заходніх і заходніх рэгіёнах. Дзейнасць каталіцкіх устаноў і духавенства была падмацавана значнай маёмасцю і прывілеямі рымскіх пантыфікаў і вялікіх князёў.

У канфесійнай палітыцы вярхоўнай улады Вялікага Княства Літоўскага пэўнае месца займалі планы царкоўнай уніі. Праз рэалізацыю планаў царкоўна-рэлігійнай уніі кіруючыя колы разлічвалі ўмацаваць дзяржаўна-палітычны саюз з Каралеўствам Польскім і паслабіць этнаканфесійныя супярэчнасці, якія ўзніклі ў дзяржаве пасля хрышчэння Літвы і замацавання за каталіцкай царквой і каталіцкім баярствам значных прывілеяў у канцы XIV – пачатку XV ст.

Спроба аб'яднання цэркваў была зроблена ў 1396 г., калі кароль польскі Ягайла і вялікі князь літоўскі Вітаўт разам з мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Русі Кіпрыянам прапанавалі канстанцінопальскаму патрыярху склікаць уніяцкі сабор у «рускіх» землях Вялікага Княства Літоўскага. Патрыярх гэтую ідэю падтрымаў, але адклаў яе рэалізацыю па прычыне вайны з туркамі.

У 1418 г. Усяленскі сабор каталіцкай царквы ў Канстанцы наведала пасольства ВКЛ, якое ўзначальваў новы мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі Грыгорый I Цамблак. У прамове да папы рымскага і ўдзельнікаў сабора ён выказаўся за рэалізацыю царкоўнай уніі, якую падтрымлівалі манархі Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Мітрапаліт прапаноўваў склікаць спецыяльны сабор аб веры і ў дыскусіі вырашыць усе спрэчныя пытанні. Вынікам павінен быў стаць раўнапраўны саюз паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі. Аднак папа Марцін V не стаў склікаць спецыяльны сабор. Больш за тое, сам Канстанцкі сабор у хуткім часе завяршыў сваю работу і, нягледзячы на ўсю маштабнасць і размах, не меў доўгатэрміновых практычных вынікаў у справе паяднання хрысціянскіх цэркваў.

Прыхільнікам грэка-каталіцкай уніі некаторы час з'яўляўся вялікі князь Свідрыгайла (1430–1432), які выкарыстоўваў адпаведную ідэю ў сваёй барацьбе з вялікім князем Жыгімонтам Кейстутавічам. Са згоды Свідрыгайлы група яго праваслаўных прыхільнікаў паслала ліст да Базельскага сабора (1431–1449). У гэтым пасланні, прынятым на з'ездзе ў Віцебску 22 сакавіка 1433 г., сцвярджалася, што Свідрыгайла застаўся шчырым католікам, а самі яны жадаюць царкоўнай уніі. Віцебскае пасланне было зачытана на саборы ў кастрычніку 1433 г. і схіліла папу Яўгена IV запрасіць да сябе ў Фларэнцыю праваслаўнага мітрапаліта Герасіма з дэлегацыяй, але паездка не адбылася па невядомых прычынах. Адна з іх – абвінавачванні Свідрыгайлам мітрапаліта Герасіма ў змове супраць вялікага князя і дзяржавы. У 1435 г. мітрапаліт быў дастаўлены ў Віцебск і праз некалькі месяцаў спалены. Папа яшчэ адпраўляў свайго пасланніка да Свідрыгайлы для працягвання перамоў аб уніі, але гэтыя намаганні былі перакрэслены паражэннем апошняга ў супрацьстаянні з Жыгімонтам Кейстутавічам.

Унія каталіцкай і грэка-ўсходняй цэркваў была абвешчана на Фларэнтыйскім саборы 1439 г. На саборы прысутнічаў мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі Ісідор, які паставіў свой подпіс пад галоўным актам уніі. Але рэалізавана яна так і не была, бо не атрымала значнай падтрымкі палітычных і царкоўных колаў Каралеўства Польскага, Вялікага Княства Літоўскага і Вялікага Княства Маскоўскага.

У канцы XV – пачатку XVI ст. вялікі князь літоўскі і кароль польскі Аляксандр і кіеўскі мітрапаліт Іосіф Балгарынавіч узнавілі спробы рэалізацыі царкоўнай уніі. Гэта прывяло да пагаршэння палітычнай і этнарэлігійнай абстаноўкі ў дзяржаве, што ва ўмовах напружаных адносін з Маскоўскім княствам было небяспечным. Чарговы праект канфесійнага аб'яднання скончыўся правалам.

Да апошняй трэці XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім цікавасць да рэлігійнай уніі не ўзнаўлялася. Бесперспектыўнасць гэтых планаў тлумачыцца апазіцыяй рэлігійным рэформам з боку пануючых колаў велікакняжацкай і польскай знаці, традыцыйнымі настроямі большасці праваслаўнага насельніцтва, узрастаючаму ўплыву Вялікага Княства Маскоўскага і яго поспехам у канфрантацыі з Вялікім Княствам Літоўскім.

Такім чынам, заключэнне міждзяржаўнай уніі ў 1385 г. і зацвярджэнне каталіцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім мела значныя вынікі. Наданне каталіцтву статусу дзяржаўнай рэлігіі стварыла перадумовы для больш цесных міжнародных стасункаў дзяржавы з Каралеўствам Польскім і еўрапейскімі краінамі. Значным дасягненнем было стварэнне саюзу супраць Тэўтонскага ордэна і пазбаўленне апошняга глебы для ўзброенай агрэсіі супраць Вялікага Княства і іншых краін.

Заканадаўчае афармленне статусу каталіцкага касцёла ўскосна спрыяла паглыбленню феадалізацыі грамадства, калі каталіцкае, а потым праваслаўнае баярства атрымала прывілеі на зямельныя маёнткі, якія рабілі іх прыватнай уласнасцю феадалаў. Амаль адначасова вясковае насельніцтва ператваралася ў залежнае сялянства, прымацаванае да зямлі. Жыхары гарадскіх пасяленняў набывалі прывілеі заходнееўрапейскіх гарадоў на самакіраванне, што спрыяла юрыдычнаму афармленню праў мяшчанскага саслоўя.

Прыняцце каталіцтва, з аднаго боку, выклікала пэўны этнаканфесійны разлад у Вялікім Княстве Літоўскім. З другога, аказала значны ўплыў на менталітэт і свядомасць, лад жыцця і побыт насельніцтва балцкіх і часткова славянскіх зямель дзяржавы. Збліжэнне з лацінскай Еўропай стварыла глебу для пранікнення культурных традыцый і дасягненняў заходняй цывілізацыі. Суіснаванне ў Вялікім Княстве Літоўскім розных плыняў хрысціянства садзейнічала ўзнікненню выдатных помнікаў архітэктуры, мастацтва і літаратуры.

# 18 ЭВАЛЮЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

- **Агульназемскія прывілеі 1492 і 1506 гг. Узрастанне ролі Гаспадарскай Рады і вальнага сойма ў жыцці дзяржавы**
- **Адміністрацыйная рэформа і сістэма мясцовага кіравання**
- **Судовая сістэма і статуты ВКЛ (1529 і 1566 гг.)**

## АГУЛЬНАЗЕМСКІЯ ПРЫВІЛЕІ 1492 І 1506 гг. УЗРАСТАННЕ РОЛІ ГАСПАДАРСКАЙ РАДЫ І ВАЛЬНАГА СОЙМА Ў ЖЫЦЦІ ДЗЯРЖАВЫ

Вялікае Княства Літоўскае ў канцы XV – пачатку XVI ст. уяўляла сабой тыповую феадальную манархію, якая была пабудавана па федэратыўным прынцыпе, адлюстраваным ужо ў самой назве дзяржавы. Яна як бы падзялялася на тры часткі: уласна Літоўскія землі, Жамойція і землі Рускія, або «прыслухаючыя», якія карысталіся аўтаномнымі правамі.

На чале дзяржавы стаяў вялікі князь, які сканцэнтраваў у сваіх руках шырокія паўнамоцтвы: ён меў права выдаваць законы і весці дыпламатычныя перамовы, камандаваць узброенымі сіламі і чыніць суд, кіраваць фінансамі, раздаваць землі за службу. Аднак улада вялікага князя не з'яўлялася абсалютнай і шмат у чым абмяжоўвалася:

а) у аўтаномных землях яе прыходзілася дзяліць з мясцовымі князямі і буйнымі магнатамі, якія часта выступалі ў ролі намеснікаў;

б) улада князя абмяжоўвалася і буйнымі землеўладальнікамі, якія ўваходзілі ў склад паноў-рады, або Гаспадарскай Рады.

Значэнне апошняй асабліва ўзрасло ў часы праўлення Казіміра. Стаўшы вялікім князем і польскім каралём, ён быў вымушаны перыядычна знаходзіцца ў Кракаве, што прывяло да ўзвышэння Гаспадарскай Рады. Калі ў 1492 г. Казімір памёр, а на яго месца заступіў сын Аляксандр (1492–1506), значэнне Рады ва ўнутрыпалітычным развіцці дзяржавы ўзрасло. Афіцыйна стаўшы 30 ліпеня 1492 г. вялікім князем, Аляксандр 6 жніўня выдаў новы агульназемскі прывілей, у якім былі пацверджаны ранейшыя правы і вольнасці пануючага саслоўя і дараваны новыя. Вялікі князь істотна саступіў у прэрагатывах сваёй улады і пашырыў правы паноў-рады.

У прывілеі ўпершыню былі выразна адзначаны матывы такіх саступак: «…жадаючы спецыяльна адплаціць… прэлатам, князям, баронам, нобілям, баярам і мяшчанам за наша абранне, каб яны былі ўсцешаны новымі міласцямі, дазволамі і вольнасцямі, і прывабіць да ўзнаўлення ўстойлівасці ў іх вернасці, мы гэтым лістом па адзінай нашай міласці і дабраце саступаем ім наступнае, што запісана ў гэтых артыкулах». Вялікі князь абяцаў не раздаваць нікому з чужакоў ці іншаземцаў, але толькі прыродным жыхарам «годнаці, дзяржавы і ўсе іншыя ўрады ці добры спадчынныя»; не адмяняць старых законаў і не выдаваць новых без ведама і згоды паноў-рады. Гаспадарская Рада атрымала права рашаючага ўдзелу ў прызначэнні на дзяржаўныя пасады і размеркаванні зямель, ажыццяўленні дыпламатычных зносін, кантролі над дзяржаўнымі фінансамі, што фактычна пераўтварала яе з дарадчага ў вышэйшы кіруючы орган улады дзяржавы.

Вельмі істотнае значэнне меў 25-ы артыкул прывілея, дзе князь абавязаўся не ўзвышаць плябея над знатнымі, а знатных захоўваць у іх чэсці. На практыцы гэта азначала пераўтварэнне шляхты ў карпаратыўнае саслоўе і тое, што доступ простых людзей у яго быў закрыты. Саслоўе шляхты сфарміравалася, аб чым сведчыць «Попіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 г.».

Пасля смерці польскага караля Яна Альбрэхта, Аляксандр з 1501 г. стаў і кіраўніком польскай дзяржавы, што некалькі супакоіла яго настрой у сувязі са стратай значнай часткі ўлады ў ВКЛ. Аднак, калі ў 1506 г. ён памёр і на яго пасаду быў абраны брат Жыгімонт Стары Аўгуст (1506–1544), працэс абмежавання ўлады вялікага князя быў падоўжаны. Мянушку Стары ён атрымаў за тое, што ў 1529 г. на Віленскім сойме яго сын Жыгімонт быў абраны вялікім князем, а ў 1544 г. на Берасцейскім сойме бацька перадаў яму ўсе паўнамоцтвы. У 1506 г. падчас абрання Жыгімонт выдаў сёмы па ліку прывілей, у якім пацвердзіў ранейшыя правы і вольнасці феадалаў, зрабіўшы да іх новыя дапаўненні. Афіцыйна абвяшчалася, што вялікі князь абавязаўся не выдаваць без ведама паноў-рады ніякіх новых законаў: «Мы не інакш будзем тлумачыць і дапасоўваць статуты і зацверджаныя

і ўхваленыя да выканання старадаўнія звычаі, або ўзноў укладзеныя і абвешчаныя і тыя, якія будуць упарадкаваны для агульнай выгады рэспублікі нашай, як пасля грунтоўнага разважання і з ведама нарады і згоды паноў рады нашых ВКЛ».

Такім чынам, паны-рады станавіліся вярхоўным заканадаўчым органам улады. Рада атрымала шырокія правы ў вызначэнні знешняй палітыкі дзяржавы, абароны, фінансаў, прызначэнні на дзяржаўныя пасады, раздачы зямель, што істотна абмежавала ўладу вялікага князя. Аднак у сувязі з тым, што з канца XV ст. ва ўнутрыпалітычным жыцці дзяржавы ўзрасло значэнне шляхты, Рада вымушана была ўсё часцей і часцей абапірацца на рашэнні вальнага сойма, каб заручыцца падтрымкай усяго пануючага саслоўя.

У якасці органа дзяржаўнага кіравання вальны сойм узнік у часы ўтварэння ВКЛ. Аднак да XVI ст. ён пераўтварыўся ў вышэйшы орган улады, які вырашаў надзённыя праблемы кіравання. Правам удзелу ў ім валодалі каталіцкія біскупы, князі, магнаты, службовыя асобы, якія выконвалі абавязкі ў розных установах дзяржаўнай улады. На соймах прысутнічала і шляхта, але правам удзелу ў прыняцці рашэнняў яна не валодала. Шляхту запрашалі на соймы быццам бы для гонару, а на самой справе для таго, каб усім быў зразумелы характар прынятых рашэнняў. Таму яе ўдзел зводзіўся да ўхвалення прынятых рашэнняў і арганізацыі іх выканання.

Пераўтварэнне шляхты ў карпаратыўнае саслоўе, якое было звязана з прывілеем 1492 г., дало ёй магчымасць атрымаць не толькі маёмасныя, але і палітычныя правы. Яна пачала змагацца і дабілася таго, што ў часы Лівонскай вайны дзяржава была вымушана пайсці на ўвядзенне інстытута павятовых соймікаў і рэформу вальнага сойма. Соймікі з'яўляліся ідэалам для шляхецкага саслоўя, бо дазвалялі напярэдадні вальнага сойма абмеркаваць усе праблемы і выпрацаваць свае прапановы. Шляхта захацела атрымаць на сойме асобныя галасы і прымаць больш актыўны ўдзел у выпрацоўцы прымаемых рашэнняў. Таму на віленскім сойме 1565–1566 гг. станы (саслоўі) звярнуліся да гаспадара з прапановай: даць дазвол на ўтварэнне павятовых соймікаў па прыкладу Польскай Кароны «для лепшага і вечыстага парадку ў Рэчы Паспалітай».

Вялікі князь пагадзіўся і 30 снежня 1565 г. выдаў прывілей, згодна з якім у кожным павеце ўводзіліся павятовыя соймікі. У сувязі з гэтым у Статут 1566 г. быў уведзены адпаведны раздзел. На соймікі мелі права збірацца ўсе землеўласнікі шляхецкага стану для абмеркавання як асабістых, так і дзяржаўных патрэб. Князь павінен быў забяспечыць іх скліканне не пазней, чым за чатыры тыдні да вальнага сойма. На сойміку абіраліся два паслы на вальны сойм, якім выдаваліся інструкцыі і паўнамоцтвы, як вырашыць вядомыя праблемы і тыя, якія маглі ўзнікнуць «водле часу і патрэбы». Для

павятовых паслоў у сойме былі прызначаны месцы ў Паспалітай Радзе згодна з той іерархіяй, якая склалася ў папярэднія часы ў Гаспадарскай Радзе.

Увядзенне павятовых соймікаў істотна паўплывала на памяншэнне колькасці шляхецкіх паслоў на вальным сойме. Але значэнне шляхты ад гэтага не знізілася, а, наадварот, значна ўзрасло. Дзякуючы ўвядзенню гэтага інстытута шляхта атрымала магчымасць прымаць удзел у абмеркаванні надзённых праблем і праз сваіх паслоў уплываць на рашэнні вальных соймаў. Такім чынам, вальны сойм стаў двухпалатным і складаўся з Гаспадарскай Рады (сенат) і Паспалітай Рады (палата прадстаўнікоў).

## АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ РЭФОРМА І СІСТЭМА МЯСЦОВАГА КІРАВАННЯ

Соймавая рэформа выклікала неабходнасць правядзення рэформы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай, бо ў гэтай справе на тэрыторыі ВКЛ назапасіліся за шмат гадоў значныя праблемы. Яшчэ вялікі князь Вітаўт у 1413 г., змагаючыся з удзельнай сістэмай, увёў замест княстваў два ваяводствы – Віленскае і Трокскае, куды ўваходзілі амаль усе беларускія землі, за выключэннем Полацкай, Віцебскай, Смаленскай, Бранскай і інш., якія карысталіся аўтаномнымі правамі. Аднак гэты крок з боку кіраўніка дзяржавы выклікаў пратэст удзельных князёў, і Вітаўт заявіў, што ён будзе прытрымлівацца прынцыпу: «Старыны не парушаем, а навіны не ўводзім», што на доўгі перыяд захавала існуючы адміністрацыйны падзел, але жыццё прымусіла кіраўніцтва дзяржавы ўвесці з пачатку XVI ст. шэраг новых ваяводстваў: Полацкае, Навагародскае, Смаленскае, Віцебскае, Падляшскае. Павет як адміністрацыйная адзінка ў гэты перыяд хоць і існаваў, але меў няпэўныя межы.

Судовая і соймавая рэформы выклікалі неабходнасць вырашэння адпаведнай праблемы, і на Віленскім сойме 1565–1566 гг. была абвешчана адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа. Тэрыторыя ВКЛ падзялілася на 12 ваяводстаў і асобнае Жамойцкае староства, якія мелі 30 паветаў. Згодна са статутавай нормай усе яны пасылалі ў Раду Паспалітую 60 паслоў. Але, нягледзячы на адыход Смаленска ў 1514 г. да Маскоўскай дзяржавы, былі захаваны правы Смаленскага і Старадубскага паветаў, колькасць шляхецкіх паслоў складала 64.

Адначасова пачала праводзіцца і вайсковая рэформа. Калі раней дзяржава падзялялася на сем вайсковых акруг – Віленскую, Трокскую, Жамойцкую, Полацкую, Віцебскую, Кіеўскую і Валынскую, то цяпер іх колькасць узрасла да 13. У кожнай акрузе кіраўніком паспалітага рушэння стаў

ваявода, які ў час вайны падпарадкоўваўся гетману і пад яго «справаю і паслушэнствам» заставаўся да яе завяршэння. У цэнтральных паветах ваяводам былі падначалены кашталяны, а ў звычайных – маршалкі. Чыста прыдворнае значэнне маршалка пачало набываць новы сэнс – кіраўніцтва войскамі, а самастойнасць удзельных князёў была знішчана. Яны як і раней маглі ехаць на вайну са сваім «почтам» (вайсковым атрадам), але цалкам падначальваліся ваяводу.

Праведзеныя рэформы істотна не паўплывалі на сістэму мясцовага кіравання. Па-ранейшаму на тэрыторыі дзяржавы існавалі такія адзінкі, як воласць, вёска, на чале якіх стаялі соцкія, дзясяцкія, валасныя старцы, мэтай якіх быў збор падаткаў не толькі са звычайных сялян, але і з баяр путных, панцырных, мельнікаў, баброўнікаў і інш., выконваючых абавязкі спецслужб. У сувязі з праведзенай аграрнай рэформай 1557 г. на тэрыторыі Беларусі гэтыя людзі не атрымалі шырокіх праў, але захавалі свой статус аж да падзелаў Рэчы Паспалітай.

## СУДОВАЯ СІСТЭМА І СТАТУТЫ ВКЛ (1529 І 1566 гг.)

Ператварыўшыся ў канцы XV ст. у карпаратыўнае саслоўе, шляхта вылучыла асобную палітычную праграму, дзе асноўным момантам было ўраўноўванне ў судовых правах з магнатамі. Справа ў тым, што ў дзяржаве на той момант ужо існаваў «Судзебнік» 1468 г. Казіміра IV, які не разводзіў пануючае саслоўе па катэгорыях, быў недасканалым і ўтрымліваў вельмі шмат жорсткіх пакаранняў. Пытанне аб гэтым неаднойчы ставілася на вальных соймах і прызнавалася цэнтральнай уладай. Яшчэ ў 1501 г. Аляксандр, выдаўшы прывілей Валынскай зямлі, заявіў, што дзейнічаць ён будзе часова, «пакуль права Статута ў айчызне нашай установім». Аднак урад даволі працяглы перыяд не прымаў неабходных захадаў па распрацоўцы Статута, што было выклікана войнамі і нежаданнем магнатаў. Толькі на Віленскім сойме 1514 г. была створана Статутавая камісія, якую ўзначаліў канцлер Альбрэхт Гаштольд. Нам невядома, хто ўваходзіў у яе склад, але даследчык гісторыі права Беларусі Я. А. Юхо выказаў меркаванне, што ў складанні першага Статута ВКЛ мог удзельнічаць Ф. Скарына, які меў ступень доктара медыцыны, доктара свабодных навук, а таксама доктара права і добра ведаў законы рымскія, мясцовыя і іншых дзяржаў, выказваў ідэі, якія былі скарыстаны ў Статуце 1529 г.

Ужо ў прадмове да «Першай кнігі царстваў» Скарына ставіў на адзін узровень закон божы і чалавечы, сцвярджаючы, што кожны народ павінен мець уласныя законы. Ён пералічвае іх: «права рыцарскае або збройнае, еже

на вайне саблюдаема бываець». Тут яго характарыстыка як бы пераклікалася з раздзелам статута «Аб абароне земскай». Услед за рыцарскім Ф. Скарына называе права «местскае», або «купецкае». На Беларусі яно ў той час яшчэ не склалася. Асветнік выказваўся і за абмежаванне законамі каралеўскай ўлады, што гарантавала «людзям паспалітым» правы і належныя свабоды.

Праект Статута быў падрыхтаваны і выносіўся на абмеркаванне Гарадзенскага (1522) і Берасцейскага (1524) соймаў ВКЛ, але яго не зацвердзілі. Тлумачылася гэта тым, што праект не задавальняў у першую чаргу магнатэрыю, якая страчвала значную частку сваёй судовай улады. Магчыма, гэта было звязана і з праблемамі з боку рэдакцыі. Толькі на Віленскім сойме 1528–1529 гг. Статут быў зацверджаны і стаў асноўным законам для ўсіх жыхароў ВКЛ з 29 верасня 1529 г.

Распрацоўнікі Статута 1529 г. упершыню вырашылі шэраг складаных задач і выпрацавалі сістэму размяшчэння прававых норм у залежнасці ад іх зместа, улічылі тыпавыя і абагульняючыя нормы. У адпаведнасці з духам эпохі былі замацаваны прынцыпы суверэннасці дзяржавы насуперак сярэднявечнаму касмапалітызму, адзінства права і прыярытэт пісаных законаў. Яго складальнікі не прытрымліваліся сістэмы кадыфікацыі, прынятай у рымскім праве, а выпрацавалі сваю. Таму Статут з’яўляўся не кодэксам законаў, а заканадаўчым актам, у якім былі сістэматызаваны і выкладзены нормы права па кожнай галіне. Больш за тое, ён утрымліваў агульныя і спецыяльныя нормы, якія забяспечвалі прывілеі асобным групам пануючага саслоўя, у чым быў яго недахоп.

Статут 1529 г. складаўся з 13 раздзелаў, 244 артыкулаў. Пазней у яго былі ўнесены дапаўненні, і колькасць артыкулаў павялічылася да 283. Статут не друкаваўся і распаўсюджваўся ў шматлікіх спісах. Таму яго першапачатковая рэдакцыя не дайшла да сённяшняга часу. Захаваліся спісы: Слуцкі (гэты рукапіс захоўваўся ў бібліятэцы езуіцкага калегіума да канца XVIII ст., а потым трапіў у Вільню, затым адтуль у Санкт-Пецярбург), Фірлееўскі і Дзялынскага (назвы паходзілі ад імён яго ўладальнікаў). Найбольш старажытным з’яўляўся Фірлееўскі, які быў складзены адразу пасля 1529 г., але яго страцілі ў час Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Польшчы. Спісы Дзялынскага (60-я гг. XVI ст.) і Слуцкі (80–90-я гг. XVI ст.) захоўваюцца ў Расіі. Упершыню Статут 1529 г. пасля апрацоўкі з улікам трох рэдакцый прафесарам Віленскага ўніверсітэта І. М. Даніловічам быў надрукаваны лацініцай у 1841 г. у Познані, а кірыліцай у 1854 г. у Маскве.

Статут 1529 г. юрыдычна замацаваў асновы грамадзянскага і дзяржаўнага ладу ВКЛ, вызначыў прававое становішча ўсіх саслоўяў. У ім абвяшчалася, што ўсе асобы, «як убогія, так і багатыя», павінны былі судзіцца, што па тым часе было новай ідэяй, якая з’явілася пад уплывам Рэнесансу.

Статут дзейнічаў непрацяглы час, бо ў жыцці ВКЛ у 30–50-я гг. XVI ст. адбыліся вялікія змены. У 1557 г. была праведзена першая аграрная рэформа. Узвысіліся новыя магнацкія роды: Радзівілы, Сапегі, Пацы, Кішкі, Хадкевічы. Шляхта ўсё часцей і часцей патрабавала ўраўнення не толькі ў палітычных, але і ў судовых правах з магнатамі. Таму, калі пачалася Лівонская вайна і цэнтральная ўлада была вымушана пастаянна звяртацца па дапамогу да шляхты, праблема стала вырашацца. Ужо на Віленскім сойме 1559 г. вялікі князь вызваліў шляхту ад уплаты мыта за гандальляснымі і сельскагаспадарчымі таварамі, што з'явілася буйным падарункам за кошт скарачэння мытных паступленняў у дзяржаўны скарб. На сойме 1563 г. гэты прывілей быў пашыраны вызваленнем шляхты ад уплаты «грэбельнага», якое бралася пры праходзе суднаў праз млынавыя плаціны і загародкі. На тым жа сойме праваслаўныя былі ўраўнаваны ў палітычных правах з католікамі. Пагаршэнне становішча каталіцкай царквы ў сувязі з Рэфармацыяй, збліжэнне шляхты розных зямель і веравызнанняў, якая пачала асэнсоўваць сябе як адзінае саслоўе, садзейнічала прыняццю такога рашэння.

Асабліва настойліва шляхта дамагалася ўвядзення павятовага земскага суда, які быў бы аддзелены ад адміністрацыі, стаў выбарным, ураўняў бы шляхту ў судовых правах з князямі, панамі, магнатамі. Пытанне аб такіх судах ужо неаднойчы ўздымалася на вальных соймах, але велікакняжацкая адміністрацыя яго адкладала, спасылаючыся на тое, што ідзе праца над праектам новага Статута.

Вялікі князь улічваў, што пры ўвядзенні земскіх судоў паменшацца прыбыткі ваяводаў, старостаў, дзяржаўцаў, якія мелі грошы за кошт судовых спраў, а магнаты ўраўнуюцца ў правах са шляхтай. Але Лівонская вайна прымусіла абодва бакі саступіць у гэтай праблеме. І калі на Бельскім сойме 1564 г. было абвешчана, што новы Статут падрыхтаваны, радныя паны, якія дагэтуль чынілі суд, прыйшлі да гаспадара і заявілі, што, «мілуючы дзяржаву, а в ней брацью сваю малодшую, народ шляхецкі і рыцарскі», яны адступаюцца ад сваёй судовай улады, якой карысталіся паводле старога Статута і звычая, і ўсіх «пажыткаў» (пользаў) і выказаліся за ўвядзенне новага суда без перашкод.

Вялікі князь выканаў гэту заяву і выдаў прывілей 1 ліпеня 1564 г., які зацвярджаў новы Статут. Планавалася, што ён пачне дзейнічаць з 11 лістапада 1564 г. Аднак на практыцы ўзніклі цяжкасці, бо, па-першае, не былі вызначаны межы судовых акруг, а па-другое, шляхта была незадаволена зместам асобных артыкулаў Статута. Таму праца над гэтым дакументам працягвалася і на Віленскім сойме 1565–1566 гг. Шляхта папрасіла вялікага князя пры ўвядзенні новых судовых акруг ураўняць некаторыя вялікія паветы і як мага хутчэй правесці абранне кандыдатаў на замяшчэнне земскага суда. Разам

з тым была ўнесена прапанова аб утварэнні выбарнага падкаморскага суда для вырашэння «спраў гранічных і земленых» па польскім узоры. Князь пагадзіўся, у сувязі з чым новы Статут быў зацверджаны і пачаў дзейнічаць з 26 студзеня 1566 г.

Пачалося афармленне земскага суда, які складаўся з суддзі, падсудка і земскага пісара. Пасады былі выбарныя і на кожную з іх на павятовых сойміках пры ўдзеле ўсіх землеўладальнікаў абіраліся па чатыры асобы, з ліку якіх гаспадар зацвярджаў тых, хто яму прыглянуўся. Кандыдатамі маглі стаць толькі шляхціцы, якія мелі зямельную ўласнасць у вызначаным павеце і не займалі іншых пасад.

Земскі суд атрымаў права судзіць землеўладальнікаў сваёй акругі па ўсіх справах, за выключэннем гвалтоўных наездаў на шляхецкія дамы; падпалаў, разбояў на праезджых; гвалтавання жанчын; крадзяжоў, падлогаў, забойстваў шляхціцаў. Усе гэтыя справы заставаліся пад юрысдыкцыяй замкавага, або гродскага, суда.

Сесіі земскага суда праходзілі тры разы ў год: пасля Троіцы, 30 верасня і Хрышчэння. Тэрміны іх склікання маглі быць зменены толькі ў час вайны, работы вальнага сойма, або паморку. Усе службовыя асобы павінны былі з'яўляцца на яго пасяджэнні пад страхам страты сваёй пасады. Калі хто хварэў, або ў судзе разглядалася яго асабістая справа, то ён меў права пасадзіць на свае месца шляхціца і чалавека добрага, годнай веры, з мясцовых землеўладальнікаў і дасведчага ў законах.

Сесіі маглі працягвацца да двух тыдняў, калі было шмат спраў, судзілі ад раніцы да вечара. Пісар, які мог замяняцца падпіскам, але за ўсе справы адказваў сам, адразу заносіў прынятыя пастановы ў земскія кнігі, якія захоўваліся ў спецыяльна ўзведзеных будынках, ключы ад якіх былі толькі ў трох службовых асоб. Адчыняліся будынкі за тры дні да пачатку сесій для ўнясення «позваў» – павестак і зачыняліся праз тры дні пасля іх завяршэння, каб даць магчымасць зацікаўленым асобам атрымаць неабходныя пастановы. Апеляцыі адразу маглі ісці ў вышэйшую судовую інстанцыю – велікакняжацкі суд, а з 1581 г. – у Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага.

У выніку рэформы ў параўнанні з папярэднімі часамі істотна скараціліся судовыя выдаткі. Статут 1566 г. увёў наступныя нормы: пісару земскага і гродскага суда: за запіс судовых «позваў» – 1 гр.; за выпіс судовых «позваў» – 1 гр.; за складанне заявы аб «крыўдзе» – 1 гр.; за судовыя лісты і выпісы прынятых рашэнняў – 2 гр.; за выпісы на пергаментных лістах – 12 гр.; за паездкі «возным» (следчым) 1 гр. за мілю ў адзін канец; за агляд месца злачынства – 1 гр.; за ўвод ва ўладанне 1 гр. з сялянскай службы і ½ гр. з пусташы і г. д.

Вялікія судовыя выдаткі раней тлумачыліся тым, што стары суд знаходзіўся ў руках ваявод, старостаў і дзяржаўцаў. Цяпер жа, калі шляхта

дамаглася саслоўнага і выбарнага суда, яна звяла судовыя пошліны да звычайнай узнагароды за працу, пазбавіўшы іх былога сэнсу, – крыніцы ўзбагачэння.

Паралельна з земскімі судамі для шляхты захаваліся суды замкавыя або дворныя, якія атрымалі назву гродскіх па адным на кожны судовы павет. Гродскаму суду, як і земскаму, былі падсудны ўсе землеўладальнікі пры разглядзе крымінальных злачынстваў. Акрамя іх, сюды ўключаліся неаселыя шляхціцы і «госці» – іншаземцы. Склад гродскага суда застаўся ранейшым. Судзілі ваявода, староста або дзяржаўца, а пры іх адсутнасці – намеснікі разам з гродскім суддзёй, які не абіраўся, а прызначаўся. Справаводства вёў гродскі пісар. Суд дзейнічаў пастаянна – «па гарачых справах», да тых, хто ўхіляўся, прымянялася права «баніцыі», абвяшчэнне па-за законам да той пары, пакуль не будзе задаволены пацярпелы бок.

Статут 1566 г. замацаваў прынцыпы суверэннасці, адзінства права для ўсіх грамадзян, прыярытэту пісаных законаў. Захаваўшы папярэднюю структуру, ён складаўся з 14 раздзелаў і 367 артыкулаў. Больш поўна ў ім была вызначана кампетэнцыя органаў дзяржаўнай улады і кіравання, планавалася аддзяліць ад іх суд. Але на практыцы гэта было здзейснена ў адносінах да земскага і падкаморскага судоў. Статут унёс некаторыя папраўкі ў крымінальнае права: непаўналетнія маглі быць пакараны толькі пасля 14 гадоў, абвяшчалася прэзумпцыя невінаватасці, пакаранне за крымінальнае злачынства магло ажыццяўляцца толькі па рашэнні суда. У Статуце захаваліся і састарэлыя нормы, якія ўжо не адпавядалі патрабаванням часу. Напрыклад, яўрэям і татарам не далі права быць сведкамі ў судзе і інш.

Статут 1566 г. быў напісаны на беларускай мове і да 1855 г. таксама не друкаваўся. Зацверджаны ў даволі складаны перыяд, ён захаваў ідэю дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ, бо менавіта праз яго артыкулы ўдалося яе аднавіць і захаваць пасля Люблінскага сойма, што мела вялікае значэнне.

Зацверджаны на Варшаўскім сойме ў студзені 1581 г. Галоўны Літоўскі Трыбунал стаў вышэйшай судовай інстанцыяй, пастановы якой атрымалі моц пастаноў сойма. Трыбунал складаўся з 46 суддзяў, якія абіраліся на павятовых сойміках тэрмінам на адзін год. У яго кампетэнцыю ўваходзілі апеляцыйныя справы на рашэнні гродскіх, земскіх і падкаморскіх судоў, а таксама скаргі на мясцовую адміністрацыю. Да яго юрысдыкцыі адносіліся і справы духоўных асоб, пры разглядзе якіх прысутнічалі прадстаўнікі духавенства. Сесіі Трыбунала адбываліся пад старшынствам выбарнага маршалка і праходзілі штогод у Вільні, праз год у Менску, Навагародку і да 1588 г. у Троках. Увядзенне Галоўнага Літоўскага Трыбунала істотна абмежавала судовую ўладу вялікага князя і паноў-рады і падкрэсліла яшчэ адзін крок наперад у адваёве незалежнасці.

# 19 ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

- **Прыярытэты знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XV – пачатку XVI ст.**
- **Адносіны ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім**
- **Заходні напрамак палітыкі**
- **Барацьба з Крымскім ханствам**

## ПРЫЯРЫТЭТЫ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВКЛ У КАНЦЫ XV – ПАЧАТКУ XVI ст.

Канец XV – пачатак XVI ст. – эпоха пералому ў гісторыі не толькі ВКЛ, але і ўсёй еўрапейскай цывілізацыі. Гэта быў час Вялікіх геаграфічных адкрыццяў і з'яўлення капіталістычных адносін, узнікнення абсалютных манархій і зараджэння нацыянальных дзяржаў. З канца XV ст. Еўропа ўступіла ў новы перыяд міжнародных стасункаў. У гэты час пачаў завязвацца шэраг вузлоў міжнародных супярэчнасцей, якія пагражалі войнамі. Па-першае, можна назваць сутыкненне інтарэсаў Іспаніі з аднаго боку, і Францыі і Англіі – з другога, якое вылілася ў Італьянскія войны (1494–1559). Па-другое, узаемаадносіны еўрапейскіх дзяржаў з Асманскай імперыяй, якая працягвала сваю экспансію ў Еўропу. Па-трэцяе, барацьба паміж краінамі Паўночнай Еўропы за панаванне на Балтыцы. На такім фоне разгортваліся падзеі, якія вызначалі асноўны змест знешняй палітыкі ВКЛ гэтага перыяду. У першую чаргу гаворка ідзе пра супрацьстаянне з Вялікім Княствам Маскоўскім. Перманентнае ваенна-палітычнае змаганне за гегемонію ў рэгіёне не прайшло незаўважаным і для іншых дзяржаў-суседзяў, паколькі фактычна ўсе яны ў той ці іншай ступені апынуліся ўцягнутымі ў гэты канфлікт.

Перавага Масквы, якая намецілася ўжо з пачатку XVI ст., выклікала змену расстаноўкі сіл ва ўсходняй частцы еўрапейскага кантынента, парушыўшы існаваўшую раўнавагу. Спробы ВКЛ аднавіць сваё былое становішча і ранейшы міжнародна-прававы парадак з дапамогай ваенных акцый поспеху не мелі. Аслабленне ваенна-палітычнага патэнцыялу дзяржавы павышала значэнне дыпламатыі ў вырашэнні міждзяржаўных супярэчнасцей.

З канца XV ст. прыярытэтным у знешняй палітыцы ВКЛ быў усходні напрамак, дзе і разгортваліся важнейшыя падзеі. Асноўны змест літвінска-маскоўскіх адносін склалі як адкрытыя ваенныя дзеянні на памежжы і ўсходніх вялікалітоўскіх землях, так і шэраг дыпламатычных і ідэалагічных акцый і крокаў. Асноўнай мэтай дзейнасці літвінскай дыпламатыі ВКЛ на гэтым напрамку была нейтралізацыя Маскоўскай дзяржавы і дасягненне status quo.

На паўднёвым вектары ВКЛ падтрымлівала кантакты з татарскімі ордамі: Вялікай (да яе разгрому ў 1502 г.), Перакопскай і спарадычна з Нагайскай, – а таксама з Малдаўскім княствам. Гэтыя адносіны былі скіраваны на разрыў антыягелонскага саюза Масковіі з Крымскім ханствам і Малдаўскім княствам і прыцягненне апошніх на бок ВКЛ. Асноўным саюзнікам ВКЛ на гэтым напрамку яшчэ з часоў вялікага князя Казіміра заставалася значна аслабелая да таго часу Вялікая Арда, якая сама разлічвала на дапамогу літвінскай дзяржавы ў барацьбе са сваім галоўным ворагам – Крымскім ханствам. Кантакты з Нагайскай і Астраханскай ордамі засталіся толькі эпізодам у знешнепалітычнай практыцы ВКЛ. У адносінах з Малдаўскім княствам поспеху ўдалося дамагчыся толькі ў перыяд пагаршэння яго адносін з Маскоўскай дзяржавай. Заключаны літвінска-малдаўскі саюз аказаўся малапрадуктыўным. Такім чынам, на паўднёвым кірунку ВКЛ не атрымалася дасягнуць значных поспехаў.

На заходнім і паўночна-заходнім напрамках ВКЛ мела сталыя кантакты з Польшчай, Лівоніяй, Тэўтонскім ордэнам (пазней – Герцагствам Прусіяй) і Мазавецкім княствам. Існавала традыцыя падзелу сфер кампетэнцыі паміж дыпламатычнымі службамі ВКЛ і Польшчы, таму кантакты з Венгрыяй, Свяшчэннай Рымскай імперыяй германскай нацыі, Рымскай курыяй, Швецыяй, Францыяй былі спарадычнымі. Адпаведныя стасункі абумоўліваліся дзеяннямі на ўсходнім напрамку, а таксама гістарычнай традыцыяй і дынастычнымі сувязямі. Асноўнай мэтай знешняй палітыкі ВКЛ азначанага перыяду на дадзеным напрамку быў пошук саюзнікаў супраць Маскоўскай дзяржавы і перашкоджанне ўтварэнню антыягелонскай кааліцыі шляхам паслаблення патэнцыяльных хаўруснікаў Масквы. Большасць заключаных саюзаў ці не былі рэалізаваны, ці не прынеслі станоўчых вынікаў.

Такім чынам, знешняя палітыка ВКЛ у канцы XV – пачатку XVI ст. была актыўнай на ўсіх асноўных напрамках, але не вельмі паспяховай. Прычыны гэтага можна бачыць як у аслабленні ваенна-палітычнага патэнцыялу ВКЛ і ўзмацненні Маскоўскай дзяржавы, так і ў супярэчнасцях у лагеры Ягелонаў і непаслядоўнасці правядзення дыпламатычных акцый з боку ВКЛ. Да таго ж у той час пачала наладжвацца агульнаеўрапейская сістэма палітычнай раўнавагі. Прыватны выпадак яе дзеяння можна бачыць у стварэнні антыягелонскай кааліцыі, асноўная моц udaraў якой прыйшлася менавіта на ВКЛ.

## АДНОСІНЫ ВКЛ З ВЯЛІКІМ КНЯСТВАМ МАСКОЎСКІМ

У канцы XV ст. паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім разгарнулася барацьба за палітычнае лідарства ў рэгіёне, якая суправаджалася прад'яўленнем маскоўскім бокам прэтэнзій на т. зв. «рускія» землі – абшары, населеныя пераважна праваслаўным насельніцтвам («рускім» па тагачаснай тэрміналогіі), якія ў IX–XIII стст. уваходзілі ў сістэму княстваў Русі. Пры гэтым маскоўскі бок для абгрунтавання сваіх праў на гэтыя тэрыторыі выкарыстоўваў два асноўныя аргументы: рэлігійнае першынство і прыналежнасць сваіх уладароў да дынастыі Рурыкавічаў. Справа ў тым, што ў выніку працяглага існавання саюзу паміж свецкай і духоўнай уладай Маскоўскай дзяржавы афіцыйная ідэалогія Вялікага Княства Маскоўскага фактычна стала царкоўнай, і маскоўскія ўладары разглядаліся ёю як уладары ўсяго праваслаўнага хрысціянства. Пасля шлюбу вялікага князя маскоўскага Івана III з пляменніцай апошняга візантыйскага імператара Канстанціна XI Палеалога Соф'яй, які быў заключаны ў 1472 г., маскоўскі бок пачаў разглядаць сябе легітымным пераемнікам Візантыі як захавальніцы запаветаў праваслаўя. У першай чвэрці XVI ст. гэтыя ўяўленні знайшлі ўвасабленне ў канцэпцыі «Масква – трэці Рым», сфармуляванай, верагодна, старцам пскоўскага Елізарава манастыра Філафеем. Вялікія князі літоўскія, зразумела, адхілялі ўсялякія прэтэнзіі Вялікага Княства Маскоўскага на ўсходнія землі ВКЛ. Такім чынам, у канцы XV ст. пачаў завязвацца вузел міжнародных супярэчнасцей на ўсходзе Еўропы, якія выліліся ў шэраг бесперапынных маскоўска-літвінскіх войнаў.

Да першых войнаў маскоўскі вялікі князь Іван III падрыхтаваўся значна лепш за літвінскі бок, стварыўшы магутную антыягелонскую кааліцыю ў складзе Маскоўскай дзяржавы, Крымскай (Перакопскай) арды, Малдаўскага княства, да якіх таксама маглі далучыцца Мазовія, Тэўтонскі ордэн і Свяшчэнная Рымская імперыя германскай нацыі. ВКЛ жа спрабавала

абаперціся толькі на Польшчу – свайго даўняга саюзніка па ўніі. Аднак адносіны з заходняй суседкай таксама былі сапсаваны выбраннем розных уладароў на троны ВКЛ і Кароны пасля смерці Казіміра Ягелончыка ў 1492 г. На пасад у Вільні ўзышоў вялікі князь Аляксандр, а на трон у Кракаве – кароль Ян Ольбрахт. Асабістая унія паміж Польшчай і ВКЛ ператварылася ў дынастычную.

Пачатку першай маскоўска-літвінскай вайны 1492–1494 гг. папярэднічала т. зв. «дзіўная вайна», якая суправаджалася «ад'ездамі» шэрагу «вярхоўскіх» князёў (Варатынскіх, Бялеўскіх, Мязецкіх, Вяземскага і інш.) на службу да маскоўскага гаспадара Івана III Васільевіча разам са сваімі вотчынамі. Справа ў тым, што па ўмовах дагавораў, якія «вярхоўскія» князі ў свой час заключылі з вялікім князем літоўскім Вітаўтам Кейстутавічам, за некаторымі з іх захоўвалася права «служить на обе стороны», г. зн. і на баку ВКЛ, і на баку Вялікага Княства Маскоўскага. Спачатку яны захоўвалі вернасць вялікім князям літоўскім, але ў канцы XV ст. «вярхоўскія» князі пачалі схіляцца на бок тых уладароў, якія маглі рэальна гарантаваць ім бяспеку. У гэты час пачасціліся наезды крымскіх татар, саюзнікаў Івана III, на землі ВКЛ. Заходзілі сюды і атрады Вялікай Арды, ханы якой па старой звычцы часам патрабавалі даніну з мясцовых князёў. Апошнія таксама добра разумелі, што іх чакае ў выпадку пачатку ваенных дзеянняў паміж дзяржавамі. Спадзявацца на хуткую дапамогу літвінскіх улад не даводзілася з прычыны адсутнасці ў дзяржаве сталага войска. На збор жа паспалітага рушэння патрабаваўся час. Пратрымацца са сваімі дробнымі дружынамі да падыходу асноўных сіл земскага апалчэння мясцовыя князі не маглі. Разам з тым частка прадстаўнікоў княжацкіх родаў, сваякі якіх перайшлі на маскоўскі бок, заставаліся вернымі ВКЛ. Гэтыя факты сведчылі аб тым, што паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім у гэты час існавала прыкладная раўнавага сіл, проста адны князі лічылі, што бяспеку ім можа забяспечыць маскоўскі бок, а іншыя – што літоўскі.

З 1487 г., калі адбыўся першы «ад'езд» (князь Іван Варатынскі перайшоў на бок Масквы разам са сваёй вотчынай Перамышлем і падуладным яму насельніцтвам), можна казаць пра маскоўска-літвінскую памежную вайну, якая набыла характар наездаў, разбояў. З 1492 г. яны перараслі ў адкрыты міждзяржаўны ваенны канфлікт. Яго канец быў пакладзены 17 студзеня 1494 г. з прыездам у Маскву літвінскага «вялікага пасольства», у склад якога ўваходзілі трокскі ваявода Пётр Янавіч Мантыгірдавіч, жамойцкі староста Станіслаў Янавіч Кезгайла, Войцех Янавіч Клачко і пісар Федзька Грыгор'еў. У выніку быў падпісаны «вечны мір», па ўмовах якога ВКЛ панесла першыя тэрытарыяльныя страты ў выглядзе часткі «вярхоўскіх»

княстваў і ўсёй Вяземшчыны. Дакладная мяжа тут вызначана не была, што пакідала падставы для будучых канфліктаў. Акрамя таго, ВКЛ адмовілася ад сваіх праў на шэраг рускіх зямель, на якія яно мела ўплыў у мінулым: Вялікі Ноўгарад, Пскоў, Цвер і Разань. Гэта азначала прызнанне літвінскім бокам пераходу названых зямель пад уплыў Масквы. Мір быў замацаваны шлюбам вялікага князя Аляксандра з дачкой Івана III Аленай. У якасці пасагу Алены былі вызначаны ўсе «рускія» землі, якімі валодала ВКЛ.

Але дынастычны шлюб не вырашыў усіх супярэчнасцей. Чарговая маскоўска-літвінская вайна ўспыхнула ўжо ў 1500 г. Фармальнай зачэпкай да яе з'явіліся раздутыя маскоўскай прапагандай пытанні аб быццам бы маючых месца праследаваннях праваслаўнага насельніцтва ВКЛ і аб новым тытуле маскоўскага вялікага князя – «государь всея Руси», які не прызнаваўся літвінскай дыпламатыяй і палітычнымі дзеячамі.

Гэты ваенны канфлікт зноў-такі пачаўся з «ад'ездаў» памежных князёў з ВКЛ да Маскоўскай дзяржавы, якія па афіцыйных версіях быццам бы ратаваліся ад ганенняў на праваслаўных. Сапраўдныя ж матывы «ад'ездаў» раскрыў аўтар «Хронікі Быхаўца», паводле якой, маскоўскі вялікі князь Іван III пасылаў «таемне» да князёў Сямёна Іванавіча Бельскага, Сямёна Іванавіча Мажайскага і Васіля Іванавіча Шамячыча, прапаноўваючы перайсці да яго на службу, «а ку тому ешче обецал им многие городы ы волости свои». Пагадненне прадугледжвала, што «которые городы и волости они под Литвою поберут, то им и державі». Статус гэтых князёў-перабежчыкаў быў ужо іншы, чым у «вярхоўскіх» князёў, якія ў большасці былі ўдзельнымі ўладарамі. Землі наменікаў, якія «ад'ехалі» вясной 1500 г., з'яўляліся пажалаваннямі вялікіх князёў літоўскіх. Да таго ж першы з іх, князь Сямён Бельскі, сам паходзіў з дынастыі Гедымінавічаў (унук князя Уладзіміра Альгердавіча), а двое апошніх з'яўляліся маскоўскімі палітычнымі эмігрантамі, прадстаўнікамі дынастыі Рурыкавічаў, якія ў свой час знайшлі прытулак у ВКЛ. Таму іх дзеянні можна, у адрозненне ад падзей першай вайны, адназначна разглядаць як здраду дзяржаўным інтарэсам ВКЛ.

У красавіку 1500 г. у Маскву прыехала літвінскае пасольства на чале са смаленскім намеснікам Станіславам Пятрашкавічам Кішкам, якое імкнулася зняць напружанне паміж дзяржавамі. Вялікі князь Аляксандр пайшоў на кампраміс і ўпершыню звярнуўся да вялікага князя маскоўскага Івана III як да «государя всея Руси», патрабуючы вярнуць «здрадцаў» (князёў-перабежчыкаў) і не чыніць больш крыўд на межах. Але Іван III усю віну пераклаў на Аляксандра, абвінаваціўшы яго ў ганеннях на праваслаўных і прымусе вялікай княгіні Алены да прыняцця каталіцтва. Літвінскія паслы былі высланы. 3 мая 1500 г. па загадзе Івана III першая групоўка

на чале з ваяводам Якавам Захар'іным рушыла на Бранск. Толькі пасля гэтага ў Вільню быў адпраўлены ганец Іван Целяшоў з граматай, у якой абвяшчалася, што Іван III «за христианство хочет стояти» і пачынае вайну. Першая групоўка тым часам авалодала Бранскам, заняла Пуціўль, Мцэнск, Сярпейск, Старадуб, Гомель, Любеч, Ноўгарад-Северскі, Рыльск. На бок Масквы перайшлі князі Масальскія і Трубяцкія. 2-я групоўка войск на чале з Юрыем Захар'іным была накіравана да Смаленска і Дарагабужа. 3-я групоўка стаяла напагатове ў Вялікіх Луках, а 4-я – у рэзерве ў Цверы. У канцы чэрвеня да Смаленска падышоў конны корпус ВКЛ пад камандаваннем найвышэйшага гетмана князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага. 14 ліпеня 1500 г. 4-тысячны атрад гетмана атакаваў на р. Вядроша пад Дарагабужам аб'яднаныя сілы маскоўскіх ваявод (40 тыс. чалавек) і ў жорсткай 6-гадзіннай бітве быў амаль цалкам знішчаны. Князь Астрожскі з часткай войска трапіў у палон, а ВКЛ апынулася ў цяжкім ваеннапалітычным становішчы, бо яго асноўныя сілы былі разбіты.

Літвінская дыпламатыя здолела стварыць антымаскоўскую кааліцыю, у якую, акрамя ВКЛ, увайшлі Вялікая (Заволжская) Арда і Лівонскі ордэн. Аднак літвінскі бок не здолеў скарыстацца спрыяльнымі момантамі ад гэтага супрацоўніцтва. Летам 1501 г. ардынцы адваявалі шэраг гарадоў на Севершчыне, якія раней належалі ВКЛ. Аднак для таго, каб перадаць іх назад, патрабавалася прысутнасць літвінскага войска, бо доўга іх утрымліваць стэпавікі не маглі. У маі 1501 г. пачаў ваенныя дзеянні супраць Масквы і магістр Лівонскага ордэна Вальтэр фон Плетэнберг. Але вялікі князь Аляксандр, заняты справамі ў Польшчы (у гэты час памёр яго брат Ян Ольбрахт і Аляксандр удзельнічаў у барацьбе за польскую карону), не змог аказаць дапамогу саюзнікам. У выніку сітуацыя склалася так, што сілы кааліцыі былі разбіты паасобку.

Другая маскоўска-літвінская вайна доўжылася да 1503 г. і закончылася падпісаннем шасцігадовага перамір'я, якое замацавала чарговыя змены на літвінска-маскоўскай мяжы. Да Масквы адышлі: рэшта вярхоўскіх княстваў (Мцэнск, Масальск, Сярпейск, Любуцк); Чарнігава-Старадубскае княства (Чарнігаў, Старадуб, Гомель); Ноўгарад-Северскае княства (Ноўгарад-Северскі, Рыльск); паўднёвая, паўночная і ўсходняя часткі Смаленшчыны (Бранск, Трубчэўск, Радагошч, Почап, Дарагабуж, Таропец, Белая і інш.); частка Кіеўшчыны (Любеч, Пуціўль); паўднёвая частка Мсціслаўскага княства (Хоцімль, Папова Гара, Мглін); паўночна-ўсходняя частка Віцебскай (Веліж) і Полацкай (Невель, Астры) зямель. Гэта рэзка змяніла суадносіны сіл у рэгіёне на карысць Масквы і рабіла непазбежнай новую вайну з Маскоўскай дзяржавай, тым больш што там мірныя ініцыятывы літвінскага боку не знаходзілі падтрымкі.

Новая ваенная кампанія была распачата пераемнікам Івана III вялікім князем маскоўскім Васілём III Іванавічам у 1507 г., яшчэ да заканчэння тэрміну шасцігадовага перамір'я, заключанага ў 1503 г. Ёй папярэднічала напружаная дыпламатычная падрыхтоўка, калі новы вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт Казіміравіч спрабаваў аб'яднаць для барацьбы з Маскоўскай дзяржавай сілы ВКЛ, Польшчы, Лівоніі, Крымскага і Казанскага ханстваў і наладзіць зносіны з братам вялікага маскоўскага князя Юрыем Іванавічам, спрабуючы дэстабілізаваць унутрыпалітычнае становішча ў Маскоўскай дзяржаве шляхам падрыхтоўкі змовы з мэтай адхілення Васіля III ад улады. У выніку рэальная дапамога была атрымана толькі ад Польшчы. Вайна 1507–1508 гг., цесна звязаная на апошнім этапе з мяцяжом князя Міхаіла Львовіча Глінскага, магутнага фаварыта вялікага князя літоўскага Аляксандра, які трапіў у няміласць пры Жыгімонце Старым, скончылася так званым «вечным мірам», заключаным восенню 1508 г. Ён замацоўваў страты літвінскага боку на перыяд 1503 г. за невялікім выключэннем, бо ВКЛ быў вернуты Любеч. Азначаны факт меў палітычнае і ваеннае значэнне. Упершыню ВКЛ вярнула частку страчаных зямель. Гэта быў псіхалагічны і прэстыжны поспех. Маскоўская дзяржава са стратай Любеча была адкінута ад лініі Дняпра (праўда толькі на 3–4 мілі), што мела пэўнае ваеннае значэнне. Адначасова палепшылася стратэгічнае становішча Кіева, для якога працягвала існаваць пагроза ў выпадку маскоўскай атакі.

Аднак Васіль III хутка парушыў «вечнасць» міру 1508 г. Восенню 1512 г. сваім смаленскім паходам ён паклаў пачатак чарговай маскоўска-літвінскай вайне, якая доўжылася з кароткімі перапынкамі і рознай інтэнсіўнасцю да 1522 г. Да яе пачатку мелі дачыненне не толькі наезды саюзніка Жыгімонта Старога крымскага хана Менглі-Гірэя на Маскву, але і варожая Ягелонам палітыка імператара Максіміліяна I Габсбурга, які прыклаў усе намаганні да стварэння кааліцыі ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі, Маскоўскай дзяржавы і Тэўтонскага ордэна, з магчымым далучэннем да яе Лівонскага ордэна, Саксоніі, Брандэнбурга і Даніі. Асноўны ўдар кааліцыі накіроўваўся па ўладаннях караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Казіміравіча.

У ВКЛ саюзнікаў амаль не было, бо на Венгрыю і Чэхію, дзе кіравалі прадстаўнікі дынастыі Ягелонаў, цяжка было разлічваць, Менглі-Гірэю пагражалі нагаі, а Польшча займалася справай з Тэўтонскім ордэнам і намагалася за сваю дапамогу атрымаць ад ВКЛ пацвярджэнне інкарпарацыйнай уніі 1501 г. Таму дапамога палякаў абмежавалася наймам за грошы некалькіх тысяч жаўнераў.

Падчас вайны адбыўся шэраг значных падзей, дзве з якіх не толькі паўплывалі на ўзаемаадносіны абедзвюх краін, але і выклікалі еўра-

пейскі рэзананс. Гаворка ідзе пра захоп маскоўскімі войскамі Смаленска 31 ліпеня 1514 г. і паражэнне маскавітаў 8 верасня 1514 г. пад Оршай ад удвая меншага земскага апалчэння ВКЛ, узмоцненага атрадамі польскіх наёмнікаў. З гэтага часу перавага была на баку Масквы, якая ў 1514 г. заключыла антыягелонскі саюз з імператарам Максіміліянам I (ад якога апошні адступіў ужо ў 1515 г.). Затое перамога войска ВКЛ пад Оршай, што разглядалася пры двары Жыгімонта Старога як рэванш за страту Смаленска, стварыла магчымасць выкарыстання знешнепалітычнай прапаганды як важнага ідэалагічнага сродку ў справе барацьбы за прыхільнае стаўленне да ВКЛ у краінах Еўропы і выкрыццё ролі імператара Максіміліяна I Габсбурга ў справе распальвання варожасці паміж хрысціянскімі ўладарамі.

Пасля вайна цягнулася без значных падзей. Спробы літвінскіх дыпламатаў заключыць мір, асноўнай умовай якога было вяртанне ўсіх захопленых раней тэрыторый ВКЛ (восень 1517 г. – пасольства магілёўскага намесніка Яна Шчыта і пісара Міхала Богуша Багавіцінавіча пры пасрэдніцтве імператарскага ўпаўнаважанага Жыгімонта Герберштэйна, жнівень 1520 г. – пасольства падляшскага ваяводы Яна Косцевіча і падскарбія Міхала Богуша Багавіцінавіча) скончылася падпісаннем пяцігадавога перамір'я, якое 14 верасня 1522 г. заключыла ў Маскве літвінскае пасольства ў складзе полацкага ваяводы Пятра Станіслававіча Кішкі, падскарбія Міхала Богуша Багавіцінавіча і пісара Івана Гарнастая. Перамір'е замацавала межы 1508 г., але са значным выключэннем, бо Смаленск застаўся за Масквой. ВКЛ захавала за сабой шматлікі маскоўскі палон. Аднак мір так і не быў падпісаны з-за спрэчак наконт Смаленска. Таму перамір'е было прадоўжана ў 1527 і 1532 гг. Са стратай Смаленска дасягненне былой раўнавагі з Масквой стала амаль немагчымым. Таму даводзілася задавальняцца палавінчатымі мерамі.

Чарговае хісткае перамір'е трывала толькі да 1534 г., калі пасля смерці Васіля III ВКЛ упершыню за разглядаемы перыяд выступіла ініцыятарам ваеннага канфлікту, маючы намер вярнуць тэрытарыяльныя страты, скарыстаўшыся спрыяльнай сітуацыяй (смерць Васіля III у 1533 г. і выспяваючы ўнутраны разлад у Маскве пры малалетнім Іване IV). На працягу 1535 г. аб'яднанае літвінска-польскае войска дасягнула значнага поспеху, заняўшы амаль усю Севершчыну, аднак замацаваць гэты поспех не атрымалася. Вайна закончылася падпісаннем 16 лютага 1537 г. пяцігадовага перамір'я па прынцыпе uti possidetis: за ВКЛ застаўся Гомель, да Маскоўскай дзяржавы адышлі Себеж і Завалочча. Вяртанне Гомельшчыны мела важнае значэнне, бо ўтвораны ў выніку літвінскі клін, які выбіваўся ў Северскія землі, быў добрым пунктам для далейшага працягу экспансіі ВКЛ у гэтым рэгіёне.

Масква была адкінута ад лініі Дняпра і перастала непасрэдна пагражаць Кіеву. Між тым страчаныя Себеж і Завалочча, дзе падданыя Івана IV пабудавалі моцныя замкі, былі добрымі пунктамі для нападу на Полаччыну. Такім чынам, у выніку чатырох маскоўска-літвінскіх і адной літвінска-маскоўскай войнаў ВКЛ страціла прыкладна 39 % тэрыторыі, галоўным чынам у Задняпроўі і на поўнач ад яго.

Як паказалі наступныя падзеі, новае перамір'е, якое працягвалася ў 1542, 1549, 1553, 1556 гг., не прадухіліла далейшага напружання ў адносінах паміж дзяржавамі. У канцы 50-х гг. XVI ст. намеціўся новы віток супрацьстаяння, звязаны з лівонскім пытаннем, які прывёў да чарговай вайны.

Такім чынам, асноўная мэта знешняй палітыкі ВКЛ на ўсходнім напрамку – захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці і вяртанне страчаных тэрыторый – дасягнута не была. Пры гэтым трэба адзначыць, што памежжа з Масковіяй было адрэзкам мяжы, дзе перавага перад дыпламатычнымі сродкамі аддавалася зброі, але і ваенныя сродкі таксама аказаліся не вельмі эфектыўнымі. Увага ж на абарончыя мерапрыемствы, звязаныя з прывядзеннем памежных замкаў у належны стан, была звернута ў асноўным толькі пасля страты Смаленска, які меў выключнае становішча сярод усходніх крэпасцей ВКЛ. Няздольнасць адваяваць Смаленск сведчыла аб канчатковай страце стратэгічнай ініцыятывы ВКЛ і недахопе патэнцыялу для захавання сваёй тэрытарыяльнай цэласнасці.

## ЗАХОДНІ НАПРАМАК ПАЛІТЫКІ

На заходнім напрамку знешняй палітыкі саюзнікам ВКЛ заставалася Польшча, злучаная з Княствам спачатку дынастычнай, а пасля персанальнай уніяй. Нягледзячы на фармальны разрыў персанальнай уніі ў 1492 г., ВКЛ і Польшча ў перыяд існавання асобных уладароў працягвалі актыўнае супрацоўніцтва. Паміж дзяржавамі часта адбываўся абмен пасольствамі. Аднак падчас першай маскоўска-літвінскай вайны 1492–1494 гг. Польшча не аказала ваеннай дапамогі ВКЛ, ставячы ўмовай яе прадстаўлення аднаўленне рэальнай уніі. Справа уніі ўзнімалася і ў 1496 г., напярэдадні Чарнаморскай антытурэцкай выправы Ягелонаў, што вылілася ў антымалдаўскі паход, у якім ужо ВКЛ не аказала значнай дапамогі Польшчы. Але наступнае пагаршэнне міжнароднага становішча ВКЛ і Польшчы патрабавала іх далейшага збліжэння, якое прывяло да заключэння ў 1499 г. кракаўска-віленскай уніі. Фактычна яна з'яўлялася звычайным ваенна-палітычным саюзам двух раўнапраўных бакоў. У 1501 г. была падпісана польска-літвінская унія ў Мельніку, паводле якой прадугледжвалася спыненне асобных выбараў

вялікага князя літоўскага ў Вільні. Манарх павінен быў выбірацца на агульным сойме дэлегатаў абедзвюх дзяржаў у Петракове. Гэта азначала ліквідацыю спадчыннага трымання велікакняжацкага пасада ў ВКЛ прадстаўнікамі дынастыі Ягелонаў і перадачу лёсу выбараў у рукі польскіх паноў, якія складалі большасць на агульным сойме. Акрамя таго, прадугледжвалася ўстанаўленне адзінай грашовай сістэмы, правядзенне агульнай унутранай і знешняй палітыкі. Захоўваліся асобныя дзяржаўныя апараты і суды, але новыя члены Рады і службовыя асобы павінны былі прысягаць каралю. Фактычна Мельніцкая унія вяла да ліквідацыі дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ. Аднак гэта дамова не была ратыфікавана літвінскім бокам. На працягу разглядаемага перыяду формай сувязі паміж краінамі заставалася персанальная унія. Выключэнне складала кароткае праўленне маладога каралевіча Жыгімонта II Аўгуста ў ВКЛ у 1544–1548 гг., калі існавала спецыфічная форма дынастычнай уніі.

Пры ўсім багацці тагачасных літвінска-польскіх адносін дамінуючым элементам у іх з'яўлялася ўзаемнае супрацоўніцтва і дапамога. Разам з тым захаванне персанальнай уніі з заходнім суседам прыводзіла да своеасаблівага самаабмежавання ВКЛ у дыпламатычных адносінах з іншымі дзяржавамі. Гэта было звязана са спробамі польскага боку манапалізаваць адносіны ВКЛ з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, пакідаючы ў вобласці кампетэнцыі велікакняжацкай дыпламатыі толькі стасункі з краінамі Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Важнае значэнне мела ваеннае супрацоўніцтва, прыкладам якога былі бітвы пад Вішняўцом 1512 г., пад Оршай 1514 г., пад Сакалем 1519 г., пад Старадубам 1535 г. і інш. Існаванне агульнага ўладара садзейнічала працэсу інтэграцыі абедзвюх дзяржаў і народаў.

З другога боку, паміж літвінамі і палякамі існавала шмат спрэчных пытанняў: праблема ўзаемных гвалтаў і грабяжоў, працяглае знаходжанне гаспадара ў Польшчы. Аднак адной з самых складаных праблем была спрэчка, якая датычыла формы уніі паміж абедзвюма дзяржавамі. Пытанне аб тым, існаваць ці не існаваць якой-небудзь сувязі паміж дзяржавамі, не ўзнікала. У справе уніі адрозніваліся пазіцыі Польшчы, ВКЛ і манархаў. Калі польскі бок выступаў за інкарпарацыйную форму уніі, то літвінскі схіляўся да формы простага ваенна-палітычнага саюзу з захаваннем дзяржаўнай асобнасці ВКЛ. Да 1562 г. польскі праект уніі быў непрымальны як для магнатаў, так і для шляхты ВКЛ. Фактычна з іх поглядам супадала пазіцыя манархаў, якія да 1562 г. не дапускалі паглыблення уніі, імкнучыся захаваць просты саюз паміж ВКЛ і Польшчай.

Такім чынам, з аднаго боку, ВКЛ разглядала Польшчу як рэальнага партнёра і саюзніка для сваіх знешнепалітычных акцый. Эфектыўнасць гэтага

супрацоўніцтва асабліва ўзрастала там, дзе супадалі іх дзяржаўныя інтарэсы. Прыкладам можа служыць сталае ўзаемадзеянне пры абароне паўднёва-ўсходніх меж дзяржаў. З другога боку, у пастаянных захадах польскага боку да уніі з ВКЛ у форме інкарпарацыі існавала рэальная небяспека дзяржаўнай самастойнасці апошняга. Аднак да канца разглядаемага перыяду ВКЛ яшчэ ўдавалася абараняць свае дзяржаўныя інтарэсы перад націскам заходняга партнёра па уніі.

## БАРАЦЬБА З КРЫМСКІМ ХАНСТВАМ

У адносінах з Крымскім ханствам асноўнай мэтай знешняй палітыкі ВКЛ з'яўлялася адцягненне яго ад удзелу ў антыягелонскай кааліцыі, створанай пад эгідай Масквы, забеспячэнне паўднёвых меж ад набегаў стэпавікаў і, па магчымасці, перацягненне іх на свой бок у барацьбе з усходнім суседам.

Недальнабачная палітыка ВКЛ апошніх гадоў праўлення вялікага князя Казіміра Ягайлавіча, накіраваная на збліжэнне з Вялікай Ардой, спрадвечным ворагам Крыма, яшчэ больш садзейнічала ўдзелу Крымскага ханства ў антыягелонскай кааліцыі. Не спрыяла добрасуседскім адносінам з Крымам і падтрымка вялікім князем Казімірам братоў крымскага хана Менглі-Гірэя Нур-Даўлата і Хайдэра (Айдара), якія знаходзіліся ў апазіцыі да правячага хана і на момант заключэння маскоўска-крымскага саюзу знайшлі часовы прытулак у ВКЛ. Ажыццяўленню азначанай дамовы спрыяла таксама зацікаўленасць сюзерэна ханства, Асманскай імперыі, у аслабленні пазіцый ВКЛ у рэгіёне. На працягу свайго існавання Крымскае ханства праводзіла палітыку нападаў з мэтай рабаўніцтва на землі сваіх больш развітых суседзяў. Пасля заключэння саюзу паміж Масквой і Крымам асноўным аб'ектам такіх наездаў сталі паўднёвыя землі ВКЛ і Польшчы, якія мелі адносна вялікую шчыльнасць насельніцтва і былі амаль пазбаўлены абароны. Пік актывізацыі нападаў прыпадае на канец XV – першыя гады XVI ст. Спробы спынення іх дыпламатычнымі сродкамі, як і намаганні перацягнуць Крымскае ханства на свой бок шляхам прапаноў больш выгадных умоў саюзу з боку дыпламатыі ВКЛ, поспеху не мелі. Выкарыстанне супраць Крыма Вялікай Арды прыносіла карысць толькі да 1502 г., калі апошняя была разбіта войскам крымскага хана Менглі-Гірэя. Ваенная абарона паўднёвай мяжы яшчэ не была наладжана, таму крымчакі дзейнічалі амаль беспакарана аж да бітвы пад Клецкам 5 жніўня 1506 г., якая скончылася перамогай апалчэння ВКЛ над пераўзыходзячымі сіламі крымскіх татар.

Гэтая падзея стала своеасаблівай вехай, якая азнаменавала сабой змены ў развіцці літвінска-крымскіх адносін, што намеціліся раней. У 1507 г.

паміж ВКЛ і Крымскім ханствам быў заключаны саюз, які меў яўную антымаскоўскую накіраванасць. Аднак, як паказалі далейшыя падзеі, ён не прынёс рэальнай дапамогі ў барацьбе з Масквой. Не спыніў саюз і наезды крымчакоў, хоць змяніў іх інтэнсіўнасць. Прычына заключалася ў палітыцы двайнога заахвочвання, якую праводзіў крымскі хан у гэтым рэгіёне. Менглі-Гірэй ужо ў пачатку 1508 г. у сувязі з пачаткам мяцяжу князя Міхаіла Львовіча Глінскага зноў паспрабаваў зрабіць стаўку на апошняга, паколькі той паабяцаў перадаць хану яго даўняга ворага – хана Вялікай Арды Шыг-Ахмата, які ўтрымліваўся ВКЛ на становішчы напаўпалоннага-напаўзакладніка. У канцы таго ж года Менглі-Гірэй пацвердзіў свой стары саюз з Маскоўскай дзяржавай. «Упамінкі» крымскаму хану, якія выплочваліся рэгулярна, каштавалі значных выдаткаў. Таму кіраўніцтва ВКЛ у адносінах з ханствам зноў узяло курс на ваенныя сродкі. У бітве пад Вішняўцом 28 красавіка 1512 г. крымчакі былі разбіты. У тым жа годзе заключаны новы крымска-літвінскі саюз, які не толькі стварыў часовую бяспеку на паўднёвых межах княства, але і накіраваў татарскія загоны на спусташэнне маскоўскіх зямель. Выключнасць дадзенай знешнепалітычнай акцыі была яшчэ і ў тым, што, акрамя звычайнай ратыфікацыі, гэты саюз быў падмацаваны крымскім бокам прысылкай у ВКЛ унука хана Менглі-Гірэя, Джалалдзіна, у якасці закладніка (хоць апошні хутка памёр, так і не сустрэўшыся з вялікім князем Жыгімонтам Казіміравічам). Але літвінскі бок не здолеў скарыстацца гэтым ваенна-палітычным поспехам, бо наезды крымчакоў на маскоўскія землі сталі адной з зачэпак для разрыву вялікім князем маскоўскім Васілём III «вечнага міру» і пачатку ў 1512 г. ваенных дзеянняў супраць ВКЛ.

Вясной 1515 г. пасля смерці хана Менглі-Гірэя літвінская дыпламатыя здолела перацягнуць на свой бок новага хана Мухамед-Гірэя, які аднавіў саюз з ВКЛ у 1516 г. Гэта падзея таксама была непасрэдна звязана з сітуацыяй у рэгіёне, бо пасля захопу ў канцы ліпеня 1514 г. Смаленска маскоўскімі войскамі перавага сіл знаходзілася на баку Масквы. У 1518 г. разлік паставіць крымскага царэвіча на чале Казанскага ханства схіліў Мухамед-Гірэя да саюзу з маскоўскім вялікім князем Васілём III. 1519 год быў адзначаны канчатковым адыходам хана ад саюзу з Жыгімонтам, што выявілася ў спусташальных наездах крымчакоў на Валынь, Кіеўшчыну і Люблін, зробленых па просьбе Васіля III. Калі ж апошні паставіў у Казані сваю марыянетку – хана Шэйх-Алея, Мухамед-Гірэй звярнуўся да Жыгімонта Старога з прапановай аднавіць былы саюз. У Крым быў накіраваны Астафей Гарнастай, які ў 1521 г. вярнуўся разам з паслом хана, што прывёз даканчальную грамату на «вечны мір». У тым жа годзе брат хана царэвіч Сахіб-Гірэй захапіў Казань і ў ліпені крымска-казанскае войска, пры ўдзеле чаркаскага старосты Астафія Дашковіча, рушыла на маскоўскія землі.

Адносіны з Крымскім ханствам пагоршыліся, калі пасля забойства ў 1523 г. хана Мухамед-Гірэя і кароткатэрміновага праўлення яго сына Газы-Гірэя, у 1524 г. трон захапіў хан Сеадзет-Гірэй. У адказ на наезды крымчакоў літвінскі бок прыняў меры супрацьдзеяння з дапамогай як ваенных сродкаў (напрыклад, наезд казакаў Астафея Дашковіча на крымскія ўлусы ў 1524 г., перамога літвінскага апалчэння над значнымі сіламі татар у бітве на р. Альшаніцы 5 лютага 1527 г.), так і сродкаў палітычных. Ужо ў 1525 г. у Крыме пачаліся ўдала арганізаваныя літвінскай дыпламатыяй унутраныя ўскладненні, перарослыя ў адкрытую ўсобіцу паміж ханам Сеадзет-Гірэем і яго пляменнікам Іслам-Гірэем, якога спачатку і падтрымліваў літвінскі бок. Акрамя таго, быў нарэшце выпушчаны з няволі даўні вораг Гірэяў хан Шыг-Ахмат, і таму зноў узрасла пагроза крымчакам ад рэшткаў Вялікай Арды. Вынікам гэтых акцый было часовае заспакаенне на паўднёвых межах ВКЛ, але адначасова змяншалася магчымасць выкарыстання татар супраць Маскоўскай дзяржавы.

У 1526 г. Сеадзет-Гірэй і Іслам-Гірэй-салтан заключылі паміж сабой пагадненне, падзяліўшы Перакопскую Арду, пасля чаго літвінская дыпламатыя стала на шлях наладжвання прыязных кантактаў з Сеадзет-Гірэем. Калі ў тым жа годзе Сеадзет-Гірэй і Іслам-салтан запатрабавалі «ўпамінкаў», якія плаціліся хану Мухамед-Гірэю і яго сыну Багатыр-салтану, то атрымалі фармальную згоду пры ўмове, што ханы будуць саюзнікамі супраць усіх непрыяцеляў і вернуць захоплены да таго часу палон. Аднак, відаць, літвінскі бок не спяшаўся плаціць хану «ўпамінкі», а апошні – вяртаць палонных.

У 1532 г. у Крыме аднавілася барацьба паміж Сеадзет-Гірэем і Іслам-салтанам. У тым жа годзе адбыўся і паход Сеадзет-Гірэя на паўднёвыя землі ВКЛ, які такім чынам дамагаўся выплаты «ўпамінкаў». Літвінскі бок схіліўся да іх выплаты толькі пасля паведамлення аб прымірэнні паміж ханамі. Але стаўку зноў пачалі рабіць на Іслам-салтана, які ў наступным годзе паведамляў, што застаўся адзіным ханам у Перакопскай Ардзе. Да яго адразу ж накіравалася пасольства з «упамінкамі» і прапановай заключыць саюзную дамову. Аднак хутка чарговая смута ў Крыме зноў змяніла сітуацыю. У 1534 г. Перакопская Арда ў чарговы раз распалася на два ханствы. Супернікам Іслам-Гірэя стаў Сахіб-Гірэй, з якім у 1534 г. і заключыў саюзную дамову літвінскі пасол Анікей Гарнастай. Няўстойлівае становішча хана паўплывала на тое, што «ўпамінкі» былі значна зменшаны і склалі 260 паставаў сукна «луньскага» для абодвух ханаў: 200 Сахіб-Гірэю і 60 Іслам-Гірэю. У 1537 г. Іслам-Гірэй быў забіты, а Сахіб-Гірэй пачаў адмаўляцца прыняць меншыя «ўпамінкі». Высланае ў 1538 г. літвінскае пасольства, якое мела мэтай перакканаць хана застацца на ўмовах пагаднення 1534 г., было затрымана ў Крыме. Нацягнутасць у адносінах спала толькі ў 1540 г., калі было заключана новае «даканчан-

не» на ўмовах літвінска-крымскага дагавора 1512 г. Адначасова пагоршыліся маскоўска-крымскія стасункі. Магчыма, гэта паўплывала на вынік маскоўска-літвінскіх перамоў 1542 г., якія завяршыліся сямігадовым перамір'ем – самым доўгім з усіх заключаных. Аднак у гэты ж час на літвінска-крымскія адносіны пачаў аказваць уплыў «казацкі фактар», часам уносячы ў іх большае напружанне.

У 1551 г. у выніку чарговага перавароту ў Крыме да ўлады прыйшоў пляменнік Сахіб-Гірэя – Дэўлет-Гірэй, які адразу ж заключыў з Жыгімонтам Аўгустам «даканчанне» на ўмовах выплаты 15 тыс. залатых «упамінкаў»: на 13 тысяч залатых сукна «луньскага» і на 2 тысячы «готовизной». Але гэта не перашкодзіла хану ў тым жа годзе захапіць і спаліць Брацлаў, а пазней і патрабаваць такіх «упамінкаў», якія даваліся Мухамед-Гірэю: на 7,5 тыс. залатых грашамі і на 7,5 тыс. залатых сукнамі.

Кантакты з Крымскім ханствам актывізаваліся напярэдадні Лівонскай вайны. Аснову іх складалі праблемы, звязаныя з дробнымі наездамі крымчакоў і дзейнасцю казакаў. Аднак у 1558 г. адбыўся новы вялікі наезд на паўднёвыя землі ВКЛ. Пад націскам султана, да якога звярнуўся Жыгімонт Аўгуст, справу ўрэгулявалі і нават былі вернуты палонныя. А ў 1560 г. было заключана чарговае літвінска-крымскае саюзнае «даканчанне» на ўмовах дамовы 1512 г. Тым самым, уступаючы ў чарговую вайну з Маскоўскай дзяржавай, ВКЛ гарантавала сабе адносную бяспеку паўднёвага фланга і саюзніка ў будучай барацьбе.

Такім чынам, у канцы XV – першай палове XVI ст. кантакты паміж ВКЛ і Крымам эвалюцыянавалі ад адкрыта варожых да нейтральных і нават добрасуседскіх, пасля чаго зноў пагоршыліся. Асноўнай прычынай гэтага можна лічыць аслабленнне міжнароднага прэстыжу ВКЛ у выніку шэрагу няўдач у войнах з Масквой. З другой паловы 30-х гг. XVI ст. адносіны паміж дзяржавамі ўступілі ў новую стадыю і да сярэдзіны стагоддзя характарызаваліся пэўнай стабільнасцю.

Пры ажыццяўленні знешняй палітыкі ВКЛ выкарыстоўваўся значны арсенал сродкаў, форм і метадаў рэалізацыі міжнародных акцый, якія мелі на мэце забеспячэнне дзяржаўнага суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці краіны. Але пры гэтым не заўсёды ўдавалася дасягнуць станоўчых вынікаў, якія адпавядалі б інтарэсам ВКЛ, віной чаму былі нерашучасць, прамаруджванні, збег розных неспрыяльных акалічнасцей, а то і проста легкадумнасць кіраўніцтва дзяржавы ў дачыненні да ўзятых на сябе абавязацельстваў. У выніку не ўдалося пазбегнуць значных тэрытарыяльных страт на ўсходзе, а для рэваншу ўжо не хапала сілы. Пэўныя поспехі на іншых напрамках не маглі кампенсаваць правалы на ўсходнім напрамку. У цэлым знешняя палітыка ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI ст. мела толькі часовы і частковы поспех.

# 20 ЗМЕНЫ ВА ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў 20–60-я гг. XVI ст.

- **Мяцеж Міхаіла Глінскага**
- **Арганізацыя вайсковай справы і фінансавыя мерапрыемствы па забеспячэнні патрэб вайны**

## МЯЦЕЖ МІХАІЛА ГЛІНСКАГА

Пачатак XVI ст. для Вялікага Княства Літоўскага быў багаты не толькі на войны і сутыкненні з Маскоўскай дзяржавай і татарамі, але і на ўнутраныя канфлікты. Апафеозам унутрыдзяржаўнага супрацьстаяння ў гэты час стала выступленне ў 1508 г. князя Міхаіла Глінскага, што адыграла неадназначную ролю ў айчыннай гісторыі.

На рубяжы XV–XVI стст. у палітычных колах ВКЛ не існавала выразна акрэсленых магнацка-княжацкіх груповак, падзеленых па этнаканфесійнай прыкмеце. Тым не менш частымі былі спрэчкі, канфлікты, судовыя разбіральніцтвы паміж прадстаўнікамі кіруючай эліты, што вынікала з некалькіх працэсаў. Па-першае, гэта фарміраванне буйных зямельных уладанняў і барацьба за кантроль над імі. Па-другое, абмежаванне ўлады манарха ў ВКЛ і афармленне саслоўных органаў дзяржаўнай улады (паны-рада, сойм) і адміністрацыйнага апарату. Рознае бачанне знешнепалітычных перспектыў дзяржавы таксама ўплывала на непаразуменні паміж асобнымі прадстаўнікамі пануючага саслоўя. У рэчышчы ўзгаданых з'яў узнік унутрыпалітычны канфлікт, які ператварыўся ў антыдзяржаўнае выступленне пад кіраўніцтвам М. Глінскага.

Галоўнай прычынай, якая прывяла да мяцяжу ў 1508 г., быў канфлікт паміж трокскім ваяводам Янам Забярэзінскім і дворным маршалкам Міхаілам Глінскім. Гэта супрацьстаянне мела шэраг аспектаў. Абодва паны сапернічалі за велікакняжацкія зямельныя пажалаванні на Падляшшы, паміж імі таксама ішла барацьба за ўплыў на вялікага князя Аляксандра, а пасля і Жыгімонта. Акрамя таго, Забярэзінскі і Глінскі займалі розныя пазіцыі адносна заключэння уніі з Польшчай – першы быў яе прыхільнікам, а другі падтрымаў Ягелонаў у справе зрыву уніі і захавання спадчынных праў дынастыі на трон ВКЛ. Канфлікт выліўся ва ўзаемныя абвінавачванні ў спробах забойства і дзяржаўнай здрады. Жыгімонт Стары пасля каранацыі імкнуўся пазбавіцца ад уплыву магнатаў і адхіліў братоў Глінскіх ад дзяржаўных пасад, а вырашаць спрэчку Глінскага з Забярэзінскім у судовым парадку не жадаў. Гэта справакавала М. Глінскага на самавольныя дзеянні.

Ва ўмовах вострага супрацьстаяння ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам у пачатку XVI ст. актуальным стала пытанне заключэння уніі з Польшчай з мэтай атрымання вайсковай дапамогі ад палякаў. Аднак польскі бок настойваў на заключэнні дзяржаўнай (рэальнай) уніі, а не на простым пацвярджэнні уніі дынастычнай. Вялікі князь Аляксандр вымушаны быў пайсці на гэты крок і тым самым згубіць для дома Ягелонаў спадчынныя правы на трон ВКЛ. Аднак сканчэнне вайны 1500–1503 гг. змяніла планы дынастыі адносна ратыфікацыі Пётркаўска-Мельніцкай уніі 1501 г. з Польшчай. Венгерскі і чэшскі кароль Уладзіслаў Ягелончык і польскі кароль і вялікі князь літоўскі Аляксандр Ягелончык вырашылі перадаць трон ВКЛ свайму малодшаму брату – глогаўскаму князю Жыгімонту. Перамовы з Жыгімонтам адносна дадзенага плана, а таксама падрыхтоўка прадстаўнікоў велікапольскай і велікакняжацкай магнатэрыі да гэтай акцыі ажыццяўляліся М. Глінскім.

Стаўшы вялікім князем літоўскім, Жыгімонт спрабаваў прытрымлівацца нейтралітэту ў адносінах да магнацкіх спрэчак у ВКЛ, каб не трапіць пад большы ўплыў знаці. У сувязі з гэтым М. Глінскі і яго браты паступова страцілі статус давераных асоб манарха, згубіўшы многія дзяржаўныя пасады. Так, у 1506 г. М. Глінскі быў пазбаўлены пасады дворнага маршалка, а ў наступным годзе мусіў скласці з сябе паўнамоцтвы бельскага намесніка і кіраўніка віленскага манетнага двара. Яго брат Васіль Глінскі страціў у 1507 г. берасцейскае староства і васілішскае намесніцтва. Іван Глінскі хоць і атрымаў пасаду новагародскага намесніка, але толькі пасля пазбаўлення пасады кіеўскага намесніка. Гэта дазволіла іх праціўніку Я. Забярэзінскаму беспадстаўна абвінаваціць М. Глінскага ў забойстве Аляксандра Ягелончыка і намеры ўзурпіраваць уладу ў ВКЛ. М. Глінскі неаднаразова патрабаваў

судовага вырашэння дадзенай справы і апеляваў не толькі да вялікага князя літоўскага як вярхоўнага суддзі ў дзяржаве, але і да замежных уплывовых асоб – караля Чэхіі і Венгрыі Уладзіслава Ягелончыка, былога каралеўскага сакратара Эразма Цёлка, познаньскага ваяводы, якім была вядома роля М. Глінскага ў справе абрання Жыгімонта на трон.

Аднак судовае разбіральніцтва Жыгімонтам не было прызначана. Вялікі князь імкнуўся адцягнуць вырашэнне дадзенай справы і, магчыма, уладзіць канфлікт іншымі метадамі. Але вынікам такой пазіцыі манарха стаў наезд М. Глінскага на ўладанні Я. Забярэзінскага і самасуд над ім.

Пасля забойства Я. Забярэзінскага пад Гародняй у лютым 1508 г. М. Глінскі няўдала спрабаваў выкрасці з Ковенскага замка ганаровага палонніка ВКЛ – хана Заволжскай Арды Шых-Ахмата, а пасля правёў нараду з братамі ў Навагародку. Адтуль, сабраўшы сваіх крэўных і прыхільнікаў, браты Глінскія выехалі ў Тураў – асабістае валоданне М. Глінскага. Стыхійныя змены напрамкаў паходу Глінскіх (Гародня – Коўна – Навагародак – Тураў) сведчаць аб адсутнасці ў іх першапачаткова вызначанай мэты і адзінага плана.

Падчас першага этапу мяцяжу, у лютым – сакавіку 1508 г. М. Глінскі разлічваў прымірыцца з Жыгімонтам, не зрываў адносін з прадстаўнікамі паноў-рады і дыпламатычным шляхам імкнуўся дабіцца прабачэння. Прычым, як Рада, так і вялікі князь гатовы былі хадатайнічаць за М. Глінскага адзін перад адным. Відавочна, дзве лініі перамоў з Глінскім вяліся незалежна, а іх мэтай было заспакаенне мяцежніка і ўтрыманне яго ад магчымых далейшых рэзкіх крокаў. Але па ўсім відаць, што М. Глінскі не давяраў ні пасланнікам Жыгімонта, ні пасольству паноў-рады, таму Глінскія перайшлі на бок вялікага князя маскоўскага Васіля III, які прапанаваў ім сваю абарону і падтрымку.

Унутраны разлад у ВКЛ быў надзвычай добрай нагодай для маскоўскага князя Васіля III, каб аднавіць баявыя дзеянні і працягнуць заваёву ўсходнеславянскіх зямель. Кампанія 1507 г. была безвыніковай, але ўдар па сваім ворагу адразу з двух франтоў, выкарыстоўваючы мяцеж Глінскіх, адкрываў перад Масквой добрыя перспектывы. Таму хуткае прыбыццё маскоўскіх паслоў у Тураў і прапанова падтрымкі былі першачарговай задачай на дадзеным этапе змагання з ВКЛ. Васіль III выслаў паслоў да Глінскага з прапановай дапамогі, «а велел их звати к собе, чтобы ехали к нему служити и с вотчинами». Міхаіл Глінскі разумеў, што пры дапамозе толькі сваіх братоў і прыхільнікаў яго барацьба асуджана на няўдачу і палічыў, што саюз з маскоўскім князем будзе ўзаемавыгаднай справай. Прыняўшы Глінскіх, Васіль III заклікаў іх не проста захаваць і абараніць свае вотчыны, але і за-

хапіць іншыя гарады ВКЛ, для чаго высылаў на дапамогу войскі з Севершчыны. У сувязі з гэтым у Міхаіла Глінскага ўзнік план стварэння ўласнага ўдзела, залежнага ад Масквы. І менавіта з актыўнай дапамогай маскоўскіх войскаў ён звязваў паспяховае ажыццяўленне дадзенай задачы.

У другой палове сакавіка – пачатку жніўня 1508 г. мяцеж ператварыўся з унутранай праблемы ВКЛ у чарговы этап супрацьстаяння дзяржаў Усходняй Еўропы. Акрамя паслоў маскоўскага князя, Глінскія прынялі пасольства з Крымскага ханства і Малдаўскага княства, якія прапаноўвалі дапамогу і падтрымку. М. Глінскі ж імкнуўся выкарыстаць супярэчнасці паміж ВКЛ, ВКМ і Крымскім ханствам у сваіх інтарэсах.

Сумесная дзейнасць мяцежнікаў і маскоўскіх войскаў не дала вялікага плёну. Чакаючы дапамогі з Масквы, М. Глінскі замацаваўся толькі ў Мазыры, пакінуўшы Тураў. Аднак аб заваяванні горада казаць нельга, бо мазырскім дзяржаўцам быў муж стрыечнай сястры Глінскіх Якуб Івашэнцавіч, які далучыўся да мяцяжу. Больш за два месяцы М. Глінскі знаходзіўся ў нязначным мястэчку Глуск – ад пачатку красавіка амаль да сярэдзіны чэрвеня. У гэты час ён не прадпрымаў аніякіх вайсковых крокаў, а працягваў перамовы з Васілём III аб узгадненні планаў дзеянняў, а таксама прыняў пасла малдаўскага гаспадара. І толькі з падыходам ваяводы В. Шамячыча зрушыў з месца. Гэта кажа аб няўпэўненасці самога М. Глінскага ў сваіх сілах і нежаданні рызыкаваць. У чэрвені пачалося адступленне маскоўскіх войскаў ва ўсходнім кірунку ў сувязі са зборам паспалітага рушэння ВКЛ і яго маршам з Навагародка. Слуцк, Бабруйск, Менск, Барысаў, Орша, Крычаў і Мсціслаў – гарады, на якія была скіравана агрэсія маскоўскіх войскаў і мяцежнікаў, захоплены не былі. Дзякуючы падтрымцы асобных прадстаўнікоў роду Друцкіх мяцежнікі толькі на некалькі дзён затрымаліся ў Друцку.

Падчас трэцяга этапу мяцяжу ў канцы жніўня – лістападзе 1508 г. для ВКМ вайсковая кампанія набыла ўжо абарончы характар. М. Глінскі, ведаючы аб вельмі напружаных адносінах дынастыі Ягелонаў з Габсбургамі, падштурхнуў маскоўскага князя да заключэння саюзу з імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі Максіміліянам І. Падтрымка апошняга павінна была, па разліках М. Глінскага, заахвоціць Васіля III да новых актыўных дзеянняў на заходнім напрамку. Аднак вялікі князь маскоўскі прыняў рашэнне аб згортванні ваенных дзеянняў. У якасці выканання свайго абяцання дапамагчы Глінскім, Васіль III вылучыў нязначнае падмацаванне М. Глінскаму з мэтай утрымаць ужо толькі Тураў і Мазыр. Апошні з'яўляўся адзіным горадам, які з часу пераходу Глінскіх у маскоўскае падданства заставаўся пад іх кантролем. Менавіта Мазыр мэтазгодна называць цэнтрам мяцяжу.

У вайне 1507–1508 гг. ні адзін з бакоў не мог дасягнуць пастаўленых перад сабою мэт. Васіль III не здолеў адарваць ад ВКЛ ні Смаленска, ні гарадоў Беларускага Падняпроўя, а Жыгімонт I не змог замацавацца ў Севершчыне, не маючы істотнай падтрымкі Лівонскага ордэна і крымскіх татар. Пасля перамоў 8 кастрычніка вялікім князем маскоўскім было падпісана «вечное докончанье», якое фактычна захавала status quo і пакінула межы, што склаліся паміж ВКМ і ВКЛ у выніку папярэдніх войнаў 1492–1494 гг. і 1500–1503 гг. ВКЛ атрымала толькі горад Любеч і некалькі малых валасцей. Паводле асобнай дамоўленасці Васіля III з Жыгімонтам I у канцы восені 1508 г. Глінскія атрымалі магчымасць выезду ў Маскву.

Паражэнне мяцяжу прадвызначыла развіццё далейшых адносін ВКЛ і ВКМ. Міхаіл Глінскі, які апынуўся ў Маскве, не адмовіўся ад планаў заваявання ў Жыгімонта I усходніх «ускраін» ВКЛ і гарадоў Палесся. Ён стаў адным з ініцыятараў стварэння антыягелонскай кааліцыі ў 1510-я гг. і сувязным звяном у кантактах Масквы са Свяшчэннай Рымскай імперыяй, Саксоніяй і Тэўтонскім ордэнам пры падрыхтоўцы новай вайны супраць ВКЛ, што пачалася ў 1512 г. Дзякуючы намаганням М. Глінскага пад уладу вялікага князя маскоўскага ў 1514 г. перайшоў Смаленск.

Пры характарыстыцы і разуменні бурлівых палітычных падзей 1508 г. важным момантам з'яўляецца даследаванне сацыяльнай базы выступлення князёў Глінскіх. Гэта задача з'яўляецца мэтазгоднай і вырашальнай, нягледзячы на тое, што поўнага і дакладнага спісу мяцежнікаў скласці немагчыма – як па прычыне абмежаванай колькасці крыніц, так і таму, што на старонкі дакументаў і летапісаў трапілі толькі найбольш значныя асобы. Сацыяльны склад мяцежнікаў быў моцна абмежаваны. Перш за ўсё, гэта былі родныя і слугі князёў Глінскіх, пэўная кліентэла. Аслабленне пазіцый патрона роду, князя М. Глінскага, і яго братоў азначала і страту магчымасці ўзбагачэння і прасоўвання па службе для іх суродзічаў, слуг і прыхільнікаў. Акрамя таго, выступленне падтрымала група князёў, паходзячых ад Рурыкавічаў, якія да XVI ст. раздрабіліся і збяднелі. Шукаючы сродкі да існавання, яны мусілі або служыць пры двары гаспадара, або наймацца да магнатэрыі. Некаторыя ж бачылі выйсце ў эміграцыі ў ВКМ, спрабуючы там займець землі і пасады. Князі – удзельнікі мяцяжу М. Глінскага – як раз гэтымі мэтамі і кіраваліся. З крыніц вядомы 52 мяцежнікі, з якіх па меншай меры 26 адносіліся да роду Глінскіх, іх крэўных, слуг і кліентэлы. Па сваім характары выступленне было не паўстаннем, а менавіта мяцяжом з уласцівымі яму вузкай сацыяльнай базай, стыхійным пачаткам, суб'ектыўнымі прычынамі і мэтамі.

У позніх хроніках XVI ст. М. Глінскі паўстае як правадыр і абаронца праваслаўнай шляхты ВКЛ. Гэта дазволіла некаторым прадстаўнікам расійскай і савецкай гістарыяграфіі сцвярджаць, што мяцеж 1508 г. стаў вынікам барацьбы канфесій у дзяржаве. Аднак сам М. Глінскі падчас узнятага ім выступлення з'яўляўся каталікам. У той жа час ён спрабаваў прадставіць сябе як абаронцу праваслаўнага насельніцтва, якому нібыта пагражала гвалтоўнае акаталічванне.

Разглядаючы пытанне рэлігійных матываў у выступленні М. Глінскага, трэба адзначыць, што рубеж XV–XVI стст. стаў даволі спрыяльным для праваслаўнай канфесіі ў ВКЛ. У такіх умовах агітацыйная рыторыка М. Глінскага, накіраваная праваслаўнай знаці, губляла актуальнасць. Рэлігійныя і этнічныя матывы не адыгралі рэальнага значэння ў мяцежнікаў у 1508 г. Часта іх дзейнасць мела рабаўнічы характар у дачыненні да насельніцтва ВКЛ. Па словах самога Міхаіла Глінскага, яго прыхільнікі разам з маскоўскімі войскамі «везде огонь пускали и шкоды чинили, и полону на колкос десять тысяч взяли…». Тое, што выступленне М. Глінскага не было праявай канфесійнага канфлікту, пацвярджаюць і акты раздачы маёнткаў мяцежнікаў. Іх захавалася ў Метрыцы ВКЛ больш за 40. Пераважную большасць зямель атрымалі прадстаўнікі «рускай» (беларускай і ўкраінскай) шляхты і праваслаўных князёў, якія нярэдка паходзілі з тых самых паветаў, што і мяцежнікі, і нават удзельнічалі ў барацьбе з імі.

Асабістае стаўленне М. Глінскага да канфесійнага пытання можна назваць меркантыльным. Яно выкарыстоўвалася ім у палітычных, а дакладней сказаць – у асабістых мэтах. Пра тое, якія мэты ставіў перад сабой М. Глінскі, яскрава сведчыць яго ліст, напісаны імператару Свяшчэннай Рымскай імперыі ў 1509 г., калі ў Глінскага ўзнікла надзея вярнуцца ў ВКЛ: «І вось мы просім прабачэння ў гэтай справе ў Вашай Найсвятлейшай Вялікасці (Максіміліяна І Габсбурга. – *Аўт.*), у святой рымскай царквы і ўсіх вернікаў... Каб з Божаю дапамогай вырашыць гэтую справу, сардэчна просім... хадайнічаць перад каралём Жыгімонтам І, каб вярнуў адабраныя ў нас, братоў нашых і сяброў усялякую маёмасць, вотчыны, замкі, гарады, мястэчкі, землі і вёскі і іншыя пасады, а таксама ўзнавіў нас у ранейшай годнасці, пачцівасці і становішчы і пацвердзіў гэта граматамі».

Паражэнне выступлення і адсутнасць шырокай падтрымкі зáклікаў М. Глінскага зацвердзілі палітычную лінію, накіраваную на кансалідацыю праваслаўнай і каталіцкай частак знаці ВКЛ і паскорылі працэс рэальнага ўраўнавання дзвюх канфесій у дзяржаве. Да ўдзелу ў дзяржаўным кіраўніцтве стала больш актыўна прыцягвацца «руская» праваслаўная знаць.

Уладныя колы ВКЛ усвядомілі, што пры няўважлівым да яе стаўленні яна можа стаць дэструктыўнай сілай у дзяржаўным арганізме. Слабая падтрымка выступлення Глінскага ўнутры дзяржавы паказала, што захады Аляксандра Ягелончыка па саслоўнай кансалідацыі двухэтнічнай і двухканфесійнай знаці былі ўспрыняты як сталы і незваротны працэс. Жыгімонт І пераканаўся ў гэтым на ўласным вопыце, што толькі зацвердзіла дадзеную ўнутрыпалітычную лінію. Разам з тым паражэнне М. Глінскага, яго ўцёкі ў Маскву і раздача зямель мяцежнікаў у пэўнай ступені справакавалі ў ВКЛ новы віток магнацкіх канфліктаў на эканамічнай глебе.

## АРГАНІЗАЦЫЯ ВАЙСКОВАЙ СПРАВЫ І ФІНАНСАВЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ПАТРЭБ ВАЙНЫ

Перыяд працяглай барацьбы, у які ўступіла ВКЛ з канца XV ст. патрабаваў вялікай напругі ўсіх вайсковых і матэрыяльных рэсурсаў, што знайшло адлюстраванне ў шэрагу мерапрыемстваў цэнтральнай улады па паляпшэнні абароназдольнасці дзяржавы і арганізацыі вайсковай павіннасці. Усе яны зыходзілі ад імя вялікага князя, паноў-рады і вальнага сойма.

Арганізацыя вайсковай справы ў ВКЛ да канца XV ст. не рэгулявалася заканадаўствам і кожны маёнтак выстаўляў на вайсковую службу ратнікаў паводле звычая або ўмоў яго трымання. Аднак у новай сітуацыі такі парадак страціў сваё значэнне, бо на практыцы адбыліся колькасныя і якасныя змены ў характарыстыцы прыватнаўласніцкіх маёнткаў. Таму ў перыяд актыўнага знешнепалітычнага супрацьстаяння ўзнікла патрэба ва ўдасканальванні вайсковай справы і яна пачала вырашацца.

У 1502 г. на сойме ў Навагародку вялікі князь разам з прэлатамі і панамі-радай вырашылі, каб надалей усе князі, паны і зямяне шляхта выстаўлялі на вайну з кожных 10 сялянскіх службаў (адзінкі абкладання сялян павіннасцямі, якія знаходзіліся ва ўладанні і карыстанні двух і болей двароў) аднаго ратніка на кані, у зброі, з дзідай. Гэта норма аказалася своечасовай, захаваўшыся пры фарміраванні паспалітага рушэння на доўгія дзесяцігоддзі. Аднак пасля Смаленскай вайны 1512–1522 гг. у сувязі з узмацненнем паўднёвай пагрозы было вырашана яе пераглядзець. На Віленскім сойме 1529 г. пастанавілі:

- выстаўляць аднаго ратніка не з 10, а з 8 сялянскіх службаў;
- у тых маёнтках, дзе будзе толькі 8 сялянскіх службаў, на вайну павінен ехаць асабіста сам гаспадар;

• калі ў такім маёнтку заставалася толькі жанчына-ўладальніца, то яна павінна выставіць замест сябе «пахолка добрага» (слугу);

• той шляхціц, у якога сялян было менш або зусім не было, павінен ехаць на вайну «водле можнасці своее».

Сойм прыняў дадатковае рашэнне, паводле якога ў лік сялянскіх службаў побач з цяглымі павінны былі ўключацца слугі і даннікі, акрамя баяр і месцічаў гаспадарскіх. Новая норма ўводзілася тэрмінам на дзесяць гадоў, пасля чаго кожны шляхціц павінен быў служыць як і раней.

Напрыканцы жыцця Жыгімонта Старога на Берасцейскім сойме 1544 г. увялі новую ўставу тэрмінам на восем гадоў, якая патрабавала выстаўляць з кожных дзевяці сялянскіх службаў аднаго ратніка, супраць чаго запратэставалі многія саслоўі, бо палічылі яе вельмі цяжкай. Віленскі сойм 1554 г. яе захаваў і паводле розных крыніц і меркаванняў даследчыкаў, дазволіў уключыць у лік сялянскіх службаў ад аднаго да чатырох сялянскіх дымоў.

Каб законы працавалі, патрабавалася адпаведная работа па арганізацыі іх выканання. Таму ўжо на сойме 1507 г. было вырашана перыядычна праводзіць пописы (перапісы) земскіх маёнткаў і ў залежнасці ад іх вынікаў вызначаць колькасць выстаўляемых на вайну ратнікаў. Гэту работу павінны былі праводзіць самі землеўладальнікі і пад прысягай даводзіць звесткі да гаспадара. Цяжка сказаць, наколькі добрасумленна яны выконвалі дадзеную задачу. Сойм 1528 г. вырашыў увесці новы парадак правядзення земскіх попісаў. Для гэтага ў кожным павеце дзяржаўца выбіраў двух шляхціцаў «годных веры», якія разам з дзякам павінны былі аб'ехаць усе маёнткі і зрабіць попіс іх уладальнікаў, узяўшы пад прысягай звесткі адносна колькасці сялянскіх службаў. Потым яны складалі «рэестр» (спіс), які падавалі ваяводзе. У велікакняжацкіх маёнтках гэту працу рабілі асобныя пісары, якіх пасылалі з цэнтра.

Вынікамі такой работы стаў першы агульнадзяржаўны попіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 г., пасля чаго быў складзены рэестр князёў, паноў, баяр, шляхты і тых «почтаў» (вайсковых атрадаў), з якімі яны павінны былі ехаць на вайну. У ім былі зарэгістраваны 19 844 ратнікі, з якіх 11 214 складала шляхта, а 7757 – почты магнатаў. Аднак гэта была не ўся земская служба дзяржавы, бо тут не ўлічваліся харугвы з Падляшша, Валыні, Падолля і Кіеўшчыны. Польскі даследчык Т. Корзан падаваў звесткі, што ў 1529 г. ВКЛ магло выстаўляць 24 446 ратнікаў паспалітага рушэння, а папскі нунцый Ругіеры лічыў, што ў XVI ст. дзяржава мела магчымасць накіроўваць на вайну да 70 тыс. ратнікаў, але добра было, калі збіралася толькі палова. Акрамя чыста вайсковага значэння, попіс 1528 г. аказаў вялікі ўплыў на кансалідацыю шляхецкага салоўя, а затым стаў своеасаблівай шляхецкай кнігай у ВКЛ, дзе былі зафіксаваны асноўныя роды.

Адначасова з попісам земскіх маёнткаў на соймах распрацоўваліся жорсткія пастановы супраць тых, хто ўхіляўся ад вайсковай службы. У 1507 г. была прынята «ўхвала», паводле якой:

- той, хто не з'явіцца на вайну ў вызначаны тэрмін, будзе карацца стограшовым штрафам;
- хто не з'явіцца праз тыдзень, спадзеючыся на багацце сваё і «упором» сваім, той «шыю» траціць;
- хто без дазволу паедзе з вайны, таму таксама прызначаецца смяротнае пакаранне.

Аднак несвоечасовае з'яўленне на месца збору паспалітага рушэння стала такой распаўсюджанай з'явай, што Гарадзенскі сойм 1522 г. быў вымушаны замяніць смяротнае пакаранне канфіскацыяй маёнтка і стратай шляхецкай годнасці. Маёнткі аддаваліся гетману, які меў магчымасць узнагародзіць тых, хто вызначыўся ў баях.

Асноўнай прычынай несвоечасовай яўкі шляхты на вайну было тое, што паводле вайсковага заканадаўства кожны павінен быў прыехаць на месца збору ў вызначаны тэрмін з запасам ежы і вайсковага рыштунку на адзін месяц. Калі ж вайна зацягвалася, то праблему з правіянтам трэба было вырашаць ці закупкай неабходнага ў маркітантаў, якія заўсёды ішлі за войскам, ці беручы гэта ў сваім уласным маёнтку. Статут 1529 г. у 14-м артыкуле II раздзела асобна запісаў: «Кому бы не достало, будучи на войне, стацеи и самому естли або на кони его, тогды мает тот с вижом гетманским где ехати або пойти и взяти с потребу живности собе и на кони; а то мает заплатити подлуг уставы положоное. А дрова мають брати, где будут стояти; нижели домов разбирати и плотов жечи, и ставов волочити ани спускати, ани жит и ярин топтати и травити не мають. А если бы хто таковую шкоду вчинил, тогда мает гетман наш таковых в ланцуг сажати, а предся оный тую шкоду мает отправовати и кгвалт платити».

Практыка паказала, што паспалітае рушэнне, з'яўляючыся добрай вайсковай адзінкай, доўга знаходзіцца на вайне не магло, і ВКЛ з часоў Аляксандра і Жыгімонта Старога Аўгуста па прыкладзе Польшчы пачало звяртацца да найму жаўнераў. У адрозненне ад шляхціцаў, якія падчас працяглых войнаў нярэдка ехалі па дамах з-за патрэбы ў прыпасах і грошах, наёмнікі былі больш дысцыплінаванымі і дзейнічалі прафесійна.

Аднак ім трэба было добра плаціць. У пачатку XVI ст., напрыклад, конны жаўнер каштаваў 10 злотых у квартал, пешы – 5–6 злотых, ротмістр і паручнікі атрымоўвалі па 10 злотых за кожныя 30 асоб службовых. Для гэтага патрэбна была значная сума грошай і вялікі князь спачатку быў вымушаны выстаўляць у «заставу» (залог) свае маёнткі. Такая практыка

пачалася ўжо пры Аляксандры, але асабліва пашырылася пры Жыгімонце, які пасля падзення Смаленска быў вымушаны выставіць у заставу ўсе свае маёнткі. Справа пагоршылася настолькі, што да 1522 г. усе гаспадарскія маёнткі і мыта «в долзех зашлі» і калі з дапамогай гэтага былі вырашаны наспелыя задачы, дзяржаўны скарб прыйшоў у поўны заняпад. Трэба было шукаць выйсце са складанага становішча і яго знайшлі ў сістэме надзвычайных падаткаў, якімі пачалі абкладаць усіх жыхароў ВКЛ.

Адпаведны прэцэдэнт з'явіўся яшчэ ў часы Казіміра, калі Віленскі сойм 1473 г. пастанавіў даць на карысць вялікага князя па шэсць пражскіх грошаў з аднаго плуга. Гэты крок быў падказаны Польшчай, дзе шляхецкія маёнткі былі пазбаўлены ад выплаты падаткаў, але кожны год давалі каралю па два грошы з лану зямлі ў адзнаку свайго падданства. Шляхта ў ВКЛ па прывілеі 1447 г. была вызвалена ад усіх выплат у дзяржаўны скарб. Барацьба з Маскоўскай дзяржавай і крымскімі татарамі, якая пачалася ў канцы XV – пачатку XVI ст., прымусіла кіруючыя колы княства больш уважліва аднесціся да гэтай праблемы, і на сойме 1507 г. паны радныя і зямяне шляхта ўхвалілі на карысць вялікага князя надзвычайны падатак – сярэбшчыну, які браўся ў памерах: з валовай сахі – 6 гр.; з конскай сахі – 3 гр.; з тых, хто не меў цягла – 3 гр.

У 1514 г. Віленскі сойм для найму 7000 польскіх жаўнераў увёў пагалоўшчыну ў памерах: 1 гр. з селяніна; 2 гр. з баярына; 30 гр. з урадніка. Новыя падаткі былі прызначаны ў 1516, 1518 і 1519 гг. Усяго ж з 1473 па 1566 г. збор сярэбшчыны і пагалоўшчыны прызначаўся 15 разоў і выбіраўся на працягу 26 гадоў. Выплочваць іх павінны былі землеўладальнікі, дзяржаўныя сяляне, непрывілеяваныя мястэчкі, гарады, якія валодалі палявымі валокамі. Памер падаткаў кожны раз вызначаўся асобна і складаў на працягу XVI ст. ад 5 да 48 гр. Акрамя гэтага, прызначалася пагалоўшчына для яўрэяў, татар, цыганоў, гандляроў-шатландцаў.

У выніку атрымалася, што з надзвычайных падаткаў сярэбшчына і пагалоўшчына ператварыліся ў пастаянныя, хоць і ўхваленыя вальным соймам, а гэта пазбавіла землеўладальнікаў матэрыяльных каштоўнасцей, якія былі вызначаны прывілеем 1447 г. Неабходнасць забеспячэння абараназдольнасці дзяржавы непасрэдна ўплывала на працэс абмежавання ўлады манарха і фарміраванне сойма як органа цэнтральнай улады. Для канцэнтрацыі матэрыяльных сродкаў на вайсковыя патрэбы неабходна была згода прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя, розных маёмасных груп і розных геаграфічных рэгіёнаў. Цяжар вайны ўскладаўся на землеўладальнікаў як непасрэдна (праз паспалітае рушэнне), так і ўскосна (праз збор падаткаў). Удзел князёў, паноў, баяр, зямян у прынятцці рашэнняў па пытаннях вайны і міру і фінансавых

пытаннях стаў неабходнай умовай функцыянавання дзяржаўнага апарату. Адпаведна, паўнамоцтвы шляхецкага сойму пашыраліся, а аднаасобныя паўнамоцтвы манарха звужаліся.

Калі казаць пра арганізацыйна-тактычныя характарыстыкі войска ВКЛ, неабходна адзначыць, што найбольш дробнай вайсковай адзінкай з'яўлялася кап'ё, якое ў класічным выглядзе складалася з аднаго цяжкаўзброенага капійніка (вершніка ў поўным рыцарскім рыштунку з кап'ём) і двух стральцоў. Аднак на практыцы колькасны склад кап'я мог быць розным – гэта залежала ад матэрыяльных магчымасцей землеўласніка, які выконваў вайсковую службу і выстаўляў у паспалітае рушэнне свой вайсковы атрад, які даволі часта і лічыўся кап'ём ці почтам. У яго маглі ўваходзіць ці залежныя ад шляхціца людзі, ці нанятыя ім за грошы. Коп'і аб'ядноўваліся ў харугвы, якія колькасна таксама былі рознымі ў залежнасці ад матэрыяльных і дэмаграфічных асаблівасцей паветаў – ад 30 да 200 чалавек. Вылучаліся харугвы земскія, родавыя і надворныя.

Аснову войска складала кавалерыя. У першай палове XVI ст. адбываўся працэс яе аблягчэння, і ў складзе вылучаліся лягчэйшыя і больш мабільныя за цяжкаўзброеных капійнікаў гусары, казакі, кашубы. Усё часцей, пачынаючы з XVI ст., атрады ўзгаданых вершнікаў наймаліся за мяжой. У прыватнасці, з'яўленне гусараў у ВКЛ трэба звязаць з дзейнасцю М. Глінскага. Першы атрад гусараў быў завербаваны ім у 1500 г. падчас побыту ў Венгрыі пры двары Уладзіслава Ягелончыка. Пяхота як асобны род войскаў у той час мела другаснае значэнне, хоць сярод атрадаў прафесійных наёмнікаў іх была даволі значная колькасць.

Як бачым, у першай палове XVI ст. ВКЛ сутыкнулася з шэрагам унутрыпалітычных праблем непасрэдна звязаных з міжнароднымі адносінамі ва Усходняй Еўропе. Войны з Маскоўскім княствам і татарамі выклікалі неабходнасць удасканальвання вайсковай арганізацыі для падтрымання абароназдольнасці дзяржавы і пераходу ад сярэднявечнай сістэмы шляхецкай апалчэнскай службы да прафесійнага войска новага часу, выдаткі на ўтрыманне якога размяркоўваліся сярод насельніцтва дзяржавы паводле рашэння саслоўна-прадстаўнічага органа ўлады – сойма.

# 21 САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У XV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

- **Развіццё сельскай гаспадаркі**
- **Феадальнае землеўладанне**
- **Сялянскае землекарыстанне і катэгорыі сялян**
- **Станаўленне фальварачнай гаспадаркі**
- **Аграрная рэформа каралевы Боны Сфорцы**
- **Гарады, мястэчкі, гандаль**

## РАЗВІЦЦЁ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Перыяд XV – першай паловы XVI ст. у сацыяльна-эканамічным развіцці характарызуецца рэарганізацыяй гаспадарчай сістэмы, узмацненнем феадальнай залежнасці сялян, ростам буйнога землеўладання, уключэннем беларускіх зямель у сферу еўрапейскіх эканамічных адносін, пашырэннем грашовага абарачэння, хуткім развіццём гарадоў.

Як і раней, аснову эканамічнага развіцця складала сельская гаспадарка. Найбольшую ролю адыгрывала земляробства. У гэты перыяд насельніцтва выкарыстоўвала розныя сістэмы і спосабы захавання ўрадлівасці глебы і павелічэння ўраджайнасці культур. Выкарыстоўваліся абложная, падсечна-агнявая (лядная) і папарная сістэмы землекарыстання. Падсечна-агнявая сістэма пашырала плошчы ворыўных зямель за кошт расчысткі лясных участкаў, прыдатных для сельскагаспадарчай дзейнасці. Ачышчаныя ад дрэў і хмызняку дзялянкі (іх называлі «ляда», «розробки») давалі добрыя ўраджаі на працягу некалькіх гадоў. У якасці ўгнаення выкарыстоўвалі попел. Найбольш багатыя попелам участкі засявалі жытам і пшаніцай, а на горшых

высявалі авёс і ячмень. У XV – першай палове XVI ст. інтэнсіўна асвойваліся незанятыя землі, пусташы, пашыраліся плошчы старых паселішчаў, узнікалі новыя вёскі. Ачышчаныя ад лесу ўчасткі звычайна далучалі да старых сельскагаспадарчых зямель або засноўвалі каля іх новыя паселішчы.

Папарная сістэма земляробства была прадстаўлена двухполлем і трохполлем. Паступова двухполле выцяснялася трохпольнай сістэмай. Першапачаткова яна мала адрознівалася ад двухпольнай, таму што поле падзялялі на тры (азімыя, яравыя, папар) вельмі нярОўныя па плошчы часткі і агульна засявалі не дзве трэці раллі, а палову ці нават менш. У XV ст. больш эфектыўны рэгулярны трохпольны севазварот істотна пашырыўся, але канчаткова яго замацаванне адбылося пасля аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст.

Найбольш распаўсюджанымі былі збожжавыя культуры: жыта (пераважала азімае), пшаніца, авёс, ячмень, проса, грэчка. У першай палове XVI ст. у дзяржаўных і буйных феадальных гаспадарках заходніх беларускіх зямель значна пашырыліся плошчы пад пшаніцу, што абумоўлівалася павелічэннем вывазу збожжа ў Еўропу. Ураджайнасць зерневых культур у сярэднім складала «сам»-3 – «сам»-4, або каля чатырох цэнтнераў з гектара, але ўраджаі былі нестабільнымі. Таксама паўсюдна вырошчвалі бабовыя, хмель, каноплі, лён, разнастайную агародніну (капусту, рэпу, буракі, моркву, цыбулю, часнок, рэдзьку, агуркі, мак) і садавіну (яблыкі, вішні, слівы).

Асноўныя земляробчыя прылады працы заставаліся пераважна драўлянымі: драўляная саха з жалезнымі нарогамі, барана-сукаватка, пляцёная барана, драўляная акаваная рыдлёўка. Выкарыстоўвалі жалезныя матыкі, сярпы, косы-гарбушы і іншыя прылады. Працоўнай цяглавай жывёлай былі валы і коні. У XVI ст. для апрацоўкі раллі на захадзе Беларусі звычайна карысталіся двухваловымі запрэжкамі, а на ўсходзе пераважалі аднаконныя.

Жывёлагадоўля з’яўлялася другой па значнасці галіной сельскай гаспадаркі. Валы і коні выкарыстоўваліся для перавозкі грузаў і апрацоўкі зямлі. Буйная і дробная рагатая жывёла, свінні, свойскія птушкі не толькі пашыралі і рабілі больш стабільным харчовы рацыён насельніцтва, але таксама забяспечвалі яго пухам, пер’ем, шкурамі. Жывёлагадоўляй, як і земляробствам, у той ці іншай ступені займаліся і жыхары гарадоў. Неабходна адзначыць нізкую прадукцыйнасць тагачасных парод свойскай жывёлы. Ужыванне малочнай прадукцыі насельніцтвам было нязначным.

Заняткі сельскай гаспадаркай насельніцтва шырока дапаўняла разнастайнымі промысламі. Іх распаўсюджанне абумовілі вялікія лясныя абшары, шматлікія рэкі, азёры Беларусі і малазаселенасць тэрыторыі, таму важнае гаспадарчае значэнне захоўвалі паляванне, рыбалоўства, бортніцтва, збор лясных ягад і інш.

На беларускіх землях атрымаў значнае развіццё промысел па тэрмічнай перапрацоўцы драўніны. Для гэтага выкарыстоўвалі «буды попельныя» – спецыяльныя смалакурныя печы, у якіх смалістую драўніну, карчы перапрацоўвалі на смалу, дзёгаць, вугаль, попел, паташ і іншыя рэчывы. Яны ішлі на розныя рамесныя справы, а таксама масава вывозіліся за мяжу. З лесам быў звязаны і сплаўны промысел. Па рэках (Заходняя Дзвіна, Днепр, Нёман, Буг і іх прытокі) сплаўлялі плытамі будаўнічы лес, клёпкі, бочкі і іншыя вырабы і матэрыялы. Прамысловымі заняткамі з'яўляліся нарыхтоўка дроў, распілоўка драўніны, сталярная справа.

Старажытным збіральніцкім промыслам – нарыхтоўкай ягад, грыбоў, арэхаў, траў, – займаліся традыцыйна жанчыны і дзеці. Але ўжо ў канцы XV – першай палове XVI ст. такія заняткі патрабавалі спецыяльнага дазволу феадала, княжацкай адміністрацыі. Статут 1529 г. даваў права затрымліваць парушальнікаў і адымаць усё нарыхтаванае падчас збору.

Паляўнічы промысел прыносіў дадатковае харчаванне, а таксама футра. Каштоўнае футра пастаўлялася на ўнутраны і знешні рынкі. Відавочна, што гэты промысел строга кантраляваўся як на велікакняжацкіх, так і на прыватнаўласніцкіх землях. Заканадаўствам прадугледжваліся розныя віды пакаранняў у залежнасці ад каштоўнасці дзічыны за браканьерства, разбурэнне гнёздаў і іншыя парушэнні. Рыбалоўны промысел быў таксама распаўсюджаным, і займацца ім жыхары маглі амаль без абмежаванняў. Звычайна ў якасці платы ўладальніку зямлі аддавалі частку ўлову.

Лясы, як і большасць зямель, належалі дзяржаве (вялікаму князю) і феадалам. Права лясных уваходаў было старажытным для сялян і шляхты і да XVI ст. не рэгламентавалася. Звычайна ад вёскі да лесу вяла толькі адна дарога. Пракладаць іншыя сцежкі і ствараць новыя ўваходы ў лес строга забаранялася, бо гэта ўскладняла кантроль. Асобныя воласці ў XV – першай палове XVI ст. яшчэ мелі ў сваім распараджэнні вольныя лясы, «ловы лосиныи», «бобровыи гоны», куды не дазвалялася заходзіць дзяржаўцам і іх служкам, але паступова ўсе гэтыя землі перайшлі пад уладу дзяржавы.

Асобнае месца сярод промыслаў мела бортніцтва. Мёд і мядовыя напоі спажывалі, прадавалі, мянялі, вывозілі за мяжу. Паводле падлікаў даследчыкаў, у пачатку XVI ст. на беларускіх землях налічвалася каля 1 млн бортняў. Да канца XV ст. пераважала традыцыйнае бортніцтва, калі пчол разводзілі ў дуплах дрэў («бортныя дрэвы»), а ў XVI ст. пашыралася пчалярства. Участкі лесу, дзе знаходзіліся бортныя дрэвы ці калоды («земля бортная», «поколодныя краи») юрыдычна не адрозніваліся ад ворнай зямлі і іх маглі прадаваць, купляць, аддаваць у пасаг і інш., паведаміўшы аб гэтым ураду. У Вялікім Княстве Літоўскім была пашырана

першасная перапрацоўка бортніцкай прадукцыі. Некаторыя сяляне мелі нават свае васкабойні, але звычайна яны былі валасныя, гарадскія, прыватнаўласніцкія. У XV ст. – пачатку XVI ст. шмат сялян-даннікаў сплочвалі падаткі пераважна мёдам, воскам, футрам і інш. Аб значнасці бортніцтва ў эканамічным жыцці княства сведчыць той факт, што ў XVI ст. амаль ва ўсіх заканадаўчых актах змяшчаліся нормы, якія тычыліся гэтага промыслу: вайсковыя ўставы, Устава на валокі 1557 г., Лясная ўстава 1567 г., статуты, валасныя граматы і інш.

Шматлікія промыслы дапаўняліся сельскімі рамёствамі. Ткацтва, цяслярства, бондарства, гарбарства, ганчарства і іншыя заняткі былі шырока распаўсюджаны. Сельскія рамеснікі працавалі пераважна на заказ і задавальнялі попыт мясцовага насельніцтва, але частку вырабаў прадавалі ў гарадах. Таксама на бліжэйшых рынках сельскія жыхары маглі набываць пэўныя тавары, прылады, посуд. Па-ранейшаму большасць насельніцтва, асабліва сяляне, імкнуліся вырабляць пераважную колькасць неабходных рэчаў сіламі сваёй сям'і. Натуральная гаспадарка захоўвала пануючы характар.

## ФЕАДАЛЬНАЕ ЗЕМЛЕЎЛАДАННЕ

Галоўнае багацце грамадства – зямля – канцэнтравалася ва ўласнасці дзяржавы, свецкіх феадалаў, царквы. Нязначная частка зямлі належала гарадам і гараджанам. У XV–XVI стст. адбылося ўмацаванне феадальнага землеўладання. Правы землеўладальнікаў набылі юрыдычнае афармленне.

Буйнейшым землеўладальнікам выступала дзяржава. Вярхоўным уладальнікам дзяржаўных зямель з'яўляўся вялікі князь – гаспадар. Дзяржаўныя землі мелі рознае прызначэнне. Так, з іх вылучаліся гаспадарскія двары – адміністрацыйныя ці адміністрацыйна-гаспадарчыя цэнтры валасцей або ўладанняў вялікага князя, колькасць якіх павялічвалася з умацаваннем феадальных адносін. Новыя двары засноўваліся на пустуючых незанятых землях. Усімі справамі кіравалі прадстаўнікі велікакняжацкай адміністрацыі – ураднікі, цівуны. Спачатку гаспадарчыя двары былі падобныя на гаспадарку свецкіх феадалаў. Іх дзейнасць накіроўвалася на забеспячэнне гаспадара і яго сям'і, велікакняжацкага двара, патрэбы дзяржавы. У такіх дварах спачатку працавала выключна велікакняжацкая чэлядзь, а ў далейшым да працы прыцягваліся сяляне бліжэйшых вёсак, якія паступова траплялі ў залежнасць. З другой паловы XV ст. у гаспадарчых дварах пашыралася таварная вытворчасць, ствараліся фальваркі. Тэрытарыяльна большая колькасць гаспадарчых двароў знаходзілася на захадзе Вялікага Княства Літоўскага – на землях сучаснай Літвы і Заходняй Беларусі.

Другую, больш значную частку дзяржаўных зямель складалі воласці – адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, якія аб'ядноўвалі сельскія абшчыны некалькіх паселішчаў. Колькасць такіх паселішчаў у складзе воласці вагалася ад 10 да 30 ці болей. Больш значныя па тэрыторыі воласці да сярэдзіны XVI ст. знаходзіліся на ўсходзе княства. Сярод іх вылучаліся Азярышчанская і Усвяцкая Віцебскага павета; Магілёўская Аршанскага павета; Барысаўская, Любашанская, Свіслацкая, Бабруйская на Бярэзіне; Крычаўская, Прапойская, Чачэрская ў Пасожжы; Гомельская, Рэчыцкая, Мазырская на поўдні. Кіраваць такімі валасцямі вялікі князь звычайна прызначаў намеснікаў з ліку буйных феадалаў. У XV ст. намеснікамі Азярышчанскай воласці прызначаліся феадалы з роду Валовічаў, Кішкаў, Радзівілаў. Вялікія князі Аляксандр і Жыгімонт Стары перадавалі Азярышчанскую воласць ва ўладанне сваіх жонак Алены Іванаўны і Боны адпаведна. З ліку буйных феадалаў прызначаліся велікакняжацкія намеснікі і ў Барысаўскую воласць, даходы з якой накіроўваліся на службовыя выдаткі Віленскага ваяводства. Невыпадкова сярод яе намеснікаў у першай палове XVI ст. былі Альбрэхт Гаштольд, Ян Глябовіч, Мікалай Радзівіл Чорны, якія адначасова з'яўляліся і віленскімі ваяводамі.

У воласць, акрамя гаспадарчых зямель сельскіх абшчын, уваходзілі пусташы, лясы, бабровыя гоны і іншыя падобныя землі, якія знаходзіліся ў карыстанні ўсёй воласці. Так, у інвентары 1545 г. Мядзельскай воласці падрабязна пералічаны пусташы і сенажаці, а «сумма пустовщизн всех мядельских 25». Ворыўныя землі выкарыстоўваліся сялянамі як сямейныя надзелы, астатнімі пустуючымі землямі распараджалася адміністрацыя.

Для кіравання ў сельскіх абшчынах сяляне выбіралі старцаў, якія пры дапамозе дзясяцкіх размяркоўвалі і арганізоўвалі збор падаткаў. Выбраныя старцы выступалі пасрэднікамі паміж сельскай абшчынай і прадстаўнікамі дзяржаўнай улады – цівунамі ці намеснікамі. Знаходзіўся цівун (намеснік) звычайна ў найбольш значным паселішчы – горадзе, вялікім сяле, якія размяшчаліся ў цэнтры воласці. На цівуна і намесніка ўскладаліся прыём і перасылка сабраных падаткаў да дзяржаўнага скарбу, узвядзенне і рамонт абарончых збудаванняў. Паступова правы сельскіх абшчын абмяжоўваліся. Амаль паўсюдна старцаў замест абрання пачалі прызначаць. Сяляне спрабавалі адстойваць ранейшы парадак, але безвынікова. У 1547 г. на скаргу сялян Чачэрскай воласці Жыгімонт Аўгуст адказаў «…ино што ся дотычит мыта и выбирання старца, то сей реч наша господарская, а не ваша хлопская». Намеснікі і цівуны атрымалі таксама права збіраць падаткі непасрэдна з сялян, а не праз старцаў.

З умацаваннем феадальных адносін валасныя землі, прычым не толькі пусташы, лясныя ўгоддзі, але і дворышчы, вёскі, часам захопліваліся свецкімі

і царкоўнымі феадаламі. У залежнасць да феадалаў трапляла і іх насельніцтва. Так, у 1526 г. у лісце намесніку Крычаўскай воласці князю Жылінскаму вялікі князь Жыгімонт Стары адзначаў шматлікія скаргі на такія выпадкі: «тем жаловали нам, што ж дей ты их многих, мещан и людей наших, за собою поосаживал, и тыи дей люди поспол з ним и службы служыти и поплатов выдавати не хотят».

Асобныя сёлы са складу валасцей перадаваліся ў часовае або вотчыннае валоданне шляхце, манастырам, царкве. Так, у пачатку XVI ст. сёлы Барысаўскай воласці Глівін, Упірэвічы, Шыпяны і некаторыя іншыя праз вялікакняжацкія падараванні сталі прыватнаўласніцкімі.

За службу за кошт дзяржаўных зямель баяры атрымлівалі ад вялікага князя зямельныя падараванні («дачки», «дачы», «выслуги») – вёскі, ворыўныя землі, борці, ловы, пусташы і інш. Разбурэнне валасцей больш хутка адбывалася ў заходняй частцы Вялікага Княства Літоўскага.

Уласнікамі зямлі феадальнага тыпу ў XV – першай палове XVI ст. з'яўлялася не толькі шляхта, але і ваенна-служылыя людзі, вярхушка мяшчанства ў гарадах, заможныя татары.

Развіццё феадальных адносін абумовіла пашырэнне свецкага землеўладання. Найбольш актыўна гэты працэс адбываўся ў XV – XVI стст. З часоў вялікага князя Вітаўта падараванні маёнткаў станавіліся галоўным сродкам ўзнагароджання феадалаў за службу. З гэтага ж часу заўважна выступала тэндэнцыя надання буйным феадалам вялікіх маёнткаў, валасцей, гарадоў. Падараванні дробнай і сярэдняй шляхце былі больш сціплымі і абмяжоўваліся пусткамі, часткай вёскі, некалькімі дварамі. Падобную палітыку праводзілі вялікія князі Казімір і Аляксандр. Ад апошняга шэраг буйных маёнткаў атрымаў, напрыклад, Міхаіл Глінскі. Сярод гэтых падараванняў былі маёнтак Мажэйкава пад Лідай, Тураў і інш.

На працягу XV–XVI стст. велікакняжацкія падараванні, як і раней, маглі даваццца на пэўны тэрмін або на «вечнасць». Так, маёнтак Смальняны ў Аршанскім павеце ў 1522 г. быў падараваны князю Канстанціну Астрожскаму «до живота и сыну его до живота». Звычайна падараванні незаселеных зямель утрымлівалі дазвол перасяліць ці запрасіць туды людзей. Феадалы актыўна карысталіся гэтай магчымасцю і стваралі феадальныя двары.

З канца XV ст. колькасць часовых падараванняў скарачалася, а ў першай палове XVI ст. найбольш распаўсюджанымі з'яўляліся падараванні на «вечнасць». Так, паводле Полацкай рэвізіі 1552 г. з 116 уладанняў улічанай полацкай шляхты «извечныя» складалі пераважную большасць – 81. Павелічэнне свецкага землеўладання адбывалася пераважна за кошт дзяржаўных зямель. У выніку адбылося пераразмеркаванне зямлі – з XVI ст.

каля 65 % усёй зямлі з'яўлялася ўжо ўласнасцю феадалаў, у той час як у канцы XIV ст. ім належала менш 1/3 зямлі, а каля 70 % было ў руках вялікага князя.

Скарачэнню фонда дзяржаўных зямель у XV – першай палове XVI ст. садзейнічала таксама вялікакняжацкая палітыка падтрымкі каталіцкай царквы. Толькі ў гады Вітаўта віленскаму капітулу было падаравана каля 50 вёсак. Падтрымлівалі гэтую палітыку і феадалы. Так, у 1439 г. князь Міхаіл Жыгімонтавіч падараваў Лепельскі маёнтак Віцебскаму касцёлу. Асабліва заўважнай падтрымка свецкіх землеўласнікаў стала з канца XV ст. Атрымлівала падараванні ад князёў і феадалаў і праваслаўная царква, але яны былі значна меншымі.

Важнай характарыстыкай землеўладання азначанага перыяду з'яўляецца павелічэнне буйнога землеўладання. Яно адбывалася не толькі на аснове вялікакняжацкіх падараванняў, але і за кошт куплі-продажу, заставы, іншых аперацый, якія садзейнічалі збядненню дробнай і сярэдняй шляхты. Таму расла колькасць дробнай шляхты. Паводле попісу войска 1528 г., дробная шляхта ў Беларусі складала 81 % феадалаў. Дробная шляхта знаходзілася на ніжэйшых прыступках феадальнай іерархіі і валодала невялікімі землямі. Да яе з XVI ст. адносіліся, напрыклад, групоўкі ваколічнай (засценкавая, заградовая, шарачковая і іншыя назвы) і чыншавай шляхты, якія па маёмасным становішчы набліжаліся да сялян. Засцянковая шляхта паходзіла са свабодных людзей (баяр, зямян). Яна сялілася на незанятых гаспадарскіх землях (аколіцах, засценках і інш.), а таксама магла дакументальна пацвердзіць сваё паходжанне і даказаць, што вызваляецца ад цяглай службы, чынша і іншых павіннасцей. Чыншавая шляхта сваёй зямлёй не валодала і арандавала яе за грошы ў дзяржавы, паноў, мела асабістую недатыкальнасць і вызвалялася ад павіннасцей. Звычайна ўмовай валодання зямлёй з'яўлялася нясенне шляхтай ваеннай або іншай службы. Амаль палова дробнай шляхты не мела сялян, менавіта яе называлі «голотой». Такія шляхціцы неслі ваенную службу асабіста, або нават па чарзе. Але і ўнутры дробнай шляхты існавала свая іерархія. Сацыяльны статус вотчыннай шляхты, якая атрымала зямельныя падараванні ад іншых буйных феадалаў, быў ніжэйшым за павятовую шляхту, падпарадкаваную непасрэдна вялікаму князю.

З канца XIV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім пачалі фарміравацца латыфундыі. Да буйных землеўладальнікаў адносілася невялікая групоўка феадалаў. Так, у XV ст. самым значным феадальным родам былі Гаштольды, прадстаўнікі літоўскай знаці, вядомыя з XIV ст. Вялікія зямельныя ўладанні мелі Кезгайлы, Радзівілы, Глябовічы. На аснове попісу войска

1528 г. вылучаецца 14 буйнейшых землеўладальнікаў, якія агульна выставілі ў войска ВКЛ 3892 коннікаў. З іх 466 коннікаў выставіў Альбрэхт Гаштольд, 426 – князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі. У XVI ст. узрасла магутнасць літоўскага роду Радзівілаў. У 1528 г. ім належалі 1824 сялянскія дымы, з якіх у войска было выстаўлена 760 коннікаў і 1586 пехацінцаў. Лёс латыфундый складаўся па-рознаму: некаторыя драбіліся паміж шматлікімі нашчадкамі роду і ператвараліся ў звычайныя маёнткі, пераходзілі да іншых уладальнікаў у выніку куплі-продажу, дынастычных саюзаў, адыходзілі да вялікага князя. Так, пасля смерці Станіслава Гаштольда, апошняга прадстаўніка дынастыі, усе родавыя маёнткі перайшлі да вялікага князя.

У канцы XV – пачатку XVI ст. пачала фарміравацца найбольш заможная і ўплывовая частка феадальнага саслоўя – магнаты (ад лат. Magnatus – багаты, значны чалавек). Да яе адносіліся буйнейшыя феадалы-землеўладальнікі, прадстаўнікі заможнай радавітай знаці. Яны не толькі засяроджвалі ў сваіх руках значныя зямельныя ўладанні і вялікую колькасць сялян, мястэчкі і гарады, але і галоўныя дзяржаўныя пасады.

У XV–XVI стст. адбывалася станаўленне пануючага саслоўя і адасабленне яго ад іншых груп насельніцтва. Падараваныя манархам прывілеі юрыдычна вызначылі прававы статус шляхты. Афармленне праў і ільгот землеўласнікаў пачалося з прывілея 1387 г., які надаваў феадалам каталіцкага веравызнання пераважна балцкага паходжання шырокія правы валодання і распараджэння сваімі вотчыннымі землямі і вызваляў іх ад шэрагу дзяржаўных павіннасцей. За валоданне зямлёй феадалы неслі ваенную службу, якая дапаўнялася ўзвядзеннем і ўтрыманнем абарончых дзяржаўных збудаванняў.

Пашырэнне судовага і маёмаснага імунітэту феадалаў адбывалася на працягу XV ст. Так, Гарадзельскі прывілей 1413 г. пашырыў палажэнні прывілея 1387 г. на ўсіх феадалаў каталіцкага веравызнання, гарантаваў недатыкальнасць іх асоб і ўладанняў. Толькі спавядальнікам хрысціянскай каталіцкай веры дазвалялася займаць «дастоінства, месцы і пасады» ў дзяржаве. Удзельнічаць у выбарах вялікага князя таксама маглі толькі «паны і шляхціцы зямлі літоўскай, прыхільнікі хрысціянскай рэлігіі, рымскай царкве падуладныя, не схізматыкі ці іншыя паганыя». Велікакняжацкія прывілеі 1432 і 1434 гг. надавалі праваслаўным феадалам беларускіх і ўкраінскіх зямель роўныя сацыяльна-эканамічныя правы з каталіцкімі феадаламі, у тым ліку права свабоднага распараджэння спадчыннымі маёнткамі, вызваленне ад асобных відаў дзяржаўных падаткаў і павіннасцей, права мець свае гербы і іншыя. Агульназемскі прывілей 1447 г. дапоўніў сацыяльна-эканамічныя правы юрысдыкцыяй землеўласнікаў над залежным ад яго валасным і гарадскім насельніцтвам, а таксама забараніў ураду даваць дзяржаўную маёмасць і пасады іншаземцам.

У XVI ст. кансалідацыя вышэйшага саслоўя паскорылася. Прынятая ў 1522 г. «Устава о выводе шляхетства за прымоваю» і Статут 1529 г. ускладнілі прадстаўнікам іншых саслоўяў магчымасці трапіць у склад шляхты. Да сярэдзіны XVI ст. працэс фарміравання прывілеяванага шляхецкага саслоўя ў Вялікім Княстве Літоўскім амаль завяршыўся.

Неаднароднасць вышэйшага саслоўя дзяржавы прадвызначылі некалькі фактараў: памеры землеўладанняў, наяўнасць тытула, канфесійная і этнічная прыналежнасць. Узначальвалі феадальную іерархію княства прадстаўнікі родавай тытулаванай знаці – нашчадкі дынастый Рурыкавічаў, Гедымінавічаў, Усяславічаў. Але землі тэрытарыяльных княстваў паступова драбніліся і нашчадкі знакамітых дынастый часта ператвараліся ў сярэдніх землеўладальнікаў. Здрабнелі або спынілі сваё існаванне такія роды, як Лукомскія, Друцкія, Свірскія. У XV – першай палове XVI ст. вылучылася багатая і моцная група феадалаў, якая атрымала назву «паны», – нашчадкі знатных баяр, узнагароджаных за службу вялікім князем высокімі пасадамі і буйнымі зямельнымі падараваннямі, якія з цягам часу рознымі шляхамі павялічваліся. Паны, як і князі, трымалі землі на вотчынным праве «з поўным правам і панствам». Сярод гэтай групы феадалаў па значнасці вылучаліся паны радныя (паны-рада), якія мелі вышэйшыя духоўныя і свецкія пасады, паны харугаўныя (назва вызначала выстаўленне такімі панамі войска пад фамільнай харугвай (сцягам), а не пад павятовым) і панята – заможныя землеўласнікі, якія служылі пры двары вялікага князя. Асноўную і самую вялікую частку пануючага саслоўя складалі сярэднія і дробныя землеўладальнікі, якія ў XV–XVI стст. часцей за ўсё называліся «баяре, баяре-шляхта, зямяне». Валоданне зямельнай уласнасцю, адбыванне ваеннай службы з'яўляліся галоўнымі крытэрыямі прыналежнасці да прывілеяванага шляхецкага саслоўя.

Па этнічным паходжанні склад шляхты быў неаднародным. У першай трэці XVI ст. дробныя і сярэднія феадалы беларускага паходжання складалі каля 80 % усіх феадалаў дзяржавы. Яны пераважалі ў цэнтральных і ўсходніх землях. Амаль 19 % пануючага саслоўя мелі літоўскае паходжанне. Сярод феадалаў былі і выхадцы з іншых краін, якія здолелі асесці ў ВКЛ: палякі, маскавіты і інш.

## СЯЛЯНСКАЕ ЗЕМЛЕКАРЫСТАННЕ І КАТЭГОРЫІ СЯЛЯН

Зямля знаходзілася ва ўласнасці дзяржавы, свецкіх і духоўных феадалаў, а апрацоўвалі яе сяляне – самая шматлікая групоўка, якая ўключала каля 85 % усяго насельніцтва. Першапачаткова пераважная большасць сялян

належала да вольных абшчыннікаў. З умацаваннем феадальнай уласнасці на зямлю пашыралася запрыгоньванне сялян. Земляробы гублялі магчымасці распараджацца зямлёй: прадаваць, мяняць, закладаць, пакідаць у спадчыну; скарачаліся і іншыя свабоды. У XV – першай палове XVI ст. сяляне паступова страчвалі правы валодання зямлёй і ператвараліся ў землекарыстальнікаў. З канца XV ст. селянін стаў аб'ектам куплі-продажу як з зямлёй, так і без яе. Па прыналежнасці сяляне падзяляліся на дзяржаўных, царкоўных і прыватнаўласніцкіх.

Сяляне жылі пераважна ў сёлах, пагостах, вёсках. У большасці гэтыя паселішчы знаходзіліся на стараворыўных землях у зручных і добра распрацаваных далінах. Імкненне да пашырэння сельскагаспадарчай вытворчасці ў XV – першай палове XVI ст. паскорыла асваенне новых участкаў і абумовіла інтэнсіўную ўнутраную каланізацыю. Поруч са старадаўнімі ўзнікалі новыя сёлы і вёскі. У XV–XVI стст. з'явіліся шматлікія новыя тыпы паселішчаў, такія як воля, слабада, аколіца, засценак, селішча і інш. Даследчыкі лічаць, што «волямі» называлі пасяленні, створаныя на новаасвоеных землях, жыхары якіх вызваляліся ад шэрагу павіннасцей, і такім чынам мелі ільготы – «волі». Такія пасяленні («волі», «вулькі») былі асабліва распаўсюджаны ў Пінскім Палессі і заходніх рэгіёнах.

Беларускія землі ў той час былі малазаселенымі. Недахоп працоўнай сілы стрымліваў развіццё феадальнай гаспадаркі. Таму феадалы, адміністрацыя гаспадарскіх двароў імкнуліся прыцягнуць да вытворчасці як мага болей сялян. Новыя «асаджаныя» сяляне, якіх сялілі на распрацаваных землях або «на сыром корани», сядзелі «на асады за куницу» (від падатку), часова вызваляліся ад павіннасцей, карысталіся ўваходамі ў лясы, займаліся промысламі, атрымлівалі іншыя дадатковыя прывабныя ўмовы. Такія паселішчы атрымалі назву «слабада». Яны былі пашыраны ў Падняпроўі і Падзвінні.

Сялянскія паселішчы ў большасці былі невялікімі. Некалькі паселішчаў або вялікае сяло ўтваралі абшчыну. Самі паселішчы складаліся з дымоў або з большых складаных адзінак – дворышчаў. Дым уяўляў сялянскую гаспадарку сям'і. Дворышча з'яўлялася больш складанай гаспадарчай і сацыяльнай арганізацыяй і аб'ядноўвала ад дзвюх да дзесяці і болей сваяцкіх сямей. Сем'і жылі асобнымі дамамі, супольна карысталіся інвентаром, сенажацямі, выганамі, бортнымі і іншымі землямі. Дворышчы істотна адрозніваліся па колькасці сямей і зямель. На працягу XV ст. у дворышчах адбываўся паступовы пераход ад вядзення сваякамі агульнай гаспадаркі да саюзу сваяцкіх (і не толькі) сямей-дольшчыкаў. У гаспадарчых адносінах супольнае землекарыстанне абумоўлівала існаванне прымусовага

севазвароту, але кожная сям'я дворышча пачала самастойна апрацоўваць сваю долю ворыўнай зямлі і распараджалася вынікамі працы. Члены дворышча перадавалі свае долі ў спадчыну, закладалі і нават прадавалі іх. Часам у дворышча або да малалікіх сямей дымоў далучаліся прышлыя людзі – сябры, паплечнікі, патужнікі («Грыц Бобрович з поплечником Василем», «Самсон Питалович, человек прихожий»). Прышлых людзей прымалі таксама для дапамогі, калі жадалі пашырыць гаспадарку. Часам іх «падсаджвалі» дзяржаўныя ўрадцы.

Сялянскаму землекарыстанню да сярэдзіны XVI ст. была ўласціва надзвычайная цераспалосіца. Сялянскія надзелы – ворыўныя землі, сенажаці, борці і інш. – былі стыхійна раскіданы вакол паселішчаў, цесна перапляталіся паміж сабой, уклініваліся ў землі іншых уласнікаў. Такі парадак землекарыстання ўтвараўся на працягу доўгага часу. Шматлікія раскіданыя сялянскія землі сталі вынікам распрацоўкі бліжэйшых пусташаў. Абшчыннікі пакаленнямі сядзелі на зямлі, якую занялі, распрацавалі, ачысцілі ад лесу іх продкі. Узбуйненне паселішчаў, разрастанне дымоў і дворышчаў прымушалі сялян асвойваць новыя землі. Прыдатныя землі поруч з вёскай займаліся хутка, і сяляне шукалі ўчасткі далей. Такія ж захады рабілі іншыя сем'і. Так утваралася цераспалосіца. Да сярэдзіны XVI ст. значныя абшары прыдатнай для гаспадарчай дзейнасці зямлі на тэрыторыі Беларусі яшчэ не былі заселены. Таму памеры занятай сялянамі зямлі залежалі пераважна ад наяўнасці рабочай сілы ў сям'і, колькасці цяглай жывёлы і цяжару падаткаў. Павелічэнне сялянамі сваіх надзелаў за кошт нераспрацаваных гаспадарскіх зямель не абмяжоўвалася ўладамі, але вяло да ўзрастання падаткаў.

Да сярэдзіны XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім не існавала агульнага падаткаабкладання. Падаткі і павіннасці ўскладаліся на сялянскую абшчыну, унутры якой яны размяркоўваліся па дворышчах або дымах. У якасці ўліковых гаспадарчых адзінак таксама выступалі «двары», «службы», «селішчы» і інш. Даследчыкі падкрэсліваюць пэўную нявызначанасць памераў, складу зямельных угоддзяў, колькасці насельніцтва разнастайных гаспадарак у гэты перыяд. Так, падобныя да дворышчаў гаспадарчыя адзінкі на Смаленшчыне, Мсціслаўшчыне і некаторых іншых землях атрымалі назву «селішча». На паўднёвым захадзе, Піншчыне, пераважалі «дворышчы». У Берасцейскіх землях яшчэ адной распаўсюджанай назвай сялянскай гаспадаркі як адзінкі падаткаабкладання з'яўлялася «жарэб'е» («жеребьи»). «Службы» сустракаліся паўсюдна, але дамінавалі гаспадаркі з такой назвай у Падзвінні і Падняпроўі.

З умацаваннем феадальных адносін дзяржава і свецкія феадалы ўсё больш падпарадкоўвалі сельскія абшчыны сваёй уладзе. Першапачаткова

расклад і збор падаткаў кантралявалі і вялі выбарныя абшчыннікі – старцы, дзясяцкія. Але вялікакняжацкая адміністрацыя паступова пашырыла сваю ўладу – пачала прызначаць старцаў, узяла збор падаткаў у свае рукі, увяла новыя павіннасці.

У дакументах XV–XVI стст. сяляне агульна выступалі пад назвамі «люди», «простые люди», «мужыки», «подданыя». Але сялянства было вельмі неаднародным саслоўем, падзялялася на шматлікія групы, якія ў пэўнай ступені адлюстроўвалі прававое, падатковае, маёмаснае і іншае становішча. Можна вылучыць катэгорыі сялян па прыналежнасці, па ступені асабістай свабоды, паводле дамінуючых падаткаў і павіннасцей, па маёмасным стане. Шматлікія назвы катэгорый сялян – «господарские», «отчичи», «похожие», «заседелые», «невольные», «подсуседки», «дольники», «потужники», «жалобники», «слободичи», «люди служебные», «люди в пенезях», «слуги посельские», «закупы», «челядь» і інш. – адлюстроўваюць стракаты сацыяльны і эканамічны склад сялянства і пашырэнне феадальнай залежнасці.

Асноўным падаткам на карысць дзяржавы да канца XV ст. была натуральная (прадуктовая) даніна (дзякла), якая магла дапаўняцца грашовай. Пашырэнне таварна-грашовых адносін абумовіла з'яўленне грашовага аброку – чыншу, які вядомы з XV ст. Акрамя асноўных падаткаў на карысць дзяржавы, сяляне выконвалі шматлікія павіннасці – рамонт дарог і мастоў, надзвычайныя работы, плацілі падаткі на ваенныя мэты і інш. Даволі цяжкай з'яўлялася павіннасць па рамонту і будаўніцтву розных абарончых збудаванняў.

У адпаведнасці з ускладзенымі падаткамі і павіннасцямі вылучаюцца наступныя групы сялян: даннікі, чыншавыя, цяглыя, сяляне-слугі. Да сярэдзіны XVI ст. асноўнай катэгорыяй феадальна-залежнага насельніцтва з'яўляліся даннікі. Галоўнай павіннасцю такіх сялян была натуральная рэнта – мядовая, бабровая, кунічная, збожжавая і інш. Натуральная даніна дапаўнялася грашовай, некаторымі адпрацовачнымі павіннасцямі на карысць вялікага князя або феадала. Даніна пераважала ў гаспадарскіх уладаннях да канца XV ст., асабліва на ўсходзе Беларусі, дзе гаспадарскіх двароў было мала. Сапраўдным царствам даннікаў называў М. Доўнар-Запольскі задзвінскія і падняпроўскія воласці. З канца XV ст. актыўна змяншалася доля натуральнай формы даніны і пашыралася яе частковае замяшчэнне грашовым эквівалентам. У Падняпроўі, на Палессі назіраўся пераход ад традыцыйнай формы даніны, пераважна футрам, да даніны сельскагаспадарчай прадукцыяй. Пашыраліся таксама грашовыя плацяжы. Даннікамі з'яўляліся і сяляне-дольнікі, якія плацілі 1/3–1/4 долі ўраджаю. Шмат дольнікаў у пер-

шай палове XVI ст. было ў Падзвінні. Так, у пагадненні віцебскіх землеўладальнікаў 1551 г. забаранялася «водворять за собой людей вольных похожих иначе, как по принятому в земле Полоцкой обычаю, т. е. па четвертой доле, так что каждый вольный похожий человек должен нам, панам своим, давать от ржи и от всякого другого хлеба долю – четвертый сноп, которая доля должна быть смолочена при нашем посланце».

У чыншавых сялян асноўнай формай зямельнай рэнты з'яўлялася грашовая. Акрамя яе чыншавыя сяляне выконвалі розныя дадатковыя павіннасці: дзякла, талокі, згоны ці гвалты, будаўнічыя, рамонтныя і іншыя работы. З развіццём таварна-грашовых адносін грашовая рэнта павольна замяшчала прадуктовую даніну, а таксама выступала дадатковай павіннасцю для розных катэгорый. Чынш быў галоўнай павіннасцю кунічных сялян, якія карысталіся ўзятымі ў арэнду землямі, угоддзямі, вадаёмамі і інш.

Значную частку феадальна-залежнага насельніцтва складалі цяглыя сяляне. На іх ускладалася адработачная рэнта – паншчына, якая зводзілася не толькі да земляробчых работ. Паншчыну сяляне выконвалі «с сохою, с серпом, с косою, с топором и иную тягль тянули». Адработачныя павіннасці адбывалі сваімі прыладамі працы і цяглай жывёлай. З канца XV ст. паншчына актыўна пашыралася. Цяглыя і чыншавыя сяляне пачалі пераважаць на захадзе Вялікага Княства Літоўскага, дзе ствараліся таварныя гаспадаркі. Цяглыя сяляне, як і чыншавыя, мелі дадатковыя павіннасці. Дакладна вызначыць памеры паншчыны ў гэты перыяд немагчыма, але ў пачатку XVI ст. паншчына складала адзін дзень на тыдзень, а ў сярэдзіне XVI ст. – два дні («мають тые люди 2 дни у недели пригону служити с сохою, або з бороною, або с косою, або с топором, або жать»).

Сяляне-слугі былі як у дзяржаўных (гаспадарскіх), так і ў прыватных і царкоўных уладаннях. Да сярэдзіны XVI ст. забяспечанасць зямельнымі надзеламі гэтай групоўкі залежных мала адрознівалася ад гаспадарак іншых сялян. Адрозненне сялян-слуг ад іншых катэгорый вызначалася спецыфічнымі абавязкамі за карыстанне зямлёй. Разнастайныя павіннасці і розны сацыяльны статус асобных груп сялян-слуг абумовілі значную ўнутраную стратыфікацыю гэтай катэгорыі. Да яе адносілася вялікая групоўка вайсковых сялян – панцырныя баяры, путныя баяры, паседскія баяры, ардынскія слугі і іншыя. У XV – першай палове XVI ст. вайсковыя сяляне складалі значную частку на ўсходзе Беларусі – у полацкіх, віцебскіх, смаленскіх землях. Да сялян-слуг далучаліся адміністрацыйна-гаспадарчыя асобы (напрыклад, старцы), прыслуга (кухары, піввары, пекары і інш.). Сяляне-слугі выконвалі абавязкі па лясной гаспадарцы, займаліся здабычай руды, солі і іншымі работамі, якія патрабавалі пэўнай кваліфікацыі. Склад

сялян-слуг прамысловых заняткаў быў вельмі шырокі: бортнікі, млынары, баброўнікі, стральцы, сакольнікі, смаляры, руднікі і іншыя. Асочнікі ахоўвалі пушчы і рыхтавалі паляванні. Дзічыну, звяроў пастаўлялі лаўцы, стральцы, пташнікі, шацёрныя. Буднікі, вугольнікі займаліся перапрацоўкай попелу. Спецыяльную службу – пастаўку пэўных вырабаў – выконвалі сяляне-рамеснікі: ганчары, рымары, сядзельнікі, кавалі, цесляры і інш. Большая частка сялян-слуг звыш сваіх спецыяльных павіннасцей неслі і дадатковыя. На некаторых сялян-слуг ускладалася падводная павіннасць, стацыя* або рамонт дарог і гацяў, іншыя плацілі падаткі на ваенныя патрэбы (сярэбшчыну, ардыншчыну) і г. д.

Паводле ступені асабістай свабоды вылучаліся сяляне пахожыя і непахожыя, чэлядзь нявольная. Найгоршае становішча ў прававых адносінах мела чэлядзь нявольная, якая з'яўлялася поўнай уласнасцю гаспадара. Крыніцамі фарміравання гэтай катэгорыі сялян выступалі купля-продаж, шлюб з нявольным і нараджэнне ў няволі, палон, пакаранне судом за вызначаныя злачынствы («которые здавна в неволи суть або з невольных ся родили», «которые полономо заведенье суть», «коли бы сами ся в неволю подали», «естли бы за невольного пошла ведаючи, тогды и сама в неволю подается и дети их»). Чэлядзь нявольная была нешматлікай. Яна не мела сваёй гаспадаркі, жыла пераважна пры дварах землеўласнікаў (чэлядзь дворная) і ўтрымлівалася за іх кошт – «маеть староста отдати челяди нашой невольной месячину на весь год». Асноўнай формай утрымання чэлядзі з'яўлялася месячына, якую атрымлівалі пераважна хлебам («только на месечине, на хлебе в домах шляхетских живут»). Частка чэлядзі пражывала ў вёсцы і атрымлівала невялікія надзелы – «прыробкі», «прысеўкі». Адпаведна і месячына на яе ўтрыманне вылучалася меншая – «абы челяди невольной, которыи мають приробки а бонды свои по полтлоры копы жыта на рок давано». Чэлядзь нявольная пэўны час была асноўнай прадукцыйнай сілай вялікакняжацкай гаспадаркі. Заканадаўства не толькі абараняла правы феадалаў адносна чэлядзі нявольнай – забараняла прымаць беглых нявольнікаў, уводзіла адказнасць за дапамогу беглым і гэтак далей, – але і абавязвала землеўладальнікаў клапаціцца аб сваёй чэлядзі. Статут 1529 г. вызначаў, што выгнанне феадалам чалядзіна ў галодны год вызваляла апош-

---

* Стацыя (ад лат. statio – стан, месцазнаходжанне) – вядомая з канца XIV ст. феадальная павіннасць сялян і мяшчан ВКЛ на ўтрыманне вялікага князя і яго світы ў час выканання ў валасцях судова-адміністрацыйных спраў. Спачатку стацыя мела натуральную форму, а пазней была пераведзена на грошы і набыла пастаянны характар, незалежна ад прыезду князя.

няга ад няволі: «естли бы их выбил вон, не хотячи их кормити, тогды оная челядь вжо вечне маеть быти вольна».

«Непахожымі» з'яўляліся сяляне, якія страцілі права «выхаду» – пераходу на землі іншага ўласніка. Такія сяляне называліся «отчичи», «извечные», «отчизныя люди». Перавод вольных сялян у отчычаў абапіраўся на прынцып старажыльства. З цягам часу вольныя сяляне асаджваліся на землях пэўнага феадала, абзаводзіліся гаспадаркай, перадавалі яе ў спадчыну, выконвалі павіннасці і першапачаткова захоўвалі права «выхаду». Але павялічваць рэнту, змяняць яе форму феадалу, безумоўна, прасцей было з «непахожых» сялян. Таму феадалы імкнуліся ўскладніць, абмежаваць і ўрэшце забараніць сялянам пераходы. На думку М. Доўнар-Запольскага, якую падзяляў У. Пічэта, запрыгоньванне сялян на беларускіх землях пачалося з заходніх валасцей і гаспадарскіх двароў. У сярэдзіне XV ст. заканадаўства надало адносінам непахожых сялян з землеўладальнікамі характар асабістай залежнасці. Прывілей 1447 г. забараняў прымаць на гаспадарскія землі людзей «извечных». Яны вызваляліся ад дзяржаўных падаткаў на карысць феадала і пераходзілі пад суд свайго пана. Судзебнік 1468 г., Статут 1529 г. узмацнілі характар асабістай залежнасці непахожых сялян. Іх дазвалялася перадаваць у спадчыну, прадаваць, закладаць, вызначаць ім пакаранне. Статут 1529 г. дазваляў нават продаж атчызных людзей без зямлі, але ў адрозненне ад чэлядзі нявольнай непахожых людзей пераважна перадавалі з іх надзеламі без высялення.

«Пахожыя» сяляне лічыліся асабіста вольнымі. Яны не былі прымацаваны да зямлі і мелі права вольнага пераходу ад аднаго землеўладальніка да іншага. У крыніцах яны выступаюць таксама пад назвамі «людзі прыбылыя», «прыхожыя». Статут 1529 г. выкарыстоўвае тэрміны «людзі пахожыя» і «людзі вольныя». У XV ст. такія сяляне складалі найбольшую групоўку. «Прырастала» гэтая катэгорыя за кошт сялян-спадчыннікаў, якія здолелі выправіць дакумент аб сваім стане і забяспечылі яго перадачу нашчадкам. Значную колькасць складалі сяляне, якія прадавалі або здавалі свае вотчыны іншым, а самі шукалі лепшай долі ў новых месцах. Асноўнай формай феадальнай рэнты за карыстанне зямлёй «людзей пахожых» звычайна была даніна.

Першапачаткова адносіны землеўладальніка і пахожых сялян рэгуляваліся мясцовым звычаёвым правам. Даннік мог сысці са свайго ўчастка, папярэдзіўшы землеўладальніка і заплаціўшы грашовую кампенсацыю за «выхад». Затрымліваць «выхады» феадалам і ўрадцам не дазвалялася. Тэрміны і ўмовы «выхаду» не мелі жорсткай рэгламентацыі, а пісьмовыя дагаворы на арэнду зямлі заключаліся выпадкова. Не маючы пісьмовых

доказаў асабістай вольнасці, «людзі пахожыя» не заўжды маглі захаваць свой стан падчас продажу, раздзелаў зямлі, перадачы яе ў спадчыну. Стратай свабоды пагражала і разавае выкананне якой-небудзь цяглай павіннасці замест пэўнай службы, што лічылася доказам прымацавання да зямлі.

З канца XV ст. становішча пахожых сялян пачало пагаршацца. Барацьба за вольныя працоўныя рукі прымушала землеўладальнікаў у асобных землях выпрацоўваць агульныя ўмовы для «людзей пахожых». Вядомы падобныя пагадненні аб павіннасцях пахожых сялян і ўмовах пераходу да іншага ўладальніка феадалаў Полацкай зямлі (1522 г.), Віцебскага ваяводства (1531 г.), землеўладальнікаў Полацкага і Віцебскага ваяводстваў (1551 г.). Яны зацвярджаліся вялікім князем і набывалі заканадаўчую моц. Пагадненні павялічвалі падаткі, ускладнялі і абмяжоўвалі тэрмін «выхаду» сялян: «если бы который человек захотел перейти к кому-нибудь другому, то должен заблаговременно летом уступить пану своему паровое поле, и явившись на мирском сходе, на первой неделе великого поста, ударивши челом и заплативши выходную куницу – 12 грошей, выйти прочь». Збеглых без выканання ўмоў «выхаду» пахожых сялян адшуквалі ўжо як отчычаў. Парушэнне пагаднення аб трыманні вольных людзей у бок змяншэння павіннасцей пагражала феадалам пакараннем – спагнаннем пені на карысць вялікага князя ў 50 коп грошай.

Пашырэнне гаспадаркі і стварэнне фальваркаў заахвочвалі феадалаў да замацавання сялян на сваіх землях. Статут 1529 г. утрымліваў норму дзесяцігадовай земскай даўнасці, прынцып якой феадалы і дзяржаўныя ўрадцы шырока выкарыстоўвалі для запрыгоньвання пахожых сялян, «засядзеўшыхся» на зямлі феадала больш за дзесяць гадоў. Нягледзячы на шматлікія скаргі і пэўны супраціў, з канца XV ст. колькасць «людзей пахожых» змяншалася.

Адначасова адбываўся наступ і на катэгорыі часова залежных сялян, колькасць якіх таксама скарачалася. Такімі сялянамі з'яўляліся закупы. Яны адрозніваліся па сваім становішчы ад людзей непахожых, для якіх няволя набыла пастаянны характар. Часова залежнымі, як і закупы, былі найміты (наёмныя работнікі), а таксама няспраўныя плацельшчыкі-даўжнікі. Яны аддаваліся «на выробок» – да адпрацоўкі доўгу. Часова прымацаванымі да зямлі, але асабіста вольнымі лічыліся «людзі ў пенезях» – сяляне, якія падчас пераходу бралі пазыку ў новага землеўладальніка і абавязваліся выконваць сялянскую службу да поўнай выплаты.

Такім чынам, XV – першая палова XVI ст. сталі часам істотных змяненняў у сацыяльным становішчы сялян, паклалі пачатак юрыдычнаму афармленню прыгоннага права. Асабліва актыўна працэс запрыгоньвання сялян адбываўся ў канцы XV – першай палове XVI ст.

# СТАНАЎЛЕННЕ ФАЛЬВАРАЧНАЙ ГАСПАДАРКІ

У другой палове XV – першай палове XVI ст. у арганізацыі феадальнай гаспадаркі Вялікага Княства Літоўскага адбыліся важныя змяненні – з'явіліся фальваркі. Сама назва «фальварак» (польск. Folwark ад ням. Vorwerk) была запазычана з польскай мовы і ў шырокі ўжытак увайшла ў XVI ст. Першапачатково такія гаспадаркі мелі традыцыйную назву «двор». «Дваром» называлася вялікакняжацкая («гаспадарская») або феадальная гаспадарка, скіраваная на забеспячэнне самога ўладальніка, яго сям'і, адміністрацыі і чэлядзі неабходнай сельскагаспадарчай прадукцыяй.

Прыкладна да сярэдзіны XV ст. феадальная гаспадарка мела натуральны характар. Усё неабходнае для задавальнення патрэб феадала выраблягла чэлядзь нявольная і забяспечвала даніна з сялянскіх гаспадарак. Адсутнасць войнаў у другой палове XV ст., спрыяльная кан'юнктура знешняга рынку і рост гарадоў падштурхоўвалі феадалаў да пашырэння ўласнай гаспадаркі і павелічэння яе прыбытковасці. У выніку з'явіўся новы тып гаспадаркі – фальварак, які ўключаў панскі двор з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, ворыўнымі землямі,ляснымі і іншымі ўгоддзямі. Вытворчасць фальварка была скіравана на продаж прадукцыі і абапіралася на працу прыгонных сялян.

Значным стымулам да рэарганізацыі гаспадаркі і пашырэння вытворчасці прадукцыі для феадалаў Вялікага Княства Літоўскага з'явіўся рост цэн і павелічэнне попыту на збожжа і іншую сельскагаспадарчую прадукцыю ў краінах Заходняй Еўропы ў канцы XV – пачатку XVI ст. Першымі на гэта адгукнуліся буйныя землеўладальнікі. Яны імкнуліся пашырыць ворыўныя землі старых двароў, павялічыць колькасць чэлядзі ў дварах, а таксама заснаваць новыя гаспадаркі.

Пад фальваркі звычайна адводзілі лепшыя землі. Вялікую ролю пры гэтым адыгрывала не толькі якасць глебы, але і размяшчэнне будучай гаспадаркі. Вызначальнымі фактарамі ўсталявання фальварка выступалі шляхі зносін з буйнымі гандлёвымі цэнтрамі, набліжанасць да гарадоў, наяўнасць працоўнай сілы. Больш спрыяльным спалучэнне гэтых умоў было ў Заходняй Беларусі. Таму першыя фальваркі ўзніклі і хутка распаўсюдзіліся ў басейнах Нёмана, Заходняга Буга і прылеглых да іх тэрыторыях. На ўсходзе Беларусі – у Падзвінні і Падняпроўі – фальваркаў было мала. Гэтыя тэрыторыі з канца XV ст. былі небяспечнымі падчас войнаў з Маскоўскім княствам, а таксама знаходзіліся далей ад значных гандлёвых еўрапейскіх цэнтраў.

Памеры фальварачных гаспадарак істотна адрозніваліся: ад некалькіх дзясяткаў гектараў да сотні і болей гектараў ворыўнай зямлі. Некаторыя

феадалы мелі па некалькі фальваркаў. Безумоўна, вялікія фальваркі належалі буйным феадалам. Па падліках даследчыкаў, на адну фальварковую гаспадарку ў першай палове XVI ст. прыходзілася ў сярэднім ад двух да шасці валок*. Для параўнання: на кожны з радзівілаўскіх фальваркаў (а яны былі створаны больш, чым у 40 дварах) прыпадала ўмоўна каля 10 валок. Шмат двароў былі гаспадарскімі. Вялікія князі і буйныя землеўласнікі для кіравання гаспадаркамі прызначалі адміністрацыю – намеснікаў, ураднікаў, стараст і інш.

Распаўсюджванне фальваркаў прывяло да павелічэння паншчыны і паскорыла запрыгоньванне сялян. Суадносіны фальварковага і сялянскага ворыва вызначаліся як 1:7 (на адну валоку фальварковай зямлі прыходзілася сем сялянскіх). Вытворчасць прадукцыі ў фальварках пераводзілася з нявольнай чэлядзі на прыгонных сялян. Сялянская сям'я атрымлівала ў карыстанне валоку зямлі або частку валокі і павінна была выконваць вызначаныя павіннасці на карысць землеўладальніка на фальварковай зямлі.

Асноўнай галіной вытворчасці ў фальварках заставалася збожжавае раслінаводства, у асноўным жыта. Збожжа карысталася высокім і ўстойлівым попытам як у Заходняй Еўропе, так і на ўнутраным рынку. Другое па значнасці месца належала жывёлагадоўлі. У фальварках гадавалі разнастайную свойскую жывёлу і хатнюю птушку. Большасць гаспадарак былі шматгаліновымі. Яшчэ адным напрамкам з'яўлялася перапрацоўка сельскагаспадарчай сыравіны (млыны, сыраварні і інш.). Імкненне феадалаў атрымаць больш прыбытак выклікала актыўную распрацоўку ў таварных мэтах лясных, бортных, рыбных і іншых угоддзяў.

Пашырэнне фальваркаў прывяло да павелічэння сельскагаспадарчай прадукцыі і паляпшэння яе якасці, умацавала сувязі з рынкам. Пераважная большасць землеўладальнікаў арыентавалася на ўнутраны рынак і купцапасрэдніка. Буйныя феадалы вялі знешні гандаль непасрэдна, пастаўлялі ў Заходнюю Еўропу і набывалі там разнастайныя тавары.

Распаўсюджванне фальваркаў з'явілася важным этапам эвалюцыі гаспадаркі Вялікага Княства Літоўскага. Да сярэдзіны XVI ст. фальварак стаў галоўнай формай гаспадарання феадалаў на захадзе і ў цэнтральнай частцы Беларусі. Фальваркі ствараліся як у прыватных, так і ў дзяржаўных і царкоўных уладаннях. Вялікую ролю ў пашырэнні фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадарання адыгралі аграрныя рэформы, распачатыя каралевай Бонай і працягнутыя Жыгімонтам Аўгустам.

---

* Валока – асноўная зямельная мера ў ВКЛ (21,36 га), якая складалася з 30 моргаў, або 9000 прутоў.

## АГРАРНАЯ РЭФОРМА КАРАЛЕВЫ БОНЫ СФОРЦЫ

Пераход да таварнай гаспадаркі значна павялічыў даходы феадалаў. Разам з тым шматлікія прывілеі і зямельныя падараванні шляхце істотна зменшылі паступленні ў дзяржаўны скарб. Значныя дзяржаўныя, і асабліва ваенныя расходы патрабавалі новых грашовых паступленняў. Першыя спробы рэфармавання гаспадаркі былі зроблены ў 1530–40-я гг. каралевай Бонай Сфорцай, жонкай вялікага князя і караля Жыгімонта І Старога.

Бона Сфорца (1494–1557) – надзвычай цікавая і супярэчлівая постаць нашай гісторыі. Яна паходзіла з сям'і міланскага герцага Джана Галеацца Сфорца і Ізабэлы Арагонскай. Бона Сфорца не толькі лічылася адной з найпрыгажэйшых нявест Еўропы, але і славілася сваёй адукаванасцю і практычнасцю. Яна атрымала выдатную па тым часе адукацыю: ведала права, тэалогію, латынь, філасофію і матэматыку. Свае веды і таленты Бона Сфорца паспяхова рэалізавала ў новай радзіме. Шлюб з Жыгімонтам Старым адбыўся ў 1518 г. Адзін з шасці дзяцей, народжаных у гэтым шлюбе, Жыгімонт Аўгуст, стаў наступным вялікім літоўскім князем і польскім каралём.

З самага пачатку Бона Сфорца імкнулася ўзмацніць уладу вялікага князя і караля шляхам павелічэння эканамічнай магутнасці гаспадара. Сапраўды, дзейнасць каралевы-рэфарматаркі значна павялічыла зямельную ўласнасць дынастыі Ягелонаў, а таксама абараніла дзяржаўныя землі ад захопаў іх феадаламі. Праз суд, выкуп з закладу былі вернуты шматлікія землі, прысвоеныя магнатамі раней (напрыклад, Гарадзенскае староства). Менавіта каралева Бона са сваіх уладанняў (Давыд-Гарадок, Клецк, Пінск, Кобрын) упершыню пачала шырокую рэарганізацыю гаспадаркі, якая і стала асновай рэформы «валочнай памеры», працягнутую потым яе сынам.

У пачатку XVI ст. на тэрыторыі Пінскага Палесся зямельныя ўладанні манарха былі найбуйнейшымі. Пінскае староства было падобна на іншыя велікакняжацкія ўладанні. Поруч з сялянскімі вёскамі, але звычайна на лепшых землях, існавалі гаспадарскія двары. Яны выступалі адміністрацыйнымі і фіскальнымі цэнтрамі навакольных вёсак, мелі невялікія гаспадаркі для задавальненння патрэб княжацкай адміністрацыі. Кіравалі такімі дварамі ўраднікі, а ўсе работы выконвала чэлядзь нявольная. У сярэднім на адзін княжацкі двор прыходзілася каля 20 нявольнікаў. Акрамя гарадоў і двароў, у Пінскім павеце вялікі князь валодаў 102 вёскамі, а ў Клецкім павеце меў 49 вёсак. Але гэтыя вялікія ўладанні не прыносілі адчувальнага прыбытку. Асноўны даход у скарб давала даніна ад падданых, выплаты за арэнду і нязначныя розныя падаткі.

Першыя падараванні зямель жонцы Жыгімонт Стары зрабіў яшчэ ў 1519 г., але спатрэбіўся пэўны час на ўпарадкаванне спраў пасля смерці іх папярэдняга ўладальніка – князя Фёдара Іванавіча Яраславіча. Таму пацвярджальны ліст на валоданне Пінскім, Клецкім, Давыд-Гарадзенскім, Рагачоўскім княствамі і валасцю Вяда Бона Сфорца атрымала толькі ў 1523 г. Правы на гэтыя землі перадаваліся каралеве ў такіх жа памерах, якія меў князь Фёдар. Становішча атрыманых ад мужа зямель не задавальняла Бону Сфорцу. Яна імкнулася зрабіць Палессе цэнтрам сваіх будучых уладанняў і, не чакаючы пацвярджальных актаў, ужо ў 1522 г. прыступіла да ўпарадкавання набытых зямель.

У атрыманых княствах было створана мясцовае кіраўніцтва пад началам старостаў. У асобныя гарады прызначаліся падстаросты і пісары. З 1532 г. каралева ў поўнай ступені валодала і Кобрынскім староствам (былым княствам), якім распараджалася з 1519 г. Акрамя рэарганізацыі сістэмы кіравання, Бона Сфорца паслядоўна праводзіла палітыку пашырэння і аб'яднання сваіх зямель. Існуючая цераспалосіца істотна перашкаджала гаспадарчаму развіццю і стрымлівала ўтварэнне буйных таварных маёнткаў. Бона Сфорца імкнулася пашыраць свае ўладанні шляхам куплі і вяртання судовым парадкам спрэчна захопленых феадаламі зямель. Так, у 1536 г. яна набыла Шарашоў у Кобрынскім павеце ў баяр Яна Ілініча і Яна Абрамовіча. Некалькі гадоў вяліся зямельныя спрэчкі з князямі Чартарыйскімі і Сангушкамі. Таксама практыкаваўся абмен землямі з феадаламі, чые ўладанні ўкліньваліся ў землі каралевы. Дзейсным механізмам пашырэння ўладанняў былі неаднаразовыя рэвізіі праў шляхты, духоўных асоб на зямлю, якой яны карысталіся.

У сваіх уладаннях Бона Сфорца загадала перамераць ворыўныя землі з дапамогай новых адзінак вымярэння – валок. Перамераныя землі падзяляліся паміж вёскамі і прыватнымі ўладальнікамі. Пры гэтым каралева імкнулася не толькі пакінуць за сабой лепшыя землі, але і садзейнічала аб'яднанню зямель прыватых уладальнікаў у адно цэлае. Шмат увагі надавалася ўпарадкаванню сялянскіх павіннасцей. Замест натуральнай даніны і прыгонніцтва пачалі паступова ўводзіць грашовы чынш.

Упарадкаванне прадугледжвала пашырэнне ворыўнай запашкі, а таксама, пры неабходнасці, перанос вёсак на новае месца. Пры гэтым ліквідавалася ранейшая бессістэмная забудова, уводзілася вулічная планіроўка. Вёскі аб'ядноўваліся ў войтаўствы, на чале якіх для кіравання прызначаліся войты. У 1549–1550 гг. у Кобрынскім старостве былі арганізаваны тры вялікія фальваркі (ад 22 да 37 валок). Яны спецыялізаваліся на вырошчванні збожжа, якое прадавалі праз Гданьск. Дзесяць меншых фальваркаў

(па 8–15 валок) былі створаны ў 1552–1555 гг. у Клецкіх і Пінскіх землях, але балоцістая мясцовасць і аддаленасць ад сплаўных рэк арыентавалі іх вытворчасць у асноўным на мясцовыя рынкі. Працавалі ў фальварачных гаспадарках як нявольная чэлядзь, так і прыгонныя сяляне. Высокую ацэнку эканамічным пераўтварэнням Боны Сфорцы даў М. Доўнар-Запольскі, які адзначаў, што дзякуючы створанай яе намаганнямі фальваркова-прыгонніцкай сістэме Кобрынскае староства ў канцы XVI ст. у параўнанні з яго пачаткам павялічыла вытворчасць у сем разоў.

Бона Сфорца разгарнула гаспадарчае выкарыстанне прыродных багаццяў краю. На еўрапейскі ўзор была пераведзена лясная гаспадарка. Кемлівыя і наватарскія дзеянні каралевы Боны хутка ўзнялі прыбытковасць зямель, садзейнічалі ўцягненню ў рыначныя адносіны сялян і мяшчан, мясцовай шляхты. Бона пачала праводзіць меліярацыю палескіх зямель. Так, на Кобрыншчыне былі пракладзены некалькі каналаў. Сярод іх вылучаецца так званы «Канал каралевы Боны» даўжынёй 20 км, які ўпадае ў раку Мухавец ніжэй Кобрына. Пераўтварэнні ўражвалі сучаснікаў сваёй велічнасцю. Даследчыкі сутыкаюцца з крыніцамі, у якіх жыхары асобных месцаў княства выказвалі жаданне перайсці пад кіраванне Боны. Таксама як і насельніцтва Барысаўскай воласці, якое «са слязьмі ў вачах» прасіла Бону, каб яна ўзяла іх пад сваё кіраванне.

Фінансавыя спадзяванні апраўдалі і шматлікія мястэчкі, якія закладаліся па загаду Боны. Праз Палессе праходзіла некалькі значных трактаў, важнейшым з якіх была «вялікая дарога» з Луцка да Берасця праз Пінск і Кобрын. Над Стаходам пралягалі гасцінцы, якія звязвалі Пінск з Валынню і Літвой. Сюды прыязджалі гандляваць не толькі мясцовыя, але і замежныя купцы. Закладзеныя мястэчкі хутка станавіліся цэнтрамі гандлю і рамёстваў. Для атрымання большага прыбытку шырока практыкавалася перадача мытняў і корчмаў яўрэям.

Праведзеныя ў 1522–1555 гг. пераўтварэнні былі накіраваны на атрыманне высокіх даходаў і прывялі да стварэння новай эфектыўнай сістэмы абкладання сялян падаткамі і павіннасцямі, заснаванай на ўвядзенні новых форм землекарыстання. Аграрная рэформа ў землях Боны Сфорцы праводзілася паводле спецыяльных інструкцый («уставаў»), з якіх вядомы рэдакцыі 1549 і 1552 гг. Распачатая ва ўладаннях каралевы «памера» па яе ініцыятыве таксама была праведзена ў пачатку 1550-х гг. у дзяржаўных староствах Гарадзенскім і Берасцейскім. Асноўныя прынцыпы гэтай рэформы былі выкарыстаны для пераўтварэння гаспадарскіх уладанняў Жыгімонтам Аўгустам у сярэдзіне XVI ст.

## ГАРАДЫ, МЯСТЭЧКІ, ГАНДАЛЬ

У XV – першай палове XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім значна паскорыліся ўрбанізацыйныя працэсы: павялічылася колькасць гарадскіх паселішчаў, умацавалася іх гаспадарчая роля, пашыралася наданне магдэбургскага права, адбывалася заканадаўчае афармленне статусу мяшчан.

У 1441 г. да буйных гарадоў ВКЛ належалі Полацк, Віцебск, Слуцк, Менск, Берасце, Гародня і Навагародак. Большасць гэтых гарадоў, акрамя Слуцка, былі велікакняжацкімі і з'яўляліся адміністрацыйнымі цэнтрамі. З канца XV ст. хутка развіваліся Магілёў і Пінск. Але ў параўнанні з заходнееўрапейскімі краінамі, дзе сярэдні горад налічваў 5–10 тыс. жыхароў, беларускія гарады не былі вялікімі. Да сярэдзіны XVI ст. толькі насельніцтва Полацка дасягала 9–10 тыс. чалавек, а Берасця – 6--7 тыс. Насельніцтва Гародні, Менска, Навагародка ў гэты час не перавышала 5–6 тыс. Жыхары гарадоў складалі не болей 15 % ад усяго насельніцтва краіны.

Дакладна вызначыць колькасць гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд даволі складана. Да гарадскіх паселішчаў у крыніцах XV–XVI стст. ужываюцца розныя найменні: «град», «горад», «месца». Назва «град» выкарыстоўвалася ў адносінах да ўмацаванага паселішча, якім часта выступаў замак князя або феадала. У поўным сэнсе такое пасяленне не з'яўлялася горадам. Назва «месца» магла датычыцца як буйнога горада («место нашо Менъск…»), так і феадальнага двара. Па меркаванні Ю. Бохана, у пачатку XV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім налічвалася не менш за 62 гарады.

Насельніцтва гарадоў было неаднародным па сацыяльнай прыналежнасці, сферы занятку, маёмасным стане («князи и бояре и местичи и черные люди»). Асноўную частку гарадскога насельніцтва складалі мяшчане. Да іх адносіліся ў першую чаргу асабіста свабодныя гандляры і рамеснікі, якія мелі нерухомую маёмасць у горадзе. Тэрмін «мяшчане»/«месцічы» ў дакументах пачаў шырока выкарыстоўвацца з сярэдзіны XV ст. («виленские местичи», «местичи Смоленские», «жаловал есми враду месткому на тых мещан…»). У агульнадзяржаўным заканадаўстве ўпершыню гэты тэрмін ужыты ў агульназемскім прывілеі 1447 г. Казіміра Ягайлавіча. Правы мяшчан як асобнага саслоўя былі аформлены ў Статуце 1529 г. і набылі замацаванне ў статутах 1566 і 1588 гг. Таксама правы мяшчан вызначаліся ў прывілеях гарадам на магдэбургскае права.

Асноўнымі заняткамі мяшчан былі рамёствы і гандаль. Значная частка іх валодала ўчасткамі зямлі – пляцамі (дваровымі, рынкавымі, вулічнымі, прадмеснымі). Заможныя мяшчане валодалі нават зямельнымі надзеламі і маёнткамі з сялянамі. За права валодаць зямлёй яны асабіста неслі вай-

сковую службу, але, у адрозненне ад шляхты, ім не дазвалялася займаць вышэйшыя дзяржаўныя і духоўныя пасады. Прадстаўнікі заможнага мяшчанства часам прымалі ўдзел у важных дзяржаўных падзеях, напрыклад, прысутнічалі на цырымоніях узвядзення на трон вялікіх князёў у 1492 г. і 1544 г. Мяшчане маглі мяняць месца жыхарства, нават выязджаць за мяжу.

Папаўненне гарадскога насельніцтва ў XV – першай палове XVI ст. адбывалася пераважна за кошт актыўнага прытоку ў гарады сялян і сельскіх рамеснікаў. Яны імкнуліся пазбегнуць прыгнёту, набыць больш высокі сацыяльны статус, скарыстацца эканамічнымі магчымасцямі горада. Гарады папаўняліся за кошт замежных купцоў і рамесных майстроў. У Полацку, Берасці, Гародні і некаторых іншых гарадах існавалі трывалыя суполкі нямецкіх мяшчан. Перасяленню рамеснікаў і купцоў спрыялі і ўладальнікі гарадоў, якія прапаноўвалі новым жыхарам «слободы» – часовае вызваленне ад падаткаў і павіннасцей.

На працягу XV – першай паловы XVI ст. распаўсюдзіўся новы тып гарадскіх паселішчаў – мястэчкі. Яны ўзнікалі каля традыцыйных кірмашоў, на скрыжаваннях гандлёвых шляхоў. Звычайна ў такіх пасяленнях не існавала абарончых умацаванняў. Насельніцтва займалася пераважна гандлем і рамёствамі, трымала корчмы, заезджыя двары, значную ролю захоўвалі сельскагаспадарчыя заняткі. Па прыналежнасці мястэчкі, падобна гарадам, падзяляліся на дзяржаўныя, прыватнаўласніцкія і царкоўныя. Шляхі ўтварэння мястэчак былі рознымі. Некаторыя з іх засноўваліся па загаду вялікага князя, шмат мястэчак стваралася ўладальнікамі зямель з дазволу князя (да 1588 г.). Асобныя мястэчкі будаваліся каля замкаў або разам з імі (Іказнь, 1504 г.; Дзісна, 1566 г.). Найбольшая колькасць прыватнаўласніцкіх мястэчак была пераўтворана з буйных сёл. У новы статус былі пераведзены такія сёлы, як Моталь (1554), Дзівін (1566), а іх насельніцтва атрымала статус мяшчан. У 1552 г. як мястэчка Тышкевічаў упершыню згадваюцца Ружаны.

Большасць створаных мястэчак хутка развіваліся. Так, насельніцтва ўтворанага па загаду каралевы Боны мястэчка Моталь за восем гадоў вырасла на 39 % і пераўтварылася ў значны цэнтр рамяства і гандлю. Сюды перасялілася шмат купцоў і рамеснікаў з нямецкіх і італьянскіх зямель. У мястэчку рэгулярна адбываліся кірмашы, меўся вялікі рынак, пад які быў адведзены адзін морг і 2,5 прута зямлі. У сярэдзіне XVI ст. на тэрыторыі Беларусі налічвалася больш за 200 мястэчак, з іх прыкладна 30 знаходзілася на Палессі, каля 70 у Панямонні. Тэрытарыяльна большасць новых пасяленняў была створана на захадзе княства, дзе хутчэй з'явіліся фальваркі. Многія мястэчкі пазней пераўтварыліся ў гарады, іншыя страцілі свой статус і зноў сталі вёскамі.

У XV–XVI стст. у Вялікім Княстве Літоўскім імкліва распаўсюджвалася магдэбургскае права. Пасля Берасця (1390) яго атрымалі такія беларускія гарады, як Слуцк (1441), Гародня (1496), Полацк (1498), Менск (1499), Ваўкавыск (1503), Навагародак (1511), Слонім (1531) і іншыя («место нашо Менъскъ съ права Литовъского и Русского… у право Немецкое, которое зоветься Маитборъское, переменяемъ на вечныи часы»). Найчасцей магдэбургскае права надавалася для паляпшэння эканамічнага развіцця горада і дабрабыту яго насельніцтва, што павялічвала памнажэнне скарбу дзяржавы. Грамата 1503 г. аб наданні магдэбургскага права Ваўкавыску абвяшчае: «хотечи осмотрети абы место Волковыское в людех и в обыходех множилося». Падобная мэта акрэслена ў грамаце 1511 г. Новагародку: «маючы взгляд посполитого доброго размноженья и хотячи положенье места нашого Новогороцкого в мере лепшой поставити, абы люди наши, там мешкаючыи, через вряд добрый а справедливый были размножены». Мястэчкі, як і гарады маглі атрымліваць магдэбургскае права і гербы. Магдэбургскім правам і ўласным гербам з 1494 г. карысталася Высокае.

Магдэбургскае права ў беларускіх гарадах распаўсюджвалася на ўсіх мяшчан-хрысціян, незалежна ад іх канфесійнай прыналежнасці. Прывілеі на самакіраванне вызвалялі гарады ад улады і суда дзяржаўных службоўцаў або адміністрацыі ўладальніка і пазбаўлялі ад феадальнай залежнасці. Магдэбургскае права дазваляла жыхарам стварыць выбарны орган самакіравання – магістрат; мець цэхі; гарантавала права судзіцца толькі ў сваім судзе, распараджацца гарадскімі землямі, усталёўваць і збіраць гарадскія падаткі, ажыццяўляць кантроль за цэнамі, сведчыць грамадзянскія акты і інш.

Гарадская абшчына вызначала колькасць бурмістраў, лаўнікаў, радцаў, уводзіла дадатковыя пасады самакіравання (шафары, шпітальныя апекуны і інш.), звярталася да гаспадароў для зацвярджэння новых ільгот і прывілеяў. Пацвярджэнне, пашырэнне і ўдакладненне норм магдэбургскага права адбывалася шляхам выдання новых грамат.

На чале гарадскога самакіравання быў войт, які ўзначальваў судовую і адміністрацыйную ўладу ў горадзе. Часцей на гэтую пасаду каго-небудзь прызначалі са шляхціцаў або заможных мяшчан, але адзінай сістэмы фарміравання органаў самакіравання не склалася. У большасці гарадоў войта прызначаў вялікі князь або ўладальнік горада. Некаторыя прывілеі прадугледжвалі прызначэнне войта з некалькіх абраных мяшчанамі кандыдатур. У Полацку права на войтаўства меў ваявода. Грамата на магдэбургскае права Камянцу 1503 г. замацоўвала за мяшчанамі права выбіраць войта штогод са свайго асяроддзя. Такім жа чынам выбіралі войта і ў Ружанах.

Магістрат уключаў раду і лаву. Рада складалася з радцаў і бурмістраў і з'яўлялася галоўнай установай самакіравання. Яна займалася адміністра-

цыйнымі справамі і зборам падаткаў, вяршыла суд па маёмасных і грамадзянскіх справах, распараджалася гарадской маёмасцю, забяспечвала абароназдольнасць, дабрабыт і развіццё горада. Лава – выбарны судовы орган самакіравання, які займаўся крымінальнымі справамі гараджан, удзельнічаў у арганізацыі выбараў і інш.

Большасць прывілеяў не вызначалі дакладна колькасць гарадскіх службоўцаў. Грамата на магдэбургскае права Полацку (1498 г.) прадугледжвала абранне 20 радцаў і 2 бурмістраў, прычым палова з іх павінна быць праваслаўнымі, а палова каталікамі. Прывілей Менску (1499 г.) вызначаў 12 радцаў і 2 бурмістры. Прывілей Навагародку (1511 г.) уводзіў двух бурмістраў, шэсць радцаў і восем лаўнікаў з роўным прадстаўніцтвам каталікаў і праваслаўных. Звычайна на чале рады былі два бурмістры, а колькасць радцаў вагалася ад 6 да 24 асоб.

У гарадах з магдэбургскім правам існавалі пэўныя катэгорыі насельніцтва і юрыдыкі (тэрыторыі прыватных уладальнікаў, царквы), непадуладныя магістрату. У асобных гарадах і мястэчках граматы прадугледжвалі пашырэнне ўлады магістрата на такія групоўкі жыхароў. У Дзісне прывілеем на самакіраванне Жыгімонта Аўгуста 1569 г. усе ваенныя і юрыдзічане былі абавязаны несці павіннасці на карысць горада нароўні з мяшчанамі.

Да канца XVI ст. шмат гарадоў і мястэчак Беларусі мелі магдэбургскае права. Яно не толькі садзейнічала эканамічнаму развіццю гарадоў, але таксама спрыяла афармленню мяшчанства ў асобнае саслоўе.

У XV–XVI стст. значнае развіццё атрымаў унутраны і знешні гандаль, павялічылася яго роля ў эканамічным жыцці грамадства. Развіццё рамёстваў, утварэнне фальваркаў, спрыяльная кан'юнктура заходнееўрапейскага рынку забяспечылі ўсталяванне рэгулярных гандлёвых адносін паміж вёскай і горадам; паміж гарадамі княства; асобнымі гарадамі княства і буйнымі еўрапейскімі гандлёвымі цэнтрамі.

Аб умацаванні гандлёвых сувязей паміж горадам і вёскай сведчыць з'яўленне «гандлёвых людзей» – сялян, якія вялі рэгулярны гандаль у горадзе. Гандлёвыя аперацыі сялян звычайна мелі кароткатэрміновы характар. Пасля продажу сельскагаспадарчай або прамысловай прадукцыі сяляне набывалі ў горадзе разнастайныя рамесныя вырабы, патрэбы ў якіх не ў поўнай ступені задавальнялі сельскія рамеснікі. Рознічны гандаль дазваляўся сялянам толькі ў час кірмашоў і штотыднёвых таргоў. У іншыя дні сяляне мелі права на аптовы продаж прадукцыі. На продаж у горад вывозілі свае вырабы і сельскія рамеснікі, але іх магчымасці абмяжоўвалі нормы магдэбургскага права і з'яўленне рамесных цэхаў. Права вольнай куплі тавараў у сельскай мясцовасці мелі мяшчане гарадоў княства.

Значна ўзрасла роля гарадскога рынку. Купцы і рамеснікі займаліся гандлем звычайна асабіста. Мяшчане горада мелі перавагу перад замежнымі купцамі і мясцовымі сялянамі. Звычайна для іншагародніх купцоў на карысць горада ўсталёўвалі спецыяльны падатак – «тарговае», «тарговае меснае». Права на такі падатак прадугледжвалі многія граматы на магдэбургскае кіраванне. Прывілей 1536 г. Магілёву вызначаў памер гэтага збору: «давати тарговае от коня по грошу… от вола, або от яловицы по полгроша…».

Асноўнымі формамі стацыянарнага гандлю ў гарадскіх паселішчах былі крамы, лаўкі, яткі, а перыядычнага – таргі і кірмашы. Права правядзенння таргоў і кірмашоў рэгулявалася вялікім князем наданнем прывілеяў, агаворвалася ў граматах на магдэбургскае кіраванне. Таргі адбываліся кожны тыдзень у вызначаныя дні ў спецыяльна адведзеным месцы. На таргах дазваляўся свабодны аптовы і рознічны гандаль усім удзельнікам. Кірмашы праходзілі 1–3 разы на год у адзін і той жа строга вызначаны тэрмін. Працягласць кірмашоў вагалася ад аднаго дня да месяца, але таксама была дакладна акрэслена. Удзельнікі кірмашоў вызваляліся ад платы мыт і шэрагу падаткаў.

Аб развіцці ўнутранага рынку сведчыць умацаванне гандлёвых адносін паміж рознымі гарадамі княства. Велікакняжацкая грамата 1432 г. Жыгімонта Кейстутавіча Вільні ўзгадвае гандлёвыя сувязі горада з Коўна, Навагародкам, Менскам, Луцкам, Берасцем, Кіевам, Смаленскам. У Менску прадаваліся тавары са Слуцка, Магілёва, Гародні. Амаль з усімі буйнымі гарадамі Беларусі меў трывалыя гандлёвыя стасункі Магілёў.

Асноўным таварам унутранага рынку было збожжа. Яго актыўна набывалі жыхары горада і мясцовыя купцы. Гарады выступалі і месцам набыцця збожжа для далейшага продажу яго за мяжу. Спецыяльныя рынкі, дзе канцэнтравалася збожжа і іншыя тавары, існавалі ў Магілёве, Мсціславе, Гародні. Значнае месца ў гандлёвых аперацыях адводзілася прадукцыі жывёлагадоўлі, промыслаў («от быдла живого и от мяса, вялых и мерзлых, от белужины, осетрыны и от икры осетриное…»).

Унутраныя і рэгіянальныя мытні былі значнай крыніцай павелічэння дзяржаўнага скарбу. Крыніцы сведчаць аб існаванні ў 1480-х гг. мытных камор у Давыд-Гарадку, Тураве, Пінску, Рэчыцы, Гомелі, Мазыры, Прапойску, Крычаве, Мсціславе. Актывізацыя гандлю выклікала ў XVI ст. павелічэнне колькасці мытных камор на гандлёвых шляхах. Звычайна назва такіх камор паходзіла ад назвы горада, каля якога яна засноўвалася. У першай палове XVI ст. згадваюцца Віленская, Полацкая, Смаленская, Дарагіцкая, Бельская, Менская, Берасцейская, Віцебская і шэраг іншых камор. Мытныя кнігі фіксавалі імя гандляра, яго маршрут, назву і колькасць тавару. Спроба гандляра ўхіліцца ад мытнага падатку (схаваць частку тавару, аб'ехаць мытную

камору і інш.) каралася спецыяльным штрафам – «прамыта» («мыто нашо Менское и с промытаю мають мытники наши держати»). Даныя мытных кніг таксама сведчаць аб павелічэнні ў першай палове XVI ст. транзітнага гандлю.

Беларускія купцы вялі актыўны знешні гандаль з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, Маскоўскай дзяржавай. Важнае значэнне для беларускіх зямель меў гандаль з Прусіяй (Каралявец) і Рыгай, узрасла роля Гданьска. На балтыйскія рынкі вывозілі збожжа, футра, скуры, воск, дзёгаць. Развіваліся і іншыя кірункі. Рэестр Люблінскай мытні 1530 г. зафіксаваў купцоў з Берасця, Слуцка, Пінска, Полацка, Віцебска і Смаленска. Актыўна развіваліся гандлёвыя адносіны з такімі польскімі гарадамі, як Кракаў і Познань. З канца XV ст. узрастаў вываз збожжа, ільну. Павялічваўся экспарт жывёлы, асабліва з паўднёвых зямель Вялікага Княства Літоўскага. Калі ў 1510 г. праз Кракаўскую камору было правезена 4424 валы і іншай худобы 1909 галоў, то ў 1533 г. толькі валоў перавезена 30 119, а коней – 630. З рынкаў Заходняй Еўропы пастаўлялі пераважна соль, пэўныя тканіны, жалезныя і ювелірныя вырабы, рамесныя тавары.

Вядучым гандлёвым цэнтрам Беларускага Падзвіння з заходнееўрапейскімі краінамі, Наўгародскімі і Цвярскімі землямі ў першай палове XV ст. з'яўляўся Полацк. У XVI ст. галоўная роля ў ажыццяўленні гандлёвых аперацый у гэтым рэгіёне паступова перайшла да Віцебска. Магілёўскія купцы адыгрывалі важную ролю ў гандлі з Маскоўскай дзяржавай, адкуль паступалі каштоўныя футры, скуры, рамесныя вырабы. З тэрыторыі Беларусі ў адваротным кірунку пастаўлялі як заходнееўрапейскія тавары, так і вырабы мясцовых майстроў. Праз украінскія землі на беларускія рынкі прывозілі турэцкія тавары, шоўк, зброю і інш.

Развіццю гандлю ў значнай ступені садзейнічала геаграфічнае становішча Вялікага Княства Літоўскага. Густая сетка сплаўных рэк (Нёман, Заходняя Дзвіна, Вілія, Заходні Буг, Днепр, Прыпяць, Сож) і разгалінаваныя сухапутныя шляхі стварылі эфектыўную транспартную сістэму і забяспечвалі дастаўку неабходных тавараў.

# 22 ІНФЛЯНЦКАЯ (ЛІВОНСКАЯ) ВАЙНА

- **Уступленне ВКЛ у вайну**
- **Барацьба за Полацк. Завяршэнне першага этапу Лівонскай вайны**
- **Заключны этап вайны і яе вынікі**

## УСТУПЛЕННЕ ВКЛ У ВАЙНУ

У сярэдзіне XVI ст. Лівонія* (ад лац. *Livonia*, старабел. – *Інфлянты*) увайшла ў стадыю глыбокага ўнутранага крызісу і стала аб'ектам увагі з боку сваіх суседзяў, у першую чаргу, Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы. Як Вільня, так і Масква былі зацікаўлены ва ўзмацненні сваіх уплываў у Лівоніі, якая займала стратэгічна важнае геаграфічнае становішча ў Прыбалтыцы. Нарастанне супярэчнасцей паміж дзяржавамі балтыйскага рэгіёна прывяло да пачатку новай шырокамаштабнай вайны.

ВКЛ імкнулася ўзяць Лівонію пад кантроль палітычнымі метадамі. Так, пад пагрозай ваеннага ўмяшання кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст у верасні 1557 г. схіліў Лівонію да заключэння абарончага саюзу. Амаль адначасова актыўныя дзеянні распачала і Маскоўская дзяржава. У студзені 1558 г. войскі вялікага князя маскоўскага Івана IV уварваліся ў Лівонію і да лета захапілі Усходнюю Эстонію. У канфлікт умяшалася

* Канфедэрацыя, якая складалася з пяці царкоўна-феадальных дзяржаў: Лівонскага ордэна, Рыжскага арцыбіскупства, а таксама Дэрпцкага, Эзельскага і Курляндскага біскупстваў, была ўтворана ў XIII ст. на землях Усходняй Прыбалтыкі (суч. Латвія і Эстонія), заселеных плямёнамі ліваў, куршаў, земгалаў, селаў, латгалаў і эстаў, нямецкімі каланізатарамі.

Дацкае каралеўства, якое ўзяло пад свой кантроль частку Заходняй Эстоніі. Лівонская дзяржава не мела сіл і рэсурсаў супрацьстаяць маскоўскай агрэсіі. Яна звярнулася па дапамогу да Вялікага Княства Літоўскага. У сакавіку 1559 г. Лівонскі ордэн заключыў з Маскоўскай дзяржавай перамір'е на шэсць месяцаў і распачаў перамовы аб саюзе з ВКЛ.

Кіраўніцтва Вялікага Княства не збіралася проста так саступаць Лівонію, якая мела важнае ваенна-стратэгічнае і эканамічнае значэнне. Валоданне гэтымі землямі давала магчымасць забяспечваць свабодную навігацыю па Дзвіне і выхад да порта Рыгі, што было надзвычай значным для экспарту ў краіны Заходняй Еўропы збожжа і іншых тавараў з ВКЛ, асабліва з паўночна-ўсходніх зямель Беларусі. Лівонія таксама з'яўлялася зручным плацдармам для ўдару па паўночных раёнах Маскоўскай дзяржавы ў выпадку вайны. Нарэшце, беларуская і літоўская шляхта магла разлічваць на атрыманне зямель у Лівоніі, якія былі багатай крыніцай збожжа і прадукцыі дрэваапрацоўкі («лясных тавараў»).

31 студзеня 1559 г. прадстаўнікі Лівонскага ордэна падпісалі ў Вільні дамову, паводле якой ордэнскія землі траплялі пад асабістую пратэкцыю караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста. ВКЛ абавязвалася абараняць Лівонію і вярнуць захопленыя маскоўскім войскам тэрыторыі. Частка лівонскіх зямель была закладзена Вялікаму Княству, у некаторыя замкі ўводзіліся войскі ВКЛ. Фактычна заключэнне гэтай дамовы азначала ўступленне Вялікага Княства Літоўскага ў Лівонскую вайну.

Спробы дыпламатычнага вырашэння канфлікту ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай поспехаў не прынеслі. Улетку 1560 г. адбыліся першыя баявыя сутыкненні войскаў абедзвюх дзяржаў, аднак збольшага яны мелі лакальны характар. Летам 1561 г. у канфлікт уступіла Шведскае каралеўства, войскі якога ўзялі пад свой кантроль Рэвель (сучасны Талін), адзін з важнейшых партоў і замкаў у Лівоніі. Вялікае Княства апынулася ў стане вайны і са Швецыяй, хоць ваенныя дзеянні паміж імі так і не набылі шырокага размаху.

Тым часам паміж ВКЛ і Лівонскім ордэнам працягваліся перамовы аб далейшым лёсе апошняга. 28 лістапада 1561 г. у Вільні была падпісана чарговая дамова, паводле якой змяняўся дзяржаўны статус Лівоніі. Землі Лівонскага ордэна перайшлі пад пратэктарат Жыгімонта Аўгуста, як уладара Польшчы і ВКЛ. Лівонская дзяржава была падзелена на Курляндскае і Земгальскае герцагства і Задзвінскае княства, а былы магістр ордэна Г. Кетлер стаў васалам караля польскага і вялікага князя літоўскага. Тым не менш Лівонія захавала даволі шырокую ўнутраную аўтаномію. Акрамя таго, Рыга, хоць і згаджалася на ваеннае супрацоўніцтва з Вялікім Княствам, гэтай дамовы не прызнала і заставалася незалежнай яшчэ да 1581 г.

Вынікі віленскай дамовы 1561 г. былі даволі неадназначнымі. З аднаго боку, пад кантроль ВКЛ пераходзіла большая частка Лівоніі. З другога боку, літвіны не атрымалі тут ні дзяржаўных пасад, ні зямельных уладанняў, а толькі неабходнасць абароны гэтых зямель за ўласны кошт. Акрамя таго, новая шырокамаштабная вайна з Маскоўскай дзяржавай была непазбежнай.

І сапраўды, ужо ўвесну 1562 г. пачаліся даволі маштабныя баявыя дзеянні паміж войскамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, прычым на землях Беларусі. У сакавіку маскоўскія атрады рабілі набегі на памежныя раёны Полаччыны, ваколіцы Оршы, Дуброўна, Мсціслава, Копысі, Шклова, Магілёва, Чачэрска і Прапойска (суч. Слаўгарад). У маі маскоўскае войска беспаспяхова спрабавала захапіць Віцебск. Атрады ВКЛ адказалі паходамі на Смаленшчыну, Веліж, Себеж і Апочку. Да таго ж па дамоўленасці з літвінамі ў ліпені 1562 г. крымскія татары здзейснілі набег на тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы, што прымусіла Івана IV адкласці на пэўны час падрыхтоўку да маштабнага паходу на Вялікае Княства. Летам – восенню 1562 г. лакальныя баявыя сутыкненні працягваліся. У жніўні пад Невелем атрад у 1,5–2 тыс. палякаў і літвінаў (па іншых даных 4 тыс. чалавек) нанёс адчувальнае паражэнне маскоўскаму войску колькасцю ў 15 тыс. ратнікаў. У выніку бітвы маскоўцы страцілі, па розных ацэнках, ад 1,5 да 7–8 тыс. чалавек, у той час як саюзнікі – усяго 15–16 жаўнераў. У верасні атрады ВКЛ здзяйснялі выправы на ваколіцы Себежа і Старадуба. Да зімы 1562 г. ваенныя дзеянні былі часова прыпынены. Аднак ужо ўвосень 1562 г. Іван IV пачаў рыхтаваць буйны ваенны паход супраць ВКЛ. Мэтай удару стаў Полацк, захоп якога перадаваў бы ў рукі маскоўцаў стратэгічную перавагу фактычна на ўсім тэатры баявых дзеянняў.

## БАРАЦЬБА ЗА ПОЛАЦК. ЗАВЯРШЭННЕ ПЕРШАГА ЭТАПУ ЛІВОНСКАЙ ВАЙНЫ

Паход на Полацк узначаліў асабіста Іван IV, узяўшы з сабой дзеля ідэалагічнага абгрунтавання сваёй агрэсіі крыж Ефрасінні Полацкай. Збор маскоўскага войска адбыўся ў пачатку студзеня 1563 г. у Вялікіх Луках. Сілы маскоўцаў складалі каля 60 тыс. жаўнераў, без уліку розных дапаможных сіл, а таксама каля 150–200 гармат. Па іншых даных, відавочна завышаных, колькасць арміі сягала да 200–300 тыс. чалавек. Войска ж ВКЛ пад кіраўніцтвам вялікага гетмана Мікалая Радзівіла Рудога ў пачатку 1563 г. налічвала 3400 жаўнераў.

Ужо 31 студзеня 1563 г. маскоўская армія падышла да Полацка. Вялікае Княства Літоўскае аказалася зусім не падрыхтаваным да такой сітуацыі.

Гарнізон Полацка складаў толькі каля 2500 чалавек і меў ад 20 да 40 гармат. Кіраваў абаронай горада полацкі ваявода Станіслаў Давойна.

Полацк быў акружаны маскоўцамі. Непасрэдна да гарадскога пасада падцягнулі гарматы, у тым ліку і цяжкія. Атрады М. Радзівіла Рудога знаходзіліся за 40 км ад горада. У такіх умовах С. Давойна прыняў даволі спрэчнае рашэнне спаліць гарадскі пасад і адступіць у Верхні замак. Гэта дазволіла маскоўскім войскам падцягнуць цяжкую артылерыю непасрэдна да замкавых сцен. Акрамя таго, пачаліся канфлікты і сярод кіраўніцтва асаджанага гарнізона. 13–14 лютага адбываўся пастаянны масіраваны абстрэл замка. Маскоўцам удалося падпаліць сцены. 15 лютага 1563 г. Полацк капітуляваў. Пасля захопу горада царскія татары па-зверску забілі манахаў-бернардынцаў, а Іван IV асабіста загадаў утапіць у Дзвіне ўсіх мясцовых яўрэяў. Тысячы полацкіх мяшчан, а таксама шляхта былі вывезены ў Маскоўскую дзяржаву. ВКЛ згубіла ініцыятыву ў вайне і вымушана было як мага хутчэй пайсці на спыненне баявых дзеянняў.

Нягледзячы на перамір'е, маскоўскія войскі працягвалі рэйды ў глыб тэрыторыі ВКЛ, менавіта на левабярэжную Полаччыну. Са свайго боку, кіраўніцтва Вялікага Княства выкарыстоўвала дыпламатычныя захады, каб выйграць час для падрыхтоўкі рэваншу. Так, у снежні 1563 г. у Маскве знаходзілася вялікае пасольства ВКЛ у складзе крайчага Юрыя Хадкевіча, гаспадарскага маршалка Рыгора Валовіча і пісара Міхала Гарабурды. Аднак перамовы з-за прынцыпова розных патрабаванняў абодвух бакоў скончыліся няўдала. Маскоўская дзяржава прыступіла да падрыхтоўкі чарговага буйнамаштабнага паходу на Вялікае Княства Літоўскае.

У студзені 1564 г. у глыб тэрыторыі ВКЛ рушылі дзве вялікія маскоўскія групоўкі. Першая, якая выйшла з Полацка, налічвала каля 17–18 тыс. чалавек (па некаторых звестках – да 30 тыс.), узначальваў яе Пётр Шуйскі. Другая групоўка на чале з Васілём Сярэбраным рухалася са Смаленска і складалася недзе з 50 тыс. жаўнераў. Планавалася, што абедзве групоўкі злучацца пад Оршай і працягнуць наступленне далей у напрамку Менска і Навагародка, *«чинечи плен и шкоду...»*. У сваю чаргу, войска ВКЛ на той момант складала, па розных даных, ад 4 да 10 тыс. чалавек.

Атрымаўшы дакладныя звесткі аб прасоўванні групоўкі П. Шуйскага, М. Радзівіл Руды рушыў ёй насустрач да ракі Улы. Войска ВКЛ скарыстала фактар нечаканасці і 26 студзеня 1564 г. каля с. Іванаўскае нанесла раптоўны ўдар. Нягледзячы на сваю колькасную перавагу, маскоўскае войска не здолела аказаць арганізаванага супраціўлення і было цалкам разбіта. У палон трапіла ўсё вышэйшае камандаванне дадзенай групоўкі, а сам П. Шуйскі быў забіты. Ульская бітва была адной з самых значных

перамог войска ВКЛ у гады Лівонскай вайны. У ёй вызначыліся ротмістры Баркулаб Корсак, Рыгор Бака, Юрый Зяновіч, князь Багдан Саламярэцкі.

Вялікую небяспеку несла і другая маскоўская групоўка. Супраць яе выступіў аршанскі староста Філон Кміта-Чарнабыльскі на чале войска, якое налічвала ўсяго толькі ад 500 да 2000 вершнікаў. У пачатку лютага 1564 г. войска В. Сярэбранага атрымала дэзінфармацыю, што да яго падыходзяць асноўныя сілы ВКЛ. Таму, сутыкнуўшыся з невялікім атрадам Ф. Кміты, маскоўцы прынялі яго за галоўнае войска Вялікага Княства і панічна адступілі да Смаленска. Такім чынам, планы вялікага паходу ў глыб ВКЛ былі сарваны, маскоўскае войска панесла велізарныя страты, але вызваліць занятыя землі літвіны не здолелі.

У верасні 1564 г. Вялікае Княства паспрабавала арганізаваць ваенную кампанію, мэтай якой было вызваленне Полацка. Саюзнае войска, складзенае з літвінаў і палякаў, колькасцю звыш 9 тыс. чалавек 16 верасня падышло да горада. Аднак саюзнікі спадзяваліся на бітву ў адкрытым полі і не былі падрыхтаванымі да асады. У сваю чаргу, маскоўцы зачыніліся ў горадзе, гатовыя да працяглай асады. У пачатку кастрычніка літвінам і палякам прыйшлося адступіць. Да таго ж у лістападзе 1564 г. значныя сілы Маскоўскай дзяржавы, якія рухаліся на дапамогу асаджанаму гарнізону ў Полацку, захапілі замак Азярышча. ВКЛ не здолела развіць поспех пачатку 1564 г. Усё больш відавочным станавілася тое, што яно не мае дастатковых фінансавых і людскіх рэсурсаў, каб самастойна арганізаваць эфектыўнае і паспяховае ваеннае супраціўленне Маскоўскай дзяржаве.

У 1565–1566 гг. вайна набыла характар невялікіх лакальных сутычак. Палякі і літвіны неаднаразова здзяйснялі напады на падкантрольную маскоўцам частку Лівоніі і Пскоўшчыну. На ўсходнім памежжы аб'ектам для паходаў атрадаў ВКЛ сталі Смаленск, Почап, Старадуб, Чарнігаў, Рослаў, Севершчына і інш. Асабліва ў гэтых паходах вызначыўся Ф. Кміта-Чарнабыльскі. Даволі актыўна праявіў сябе ў гэты час і віцебскі ваявода Станіслаў Пац, які неаднаразова арганізоўваў ваенныя паходы на Усвяты і Веліж. Маскоўцы спрабавалі трывала замацавацца на захопленых землях. Так, на Полаччыне былі пабудаваны невялікія, але добра ўмацаваныя замкі Коп'е, Сокал, Ула, Усвяты і інш. На пэўнае суцішванне баявых дзеянняў паўплывалі фінансавыя і ўнутрыпалітычныя цяжкасці ў абедзвюх дзяржавах, а таксама эпідэмія чумы.

Аднавіліся дыпламатычныя кантакты. Улетку 1566 г. у Маскве знаходзілася вялікае пасольства ВКЛ у складзе трокскага кашталяна Юрыя Хадкевіча, берасцейскага ваяводы Юрыя Тышкевіча і пісара Міхала Гарабурды. Вынікам перамоў стала заключэнне перамір'я да восені 1567 г. Палітычная

эліта ВКЛ цвёрда імкнулася захаваць лівонскія землі за сабой. На сойме ў Гародні ў канцы 1566 г. была зацверджана унія Лівоніі з Вялікім Княствам Літоўскім, паводле якой яны аб'ядналіся на *«вечныя часы»*, як *«адзіны народ»*.

Нягледзячы на перамір'е, ужо летам 1567 г. баявыя дзеянні аднавіліся. Адбываліся яны даволі паспяхова для ВКЛ і былі звязаны з прызначэннем выконваючым абавязкі польнага гетмана Рамана Сангушкі. У ліпені каля возера Суша Р. Сангушка на чале 2 тыс. нанятых жаўнераў нечакана напаў на маскоўскі лагер і разбіў 8-тысячную варожую групоўку. У верасні 1567 г. менш за 3 тыс. чалавек на чале з Р. Сангушкам разбілі 9 тыс. маскоўцаў.

Увосень 1567 г. Вялікае Княства Літоўскае прыступіла да арганізацыі шырокамаштабнай ваеннай аперацыі супраць Маскоўскай дзяржавы. Пад Маладзечна і Радашковічамі адбыўся збор паспалітага рушэння. У рушэнне выйшла каля 30 тыс. шляхціцаў, яго ўзначаліў асабіста Жыгімонт Аўгуст. З улікам нанятых і польскіх атрадаў, было сабрана войска колькасцю каля 50 тыс. чалавек. Аднак ніякіх актыўных баявых дзеянняў не праводзілася. Час быў змарнаваны, і шляхта пачала проста раз'язджацца па дамах. Зноў усё абмежавалася лакальнымі аперацыямі. У лютым 1568 г. частка войска ВКЛ на чале з Я. Хадкевічам паспрабавала захапіць замак Ула, але трохтыднёвая асада ніякіх вынікаў не прынесла. Літвіны адступілі са значнымі стратамі. Прыкладна ў той жа час Ф. Кміта-Чарнабыльскі арганізаваў даволі ўдалы паход пад Смаленск, падчас якога быў разбіты значны маскоўскі атрад.

Тым не менш 1568 г. прынёс пэўнае паляпшэнне становішча ВКЛ у Лівонскай вайне. Па-першае, у тым годзе новым каралём Швецыі стаў Ёхан III, швагер Жыгімонта Аўгуста. Швецыя з праціўніка ператварылася ў саюзніка Вялікага Княства і ў тым жа годзе пачала вайну з Маскоўскай дзяржавай. Па-другое, у жніўні 1568 г. войскі ВКЛ на чале з Р. Сангушкам ўсё ж здолелі захапіць Улу. Падчас захопу такога важнага на гэтым тэатры баявых дзеянняў замка вызначыліся ротмістры Рыгор Война, князь Багдан Лукомскі, М.* Салагуб, Юрый Тышкевіч. У адказ 6-тысячнае маскоўскае войска ў верасні 1568 г. паспрабавала авалодаць Віцебскам, але на трэці дзень аблогі з-за актыўнага супраціўлення абаронцаў вымушана было адступіць ні з чым.

Такім чынам, ініцыятыва ў вайне паступова пераходзіла на бок літвінаў. Аднак ВКЛ, як і Маскоўская дзяржава, было знясілена ад працяглай вайны. Для ўсіх варагуючых бакоў патрабавалася перадышка. І хоць баявыя дзеянні працягваліся і ў 1569 г. (напрыклад, літвіны ў студзені на некаторы час нават

---

* Звестак пра імя не захавалася.

захапілі замак Ізборск на Пскоўшчыне), абодва бакі схіляліся да заключэння перамір'я. Актыўныя баявыя дзеянні, частыя падаткі, пастоі войскаў, неўраджаі прывялі Вялікае Княства да гаспадарчага крызісу. Фінансавых сродкаў для далейшага вядзення вайны па сутнасці не мелася, шляхта была знясілена пастаяннымі выплатамі грошай. Катастрафічна не хапала фінансавых сродкаў на разлік з праслужыўшымі жаўнерамі і найм новых, на забеспячэнне памежных замкаў людзьмі, зброяй і боепрыпасамі. Так, у сакавіку 1569 г. віленскі ваявода і канцлер М. Радзівіл Руды выступаў за заключэнне міру з Масквой, які *«естъ велми потребный под тым часом, трудностей и недостатку нашого»*. У крызісным становішчы знаходзілася і Маскоўская дзяржава. Менавіта цяжкае становішча ў Лівонскай вайне было адной з важнейшых прычын, па якіх Вялікае Княства Літоўскае пайшло на заключэнне рэальнай уніі з Каралеўствам Польскім у Любліне 1 ліпеня 1569 г.

На Люблінскім сойме 1569 г. было вырашана адправіць у Маскву вялікае пасольства новаўтворанай Рэчы Паспалітай, якое б распачало перамовы аб перамір'і. 22 чэрвеня 1570 г. пасольства Рэчы Паспалітай у складзе інаўроцлаўскага ваяводы Яна Кратоскага (прадстаўнік Польшчы), менскага кашталяна Мікалая Тальваша, старосты радзяеўскага Рафала Ляшчыньскага (прадстаўнік Польшчы) і каралеўскага сакратара, падкаморага навагародскага Андрэя Харытонавіча-Абрынскага ў Маскве заключыла перамір'е з Маскоўскай дзяржавай на тры гады (да 29 чэрвеня 1573 г.). Краіны захоўвалі за сабой тыя тэрыторыі, якімі валодалі на дадзены момант (перамір'е на ўмовах uti possidetis). Такім чынам, да Маскоўскай дзяржавы адыходзіла значная частка Лівоніі, паўночная Полаччына разам з Полацкам, частка Віцебскага ваяводства з гарадамі Азярышча і Усвяты. Увесну 1571 г. Жыгімонт Аўгуст прыняў пасольства ад Івана IV і ратыфікаваў перамір'е. Зразумела, палітычная эліта ВКЛ, ды ўсёй Рэчы Паспалітай, сам манарх не маглі пагадзіцца са стратай значных тэрыторый у Лівоніі і Вялікім Княстве, таму далейшы працяг вайны быў толькі пытаннем часу. Заўважым таксама, што ў 1571 г. у Шчэціне мірны трактат падпісалі паміж сабой Швецыя і Данія.

## ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП ВАЙНЫ І ЯЕ ВЫНІКІ

Утварэнне Рэчы Паспалітай значна змяняла баланс сіл у канфлікце вакол Лівоніі. Паводле рашэнняў Люблінскага сойма 1569 г. Лівонія станавілася кандамініумам (супольным уладаннем) Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага, а Курляндскае і Земгальскае герцагства пераходзіла ў падвойную васальную залежнасць ад Польшчы і ВКЛ. Вялікае Княства магло разлічваць на фінансавую і ваенную дапамогу з боку Польшчы. Тым

больш, што акт Люблінскай уніі абавязваў, каб у Рэчы Паспалітай *«адзін бок другому быў радай і дапамогай»*.

Аб неабходнасці супольна супрацьстаяць Маскоўскай дзяржаве палітычная эліта ВКЛ нагадвала сваім польскім партнёрам адразу пасля заключэння уніі: яшчэ на Люблінскім сойме 1569 г., на павятовых сойміках і вальным сойме ў 1570 г. Каронная шляхта хоць і выказвалася аб гатоўнасці дапамагчы Вялікаму Княству, рэальных захадаў так і не рабіла. Нічога не пастанавіў аб супольнай абароне і вальны сойм Рэчы Паспалітай 1572 г., апошні пры жыцці Жыгімонта Аўгуста. Як адзначаў яшчэ ў лютым 1570 г. вялікі гетман ВКЛ Рыгор Хадкевіч у лісце да Р. Сангушкі, у справе абароны *«...панове корунные, ставши ся однымъ члонкомъ и нероздельнымъ теломъ с князьством Литовском, заровно прикладать не хочете»*.

Пасля смерці Жыгімонта Аўгуста ў ліпені 1572 г. у Рэчы Паспалітай пачалося першае бескаралеўе. Палітычная барацьба вакол выбараў новага караля і вялікага князя, якая разгарнулася як у Польшчы, так і ў ВКЛ, часова адсунула пытанне працягу Лівонскай вайны на другі план. Тым не менш у Вялікім Княстве пастаянна адчувалі небяспеку аднаўлення баявых дзеянняў з боку Маскоўскай дзяржавы. Таму літвіны прыкладалі ўсе магчымыя намаганні ў дыпламатычнай сферы, каб захаваць мірныя адносіны з Масквой.

Так, з элекцыйнага сойма 1573 г. у Маскоўскую дзяржаву былі накіраваны ганцы Рэчы Паспалітай Фёдар Варапай і Анджэй Тараноўскі (прадстаўнік Польшчы), якія здолелі працягнуць перамір'е яшчэ на год – да 15 жніўня 1574 г. У ліпені 1574 г. у Маскву накіраваліся чарговыя ганцы: каралеўскія сакратары Мацей Пратасовіч з Вялікага Княства і Барталамей Завадскі з Кароны. Яны ў канцы жніўня 1574 г. дамовіліся аб працягу перамір'я Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай яшчэ на два гады, да 15 жніўня 1576 г. Акрамя таго, значная частка палітычнай эліты ВКЛ ужо ў верасні 1572 г. на з'ездзе ў Рудніках пад Вільняй распачала дыпламатычную гульню з Маскоўскай дзяржавай. Літвіны паведамілі Маскве, што гатовы распачаць перамовы аб абранні каралём польскім і вялікім князем літоўскім або самога Івана IV, або кагосьці з яго двух сыноў. Аднак сапраўднай мэтай гэтай прапановы была нейтралізацыя ваеннай небяспекі з боку вялікага князя маскоўскага. Пакуль ішлі перамовы, можна было спадзявацца, што Маскоўская дзяржава не распачне баявых дзеянняў супраць Рэчы Паспалітай, якая апынулася ў цяжкім палітычным становішчы. На сур'ёзную падтрымку ў ВКЛ і Польшчы Івану IV разлічваць было вельмі цяжка. Сутнасць гэтай дыпламатычнай гульні ў 1574 г. вельмі трапна ахарактарызаваў Ф. Кміта-Чарнабыльскі: *«Солгавшы спаслися. Бо без напасти от него* (Івана IV. – *Аўт.*) *б не быть... Да только то мне росказывано от всех, хто*

*был на зъезде Рудницком и хто не был, звлаща иж о Литву шло... Ино от него Бог збавил».* Аб тым, што гэта была толькі спроба зацягнуць час, ускосна сведчыць і тое, што ў перамовах з прадстаўнікамі іншых кандыдатаў на ўладу ў Рэчы Паспалітай палітычная эліта ВКЛ пастаянна вылучала пастулат аб аднаўленні былых межаў Вялікага Княства, а фактычна аб працягу вайны з Масквой. Тым не менш «маскоўская» кандыдатура ў шляхецкім асяроддзі Вялікага Княства, асабліва ў часы другога бескаралеўя (1574–1576) сапраўды мела пэўную папулярнасць. Меркавалася, што абранне вялікага князя маскоўскага Івана IV або яго сына Фёдара каралём Рэчы Паспалітай, па-першае, спыніць войны паміж краінамі, па-другое, дазволіць вярнуць у склад ВКЛ страчаныя землі.

Хоць фармальна паміж дзяржавамі існавала перамір'е, сітуацыя ў Лівоніі для Рэчы Паспалітай была вельмі складанай. Яшчэ ў 1570 г. дацкі каралевіч Магнус прынёс васальную прысягу Івану IV і быў прызначаны кіраўніком Лівоніі. Магнус у парушэнне ўмоў перамір'я з ведама вялікага князя маскоўскага нападаў на падкантрольную Рэчы Паспалітай тэрыторыю правінцыі. Так, ужо ў пачатку 1575 г. маскоўскія войскі пад фармальным кіраўніцтвам Магнуса спустошылі ваколіцы замкаў Пернава (суч. Пярну), Руен, Буртнек, Гельмет, Лемзаль. На мяжы вясны і лета 1575 г. васал Івана IV захапіў Эрмес, Гельмет, Руен, а 9 ліпеня – Пернаву. Акрамя таго, Маскоўская дзяржава ў тым жа годзе заключыла двухгадовае перамір'е са Швецыяй, што давала ёй магчымасць сканцэнтраваць усе сілы на далейшым падпарадкаванні Лівоніі.

Пасля працяглай палітычнай барацьбы ў 1576 г. новым каралём польскім і вялікім князем літоўскім стаў трансільванскі князь Стэфан Баторый. Пэўная стабілізацыя ўнутранага грамадска-палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай давала магчымасць дзейнічаць у Лівоніі больш актыўна. Аднак яшчэ Гданьск не прызнаваў уладу новага караля, таму Стэфан Баторый спачатку скіраваў свае сілы супраць мяцежнага горада, а з Маскоўскай дзяржавай пачаў мірныя перамовы. Тым больш што тэрмін перамір'я заканчваўся 15 жніўня 1576 г. Праўда, спадзявацца на спрыяльны вынік гэтых перамоў не прыходзілася. Магнус працягваў захопліваць замкі ў Лівоніі (напрыклад, у кастрычніку 1576 г. быў заняты замак Лемзаль), а ў Маскве адназначна падкрэслівалі свае правы на валоданне Полацкам і лівонскімі землямі.

Пасля заканчэння вальнага сойма 1576 г. быў вызначаны склад новага вялікага пасольства Рэчы Паспалітай у Маскву. У яго ўвайшлі мазавецкі ваявода Станіслаў Крыскі (прадстаўнік Польшчы), менскі ваявода Мікалай Сапега і падскарбі дворны і пісар ВКЛ Фёдар Скумін-Тышкевіч. Аднак Іван IV, не дачакаўшыся прыезду пасольства ў Маскоўскую дзяржаву, улетку 1577 г. аднавіў баявыя дзеянні.

Сітуацыя ў вайне для ВКЛ стала крытычнай. 30-тысячнае войска Івана IV у ліпені ўвайшло на тэрыторыю правінцыі, і на працягу жніўня ўся Лівонія па правым беразе Заходняй Дзвіны, за выключэннем Рыгі з ваколіцамі і Курляндыі, была пад уладай маскоўцаў. Варожае войска падышло амаль што да меж Вялікага Княства. Літвіны пачалі тэрмінова шукаць сродкі на абарону. Галоўны соймік ВКЛ ужо ў ліпені 1577 г. ухваліў падатак на абарону, але грошы збіраліся марудна і не маглі забяспечыць усіх вайсковых патрэб краіны. У жніўні ў Вялікім Княстве быў абвешчаны збор паспалітага рушэння, але і на яго надзей было няшмат. Як адзначаў польны гетман Крыштаф Радзівіл, ніхто ў ВКЛ выходзіць у рушэнне не жадаў, пакуль яго не ўзначаліў бы асабіста Стэфан Баторый. У лістападзе 1577 г. літвінам удалося дасягнуць некаторых поспехаў у Лівоніі: былі ўзяты Дынабург (суч. Даўгаўпілс) і Вендэн (суч. Цэсіс). Аднак кардынальна сітуацыю ў правінцыі гэта не змяніла. Толькі ўлагодзіўшы канфлікт з Гданьскам у снежні 1577 г., кароль і вялікі князь здолеў сканцэнтраваць усю ўвагу на вайне з Маскоўскай дзяржавай.

Са студзеня па сакавік 1578 г. праходзіў вальны сойм Рэчы Паспалітай, на якім абмяркоўвалася вайна з Іванам IV. Імкненне Стэфана Баторыя пераламіць ход барацьбы за Лівонію і вызваліць захопленыя беларускія землі адпавядала інтарэсам палітычнай эліты ВКЛ, таму літвіны згадзіліся з планамі вядзення вайны з Маскоўскай дзяржавай і ўзялі актыўны ўдзел у абмеркаванні стратэгіі і тактыкі будучай вайсковай кампаніі. Сенатары і земскія паслы Вялікага Княства на сойме ўхвалілі двухгадовы падатак на вядзенне вайны. Цікава, што ў гэты ж час у Маскве знаходзіліся паслы Рэчы Паспалітай, якія вялі перамовы аб заключэнні доўгатэрміновага перамір'я з Маскоўскай дзяржавай. Перамовы гэтыя аказаліся вельмі складанымі. Іван IV быў упэўнены ў сваёй ваенна-палітычнай перавазе над Рэччу Паспалітай і навязваў пасольству непрымальныя ўмовы міру. У выніку было ўзгоднена перамір'е на тры гады, якое Стэфан Баторый так і не ратыфікаваў.

Хоць падаткі былі ўхвалены, падрыхтоўка да новай ваеннай кампаніі вельмі зацягнулася. У сваю чаргу, маскоўскія войскі ўвосень 1578 г. актывізавалі свае дзеянні ў Лівоніі не толькі супраць Рэчы Паспалітай, але і супраць Швецыі. У кастрычніку імі быў узяты падкантрольны шведам замак Обэрпален. Пасля гэтага войскі Маскоўскай дзяржавы колькасцю ў 15–18 тыс. чалавек, узмоцненыя артылерыяй (64 гарматы), накіраваліся да Вендэна. Горад займаў даволі важнае стратэгічнае становішча ў цэнтральнай Лівоніі, і кантроль над ім адкрываў непасрэдны шлях да Рыгі. Ужо 14 кастрычніка маскоўцы падышлі пад сцены замка, а 15 кастрычніка горад быў узяты ў аблогу, і пачаўся масіраваны артылерыйскі агонь па замкавых

умацаваннях. Да Вендэна накіраваліся атрады Рэчы Паспалітай на чале з ротмістрам Андрэем Сапегам. Па дарозе ён злучыўся яшчэ і са шведскім атрадам. Колькасць аб'яднанага войска складала ад 4500 да 5500 жаўнераў, а агульнае кіраванне ім належала А. Сапегу.

Саюзнікі падышлі да Вендэна 21 кастрычніка 1578 г. і пачалі пераправу праз раку. Маскоўцы, убачыўшы малалікасць праціўніка, не перашкаджалі іх пераправе. Гэта была памылка, якая стала вызначальнай для далейшага ходу падзей. Кіраўніцтва маскоўскага войска было ўпэўнена, што не будзе ніякіх цяжкасцей разграміць сілы А. Сапегі ў адкрытай палявой бітве: *«...и триумфовали Москва, малость люду нашого вжо перепpавленого видечи тамъ»*. Аб'яднаныя войскі Рэчы Паспалітай і Швецыі без праблем пераправіліся праз раку і ў адкрытым полі сышліся з маскоўцамі. На маскоўскім баку была колькасная перавага, а на баку саюзнікаў – лепшая тактычная падрыхтоўка. І на гэты раз праявілася перавага войскаў ВКЛ і Польшчы над войскам Маскоўскай дзяржавы. Маскоўцы не вытрымалі ўдару вопытнай і добра падрыхтаванай кавалерыі саюзнікаў на чале з А. Сапегам і пачалі адступаць. Хутка адступленне набыло характар бегства. Пераслед і знішчэнне ворага працягваліся на працягу дзвюх міляў, *«поки поля ставало вьдолжъ»*. Частка маскоўскага войска, якая не была разбіта і рассеяна, укрылася ў акопах і працягвала ўпарта абараняцца пры сваёй артылерыі. Аб'яднанае войска Рэчы Паспалітай і Швецыі штурмавала маскоўскія пазіцыі да раніцы наступнага дня. У выніку 22 кастрычніка 1578 г. лагер быў захоплены, а войска Маскоўскай дзяржавы цалкам разгромлена. Былі забіты ці ўзяты ў палон амаль усе кіраўнікі маскоўцаў, у якасці трафея пераможцы таксама захапілі дзясяткі гармат, у тым ліку цяжкіх, прызначаных спецыяльна для асады замкаў.

Бітва пад Вендэнам стала па сутнасці прадвеснікам карэннага пералому ў ходзе Лівонскай вайны. Ініцыятыва ў баявых дзеяннях зноў пераходзіла на бок ВКЛ і Польшчы. Поўны разгром маскоўскіх войскаў быў выкарыстаны ў прапагандысцкіх мэтах і шмат у чым прадвызначыў змену грамадскіх настрояў у ВКЛ адносна перспектыў далейшага працягу вайны з Маскоўскай дзяржавай.

На пазіцыю шляхты паўплываў і прыезд у лютым 1579 г. у Вялікае Княства самога Стэфана Баторыя. На лютаўскім з'ездзе ў Гародні літвіны за свой кошт выставілі на вайну ад 8 да 10 тыс. жаўнераў, магнаты са сваіх маёнткаў накіравалі сялян з рыштункам для прац у войску, а таксама выдалі значную колькасць збожжа, валоў. На два гады быў працягнуты збор мыта, а шляхта на павятовых сойміках згадзілася выйсці ў паспалітае рушэнне. Акрамя таго, трымальнікі гаспадарскіх маёнткаў (галоўным чынам магнатэрыя) абавязаліся выдаць на вядзенне вайны 100 000 польскіх злотых.

Стэфан Баторый не марудзячы прыступіў непасрэдна да падрыхтоўкі ваеннай кампаніі і 26 чэрвеня 1579 г. у Вільні ўрачыста абвясціў вайну Івану IV. Галоўнай мэтай кампаніі стала вызваленне Полацка, што давала кантроль за навігацыяй па Дзвіне. Войска Рэчы Паспалітай налічвала больш за 41 тыс. чалавек, з якіх каля 23 тыс. жаўнераў выстаўляла непасрэдна ВКЛ. У канцы ліпеня – пачатку жніўня былі ўзяты замкі Казьян і Красны, а таксама знішчана крэпасць Сітна. З 11 жніўня пачалася асада Полацка. Маскоўскі гарнізон колькасцю прыкладна ў 6 тыс. чалавек абараняўся ў Верхнім замку. Упартае супраціўленне і добрыя замкавыя ўмацаванні не дазволілі авалодаць Полацкам з ходу. Акрамя таго, асаду ўскладнялі амаль няспынныя дажджы і спустошаныя за шаснаццаць гадоў акупацыі наваколлі. Войска Рэчы Паспалітай цярпела недахоп харчавання, спробы падпаліць сцены замка вынікаў не давалі. Нарэшце, 29 жніўня драўляныя ўмацаванні ўдалося падпаліць, што і прадвызначыла лёс асады. Маскоўскі гарнізон пачаў перамовы аб капітуляцыі. 30 жніўня 1579 г. Полацк быў вызвалены. Актыўны ўдзел у баявых дзеяннях узяла полацкая шляхта, адна з найбольш пацярпелых у Лівонскай вайне. Па прызнанні Стэфана Баторыя, шляхціцы Полаччыны: *«з милости своее ку намъ господару и речи посполитое... пры добываню того замъку Полоцького з рукъ неприятельских Московъскихъ... з нелитованемъ горла и маетъностей своих, яко добрые а верные рыцерские люди служили»*.

Тым часам маскоўскае войска (каля 40 тыс. чалавек) на чале з Іванам IV знаходзілася ў Ноўгарадзе, але пайсці пад Полацк і ўступіць у адкрытую палявую бітву з войскам Стэфана Баторыя вялікі князь маскоўскі не наважыўся. Маскоўцы абмяжоўваліся толькі рэйдамі невялікіх атрадаў на землі ВКЛ. У сваю чаргу, шэраг атрадаў Рэчы Паспалітай здзейснілі паходы на тэрыторыю Лівоніі і Маскоўскай дзяржавы. Асабліва ўдалымі былі рэйды Філона Кміты-Чарнабыльскага на Смаленшчыну і князя Івана Саламярэцкага пад Яраслаўль.

Пасля вызвалення Полацка войска Рэчы Паспалітай працягнула свой паход. Ад маскоўскіх войскаў была вызвалена большая частка захопленых раней зямель Паўночнай Беларусі. Так, атрады ульскага старосты Канстанціна Лукомскага і Марціна Курча 4 верасня занялі замак Туроўля. Пасля ўпартага і крывавага штурму 25 верасня быў захоплены Сокал. У кастрычніку быў вымушаны капітуляваць замак Суша, а ў снежні – Няшчэрда. Усяго за гэтую кампанію войска Рэчы Паспалітай авалодала васьмю замкамі, важнейшым з якіх, безумоўна, з'яўляўся Полацк.

Неабходна было працягваць актыўныя баявыя дзеянні, каб замацаваць гэты поспех, для чаго патрабаваліся новыя грашовыя сродкі. На сойме

Рэчы Паспалітай 1579/80 г. літвіны падтрымалі планы Стэфана Баторыя *«далей войну противъ тому неприятелю попирати»*: быў ухвалены падатак на адзін год. А шляхта на галоўным з'ездзе ВКЛ у Вільні ўвесну 1580 г. другі раз згадзілася выйсці на вайну паспалітым рушэннем. Падтрымка вайны была ў грамадстве вельмі вялікай. Па сведчаннях храніста і дыпламата Р. Гейдэнштэйна, колькасць нанятага войска і паспалітага рушэння ВКЛ ды якасць яго ўзбраення ў 1580 г. была такой, што ніхто не мог бы здагадацца аб стратах літвінаў у мінулым годзе.

Ваенная кампанія 1580 г. таксама атрымалася даволі ўдалай для Рэчы Паспалітай. Збор войска прызначаўся ў Чашніках. Галоўнай мэтай наступлення былі вызначаны Вялікія Лукі, кантроль над якімі даваў стратэгічную перавагу для далейшага наступлення або ў Лівонію, або ў глыб Маскоўскай дзяржавы. Каб адцягнуць увагу маскоўцаў, на Смаленшчыну зноў быў накіраваны Ф. Кміта-Чарнабыльскі (з кастрычніка 1579 г. – тытулярны смаленскі ваявода). Асноўныя сілы Рэчы Паспалітай дасягалі амаль 48 тыс. чалавек, з якіх войска ВКЛ складала больш за 25 тыс. жаўнераў. Перад паходам на Вялікія Лукі неабходна было ўзяць пад кантроль шэраг крэпасцей. Так, войскам на чале з каронным канцлерам Я. Замойскім у ноч на 7 жніўня здаўся Веліж, а атрады віленскага ваяводы і вялікага гетмана М. Радзівіла Рудога 16 жніўня авалодалі Усвятамі. У канцы жніўня асноўныя сілы Рэчы Паспалітай падышлі да Вялікіх Лукаў. Асада пачалася 27 жніўня, а 1 верасня адбыўся масіраваны артылерыйскі абстрэл замка. Штурм працягваўся, нягледзячы нават на тое, што да Стэфана Баторыя прыбылі паслы Івана IV з даволі выгоднымі для Рэчы Паспалітай прапановамі аб перамір'і. Нарэшце, 4 верасня 1580 г. Вялікія Лукі былі захоплены.

Наступленне на гэтым не было завершана. Полацкі ваявода Мікалай Дарагастайскі 29 верасня пераможна завяршыў асаду Невеля, а 20 кастрычніка перад віленскім ваяводам Мікалаем Радзівілам капітуляваў замак Азярышча. Апошнім умацаваным пунктам, захопленым войскамі Рэчы Паспалітай у 1580 г. (23 кастрычніка) стала Завалочча. У самым пачатку 1581 г. атрады ВКЛ на чале з М. Курчам і Ф. Кмітам-Чарнабыльскім захапілі і знішчылі Холм і Старую Русу, крэпасці ў глыбіні маскоўскіх зямель.

Фінансавыя магчымасці далейшага правядзення ваеннай кампаніі былі вычарпаны. Стэфан Баторый склікаў новы вальны сойм Рэчы Паспалітай. Сойм 1581 г. ухваліў чарговы двухгадовы пабор на працяг шырокамаштабных баявых дзеянняў. Таксама ў ВКЛ быў працягнуты тэрмін збірання мыта яшчэ на два гады. Падкрэслім, што ў адрозненне ад часткі польскай шляхты, паслы і сенатары Вялікага Княства Літоўскага без усякіх агаворак падтрымалі фінансавыя рашэнні сойма.

Нягледзячы на значную шкоду, якую прыносілі пастоі войскаў Рэчы Паспалітай у дзяржаўных і шляхецкіх маёнтках, прадстаўнікі ВКЛ паранейшаму падтрымлівалі рашучую палітыку караля і вялікага князя, якая адпавядала іх інтарэсам. Яшчэ адным фактарам, што паўплываў на пазіцыю літвінаў, быў правал перамоў аб міры, якія праводзіліся ў гэты ж час у Варшаве пад кіраўніцтвам віленскага кашталяна і канцлера Астафія Валовіча.

У ліпені 1581 г. распачалася чарговая, трэцяя, ваенная кампанія. На гэты раз асноўнай мэтай быў захоп Пскова – галоўнай і мацнейшай фартэцыі Маскоўскай дзяржавы ў гэтым рэгіёне. Авалоданне Псковам дазваляла фактычна адрэзаць Маскоўскую дзяржаву ад Лівоніі.

З мэтай сарваць наступленне Рэчы Паспалітай маскоўскае войска, колькасцю ад 20 да 30 тыс. чалавек, здзейсніла паход па Падняпроўі. Былі спустошаны наваколлі Шклова, Магілёва, Копысі, Чэрыкава, але ніводзін з гэтых гарадоў захоплены не быў. Больш за тое, пад Магілёвам войска ВКЛ нанесла значныя страты маскоўцам. Як паведамляў Баркулабаўскі летапіс: «*Москву от Могилева отперли, побили, отогнали*». Маскоўскія войскі адступілі, так і не сарваўшы планаў Стэфана Баторыя. Наступленне амаль 40-тысячнага войска Рэчы Паспалітай (з якіх войска ВКЛ налічвала каля 14 500 жаўнераў) на Пскоў адбылося. Ужо 21 жніўня быў захоплены Востраў, а ўласна асада Пскова пачалася 28 жніўня. Фактычна адначасова ў глыб Маскоўскай дзяржавы (на Таропец і Холм) быў здзейснены рэйд аддзелаў палявога гетмана К. Радзівіла і Ф. Кміты-Чарнабыльскага. Атрады, у якіх налічвалася больш за 5 тыс. вершнікаў, даходзілі нават да Волгі.

Асада Пскова была збольшага пасіўнай і відавочна зацягвалася. Абаронцы горада былі добра падрыхтаваны да доўгатэрміновай аблогі. Спроба генеральнага штурму 7 верасня 1581 г. скончылася безвынікова. У войску Рэчы Паспалітай расла незадаволенасць працяглай аблогай, не хапала зброі і харчавання. Арыстакратыя Вялікага Княства нават пакінула вайсковы стан пад Псковам. Сярод шляхты ВКЛ станавілася ўсё больш прыхільнікаў хутчэйшага спынення баявых дзеянняў і заключэння міру з Маскоўскай дзяржавай. Жадаў хутчэйшага міру і Іван IV. Становішча Масквы ўскладнялася і тым, што супраць яе актывізавала баявыя дзеянні таксама шведская армія, якая атрымала шэраг перамог над маскоўскім войскам і ўвосень 1581 г. захапіла Нарву.

У рэшце рэшт, у снежні 1581 г. распачаліся мірныя перамовы паміж маскоўскімі пасламі і пасламі Рэчы Паспалітай (брацлаўскі ваявода Януш Збаражскі, дворны маршалак ВКЛ Альбрыхт Радзівіл і пісар Міхал Гарабурда). Яны праводзіліся з 13 снежня 1581 г. пры пасрэдніцтве папскага легата

Антоніа Пасевіна і скончыліся падпісаннем 15 студзеня 1582 г. Ям-Запольскага перамір'я на 10 гадоў. Уся Лівонія і землі паўночна-ўсходняй Беларусі разам з Полацкам і Азярышчам, а таксама Усвяты, Веліж і Себеж, вярталіся ў склад Рэчы Паспалітай. За адмову Івана IV ад усякіх прэтэнзій на Лівонію і Курляндыю Маскоўскай дзяржаве былі аддадзены заваяваныя раней Вялікія Лукі, Невель, Завалочча і інш. Таксама Рэч Паспалітая не стала настойваць на грашовай кампенсацыі за панесеныя ў час вайны страты.

Разам з тым працягвалася яшчэ вайна Швецыі з Маскоўскай дзяржавай. Яна была скончана падпісаннем у 1583 г. паміж гэтымі краінамі Плюскага перамір'я на тры гады. Паводле перамір'я, да Шведскага каралеўства адыходзіла Паўночная Эстонія, а таксама некаторыя рускія землі (Івангарад, Ям, Капор'е, Карэла).

Такім чынам, Лівонская вайна завяршылася перамогай Рэчы Паспалітай. Яе ўтварэнне ў 1569 г. дазволіла аб'яднаць сілы ВКЛ і Польшчы і кардынальна змяніць расклад сіл у вайне. Лівонія стала правінцыяй Рэчы Паспалітай, а Вялікае Княства Літоўскае вярнула ў свой склад амаль усе этнічныя беларускія землі. Маскоўская дзяржава пацярпела ваеннае паражэнне. Больш за тое, яна на доўгі час аказалася выключанай з барацьбы за ўплывы на Балтыцы. Затое Рэч Паспалітая стала адной з самых уплывовых дзяржаў у рэгіёне Балтыйскага мора. Аднак у Лівоніі засталіся супярэчнасці паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй, што пазней стала прычынай працяглага ваеннага канфлікту паміж гэтымі краінамі. Акрамя таго, Лівонская вайна прывяла да значнага гаспадарчага і дэмаґрафічнага крызісу на землях паўночна-ўсходняй Беларусі. Вёскі, якія пацярпелі ад баявых дзеянняў, прыходзілася цалкам вызваляць ад падаткаў на 10 і нават 15 гадоў.

# ХРАНАЛОГІЯ ВАЖНЕЙШЫХ ПАДЗЕЙ

**Каля 100 тыс. – 40–35 тыс. гадоў таму** – з'яўленне чалавека (неандэртальца) на тэрыторыі Беларусі.

**Каля 100 тыс. – 10 тыс. гадоў таму** – старажытны каменны век (палеаліт) на тэрыторыі Беларусі.

**Каля 27 тыс. – каля 24 тыс. гадоў таму** – познепалеалітычныя паселішчы-стаянкі краманьёнцаў каля в. Юравічы і Бердыж Гомельскай вобл.

**9–5 тыс. да н. э.** – сярэдні каменны век (мезаліт) на тэрыторыі Беларусі.

**5-е – пач. 2-га тыс. да н. э.** – новы каменны век (неаліт) на тэрыторыі Беларусі.

**Пачатак 2-га тыс. да н. э. – VIII/VII ст. да н. э.** – бронзавы век на тэрыторыі Беларусі.

**VIII/VII ст. да н. э. – V ст. н. э.** – жалезны век на тэрыторыі Беларусі.

**VI–VIII стст.** – рассяленне славян на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

**859 г.** – першае летапіснае ўпамінанне крывічоў-палачан.

**862 г.** – першае летапіснае ўпамінанне пра Полацк.

**885 г.** – першае летапіснае ўпамінанне радзімічаў.

**980 г.** – першае летапіснае ўпамінанне пра Тураў.

**983 г.** – першае летапіснае ўпамінанне яцвягаў.

**984 г.** – бітва на р. Пяшчань.

**988 г.** – прыняцце хрысціянства ў Кіеўскай Русі.

**992 г.** – стварэнне хрысціянскай епархіі ў Полацку.

**Каля 988 – 1001 г.** – княжанне ў Полацку Ізяслава.

**1003–1044 гг.** – княжанне ў Полацку Брачыслава Ізяславіча.

**1005 г.** – стварэнне Тураўскай епархіі.

**1009 г.** – першае ўпамінанне літвы ў заходніх крыніцах.

**1019 г.** – першае летапіснае ўпамінанне пра Берасце.

**1021 г.** – паход князя Брачыслава Ізяславіча на Ноўгарад.

**1044–1101 гг.** – княжанне ў Полацку Усяслава Брачыславіча.

**1050-я гг.** – будаўніцтва ў Полацку Сафійскага сабора.

**1066 г.** – паход полацкага князя Усяслава Брачыславіча на Ноўгарад.

**3 сакавіка 1067 г.** – бітва на р. Нямізе войск полацкага князя з князямі Яраславічамі.

**1067 г.** – першыя летапісныя звесткі пра Менск і Оршу.

**1068–1069 гг.** – княжанне Усяслава Брачыславіча ў Кіеве.

**1078 г.** – першае ўпамінанне пра Друцк, Лагойск, Лукомль.

**1078–1086 гг.** – княжанне Яраполка Ізяславіча ў Тураве.

**1088–1113 гг.** – княжанне Святаполка Яраславіча ў Тураве.

**1097 г.** – з'езд рускіх князёў у Любечы. Першае летапіснае ўпамінанне пра Пінск.

**1104–1119 гг.** – княжанне Глеба Усяславіча ў Менску.

**Каля 1104 – 1167 г.** – жыццё і дзейнасць Ефрасінні Полацкай.

**1116 г.** – першае летапіснае ўпамінанне пра Слуцк.

**1127 г.** – першыя летапісныя звесткі пра Гародню і Клецк.

**1129 г.** – высылка полацкіх князёў у Візантыю.

**Каля 1130 – каля 1182 г.** – жыццё і дзейнасць Кірылы Тураўскага.

**1142 г.** – першыя звесткі пра Гомель, Драгічын і Рагачоў.

**1147 г.** – першае летапіснае ўпамінанне пра Брагін.

**1155 г.** – першае летапіснае ўпамінанне пра Мазыр.

**1157 – пасля 1167 г.** – княжанне ў Тураве Юрыя Яраславіча.

**1159 г.** – першае летапіснае ўпамінанне пра Чачэрск.

**1162 г.** – апошняе летапіснае ўпамінанне крывічоў.

**1169 г.** – апошняе летапіснае ўпамінанне радзімічаў.

**1180 г.** – утварэнне Мсціслаўскага ўдзельнага княства.

**1202 г.** – заснаванне ваенна-манаскага Ордэна мечаносцаў.

**1203, 1206, 1216 гг.** – паходы полацкіх дружын на крыжаносцаў.

**1229 г.** – заключэнне гандлёвага дагавора Смаленскім, Віцебскім і Полацкім княствамі з Рыгай і востравам Готланд («Смаленская гандлёвая праўда»).

**1237 г.** – утварэнне Лівонскага ордэна.

**15 ліпеня 1240 г.** – бітва наўгародскай дружыны князя Аляксандра Яраславіча са шведскімі рыцарамі на р. Няве.

**5 красавіка 1242 г.** – бітва з нямецкімі рыцарамі на Чудскім возеры.

**1253 (1252) г.** – каранацыя Міндоўга ў Новагародку.

**1260 г.** – бітва з крыжакамі каля воз. Дурбе.

**1263 г.** – забойства Міндоўга.

**1263–1264 гг.** – княжанне Траняты ў ВКЛ.

**1264–1267 гг.** – княжанне Войшалка ў ВКЛ.

**1267–1270 гг.** – княжанне Шварна Данілавіча ў ВКЛ.

**1267 г.** – першае ўпамінанне пра Магілёў.

**1270–1282 гг.** – княжанне Трайдзеня ў ВКЛ.

**1293–1316 гг.** – княжанне Віценя ў ВКЛ.

**1307 г.** – уключэнне Полацкага княства ў склад ВКЛ.

**Каля 1315 г.** – далучэнне Берасцейскай зямлі да ВКЛ.

**1316–1341 гг.** – княжанне Гедыміна ў ВКЛ.

**Каля 1320 г.** – уваходжанне Віцебскага княства ў склад ВКЛ.

**1323 г.** – перанясенне сталіцы ВКЛ у Вільню.

**1331 г.** – бітва з нямецкімі рыцарамі на р. Акмяне.

**1341–1345 гг.** – княжанне Яўнута ў ВКЛ.

**1345–1377 гг.** – княжанне Альгерда ў ВКЛ.

**2 лютага 1348 г.** – бітва з крыжакамі на р. Стрэве.

**1355 г.** – далучэнне Бранскага княства да ВКЛ.

**1358 (1359) г.** – далучэнне Мсціслаўскага княства да ВКЛ.

**1362 г.** – бітва на р. Сіняя Вада (Сінія Воды).

**1360-я гг.** – уваходжанне Мазырскай і Брагінскай валасцей у ВКЛ.

**Каля 1364 – 1419/1420 г.** – жыццё і дзейнасць Грыгорыя Цамблака.

**1368, 1370, 1372 гг.** – паходы войскаў ВКЛ на Маскву.

**1377–1381, 1382–1392 гг.** – княжанне Ягайлы ў ВКЛ.

**8 верасня 1380 г.** – Кулікоўская бітва.

**1381–1382 гг.** – княжанне Кейстута ў ВКЛ.

**14 жніўня 1385 г.** – падпісанне Крэўскай уніі.

**1386 г.** – каранацыя Ягайлы як польскага караля (1386–1434).

**20 лютага 1387 г.** – выданне Ягайлам першага Агульназемскага прывілея.

**22 лютага 1387 г.** – прывілей Ягайлы каталіцкай царкве ў ВКЛ.

**1387 г.** – магдэбургскае права атрымала Вільня. Стварэнне Віленскага каталіцкага біскупства.

**1390 г.** – магдэбургскае права атрымала Берасце.

**5 жніўня 1392 г.** – Астраўскае пагадненне.

**1392–1430 гг.** – княжанне Вітаўта ў ВКЛ.

**12 кастрычніка 1398 г.** – заключэнне Салінскага дагавора.

**12 жніўня 1399 г.** – бітва на р. Ворскле.

**1401 г.** – Віленска-Радамская унія.

**1404 г.** – уключэнне Смаленска ў склад ВКЛ.

**1409–1411 гг.** – Вялікая вайна Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага з Тэўтонскім ордэнам.

**15 ліпеня 1410 г.** – Грунвальдская бітва.

**1 лютага 1411 г.** – заключэнне Торуньскага дагавора.

**2 кастрычніка 1413 г.** – заключэнне Гарадзельскай уніі.

**1413 г.** – заснаванне Віленскага і Трокскага ваяводстваў.

**1430–1432 гг.** – княжанне Свідрыгайлы ў ВКЛ.

**1432–1439 гг.** – феадальная (грамадзянская) вайна ў ВКЛ.

**1432–1440 гг.** – княжанне Жыгімонта Кейстутавіча ў ВКЛ.

**6 мая 1434 г.** – прыняцце Агульназемскага прывілея Жыгімонта Кейстутавіча.

**1435 г.** – бітва пад Вількамірам.

**1440–1492 гг.** – княжанне Казіміра ў ВКЛ.

**1441 г.** – магдэбургскае права атрымаў Слуцк.

**1446 г.** – стварэнне Беларуска-літоўскага летапісу.

**2 мая 1447 г.** – выданне Агульназемскага прывілея Казіміра.

**1449 г.** – дагавор паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам аб міры («Вечнае даканчэнне»).

**Каля 1460 – 1530 г.** – жыццё і дзейнасць Канстанціна Астрожскага.

**29 лютага 1468 г.** – прыняцце Судзебніка Казіміра.

**1470-я гг. – пасля 1553 г.** – жыццё і дзейнасць Міколы Гусоўскага.

**1481 г.** – змова князёў ВКЛ супраць Казіміра IV Ягелончыка.

**Каля 1490 – каля 1551 г.** – жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны.

**1492–1506 гг.** – княжанне Аляксандра ў ВКЛ.

**6 жніўня 1492 г.** – прыняцце Агульназемскага прывілея Аляксандра.

**1492–1494 гг.** – вайна Вялікага Княства Маскоўскага з Вялікім Княствам Літоўскім.

**1494 г.** – магдэбургскае права атрымала Высокае.

**1496 г.** – магдэбургскае права атрымала Гародня.

**1498 г.** – магдэбургскае права атрымаў Полацк.

**1499 г.** – магдэбургскае права атрымаў Менск.

**1500–1503 гг.** – вайна Вялікага Княства Маскоўскага з Вялікім Княствам Літоўскім.

**14 ліпеня 1500 г.** – бітва на р. Вядрошы.

**1501 г.** – падпісанне акта Мельніцкай уніі.

**1503 г.** – утварэнне Віцебскага ваяводства.

**1503 г.** – магдэбургскае права атрымалі Ваўкавыск і Камянец.

**1504 г.** – утварэнне Полацкага ваяводства.

**5 жніўня 1506 г.** – бітва пад Клецкам.

**1506–1548 гг.** – княжанне Жыгімонта Старога ў ВКЛ.

**1507 г.** – утварэнне Навагародскага ваяводства.

**1507–1508 гг.** – вайна Вялікага Княства Маскоўскага з Вялікім Княствам Літоўскім.

**1508 г.** – мяцеж Міхаіла Глінскага.

**1511 г.** – магдэбургскае права атрымаў Навагародак.

**1512–1522 гг.** – вайна Вялікага Княства Маскоўскага з Вялікім Княствам Літоўскім.

**8 верасня 1514 г.** – бітва пад Оршай на р. Крапіўне.

**1515–1565 гг.** – жыццё і дзейнасць Мікалая Радзівіла Чорнага.

**6 жніўня 1517 г.** – пачатак кнігавыдавецкай дзейнасці Ф. Скарыны ў Празе. Выданне «Псалтыра».

**1519 г.** – Кобрынскае княства пераўтворана ў староства.

**1522 г.** – адкрыццё Ф. Скарынай друкарні ў Вільні. Выданне «Малой падарожнай кніжкі».

**1523 г.** – выданне «Песні пра зубра» М. Гусоўскага ў Кракаве.

**1527 г.** – бітва на р. Альшаніцы.

**29 верасня 1529 г.** – прыняцце I Статута ВКЛ.

**1531 г.** – магдэбургскае права атрымаў Слонім.

**1534–1537 гг.** – вайна Вялікага Княства Літоўскага з Вялікім Княствам Маскоўскім (Старадубская вайна).

**1548–1572 гг.** – княжанне ў ВКЛ Жыгімонта II Аўгуста.

**1 красавіка 1557 г.** – прыняцце «Уставы на валокі».

**1558–1583 гг.** – Інфлянцкая (Лівонская) вайна.

**1559 г.** – пераход Лівонскага ордэна пад пратэктарат ВКЛ.

**1562 г.** – выданне Сымонам Будным «Катэхізіса» ў Нясвіжы.

**1563 г.** – выданне Берасцейскай (Радзівілаўскай) Бібліі.

**15 лютага 1563 г.** – захоп Полацка войскамі Івана Грознага.

**7 чэрвеня 1563 г.** – выданне Віленскага прывілея Жыгімонта II Аўгуста.

**26 студзеня 1564 г.** – бітва на р. Уле.

**1 ліпеня 1564 г. –** выданне Бельскага прывілея.

**1565 г.** – правядзенне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і судовай рэформ.

**1565 г.** – утварэнне Менскага і Мсціслаўскага ваяводстваў.

**1566 г.** – утварэнне Берасцейскага ваяводства.

**1 сакавіка 1566 г.** – уведзены ў дзеянне II Статут ВКЛ.

**1 ліпеня 1569 г.** – Люблінская унія. Стварэнне Рэчы Паспалітай.

**1576–1586 гг.** – праўленне Стэфана Баторыя ў Рэчы Паспалітай.

**30 жніўня 1579 г.** – вызваленне Полацка ад войскаў Івана Грознага.

**1582 г.** – заключэнне Ям-Запольскага перамір'я.

# КРЫНІЦЫ

Акты Литовско-Русского государства / изд. М. В. Довнар-Запольским. М., 1897–1899. Вып. 1 : в 2 т. Т. 2 : 1390–1529. 1899.

Анталогія даўняй беларускай літаратуры, XI – першая палова XVIII стагоддзя / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; падрыхт.: А. І. Богдан [і інш.] ; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. [2-е выд., выпр.]. Мінск, 2005.

Беларускія летапісы і хронікі : пер. са старажытнарус., старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлова ; прадм. В. Чамярыцкага. Мінск, 1997.

Белоруссия в эпоху феодализма : сб. док. и материалов : в 4 т. / редкол.: А. И. Азаров [и др.]. Минск, 1959–1961. Т. 1 : С древнейших времен до сер. XVII в. 1959.

*Вішнеўскі, А. Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах : вучэб. дапам. / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. Мінск, 2003.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах : у 4 т. Менск, 1936–1954. Т. 1 : IX–XVIII ст. / В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. 1936.

*Длугаш, Я.* Грунвальдская бітва / Я. Длугаш ; [прадм., пер. на беларус. мову А. П. Вашчанкі]. Мінск, 2017.

Законодательные акты Великого княжества Литовского XV–XVI вв. : сб. материалов / подгот. И. И. Яковкиным. Л., 1936.

Исторические песни XIII–XVI веков / изд. подгот. Б. Н. Путилов и Б. М. Добровольский. М. ; Л., 1960.

Кніга жыцій і хаджэнняў / уклад., прадм. і камент. А. Мельнікава ; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мінск, 1994.

Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раннемадэрны час / уклад. В. А. Варонін ; прадм.: В. Варонін, М. Улашчык. Мінск, 2013.

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кн. запісаў 28 (1522–1552) (копія канца XVI ст.) / архіў Канцылярыі Вялікага Князя Літоўскага ; падрыхт.: В. Мянжынскі, У. Свяжынскі. Менск, 2000.

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кн. запісаў 42 (1556–1562) (копія канца XVI ст.) / падрыхт. В. С. Мянжынскі. Мінск, 2015.

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кн. запісаў 43 (1523–1560) / архіў Канцылярыі Вялікага Князя Літоўскага, Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; падрыхт. В. С. Мянжынскі ; рэдкал.: Г. Я. Галенчанка [і інш.]. Мінск, 2003.

Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. запісаў 44 (1559–1566) / падрыхт. А. І. Груша. Мінск, 2001.

Повести Древней Руси. XI–XII вв. / сост. Н. В. Понырко ; вступ. ст. Д. С. Лихачёва. Л., 1983.

Повесть временных лет. 2-е изд. / пер. Д. С. Лихачёва. СПб., 1996.

Полное собрание русских летописей. Т. 32 : Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца ; Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост. и ред. Н. Н. Улащик. М., 1975.

Полное собрание русских летописей. Т. 35 : Литовско-белорусские летописи / сост. и ред. Н. Н. Улащик. М., 1980.

Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. : в 2 т. / подгот. А. Л. Хорошкевич (отв. ред.) [и др.]. М., 2015.

Свод древнейших письменных известий о славянах : в 2 т. / отв. ред. Г. Г. Литаврин. М., 1991–1995.

Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии (конец XIV в. – 1648 г.) : сб. док. и материалов : в 3 т. Т. 1 : Конец XVI в. – 1648 г. / сост. З. Ю. Копысский [и др.]. Минск, 1988.

Статут Великого княжества Литовского 1529 года / ред. К. Яблонскис. Минск, 1960.

Хрестоматия по истории Беларуси : учеб. пособие : в 2 ч. Минск, 2008. Ч. 1 : С древнейших времен до 1917 г. / сост. Я. И. Трещенок ; под науч. ред. К. М. Бондаренко.

Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. / сост.: А. П. Игнатенко, В. Н. Сидорцов. Минск, 1997.

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ


*Алексеев, Л. В.* Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. / Л. В. Алексеев. М., 2006.

Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя. Мінск, 1993.

Археалогія Беларусі : у 4 т. Мінск, 1997–2001. Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі [і інш.] ; рэдкал.: М. В. Біч (старш.) [і інш.]. 1997 ; Т. 2 : Жалезны век і ранняе сярэднявечча / А. А. Егарэйчанка [і інш.] ; рэдкал.: М. В. Біч (старш.) [і інш.] ; навук. рэд.: В. І. Шадыра, В. С. Вяргей. 1999.

*Бардах, Ю.* Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бардах. Мінск, 2010.

Беларусы : у 8 т. / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. Мінск, 1995–2005. Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё. 2001.

*Бохан, Ю.* Побыт феадалаў ВКЛ у XV – сярэдзіне XVII ст. / Ю. Бохан, А. Скеп'ян. Мінск, 2011.

*Бохан, Ю. М.* Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. / Ю. М. Бохан. Мінск, 2002.

*Бригадин, П. И.* История Беларуси в контексте европейской истории : курс лекций / П. И. Бригадин. Минск, 2007.

*Брыгадзін, П. І.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі : вучэб. дапам. / П. І. Брыгадзін. Мінск, 2015.

*Бычкова, М. Е.* Русское государство и Великое княжество Литовское с конца XV в. до 1569 г. Опыт сравнительно-исторического изучения политического строя / М. Е. Бычкова. М., 1996.

Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 3 т. Мінск, 2005–2010.

*Варонін, В. А.* Князь Юрый Лынгвеневіч Мсціслаўскі: Гістарычны партрэт / В. А. Варонін. Мінск, 2010.

*Высоцкая, Н. Ф.* Искусство Беларуси XII–XVIII вв. / Н. Ф. Высоцкая. Минск, 1994.

Вялікі гістарычны атлас Беларусі : у 4 т. / [рэдкал.: В. Л. Насевіч (гал. рэд.) і інш.]. Мінск, 2009–2018. Т. 1. 2009.

Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2007–2011. Т. 1 : Старажытная Беларусь: Ад першабытнага засялення да сярэдзіны XIII ст. 2000 ; Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. 2008.

Гісторыя Беларусі : курс лекцый : у 2 ч. / І. П. Крэнь [і інш.]. Мінск, 2000–2001. Ч. 1 : Са старажытных часоў да канца XVIII ст. 2000.

Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / АН БССР ; пад рэд. І. М. Ігнаценкі. Мінск, 1972–1975. Т. 1. 1972.

Гісторыя Літвы / А. Эйдзінтас [і інш.] ; пер. з літ.: В. Вячорка ; рэдкал.: Р. Лапата (старш.) [і інш.]. Вільня [Вільнюс], 2014.

Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да 1996 г. : у 3 т. / рэдкал.: М. П. Касцюк (старш.) [і інш.] ; Нац. АН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 1997– . Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. 1997.

*Голубеў, В. Ф.* Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. / В. Ф. Голубеў. Мінск, 2008.

Города, местечки и замки Великого княжества Литовского : энциклопедия / редсовет: Т. В. Белова [и др.]. Минск, 2009.

*Греков, И. Б.* Очерки по истории международных отношений Восточной Европы XIV–XVI вв. / И. Б. Греков. М., 1963.

*Груша, А. І.* Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV – першай паловы XVI ст. / А. І. Груша. Мінск, 2006.

*Грушевський, М. С.* Історія України-Руси : в 10 т. / М. С. Грушевський. Київ ; Львів, 1898–1936. Т. 4 : XIV–XVI віки – відносини политични. 1904.

*Гудавичюс, Э.* История Литвы с древнейших времен до 1569 года / Э. Гудавичюс. М., 2005.

*Дворниченко, А. Ю.* Городская община Верхнего Поднепровья и Подвинья в XI–XV вв. / А. Ю. Дворниченко. М., 2013.

*Данилевич, В. Е.* Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия / В. Е. Данилевич. Киев, 1896.

*Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага пры Ягелонах / М. В. Доўнар-Запольскі. Мінск, 2009.

*Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. Минск, 2003.

*Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. Мінск, 1994.

*Доўнар, Т. І.* Помнікі права Беларусі феадальнага перыяду : курс лекцый / Т. І. Доўнар. Мінск, 2001.

*Загорульский, Э. М.* Белая Русь с середины I тысячелетия до середины XIII века / Э. М. Загорульский. Минск, 2013.

*Загарульскі, Э. М.* Заходняя Русь: IX–XIII стст. / Э. М. Загарульскі. Мінск, 1998.

*Загорульский, Э. М.* Возникновение Минска / Э. М. Загорульский. Минск, 1982.

*Загорульский, Э. М.* Славяне: происхождение и расселение на территории Беларуси / Э. М. Загорульский. Минск, 2013.

*Заяц, Ю. А.* Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. Минск, 1995.

*Егорейченко, А. А.* Культуры штрихованной керамики / А. А. Егорейченко. Минск, 2006.

*Ермаловіч, М. І.* Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды / М. І. Ермаловіч. Мінск, 1990.

*Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. Мінск, 1991.

Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі: Ад старажытнасці да пачатку XX ст. / Бел. энцыкл. ; рэд. Б. І. Сачанка. Мінск, 1995.

История белорусской государственности : в 5 т. Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. О. Н. Левко, В. Ф. Голубев. Минск, 2018.

*Ковкель, И. И.* История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. Минск, 2006.

*Копысский, З. Ю.* Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. Минск, 1975.

*Краўцэвіч, А.* Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага 1248–1377 г. : у 2 кн. / А. Краўцэвіч. Уроцлаў, 2015. Кн. 1 : Ад пачатку гаспадарства да каралеўства Літвы і Русі (1248–1341 г.) ; Кн. 2 : Дуумвірат Альгерда і Кейстута Гедымінавічаў (1341–1377 г.).

*Краўцэвіч, А. К.* Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага / А. К. Краўцэвіч. Мінск, 1998.

*Кром, М. М.* Меж Русью и Литвой: западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в. / М. М. Кром. М., 1995.

*Левко, О. Н.* Торговые связи Витебска в X–XVIII вв. / О. Н. Левко. Минск,1989.

*Лошенков, М. И.* Городища милоградской культуры на территории Беларуси / М. И. Лошенков. Минск, 2011.

*Лысенко, П. Ф.* Дреговичи / П. Ф. Лысенко. Минск,1991.

*Лысенко, П. Ф.* Туровская земля / П. Ф. Лысенко. Минск, 1999.

*Лыч, Л. М.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. М. Лыч, У. І. Навіцкі. Мінск, 1996.

*Любавский, М. К.* Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М. К. Любавский. М., 1900.

*Любавский, М. К.* Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М. К. Любавский ; подгот. к печати Д. В. Карев ; авт. вступ. ст. Д. В. Карев / Ин-т истории НАН Беларуси. Минск, 2012.

*Марзалюк, І. А.* Людзі даўняй Беларусі: Этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.) / І. А. Марзалюк. Магілёў, 2003.

*Мартос, А.* Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни / А. Мартос. Минск, 2000.

*Митрофанов, А. Г.* Железный век Средней Белоруссии / А. Г. Митрофанов. Минск, 1978.

Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. Мінск, 1994–1995. Ч. 1. 1994.

*Насевіч, В. Л.* Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы / В. Л. Насевіч. Мінск, 1993.

Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. / редкол.: П. Т. Петриков [и др.]. Минск, 1996.

*Петрухин, В. Я.* Русь в IX–X веках: От призыва варягов до выбора веры / В. Я. Петрухин. М., 2013.

*Пилипенко, М. Ф.* Возникновение Белоруссии. Новая концепция / М. Ф. Пилипенко. Минск, 1991.

*Пичета, В. И.* Белоруссия и Литва XV–XVI вв. (исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития) / В. И. Пичета ; под ред. З. Ю. Копысского, В. Д. Королюка, Н. Н. Улащика. М., 1961.

*Пичета, В. И.* История белорусского народа / В. И. Пичета. Минск, 2003.

*Пятраўскас, Р.* Літоўская знаць у канцы XIV – XV ст.: Склад – структура – улада / Р. Пятраўскас. 2-е выд. Смаленск, 2014.

Рэлігія і Царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. Мінск, 2001.

*Сагановіч, Г.* Грунвальд у беларускай гісторыі: спроба разбору палітычнага міфа / Г. Сагановіч. Мінск, 2015.

*Сагановіч, Г.* Нарыс гісторыі Беларусі / Г. Сагановіч. Мінск, 2001.

*Седов, В. В.* Восточные славяне в VI–XIII вв. / В. В. Седов. М., 1982.

*Седов, В. В.* Славяне. Историко-археологическое исследование / В. В. Седов. М., 2002.

*Семянчук, А. А.* Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі. Гродна, 2000.

Славяне на территории Беларуси в догосударственный период : в 2 кн. / О. Н. Левко [и др.] ; А. А. Коваленя (гл. ред.). Минск, 2016.

*Снапкоўскі, У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / У. Е. Снапкоўскі. Мінск, 2003. Ч. 1 : Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XVIII ст.

*Спиридонов, М. Ф.* Закрепощение крестьянства Белоруссии XV–XVI вв. / М. Ф. Спиридонов ; под ред. А. Л. Хорошкевич ; АН Беларуси, Ин-т истории. Минск, 1993.

*Стрэнкоўскі, С. П.* Гарадское самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XIV – XVIII ст.) : у 2 ч. / С. П. Стрэнкоўскі. Мінск, 2013.

*Тарасаў, С. В.* Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. Мінск, 1998.

*Ткачёв, М. А.* Замки Белоруссии / М. А. Ткачёв. Минск, 1987.

*Трусов, О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. Архитектурно-археологический анализ / О. А. Трусов. Минск, 1988.

*Улашчык, М. М.* Працы па археаграфіі і крыніцазнаўству гісторыі Беларусі: З рукапіснай спадчыны / уклад.: Я. М. Кісялёва, В. У. Скалабан ; рэдкал.: Н. М. Дзятчык [і інш.]. Мінск, 1999.

*Улашчык, М. М.* Збор твораў : у 3 т. / М. М. Улашчык ; пад рэд Д. Віцько [і інш.]. Смаленск, 2017– . Т. 1. 2017.

*Ходзін, С. М.* Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне) : вучэб. дапам. / С. М. Ходзін. Мінск, 1999.

*Хорошкевич, А. Л.* Русское государство в системе международных отношений конца XV – начала XVI в. / А. Л. Хорошкевич. М., 1980.

*Цемушаў, В. М.* На ўсходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XV – першая палова XVI ст.) / В. М. Цемушаў. Смаленск, 2014.

*Шабульдо, Ф. М.* Земли Юго-Западной Руси в составе Великого княжества Литовского / Ф. М. Шабульдо ; АН УССР, Ин-т истории. Киев, 1987.

*Штыхов, Г. В.* Древний Полоцк XI–XIII вв. / Г. В. Штыхов. Минск, 1975.

*Штыхаў, Г. В.* Крывічы / Г. В. Штыхаў. Мінск, 1992.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск, 1993–2003.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. Мінск, 1982–1987.

Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. Мінск, 1983.

Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / рэд. В. К. Бандарчык [і інш.]. Мінск, 1985.

*Юхо, Я. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : у 2 ч. / Я. А. Юхо. Мінск, 2000–2003.

*Янушкевич, А. Н.* Ливонская война. Вильно против Москвы, 1558–1570 / А. Н. Янушкевич. М., 2015.

*Bardach, J.* O dawniej i niedawniej Litwie / J. Bardach. Poznań, 1988.

*Błaszczyk, G.* Litwa na przełome średniowiecza i nowożytności: 1492–1569 / G. Błaszczyk. Poznań, 2002.

*Błaszczyk, G.* Dzieje stosunków polsko-litewskich od czasów najdawniejszych do spółczesności : w 2 t. / G. Błaszczyk. Poznań, 1998–2007. T. 1 : Trudne początki. 1998 ; T. 2 : Od Krewa do Lublina. Cz. 1. 2007.

*Kiaupa, Z.* The History of Lithuania (before 1795) / Z. Kiaupa, J. Kiaupiene, A. Kuncevičius. Vilnius, 2000.

*Kolankowski, L.* Dzieje Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonów : w 2 t. / L. Kolankowski. Warszawa, 1930. T. 1 (1377–1499).

*Kosman, M.* Historia Białorusi / M. Kosman. Wrocław, 1979.

*Łowmiański, H.* Polityka Jagiellonów / H. Łowmiański. Poznań, 2006.

Monarchia Jagiellonów: 1399–1586 / U. Augustyniak [et al.] ; red. nauk. M. Derwich. Warszawa ; Wrocław, 2003.

*Ochmański, J.* Historia Litwy / J. Ochmański. Wrocław, 1990.

*Pietkiewicz, K.* Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellonczyka. Studia nad dziejami państwa i spoleczeństwa na przełomie XV i XVI wieku / K. Pietkiewicz. Poznań, 1995.

Prahistoria ziem Polskich : w 5 t. / oprac. pod red. W. Hensla ; Skorowidz osobowy nazw B. Balke [et al.]. Wrocław. 1981. T. 5.

# ЗМЕСТ

Прадмова..........3

1. Уводзіны ў гісторыю Беларусі..........5

2. Насельніцтва Беларусі ў каменным і бронзавым вяках..........16

3. Грамадства на тэрыторыі Беларусі ў жалезным веку..........36

4. Полацкае княства: вытокі беларускай дзяржаўнасці..........57

5. Тураўскае княства. Землі беларускага Пабужжа, Панямоння і Пасожжа..........72

6. Сацыяльна-эканамічнае развіццё зямель Беларусі ў IX–XII стст...........83

7. Рэлігія і культура беларускіх зямель у IX–XIII стст...........97

8. Фарміраванне беларускага этнасу..........118

9. Супрацьстаянне крыжацкай агрэсіі і паходам мангола-татар у першай палове XIII ст...........129

10. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага..........144

11. Дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага ў XIV ст...........156

12. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны (другая палова XIII – XIV ст.)..........166

13. Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ. Княжанне Вітаўта..........181

14. Унутрыпалітычная барацьба ў Вялікім Княстве Літоўскім у 30–40-я гг. XV ст...........200

15. Палітыка Казіміра Ягелончыка..........213

16. Культура Беларусі ў XIV–XV стст...........223

17. Рэлігійнае становішча ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XV стст...........245

18. Эвалюцыя дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага..........261

19. Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага
ў канцы XV – першай палове XVI ст. ....................................................270

20. Змены ва ўнутрыпалітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага
ў 20–60 гг. XVI ст. ....................................................284

21. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель
у XV – першай палове XVI ст. ....................................................295

22. Інфлянцкая (Лівонская) вайна....................................................322

Храналогія важнейшых падзей....................................................337

Крыніцы....................................................343

Спіс літаратуры....................................................345

Вучэбнае выданне

**Брыгадзін** Петр Іванавіч
**Варонін** Васіль Аляксеевіч
**Грыбко** Ірына Леанідаўна і інш.

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ**

**Дапаможнік**

**У чатырох частках**

**Частка 1**
**АД СТАРАЖЫТНАСЦІ**
**ДА СЯРЭДЗІНЫ XVI ст.**

Рэдактар *А. В. Яфімаў*
Мастак вокладкі *Т. Ю. Таран*
Тэхнічны рэдактар *Л. У. Жабароўская*
Камп'ютарная вёрстка *К. В. Бекіш*
Карэктар *Т. М. Вяльчынская*

Падпісана да друку 29.12.2018. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 20,46. Ул.-выд. арк. 25,39.
Тыраж 120 экз. Заказ 18.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/270 ад 03.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.




НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ
- Сталіцы дзяржаў
- Трокі Цэнтры ваяводстваў ВКЛ (з 1413 г.)
- Гарады – цэнтры земель, намесніцтваў, рэзідэнцыі ўдзельных князёў
- Іншыя гарады і населеныя пункты
- Цэнтры ўдзельных княстваў ВКЛ, якія існавалі ў
- 1392 г. — 1430 г.

ГРАНІЦЫ
- дзяржаў на 1392 г.
- удзельных княстваў, намесніцтваў, зямель, далучаных тэрыторый
- ВКЛ пад уладай Вітаўта ў 1430 г.
- Каралеўства Польскае ў 1392 г.

ГАДЫ ДАЛУЧЭННЯ ТЭРЫТОРЫЙ

| трывалага | часовага | да |
|---|---|---|
| 1404 | 1395-1402 | ВКЛ |
| 1393 | 1401-1405 | Маскоўскага вялікага княства |
| каля 1395 | каля 1395-1411 | Каралеўства Польскага |

ТЭРЫТОРЫІ
- ВКЛ, падуладныя Вітаўту ў 1392 г.
- найбольш уплывовых удзельных княстваў, скасаваных Вітаўтам да 1394 г.
- далучаныя да ўдзельных княстваў пасля 1394 г.
- іншых княстваў і ленных уладанняў ВКЛ, лаяльных да ўлады Вітаўта
- сумесных уладанняў Вялікага Ноўгарада і ВКЛ («Чарнакунства»)
- Прычарнаморскага стэпу, намінальна далучаныя да ВКЛ каля 1398 г.
- якія намінальна ўваходзілі ў склад ВКЛ, фактычна з'яўляліся часткай Поля, якое перыядычна выкарыстоўвалі татары ў якасці качэўяў
- уладанняў Фёдара Карыятавіча (да 1414 г.), дадзеныя венгерскім каралём за правы на Падольскую зямлю
- непасрэдна падуладныя Ягайлу ў 1392 г.
- ленных уладанняў Каралеўства Польскага
- спрэчныя паміж ВКЛ і Каралеўствам Польскім
- Маскоўскага вялікага княства ў 1389 г.
- далучаныя да маскоўскіх уладанняў у канцы XIV ст. – 1425 г.
- замацаваныя за Тэўтонскім ордэнам паводле Салінскага дагавора, уключаныя ў склад ВКЛ фактычна ў 1411–13, канчаткова – у 1422 г.
- Пакуцця, на кароткі час захопленая Малдовай (паміж 1393 і пачаткам 1395 г.)
- Ржэўскай зямлі, часова (1399 – каля 1402 г.) далучанай да Цвярскога вялікага княства

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ

Напрамкі паходаў
- Вітаўта і яго саюзнікаў
- рыцараў Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў
- маскоўскіх войскаў
- Цімура-Кутлуга і Эдыгея
- 12.08.1399 Месцы і даты найбольш значных бітваў
- Месцы заключэння перамір'яў Вітаўта з Васілём I

ІНШЫЯ ПАДЗЕІ
- 18.01.1401 Месцы і даты заключэння уній
- 12.10.1398 Месца і дата заключэння Салінскага дагавора аб саюзе ВКЛ і Тэўтонскага ордэна
- Месцы няўдалых каранацыйных з'ездаў Вітаўта




НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ
- Сталіцы дзяржаў
- Цэнтры ваяводстваў і зямель ВКЛ і Каралеўства Польскага
- Цэнтры княжацкіх уладанняў
- Іншыя гарады, цэнтры валасцей, сёлы

ГРАНІЦЫ
- дзяржаў да 1487 г.
- ваяводстваў і зямель
- княжацкіх уладанняў
- далучаных тэрыторый
- Літоўска-маскоўская граніца паводле «вечнага міру» 1494 г.
- Граніца ВКЛ у 1537 г.
- Сучасная граніца Рэспублікі Беларусь

Гады далучэнняў тэрыторый
- 1537 да ВКЛ
- 1434 да Польшчы
- 1503 да Маскоўскага вялікага княства

ТЭРЫТОРЫІ
- Вялікага Княства Літоўскага ў 1503 г.
- Маскоўскага вялікага княства ў 1487 г.
- Каралеўства Польскага
- сумесных уладанняў Ноўгарада, Масквы і Вільні («Чарнакунства»), паводле «вечнага міру» 1494 г. канчаткова прызнаныя за Масквой
- якія намінальна ўваходзілі ў склад вялікіх княстваў Маскоўскага і Літоўскага, фактычна – частка Поля (месца татарскіх качэўяў)
- Пакуцця, спрэчнага паміж Польшчай і Малдовай (у 1503–1505, 1530–1531 гг. у складзе апошняга). У 1538 г. канчаткова прызнана за Польшчай

Тэрыторыі, занятыя расійскімі войскамі
- падчас вайны 1500–1503 гг., але вернутыя ВКЛ у выніку перагавораў 1503 г.
- падчас вайны 1507–1508 гг., але вернутыя ВКЛ у 1508 г. разам з часткай тэрыторыі, прызнанай за Расіяй у 1503 г.
- Тэрыторыі, занятыя Польшчай пасля смерці Вітаўта

Тэрыторыі, вернутыя ў склад ВКЛ
- паводле дагавора аб «вечным міры» 1508 г.
- паводле перамір'я 1537 г.

Тэрыторыі, далучаныя да Маскоўскага вялікага княства
- паводле дагавора аб «вечным міры» 1494 г. (у выніку вайны 1487–1494 гг.)
- у выніку захопаў 1494–1498 гг.
- паводле 6-гадовага перамір'я 1503 г. (у выніку вайны 1500–1503 гг.)
- паводле 5-гадовага перамір'я 1522 г. (у выніку вайны 1512–1522 гг.)
- паводле перамір'я 1537 г. (у выніку вайны 1534–1536 гг.)
- Сумесныя ўладанні вялікіх княстваў Маскоўскага і Літоўскага (1494–1503 гг.)

Напрамкі і даты паходаў войскаў
- 1514 ВКЛ
- 1500 Маскоўскага вялікага княства
- 1514 Месцы і даты найбольш важных бітваў
- Напрамкі нападаў крымскіх татар



ISBN 978-985-566-616-6

9 789855 666166

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ 1